Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт
інфарматыкі і радыёэлектронікі»

Кафедра гуманітарных дысцыплін

# Вучэбны дапаможнік па курсу

# «Гісторыя Беларусі»

## для студэнтаў усіх форм навучання і спецыяльнасцей

Мінск 2006

## ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ 6

РАЗДЗЕЛ І. СТАРАЖЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. ФАРМІРАВАННЕ ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН (ад старажытных часоў – да другой паловы XIII ст.) 13

§ 1. Засяленне беларускіх зямель. Характарыстыка даіндаеўрапейскага перыяду этнічнай гісторыі Беларусі 13
§ 2. Індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі, яго балцкі і славянскі этапы 15
§ 3. Узнікненне Беларусі: розныя падыходы і канцэпцыі 19
§ 4. Паходжанне назваў "Белая Русь" і "Чорная Русь" 22
§ 5. Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь) – агульная раннефеадальная дзяржава-манархія ўсходніх славян 26
§ 6. Полацкае і Тураўскае княствы – першыя раннефеадальныя дзяржавы-манархіі на тэрыторыі Беларусі 31
§ 7. Беларускія землі ў перыяд феадальнай раздробленасці 36
§ 8. Барацьба супраць крыжакоў і татара-манголаў 40
§ 9. Увядзенне хрысціянства. Культура на беларускіх землях у IX – XIII стст. 43

РАЗДЗЕЛ ІІ. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ І РОЛЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ЯГО ПАЛІТЫЧНЫМ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ РАЗВІЦЦІ (другая палова XIII – першая палова XVI стст.) 50

ГЛАВА 1. УТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 50
ГЛАВА 2. ПАЛІТЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У XIV – XVI стст. 52
§ 1. Беларускія землі ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ 52
§ 2. Знешняя палітыка ВКЛ у XIV – сярэдзіне XVI стст. 55
ГЛАВА 3. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ ВКЛ 58
§ 1. Асаблівасці дзяржаўнага і саслоўнага ладу ВКЛ 58
§ 2. Эканамічнае развіццё беларускіх зямель. Станаўленне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі і масавае запрыгоньванне сялян. Беларускі феадальны горад 61
ГЛАВА 4. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI стст. 64
§ 1. Фарміраванне беларускай народнасці 64
§ 2. Культура Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI стст. 67

РАЗДЗЕЛ ІІІ. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (1569 – 1795) 72

ГЛАВА 1. ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ. УТВАРЭННЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 72
§ 1. Гістарычныя ўмовы Люблінскай уніі 72
ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАСЛЯ ЛЮБЛІНА (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) 73
§ 1. Грамадска-палітычны лад Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча княства ў складзе Рэчы Паспалітай 73
§ 2. Барацьба беларускага народа супраць польска-каталіцкай экспансіі 75
ГЛАВА 3. ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА. ВОЙНЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI – XVIII стст. 77
ГЛАВА 4. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ (другая палова XVI – канец XVIII стст.) 80
ГЛАВА 5. ПАГЛЫБЛЕННЕ ПАЛІТЫЧНАГА КРЫЗІСУ. ПАДЗЕЛЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 83

ГЛАВА 6. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (другая палова XVI – канец XVIII стст.) 85

РАЗДЗЕЛ IV. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ. КРЫЗІС ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ (канец XVIII – 50-я гг. XIX ст.) 90

ГЛАВА 1. УВАХОДЖАННЕ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ. ПАЛІТЫЧНАЕ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ 90

§ 1. Унутраная палітыка расійскага ўрада на Беларусі у канцы XVIII – першай чвэрці XIX ст. 90

§ 2. Беларусь у Айчыннай вайне 1812 г. 99

§ 3. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух 104

§ 4. Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі ў 30 – 50-я гг. XIX ст. 108

§ 5. Крызіс прыгоннага ладу. Эканамічныя рэформы 30 – 50-х гадоў XIX ст. 113

ГЛАВА 2. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст. 120

§ 1. Асаблівасці культурнага развіцця Беларусі. Адукацыя і навука. Беларусазнаўства – частка славістыкі 120

§ 2. Літаратура. Музычна-тэатральная культура. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура 123

РАЗДЗЕЛ V. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА. БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ. БАРАЦЬБА ЗА НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ (60-я гады XIX ст. – люты 1917 г.) 129

ГЛАВА 1. БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ. ПЕРАХОД ДА КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ 129

§ 1. Адмена прыгоннага права 129

§ 2. Буржуазныя рэформы 60–70-х гадоў і контррэформы 80–90-х гадоў 133

§ 3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх губерняў у 60-я гады XIX ст. – першыя гады XX ст. 140

§ 4. Беларусь напярэдадні першай сусветнай вайны. Сталыпінскія рэформы 150

ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУСІ 154

§ 1. Паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі 154

§ 2. Сялянскі і рабочы рух. Народніцкія і сацыял-дэмакратычныя арганізацыі на Беларусі 159

§ 3. Фарміраванне палітычных партый. Нацыянальнае адраджэнне. Першыя палітычныя арганізацыі 162

§ 4. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. Палітычнае становішча ў паслярэвалюцыйныя гады. "Нашаніўскі перыяд" беларускага нацыянальнага руху 164

ГЛАВА 3. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. ЛЮТАЎСКАЯ БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ 169

§ 1. Пачатак і прычыны Першай сусветнай вайны. Адносіны да вайны розных класаў і партый 169

§ 2. Беларусь у гады першай сусветнай вайны 171

§ 3. Беларускі нацыянальны рух 174

§ 4. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. Перамога рэвалюцыі на Беларусі 175

ГЛАВА 4. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. 178

§ 1. Фарміраванне беларускай нацыі 178

§ 2. Развіццё адукацыі, навукі, друку 181

§ 3. Мастацтва і архітэктура 186

РАЗДЗЕЛ VI. АД ЛЮТАГА ДА КАСТРЫЧНІКА 1917 г. КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ. НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ БУДАЎНІЦТВА. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА І ІНШАЗЕМНАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ (1917–1920) 192

ГЛАВА 1. БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. УСТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА БЕЛАРУСІ 192
§ 1. Ад лютага да кастрычніка 1917 г. Альтэрнатывы грамадска-палітычнага развіцця. Уздым беларускага нацыянальнага руху 192
§ 2. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі. Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні 194
§ 3. Размежаванне палітычных сіл на Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. І Усебеларускі з’езд (снежань 1917 г.). Мяцеж польскага корпуса пад камандаваннем генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага 198
ГЛАВА 2. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ І ПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ГЕРМАНСКАЙ АКУПАЦЫІ. НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ БУДАЎНІЦТВА 201
§ 1. Беларусь пасля падпісання Брэсцкага мірнага дагавора. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні і культурнае будаўніцтва на свабоднай ад нямецкіх акупантаў тэрыторыі Беларусі 201
§ 2. Барацьба беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) 202
§ 3. Утварэнне Беларускай ССР. Аб’яднанне Беларускай ССР з Літоўскай ССР 207
ГЛАВА 3. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ПОЛЬСКАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ (1919–1920) 210
§ 1. Захоп тэрыторыі Беларусі войскамі Польшчы. Савецка-польская вайна 210
§ 2. Барацьба беларускага народа супраць польскіх інтэрвентаў. Беларускі нацыянальны рух 212
§ 3. Аднаўленне Беларускай ССР 214
§ 4. Гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў 1919–1920 гг. 215

РАЗДЗЕЛ VII. САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ І ПАБУДОВЫ САЦЫЯЛІЗМУ. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ (1921–1939) 218

ГЛАВА 1. АДНАЎЛЕННЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ. ПРАВЯДЗЕННЕ ПАЛІТЫКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НА БЕЛАРУСІ 218
§ 1. Пачатак мірнага будаўніцтва. Новая эканамічная палітыка, яе сутнасць і вынікі 218
§ 2. Курс на сацыялістычную індустрыялізацыю. Асаблівасці яе правядзення ў рэспубліцы 224
§ 3. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі 231
ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ 237
§ 1. Асноўныя рысы беларускага савецкага грамадства 237
§ 2. Нацыянальная палітыка. Беларусізацыя 241
§ 3. Беларускае замежжа 245
§ 4. Палітычныя рэрпрэсіі: прычыны, памеры, вынікі 247
ГЛАВА 3. КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА 250
§ 1. Ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. Развіццё асветы і навукі 250
§ 2. Беларуская літаратура, тэатральнае і музычнае мастацтва: асноўныя напрамкі развіцця 254
§ 3. Жывапіс, скульптура і архітэктура 256
ГЛАВА 4. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ 260
§ 1. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель 260
§ 2. Нацыянальна-вызваленчая барацьба насельніцтва Заходняй Беларусі. Роля і значэнне дзейнасці палітычных партый і арганізацый камуністычнага і нацыянальна-дэмакратычнага напрамку 263

§ 3. Праблема адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту ў Заходняй Беларусі. Міжпартыйныя адносіны 266

РАЗДЗЕЛ VIII. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (верасень 1939 г. – верасень 1945 г.) 269

ГЛАВА 1. ПЕРАДВАЕННЫ КРЫЗІС І ПАЧАТАК ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР. ДАЛУЧЭННЕ ВІЛЕНШЧЫНЫ ДА ЛІТВЫ 269
ГЛАВА 2. НАПАДЗЕННЕ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ НА СССР. АДПОР ВОРАГУ Ў ПАЧАТКОВЫ ПЕРЫЯД ВАЙНЫ 275
ГЛАВА 3. АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ КАЛАБАРАЦЫЯНІСТАЎ 279
ГЛАВА 4. БАРАЦЬБА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ 284
ГЛАВА 5. ДЗЕЙНАСЦЬ ВАЕННЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ І АРГАНІЗАЦЫІ ЎКРАІНСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ. РУСКАЯ ВЫЗВАЛЕНЧАЯ АРМІЯ 289
ГЛАВА 6. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ. ЗАКАНЧЭННЕ ВАЙНЫ 292
ГЛАВА 7. УКЛАД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ 296

РАЗДЗЕЛ IX. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ. БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ (1946–1985) 299

ГЛАВА 1. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ 299
§ 1. Аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі пасля Вялікай Айчыннай вайны 299
§ 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 50-я – першай палове 80-х гг. 303
ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ І ДУХОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ 309
§ 1. Асноўныя рысы грамадска-палітычнага развіцця Беларусі 309
§ 2. Адукацыя і навука 312
§ 3. Літаратура і мастацтва 315
ГЛАВА 3. БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ 318
§ 1. Удзел БССР у барацьбе міжнароднага супольніцтва за вырашэнне глабальных сацыяльна-палітычных праблем, за мір і бяспеку 318
§ 2. Развіццё гандлёва-эканамічных адносін БССР з замежнымі краінамі 321
§ 3. Культурныя, навуковыя, спартыўныя і турысцкія сувязі БССР 324

РАЗДЗЕЛ X. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФОРМ: САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ. ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА (1985 – 2006 гг.) 327

§ 1. Палітыка перабудовы, яе змест і шляхі ажыццяўлення: розныя погляды і меркаванні 327
§ 2. Дзяржаўны пераварот у Маскве ў жніўні 1991 г. Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Ліквідацыя СССР: розныя погляды і меркаванні 331
§ 3. Грамадска-палітычнае жыццё Рэспублікі Беларусь на мяжы XX – XXI стст. 338
§ 4. Канфесійная палітыка. Адраджэнне царкоўнага жыцця 342
§ 5. Рэспубліка Беларусь на шляху рыначных рэформ. Асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця 346
§ 6. Культура Беларусі на сучасным этапе 350
§ 7. Рэспубліка Беларусь у міжнародным супольніцтве на мяжы XX – XXI стст. 355

ЗАКЛЮЧЭННЕ 360

# УВОДЗІНЫ

***Гісторыя*** (ад грэч. *historia*) – навука аб прошлым, зведаным. Гісторыя (гістарычная навука) уяўляе сабой комплекс сацыяльна-гуманітарных навук, якія вывучаюць прошлае чалавецтва ва ўсёй яго канкрэтнасці і разнастайнасці. Як комплекс навук гісторыя ўключае ў сябе такія спецыяльныя дысцыпліны, як археалогія і этнаграфія, навукі, якія вывучаюць гісторыю розных бакоў навукі і тэхнікі (гісторыя матэматыкі, гісторыя фізікі, гісторыя радыётэхнікі і электронікі і г. д.) і розных галін культуры (гісторыя тэатра, гісторыя архітэктуры, гісторыя музыкі і г. д.). Гісторыя ўваходзіць у групу сацыяльна-гуманітарных навук, якія вывучаюць той ці іншы рэгіён (афрыканістыка, балканістыка і г. д.), народ (беларусазнаўства, русістыка, сіналогія і г. д.) ці групу народаў (славяназнаўства).

Устанаўленне заканамернасцей гістарычнага развіцця дасягаецца шляхам выяўлення і даследавання фактаў, падзей і працэсаў. Канкрэтна-гістарычны, факталагічны матэрыял з’яўляецца базай гістарычнай навукі, а калі яго няма, то і няма гісторыі як навукі. У сілу сваёй спецыфікі гісторыя адказвае на пытанні аб тым, што, калі, дзе, чаму і пры якіх абставінах адбылося, якія этапы прайшло ў сваім развіцці і чым стала сёння з пункту гледжання гістарычнага вопыту. Гісторыя не адказвае на пытанне аб тым, што было б, калі б тая ці іншая падзея (напрыклад, Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., Другая сусветная вайна 1939 – 1945 гг. і г. д.) не адбылася, бо гэтага ніхто не ведае і гэта не з галіны гістарычнай навукі, а з галіны гаданняў, прадказанняў і таму падобнага, да чаго навука не мае ніякага дачынення. Гісторыя – гэта тое, што было, а не тое, што магло быць.

Гісторыя – складаная, шматгаліновая навука аб прошлым, зведаным, аб тым, калі ўзнікла чалавечая цывілізацыя на нашай Планеце, якія этапы яна прайшла ў сваім развіцці, які агульнацывілізацыйны вопыт набыла і як яна крочыць у будучыню сёння.

Напісаная гісторыкамі і выпушчаная ў свет кнігавыдаўцамі, гісторыя павінна насіць пазітыўны характар, уключаць у сябе станоўчы, творчы зарад, выхоўваць у чытача высокія духоўныя і маральныя якасці і перш-наперш любоў да Айчыны, пачуццё гордасці за краіну і народ, гатоўнасць да здзяйснення добрых спраў у імя краіны і яе квітнення. Кожны грамадзянін, кожны школьнік і студэнт, які вывучыў курс гісторыі, павінен разумець, што будучае краіны і народа, будучае кожнага чалавека заключана ў прошлым, у нашай гісторыі. Напрыклад, Рэспубліка Беларусь стала суверэннай дзяржавай не толькі і не столькі дзякуючы таму, што ў канцы XIX – пачатку XX ст. нацыянальныя дзеячы Беларусі рабілі спробу стварыць нацыянальную дзяржаўнасць на буржуазнай аснове, а дзякуючы таму, што ў 1919 г. была створана Беларуская ССР, у якой у складзе СССР быў створаны магутны вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны і інтэлектуальны патэнцыял, які з’явіўся базай, фундаментам суверэннасці сённяшняй Беларусі. Пагэтаму

гісторыя перыяду, калі БССР уваходзіла ў склад СССР, павінна разглядацца намі з патрыятычных пазіцый, насіць пазітыўны характар.

Гістарычная праўда ўяўляе сабой камбінаваную, многапланавую, многагранную ісціну. Калі з гэтага складанага фарміравання (многагранніка) вылучыць толькі адну грань, паднесці яе блізка да вачэй і закрыць ёю астатнія грані, то мы атрымаем не веды, а аднабаковую, неаб'ектыўную, ненавуковую інфармацыю. Мы не ўбачым шырокай панарамы гістарычных падзей, гістарычнага працэсу ў цэлым, гістарычнай творчасці мільёнаў людзей. Некаторыя вучоныя з гістарычнага працэсу 20 – 50-х гадоў XX ст. наўмысна, у мэтах дыскрэдытацыі сацыялізму вырываюць толькі адну грань – палітычныя рэпрэсіі і да гэтага зводзяць усю гісторыю.

Але ж у тыя гады была здзейснена грандыёзная сацыялістычная індустрыялізацыя, створаны буйныя калектыўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Ажыццёўленая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў сапраўдная культурная рэвалюцыя не мае аналагаў і сёння, бо ў свеце, прадстаўнікі "залатога мільярда" якога любяць хваліцца сваёй цывілізаванасцю, 1,2 млрд. чалавек не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць.

А між тым ужо да канца 30-х гадоў XX ст. Савецкі Саюз адносіўся да ліку 3 – 4 краін свету, якім была даступна вытворчасць усіх вядомых тады чалавецтву відаў прамысловай прадукцыі. СССР разам з іншымі саюзнымі дзяржавамі перамог гітлераўскую Германію і яе сатэлітаў і пазбавіў чалавецтва ад карычневай чумы фашызму. У пасляваенныя гады Савецкі Саюз з краіны індустрыяльна-аграрнай ператварыўся ў буйнейшую індустрыяльную дзяржаву свету з магутным вытворча-эканамічным і навукова-тэхнічным патэнцыялам, стаў адной са звышдзяржаў свету. У 1954 г. у Савецкім Саюзе была створана першая ў свеце атамная электрастанцыя, у 1957 г. запушчаны першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі, у 1961 г. здзейснены першы ў свеце пілатуемы палёт грамадзяніна СССР Ю.А. Гагарына ў космас. Быў запушчаны ў космас беспілотны карабель "Буран" і здзейснена яго пасадка, арганізавана работа ў космасе навуковай станцыі "Мір".

Адказваючы на навязаную міжнародным імперыялізмам гонку ўзбраенняў, Савецкі Саюз у 1949 г. пераадолеў манаполію ЗША на ядзерную зброю, стварыўшы першую ў краіне атамную бомбу. Хутка была пераадолена таксама манаполія ЗША на тэрмаядзерную зброю, створана першая ў краіне вадародная бомба. Савецкі Саюз стварыў лепшыя ў свеце комплексы і сістэмы ўзбраенняў, у тым ліку ракетна-ядзерных і ракетна-касмічных, забяспечваючы існаванне біпалярнага свету, надзейную абараназдольнасць сваю і сваіх саюзнікаў, парытэт палітычных і ваенных сіл паміж дзвюма звышдзяржавамі (СССР і ЗША) і дзвюма ваенна-палітычнымі блокамі (Арганізацыя Варшаўскага Дагавору і НАТА). Гэта – ***па-першае***.

***Па-другое***, у СССР былі забяспечаны бясплатная адукацыя і медыцынскае абслугоўванне, што трэба разглядаць як агульнацывілізацыйныя дасягненні. Кожны грамадзянін СССР меў рэальную магчымасць атрымаць бясплатнае

жыллё, амаль бясплатную пуцёўку ў санаторый, пансіянат, дом адпачынку. Пастаянна раслі заработная плата і іншыя прыбыткі насельніцтва пры нязменнасці і стабільнасці рознічных цэн на тавары і паслугі, што рабіла апошнія даступнымі для шырокіх колаў народа.

***Па-трэцяе***, у галіне культуры была здейснена сапраўдная культурная рэвалюцыя. Яшчэ ў 20 – 30-я гады XX ст. была ліквідавана масавая непісьменнасць дарослага насельніцтва, а ў 50 – 60-я гады дасягнута поўная пісьменнасць усяго насельніцтва. Беларуская ССР стала рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. У 20 – 30-я гады ў БССР было ажыццёўлена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне, у 50 – 60-я гады – сямігадовае навучанне, а ў 70 – 80-я гады – усеагульнае навучанне моладзі за курс сярэдняй школы. Сапраўдны расцвет атрымала савецкая навука і культура. Беларускі народ стаў адным з інтэлектуальных народаў свету. Дзякуючы росту яго агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню, дасягненні айчыннай і сусветнай культуры зрабіліся даступнымі для шырокіх мас працоўных.

Гэтыя і многія іншыя факты гісторыі, дасягненні СССР і БССР маюць не мясцовае, не нацыянальнае, а сусветна-гістарычнае, агульнацывілізацыйнае значэнне. Гаварыць аб “гістарычным краху Расіі” у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі, аб “гістарычным тупіку”, аб “няўдалым сацыялым эксперыменце бальшавікоў” і г. д. – значыць займацца міфатворчасцю, выконваць палітыка-ідэалагічны заказ з тым, каб людзі, асабліва моладзь, забыліся пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, нічога не ведалі аб савецкім дзяржаўным і грамадскім ладзе, аб дасягненнях СССР і БССР у сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і духоўнай сферах.

Ход гісторыі мае глыбінны сэнс, які цяжка вызначыць, але які з’яўляецца больш значным за ўсе нашы думкі і разважанні аб гісторыі. Да 1941 г., напрыклад, ніхто не мог нават уявіць сабе, што краіне і яе народу прыйдзецца весці вайну за сваё існаванне на планеце з магутнай ваеннай машынай, якая ўключыла ў сябе амаль усе рэсурсы Еўропы. Але ход гісторыі ва ўсёй яе паўнаце магчымасць вайны неяк прадбачыў: павялічваўся хуткімі тэмпамі вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны, абаронны і духоўны патэнцыял савецкага грамадства. Калі б гэтага не было – не было б і Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Вызначыць гэты глыбінны сэнс хода гісторыі – задача ў першую чаргу прафесіянальных гісторыкаў, навукоўцаў, грамадскасці.

**Перыядызацыя гісторыі Беларусі.** Курс “Гісторыя Беларусі” ахоплівае гісторыю Айчыны ад старажытных часоў да нашых дзён. Ён адлюстроўвае гісторыю той часткі чалавецтва, якая на працягу тысячагоддзяў насяляла тэрыторыю сучаснай Беларусі.

Чалавечае грамадства на тэрыторыі Беларусі прайшло наступныя перыяды свайго развіцця.

***Старажытнае грамадства.*** Яго храналагічныя рамкі – 40 тыс. гадоў да н.э. – V ст. н.э. Гэты перыяд падзяляецца на 3 этапы: каменны век (40 тыс. гг.

да н.э. – 2 тыс. гг. да н.э.); бронзавы век (каля 2 тыс. гг. да н.э. – пачатак 1 тысячагоддзя да н.э.); жалезны век (пачатак 1 тысячагоддзя да н.э. – V ст. н.э.).

***Сярэднявечча*** – канец V – XV ст. Выдзяляюцца 2 этапы: пачатак пераходу да класавага грамадства і ўзнікненне дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі (канец V – перш. пал. XIII ст.); развіццё феадальнай сістэмы (сярэдзіна XIII – XV ст.).

***Новы час*** – XVI – пачатак XX ст. Падзяляецца на 2 этапы: афармленне феадальнай сістэмы і выспяванне яе крызісу (XVI – канец XVIII ст.); генезіс і зацвярджэнне капіталізму, выспяванне крызісу буржуазнага грамадства (канец XVIII ст. – 1917 г.).

***Навейшы час*** – з 1917 г. – да нашых дзён.

**Крыніцы па гісторыі Беларусі.** Гісторыя Беларусі вывучаецца на падставе даных разнастайных гістарычных крыніц. ***Гістарычныя крыніцы*** – пісьмовыя дакументы і рэчавыя прадметы, якія непасрэдна адлюстроўваюць гістарычны працэс і даюць магчымасць вывучаць прошлае чалавечага грамадства. Гістарычная дысцыпліна, якая распрацоўвае тэорыю і методыку вывучэння і выкарыстання гістарычных крыніц (у асноўным пісьмовых), называецца ***крыніцазнаўствам***.

Гістарычныя крыніцы падзяляюцца на 6 асноўных груп: археалагічныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, вусныя, пісьмовыя і кіна-фота-фона. Асабліва важнае значэнне маюць пісьмовыя крыніцы. Сярод іх – ***заканадаўчыя акты*** (“Русская Правда” XI ст.; дагаворы Русі з грэкамі 907, 911 і 914 гг.; прывілеі, якія выдаваліся вялікімі князямі літоўскімі і каралямі Рэчы Паспалітай, а таксама агульназемскія і абласныя прывілеі; Судзебнік Казіміра 1468 г.; Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг.; уніі Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай; законы, маніфесты, палажэнні, указы, рэскрыпты ўрада Расійскай імперыі; акты заканадаўчых і выканаўчых органаў БССР і СССР, Рэспублікі Беларусь і г. д.

Да пісьмовых крыніц адносяцца ***матэрыялы справаводства***. Гэта – “Литовская метрика” – дзяржаўны архіў Вялікага княства Літоўскага; сеймавыя матэрыялы XVI – XVIII стст. (напрыклад, “Дзённік Люблінскага сейма 1569 г.”); матэрыялы судовых устаноў Вялікага княства Літоўскага (актавыя кнігі); дакументацыя дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў, банкаў, а таксама палітычных партый і грамадска-палітычных арганізацый мінулага і сучаснага.

Спецыфічны тып дакументаў прадстаўляе комплекс ***эканоміка-геаграфічных***, ***гаспадарчых*** і ***статыстычных апісанняў XVI – XX стст.*** Сярод іх гаспадарчыя апісанні XVI – XIX стст. (пісцовыя кнігі, інвентары); эканоміка-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні канца XVIII – XIX ст. (матэрыялы генеральнага межавання канца XVIII ст., інвентары памешчыцкіх маёнткаў першай паловы XIX ст., ваенна-тапаграфічныя апісанні); пазямельныя даследаванні, ваенна-конскія перапісы, спісы фабрык і заводаў, перапісы насельніцтва (напрыклад, “Первая всеобщая перепись населения Российской

империи 1897 года", усесаюзныя перапісы насельніцтва 1923, 1926, 1937, 1939 гг. і інш.).

Адной з важнейшых гістарычных крыніц з'яўляюцца летапісы. Сярод іх "Аповесць мінулых гадоў" (XII ст.), Лаўрэнцьеўскі, Іпацьеўскі, Радзівілаўскі (Кёнігсбергскі) летапісы, "Летописец великих князей литовских", "Хроника Великого княжества Литовского и Жомойтского", "Хроника Быховца" (XV – XVI стст.), Баркулабаўскі летапіс канца XVI – пачатку XVII ст.

Да гістарычных крыніц адносяцца ***мемуары і дзённікі***. Часта яны з'яўляюцца адзіным сведчаннем, якое дае ўяўленне аб той ці іншай падзеі або факце.

У якасці гістарычных крыніц могуць выкарыстоўвацца і ***літаратурныя творы***. Гераічная, часам трагічная гісторыя беларускага народа яскрава адлюстроўваецца ў творах В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, П. Броўкі, І. Мележа, І. Шамякіна і іншых выдатных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

У Новы і Навейшы час беларускай гісторыі важнае значэнне набыў ***перыядычны друк***. Ён адрозніваецца разнастайнасцю палітычнага спектра і аператыўным распаўсюджаннем інфармацыі аб падзеях і фактах у жыцці Беларусі і за яе межамі.

Асобную і вельмі важную групу гістарычных крыніц складаюць рэчавыя прадметы – прадметы вытворчай гаспадаркі (прадметы і сродкі працы, прадукты вытворчасці) і творы мастацтва (пабудовы, скульптуры, карціны і г. д.). Створаныя людзьмі, яны сведчаць не толькі аб узроўні прафесійнага майстэрства іх аўтараў, але і аб ступені развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры грамадства.

**Гістарыяграфія гісторыі Беларусі.** ***Гістарыяграфія*** (ад слоў *"гісторыя"* і грэч *"grapho"* – пішу) – літаральна апісанне гісторыі, адсюль гістарыёграф (тое ж, што і гісторык). Сэнс гэтага паняцця зводзіцца да наступнага: 1) Гісторыя гістарычнай навукі (накапленне гістарычных ведаў, рознае тлумачэнне гістарычных з'яў, змена метадалагічных накірункаў у гістарычнай навуцы і інш.). 2) Сукупнасць гістарычных даследаванняў, прысвечаных пэўнай эпосе (гістарыяграфія эпохі феадалізму (капіталізму), тэме ці перыяду (гістарыяграфія гісторыі рабочага класа Беларусі XIX – XX стст.), ці сукупнасць гістарычных работ, аб'яднаных агульнымі рысамі: тэарэтычнымі (ліберальна-буржуазная, дэмакратычная, марксісцкая гістарыяграфія і інш.), нацыянальнымі (беларуская, расійская, украінская, польская гістарыяграфія).

Першымі прафесійнымі гісторыкамі, якія заклалі падмурак канцэпцыі беларускай гісторыі, былі прафесары Віленскага універсітэта І. Анацэвіч, М. Баброўскі, І. Даніловіч, Т. Нарбут, Ю. Ярашэвіч і інш. І. Даніловіч упершыню апублікаваў Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г., Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. і іншыя крыніцы па гісторыі Беларусі. Ю. Ярашэвіч апублікаваў фундаментальнае даследаванне "Вобраз Літвы з пункту гледжання цывілізацыі ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст. (Вільня, 1844 –

1845. Т. 1 – 3). Вывучэннем гісторыі Вялікага княства Літоўскага, збіраннем археалагічных крыніц, пошукамі і апрацоўкай матэрыялаў для “Актов Западной России” (СПб., 1846 – 1853. Т. 1 – 5) займаўся І. Анацэвіч.

Браты Я. І К. Тышкевічы з’яўляюцца пачынальнікамі беларускай археалогіі, З. Даленга-Хадакоўскі – заснавальнікам беларускай фалькларыстыкі і мовазнаўства, Т. Нарбут – аўтарам 9-томнай “Гісторыі літоўскага народа” (Вільня, 1835 – 1841), А. Кіркор – вучоным і грамадскім дзеячам, Я. Чачот – збіральнікам і выдаўцам (на польскай мове) народных песень.

Вывучэнне айчыннай гісторыі звязана з імем беларускага археографа І. Грыгаровіча. Ён сабраў і на сродкі графа М.П. Румянцава выдаў “Белорусский архив древних грамот”, быў аўтарам гістарычнага даследавання “Беларуская іерархія” (напісана ў 1824 г., выдадзена ў 1992 г. у Мінску), прымаў удзел у выданні “Актов Западной России”. Аўтарам навуковых твораў “Путешествие по Полесью и Белорусскому краю” (СПб., 1853, 1856) быў пісьменнік-этнограф П. Шпілеўскі. У 1855 г. у Санкт-Пецярбургу М.В. Без-Карніловічам былі выдадзены “Исторические сведения “о примечательных местах Белоруссии…”, тэрыторыю якой ён абмяжоўваў Віцебскай і Магілёўскай губернямі, астатнія беларускія землі называў Літвой.

Важнай вехай у станаўленні і развіцці нацыянальнай гістарыяграфіі з’явілася кніга В. Ластоўскага “Кароткая гісторыя Беларусі”, выдадзеная ў Вільні ў 1910 г. Беларускі гісторык і этнограф М. Доўнар-Запольскі ў 1926 г. падрыхтаваў фундаментальную працу “Гісторыя Беларусі” (выдадзена ў 1994 г. у Мінску). Даследчык і гісторык беларускай мовы, акадэмік Я. Карскі ў 1903 – 1922 гг. выдаў трохтомную працу “Беларусы”, якую называюць энцыклапедыяй беларусазнаўства. Значны ўклад у беларускую гістарыяграфію ўнеслі грунтоўныя даследаванні гісторыкаў, этнографаў і лінгвістаў М. Янчука, А. Слупскага, І. Насовіча, М. Дзмітрыева, М. Федароўскага, Е. Раманава і інш., выдадзеныя ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вучоны-гісторык і дзяржаўны дзеяч Савецкай Беларусі У. Ігнатоўскі выдаў працы па айчыннай гісторыі і манаграфію пра паўстанне 1863 – 1864 гг. Яго “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі” ў 1920-я гады з’яўляўся падручнікам па айчыннай гісторыі для вучняў школ, а “Гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя” вывучалася ў вышэйшых навучальных установах. У 1920-я гады публікаваліся таксама навуковыя працы Ф. Турука, У. Пічэты, А. Цвікевіча, А. Луцкевіча, М. Гарэцкага, З. Жылуновіча і інш. У пачатку 1930-х гадоў некаторыя гісторыкі былі рэпрэсіраваны, а іх працы на доўгі час трапілі ў “спецсховішчы”.

Дэмакратызацыя савецкага грамадства, якая пачалася з другой паловы 1950-х гадоў, садзейнічала далейшаму развіццю беларускай гістарычнай навукі. У 1960 – 1980-я гады выйшлі ў свет манаграфіі, прысвечаныя актуальным праблемам айчыннай гісторыі, а таксама калектыўныя працы – двухтомная “История Белорусской ССР” (1961 г.), пяцітомная “Гісторыя Беларускай ССР” (1972 – 1975 гг.), аднатомная “История Белорусской ССР” (1977 г.).

У 1994 – 1995 гг. Інстытут гісторыі АН Беларусі падрыхтаваў і выдаў (у дзвюх частках) “Нарысы гісторыі Беларусі”, многія раздзелы якіх напісаны тэндэнцыйна і празмерна палітызаваныя.

У 2006 г. выйшла ў свет чацвёртае выданне “Гісторыі Беларусі” (у дзвюх частках), падрыхтаванай гісторыкамі кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі пры ўдзеле гісторыкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта. На сённяшні дзень гэта адзіная ў рэспубліцы вучэбная кніга, якая мае грыф падручніка для студэнтаў устаноў, забяспечваючых атрыманне вышэйшай адукацыі.

У якасці вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў устаноў, забяспечваючых атрыманне вышэйшай адукацыі, выдадзены “Гісторыя Беларусі з 1795 да вясны 1917 г.” (падрыхтавана калектывам гродзенскіх гісторыкаў) (2001 г.), “Гісторыя Беларусі. XIX – XX стагоддзі” (падрыхтавана гісторыкамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта) (2002 г.), “История Беларуси. С древности до наших дней” П.Г. Чыгрынава (2004 г.) і інш.

# РАЗДЗЕЛ I. СТАРАЖЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. ФАРМІРАВАННЕ ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН
## (ад старажытных часоў – да другой паловы XIII ст.)

### § 1. Засяленне беларускіх зямель. Характарыстыка даіндаеўрапейскага перыяду этнічнай гісторыі Беларусі

Чалавек вылучыўся з жывёльнага свету прыблізна два мільёны гадоў таму назад. Гэта адбылося ў Афрыцы. Прыкладна мільён гадоў назад людзі засялілі Міжземнамор’е, а затым Каўказ і поўдзень Украіны. Чалавек з’явіўся на планеце Зямля ў перыяд старажытна-каменнага веку, які ў археалогіі называецца ***палеалітам***. У ніжнім і сярэднім палеаліце жылі людзі, якіх вучоныя назвалі ***піцекантрапамі*** і ***неандэртальцамі***, а ў верхнім палеаліце (прыкладна 40 тыс. гг. назад) сфарміраваўся чалавек сучаснага фізічнага тыпу, якога называюць ***краманьёнцам***.

Калі на Зямлі з’явіліся першыя людзі, на тэрыторыі сучаснай Беларусі чалавек яшчэ доўгі час не пражываў. Першае пранікненне людзей на гэтую тэрыторыю адбылося толькі ў верхнім палеаліце, прыкладна 40 тыс. гадоў таму назад. Пачаўся ***даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі***. Яго храналагічныя рамкі: 40 тыс. гг. да н.э. – 3 – 2 тыс. гг. да н.э.

З верхнім палеалітам звязана ***ледніковая эпоха*** (16 – 8 тыс. гг. да н.э.), калі адбылося некалькі абледзяненняў тэрыторыі сучаснай Беларусі. Магчыма, у час, які папярэднічаў ледніку, магчыма, у межледніковую эпоху, калі адбываліся кароткія пацяпленні, на гэтай тэрыторыі пасяліліся і жылі першыя людзі.

Вядомы дзве самыя старажытныя верхнепалеалітычныя стаянкі чалавека на тэрыторыі Беларусі. Адна з іх – на Прыпяці, каля в. Юравічы, недалёка ад Мазыра, другая – на Сожы, ля в. Бердыж, недалёка ад Чачэрска. На гэтых стаянках пражывала прыблізна 50 чалавек.

Існавала ***раннеродавая абшчына***. Некалькі абшчын аб’ядноўваліся ў ***род***, спачатку мацярынскі. Род быў уласнікам пэўнай тэрыторыі, вёў калектыўную гаспадарку, меў агульную маёмасць. У вельмі цяжкіх умовах жыцця чалавек вымушаны быў навучыцца здабываць агонь, будаваць прымітыўнае жыллё, удасканальваць спосабы палявання на буйных жывёл.

Па меры таяння і адступлення ледніка ў ***сярэднім каменным веку***, ***мезаліце*** (8 – 5 тыс. гг. да н.э.) адбылося поўнае засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі. Засяленне ажыццяўлялася з розных месц і накірункаў рознымі групамі насельніцтва. У далінах буйных рэк з’явілася першая сталае (аўтахтоннае) насельніцтва. На Беларусі вядома 120 мезалітычных стаянак людзей, агульная колькасць насельніцтва складала прыкладна 4,5 – 6 тыс. чалавек.

Для жыцця і побыту людзей была характэрна радавая арганізацыя. Радавыя абшчыны аб’ядноўваліся ў ***плямёны***. Асноўныя прылады працы выраблялiся з

крэмню (крэмніевыя пласціны, сякеры, цяслы, разцы, скрабкі, скоблі), дрэва або касці. Быў вынайдзены лук, які змяніў характар палявання. Памочнікам чалавека на паляванні стаў сабака. Значнае месца займала рыбалоўства.

Каменны век завяршыўся эпохай ***новага каменнага веку – неаліту*** (4 – 3 тыс. гг. да н.э.). На тэрыторыі сучаснай Беларусі выяўлена больш за 500 паселішчаў эпохі неаліту, агульная колькасць насельніцтва складала 27 – 36 тыс. чалавек. Вытворчая гаспадарка яшчэ адсутнічала. Насельніцтва па-ранейшаму займалася збіральніцтвам, паляваннем і рыбнай лоўляй. Акрамя лука на паляванні сталі прымяняць лоўчыя ямы і пасткі. Вынаходніцтва сетак зрабіла рыбалоўства больш надзейнай крыніцай забеспячэння людзей харчаваннем. З’явіліся гліняны посуд, прадзенне і ткацтва. Удасканальваліся прылады працы: сякера, цясла, долата.

Прыкладна ў III тысячагоддзі да н.э. у Падзвінні і Падняпроўі з’явілася фіна-угорскае насельніцтва, а на крайнім паўднёвым захадзе Папрыпяцця – невялікія групы індаеўрапейскага насельніцтва. Пачаўся паступовы пераход да вытворчай гаспадаркі – земляробства і жывёлагадоўлі. Гэты вялікі ў гісторыі чалавецтва гаспадарчы пераварот атрымаў назву ***неалітычнай рэвалюцыі, або першай цывілізацыйнай рэвалюцыі***[1].

Вызначыць этнічную прыналежнасць старажытнага насельніцтва Беларусі ў палеаліце, мезаліце і на працягу большай часткі неаліту няма магчымасці. Мовы гэтага насельніцтва невядомы. Сляды іх не знойдзены. Узнікае пытанне: “Што такое этнас, якія яго прыкметы?”.

***Этнас*** (ад грэч. *ethnos* – племя, народ) – устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі, мае агульную мову, культуру, побыт, псіхалагічныя рысы і самасвядомасць. ***Асноўныя гістарычныя формы этнасу*** – род, племя, народнасць, нацыя. Паняцце “этнас” блізкае да паняцця “народ” у этнаграфічным сэнсе. ***Галоўнымі прыкметамі этнасу*** з’яўляюцца этнічная тэрыторыя, мова, культура, побыт, псіхалагічны склад, самасвядомасць і інш. На паняцці “этнас” грунтуецца значная частка навуковай тэрміналогіі – этнагенез (паходжанне этнасаў), этнонім (назва этнасу) і інш. Навука, якая вывучае бытавыя і культурныя асаблівасці этнасаў, праблемы іх паходжання (этнагенезу), рассялення (этнагеаграфіі) і культурна-гістарычнага ўзаемадзеяння, называецца ***этнаграфіяй (этналогіяй, народазнаўствам)***.

---

[1] ***Другая цывілізацыйная рэвалюцыя*** звязана з прамысловым пераваротам, навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй і стварэннем індустрыяльнага грамадства (XVII – XX стст.), ***трэцяя цывілізацыйная рэвалюцыя*** – з інфармацыйна-тэхналагічным пераваротам у вытворчай гаспадарцы і стварэннем постіндустрыяльнага грамадства (з апошняй чвэрці XX ст. – да нашага часу).

## § 2. Індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі, яго балцкі і славянскі этапы

***Індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі*** пачаўся ў ***бронзавым веку*** з часу рассялення на яе тэрыторыі індаеўрапейскіх плямён. Яго храналагічныя рамкі: 3 – 2 тыс. гг. да н.э. – да нашага часу.

Прыкладна 3 – 2 тыс. гг. да н.э. адбыўся дэмаграфічны выбух, пачалося "вялікае перасяленне народаў". На прасторах Еўропы – ад Рэйна на захадзе да Волгі на ўсходзе, ад Прычарнамор'я на поўдні да Скандынавіі на поўначы – рассяліліся плямёны індаеўрапейскай моўнай групы. Узнікае пытанне: "Дзе знаходзілася прарадзіма індаеўрапейцаў, калі, у выніку якіх прычын пачалася іх міграцыя на прасторы Еўропы і Азіі?".

Існуе некалькі канцэпцый прарадзімы індаеўрапейцаў. Адна з іх – ***канцэпцыя еўрапейскай лакалізацыі***. Згодна з ёю, прарадзімай індаеўрапейцаў з'яўлялася тэрыторыя Паўночнай Германіі і Паўднёвай Скандынавіі. Гэта канцэпцыя сфарміравана нямецкімі вучонымі пад уздзеяннем іх пангерманскіх настрояў. У больш позні час яна атрымала расісцкую афарбоўку і была ўзята на ўзбраенне кіраўнікамі фашысцкай Германіі. Адзінымі сапраўднымі патомкамі індаеўрапейцаў, без аніякіх прымесяў, "чыстымі" арыйцамі (арыямі называла сябе ў старажытнасці адна з усходніх індаеўрапейскіх груповак, якая жыла на тэрыторыі сучаснай Індыі) былі аб'яўлены германскія народы. Аднак вучонымі-археолагамі даказана, што ў Еўропе насельніцтва мігрыравала з поўдня на поўнач, а не наадварот, як бяздоказна сцвярджаюць вучоныя пангерманскага накірунку. Акрамя таго, у Паўночнай Еўропе жывёлагадоўля распаўсюдзілася пазней, чым, напрыклад, на Балканах.

Пагэтаму ўзнікла ў канцы XIX – пачатку XX ст. так званая ***балканская канцэпцыя прарадзімы індаеўрапейцаў***. Яна ў многім давала адказы на тыя пытанні, на якія не адказвала канцэпцыя паўночнаеўрапейскай лакалізацыі індаеўрапейцаў (шляхі міграцыі насельніцтва і распаўсюджвання жывёлагадоўлі ў Еўропе). Але Балканы не з'яўляліся прарадзімай індаеўрапейцаў, а былі толькі адным з накірункаў іх міграцыі на прасторах Еўропы. Але аб гэтым будзе напісана ніжэй.

У якасці прарадзімы індаеўрапейцаў некаторымі даследчыкамі разглядаюцца таксама ***паўднёвыя стэпы Усходняй Еўропы і значныя раёны Сібіры***. Але гэта супярэчыць прынятым у навуцы ўяўленням аб тым, што пачатковая вобласць прарадзімы этнасаў не павінна быць вялікай.

Найбольш навукова абгрунтаванай з'яўляецца ***канцэпцыя пярэднеазіяцкай прарадзімы індаеўрапейцаў***. У адпаведнасці з ёй праіндаеўрапейцы да міграцыі жылі ў Пярэдняй Азіі, там, дзе цяпер знаходзяцца Іран, Ірак, Афганістан. Даныя археалогіі, этнаграфіі, тапанімікі і іншых навук сведчаць аб тым, што праіндаеўрапейцы жылі на поўдні сярод гор. Яны ведалі горныя ледннікі, хуткія горныя рэчкі і горную расліннасць. Іх суседзямі былі семіцкія плямёны і картвельскія народы (продкі грузін). Сярод вядомых ім звяроў былі леў і слон.

У 4 – 3 тысячагоддзі да н.э. пачалася ***міграцыя праіндаеўрапейцаў*** са сваёй прарадзімы. Гэта было абумоўлена бурным развіццём земляробства і жывёлагадоўлі, павелічэннем працягласці жыцця, шчыльнасці і колькасці насельніцтва, перанаселенасцю праіндаеўрапейскімі плямёнамі іх прарадзімы і неабходнасцю асваення новых тэрыторый. Міграцыя індаеўрапейцаў адбывалася на працягу тысячагоддзяў.

Рухаючыся на захад, праіндаеўрапейцы прайшлі Малую Азію, выйшлі да Эгейскага мора, засялілі Балканы, якія з'явіліся адным з накірункаў іх міграцыі. Частка праіндаеўрапейцаў абагнула Чорнае мора, прайшла праз тэрыторыю сучасных Балгарыі, Румыніі і Малдавіі, пасялілася на Правабярэжнай Украіне. Пазней праіндаеўрапейцы пранiклі на Каўказ.

Частка праіндаеўрапейцаў рухалася на ***ўсход*** на тэрыторыю сучасных Кітая і Індыі. Асобная іх група павярнула на ***поўнач***, у Сярэднюю Азію, прайшла паміж Каспійскім і Аральскім морамі, апынулася ў прыволжскіх стэпах і працягвала рух на захад, у Паўночнае Прычарнамор'е. Гэты магутны міграцыйны паток стаў крыніцай рассялення праіндаеўрапейцаў у Еўропе, у тым ліку і ў Беларусі.

Пры сустрэчы з мясцовым насельніцтвам індаеўрапейцы, якія знаходзіліся на больш высокай ступені сацыяльна-эканамічнага развіцця (прынеслі з сабой земляробства і жывёлагадоўлю, кола і калёсны транспарт, пахаванне ў курганах, патрыярхат і інш.), перамагалі яго і асімілявалі. Выключэннем было насельніцтва Індыі і Кітая, якое асімілявала індаеўрапейцаў, за выключэннем невялікай групы арыяў на тэрыторыі Індыі.

З Паўднёва-Усходняй Еўропы і Паўночнага Прычарнамор'я індаеўрапейцы працягвалі міграцыю ў двух накірунках: першы – на захад і паўночны захад, у Заходнюю Еўропу, другі – на поўнач, у Сярэднюю і Паўночную Еўропу. На вялікай тэрыторыі, якая ахоплівала басейны Віслы, Нёмана, Заходняй Дзвіны, Верхняга Падняпроўя, у выніку асіміляцыі мясцовага неалітычнага насельніцтва індаеўрапейцамі сфарміраваўся новы этнас – ***балты*** (літоўцы, латышы, прусы, яцвягі, куршы, земгалы, селы і інш.). Пачаўся ***балцкі этап індаеўрапейскага перыяду этнічнай гісторыі Беларусі***, які храналагічна супадае з ***эпохай металу*** (3 – 2 тыс. гадоў да н.э. – IV – V стст. н.э.). Балты жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі да прыходу сюды славян.

З рассяленнем індаеўрапейцаў змяніўся не толькі этнічны склад насельніцтва Беларусі, але змянілася і эпоха. ***Каменны век уступіў месца бронзаваму веку (3 – 2 тыс. гг. да н.э. – 1 тыс. гг. да н.э.).*** Старажытная эканоміка, заснаваная на паляванні, збіральніцтве і рыбнай лоўлі, паступлова замянялася земляробствам і жывёлагадоўляй. Індаеўрапейцы пакланяліся агню і сонцу, прычым агонь атаясамліваўся з ачышчальнай сілай, з ім асацыіраваўся чырвоны колер. Асноўным тыпам пасяленняў былі ўмацаваныя гарадзішчы, якіх на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 1 тыс. Агульная колькасць насельніцтва ў бронзавым веку магла быць ад 50 да 75 тыс. чалавек.

***Бронзавы век уступіў месца жалезнаму веку (1 тыс. гг. да н.э. – IV – V стст. н.э.).*** Мясцовыя плямёны асвоілі жалезаапрацоўку, вырабы з жалеза былі дастаткова разнастайнымі: сякеры, нажы, сярпы, зброя, упрыгажэнні і г. д.

***Новы, славянскі этап этнічнай гісторыі Беларусі*** пачаўся ў раннім сярэднявеччы. Яго храналагічныя рамкі: IV – V стст. н.э. – да нашага часу.

Калі і адкуль з'явіліся славяне на беларускай зямлі? Дзе іх прарадзіма? Як адбываліся працэсы славянскай міграцыі?

***Ёсць некалькі канцэпцый прарадзімы славян.*** Адны даследчыкі сцвярджалі аб лакалізацыі славян у Прыпяцка-Сярэднедняпроўскім рэгіёне (дзе сёння Беларусь і Украіна), другія вучоныя змяшчалі іх прарадзіму ў Вісла-Одэрскім міжрэччы (дзе сёння Польшча), трэція – на шырокіх прасторах ад Одэра да Дняпра (дзе сёння Беларусь, Польшча і Украіна). Вучоныя пангерманскага накірунку з'яўляюцца аўтарамі так званай канцэпцыі "усходняй лакалізацыі славян", згодна з якой славяне прыйшлі на нашу тэрыторыю з Азіі і паўднёвых стэпаў Усходняй Еўропы, а таму яны – азіяты, дзікія людзі.

Найбольш навукова абгрунтаванай і распаўсюджанай з'яўляецца ***канцэпцыя цэнтральнаеўрапейскай лакалізацыі славян***, паводле якой прарадзімай славян трэба лічыць тэрыторыю паміж Эльбай, Віслай і Нёманам, дзе сёння знаходзяцца Германія, Чэхія, Славакія, Польшча, самыя заходнія раёны Беларусі. У выніку асіміляцыі мясцовага насельніцтва прышлымі індаеўрапейцамі ў III тысячагоддзі да н.э. на гэтай тэрыторыі ўтварылася яшчэ адна галіна індаеўрапейскай мазаікі народаў – славянская (усяго ж налічваецца больш за 40 індаеўрапейскіх народаў).

Да першых стагоддзяў нашай эры славяне ўяўлялі сабой адзінае цэлае. Гісторыкі і пісьменнікі VI ст. ведалі славянскі свет ужо падзеленым на тры часткі – ***венедаў, склавін і антаў***. Готскі гісторык Іордан пісаў: "Яны (венеды)… паходзяць ад аднаго племені, маюць цяпер тры імёны, г. зн. венеды, анты і склавіны". "І некалі нават імя ў славян і антаў было адно і тое ж", – падкрэсліваў візантыйскі гісторык Пракопій Кесарыйскі. Першапачаткова склавіны жылі на захад ад Днястра і ў Прыкарпацці (заходнія славяне), анты – паміж Днястром і Дняпром, а таксама на поўнач ад Азоўскага мора (усходнія славяне), венеды, па Іардану, знаходзіліся на паўночны ўсход ад Карпат, у вярхоўі Віслы (паўднёвыя славяне).

У IV – VII стст. адбылося ***другое "вялікае перасяленне народаў"***. Аднак яго храналагічныя рамкі можна было б пашырыць у абодва бакі. Маштабныя перамяшчэнні плямён (пераважна з усходу) пачаліся яшчэ да н.э. Гэта – рух скіфаў і сарматаў з-за Дона (з тэрыторыі сучасных Казахстана і Сярэдняй Азіі) у Паўночнае Прычарнамор'е, заняцце імі вялікіх прастораў ад Алтая да Дуная. Перамяшчэнні працягваліся пазней. Гэта – міграцыя ў II – пачатку III ст. ***готаў***, аднаго з усходнегерманскіх плямён, з тэрыторыі сучаснай Польшчы (на ўзбярэжжы Балтыйскага мора) праз балоты сучаснай Беларусі на поўдзень сучаснай Украіны (ад Балтыкі да Чорнага мора). Гэта – перамяшчэнне ***гунаў***

з тэрыторыі Манголіі праз сучасны Казахстан і Сярэднюю Азію і выхад да II ст. н.э. да Волгі, паражэнне, нанесенае імі аланам і готам, далейшы рух у Еўропу, заснаванне на тэрыторыі сучаснай Венгрыі Гунскай дзяржавы ў IV – V стст., яе паражэнне ў час паходу супраць Рымскай імперыі, вяртанне гунаў у прычарнаморскія стэпы. Гэта – перамяшчэнні ***германскіх плямён*** на поўдзень і захад, а ўслед за імі ***славян*** ад Эльбы на захадзе і па Усходне-Еўрапейскай раўніне на ўсходзе.

Галоўнымі прычынамі міграцыі славян са сваёй прарадзімы былі наступныя: 1) дэмаграфічная перанаселенасць і вялікая шчыльнасць насельніцтва прывялі славян у рух для пошукаў новых зямель; 2) пагалоўнае ўзбраенне мужчын, іх рэгулярныя грабежніцкія паходы, якія з’яўляліся адным з найбольш лёгкіх, эфектыўных і распаўсюджаных спосабаў узбагачэння: Рымская імперыя – багатая і казачная краіна для грабяжоў; 3) прывабнасць новых зямель для земляробства, якое ў славян дасягнула дастаткова высокага ўзроўню; 4) ціск на славян з боку іншых народаў (германцаў, кельтаў, авараў і інш.).

Са сваёй прарадзімы частка славян пачала масавы рух на поўдзень і ў VII – VIII стст. засяліла Балканы, землі сучаснай Югаславіі, Балгарыі, часткова Грэцыі. Некаторыя групы славян дайшлі да Малой Азіі, Іспаніі, Сіцыліі, Паўночнай Афрыкі. У працэсе асіміляцыі смуглатварага фракійскага насельніцтва ўтварылася галіна славян, якіх называюць ***паўднёвымі славянамі (былыя венеды)***. Сёння гэта – балгары, сербы, харваты, славенцы, македонцы і інш.

Другая частка славян са сваёй прарадзімы рухалася на ўсход, дайшла да Дняпра і ў VI – VII стст. на тэрыторыі сучаснай украінскай Валыні і Паўднёвай Беларусі (на поўдзень ад Прыпяці) сфарміравалася новая галіна славян – ***усходнія славяне (былыя анты)***. У VI – VIII стст. усходнія славяне праніклі на паўднёварускія стэпы, каланізавалі міжрэчча Волгі і Акі, выйшлі да Дона, Ладажскага возера, Невы і Нарвы. Яны асімілявалі мясцовае балцкае, фіна-угорскае і цюркскае насельніцтва. Усходнія славяне сёння – гэта беларусы, рускія і ўкраінцы.

Што датычыць ***заходніх славян*** (сёння гэта – палякі, чэхі, славакі і сербы-лужычане), то яны засталіся на сваёй прарадзіме, нікуды не мігрыравалі і ні з кім не змешваліся. Гэта – ***былыя склавіны***.

Паводле даных заходнееўрапейскіх, арабскіх і візантыйскіх крыніц, славяне адрозніваліся высокім ростам, моцным складам цела, вялікай вынослівасцю, цёмна-русым (рыжаватым) колерам валасоў. Прастадушныя, прыветлівыя і гасцінныя ў дамашняй абстаноўцы, славяне на вайне непрымірымыя і бязлітасныя да ворага: воінаў і жыхароў-мужчын забівалі зброяй (коп’ямі, мячамі і інш.), секлі галавы, садзілі на кол, распіналі на крыжы, білі батогамі па галаве, “иных, запёрши вместе с быками и овцами, … безжалостно сжигали”.

У VI – VII стст. славяне пачынаюць пранікаць у балцкі арэал. У VIII – IX стст. пачынаецца масавае рассяленне славян на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Спачатку славяне рассяліліся на правым беразе Дняпра і на Бярэзіне, затым пранiклі ў Падзвінне і Падняпроўе, а ў X ст. рассяліліся ў Верхнім Панямонні. Большая частка балцкага насельніцтва была асімілявана, другая – знішчана ці выціснута на паўночны захад, у Прыбалтыку, дзе прыняла ўдзел у фарміраванні этнічных латышоў і літоўцаў. Трэцяя частка балцкага насельніцтва працягвала жыць на сваіх былых месцах, іх асіміляцыя славянамі працягвалася да XII – XIII стст. і нават пазней.

У выніку славяна-балцкага ўзаемадзеяння ўзніклі новыя этнічныя супольнасці, якія ўпамінаюцца ў сярэдневяковых крыніцах. Да ліку такіх супольнасцей на тэрыторыі сучаснай Беларусі адносіліся ***крывічы***, ***дрыгавічы***, ***радзімічы***. У іх асяроддзі не было сацыяльнай роўнасці, з'явілася палітычнае кіраванне і свае князі. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы ўяўлялі сабой не плямёны ці саюзы плямён, як сцвярджалася ў літаратуры раней, а ***протанароднасці*** (народнасці, якія пачыналі фарміравацца). Іх дзяржаўныя ўтварэнні называюць ***протадзяржавамі*** (дзяржавы, якія пачыналі стварацца).

Вялікая патрыярхальная радавая абшчына, якая стваралася па роднаснаму прынцыпу, саступае месца суседскай (тэрытарыяльнай) абшчыне, што складалася з асобных малых сем'яў усяго паселішча, гарадзішча (цяпер, сказалі б, вёскі). Апошняя станавілася асноўнай сацыяльнай арганізацыяй усходніх славян і пазней стала называцца ***сялянскай абшчынай***. Крывічы, дрыгавічы, радзімічы – не непасрэдныя продкі беларусаў, а этнічныя супольнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў IX – першай палове XII ст.

## § 3. Узнікненне Беларусі: розныя падыходы і канцэпцыі

Адным з самых складаных у гісторыі Беларусі з'яўляецца пытанне: як і калі з раней названых славянскіх, славяна-балцкіх супольнасцей і іншых груп насельніцтва сфарміравалася беларуская народнасць, як узнікла Беларусь? Адказаць на гэтыя пытанні адназначна нельга. Справа ў тым, што ў навуцы няма адзінай думкі наконт гэтых праблем. Адны даследчыкі сцвярджаюць, што беларусы як этнас ужо існавалі ў XIII ст., а працэс фарміравання беларускай народнасці пачаўся яшчэ ў VII – VIII стст. (Г. Штыха ў, М. Ермаловіч, М. Ткачоў і інш.). Паводле У. Сядова, беларуская этнічная супольнасць склалася ў XIII – XIV стст. М. Грынблат лічыць, што фарміраванне беларусаў адбывалася ў XIV – XVI стст. Ёсць іншыя меркаванні.

Няма адзінага погляду і на пытанні аб продках беларусаў. Узнікла мноства канцэпцый, якія ўзаемавыключаюць адна адну. У XIX ст. з'явіліся ***польская і велікаруская канцэпцыі***, якія адмаўлялі існаванне самастойнага беларускага этнасу на той падставе, што ў насельніцтва Беларусі быццам не было самастойнай славянскай мовы. Прыхільнікі польскай канцэпцыі (Л. Галембоўскі, А. Рыпінскі і інш.) лічылі беларускую мову дыялектам польскай мовы, а беларусаў – часткай польскага этнасу. Творцы велікарускай

канцэпцыі (А. Сабалеўскі, І. Сразнеўскі і інш.) сцвярджалі, што Беларусь – частка велікарускай этнічнай тэрыторыі, а беларуская мова – дыялект рускай мовы.

Памылковасць гэтых канцэпцый выяўлена даследаваннямі па беларускай мове. Яшчэ ў пачатку XX ст. выдатны беларускі славіст Я. Карскі ў фундаментальнай працы "Беларусы" (Варшава; Петраград. 1903 – 1922. Т. 1 – 3) пераканаўча даказаў, што беларуская мова з'яўляецца самастойнай славянскай мовай, якая паводле свайго лексічнага складу, сінтаксісу, фанетыкі і марфалогіі ўваходзіць у групу ўсходнеславянскіх моў нароўні з велікарускай і ўкраінскай.

У пачатку XX ст. з'явілася ***крывіцкая канцэпцыя***. Яе аўтарамі былі М.Пагодзін, В.Ластоўскі і інш. Яна заснавана на памылковым уяўленні аб тым, што продкамі беларусаў з'яўляюцца крывічы. Аўтары канцэпцыі атаясамлівалі беларусаў і крывічоў і прапаноўвалі называць беларусаў крывічамі, а Беларусь – Крывіяй. Памылковасць гэтай канцэпцыі заключаецца ў тым, што крывічы займалі толькі паўночную і цэнтральную частку тэрыторыі сучаснай Беларусі. А як жа ўзнікла паўднёвабеларускае насельніцтва? На гэта пытанне крывіцкая канцэпцыя адказу не дае. Няма ў данай канцэпцыі тлумачэння і таго, чаму на частцы тэрыторыі, якую займалі крывічы, пазней сфарміравалася велікаруская народнасць. Аднак самая вялікая памылка крывіцкай канцэпцыі выяўляецца ў храналагічнай неадпаведнасці знікнення крывічоў і з'яўлення беларускага этнасу. Крывічы зніклі да сярэдзіны XII ст., а беларусы як этнас да гэтага часу яшчэ не сфарміраваліся.

Аднабаковасць крывіцкай канцэпцыі вырашылі пераадолець вядомы беларусазнаўца Я.Карскі, гісторык-славіст У.Пічэта, даследчык этнічнай гісторыі Беларусі М. Грынблат, вядомы гісторык М.Доўнар-Запольскі. Яны ўключылі ў склад продкаў беларусаў не толькі крывічоў, але таксама дрыгавічоў і радзімічаў. Адсюль і назва канцэпцыі – ***крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая***. Аднак і гэта канцэпцыя, як і папярэдняя, не ўлічвае таго факта, што дрыгавічы і радзімічы, як і крывічы, зніклі да сярэдзіны XII ст., калі агульнабеларускі этнічны комплекс яшчэ не сфарміраваўся.

Асаблівую папулярнасць набыла ***балцкая*** тэорыя этнагенезу беларусаў. Паводле гэтай тэорыі, змяшэнне славян з даславянскім насельніцтвам – балтамі – прывяло да з'яўлення беларускага этнасу. Балты, такім чынам, адыгралі ролю субстрату (падасновы) у этнагенезе беларусаў. Аўтар гэтай тэорыі археолаг В. Сядоў робіць выснову на падставе таго, што шмат элементаў беларускай культуры і мовы маюць балцкае паходжанне. Аднак В. Сядоў не ўлічыў таго, што гэтыя элементы ўласцівы як славянам, так і балтам. Яны індаеўрапейскага паходжання. Балты з'явіліся продкам, субстратам не непасрэдна беларусаў, а ўсходнеславянскіх супольнасцей – крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў.

Існуе і ***фінская канцэпцыя*** паходжання беларусаў. Яе аўтарам з'яўляецца пісьменнік І.Ласкоў. На падставе таго, што на тэрыторыі Беларусі ёсць назвы рэчак і азёраў фінскага паходжання (Дзвіна, Свір і інш.), ён лічыць, што

продкамі беларусаў маглі быць і фіны. Для такой высновы няма навуковых падстаў. Фінамоўнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі жыло ў глыбокай старажытнасці і было асімілявана не славянамі, а старажытнымі балтамі, якія рассяліліся ў Панямонні, Падзвінні і Падняпроўі ў бронзавым веку. Фіны на тэрыторыі Беларусі з'явіліся субстратам не беларусаў, а старажытных балтаў.

У 50-я гады XX ст. савецкі этнограф С. Токараў абгрунтаваў ***новую канцэпцыю***. Яе сутнасць заключаецца ў наступным. У выніку змешвання розных супольнасцей – крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, драўлян, палян, вяцічаў і іншых – у Сярэднім Падняпроўі ў IX – X стст. у межах Кіеўскай Русі сфарміравалася новая ўсходнеславянская этнічная супольнасць – ***старажытнаруская народнасць***. У другой палове X ст. зацвердзілася і агульная назва гэтай тэрыторыі – Русь. Сярэдняе Падняпроўе стала звацца Рускай зямлёй, кіеўскія князі – рускімі князямі. Затым у працэсе распаду Кіеўскай Русі раз'ядналася і старажытная народнасць. У выніку ўтварыліся тры роднасныя народы: рускі, беларускі і ўкраінскі.

Аднак у гэтай канцэпцыі з'явілася шмат апанентаў (Г. Штыхаў, М. Ермаловіч, М. Ткачоў і інш.). Без дастатковых навуковых абгрунтаванняў яны сцвярджаюць, што ніякай старажытнарускай народнасці не існавала, што не магло быць ніякага падзелу неіснуючай агульнарускай народнасці на тры галіны – беларускую, рускую і ўкраінскую. Уся справа ў тым, на якой тэрыторыі пасяліліся плямёны і з якім карэнным насельніцтвам (субстратам) адбылося змяшэнне. Так, рускі этнас фарміраваўся на аснове фіна-угорскага субстрату, украінскі – цюрскага, беларускі – балцкага. Памылковасць гэтых поглядаў заключаецца ў тым, што ў выніку асіміляцыі, змяшэння прышлых славян з фіна-угорскім, цюркскім і балцкім насельніцтвам сфарміраваліся новыя славянскія этнічныя супольнасці (усяго каля 15) – крывічы, дрыгавічы, радзімічы, славене, паляне, драўляне, валыняне, улічы, ціверцы і іншыя, а не руская, украінская і беларуская народнасці. Фарміраванне гэтых народнасцей адбылося не ў IX – X стст., а значна пазней.

У пачатку 90-х гадоў XX ст. ***новую канцэпцыю ўзнікнення беларусаў*** распрацаваў гісторык-этнограф М. Піліпенка (Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. Мн., 1991). Ён лічыць, што ў выніку шырокага рассялення славян і змешвання іх з усходнімі балтамі ўтварыліся не беларусы, а першапачатковыя ўсходнеславянскія этнічныя супольнасці крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Гэта адбылося ў IX – X стст. Затым у канцы X – пачатку XI ст. разам з іншымі ўсходнеславянскімі супольнасцямі крывічы, дрыгавічы і радзімічы кансалідаваліся ў новую агульнаславянскую этнічную супольнасць. Для яе былі характэрны агульнаўсходнеславянская мова, агульная матэрыяльная і духоўная культура. З трансфармацыяй гэтых першапачатковых этнічных славянскіх супольнасцей у агульнаславянскую старажытную супольнасць іх тэрыторыі сталі агульнай этнічнай тэрыторыяй, якая атрымала назву “Русь”. Менавіта з гэтага часу ў дачыненні да тэрыторыі Беларусі, як і да

суседніх усходнеславянскіх зямель, пачала ўжывацца назва “Русь”, а насельніцтва стала называцца русамі, русічамі, русінамі, рускімі.

З часу свайго фарміравання этнічная тэрыторыя “Русь” не была аднастайнай. Яна падзялялася на рэгіёны, якія не супадалі з ранейшымі этнічнымі тэрыторыямі першапачатковых усходнеславянскіх этнічных супольнасцей. Тэрыторыя сучаснай Беларусі па лакальных асаблівасцях мовы і культуры ўваходзіла ў дзве дыялектна-этнаграфічныя зоны агульнаўсходнеславянскай этнічнай супольнасці – папрыпяцка-палескую і падзвінска-дняпроўскую. Акрамя агульнай назвы “Русь”, за паўднёвай часткай тэрыторыі Беларусі замацавалася назва “Палессе”, за цэнтральнай і паўночнай – “Белая Русь”. У паўднёвай папрыпяцка-палескай зоне на аснове трансфармацыі дрыгавічоў, драўлян і паўднёвай часткі радзімічаў ішоў працэс складвання новай этнічнай супольнасці – ***палешукоў***, у паўночным (падзвінска-дняпроўскім) рэгіёне ў выніку трансфармацыі крывічоў, вяцічаў і паўночных радзімічаў – ***старажытных беларусцаў***. Піліпенка лічыць, што менавіта палешукі і беларусцы сталі непасрэднымі продкамі беларусаў.

З цягам часу, адзначае М. Піліпенка, у выніку інтэнсіўных этнічных працэсаў на аснове ўзаемадзеяння, узаемапранікнення, згуртавання дзвюх значных груп (папрыпяцка-палескай і падзвінска-дняпроўскай) усходнеславянскага насельніцтва, з аднаго боку, і змяшэння, кансалідацыі іх з асобнымі групамі неўсходнеславянскага насельніцтва – заходнеславянскага (польскага), балцкага і цюркскага (татарскага), з другога, на шырокай тэрыторыі, размешчанай паміж Прыпяццю на поўдні і Заходняй Дзвіной на поўначы, Нёманам на захадзе і Дняпром на ўсходзе, у канцы XV – сярэдзіне XVI ст. сфарміраваліся новы комплекс культуры і звязаная з ім сістэма мовы. Усё гэта сведчыла аб з’яўленні новай, усходнеславянскай этнічнай тэрыторыі, якая атрымала з таго часу сваю назву “Белая Русь”, а яе жыхары атрымалі назву “беларусы”.

## § 4. Паходжанне назваў “Белая Русь” і “Чорная Русь”

Паходжанне назвы “Белая Русь” канчаткова не высветлена. Наконт гэтага існуе шмат думак і версій. Адны аўтары паходжанне назвы “Белая Русь” звязваюць з прыгажосцю зямлі, чысцінёй рэк і блакітнасцю азёр, мноствам снегу, незалежнасцю ад татара-манголаў і літоўскіх князёў (“белая” у дадзеным выпадку – вялікая, незалежная, вольная, свабодная), другія – са светларусымі валасамі і блакітнымі вачыма жыхароў (бландзіны). Маюцца і іншыя тлумачэнні: назва “Белая Русь” паходзіць ад белага колеру адзення, якое “при дворе царском в почтении было”, ці ад белага колеру світак, сукенак і кашуль, якія насілі жыхары гэтых зямель. Тэрмін “Белая Русь” звязваецца таксама з шырокім распаўсюджваннем у тапаніміцы назваў са словам “белая” і г. д.

Упершыню тэрмін “Белая Русь”, як пісаў рускі гісторык В.М. Тацішчаў, упамінаецца ў летапісах у 1135 г. у дачыненні да зямель Паўночна-Усходняй Русі (Уладзіміра-Суздальскага княства). Гэта тэрыторыя ад вярхоўяў Заходняй

Дзвіны і Волгі да вярхоўяў Нёмана. Яна ўключала ў свой склад Маскоўскі, Цвярскі, Смаленскі, Мсціслаўскі, Друцкі край. Вялікі князь Растова-Суздальскай зямлі Андрэй Багалюбскі з 1157 г. называўся князем Белай Русі. Сваім баярам ён гаварыў: "Я всю Белую (Суздальскую) Русь городами и сёлами великими населил и многолюдной учинил". Як бачна, ужо ў XII ст. частка сучаснай беларускай этнічнай тэрыторыі (Мсціслаўскі і Друцкі край) уваходзіла ў склад зямель, якія называліся "Белай Руссю".

У канцы XV – пачатку XVI ст. тэрмін "Белая Русь" па-ранейшаму ўжываўся для абазначэння Маскоўскай (Рускай) дзяржавы. Вялікі князь Маскоўскі Іван III насіў тытул князя "усея Велікыя і Белыя Русі". Паводле М.М. Карамзіна, "исчисляя в титуле своём все особенные владения государства Московского, Иоан наименовал оное Белою Россиею…".

У старажытнай усходняй традыцыі асноўныя колеры атаясамліваліся са старанамі свету: белы – з захадам, блакітны – з усходам, чорны – з поўначчу, чырвоны – з поўднем. Пагэтаму невыпадкова тэрыторыя старажытнай Русі дзялілася на "Белую Русь", "Чорную Русь" і "Чырвоную Русь".

У XVI – XVII стст. назва "Белая Русь" пасля некаторых блуканняў па прасторах славянскага свету паступова замацоўваецца за Падзвіннем і Падняпроўем. Амаль кожны іншаземец, які наведваў упершыню ўсходнюю частку сённяшняй Беларусі (Падзвінне і Падняпроўе), звяртаў увагу на пануючы тут паўсюдна белы колер адзення – ад світак і кажушкоў да мужчынскіх нагавіц і шапак-магерак.

Аднак у XVI – XVII стст. у розных гістарычных крыніцах назва "Белая Русь" сустракаецца не толькі ў дачыненні да Усходняй Беларусі, але і ў дачыненні да Ноўгарадскай і Пскоўскай зямель, а таксама да ўсходняй Украіны. Напрыклад, у "Хроніцы Еўрапейскай Сарматыі", напісанай італьянцам А. Гваньіні ў 1578 г., які быў на вайсковай службе ў Віцебску, сказана: "А ёсць Русь траякая: адна Белая, другая Чорная, трэцяя Чырвоная. Белая – каля Кіева, Мазыра, Мсціслаўля, Віцебска, Оршы, Полацка, Смаленска і зямлі Северскай… Чорная – у Маскоўскай зямлі каля Белага возера і далей усюды да Азіі. Чырвоная – каля гор, якія называюцца Бескідамі… Пад тымі гарамі паветы Галіцкі, Перамышльскі, Саноцкі, а ў сярэдзіне вядомы горад Львоў". Гэта адпавядае той усходняй традыцыі, калі зямля, размешчаная на Захадзе, называецца Белай, на поўначы – Чорнай, на поўдні – Чырвонай.

Разам з тым у прадмовах і пасляслоўях да кніг Ф. Скарыны (пачатак XVI ст.) тэрмін "Белая Русь" не сустракаецца. Землі сваёй радзімы Ф. Скарына называў тэрмінам "Русь" ("братия моя Русь"), які на працягу некалькіх стагоддзяў існаваў побач з назвай "Белая Русь" і даволі часта атаясамліваўся з ёй.

З сярэдзіны XVI ст. тэрмінам "Белая Русь" сталі абазначаць не толькі землі падзвінска-падняпроўскага рэгіёна (традыцыйная "Белая Русь"), але і цэнтральнага, папрыпяцка-палескага рэгіёнаў, ці землі сучаснай Цэнтральнай і Усходняй Беларусі. Беларусцамі называлі цяпер не толькі жыхароў падзвінска-падняпроўскага рэгіёна, але і людзей, якія пражывалі на ўсёй тэрыторыі ад

Заходняй Дзвіны да Прыпяці. Побач з формай "беларусцы" у дакументах сустракаецца і сучасная форма этноніма беларускага народа – "беларусы".

Польскі пісьменнік, гісторык і публіцыст С. Старавольскі ў кнізе "Польшча ці апісанне становішча каралеўства Польскага" (1632 г.) адносіў да Белай Русі 6 ваяводстваў: Навагрудскае, Мсціслаўскае, Віцебскае, Мінскае, Полацкае і Смаленскае. Урад Рускай дзяржавы ў XVII ст. Белай Руссю лічыў Полацкую, Віцебскую, Мсціслаўскую і Смаленскую землі. Астатнія беларускія землі ён называў літоўскімі.

Адначасова ішоў працэс фарміравання мовы Белай Русі, г. зн. беларускай мовы. Яе ўзнікненне было вынікам змяшэння, перапляцення паўночных (падзвінска-дняпроўскіх) і паўднёвых (папрыпяцкіх) элементаў гутарковай мовы ўсходнеславянскага насельніцтва. Гэта мова многімі асаблівасцямі фанетычнай сістэмы, граматычнага ладу і слоўнікавага складу адрозніваецца ад рускай і ўкраінскай. Да гэтых асаблівасцей належыць спалучэнне такіх элементаў, як цвёрдае "р" і "ч", мяккае "д" (дзеканне), аканне. З'явіліся т. зв. сярэднебеларускія гаворкі, якія ўвабралі ў сябе паўночныя і паўднёвыя элементы. Што датычыцца мовы паўночнай зоны падзвінска-дняпроўскага рэгіёна (Пскоўшчына, Цвярскі край, Смаленшчына), дык яна ў значнай ступені склалася пад уплывам суседніх паўночных і ўсходніх гаворак, распаўсюджаных у межах Маскоўскай дзяржавы. Тут пачалі фарміравацца гаворкі велікарускай мовы. Ва ўсходніх раёнах Беларусі разам з мяккім "д", з'явілася і цвёрдае "д", а дзе-нідзе і "оканне". У паўднёвай зоне вялікі ўплыў на беларускую мову зрабіла ўкраінская мова.

***Такім чынам, у другой палове XVI – XVII ст. сфарміравалася агульная назва ўсходняй і цэнтральнай часткі беларускай этнічнай тэрыторыі – "Белая Русь" і агульная назва (этнонім) яе жыхароў – беларусы. Прыкладна ў гэты ж час уся этнічная тэрыторыя ўсходнеславянскага насельніцтва Маскоўскай дзяржавы (у тым ліку Пскоўшчына, Цвярскі край, Смаленшчына) стала называцца Вялікай Руссю ці Расіяй.***

Заходнюю частку беларускай этнічнай тэрыторыі доўгі час называлі ***"Чорная Русь"***. Паводле звестак В.М. Тацішчава, граніца Чорнай Русі на поўначы даходзіла да р. Віллі, на ўсходзе – прыкладна да Бярэзіны, на поўдні – да Прыпяці, на захадзе – да Буга. Назва "Чорная Русь" у айчынных крыніцах упамінаецца не раней апошняй чвэрці XIII ст. (1284). Першапачаткова гэта назва не адносілася да заходняй часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі. Так называлася частка тэрыторыі сучаснай Украіны, тагачасная Галіцкая зямля. У заходнееўрапейскіх пісьмовых помніках назва "Чорная Русь" сустракаецца не раней XIV – XV стст. і ўжываецца для абазначэння самых заходніх зямель Русі, якія гранічылі з Лівоніяй, Літвой і Польшчай.

Як назва заходняй часткі беларускай этнічнай тэрыторыі (у прыватнасці, Беларускага Панямоння) тэрмін "Чорная Русь" пачынае замацоўвацца ў канцы XVI – XVII ст. Як сцвярджае В.М. Тацішчаў, назва "Чорная Русь" для абазначэння заходняй часткі сучаснай Беларусі сустракаецца ў граматах цара

Аляксея Міхайлавіча пасля таго, як ён авалодаў часткай Рэчы Паспалітай. У граматах Аляксей Міхайлавіч называецца "гасударам усёй Вялікай, Малой, Белай, Чорнай і Чырвонай Русі".

Назва заходняй беларускай этнічнай тэрыторыі "Чорная Русь" тлумачыцца па-рознаму. Часцей за ўсё яе разглядалі як супрацьпастаўленне назве "Белая Русь". Некаторыя вучоныя (С. Салаўёў) лічылі, што першапачаткова назва "Чорная Русь" абазначала залежную тэрыторыю. Чорны колер разглядаецца прыхільнікамі гэтай канцэпцыі як сімвал залежнасці, белы – як сімвал самастойнасці. У адносінах да Беларускага Панямоння такое тлумачэнне нельга прызнаць абгрунтаваным. Назва гэтага краю "Чорная Русь" замацавалася тады, калі ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі ўжо знаходзілася ў складзе Вялікага княства Літоўскага, а затым і Рэчы Паспалітай, і з палітычнага пункту погляду значнай розніцы паміж заходняй і ўсходняй часткамі гэтых тэрыторый не было.

Некаторыя даследчыкі лічаць, што з'яўленне назвы "Чорная Русь" выклікана тым, што для Верхняга Панямоння было характэрна язычніцтва, а для Падняпроўя – хрысціянства. Але і з такім пунктам погляду нельга поўнасцю пагадзіцца таму, што ў перыяд замацавання гэтага тэрміна амаль усё насельніцтва, як усходнеславянскае, так і балцкае было ўжо хрысціянскім. Хрысціянскія цэрквы ў гарадах Верхняга Панямоння былі пабудаваны не пазней, чым у гарадах сучаснага Беларускага Падняпроўя. Што датычыцца некаторых груп нехрысціянскага, язычніцкага балцкага насельніцтва, якое пражывала ў Верхнім Панямонні, то Руссю яно не называлася. Для іх наймення ўжываўся іншы тэрмін – "Літва".

Нельга пагадзіцца з думкай польскага этнолага Яна Быстраня аб тым, што назву "Чорная Русь" Верхняе Панямонне атрымала ад цёмнага (чорнага) колеру скураных лапцей, якія насілі тутэйшыя жыхары. Наўрад ці такая незначная акалічнасць магла стаць падставай для вызначэння назвы цэлага рэгіёна.

Заслугоўвае ўвагі наступнае тлумачэнне гэтай назвы. Назва "Чорная Русь" была дадзена балтамі. Згодна з балцкай традыцыяй, чорны колер сімвалізуе Захад, а белы – Усход. У сувязі з гэтай традыцыяй самую заходнюю частку Русі, г. зн. Верхняе Панямонне, сталі называць Чорнай Руссю, а ўсходнюю, г. зн. Падняпроўе, – Белай Руссю. Першапачаткова гэтыя назвы абазначалі геаграфічныя напрамкі. З цягам часу яны сталі азначаць два арэалы беларускай этнічнай тэрыторыі і сімвалізаваць этнаграфічныя асаблівасці паміж яе заходняй і ўсходняй часткамі.

З канца XVIII ст. са знікненнем Вялікага княства Літоўскага і далучэннем беларускіх зямель да Расійскай імперыі назва "Чорная Русь" паступова выходзіла з ужытку, а назва "Белая Русь" распаўсюджвалася на ўсю беларускую этнічную тэрыторыю. Прычым гэта назва набывала ў рускай мове сваю заходнееўрапейскую форму – "Белоруссия". У беларускай мове захоўвалася старая ўсходнеславянская форма гэтай назвы. Яна стала вымаўляцца і пісацца разам – "Беларусь".

Разам з тым за заходняй часткай сучаснай Беларусі доўгі час захоўвалася яшчэ адна назва – “Літва”, а за яе жыхарамі – назва “ліцвіны”. Вядома, што ў XI – XIII стст. усходняя частка сучаснай Літвы, дзе сёння знаходзіцца Вільнюс, называлася Аўкштайціяй, а заходняя, дзе сёння размяшчаецца Каўнас, – Жэмайціяй. Літва ў XI – XIII стст., як лічаць некаторыя даследчыкі, знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі – паміж Мінскам і Новагародкам. Пазней у сувязі з перанясеннем сталіцы дзяржавы з Новагародка ў Вільню (каля 1323 – 1326 гг.) назва “Літва” з Верхняга Панямоння пачала пастунова распаўсюджвацца на тэрыторыю Аўкшайціі і Жэмайціі і замацоўвацца за імі. Працэс замацавання назвы “Літва” за тэрыторыяй сучаснай Літвы завяршыўся прыкладна ў XVI ст.

Адначасова яшчэ цэлыя стагоддзі “Літвой” працягваў называцца заходні рэгіён сучаснай Беларусі. У Магілёўскай хроніцы пад 1695 г. гаворыцца аб тым, што літоўскае пагранічча праходзіла недалёка ад Мінска і Слуцка. Дзекабрыст А. Бястужаў, жывучы ў 1821 г. на тэрыторыі сучаснага Валожынскага раёна, даў у Пецярбург такі свой адрас: “Литва, д. Выганичи, в 40 верстах от Минска”. А. Міцкевіч (1798 – 1855), які нарадзіўся каля Навагрудка, сваю айчыну называў Літвой (“Litwo! Ojczyzno moja!”). Ураджэнец Гродзеншчыны К. Каліноўскі, рэвалюцыйная дзейнасць якога прыпадае на 60-я гады XIX ст., як правіла, называў родны край Літвой.

У XIX ст. яшчэ афіцыйна захоўваўся падзел беларускай этнічнай тэрыторыі на Беларусь і Літву, беларускія і літоўскія губерні. Аўтары “Жывапіснай Расіі” (1882 г.) да беларускіх губерняў адносілі Віцебскую, Магілёўскую, Мінскую і Смаленскую губерні, да літоўскіх губерняў – Гродзенскую, Віленскую і Ковенскую губерні. Яшчэ ў сакавіку 1918 г., калі падпісваўся дагавор паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, сучасны Брэст меў назву “Брэст-Літоўскі”. І толькі ў першай палове XX ст. назва “Беларусь” распаўсюдзілася на ўсю беларускую этнічную тэрыторыю, а ранейшая назва “Літва” канчаткова замацавалася за тэрыторыяй літоўскіх правінцый Аўкштайціі і Жэмайціі і выйшла з ужытку ў дачыненні да беларускай этнічнай тэрыторыі.

***Такім чынам, на працягу XIX – пачатку XX ст. тэрмін “Белая Русь” пашырыўся на ўсю беларускую этнічную тэрыторыю і набыў сучаснае гучанне – “Беларусь”.***

## § 5. Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь) – агульная раннефеадальная дзяржава-манархія ўсходніх славян

Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы было падрыхтавана ўсім ходам сацыяльна-гістарычнага развіцця ўсходнеславянскіх зямель у VI – IX стст. Існуе тры групы ўнутраных і знешніх прычын утварэння гэтай дзяржавы. ***Першая з іх – сацыяльна-эканамічныя прычыны***, звязаныя з развіццём земляробства і жывёлагадоўлі, рамяства і гандлю.

Старажытнай формай земляробства ў лясных раёнах была ***вогневая падсечная*** сістэма. На пэўным участку высякалі лес, калі дрэвы падсыхалі, іх спальвалі, угноеную попелам зямлю апрацоўвалі і засявалі. Праз два – тры гады ўчастак пакідалі і выпальвалі (асвойвалі) новы. Апрацоўвалі зямлю з дапамогай сахі і рала з жалезным наканечнікам. У далейшым з'яўляюцца рала з полазам, саха з прысашнікам (лапаткай для пераварочвання зямлі). У якасці цяглавай сілы пачынаюць выкарыстоўвацца коні. Усё гэта сведчыць аб перамозе ворыўнага земляробства.

Развіваліся таксама ***рамяство і гандаль***. З вылітай сталі кавалі рабілі мячы, нажы, кінжалы, шаблі, коп'і, а таксама напільнікі, пілы, ножніцы, стамескі, зброю. Цэнтрамі мясцовага гандлю былі гарадзішчы – пагосты і племянныя "грады". Важную ролю ў развіцці знешняга гандлю іграў так званы шлях "з вараг у грэкі". Ён пачынаўся на паўночным беразе Фінскага заліва, ішоў Невой, Ладажскім возерам, Волхавам, Ільмень-возерам з яго ракой Ловаццю, потым волакам на Заходнюю Дзвіну, з яе волакам на Днепр, далей Дняпром і Чорным морам да Канстанцінопаля. Сталі з'яўляцца гарады як цэнтры рамяства і гандлю.

Развіццё земляробства і жывёлагадоўлі, а таксама гарадоў, рамяства і гандлю патрабавала еднасці славянскіх зямель. Удасканальваць вытворчую гаспадарку, паглыбляць эканамічныя сувязі, фарміраваць міжгаспадарчыя адносіны на аснове прынцыпа "куплі-продажу", авалодваць унутраным і знешнім рынкам і атрымліваць прыбыткі можна было больш паспяхова ў рамках адзінай дзяржавы.

***Другая група прычын звязана з унутрыпалітычным развіццём усходнеславянскіх зямель.*** Працэсы славянізацыі краю і неабходнасць падпарадкавання мясцовага балцкага, фіна-угорскага і цюркскага насельніцтва, з'ўленне мясцовых князёў ("княжанняў") і сацыяльнай няроўнасці, захоп мясцовай знаццю зямель сваіх супляменнікаў і стварэнне зямельных уладанняў – вотчын (іменняў феадалаў), збор даніны з насельніцтва, прымус залежных сялян працаваць у гаспадарках землеўладальнікаў – усё гэта патрабавала фарміравання інстытута феадальнага права і сістэмы феадальных адносін, узмацнення палітычнай улады і вайсковай сілы феадалаў, іх яднання. Унутрыпалітычная сітуацыя ўзмацняла зацікаўленасць феадалаў і падштурхоўвала іх да стварэння адзінай дзяржавы.

***Трэцяя група прычын звязана са знешнепалітычнымі абставінамі.*** Неабходнасць абароны славянскіх зямель ад нападзення з боку суседніх дзяржаў і ад набегаў з боку авараў, печанегаў, полаўцаў і іншых ваяўнічых вандроўнікаў, пераадолення спусташальных міжкняжацкіх усобіц выклікала ўнутраны пратэст і фарміравала грамадскасцю думку на карысць яднання. Урэшце-рэшт гэта прывяло да аб'яднання ваенных, эканамічных і людскіх рэсурсаў і стварэння вялікай і магутнай дзяржавы – Кіеўскай Русі.

Складальнік "Аповесці мінулых гадоў" расказвае аб існаванні ў усходніх славян да ўтварэння Старажытнарускай дзяржавы шэрагу самастойных

мясцовых княстваў. Паляне мелі сваё княства на чале з Кіем, "а в древлях (у древлян) свое, в дреговичи свое, а словени свое в Новгороде, а другое на Полоте иже полочане". Мясцовыя княжанні ўяўлялі сабой пачатковую форму дзяржаўнасці на Русі ці протадзяржавы. Славене, крывічы і мера плацілі даніну нарманам (варагам)[2], якія рабілі частыя спусташальныя набегі на іх землі, а вяцічы, радзімічы, северане і нейкі час – паляне плацілі даніну хазарам, якія стварылі моцнае цюркскае дзяржаўнае ўтварэнне з цэнтрам у нізоўі Волгі.

У сучаснай гістарыяграфіі тэрмінам "Кіеўская Русь" абазначаецца раннефеадальная дзяржава – манархія ўсходніх славян на чале з вялікім князем кіеўскім. Яна ўзнікла ў выніку аб'яднання двух усходнеславянскіх дзяржаўных утварэнняў – "Куявы" (палітычны саюз палян, северан і вяцічаў, цэнтр – Кіеў) і "Славіі" (чудзь, славене, мера, крывічы, цэнтр – Ноўгарад) і якая існавала ў IX – XII стст. на тэрыторыі, блізкай да шляху "з варяг у грэкі".

Гісторыя Старажытнарускай дзяржавы пачынаецца з 862 г., калі, як сведчыць летапіс, чудзь, славене і весь накіравалі сваіх паслоў за мора – да варагаў, каб аб'явіць ім сваё рашэнне. "Зямля наша вялікая і багатая, а парадку ў ёй няма. Прыходзьце княжыць і валодаць намі". "І абраліся трое братоў са сваімі родамі, і ўзялі з сабою ўсю русь, і прыйшлі да славян, і сеў старэйшы Рурык у Ноўгарадзе, … Сінеус – на Белавозеры, … Трувар – у Ізборску". Адсюль і пачынаецца дынастыя Рурыкавічаў у рускай гісторыі.

Летапіснае паданне аб прызванні на Русь варагаў стала падставай для ***нарманскай тэорыі***, згодна з якой нарманы (варагі) з'яўляліся заснавальнікамі Старажытнарускай дзяржавы. Гэта тэорыя была сфармулявана яшчэ ў 2-й чвэрці XVIII ст. Г.З. Байерам, Г.Ф. Мілерам і інш. Яе адвяргалі М.В. Ламаносаў, Д.І. Ілавайскі, С.А. Гедзеонаў і іншыя расійскія вучоныя.

У сучаснай гістарыяграфіі даказана, што ўтварэнне Кіеўскай Русі было падрыхтавана ўсім папярэднім ходам сацыяльна-гістарычнага развіцця ўсходніх славянскіх зямель. Беларускі гісторык і археолаг Э.М. Загарульскі пераканаўча даказвае, што мясцовыя княжанні былі ў славян яшчэ да прызвання варагаў, а таму пачатак дзяржаўнасці на Русі заклалі зусім не нарманы. На аснове археалагічных матэрыялаў ён таксама сцвярджае, што да другой паловы IX ст. усходнія славяне яшчэ не паспелі рассяліцца да Ільменя і Белавозера, а летапісныя крывічы – гэта балцкія плямёны. Атрымліваецца, што варагаў маглі запрасіць на Русь неславянскія народы поўначы Усходняй Еўропы. Больш таго запрашэнні на княжанне былі звычайнай практыкай у эпоху сярэднявечча і не яны вызначалі характар дзяржаўных утварэнняў.

У 882 г. Алег (па летапісу – сваяк Рурыка, які правіў пасля яго Ноўгарадам за малалетняга сына Ігара Рурыкавіча) разам з воінамі-варагамі і дружынамі славен, крывічоў, чудзі, меры, весі зрабіў паход на поўдзень, узяў Смаленск, Любеч і прыйшоў да Кіева, дзе правілі Аскольд і Дзір. Выдаўшы сябе за купца,

[2] ***Нарманы*** (ад скандынаўскага *northman* – паўночны чалавек) – скандынавы, удзельнікі гандлёва-грабежніцкіх і заваявальных паходаў у Еўропе ў канцы VIII – сярэдзіне XI ст. Ва ўсходніх славян яны называліся варагамі, у самой Скандынавіі – вікінгамі.

які ідзе з таварам у Візантыю, Алег забіў іх і зрабіў Кіеў сталіцай аб'яднанай дзяржавы ("мати градом руских"). Значыць, Аскольд і Дзір былі прадстаўнікамі мясцовай дынастыі. А калі б яны былі варагамі, тады навошта з імі ваяваць, тым больш іх забіваць?

Сеўшы на прастол у Кіеве, ***Алег*** пачаў будаваць крэпасці як апорныя пункты для ўпраўлення і збора даніны, а таксама абароны рубяжоў Русі ад ворагаў. Ільменскія славене і крывічы былі абкладзены пастаяннай данінай. Алег падпарадкаваў і абклаў данінай драўлян, северан і радзімічаў, якія да гэтага плацілі даніну хазарам. Значыць, ёсць падставы гаварыць аб руска-хазарскай вайне пры Алегу.

У 907 г. ён зрабіў паспяховы паход на Візантыю. Высадзіўшыся з караблёў на бераг, русы спустошылі наваколле Канстанцінопаля. Візантыйскі імператар вымушаны быў заплаціць кантрыбуцыю і даць купцам русаў гандлёвыя прывілеі.

Пасля смерці Алега кіеўскім князем стаў ***Ігар***. Ён падавіў паўстанне супраць Кіева ў зямлі драўлян, завяршыў пачатае пры Алегу падпарадкаванне і ўключэнне ў склад Старажытнарускай дзяржавы ўлічаў (жылі на Дняпры, на поўдзень ад палян) і ціверцаў (жылі па Днястру да ніжняга цячэння Дуная). У 941 і 944 гадах Ігар зрабіў паходы на Візантыю. Здзяйсняліся таксама марскія паходы ў Закаўказзе, у багатыя краіны Паўднёвага і Заходняга Прыкаспія.

Апошнім актам у дзейнасці Ігара быў яго паход у зямлю драўлян за данінай. Даніна ў той час з'яўлялася асноўнай крыніцай існавання князя і яго дружыны. Сабраўшы вялікую даніну з драўлян, Ігар, падбухтораны сваімі дружыннікамі, вырашыў, што гэтага мала. Ён адпусціў дружыну і з невялікай яе часткай вярнуўся, "желая больша именья". Гэта выклікала абурэнне ў драўлян. Яны схапілі Ігара каля горада Іскарасцень і казнілі яго, прывязаўшы нагамі да двух сагнутых бяроз, якія, выпраміўшыся, разадралі цела Ігара на дзве часткі.

***Княгіня Ольга*** адпомсціла драўлянам за смерць свайго мужа. Яе дружыны разбурылі і спалілі многія гарады драўлян, у тым ліку цэнтр "деревской земли" Іскарасцень, знішчылі мясцовую знаць і князя драўлян Мала. Ольга ліквідавала мясцовыя княжанні і стварыла ўсюды сваю адміністрацыю. Пры ёй збор даніны быў уладкаваны. Замест палюддзя, калі князь разам з дружынай аб'язджаў падначаленыя яму землі і збіраў з іх у неабмежаваных памерах даніну, былі ўстаноўлены нормы даніны – "урокі" і створаны цэнтры, дзе знаходзіліся княжацкія мужы, ведаўшыя яе зборам. Сюды прывозілася даніна насельніцтвам прылеглай акругі. Даніна бралася з "дыма" (гаспадаркі) ці "рала" (плуга).

Сын Ігара ***Святаслаў*** правіў да 972 г. Выдатны палкаводзец і буйны палітычны дзеяч свайго часу, Святаслаў усё жыццё правёў на баявым кані і амаль не ведаў паражэнняў. Пад яго кіраўніцтвам дружыны русаў ваявалі на вялікіх прасторах ад Акі да Каўказа і ад Волгі да Адрыянопаля. Ён, як правіла, не нападаў на ворага знянацку, а папярэджваў яго: "Хочу на вы ити". Такімі, па словах летапісу, былі і яго воіны.

У выніку паходаў Святаслава на Усход Кіеў падпарадкаваў сабе вяцічаў, Волжскую Балгарыю, разграміў хазарскі каганат, пашырыў і ўмацаваў свае ўладанні на Паўночным Каўказе і ў Крыму. Ажыццяўляў паходы супраць Дунайскай Балгарыі і Візантыі, меў намер стварыць руса-балгарскую дзяржаву і перанесці сваю сталіцу на бераг Дуная. Вяртаючыся з паходу, Святаслаў быў забіты на дняпроўскіх парогах печанегамі.

***Уладзімір I ("Красное Солнышко")*** завяршыў падпарадкаванне Кіевам усходнеславянскіх зямель, пасадзіў сваіх 12 сыноў у гарадах усходніх славян, увёў хрысціянства на Русі, пачаў умацаванне паўднёвых граніц краіны для абароны ад вандроўнікаў. Гэта садзейнічала ўмацаванню адзінства Кіеўскай Русі. У X ст. яна прасціралася ад Карпат на захадзе да Акі і верхняй Волгі на ўсходзе і ад Балтыйскага мора на поўначы да Чорнага мора на поўдні.

Разам з тым пастаянна адбываліся войны князёў-сваякоў за кіеўскі прастол. Спроба князёў уладкаваць свае адносіны на з'ездзе ў Любечы ў 1097 г. прывяла да фактычнага раздраблення Кіеўскай Русі. У першай палове XII ст., пасля непрацяглага ўзмацнення цэнтральнай улады кіеўскага князя ***Уладзіміра II (Манамаха)***, Кіеў паступова губляе сваё дамінуючае становішча. У 30-я гады XII ст. Кіеўская Русь як адносна адзіная дзяржава прыпыніла сваё існаванне.

***У апошні час некаторымі беларускімі гісторыкамі адмаўляецца факт існавання Старажытнарускай дзяржавы***, сцвярджаецца, што ў гэтай дзяржаве не было адзінства ўсходніх славян, агульнай пісьмовай мовы, культуры, агульных дасягненняў у гаспадарчай дзейнасці, горадабудаўніцтве, духоўным жыцці. Пры гэтым спасылаюцца на незалежнасць Полацкага княства ад Кіева. Кіеўская Русь – выдумка гісторыкаў.

***З гэтым нельга пагадзіцца па наступных абставінах:***

а) Любое феадальнае княства, у тым ліку і Полацкае, з'яўлялася свайго роду дзяржавай, бо мела ўсе атрыбуты заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады. Толькі на беларускай зямлі княстваў можна налічыць больш дзесяці і кожнае з іх у пэўным сэнсе было незалежным. Міжкняжацкая барацьба з'яўлялася агульнай заканамернасцю развіцця дзяржаў Еўропы ранняга сярэднявечча. Аднак, нягледзячы на гэта, усе княствы Кіеўскай Русі як унутры яе, так і яе суседзямі ўспрымаліся як адзіная Русь. Насельніцтва гэтай Русі ў суседніх краінах называлі русамі, русінамі, русічамі, а самі русіны зваліся людзьмі рускай веры ці мясцовымі назвамі-этнонімамі – кіеўлянін, палачанін, туравец, пінянін, наўгародзец і г. д. Значыць, усходнеславянскае адзінства, адзіная дзяржава існавалі.

б) Аналіз гістарычных крыніц паказвае, што Полацкая зямля ніколі не выпадала з палітычнага жыцця Русі, была часткай Старажытнарускай дзяржавы. Разам з іншымі рускімі князямі полацкія князі ўдзельнічалі ў паходах супраць Літвы, чудзі, стэпавых вандроўнікаў, а пазней – крыжакоў. Полацкі князь Брачыслаў Ізяслававіч усё жыццё ваяваў сумесна са сваім дзядзькам Яраславам Мудрым. Сумесна з паўднёварускімі князямі ваяваў з

вандроўнікамі і Усяслаў Чарадзей. Дорага абышлося палачанам іх адмаўленне ў 1129 г. ад такой акцыі. Полацкіх князёў пазбавілі княжацкіх прастолаў і выслалі ў Візантыю.

Войны ж з Кіевам нярэдка былі справакаваны самімі полацкімі князямі і не былі такімі "частымі і спрадвечнымі", як пішуць некаторыя гісторыкі. Сярод такіх войн – разгром у 1021 г. войск Брачыслава Полацкага кіеўскім князем Яраславам Мудрым за нападзенне і спусташэнне ім Ноўгарада; пакаранне ў 1067 г. трыма Яраслававічамі князя Усяслава Чарадзея за руйнаванне ім Пскова і Ноўгарада; асада ў 1116 г. кіеўскім князем Уладзімірам Манамахам Мінска за спаленне мінскім князем Глебам Слуцка. Больш таго, наследнікі Усяслава Чарадзея ваявалі адзін з адным больш, чым з Кіевам. У выніку полацкія князі страцілі ўсе заваяванні ў Прыбалтыцы, а па полацкіх вуліцах пазней прайшліся нямецкія крыжакі.

в) Пасля ўвядзення хрысціянства ў Х ст. у Кіеўскай Русі функцыяніравала адзіная праваслаўная вера, якая і сёння часткай беларусаў завецца як руская. Царква садзейнічала ўмацаванню ідэі адзінства Русі, адзіных асноў у духоўнай і палітычнай сферах, усведамленню насельніцтвам сваёй прыналежнасці да адзінага народа, сваіх адзіных каранёў і агульнага гістарычнага лёсу.

г) Практычна адзіным быў агульны тып горада, яго планіроўка, знешні і ўнутраны выгляд, лад жыцця. Адзінай для ўсіх княстваў была старажытнаруская пісьмовая мова. Дастаткова параўнаць пісьмовыя помнікі Кіева, Полацка, Турава, Ноўгарада часоў Ефрасінні Полацкай, каб упэўніцца, што не існавала мовы крывічоў і дрыгавічоў, палачан і тураўцаў, а існавала адзіная старажытнаруская мова. А хіба тры храмы Сафіі ў Кіеве, Полацку і Ноўгарадзе не сведчаць пра ўсходнеславянскае адзінства? Пералік агульнасцей можна прадоўжыць.

Разам з тым Кіеўская Русь з'яўлялася спецыфічнай раннефеадальнай дзяржавай. Яна не была адзіным, цэнтралізаваным, маналітна злітым дзяржаўным утварэннем. Кіеўская Русь сфарміравалася як федэрацыя феадальных княстваў, кожнае з якіх захоўвала адносную самастойнасць і самабытнасць. У землях драўлян, вяцічаў, крывічоў і радзімічаў дзейнічалі мясцовыя княжацкія дынастыі. ***Кіеўскую Русь можна назваць феадальнай федэратыўнай дзяржавай-манархіяй з моцнай ваеннай арганізацыяй***, што дазваляла абараняць яе ад спакусаў суседніх дзяржаў і набегаў з боку ваяўнічых вандроўнікаў, рабіць заваявальныя паходы ў суседнія багатыя краіны і трымаць пэўны часу падпарадкаванні мясцовых князёў і баяр, схільных да сепаратызму. Эканамічныя і этнічныя сувязі ў гэтай дзяржаве наўрад ці можна лічыць трывалымі.

## § 6. Полацкае і Тураўскае княствы – першыя раннефеадальныя дзяржавы-манархіі на тэрыторыі Беларусі

Самым буйным і магутным княствам на тэрыторыі Беларусі ў раннім сярэднявеччы з'яўлялася ***Полацкае княства***. Яно ўтварылася ў сярэднім

цячэнні Заходняй Дзвіны ў IX – X стст., займала ўсю Паўночную Беларусь і межавала на поўначы з Ноўгарадскай зямлёй, на ўсходзе – са Смаленскай, на поўдні – з Турава-Пінскай, на захадзе і паўночным захадзе – з землямі літоўска-латышскіх плямён. Полацкае княства займала звыш трэці тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Прыблізна ў той час, калі на Русь былі запрошаны варагі, у Полацку існавала мясцовая княжацкая дынастыя, правы якой захоўваліся на працягу многіх пакаленняў. Пры Алегу ў ліку падданых Кіева пісьмовыя крыніцы называюць і крывічоў, на якіх ён наклаў даніну. Паход на Візантыю ў 907 г. Алег здзейсніў з удзелам крывічоў і радзімічаў. У дагаворы Алега з Візантыяй сярод іншых гарадоў, якія мелі права на даніну, упамінаецца і Полацк. Як саюзнікі Кіева, полацкая знаць і мясцовыя князі абапіраліся на вялікага кіеўскага князя.

Пры пераемніках Алега – Ігары, Вользе і Святаславе – залежнасць Полацка ад Кіева паступоава слабела. У апошняй чвэрці X ст. княжыў Рагвалод, які “трымаў Полацкую зямлю і правіў ёй”. Гэта сведчанне адноснай самастойнасці Полацка.

Пасля гібелі вялікага князя кіеўскага Святаслава Ігаравіча паміж яго сынамі Яраполкам і Уладзімірам успыхнула барацьба за кіеўскі прастол. Першы сядзеў у Кіеве, другі – у Ноўгарадзе. Магчыма, з мэтай набыць сабе магутнага саюзніка, абодва браты – Яраполк і Уладзімір – дамагаліся рукі дачкі Рагвалода Рагнеды. Маладыя князі паслалі сватоў да полацкай княжны. Летапіс паведамляе: Рагнеда, даведаўшыся, што Уладзімір быў сынам Святаслава і нявольніцы, не захацела стаць жонкай рабыніча і з пагардай адказала так: “Не хочу разути рабынича, я за Ярополка иду”. Калі Уладзіміру перадалі адказ Рагнеды, ён у 980 г. пайшоў паходам на Полацк, разбіў полацкае войска, горад зруйнаваў, забіў Рагвалода і яго двух сыноў, а Рагнеду гвалтоўна забраў у Кіеў і прымусіў стаць яго жонкай.

Паданне гаворыць пра тое, што Рагнеда спрабавала адпомсціць Уладзіміру за сваю знявагу, смерць бацькі і братоў. Яна вырашыла забіць Уладзіміра, калі той спаў, але спроба не ўдалася. Ён раптам прачнуўся і схапіў яе за руку. Калі Уладзімір узяў меч, каб засекчы гордую палачанку, на абарону маці таксама з мячом у руках стаў іх малалетні сын Ізяслаў. Гэты маленькі абаронца так уразіў Уладзіміра, што ён пабудаваў новы горад Ізяслаў (цяпер – Заслаўе бліз Мінска) і паслаў туды Рагнеду і Ізяслава на жыхарства.

Але гэта не была толькі ссылка. Уступаючы полацкаму баярству, Уладзімір вымушаны быў аддаць Рагнедзе яе “отчину” – Полоцкую зямлю і пасадзіць там на княжанне свайго малалетку Ізяслава. Іменна ў гэты час, пасля хрышчэння Русі кіеўскі князь накіроўваў другіх сваіх сыноў у буйныя гарады ў якасці намеснікаў. Ізяслаў стаў не толькі полацкім князем, але і заснавальнікам новай дынастыі Ізяславічаў. Разам з тым полацкіх князёў летапісы часта звалі Рагвалодавымі ўнукамі.

У XI ст. Кіеўская Русь падзялілася на тры часткі на чале з Кіевам, Полацкам і Ноўгарадам, якія сапернічалі паміж сабой. Фактычна ж захаваліся на Русі толькі дзве княжацкія галіны: сын Уладзіміра – ***Яраслаў Мудры*** ў Кіеве і праўнук Рагвалода – ***Брачыслаў Ізяслававіч*** у Полацку.

У той час, калі іншыя рускія землі пераходзілі паводле старшынства да нашчадкаў Яраслава Мудрага, Полацк устойліва знаходзіўся ў руках мясцовага княжацкага роду і не ўдзельнічаў у барацьбе за кіеўскі прастол. Чаму? Таму што нашчадкі Ізяслава Уладзіміравіча юрыдычна страцілі права на гэты прастол. Вядома, што ў аснове старажытнага права спадчыннасці на Русі ляжаў прынцып старэйшынства, згодна з якім княства мог наследаваць любы з Рурыкавічаў у парадку старшынства. Гэта значыць, што не сын наследаваў бацьку, а наступны па ўзросту брат бацькі. Пры гэтым старэйшы ў родзе мог заняць толькі той прастол, на якім сядзеў яго бацька. Ізяслаў памёр раней за свайго бацьку – кіеўскага князя Уладзіміра. Дзеці і ўнукі Ізяслава ўжо ніколі не маглі быць кіеўскімі князямі.

З імем Брачыслава звязана вайна з Ноўгарадам і кіеўскім князем Яраславам. У 1021 г. Брачыслаў раптоўна напаў на Ноўгарад, заняў горад, захапіў маёмасць жыхароў і палонных. Аднак на рацэ Судаміры яго чакаў з войскам Яраслаў. У бітве на рацэ Судаміры Брачыслаў пацярпеў паражэнне і збег у Полацк. Далей падзеі развіваліся даволі дзіўна. Яраслаў не пайшоў на Полацк, а запрасіў да сябе на перагаворы Брачыслава і прапанаваў яму: “Будзе же со мною за один”. Брачыслаў згадзіўся і атрымаў за гэта два гарады – Віцебск і Усвят. Кіеўскі князь, як мяркуюць даследчыкі, выступіў у ролі арбітра ў спрэчцы Полацка і Ноўгарада, носьбіта вярхоўнай улады на Русі, дзе Полацк і Ноўгарад з’яўляюцца састаўнымі часткамі адной дзяржавы і падпарадкоўваюцца яму. Магчыма, Яраславу патрэбнай была ваенная дапамога Брачыслава ў яго паходах супраць Літвы, але гэтага летапісец не ўдакладняе.

Найбольшай магутнасці Полацкае княства дасягнула пры ***Усяславе Брачыслававічу (1044 – 1101)***. Летапісы паведамляюць, што князь шмат працаваў дзеля дабрабыту Полацкай зямлі, забываючыся пра сон і адпачынак. Пра яго ўжо пры жыцці складалася мноства легенд і паданняў. Летапісы апавядаюць пра тое, што Усяслаў быў чарадзеем і мог перабягаць шэрым ваўком сотні вёрстаў. Хадзіла паданне, што ён і нарадзіўся ад чарадзейства з асобнай радзімай адзінкай, ад якой быццам бы залежала ўся яго незвычайная сіла. Каб “чарадзейны знак” не кідаўся людзям у вочы, князь заўсёды насіў на галаве павязку. Чарадзеем малюе Усяслава і аўтар “Слова пра паход Ігаравы”.

Пакуль быў яшчэ жывы Яраслаў Мудры, Усяслаў не думаў аб аддзяленні Полацкага княства ад Кіеўшчыны. Пасля яго смерці (1054) кіеўскі прастол заняў старэйшы сын Ізяслаў, тытулаваны на вялікага князя, чарнігаўскі – Святаслаў, пераслаўскі – Усевалад. Напачатку і з імі Усяслаў жыў у згодзе, нават прымаў удзел у сумесных паходах паўднёвых князёў супраць полаўцаў, якія ўвесь час пагражалі Кіеву. Так доўжылася да 60-х гадоў XI ст. З гэтага часу

зноў разгараецца барацьба Полацка з Кіевам, якая не сціхае да самай смерці Усяслава.

У 1065 г. Усяслаў аблажыў Пскоў, а ў наступным годзе ўзяў Ноўгарад, забраўшы як вайсковы здабытак царкоўную маёмасць з Сафійскага сабора. У адказ тры браты – Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад – аб’ядналіся і выступілі супраць Усяслава. Першым горадам, які апынуўся на іх шляху, быў Мінск. Горад быў абложаны і ўзяты. Кіеўскія князі павялі свае войскі далей па р. Нямізе і тут сустрэліся з войскамі Усяслава. Маленькая рэчка 3 сакавіка 1067 г. “бачыла” на сваіх берагах страшную бітву. Аўтар “Слова пра паход Ігаравы” пісаў: “На Немизе снопы стелют головами, молотят цепами булатными, на току жизнь кладут, веют душу от тела. Немиги кровавые бреги не житом были посеяны, а костьми сынов русских”. Рэчкі Нямігі цяпер няма. Па яе рэчышчы праходзіць вуліца Няміга ў Мінску.

Летам 1067 г. Яраславічы, якія сталі лагерам пад Оршай, запрасілі да сябе ў шацёр для перагавораў Усяслава з двума сынамі, гарантуючы яму бяспеку, але, парушыўшы абяцанне, паланілі яго, адвезлі ў Кіеў і пасадзілі ў вязніцу. У 1068 г. кіяўляне паўсталі супраць свайго князя Ізяслава, вызвалілі Усяслава і абвясцілі яго вялікім князем Кіеўскай Русі.

Далей падзеі разгортваліся наступным чынам. Пазбаўлены кіеўскага прастола, Ізяслаў звярнуўся за дапамогай да польскага караля Баляслава; апошні з войскамі з’явіўся пад Кіевам. Насустрач яму выступіў Усяслаў з кіеўскім апалчэннем. Сярод кіяўлян была, відаць, нейкая нязгода. Не жадаючы ўблытвацца ў няпэўную справу, князь-чарадзей кінуў войска і сярод ночы ўцёк на радзіму – у Полацк.

Феадальныя ўсобіцы працягваліся. З канца 70-х гадоў XI ст. у барацьбу з полацкімі князямі ўключыўся Уладзімір Манамах. У яе выніку моцна пацярпелі полацкія гарады: у 1078 г. – Лагойск, Лукомль, Друцк, а каля 1084 г. – Мінск. Пасля смерці Усяслава Полацкая зямля была падзелена паміж яго сынамі (іх было 6), якія потым сталі надзяляць валасцямі сваіх дзяцей. З’явіўся шэраг удзельных княстваў: Полацкае, Мінскае, Віцебскае, Друцкае[3], Ізяслаўскае (цяперашняе Заслаўе Мінскай вобласці), Лагойскае, Стрэжаўскае[4],

---

[3] ***Друцк*** (летапісны Дрютеск, Друтеск, Друческ) – старажытны горад Полацкай зямлі, цэнтр удзельнага Друцкага княства. Узнік у вярхоўях Друці (правы прыток Дняпра) ў пачатку волака аднаго з адгалінаванняў дзвінскага шляху з “варагаў у грэкі”. Упершыню упамінаецца ў летапісе пад 1092 г. У сярэдзіне XIII ст. адышоў да Вялікага княства Літоўскага. Прычына гібелі Друцка не высветлена. Магчыма, горад загінуў пры асадзе ад пажару ў канцы XV – пачатку XVI ст. і больш не аднаўляўся.

[4] ***Стрэжаў*** – цэнтр удзельнага княства Полацкай зямлі. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1127 – 1128 гг. Яго месцазнаходжанне яшчэ не вызначана. Адны гісторыкі і археолагі – Б.А. Рыбакоў, М.М. Ціхаміраў і інш. атаясамліваюць старажытны Стрэжаў з гарадскім пасёлкам Стрэшын у Жлобінскім раёне (у часы Кіеўскай Русі быў размешчаны далёка ад паўднёвай мяжы Полацкага княства, што ставіць пад сумненне існаванне тут летапіснага Стрэжава). Іншыя вучоныя лічаць, што Стрэжаў існаваў на месцы вёскі

Гарадзецкае[5]. Прастол у Полацку лічыўся галоўным. Гэты горад працягваў заставацца найважнейшым палітычным цэнтрам.

***Якім быў палітычны лад Полацкага княства?***

Заканадаўчая ўлада ў Полацкім княстве належала вечу, ці народнаму сходу. Веча запрашала князя на княжанне, выдавала законы, выбірала ўраднікаў (урадцаў, службоўцаў), ухваляла аб'яўленне вайны ці міру. Улада веча распаўсюджвалася не толькі на горад, але і на ўсю воласць, раскіданыя па ўсяму княству весі. У Полацкім княстве веча праіснавала да самага канца XV ст. (1488 г.), калі гораду было дадзена магдэбургскае права.

Выканаўчая ўлада ў Полацкім княстве належала князю. Часта князь з'яўляўся адным з родапачынальнікаў племені. Энергія і здольнасць, асабліва ў вайсковых справах, вылучалі яго з агульнай масы старшынь. У некаторых месцах, дзе жыццё было адносна спакойным, уладаром станавіўся князь як першы на падставе радавога старшынства па ўзросце. У Полацкім княстве князі займаліся вайсковай справай, хадзілі ў паходы са сваёй дружынай у іншыя землі. Акрамя таго, князь быў заняты адміністрацыйнай справай, разам з цівунамі вяршыў суд, ахоўваў гандлёвыя шляхі і караваны ў сваім княстве.

Высокае грамадскае становішча ў Полацку займаў епіскап. Ад імя князя і епіскапа пісаліся дагаворы, якія заключала полацкае веча, і да дакументаў прывешваліся іх пячаткі.

Другім буйным раннефеадальным княствам-дзяржавай на тэрыторыі Беларусі было ***Тураўскае княства***, якое ўтварылася ў IX – X стст. Яго тэрыторыя ў асноўным адпавядала месцам рассялення дрыгавічоў на поўдні Беларусі ў басейне Прыпяці. Палітычны цэнтр княства – Тураў, амаль сучаснік Полацка. Буйным горадам быў Пінск. Назву Турава летапісец звязваў з імем мясцовага князя Тура. Узнікненню і развіццю Турава і Пінска садзейнічала іх выгаднае размяшчэнне на водным Прыпецка-Бугскім гандлёвым шляху з Кіева і іншых рускіх зямель у Заходнюю Еўропу.

У 988 г. вялікі кіеўскі князь Уладзімір Святаслававіч аддаў Тураў свайму сыну Святаполку. Паводле задумы бацькі, ён павінен быў праводзіць у Тураве паўднёвавізантыйскі ўплыў. Але Святаполк, як сведчаць летапісы, не апраўдаў спадзяванняў бацькі. Ажаніўшыся з дачкой польскага караля Баляслава, каталічцы па веравызнанню, ён сам стаў падпадаць пад заходні ўплыў. Разам з ёй у Тураў прыехаў заходні епіскап Рэйнберг, які, зблізіўшыся са Святаполкам, стаў падбухторваць яго выступіць супраць Уладзіміра. Абапіраючыся на

---

Стрыжава Бешанковіцкага раёна. Аднак рэшткі ўмацаванага паселішча часоў Кіеўскай Русі тут не выяўлены.

[5] ***Гарадзец*** – старажытны горад Полацкай зямлі. Упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1162 г. З летапісу відаць, што Гарадзец быў добра ўмацаваным горадам, цэнтрам удзельнага княства, размяшчаўся ў лясах на захад ад Мінска. Яго атаясамлівалі з Гарадзеяй (Нясвіжскі раён), Гарадком каля Віцебска, Сёмкавым Гарадком і Астрашыцкім Гарадком каля Мінска, Гарадцом паміж Лепелем і Чашнікамі, Гарадком каля Маладзечна. Але, як сцвярджаюць вучоны-археолагі, у названых пунктах не знойдзены рэшткі старажытнага горада.

тураўцаў, якія добра памяталі пра незалежнасць Тураўскай зямлі ад Кіева, а таксама спадзеючыся на вайсковую дапамогу свайго цесця, караля польскага Баляслава, Святаполк задумаў аддзяліцца ад Кіеўшчыны. Уладзімір, даведаўшыся пра варожыя намеры свайго старэйшага сына, неспадзявана напаў на Святаполка, схапіў яго, яго жонку і епіскапа Рэйнберга і ўсіх кінуў у вязніцу. Пасля таго як у 1015 г. памёр Уладзімір, Святаполк як старэйшы ў родзе атрымаў права заняць кіеўскі вялікакняжацкі пасад. Успыхнула барацьба за кіеўскі прастол паміж Святаполкам і Яраславам. Перамог Яраслаў, а Святаполк збег у Польшчу, дзе і памёр.

Тураўскае княства было ўключана Яраславам Мудрым у склад Кіеўскага княства ў якасці воласці, на якую распаўсюджвалася ўлада непасрэдна кіеўскага князя. Воласць не мела свайго самастойнага статуса і замацаванай за ёй княжацкай лініі. Тураў мог разглядацца як буфер паміж Полацкам і Кіевам, калі мець на ўвазе агрэсіўную палітыку ў адносінах да суседзей з боку полацкіх князёў і небяспеку літоўскіх і яцвяжскіх набегаў. Пагэтаму кіеўскія князі імкнуліся трымаць Тураў пры сабе, накіроўваючы туды князямі сваіх сыноў і блізкіх сваякоў.

У 50-я гады XII ст. Тураў выйшаў з падпарадкавання Кіеву, і ў ім усталявалася самастойная княжацкая дынастыя. У канцы XII – пачатку XIII ст. на тэрыторыі Тураўскага княства ўтварыўся шэраг дробных феадальных, “шматковых” княстваў – Тураўскае, Пінскае, Слуцкае, Клецкае, Дубровіцкае (на тэрыторыі сучаснай паўночнай Украіны).

Такім чынам, Полацкае і Тураўскае княствы мелі ўсе атрыбуты дзяржаўнай улады – улады заканадаўчай (веча), выканаўчай (князі і дружыны) і судовай (князі і цівуны). Іх можна лічыць першымі раннефеадальнымі дзяржавамі-манархіямі на тэрыторыі Беларусі.

## § 7. Беларускія землі ў перыяд феадальнай раздробленасці

У пачатку XII ст. Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь) распалася на асобныя княствы. Землі Беларусі ўваходзілі ў склад Полацкага, Тураўскага, Пінскага, Навагародскага і часткова Смаленскага, Чарнігаўскага, Кіеўскага і Уладзіміра-Валынскага княстваў.

***Чаму распалася Старажытнаруская дзяржава?*** Таму ёсць некалькі прычын. ***Першая з іх*** звязана з далейшым развіццём сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю. Гэта рабіла ў новых умовах непатрэбнай адзіную дзяржаву, якая недастаткова ўлічвала асаблівасці княстваў і не стымулявала іх сацыяльна-эканамічнае развіццё. Лічылася, што княствы маглі самастойна і лепш вырашаць складаныя гаспадарчыя праблемы. ***Другая прычына*** звязана з наяўнасцю крэпасцей і войск ў мясцовых феадалаў, ростам іх ваеннай магутнасці, што стварала ілюзію магчымасці самастойна абараняць сваю тэрыторыю ад знешніх ворагаў і падаўляць выступленні залежных сялян. Апошняе нараджала яшчэ адну ілюзію – непатрэбнасць адзінай дзяржавы. На самай справе, развал Кіеўскай Русі, феадальная раздробленасць прывялі да 240

гадоў татара-мангольскага іга на рускіх землях. ***І, нарэшце, трэцяе***, рост эканамічнай і ваеннай магутнасці мясцовых феадалаў нараджаў у іх асяроддзі сепаратысцкія настроі, імкненне да незалежнасці ад вялікага кіеўскага князя і поўнага самастойнага княжання. А безгранічны сепаратызм заўсёды і непазбежна вядзе да гібелі адзінай дзяржавы. Так здарылася і з Кіеўскай Руссю.

У сучаснай гістарычнай літаратуры выказваюцца новыя погляды па пытаннях феадальнай раздробленасці. Так, М. Ермаловіч лічыць, што раз’яднанасць беларускіх, у прыватнасці полацкіх, зямель у XIII ст. не трэба перабольшваць. Феадальная раздробленасць, якая была вынікам феадальнага спосабу вытворчасці, з’явілася на той час не толькі заканамерным, але і прагрэсіўным этапам гістарычнага развіцця. Справа ў тым, што ў нетрах феадальнай раздробленасці выспявалі ўмовы для ўмацавання беларускіх зямель. Ствараліся лепшыя магчымасці для асваення зямель і прыродных рэсурсаў, росту гарадоў, развіцця земляробства і рамёстваў. А гэта садзейнічала таварнай вытворчасці, вяло да эканамічнага і палітычнага збліжэння паасобных зямель.

Тэндэнцыя да эканамічнага і палітычнага згуртавання назіралася ў межах Полацкай і Турава-Пінскай зямель. І хоць на тэрыторыі гэтых зямель узнік шэраг удзельных княстваў, іх князі часта дзейнічалі згуртавана. У пачатку XIII ст. Турава-Пінская зямля ўсё больш і больш звязвае свой лёс з Новагародскай зямлёй у барацьбе супраць агульнага ворага – галіцка-валынскіх князёў. Аб гэтым сведчыць тое, што ў 1228 г. новагародцы ўдзельнічалі на баку Расціслава Пінскага ў яго барацьбе з Данілам Галіцкім.

Аб росце згуртаванасці, а не раздробленасці беларускіх зямель сведчыць, на думку М. Ермаловіча, узвышэнне Новагародскай зямлі, на долю якой “выпала гістарычная роля стаць у другой палове XIII ст. ядром аб’яднання беларускіх і балцка-літоўскіх зямель у адзіную дзяржаву”. Вывад М. Ермаловіча аб тым, што “у сярэдзіне XIII ст. цэнтр палітычнага жыцця Беларусі перайшоў з Полацка ў Новагародак”, а апошні “стаў асяродкам зараджэння новай дзяржаўнасці” з’яўляецца спрэчным, дыскусійным.

***Якім жа было сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у XII – XIII стст.?***

Насельніцтва беларускіх зямель не было сацыяльна аднародным. На адным полюсе феадальнага грамадства стаялі самыя багатыя і ўплывовыя людзі – ***князі і баяры***. Эканамічную аснову іх панавання і багацця складала ўласнасць на зямлю. Існавалі розныя формы феадальнага землеўладання: ***вотчыннае*** – валоданне зямлёй, сядзібай і сялянамі з правам продажу зямлі, раздзелу яе і перадачы ў спадчыну; ***паместнае*** – перадача зямлі ў часовае ўладанне за службу без права спадчыны; ***царкоўнае*** і ***манастырскае*** – знаходжанне зямель ва ўласнасці царквы і манастыроў.

**Клас феадалаў меў іерархію.** На вяршыні піраміды знаходзіўся вялікі князь, ніжэй – князі-кіраўнікі асобных зямель, княстваў (“отчын”), яшчэ ніжэй – феадалы-уладальнікі вялікіх і малых памесцяў (баяры, дваране). Дробныя

феадалы ішлі на службу да багацейшых і знатных, станавіліся іх васаламі і карысталіся іх заступніцтвам.

Феадалы карміліся за кошт сваіх вотчын. Вотчына ўключала замак феадала, абкружаны землянымі валамі і равамі, драўлянай сцяной, за якой размяшчаліся замкавыя пабудовы, а таксама падпарадкаваную феадалу вясковую акругу. Меліся і баярскія двары-замкі, якія ўяўлялі сабой своеасаблівыя сталіцы мікраскапічных дзяржаў у дзяржаве. Уладара абслугоўвала залежная ад яго чэлядзь. Ён меў уласнае войска, з дапамогай якога ахоўваў сваё дабро і здзяйсняў уладу над сялянамі вясковай акругі. З уласным войскам феадал выступаў на вайну па патрабаванні князя ці мацнейшага феадала. Войска складалася са старэйшай дружыны вялікіх князёў і князёў буйных зямель, у якой служылі феадалы-баяры, і малодшай дружыны, у якой служылі баярскія і дваранскія дзеці, а таксама з войска феадалаў, якое ўключала ў сябе не толькі васальных баяр, але і служылых людзей, рамеснікаў і вольных сялян, што парвалі з абшчынай. Крыніцы называюць і гарадскія палкі, якія фарміраваліся па тысячах і дзяліліся на сотні.

Большую частку насельніцтва складалі ***сяляне***. Сярод іх крыніцы называюць ***смердаў*** (найбольш шматлікая група феадальна залежных сялян), ***закупаў*** (часова несвабодныя людзі, якія трапілі ў даўгавую залежнасць за ўзятую пазыку (купу), ***халопаў*** і ***рабоў*** (асабіста несвабоднае насельніцтва). Вядомы таксама ***радовічы*** – сяляне, звязаныя з феадалам нейкімі абавязацельствамі (“радам”, адсюль словы “радзіцца”, “дамаўляцца”), ***ізгоі*** – сяляне, якія выйшлі з абшчыны, знаходзіліся на службе ў феадалаў і поўнасцю залежалі ад іх волі.

Асноўнай вытворчай адзінкай з’яўлялася гаспадарка адной сялянскай сям’і (“***дым***”, “***рала***”). Гаспадарча самастойныя сялянскія сем’і сяліліся невялікімі вёскамі, якія называліся “***весямі***”. Адміністрацыйным і рэлігійным цэнтрам некалькіх “весяў” было вялікае сяло – “пагост”. Жыллём служылі невялікія зрубы ці паўзямлянкі з глінабітнымі печамі, у якіх палілася па-чорнаму.

Земляробчае насельніцтва арганізоўвалася ў сялянскія абшчыны, якія называліся “***вервь***” ці “***мир***”. Абшчына аб’ядноўвала сем’і адной або некалькіх вёсак. Зямля з’яўлялася ўласнасцю абшчыны і перыядычна пераразмяркоўвалася паміж асобнымі сем’ямі. У абшчынным карыстанні заставаліся сенажаці, лугі, лясныя ўгоддзі, рэкі і азёры. Абшчыннікі былі звязаны паміж сабой кругавой парукай: разам адказвалі за здзейсненае на яе тэрыторыі злачынства, калі віноўнік невядомы, разам узнаўлялі страты, нанесеныя гаспадарцы або рэчы ўласніка. Абшчына была адным са сродкаў супраціўлення наступленню феадалаў на сялянскія землі і ўгоддзі. У працэсе эвалюцыі з абшчыны вылучаліся заможныя сялянскія гаспадаркі.

Асноўныя формы сялянскіх павіннасцей феадалу – ***аброк*** ці “***павоз***” (аплата натурай часткі сялянскага прыбытку) і ***паншчына (баршчына)*** (работа на барскім полі). Сяляне таксама працавалі на будаўніцтве гарадоў, замкаў,

абарончых ліній, дарог. У час войнаў і феадальных міжусобіц яны аддавалі сваіх коней, абавязаны былі пастаўляць прадукты харчавання.

Большую частку неабходных для жыцця рэчаў сяляне рабілі самі. Яны пралі і ткалі, шылі адзенне і абутак, будавалі хаты, рабілі мэблю, посуд і г. д. Сыравінай для вытворчасці тканін, напрыклад, служылі шэрсць, лён і каноплі. Ткалі на гарызантальных ткацкіх станках.

Існавалі розныя сістэмы земляробства: ***падсечная*** (у лясной зоне), ***пераложная*** (у далінах рэк, на лясных палянах, сухадольных лугах, высахлых тарфяніках – зямлю пераставалі апрацоўваць для аднаўлення яе натуральнай урадлівасці), ***папарная збожжавая сістэма з двухполлем ці трохполлем***. Сеялі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, проса, грэчку, гарох, лён, каноплі.

Асаблівасцю развіцця жывёлагадоўлі было тое, што да канца I тысячагоддзя н.э. зацвердзілася стойлавае ўтрыманне жывёлы. Паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва і бортніцтва ігралі падначаленую ролю.

Поспехі, дасягнутыя ў сельскагаспадарчай вытворчасці, стварылі ўмовы для аддзялення рамяства і гандлю ад земляробства. Месцам канцэнтрацыі гэтых відаў гаспадаркі з’яўляліся ***гарады***.

Пад 862 г. летапіс упамінае Полацк, пад 980 г. – Тураў. Апавядаючы пра падзеі XI ст., летапісы паведамляюць аб існаванні яшчэ 12 гарадоў: Брэста, Віцебска, Мінска, Заслаўя, Браслава, Оршы, Пінска, Друцка, Лагойска, Лукомля і інш. Падзеі XII ст. пакінулі ў летапісах успаміны яшчэ пра 17 гарадоў: Слуцк, Барысаў, Гародня, Клецк, Камянец, Мсціслаўе, Крычаў, Гомель, Рагачоў, Брагін, Мазыр, Чачэрск і інш. У XIII ст., паводле пісьмовых крыніц, існавалі таксама Рэчыца, Нясвіж, Навагародак, Слонім, Ваўкавыск, Капыль, Кобрын і інш. У XIV ст. становяцца вядомымі Магілёў, Ліда, Быхаў, Свіслач і інш.

Пісьмовыя крыніцы і археалагічныя матэрыялы, на думку Э.М. Загарульскага, сведчаць аб тым, што ўзнікненне гарадоў звязана са славянскім этапам у гісторыі Беларусі. У аснове большасці гарадоў ляжалі княжацкі замак або пагранічная крэпасць, ваенны і фінансава-адміністрацыйны цэнтр акругі, феадальная сядзіба. У замку ці каля яго сяліліся рамеснікі і гандляры, бо феадалы з’яўляліся заказчыкамі і спажыўцамі іх прадукцыі. Па меры павелічэння ўдзельнай вагі гэтай катэгорыі людзей паселішча ператваралася ў горад.

Акрамя замка ці пагранічнай крэпасці (магутных абарончых збудаванняў), існавання рамяства і гандлю, для горада ранняга сярэднявечча былі характэрнымі дастаткова вялікая плошча ўмацаванай часткі паселішча (ад 1 да 10 га), радыяльная альбо веерападобная сетка вуліц, якія зыходзіліся да гарадскіх варот, элементы добраўпарадкавання (брук, машчэнне вуліцы дрэвам, дрэнажная сістэма), наяўнасць рынка, які размяшчаўся каля гарадскіх варот, а таксама манументальных культавых і свецкіх пабудоў (каменныя цэрквы, княжацкія палацы).

Цэнтральная ўмацаваная частка горада называлася ***дзядзінцам***. Гэта – арыстакратычная частка горада, дзе пераважна сяліліся феадалы (князь,

дружына, баяры), заможнае купецтва, духавенства. Побач з дзядзінцам размяшчаўся, як правіла, неўмацаваны ***рамесніцка-гандлёвы пасад***. З часам узнікалі знешнія ўмацаванні (Пінск) ці ўмацаванні ў частцы пасада (Новагародак). ***Насельніцтва большасці гарадоў складала ад 1 да 3 тыс. чалавек.***

У гарадах існавалі некалькі дзесяткаў відаў розных рамёстваў. Развіты былі металаапрацоўка, дрэваапрацоўка, ганчарная і гарбарная справы, разьба па косці. У буйных гарадах ювеліры валодалі майстэрствам зерні і эмалі, выраблялі складаныя і дарагія ўпрыгожанні з золата і серабра. У Полацку была наладжана вытворчасць шкляных упрыгожанняў, бранзалетаў, якія карысталіся вялікім попытам гараджанак. Гарадскія жыхары займаліся таксама земляробствам, жывёлагадоўляй, садаводствам і рыбалоўствам, паляваннем.

Развіваўся гандаль. Археалагічныя даследаванні выявілі ў заходніх землях Русі прадметы візантыйскай, заходнееўрапейскай і ўсходняй вытворчасці. З Візантыі ў спецыяльных гліняных пасудзінах – амфарах – прывозілі віно і аліўкавы алей, пастаўляліся таксама з гэтай краіны каштоўны посуд і прадметы хрысціянскага культу. Фаянсавы посуд іранскай вытворчасці знойдзены ў Новагародку і Лукомлі. У Ваўкавыску знойдзены вырабы з косці паўднёва-германскай вытворчасці, а ў Мінску – касцяная разная лыжачка для прычасця французскай вытворчасці. З Заходняй Русі ў суседнія краіны вывозіліся зерне, футра, скура, воск. Вядома аб існаванні ў Кіеве полацкага гандлёвага двара. Сведчаннем развітога гандлю з’яўляюцца знаходкі манет, сярэбраных грашовых злепкаў, якімі аплочваліся буйныя таварныя партыі. Гандляры ўзмацняліся эканамічна і палітычна, стваралі свае аб’яднанні – “братчыны”.

## § 8. Барацьба супраць крыжакоў і татара-манголаў

У канцы XII – пачатку XIII ст. заходнім і паўночна-заходнім землям Русі стала пагражаць сур’ёзная небяспека. У Прыбалтыцы з’явіліся першыя каталіцкія месіянеры, услед за якімі пачалі прыбываць атрады крыжакоў. У вусці Заходняй Дзвіны ў 1201 г. яны заснавалі крэпасць Рыгу, якая стала апорай нямецкай агрэсіі ў землі балтаў. Неўзабаве датчане напалі на эстонскае ўзбярэжжа, разбурылі старажытную крэпасць Калывань (Талін) і заснавалі сваю – Рэвель (1209).

*Якім чынам нямецкія рыцары апынуліся ў Прыбалтыцы, каля рускіх межаў?*

З канца XI ст. каралі, графы, князі Францыі, Англіі, Германіі і іншых еўрапейскіх краін імкнуліся захапіць багатае ўзбярэжжа Міжземнага мора, неаднойчы адпраўляліся ў крывавыя паходы супраць Егіпта, Сірыі. Гэтыя войны падтрымлівала каталіцкая царква, якая выступіла арганізатарам крыжовых паходаў. Яна аб’явіла іх мэтай вызваленне ад мусульман Палесціны і “гроба гасподня”. У войсках крыжакоў ствараліся асобныя манашаска-рыцарскія арганізацыі: іх звалі духоўна-рыцарскімі ордэнамі. Уступаючы ў ордэн, рыцар заставаўся воінам, але даваў зарок манаства: не мог мець сям’і.

З гэтага часу ён пакорліва слухаў галаву ордэна – гросмайстра, ці вялікага магістра.

Першым быў створаны ў 1119 г. ордэн тампліераў (храмоўнікаў), другім – ордэн шпітальераў-янітаў (сваю назву атрымаў ад шпіталя Святога Яна, які дапамагаў хворым пілігрымам – вандроўнікам). У канцы XII ст. стварыўся трэці ордэн – Тэўтонскі, які пазней перасяліўся з Палесціны ў Прусію. У 1202 г. рыжскі епіскап Альберт Буксгаўдэн, жадаючы абярнуць у хрысціянства насельніцтва Прыбалтыкі, заснаваў рыцарскі Ордэн мечаносцаў. Новыя рыцары насілі белы плашч з чырвоным мячом і крыжам, замест якога пазней сталі нашываць зорку. Пацярпеўшы цяжкае паражэнне ў вайне з арабамі, нямецкія князі ў канцы XII ст. вырашылі перанесці вайну ў Прыбалтыку і Русь, заваяванне якіх ім абяцала новыя землі і прыбыткі.

Прыбалтыка, праз якую праходзіў важны для Русі гандлёвы шлях па Заходняй Дзвіне ў Балтыйскае мора, ужо даўно знаходзілася ў сферы інтарэсаў Полацкага княства. Полацкія князі кантралявалі водны шлях, а мясцовыя плямёны ліваў прызнавалі васальную залежнасць ад Полацка і плацілі яму даніну.

Пабудаваўшы ў вусці Заходняй Дзвіны крэпасць Рыгу, рыцары ўстанавілі кантроль над гандлёвым шляхам і паставілі ў залежнасць ад сябе рускіх купцоў. Працягваючы агрэсію, ордэн мечаносцаў наблізіў свае ўладанні да ***Кукенойса***, аднаго з падначаленых Полацку рускіх гарадоў-княстваў, і паспрабаваў перахапіць у полацкага князя права на збіранне даніны з ліваў. Летам 1203 г. войскі полацкага князя Уладзіміра асадзілі дзве нямецкія крэпасці – Ікскюль і Гольм. Немцам давялося адкупіцца грашыма. Аднак ордэн працягваў палітыку захопаў. Летам 1206 г. Уладзімір спусціўся на караблях па Дзвіне з вялікім войскам, і 11 дзён працягвалася асада Гольма. Але крэпасць устаяла.

Князь Кукенойса Вячка некалькі разоў атрымліваў перамогу над крыжакамі. Пасля адной з іх ён паслаў полацкаму князю Уладзіміру багатыя падарункі: “лепшых тэўтонскіх коней, панцыры, балісты”. У 1207 г. Вячка разам з літоўскімі атрадамі асадзіў Рыгу, але, не атрымаўшы дапамогі ад полацкага князя, вярнуўся назад, спаліў свой горад і адышоў на Русь. Не змог вытрымаць націску крыжакоў і другі рускі горад-княства на Дзвіне – ***Герцыке***. Яго князь вымушаны быў прызнаць сябе васалам рыжскага епіскапа.

Землі рускіх гарадоў-княстваў Кукенойса і Герцыке былі далучаны да ордэна. Неўзабаве ордэн і полацкі князь Уладзімір заключылі “вечны” мір. Полацк адмовіўся ад збірання даніны з ліваў. Дзвіна аб’яўлялася свабоднай для праезду купцоў. Але варожасць захавалася. У 1216 г. полацкі князь Уладзімір пачаў рыхтаваць сумесны паход з эстамі і лівамі супраць крыжакоў, але раптоўная смерць перашкодзіла яго ажыццяўленню.

Ваенная экспансія немцаў супраць Полацкага княства і Наўгародскай зямлі прывяла Полацк і Ноўгарад да палітычнага саюзу, які быў замацаваны шлюбам Аляксандра Неўскага з дачкой полацкага князя Брачыслава. У бітве на Няве са шведскімі войскамі ў 1240 г. наўгародцам дапамагалі палачане. У гэтай бітве

вызначыўся полацкі воін Якуб. Знішчэнне Аляксандрам Неўскім нямецкіх рыцараў на лёдзе Чудскага возера ў 1242 г. спыніла крыжацкую агрэсію на паўночным захадзе.

Паспяховай барацьбе супраць ордэна перашкаджалі феадальныя міжусобіцы. Так, кукенойскі князь Вячка не ладзіў з полацкім Уладзімірам. Герцыкскі князь Усевалад ваяваў не толькі супраць немцаў, але і ў саюзе з Літвой “разбураў землі рускіх хрысціян”. Захоўвалі нейтралітэт князі Турава-Пінскай зямлі. Нават перад тварам грознай небяспекі не спынялі барацьбы паміж сабой полацкія князі. Іх выступленні супраць ордэна насілі разрозненны і няўзгоднены характар. Да таго ж на Полацкую зямлю ўсё часцей сталі рабіць спусташальныя набегі літоўцы, якія карысталіся аслабленнем княстваў Заходняй Русі. Аднак нягледзячы на гэта, Полацк змог спыніць наступленне рыцараў у глыбіню Русі і сыграў ролю перашкоды на шляху распаўсюджання нямецкай агрэсіі.

У 30 – 40-я гг. XIII ст. Русь перажыла самыя трагічныя падзеі ў сваёй гісторыі. Полчышчы татара-манголаў абрынуліся на яе землі. У 1223 г. на р. Калцы (цяпер Кальчык, прыток р. Кальміус у Данецкай вобласці) сышліся на першую бітву татара-манголы і аб’яднаныя сілы рускіх і полаўцаў. Мужна змагаліся воіны галіцкага, валынскага і іншых княстваў. Аднак полаўцы нечакана кінуліся ўцякаць і змялі рускія палкі. Мангольскія войскі перайшлі ў наступленне і разбілі рускіх. На Калцы Русь пацярпела паражэнне па прычыне сваёй раздробленасці. Але і ворагі, не маючы сіл, не рызыкнулі ісці на Кіеў і пайшлі на Усход.

Трынаццаць гадоў спатрэбілася захопнікам для пыдрыхтоўкі іх нашэсця на Еўропу. З 1236 па 1240 г. татара-манголы з мячом і агнём прайшлі праз землі Паўночна-Усходняй Русі, разбурылі Разань, Маскву, Уладзімір, Суздаль і іншыя гарады. Яны рушылі да Вялікага Ноўгарада, але дабрацца туды не змаглі. Гераічна абараняўся Смаленск, які прымусіў заваёўнікаў павярнуць на поўдзень. Татара-манголы як саранча прайшлі праз землі Паўднёвай Русі, захапілі і фактычна знішчылі Кіеў – “маці гарадоў рускіх”, валынскія і галіцкія гарады. Сотні тысяч людзей былі забіты альбо ўзяты ў палон. 1240 г. – год узяцця Кіева – лічыцца пачаткам татара-мангольскага іга на Русі, якое доўжылася 240 гадоў.

Расколатая на княствы і ўдзелы, якія часта ваявалі паміж сабой, Русь не змагла аб’яднаць сілы і даць арганізаваны адпор чужынцым. Калі б аб’ядналіся дружыны ўсіх рускіх князёў, то сабраліся б больш за 100 тыс. воінаў. Такое войска напэўна разбіла б ворага. Але, як пісаў летапісец, у розныя бакі глядзелі баявыя харугвы рускіх князёў. Амаль бесперапынна ваявалі між сабой князі валынскія і чарнігаўскія, суздальскія і смаленскія, полацкія і мінскія; не сціхалі заўзятыя сваркі князёў з баярамі Вялікага Ноўгарада і Пскова.

Разам з тым цаной велізарных страт рускі народ абяскровіў сілы татара-манголаў і пазбавіў іх магчымасці ажыццявіць свае планы заваявання Заходняй

Еўропы. Пасля некалькіх бітваў у Польшчы, Чэхіі і Венгрыі яны вярнуліся на Русь і ў нізоўях Волгі заснавалі сваю дзяржаву – Залатую Арду.

Беларускія землі засталіся ў баку ад асноўнага напрамку руху татара-манголаў на захад. Яны не абкладаліся данінай і не ведалі ардынскіх нукераў (дружыннікі мангольскай феадальнай знаці ў XII – XIII стст.) і баскакаў (прадстаўнікі мангольскага хана ў заваяваных землях Русі ў XIII – XIV стст., якія ажыццяўлялі кантроль за мясцовымі ўладамі). Праўда, летапісы адзначаюць разбурэнне войскамі Батыя Брэста ў 1240 г., паведамляюць, што некаторыя гарады Паўднёвай Беларусі былі абкладзены данінай. Маюцца звесткі аб бітвах з татара-манголамі ў нізіне р.Прыпяць, пад Мазыром. Татара-мангольскія набегі на заходнерускія землі адбываліся ў 1258, 1275, 1277, 1287, 1315, 1325, 1338 гг.

## § 9. Увядзенне хрысціянства. Культура на беларускіх землях у IX – XIII стст.

Хрысціянскай рэлігіі на Русі папярэднічала язычніцтва. ***Язычніцтва*** (ад царкоўнаславянскага “языцы” – народы, чужаземцы) – прыняты ў багаслоўі і ўмоўна ў гістарычнай літаратуры тэрмін, які абазначае старадаўнія вераванні і культы, што існавалі да пашырэння т. зв. “вышэйшых” рэлігій – хрысціянства, ісламу і інш. Для нашага далёкага продка-язычніка маланка азначала гнеў Перуна, набрыньвалі коцікі на вярбе – багіня вясны ўзялася за справу; каменні пад сахою пасеяў чорт, у хаце гаспадарыў дамавік. Навокал чалавека дзейнічалі сілы, якіх трэба было слухацца, каб жыць у згодзе з навакольным светам.

З прыняццем хрысціянства разумовы, духоўны, рэлігійны стан грамадства зазнаў істотныя змены. Язычніцкае для хрысціянства стала сінонімам “д’ябальскага”, варварскага.

У адрозненне ад Рымскай імперыі, хрысціянства на Старажытную Русь прыйшло з Візантыі, ***па-першае***, у гатовым выглядзе, з адшліфаванымі за дзевяць стагоддзяў свайго існавання формуламі, са Старым і Новым Запаветамі, з літаратураю айцоў царквы, з культамі Хрыста і Багародзіцы, са старaславянскай мовай, прынесенай першымі місіянерамі з Візантыі. ***Па-другое***, пры ўсёй складанасці станаўлення ранняга хрысціянства ў Рымскай імперыі яно ўсё ж такі развівалася ў накірунку ад нізоў да вярхоў, урада, эліты. У славянскім грамадстве хрысціянства наладжвалася зверху – ад эліты да народа. ***Па-трэцяе***, злом свядомасці, адмаўленне ад веры бацькоў і дзядоў, руйнаванне старых духоўных каштоўнасцей, замена язычніцкіх міфаў новымі хрысціянскімі пастулатамі суправаджалася знішчэннем абаронцаў былой веры, гатовых абараняць свае перакананні. Гэтае знішчэнне прыняло форму дзяржаўнай палітыкі, было адной з паліцэйскіх функцый вялікакняжацкай улады.

Першая праваслаўная царква па візантыйскаму ўзору была пабудавана ў Кіеве, відавочна, яшчэ ў IX ст. Сучасніца Візантыйскага імператара Канстанціна Барвянароднага – руская княгіня Вольга прыняла хрысціянства.

А яе ўнук Уладзімір Святаслававіч у 988–989 гг. пачаў хрышчэнне Русі. Ён найперш знішчыў язычніцкіх багоў – Дажбога, Стрыбога, Сімаргла, Макошу, Перуна. Па яго загаду Перуна прывязалі да конскага хваста, пацягнулі да Дняпра, і слугі князя па дарозе білі яго бізунамі. Потым вярхоўнага бога скінулі ў раку. Людзі, якія верылі ў свайго бога, плакалі, беглі за ім. Насуперак чаканням чараўнікоў, гром не грымнуў, маланкі ў Кіеў не ўдарылі. Князь Уладзімір застаўся жывы і быў здаровы многія гады.

Каб народ маўчаў, князь перад хрышчэннем аб’явіў: хто не прыйдзе да Дняпра, вораг яму, Уладзіміру. Спрачацца з князем асмеліліся нямногія. Тыя ж, хто не асмеліўся, прыйшлі раніцай да дняпроўскага берагу і па знаку прыбыўшага разам з Уладзімірам мітрапаліта і пад пагрозаю бізуноў княжацкай дружыны ўвайшлі ў ваду па шыю. Выйшлі з вады, атрымалі крыжык – і сталі хрысціянамі. Забаранялася старая і ўводзілася новая абраднасць, падлягалі забыццю імёны старых божышчаў; месцы паганскіх маленняў разбураліся.

Пасля знішчэння Перуна ў Кіеве, належала перамагчы язычніцтва ў іншых землях. Па водным шляху адправіліся з Кіева з місіяй хрысціянізацыі грэчаскія і балгарскія святары, а з імі дзядзька князя Уладзіміра – Дабрыня з войскам. Маршрут іх пралягаў праз Полацкае княства да Ноўгарада. Першым на іх шляху быў горад Тураў, дзе місіянерам аказалі ўпартае супраціўленне. Пра крывавае хрышчэнне тураўцаў сведчыць легенда аб чырвоных каменнях, якія быццам бы прыплылі па рацэ ў горад, у чым бясспрэчна чуецца памяць пра разню, якую абрушыў на мясцовых язычнікаў Дабрыня. Пазней, як паведамляе летапіс, людзі казалі, што Пуцята хрысціў агнём, а Дабрыня – мячом.

Калі з’явіліся першыя хрысціяне ў Полацкай зямлі, сказаць цяжка. Паводле padання, ужо ў IX ст. тут былі хрысціяне. Вядома, што землі Беларусі размяшчаліся на вялікім водным шляху “з варагаў у грэкі”, па якім ішоў не толькі гандаль з Візантыяй, але і распаўсюджвалася хрысціянская вера і культура. У 992 г. была створана Полацкая епархія, у 1003 г. – Тураўская.

Хрысціянская вера не прыйшла на беларускія землі як вера, усталяваная толькі гвалтам і насіллем, агнём ды мячом. Праўда, была і барацьба паміж святарамі новай веры і чараўнікамі, прыхільнікамі язычніцтва, але ўсё ж такі хрысціянскія погляды пераймаліся, як і ўся культура, адносна мірным шляхам. Яны выціскалі з жыцця грамадства старыя, язычніцкія погляды, часта зліваючыся з імі. Так, святы прарок Ілля стаў падобны да Перуна. Язычніцтва ў асноўным заставалася бытавой рэлігіяй сялянства з яго натуральнай гаспадаркай, патрыярхальным ладам жыцця, моцнай залежнасцю ад сіл прыроды. Многія сяляне патаемна выконвалі язычніцкія абрады. Гарадское супольнае жыццё, наадварот, схіляла да разумення і ўспрыняцця палажэнняў хрысціянскай рэлігіі, яе сімволікі. Такім чынам, ***стваралася двухвер’е, якое існавала на тэрыторыі Беларусі з даўнейшых часоў, існуе сёння*** і дазваляе славянскаму язычніцтву мірна ўжывацца з усходнім і заходнім хрысціянствам.

Сёння ў памяці беларускага народа жывуць розныя язычніцкія міфалагічныя ўяўленні аб існаванні “таго свету”, святкуюцца “дзяды” і

“радаўніца”, апавядаюцца гісторыі пра русалак, лесавікоў, чарцей, ведзьмаў. Працягваецца традыцыя паважлівых адносін да агню, у фальклоры ўслаўляюцца сонца, месяц, зоркі, дрэвы, рэкі і г. д. Захоўваюцца некаторыя язычніцкія абрады – гуканне вясны, купалле, валачобніцтва, юр’еўскія і траецкія звычаі. Але ўсе яны страцілі цяпер сваю магічную сілу, сталі хутчэй за ўсё гістарычнымі традыцыямі і абрадамі беларускага народа.

Увядзенне хрысціянства садзейнічала развіццю культуры на беларускіх землях. Вышэйшым узорам старажытнарускай культуры з’яўляецца ***манументальная архітэктура***. У X – XIII стст. у архітэктуры Еўропы дамінаваў ***раманскі стыль***. Грамадзянскія і культавыя раманскія пабудовы вызначаліся ***масіўнасцю, суровай манументальнасцю і крапаснымі рысамі***. У муроўцы абавязкова ўжываўся часаны і прыродны камень, часам разам з цэглай. Рысы раманскага стылю ёсць у многіх помніках беларускага дойлідства.

З прыняццем хрысціянства бярэ пачатак каменна-цаглянае будаўніцтва, узвядзенне манументальных культавых пабудоў. На пачатковым этапе рускія дойліды пераймалі візантыйскія архітэктурныя формы, потым іх пераасэнсавалі ў адпаведнасці са сваімі мастацкімі густамі, традыцыямі.

Будаўніцтву сабораў на Русі надавалася дзяржаўнае і палітычнае значэнне. Цэрквы былі не толькі культавымі ўстановамі, але і важнейшымі цэнтрамі інфармацыі аб палітычных, рэлігійных і грамадскіх справах і падзеях. У іх захоўваліся казна, бібліятэкі, архівы. Каля сцен цэркваў праходзілі сходы гараджан. Пры храмах і манастырах навучалі грамаце, тут пісаліся славутыя рускія летапісы.

У сярэдзіне XI ст. у Полацку, следам за Кіевам і Ноўгарадам, быў пабудаваны старажытнейшы з вядомых на тэрыторыі Беларусі мураваны ***Сафійскі сабор*** (Сафія – гэта ўвасабленне Слова Божага, другога твару Троіцы). Ён меў шмат агульнага з наўгародскай Сафіяй. Будаўнічым матэрыялам была плітачная цэгла і брукаваны камень. План храма адрозніваецца строгай сіметрыяй. Унутраная прастора падзялялася 16 слупамі на пяць ўздоўжных нефаў[6]. Пасярэдзіне будынка змяшчаўся галоўны купал, вакол якога групаваліся яшчэ 4 меншых. Сцены ўнутры сабора былі распісаны фрэскамі і ўпрыгожаны мазаікай. Сабор неаднаразова перабудоўваўся, апошні раз – у XVIII ст. у стылі віленскага барока.

У XII ст. у Віцебску была пабудавана ***Благавешчанская царква***, якая моцна пацярпела ў гады Вялікай Айчыннай вайны і канчаткова разбурана ў 1961 г. Храм аднаапсідны[7], трохнефавы, шасціслупавы, нагадвае

---

[6] ***Неф*** – выцягнутае памяшканне, частка інтэр’ера (звычайна базілікі), абмежаваная з аднаго ці з абодвух падоўжных бакоў радам калон ці слупоў.

[7] ***Апсіда*** – выступ будынка, паўкруглы, гранёны ці прамавугольны ў плане, перакрыты паўкупалам ці самкнутым паўскляпеннем. У хрысціянскіх храмах апсіда – алтарны выступ.

заходнееўрапейскія базілікі[8]. Царква мела багаты фрэскавы роспіс: фігуры святых, ілюстрацыі да біблейскіх сказанняў. Не выключана, што грэчаскіх майстроў-будаўнікоў храма прывезлі з сабой полацкія князі, калі вярталіся ў 1140 г. з візантыйскай ссылкі.

У сярэдзіне XII ст. у Полацку быў пабудаваны ***Спаса-Праабражэнскі (Спаса-Ефрасіннеўскі)*** сабор, які захаваўся амаль цалкам. Храм лічыцца вяршыняй полацкай архітэктуры. Ён уяўляе сабой вежападобны, выцягнуты ў плане шасціслуповы будынак з адной паўкруглай апсідай. У прыгарадзе Полацка – **Бельчыцах**, якія магчыма былі загараднай рэзідэнцыяй полацкіх князёў, у XII – XIII стст. былі пабудаваны ***Вялікі сабор***, ***Пятніцкая*** і ***Барысаглебская цэрквы***, а таксама ***Манастырскі дом***, які меў выцягнутую форму і акрамя ўсходняй апсіды яшчэ два адкрытыя ўнутр паўкруглыя выступы (конхі). Падобныя тыпы храмаў (трыконхі) былі распаўсюджаны на Балканах і Афоне.

З пабудоў XII ст. трэба адзначыць трохапсідную, чатырохслуповую ***Барысаглебскую царкву ў Навагародку*** (на рэштках старажытнай мураванай пабудовы ў XVI ст. узведзена новая) і ***царкву ў Тураве***, якая была пабудавана з плінфы спосабам роўнаслойнай муроўкі на растворы з дамешкай цамянкі (дробна тоўчанай цэглы). У 1949 г. у раскопках ***Мінскага Замчышча*** знойдзены падмурак старажытнай ***каменнай царквы***, якая па невядомых прычынах не была дабудавана.

Яскравай і самабытнай з'яўлялася гродзенская архітэктурная школа. У XII ст. былі пабудаваны ***царква Барыса і Глеба на Каложы*** на ўскраіне старажытнага Гродна, ***Крэпасныя вежы***, ***Ніжняя царква*** на тэрыторыі гродзенскага дзядзінца, ***гродзенская Прачысценская царква***, а таксама ***храм***, заложаны ***на Ваўкавыскім Замчышчы***. Спалучэнне чырвонага фону цаглянай кладкі з умураванымі разнакаляровымі керамічнымі маёлікавымі пліткамі і паліраванымі камянямі надавалі архітэктурным ансамблям маляўнічасць і непаўторнасць. Для паляпшэння акустыкі ў сцены ўмуроўвалі збаны-галаснікі.

У XIII ст. у манументальным будаўніцтве пачынаюць пераважаць абарончыя збудаванні, што звязана з узмацненнем ваеннай пагрозы з боку крыжакоў і татара-манголаў. У апошняй чвэрці XIII ст. ***у Камянцы (каля Брэста)*** была ўзведзена 30-метровая вежа абарончага значэння – ***Белая вежа***, якая захавалася да нашага часу. Круглая ў плане, яна мае пяць ярусаў з байніцамі на кожным з іх. Маюцца звесткі пра тое, што такія ж вежы былі ў Гродне, Тураве і, магчыма, у Полацку.

Састаўной часткай культуры беларускіх зямель з'яўлялася ***вусная народная творчасць***: песні, быліны, легенды, прымаўкі, казкі, плачы-галашэнні, загадкі. Глыбокімі і каларытнымі былі песенныя цыклы, якія выконваліся на вяселлях, пахаваннях і каляндарных святах. Усе гістарычныя быліны прасякнуты пачуццём патрыятызму, гордасці за сваіх герояў, клопатам

---

[8] ***Базіліка*** – адзін з галоўных тыпаў хрысціянскага храма, прамавугольны ў плане будынак, падзелены знутры радамі калон ці слупоў на прадольныя часткі (нефы).

аб лёсе ўсіх рускіх зямель. У былінах полацкі князь Усяслаў Брачыслававіч паказваецца храбрым і справядлівым воінам, здольным да пераўвасаблення то ўляснога сокала, то ў шэрага ваўка, то ў гнядога тура. Некаторыя народныя паданні пазней былі ўнесены ў летапіс. Такім паданнем, напэўна, было апавяданне пра лёс гордай палачанкі Рагнеды.

З хрысціянствам звязана ўвядзенне і пашырэнне пісьменнасці. З'явіліся богаслужэбныя кнігі, перакладная літаратура, філасофскія трактаты. З грэчаскай мовы запазычаліся некаторыя словы (напрыклад "тетрадь", "лампа"), рускім людзям даваліся грэчаскія імёны – Андрэй, Аляксандр, Георгій, Соф'я. Русь пераймала грэчаскія кнігі, многія з якіх перакладаліся на рускую мову. Былі сярод іх сачыненні пра стварэнне свету, пра біблейскіх герояў, аб рымскіх палкаводцах, "жыцці святых" і г. д.

У адрозненне ад каталіцкіх краін Захаду ў культуры і справаводстве Русі прымянялася родная мова. Разам з перакладнымі кнігамі з'яўляюцца і арыгінальныя сачыненні, у тым ліку рускія летапісы. Маюцца звесткі аб тым, што летапісанне вялося ў Полацку, Тураве, Новагародку.

Вакол царквы і манастыроў групаваліся адукаваныя людзі, у іх ці пры іх існавалі школы, пісаліся і перапісваліся кнігі, збіраліся бібліятэкі. Узорамі старажытных рукапісных кніг, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца: вядомае Тураўскае Евангелле (XI ст.), Рэймскае Евангелле (XI ст. – названае так па месцу знаходжання ў муніцыпальнай бібліятэцы г. Рэймса ў Германіі), служэбнік Валаама Худынскага (канец XII – пачатак XIII стст.), Аршанскае Евангелле (XIII ст.) і некаторыя іншыя. Асноўная частка старых рукапісных кніг загінула ў пажарах, была разрабаваная ў перыяд міжусобных войнаў. Шмат помнікаў старажытнай культуры, у тым ліку кніг, было знішчана пазней езуітамі і іншымі каталіцкімі манаскімі ордэнамі.

З прадстаўнікоў кніжнай асветы старажытнага перыяду нашай гісторыі мы павінны адзначыць: у Смаленску – Клімента Смаляціча, у Тураве – Кірылу Тураўскага, у Полацку – князёўну Прадславу-Ефрасінню.

***Клімент Смаляціч*** жыў у 1 палове XII ст. Як паведамляе летапіс, гэта быў кніжнік, раўні якому не было на ўсёй Русі. Жыў ён у манастыры, але больш быў вучоным, як манахам. У яго келлі побач з кнігамі Святога Пісьма можна было знайсці і кнігі айцоў царквы (так звалі багасловаў, якія сфарміравалі дагматыку, правілы богаслужэння, законы ўнутранага жыцця). З іх ён атрымліваў звесткі пра антычных аўтараў: Гамера, Платона, Арыстоцеля. Паводле звестак, дайшоўшых да нас, Клімент напісаў шмат кніг, казанняў (пропаведзяў), пасланняў, тлумачэнняў. З усіх гэтых матэрыялаў да нашага часу дайшло толькі адно пасланне, напісанае Клімента смаленскаму святару Фаме. Клімент Смаляціч з 1147 па 1154 гг. з'яўляўся мітрапалітам Кіеўскім.

***Кірыла Тураўскі*** – другі прадстаўнік асветы XII ст. – паходзіў з сям'і заможных гараджан. Вучылі яго грэкі. Потым ён стаў манахам. Калі вызвалілася епіскапская кафедра ў Тураве, яго абралі епіскапам. Праваслаўная царква прылучыла Кірылу Тураўскага да ліку святых. Гэта быў не толькі

кабінетны вучоны, але і выдатны царкоўны аратар. Імя яго сустракаем у агульных курсах рускай літаратуры старажытнага перыяду. Прамовы Кірылы ўяўляюць сабою ўзоры царкоўнага красамоўя таго часу. Яго казанні і павучанні створаны на асновах візантыйскай рыторыкі. Сучаснікі далі яму назву Залатавуснага (задоўга да Кірылы жыў выдатны царкоўны аратар, адзін з айцоў усходняй (праваслаўнай) царквы Іаан (каля 350 – 407 гг.), якога за красамоўства назвалі Залатавусным). І гэтае найменне з поўным правам застаецца за ім да нашага часу.

***Прадслава-Ефрасіння***, князёўна полацкая, таксама жыла ў XII ст. Яна была ўнучкаю знаёмага нам полацкага князя-чарадзея Усяслава. Як апавядаюць паданні, яна сваёю прыгажосцю і розумам стаяла вышэй за ўсіх сваіх сучасніц. Жаніхі шукалі рукі князёўны, але яна адмаўлялася ісці замуж. Бацькі хацелі аддаць яе замуж прымусам. Дазнаўшыся аб гэтым, яна цішком пакінула родную сям'ю і ўцякла ў жаночы манастыр, на чале якога стаяла яе цётка. Калі бацькі даведаліся пра гэта, яны прасілі яе вярнуцца дадому. Прадслава ж засталася ў манастыры і праз некаторы час прыняла пострыг.

Яшчэ ў доме бацькоў Прадслава любіла ў час адпачынку чытаць кнігі. Чытанне ў тыя часы было рэдкаю з'явай у грамадстве. Прыняўшы манаства, яна стала працаваць над перапісваннем кніг. Вакол яе аб'ядноўваліся шматлікія паслядоўнікі асветы і кніжнасці. Манастыр, у якім жыла і працавала Прадслава-Ефрасіння, паступова стаў буйным рэлігійным і культурным цэнтрам, адкуль кнігі разыходзіліся па ўсіх заходніх землях Русі. У сталым узросце Прадслава здзейсніла паломніцтва ў Палесціну і Ерусалім. Там яна і памерла ў 1173 г. Мошчы Ефрасінні Полацкай спачываюць цяпер у пабудаваным ёю Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры, які захаваўся амаль цалкам.

З імем полацкай князёўны звязаны такі помнік гісторыі і культуры, як ***крыж Ефрасінні Полацкай***, створаны мясцовым майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. Яго асновай з'яўлялася кіпарысавае дрэва. Зверху і знізу дрэва закрывалі залатыя пласціны (усяго 21), аздобленыя каштоўнымі камянямі, арнаментальнымі кампазіцыямі і абразкамі, якія былі выкананы ў тэхніцы перагародкавай эмалі. Па майстэрстве выканання твор Лазара Богшы не саступаў лепшым візантыйскім узорам, выробленым у гэтай найтанчэйшай тэхніцы. Шасціканцовы крыж меў вышыню каля 52 см, пасярэдзіне ў 5 квадратных падпісаных гнёздах знаходзіліся рэліквіі. Яго бакі былі абкладзены срэбнымі з пазалотаю пласцінамі, выкананымі ў тэхніцы ціснення. Крыж быў абведзены шнурком перлаў.

Крыж Ефрасінні Полацкай з'яўляецца не толькі выдатным творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, але і каштоўным помнікам старажытнабеларускага пісьменства. Зробленыя на крыжы надпісы ўмоўна падзяляюць на дзве часткі. У першай частцы паведамляецца аб годзе стварэння святыні, кошце матэрыялаў і працы, у другой жа запісаны праклён таму, хто знясе крыж са Спаскай царквы, якой падаравала яго Ефрасіння.

Няпросты лёс напаткаў крыж Ефрасінні Полацкай, шмат разоў змяняў ён уладальнікаў і месцазнаходжанне. Ужо на мяжы XII – XIII стст. яго вывезлі з Полацка смаленскія князі, у XVI ст. крыж ненадоўга трапіў у рукі маскоўскіх князёў, а затым захоўваўся ў Сафійскім саборы, які належаў уніятам. Пасля скасавання уніі ён быў вернуты ў Спаса-Ефрасіннеўскую царкву. З 1929 г. крыж знаходзіўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі. У гады Вялікай Айчыннай вайны крыж знік, і яго месцазнаходжанне невядома. У 90-я гады брэсцкім майстрам М. Кузьмічом была зроблена дакладная копія гэтага крыжа.

Вялікае развіццё ў беларускіх землях атрымала ***прыкладное мастацтва***. Нават звычайныя прадметы з дрэва, косці, гліны, металу ўпрыгожваліся разьбою, інкрустацыяй. Своеасаблівая ў гэтым сэнсе прыгажосць керамікі XI – XIII стст. У ёй мы не знойдзем яскравасці маляўнічых спалучэнняў эмалі, пераліваў сонечнага спектра шкла. Яе прыгажосць выяўлялася ў строгасці і стрыманасці каляровых гучанняў, у шурпатасці, аксамітнасці груба зробленай фактуры.

Трохі іншы характар мелі прадметы, прызначаныя для феадальнай арыстакратыі, заможных гараджан. Яны часта ўпрыгожваліся выявамі фантастычных звяроў і птушак, выкананымі ў асаблівай манеры – “звярыным стылі”. Любімымі сюжэтамі старажытнарускага прыкладнога мастацтва былі геральдычныя львы. Узорамі тонкай разьбы па каменю і косці з’яўляюцца шахматныя фігуркі, знойдзеныя ў Гродне і Ваўкавыску.

Пра высокае мастацкае майстэрства тагачасных умельцаў гавораць прадметы хрысціянскага культу. Сярод іх вылучаюцца найтанчэйшай мастацкай разьбой абразкі з шэрага шыферу, знойдзеныя ў час раскопак на гарадзішчы Мінска. Адзін з гэтых абразкоў выяўляе ўшанаваных у старажытнасці святых у поўны рост з фігураю Хрыста ў верхняй частцы. Твары і ўсё аблічча святых у многім нагадваюць нам беларускіх сялян.

Для стварэння прадметаў хатняга побыту, зброі, прылад працы і ўпрыгожванняў выкарыстоўваліся розныя металы: жалеза, бронза, медзь, срэбра, золата. Тэхніка іх апрацоўкі ў XI – XIII стст. дасягнула высокага ўзроўню. У беларускіх гарадах былі распаўсюджаны амаль усе вядомыя ў Еўропе тэхнічныя спосабы апрацоўкі металаў: плаўка, ліццё, коўка, залачэнне дроту, гравіраванне, упрыгожванне металічных вырабаў эмаллю, чарненнем.

Такім чынам, багатая, яскравая і шматгранная культура беларускіх зямель у IX – XIII стст. стаяла ў шэрагу перадавых культур свайго часу, была часткай усходнеславянскай культуры.

# РАЗДЗЕЛ ІІ. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ І РОЛЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ЯГО ПАЛІТЫЧНЫМ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ РАЗВІЦЦІ (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)

## ГЛАВА 1. УТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У гісторыі Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ) да сённяшніх дзён існуе кола праблем, якія выклікаюць пытанні ў даследчыкаў. Сярод іх – прычыны ўтварэння і працэс фарміравання ВКЛ. І калі наконт прычын ужо маецца пэўная агульнасць поглядаў, то працэс фарміравання яшчэ застаецца адным з самых складаных момантаў. Складанасць гэта вынікае з таго, што сярод вучоных няма ўзгодненага пункту гледжання на этнічную аснову дзяржаўнасці адной з буйнейшых дзяржаў сярэдневяковай Еўропы – Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. У аснове розных канцэпцый – супярэчнасць, сутнасць якой заключаецца ў тым, што вярхоўная ўлада ў першыя стагоддзі яго існавання належала часцей за ўсё літоўскім князям, а культура, юрыспрудэнцыя, дзяржаўная мова, асноўныя землі былі ўсходнеславянскімі, у пераважнай большасці – беларускімі.

Сярод мноства фактараў, якія садзейнічалі ўзнікненню новай дзяржавы, можна выдзеліць наступныя:

1. Развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рамяства, гандлю, рост гарадоў. Усё гэта спрыяла ўзбагачэнню мясцовай эліты, якая і стала ініцыятарам утварэння новай дзяржавы, каб абараніць сваю маёмасць і статус. Акрамя таго, назапашаныя і новыя рэсурсы дазвалялі арганізаваць абарону і пашырэнне дзяржавы.
2. Паглыбленне сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства, сацыяльных супярэчнасцей паміж саслоўямі. Сацыяльныя супярэчнасці і сілавыя спосабы іх вырашэння выклікалі патрэбу ў грамадскім парадку. У самім саслоўі феадалаў таксама абвастрылася барацьба за панаванне. Усё гэта выклікала грамадскую патрэбу ва ўтварэнні дзяржавы, якая б заканадаўча абмежавала грамадска небяспечныя разбуральныя працэсы, якія праяўляліся ў знішчэнні людзей і матэрыяльных каштоўнасцей.
3. Неабходнасць барацьбы са знешняй небяспекай. Такая небяспека зыходзіла найперш ад мангола-татараў і крыжакоў, а таксама галіцка-валынскіх і польскіх князёў.

Існуюць тры найбольш акрэсленыя канцэпцыі працэсу ўтварэння ВКЛ. Першая з іх умоўна называецца ***традыцыйнай (“літоўскай”)*** канцэпцыяй. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што літоўскія князі заваявалі беларускія землі, падпарадкавалі іх сабе, скарыстаўшыся аслабленнем Русі міжусобіцамі і мангола-татарскім заваяваннем. І толькі вялікі рускі народ у другой палове XVIII ст. вызваліў беларусаў з-пад ярма чужынцаў.

Другой з’яўляецца так званая ***новая (“беларуская”)*** канцэпцыя, найбольш поўна абгрунтаваная М. Ермаловічам у кнізе “ Па слядах аднаго міфа” (Мн.,

1989). Ён пісаў, што гістарычныя крыніцы не пацвярджаюць літоўскага заваявання беларускіх зямель, а, наадварот, сведчаць аб заваяванні сучасных літоўскіх зямель Новагародскім княствам. На думку М. Ермаловіча, значнай перашкодай для аб'ектыўнага асвятлення працэсу ўтварэння ВКЛ з'яўляецца атаясамліванне сучаснай тэрыторыі Літвы з летапіснай Літвой, якая, як даказваў М. Ермаловіч, знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі, паміж Мінскам і Новагародкам і паміж Слонімам і Маладзечна. Такім чынам, з пункту гледжання прыхільнікаў новай канцэпцыі, ВКЛ склалася перш за ўсё як беларуская дзяржава.

Трэцяя ***"цэнтрысцкая"*** канцэпцыя імкнецца пераадолець крайнасці іншых канцэпцый. Яе прыхільнікі сцвярджаюць, што ВКЛ на розных этапах свайго існавання было дзяржавай, у якой дамінавалі розныя этнічныя прыярытэты. Працяглы час (сярэдзіна XIII – сярэдзіна XV стст.) яно было літоўска-беларускай дзяржавай, у якой літоўскае палітычнае лідэрства ўраўнаважвалася беларускай палітычнай арганізацыяй. З сярэдзіны XV ст. і ў XVI ст. ВКЛ існавала як беларуска-літоўская дзяржава, дамінантай у якой быў беларускі пачатак.

Калектыў аўтараў кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР прытрымліваецца пункту гледжання на ВКЛ як на поліэтнічную дзяржаву чатырох асноўных народаў – беларускага, літоўскага, украінскага і рускага, дзе славяне займалі 11/12 тэрыторыі і складалі 80% насельніцтва краіны. Усе народы, якія прымалі ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным жыцці Вялікага княства, а найперш беларускі і літоўскі, з'яўляюцца гістарычнымі спадкаемцамі гэтай дзяржавы.

У дыскусіі па праблемах утварэння і этнічнай прыналежнасці ВКЛ апошняя кропка яшчэ не пастаўлена, але бясспрэчнай з'яўляецца вялікая роля нашых продкаў як ва ўтварэнні ВКЛ, так і ў яго гістарычнай спадчыне.

Працэс утварэння ВКЛ быў працяглым і складаным. Ён адбываўся больш за стагоддзе – з другой чвэрці XIII па трэцюю чвэрць XIV ст. Аб'яднанне праходзіла рознымі шляхамі: на аснове пагадненняў паміж мясцовай палітычнай элітай і літоўскімі князямі, шляхам дынастычных шлюбаў, у некаторых выпадках – шляхам захопу.

Працэс фарміравання новай дзяржавы пачаўся з узвышэння Новагародскага княства, якое прыпала на сярэдзіну XIII ст., і быў звязаны з імем князя Міндоўга. Заслуга апошняга заключаецца ў тым, што пры ім з разрозненых літоўскіх плямён і беларускіх княстваў пачалося станаўленне дзяржавы на новай аснове – Вялікага княства Літоўскага, бо менавіта Міндоўг аб'яднаў Новагародскае княства з часткай балцкіх зямель, назва якіх дала імя новай дзяржаве. Першай жа сталіцай княства стаў Новагародак. Але Міндоўг сустрэў супраціўленне старой знаці, якая забіла вялікага князя і яго двух сыноў у 1263 г.

Далейшы тэрытарыяльны рост дзяржавы расцягнуўся больш, чым на стагоддзе. Полацкае княства трапіла пад уплыў Літвы ў сярэдзіне XIII ст., калі ў

Полацку княжыў пляменнік Міндоўга Таўцівіл. У канцы XIII ст. пры вялікім князю Віцені (каля 1295 – 1316) быў пакладзены пачатак далучэнню Жамойці і канчаткова далучана Полацкае княства. Жамойць жа была канчаткова далучана толькі у першай палове XV ст. Пры вялікім князю Гедыміне (1316 – 1341) у склад ВКЛ увайшла Віцебская зямля (1320 г.), Берасцейская, Турава-Пінская землі і Мінскае княства. У 1323 г. Гедымін перанёс сталіцу дзяржавы ў Вільню. Пры вялікім князю Альгердзе (1345 – 1377) было цалкам далучана Беларускае Падняпроўе, у 1355 г. – Бранскае княства. У 1362 г. Альгерд разбіў татар у бітве на р. Сінія Воды і далучыў да ВКЛ Кіеўскую, Чарнігава-Северскую, Падольскую і Валынскую землі. Пры вялікім князю Вітаўце (1392 – 1430) у 1404 г. да ВКЛ было далучана Смаленскае княства, быў ўстаноўлены пратэктарат над Разанскай, Пскоўскай, Наўгародскай землямі. У гады праўлення Вітаўта ВКЛ дасягнула найвышэйшай магутнасці і займала найбольшую тэрыторыю.

## ГЛАВА 2. ПАЛІТЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У XIV – XVI стст.

### § 1. Беларускія землі ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ

Па форме дзяржаўнага ўладкавання ВКЛ уяўляла сабой поліэтнічную феадальную федэрацыю. Гэта тлумачылася перш за ўсё тым, што былі розныя палітычна-прававыя ўмовы ўваходжання ў склад дзяржавы асобных рэгіёнаў. Спачатку ўся дзяржава складалася з наступных, аўтаномных па сутнасці, частак: удзельных княстваў, аўтаномных абласцей, уласна Літвы, з прылеглымі да яе беларускімі часткамі, а таксама Кіеўскай, Валынскай і Падольскай зямель, якія мелі асаблівы аўтаномны лад да ўваходжання ў склад Кароны Польскай.

Удзельныя княствы былі раскіданы ў розных частках дзяржавы. Гэта Гарадзенскае, Новагародскае, Мінскае, якія ўвайшлі ў склад уласна Літвы ў другой чвэрці XIV ст., Падляшша, Мсціслаўскае, Турава-Пінскае, Слуцкае, Капыльскае княствы. Пэўны час шмат такіх княстваў было на ўсходзе дзяржавы: Вяземскае, Тарапецкае, Бельскае, Трубчэўскае, Ноўгарад-Северскае, Старадубскае і інш. Удзельны князь прыносіў “пакору” вялікаму князю, плаціў яму даніну і дапамагаў дружынай у час вайны. Ва ўсім астатнім парадкі былі ранейшымі. На правах аўтаномных абласцей знаходзіліся Полацкая, Новагародская, Віцебская і Смаленская землі. Яны кіраваліся на аснове ўстаўных грамат, якія рэгулявалі мясцовае жыццё па прынцыпу, што “мы (г. зн. вялікі князь) даўніны не рушым і навіны не ўводзім”. Да ўласна Літвы адносіліся Трокскае і Віленскае княствы.

Імкнучыся больш цэнтралізаваць дзяржаву, прывязаць шчыльней да цэнтра славянскія землі і пашырыць у іх сацыяльную базу сваёй улады, вялікія князі літоўскія ажыццяўлялі палітыку зямельных падараванняў літоўскім феадалам на далучаных да княства землях. Але гэта мера мела і адваротны бок, бо вяла да змяншэння ўласных зямельных уладанняў вялікага князя (гаспадарскага

дамена), скарачала матэрыяльную базу яго палітычнай улады ўнутры краіны. У той жа час узрасталі эканамічная роля і палітычны ўплыў буйных літоўскіх феадалаў, што замацоўвала федэратыўныя тэндэнцыі ў пабудове дзяржавы.

Барацьба цэнтралісцкіх і федэратыўных пачаткаў пранізвала ўсё ўнутрыпалітычнае жыццё княства ў XIV – XVI стст. і вяла да крызісаў дзяржаўнай улады, якія пагражалі распадам ВКЛ.

***Першы крызіс*** узнік неўзабаве пасля смерці вялікага князя Гедыміна ў 1341 г. і быў выкліканы парушэннем права наследавання трона. Скончыўся ён дзяржаўным пераваротам 1345 г., калі вялікі князь Еўнут быў звергнуты яго старэйшымі братамі Альгердам і Кейстутам. Еўнуту было перададзена Заслаўскае княства. Вялікім князем стаў Альгерд, які валодаў усходняй часткай дзяржавы, яго суправіцелем – Кейстут, у валоданні якога знаходзіліся заходнія землі княства з цэнтрам у Троках.

***Другі*** палітычны крызіс узнік у 1377 г. пасля смерці Альгерда, калі, згодна з папярэдняй дамоўленасцю паміж братамі, пры падтрымцы Кейстута на велікакняжацкі прастол быў узведзены Ягайла Альгердавіч. Ён, як і яго бацька, імкнуўся да стварэння моцнай цэнтралізаванай дзяржавы. Але гэта задача ўскладнялася трыма акалічнасцямі. Па-першае, рэальную ўладу Ягайла меў толькі ва ўсходняй частцы дзяржавы, у Троках і ўсёй заходняй частцы правіў стары Кейстут. Па-другое, на велікакняжацкі трон прэтэндаваў князь Андрэй Полацкі, старэйшы сын Альгерда ад першага шлюбу. Па-трэцяе, узмацнялася апазіцыя з боку заходнерускіх княстваў, якія былі незадаволены палітыкай цэнтралізацыі і былі супраць ідэі поўнага палітычнага зліцця з Літвой. Тут выспяваў шырокі грамадска-палітычны рух супраць умацавання ўлады вялікага князя. У 1377 г. Ягайла пазбавіў Андрэя Альгердавіча яго Полацкага ўдзелу. Андрэй збег у Пскоў і стварыў цэлую антылітоўскую кааліцыю ў складзе Маскоўскай дзяржавы, Смаленскага княства, Вялікага Ноўгарада і Лівонскага ордэна.

У гэты час сапсаваліся адносіны Ягайлы з Кейстутам. Апошні, выкарыстаўшы складанае становішча пляменніка, у 1381 г. захапіў вярхоўную ўладу ў дзяржаве. Наступіў новы**, *трэці*** па ліку, палітычны крызіс. Праз год, узяты ў палон Ягайлам, Кейстут быў задушаны ў цямніцы Крэўскага замка.

Быў яшчэ адзін фактар, які абцяжарваў праблему цэнтралізацыі дзяржавы: рост аўтарытэту Масквы на заходнерускіх землях пасля перамогі над татарамі на Куліковым полі ў 1380 г. Дарэчы, у гэтай бітве ўдзельнічалі і некаторыя князі з ВКЛ, напрыклад, той жа Андрэй Полацкі. Спроба нейтралізаваць гэту тэндэнцыю шляхам заключэння саюза паміж вялікімі князямі літоўскім і маскоўскім не прывяла да станоўчых вынікаў, бо маскоўскі бок выставіў умовы, непрымальныя для літоўскага. Самастойнаму гаспадару было не з рукі станавіцца васалам ханскага данніка.

Новае выйсце бачылася ў саюзе з Польшчай, якая акрамя апоры ў барацьбе з унутранай апазіцыяй разглядалася яшчэ і як саюзнік у змаганні з Тэўтонскім ордэнам. Польскія феадалы ў сваю чаргу хацелі засцерагчыся ад моцнага і

небяспечнага ўсходняга суседа, а таксама пашырыць свае ўладанні за кошт княства: страціўшы Сілезію і Памор'е, яны прэтэндавалі на Валынь, Падолле і Галіцкую Русь.

Сітуацыю аблегчыла тое, што палякі ўбачылі ў вялікім князю літоўскім Ягайле кандыдатуру на ролю мужа сваёй малалетняй каралевы Ядзвігі і свайго будучага караля. Усё гэта прывяло да заключэння 14 жніўня 1385 г. у Крэве пагаднення з Польшчай, якое вядома пад назвай Крэўскай уніі. Тэкст уніі да нас не дайшоў, аднак вядома, што Ягайла, у адпаведнасці з яе ўмовамі, абавязаўся аб'яднаць Польшчу з Літвою і прыняць разам з усімі сваімі падданымі каталіцтва ўзамен на права стаць польскім каралём. У 1386 г. Ягайла быў абраны польскім каралём, прыняў каталіцтва, атрымаў імя Уладзіслаў і быў абвянчаны з каралевай Ядзвігай. Такім чынам, з дапамогай уніі ВКЛ павінна было быць інкарпаравана ў склад Кароны Польскай.

Унія прывяла да таго, што паступова пачала нарастаць каталіцызацыя Вялікага княства. Гэта ў сваю чаргу змяніла сацыяльна-прававое становішча беларускіх зямель у ім. Паводле прывілея Ягайлы ад 20 лютага 1387 г., феадалы каталіцкага веравызнання мелі істотныя перавагі ў параўнанні з праваслаўнымі. Яны атрымалі неабмежаванае права валодання і распараджэння сваімі вотчынамі, вызваляліся ад выканання многіх дзяржаўных павіннасцей. Другім прывілеем ад 22 лютага 1387 г. была абумоўлена магчымасць заключэння шлюбаў паміж католікамі і праваслаўнымі толькі ў выпадку пераходу апошніх у каталіцтва. Такім чынам, каталіцызацыя закранула інтарэсы не толькі вярхоў, але і шырокіх колаў праваслаўнага насельніцтва.

Дэскрымінацыя праваслаўнай знаці з канца XIV ст. абвастрыла становішча ў краіне. Супраць уніі і Ягайлы ўзнік грамадска-палітычны рух, які на першым этапе ўзначаліў князь Андрэй Полацкі. Аднак Ягайлу ўдалося падавіць выступленні, а Андрэй быў узяты ў палон і адпраўлены ў Польшчу.

На другім этапе (1389 – 1392 гг.) на чале руху стаў стрыечны брат Ягайлы Вітаўт. На гэты раз удалося адстаяць самастойнасць дзяржавы. Барацьба скончылася заключэннем Востраўскага пагаднення 5 жніўня 1392 г., якое значна карэктавала Крэўскую унію. ВКЛ было гарантавана адасобленае дзяржаўнае існаванне, але ў саюзе з Польшчай і пад верхаўладдзем польскага караля. Ягайла прызнаў Вітаўта вялікім князем літоўскім (1392 – 1430).

З мэтай умацавання цэнтральнай улады Вітаўт ліквідаваў сістэму спадчыннага ўдзельнага княжання і замяніў яе інстытутам намесніцтва. Намеснікамі прызначаліся як ранейшыя ўдзельныя князі, якія выказалі лаяльнасць Вітаўту, так і выдзвіжэнцы вялікага князя, пераважна літоўскага паходжання. Намеснікі з'яўляліся прадстаўнікамі цэнтральнай улады.

Адстаяўшы незалежнасць ВКЛ, Вітаўт разам з тым вымушаны быў згадзіцца на пашырэнне каталіцкага ўплыву. У 1413 г. Вітаўт і Ягайла падпісалі Гарадзельскую унію, якая, з аднаго боку, юрыдычна афарміла палітычную самастойнасць ВКЛ (але найвышэйшым князем літоўскім па-ранейшаму заставаўся польскі кароль Ягайла), а з другога, пашырыла правы каталіцкай

шляхты, бо дэкларавала выключнае права феадалаў-католікаў займаць дзяржаўныя пасады.

Так Гарадзельскі прывілей яшчэ больш паглыбіў раскол у грамадстве, што вылілася пасля смерці Вітаўта ў грамадзянскую вайну 1432 – 1436 гг. У ходзе яе федэрацыя распалася на дзве дзяржавы: Вялікае княства Літоўскае на чале з Жыгімонтам Кейстутавічам і Вялікае княства Рускае на чале са Свідрыгайлам Альгердавічам. Апошняе праіснавала чатыры гады. Каб ліквідаваць напружанасць у грамадстве польскі кароль Ягайла ў 1432 г. выдаў прывілей, які потым фактычна паўтарыў у 1434 г. Жыгімонт Кейстутавіч. Паводле гэтага прывілея, адбывалася ўраўнаванне ў маёмасных правах праваслаўнай і каталіцкай шляхты і перадача на карысць баяр дзяржаўнай павіннасці – дзякла. Аднак саслоўная роўнасць не была падмацавана палітычнай. Гэта азначала, што канчаткова праблема не была вырашана. Толькі 7 чэрвеня 1563 г. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст выдаў прывілей, які ўраўняў у палітычных правах шляхту хрысціянскага веравызнання розных канфесій (праваслаўных, католікаў, пратэстантаў).

У XV – пачатку XVI ст. можна было назіраць шэраг спроб палітычнай эліты ВКЛ разарваць асабістую унію з Польшчай. Гэта было ў час праўлення вялікага князя Казіміра Ягайлавіча (1440 – 1492) у 1440 – 1447 гг. і пры сыне апошняга вялікім князю Аляксандры (1492 – 1506) у 1492 – 1501 гг. У гэтыя перыяды асабістая унія з Польшчай перарывалася і заставалася толькі унія дынастычная. Апошняя спроба разарваць асабістую унію была зроблена ў час праўлення Жыгімонта Старога (1506 – 1548), калі ў 1529 г. на сейме ў Вільні па настаянні паноў Рады ВКЛ вялікім князем быў выбраны яго 9-гадовы сын Жыгімонт Аўгуст. Але каранаваны ён так і не быў. Толькі ў 1544 г Жыгімонт Аўгуст пачаў выконваць абавязкі вялікага князя і кіраваў дзяржаўнымі справамі пры дапамозе паноў Рады. Калі ў лютым 1548 г. памёр Жыгімонт Стары, Жыгімонт Аўгуст стаў паўнапраўным польскім каралём і вялікім князем літоўскім.

## § 2. Знешняя палітыка ВКЛ у XIV – сярэдзіне XVI стст.

Знешняя палітыка ВКЛ XIV – сярэдзіны XVI стст. была цесна ўзаемазвязана з палітыкай унутранай і мела тры асноўныя напрамкі: заходні, усходні і паўднёвы.

На заходнім накірунку унія з Польшчай, нягледзячы на складаныя ўнутраныя вынікі, умацавала міжнародныя пазіцыі княства, забяспечыла адносны спакой на яго заходняй мяжы, дазволіла аб’яднаць сілы абедзвюх дзяржаў супраць агульных знешніх ворагаў.

У XIV – першай палове XV ст. галоўнымі ворагамі, з якімі ВКЛ даводзілася весці напружаную барацьбу, былі крыжакі. У 1409 г. пачалася так званая “Вялікая вайна” (1409 – 1411 гг.) паміж Польшчай і ВКЛ, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам, з другога. Менавіта антыкрыжацкі польска-літоўскі саюз дазволіў 15 ліпеня 1410 г. нанесці сакрушальнае паражэнне Тэўтонскаму

ордэну ў Грунвальдскай бітве і спыніць крыжацкую экспансію на славянскія землі.

На паўднёвым напрамку княства кантактавала з татарскімі ордамі. У 1362 г. у бітве на р. Сінія Воды (Падолле) вялікі князь Альгерд ушчэнт разбіў татара-мангольскае войска. Пасля гэтай бітвы была вызвалена і далучана да ВКЛ большая частка Украіны (Кіеўшчана, Падолле). Разгром у сіняводскай бітве ўзмацніў цэнтрабежныя тэндэнцыі ў Залатой Ардзе, якая пачала развальвацца.

У 1395 г. чарговы залатаардынскі хан Тахтамыш пацярпеў паражэнне ад сярэднеазіяцкага хана Цімура, які выгнаў свайго саперніка. Вялікі князь Вітаўт, які імкнуўся аб’яднаць пад сваёй уладай усе рускія землі, заключыў з Тахтамышам пагадненне: Вітаўт паабяцаў вярнуць хану яго былы пасад “на Орде”, а Тахтамыш паабяцаў Вітаўту пасадзіць яго на княжанне ў Масковіі, якая з’яўлялася даннікам ардынскіх ханаў. Але гэтыя планы не спраўдзіліся, бо на р. Ворскла 12 жніўня 1399 г. кааліцыйнае войска Вітаўта і Тахтамыша было разгромлена войскамі Цімура.

У XV ст. Залатая Арда распалася на некалькі ўлусаў: Вялікую, Перакопскую (Крымскае ханства), Казанскую, Астраханскую і Нагайскую орды. У сярэдзіне XV ст. набегі Вялікай Арды на тэрыторыю ВКЛ практычна спыніліся. З другой паловы XV ст. ускладніліся адносіны ВКЛ з Крымскім ханствам, якое ў 1480 г. заключыла антылітоўскі саюз з Вялікім княствам Маскоўскім. Штогод адбываліся набегі татар на тэрыторыю сучаснай Украіны. Часам яны даходзілі і далей, да беларускіх зямель. Іх актывізацыя назіралася на мяжы XV – XVI стст., падчас маскоўска-літоўскіх войн. Падлічана, што за перыяд з 1500 г. да 1569 г. крымчакі наведаліся на беларускія землі 45 разоў. Інтэнсіўнасць нападаў некалькі аслабла пасля іх разгрому войскам ВКЛ на чале з князем Міхаілам Глінскім пад Клецкам у жніўні 1506 г. Наступнае буйнае паражэнне крымчакам было нанесена ў 1527 г. у бітве пад Каневам. Пазней іх набегі спыняліся наладжанай сістэма аховы паўднёвых рубяжоў дзяржавы, у т. л. стварэннем атрадаў казакаў на Украіне.

З канца XV ст. найбольш прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі ВКЛ стаў усходні, на якім разгортваліся падзеі, што склалі асноўны змест канфлікту з Вялікім княствам Маскоўкім. К канцу XV ст. яно ўзмацнілася і, падбіраючы астатнія рускія землі, у сутык падышло да межаў ВКЛ. Пачала нарастаць канфрантацыя паміж Вільняй і Масквой як двума цэнтрамі аб’яднання старажытнарускіх зямель. Масква прад’яўляла прэтэнзіі не толькі на тыя рускія княствы, якія пакуль яшчэ заставаліся самастойнымі, але і на землі ВКЛ, населеныя праваслаўным, рускім па тагачаснай тэрміналогіі, насельніцтвам. Літоўская ж дыпламатыя імкнулася ўбіць клін у аб’яднаўчыя працэсы ў Маскоўскай дзяржаве і прадтрымлівала апошнія самастойныя княствы Русі. Акрамя таго, пачынаючы з канца XV ст., маскоўскі вялікі князь Іван III абвясціў сябе абаронцам інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва ВКЛ, умешваючыся тым самым ва ўнутраныя справы заходняга суседа. Сапраўды праваслаўе ў ВКЛ было не пануючым, а цярпімым веравызнаннем, але

цярпімасць гэта была дастаткова шырокай і адкрытага гвалту над праваслаўнымі ў гэты перыяд тут не было. Таму заявы Івана III пра ўціск на праваслаўных у ВКЛ належыць прызнаць надуманымі, закліканымі апраўдаць агрэсію супраць заходняга суседа.

З 1487 да 1492 г. на памежжы фактычна ішла неаб'яўленая вайна, якая суправаджалася ад'ездамі т. зв. "украінных" князёў на службу ў Маскву. А з 1492 па 1494 г. доўжылася ўжо першая маскоўска-літоўская вайна. У выніку яе да Маскоўскай дзяржавы адышлі Вяземскае княства і землі ў вярхоўях Акі. ВКЛ адмовілася ад прэтэнзій на Пскоў, Ноўгарад, Цвер. Мірная дамова 1494 г. была замацавана шлюбам вялікага князя Аляксандра з Аленай, дачкой вялікага князя маскоўскага Івана III. У 1500 г. пачалася чарговая маскоўска-літоўская вайна, якая доўжылася да 1503 г., калі было абвешчана 6-гадовае перамір'е і вызначаны новыя межы паміж дзяржавамі. Да Масквы адышла прыкладна трэцяя частка тэрыторыі ВКЛ з 19 буйнымі гарадамі, у т. л. Гомелем, Бранскам, Чарнігавам, Ноўгарад-Северскім, Старадубам і г.д.

Пры Жыгімонце Старым войны з Маскоўскай дзяржавай аднавіліся. Вайна 1507 – 1508 гг. нікому не прынесла поспеху (ВКЛ вярнула толькі Любеч і пяць смаленскіх валасцей) і скончылася т. зв. "вечным мірам", які доўжыўся толькі 4 гады. У 1512 г. вайна аднавілася. Яна цягнулася 10 гадоў. У ходзе яе 31 ліпеня 1514 г. быў страчаны Смаленск, а 8 верасня 1514 г. адбылася знакамітая бітва пад Оршай, у якой гетман ВКЛ князь Канстанцін Астрожскі дашчэнту разбіў больш чым удвая пераважаючае маскоўскае войска. У 1522 г. было падпісана 5-гадовае перамір'е, па ўмовах якога Смаленская зямля засталася за Масквой, шматлікі "маскоўскі палон" – за ВКЛ. Але мір так і не быў падпісаны з-за спрэчак наконт Смаленска. Таму перамір'е было прадоўжана ў 1527 і 1532 гг. У 1534 г. пачалася чарговая вайна, якая доўжылася да 1537 г., калі было падпісана 5-гадовае перамір'е, якое затым працягвалася ў 1542 і 1548 гг. (да 1562 г.). У выніку яе ВКЛ вярнула Гомель, аднак страціла шэраг тэрыторый на поўначы. У сярэдзіне XVI ст. ВКЛ сустрэлася з дамаганнямі Івана IV ужо на сучасныя беларускія і ўкраінскія землі. Гэта сведчыла аб пагрозе існаванню ВКЛ. З 1559 г. ВКЛ аказалася ўцягнутым у чарговы ваенны канфлікт, які меў самыя страшныя наступствы для яго далейшага лёсу.

Такім чынам, у канцы XV – пачатку XVI ст. у знешняй палітыцы ВКЛ адбылася пераарыентацыя і найбольш прыярытэтным напрамкам стаў усходні, дзе разгарнулася барацьба з Вялікім княствам Маскоўскім за так званую "спадчыну Рурыкавічаў". Барацьба гэта прывяла да значных тэрыторыяльных страт і прымушала ВКЛ шукаць лепшага паразумення са сваім партнёрам па уніі – Польшчай.

# ГЛАВА 3. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ ВКЛ

## § 1. Асаблівасці дзяржаўнага і саслоўнага ладу ВКЛ

К сярэдзіне XVI ст.у ВКЛ быў завершаны працэс фарміравання адносін феадальнай уласнасці, катэгорый феадалаў і залежнага насельніцтва, а таксама форм іх землеўладання і землекарыстання. Да гэтага часу ў ВКЛ сфарміраваліся чатыры саслоўі: феадалаў, духавенства, мяшчанства і сялянства. Феадалы (свецкія і духоўныя) і феадальна залежныя сяляне складалі асноўныя класы феадальнага грамадства.

Клас феадалаў меў сваю ўнутраную градацыю. На вяршыні іерархічнай лесвіцы стаяў уладар дзяржавы – вялікі князь (гаспадар), які лічыўся вярхоўным землеўладальнікам у краіне, а таксама меў свае ўласныя зямельныя ўладанні (гаспадарскі дамен). На прыступку ніжэй на іерархічнай лесвіцы стаялі буйныя феадалы, так званыя магнаты – князі і паны, якія валодалі зямлёй на правах вотчыны (спадчыннага трымання). Далей ішлі баяры (сярэднія і дробныя феадалы), якія складалі самую шматлікую групу сярод пануючага класа. З пачатку XV ст. на іх пачала распаўсюджвацца паланізаваная назва “шляхта”, якая паступова выцесніла першапачатковую. Яны валодалі зямлёй умоўна (пры ўмове нясення вайсковай службы на карысць вялікага князя або буйных феадалаў). Да шляхты адносілася таксама не толькі не толькі феадалы, а і свабодныя людзі, якія валодалі невялікімі зямельнымі надзеламі, арандавалі зямлю ў буйных феадалаў ці знаходзіліся ў іх на службе ў якасці ляснічых, канюшых і г.д.

Пануючы стан саслоўя феадалаў быў замацаваны законам. Так, у першы сістэматызаваны агульнадзяржаўны збор законаў феадальнага права Статут ВКЛ 1529 г., які меў другую (1566 г.) і трэцюю (1588 г.) рэдакцыі, быў уключаны раздзел “Аб вольнасцях шляхецкіх”. Ён замацоўваў за апошнімі ўсе правы і вольнасці, якія яны атрымалі з часоў Ягайлы і Вітаўта.

Роля розных груп феадалаў у палітычным жыцці не заставалася нязменнай. З развіццём палітычных працэсаў адбывалася пэўная эвалюцыя, якая прыводзіла да ўзвышэння новых груп зямельных уласнікаў за кошт страты прэстыжу папярэдніх. А гэта ў сваю чаргу адлюстроўвалася на развіцці палітычных інстытутаў і дзяржаўнага ладу ВКЛ, вызначала яго спецыфіку ў параўнанні з іншымі феадальнымі манархіямі.

Характар дзяржаўнага ладу не заставаўся нязменным. Ён таксама эвалюцыяніраваў пад уплывам барацьбы цэнтрабежных і цэнтраімклівых тэндэнцый. Калі спачатку ўлада вялікага князя ў межах яго дзяржавы (апрача залежных княстваў і абласцей) нічым не абмяжоўвалася і ён з’яўляўся адзінай крыніцай права, то ўжо ў XV ст. з’явілася яе абмежаванне шляхецкімі прывілеямі, а потым і магнацка-шляхецкімі палітычнымі органамі. І, як ні дзіўна, ВКЛ пачало набываць рысы абмежаванай, канстытуцыйнай манархіі менавіта ў той час, калі былі дасягнуты найбольшыя поспехі ў справе

цэнтралізацыі дзяржавы пры вялікім князю Вітаўце. Апошні ў сваёй палітыцы па дзяржаўнай кансалідацыі і барацьбе з буйнамі феадаламі абапіраўся на баярства-шляхту. На працягу XV – XVI стст. ішоў працэс пашырэння яе правоў за кошт астатніх груп пануючага класа. Гэтаму садзейнічалі прывілеі 1413, 1432, 1434 і 1447 гг. Першы з іх забяспечваў не толькі маёмасныя і асабістыя, але і саслоўна-палітычныя правы шляхты. Апошнія ўраўноўвалі шляхту ВКЛ у правах з адпаведных саслоўем у Польшчы, у тым ліку вызвалялі ад падаткаў. Адзнакай шляхецтва стала абавязковая вайсковая служба і ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай. Узвышэнню шляхты спрыялі войны, якія сталі амаль бесперапыннымі з канца XV ст. Да таго ж велікакняжацкая ўлада ў гэты час па-ранейшаму бачыла ў шляхце асноўную сілу ў барацьбе з магнатамі. Выкарыстоўваючы гэта, шляхта дабілася спадчыннага права на зямлю, стала ператвараць яе ў вотчыны. Атрымала яна і прывілеі ў гандлі. Паступова шляхта ўзвысілася палітычна. У канцы XV – першай палове XVI ст. шляхта была ўраўняна ў правах з магнатамі. Усё саслоўе землеўладальнікаў стала называцца шляхтай. Шляхецкае званне стала спадчынным.

Такім чынам, паступова складваўся палітычны лад ВКЛ як феадальнай манархіі, якая мела шэраг асаблівасцей у параўнанні з суседняй Маскоўскай дзяржавай. Скасаванне абласных княжанняў тут не суправаджалася пераносам функцый кіравання імі ў цэнтр, як гэта адбывалася ў Вялікім княстве Маскоўскім. У руках вялікага князя літоўскага не канцэнтравалася шмат штодзённай працы, як у маскоўскага ўладара і яго думы. Таму ў ВКЛ не стваралася амаль ніякіх цэнтралізаваных устаноў. Галоўным кіраўніком княства лічыўся вялікі князь літоўскі. Ён ажыццяўляў вышэйшы суд у дзяржаве, з’яўляўся вярхоўным галоўнакамандуючым, узначальваў знешнепалітычную дзейнасць. З XIV ст. пры асобе вялікага князя існаваў Савет па аналогіі з маскоўскай думай. Але ў адрозненне ад апошняй, Савет спачатку не быў дзяржаўнай установай. Гэта быў дарадчы орган пры вялікім князю, які ён фарміраваў па сваім меркаванні з ліку карысных і патрэбных людзей. На першым этапе галоўную ролю ў Савеце (Радзе) адыгрывалі князі. Але ў часы Вітаўта ў яе складзе пачалі пераважаць баяры, якія падтрымалі апошняга ў яго барацьбе за ўладу.

Паступова гэты дарадчы орган трансфарміраваўся ў прадстаўнічую ўстанову – Раду паноў. Паны Рады пачалі абмяжоўваць уладу вялікага князя. Склад Рады не быў жорстка вызначаным. У яе ўваходзілі: вышэйшая свецкая і духоўная знаць (апошняя – толькі каталіцкага веравызнання), вышэйшыя службовыя асобы: канцлер (кіраўнік дзяржаўнай канцылярыі), гетман (камандуючы ўзброенымі сіламі), падскарбі земскі (кіраўнік фінансаў), маршалкі земскі і дворны, ваяводы, кашталяны, некаторыя старосты. Гарадзельскі прывілей 1413 г. абмяжоўваў доступ у Раду праваслаўнай шляхты, але з канца XV ст. гэта забарона пачала парушацца. У звычайны час Рада складалася з вузкага кола асоб пры вялікім князю.

У другой палове XV – першай палове XVI ст. вялікія князі літоўскія часта выбіраліся каралямі польскімі, што прыводзіла да іх працяглай адсутнасці ў ВКЛ. У час адсутнасці гаспадара Рада цалкам кіравала дзяржавай. А прывілеі 1492 і 1506 гг. увялі заканадаўчае абмежаванне ўлады вялікага князя з боку паноў Рады. З гэтага моманту ўсе законы і распараджэнні агульнага характару вялікі князь павінен быў выдаваць толькі са згоды паноў Рады.

Гаспадар і Рада ў сваёй дзейнасці абапіраліся на сейм ВКЛ, на які запрашаліся прадстаўнікі прывілеяваных саслоўяў. Пачатак рэгулярнага склікання агульнадзяржаўных сеймаў прыпаў на канец XV ст. У XVI ст. за імі замацавалася назва “вялікі вальны сойм”. Спачатку на ім маглі прысутнічаць усе жадаючыя шляхцічы, але з 1512 г. было ўведзена абмежаванне – па 2 паслы ад кожнага павета. На сеймах абмяркоўваліся галоўныя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, заканадаўчыя акты, устанаўліваліся падаткі, вырашаліся судовыя справы, выбіраліся вялікія князі і зацвярджаліся кандыдаты на важнейшыя дзяржаўныя пасады. Так палітычны лад ВКЛ пачаў набываць рысы парламенцкай манархіі, бо ўлада вялікага князя пачала абмяжоўвацца яшчэ і сеймам. Так, у Статуце ВКЛ 1529 г. ужо гаварылася аб неабходнасці выдаваць прывілеі выключна на вальным сейме. Так развіццё канстытуцыяналізму, пачатак якому быў пакладзены ў XV ст. , прымала ўсё больш акрэсленыя абрысы.

У выніку таго, што ў ВКЛ не склалася якіх-небудзь спецыяльных устаноў цэнтральнага кіравання, акцэнт у распарадча-выканаўчых функцыях быў перанесены на месцы. Арганізацыя мясцовага кіравання была дастаткова складанай. У краіне захоўваліся яшчэ некаторыя старадаўнія княствы на чале з князямі, праўда, пазбаўленымі былых прывілеяў. Частка княстваў была ператворана ў ваяводствы на чале з ваяводамі. Больш дробнымі тэрытарыяльнымі адзінкамі былі паветы на чале са старостамі. На месцах быў створаны і дастаткова разгалінаваны адміністрацыйны апарат: кашталяны, гараднічыя, харужыя і г.д. У вёсках выканаўчую ўладу прадстаўлялі цівуны. Прадстаўнічымі органамі мясцовага кіравання ў ваяводствах і паветах з’яўляліся сеймікі, на якіх рашаліся некаторыя пытанні мясцовага кіраванні і выбіраліся паслы-дэпутаты на вальны сейм. Толькі ў выніку рэформ 1565 – 1566 гг. былі прыняты меры па ўпарадкаванню адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Замест розных зямель, княстваў увадзіліся ваяводствы, якія падзяляліся на паветы, а апошнія, у сваю чаргу, – на воласці.

Такім чынам, у XIV – XVI стст. у ВКЛ склалася дакладная і акрэсленая сістэма прадстаўнічай манархіі. Прадстаўнічыя ўстановы сур’ёзна абмяжоўвалі ўладу вялікага князя, спрыялі замацаванню федэратыўных асноў дзяржавы. Тым самым ВКЛ сваім палітычным ладам значна адрознівалася ад Маскоўскага княства, дзе к канцу XV ст. склалася жорстка цэнтралізаваная дзяржава з манапольнай , абсалютнай уладай вялікага князя.

## § 2. Эканамічнае развіццё беларускіх земель. Станаўленне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі і масавае запрыгоньванне сялян. Беларускі феадальны горад

У феадальную эпоху галоўным сродкам вытворчасці і галоўным багаццем краіны была зямля. Манапольнае права ўласнасці на зямлю належала класу феадалаў. Асноўным прадукцыйным класам, які працаваў на зямлі і выробляў прадукцыю, было сялянства. Яго права ўласнасці на зямлю абмяжоўвалася адносінамі землекарыстання. Першапачаткова вялікі князь літоўскі лічыўся вярхоўным уласнікам усёй зямлі. Але з канца XIV ст. побач з велікакняжацкай стала прызнавацца і прыватная ўласнасць на зямлю: княжацкая, баярская, царкоўная. Разам з тым землі падзяляліся на дзяржаўныя і прыватныя. Аднак да XVI ст. (1588 г.) не існавала дакладнага падзелу на асабістыя ўладанні вялікага князя і іншыя дзяржаўныя землі. Прыватныя ж землі падзяляліся на свецкія і царкоўныя маёнткі.

Вышэй ужо казалася пра змены ў становішчы шляхты – асноўнай часткі класа феадалаў. Паступова змяняўся і прававы статус сялян. Яны страчвалі права распараджацца зямлёй і станавіліся землекарыстальнікамі ў феадалаў. Разам з тым сяляне падзяляліся на катэгорыі ў адпаведнасці са сваім маёмасным і падатным становішчам, а таксама ў залежнасці ад той ступені асабістай свабоды, якой яны карысталіся.

Поўнай уласнасцю феадалаў была ***“чэлядзь нявольная”***, якая ўяўляла сабой катэгорыю хатніх рабоў. Чэлядзь не вяла сваёй уласнай гаспадаркі і жыла пры дварах феадалаў. Крыніцамі набору яе былі: купля-продаж, шлюб з нявольным чалавекам, нараджэнне ў няволі, пакаранне за злачынства. Акрамя працы на полі, чэлядзь выконвала і іншую працу ў гаспадарцы: апрацоўвала агароды, сады, пасвіла статкі, жанчыны ткалі лён і г.д.

Асноўную частку насельніцтва складалі ***“цяглыя”*** сяляне ўсіх найменняў. Яны мелі меншую ступень асабістай залежнасці ад уладальніка. Акрамя таго, яны карысталіся зямельнымі надзеламі, living рознымі па памеры і гаспадарчым складзе. Сялянскія надзелы складаліся звычайна з сядзібнай і агароднай зямлі, поля, сенажаці, часам – бабровых і рыбных ловен.

Для сялянскага землекарыстання была характэрна надзвычайная цераспалосіца ў размеркаванні надзелаў і сядзіб. Уся зямля, як тая, што знаходзілася ў карыстанні асобнай сям’і, ці “дыму”, так і тая, якой карысталіся ўсе жыхары вёскі (лясы, балоты, азёры, рэкі і г.д.), лічылася маёмасцю складаных сялянскіх згуртаванняў – абшчын. Абшчына несла адказнасць за своечасовае выкананне сялянскіх павіннасцей, а пазней стала ўдзельнічаць і ў землеўпарадкаванні сялянства.

За карыстанне зямлёй сяляне былі абавязаны плаціць уласніку пэўную рэнту. Формы рэнты былі розныя і падзяляліся на тры асноўныя віды: адработачную, грашовую і прадуктовую.

Адработачная рэнта была адной з самых распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі, яна называлася паншчынай. Паншчыну селянін павінен быў

адпрацаваць у гаспадарскім маёнтку. Часцей за ўсё гэта былі палявыя работы, на якіх селянін быў двойчы ў тыдзень разам з канём і сваім інвентаром: сякерай, касой, бараной. Цяглыя сяляне адбывалі паншчыну не толькі на полі. Некаторая частка сялян у якасці асноўнай павіннасці абкладалася чыншам. Такія сяляне называліся ***асаднымі***, ці чыншавымі. Чынш уяўляў сабой грашовую форму рэнты.

Разам з паншчынай і чыншам, якія былі асноўнымі павіннасцямі, сяляне выконвалі і дадатковыя: "талокі" – агульныя сязонныя гаспадарчыя работы, "гвалты", ці "згоны" – агульныя тэрміновыя работы, прывязаныя да пэўных выпадкаў: для рамонту дарог, гацей, для аблавы на звяроў, у выпадку стыхійных бедстваў і г.д.

К канцу XV ст. адным з асноўных відаў павіннасцей было дзякла – даніна прадуктамі. Яно было мядовым, бабровым, кунічным, збожжавым, піўным, сенным і г.д.

У залежнасці ад ступені асабістай свабоды цяглыя сяляне падзяляліся на ***"пахожых"*** і ***"непахожых"***. Спачатку ўсе сяляне мелі права пераходу ад аднаго ўладара да іншага, права сыходу з абшчыны. З развіццём інстытута феадальнага права на зямлю выяўлялася акрэсленая зацікаўленасць феадалаў у яго ліквідацыі.

Прывілей 1447 г. пачаў працэс юрыдычнага абгрунтавання прыгоннага права ў ВКЛ. Ён сцвярджаў, што сяляне, якія пражылі на зямлі феадала 10 год, станавіліся "непахожымі", старажыхарамі. Адзнакай старажыхарства было і спадчыннае валоданне зямлёй селяніна.

Разам з "непахожымі" ў феадальных маёнтках жылі і сяляне "пахожыя", ці вольныя.

***"Людзі служэбныя"***, ці "служкі", складалі трэцюю, даволі шматлікую катэгорыю насельніцтва. Па сваім эканамічным становішчы яны былі блізкія да цяглавага сялянства. Яны таксама былі землекарыстальнікамі, што сядзелі з сем'ямі на сваіх вотчынах. Але ад сялян яны адрозніваліся сваёй асаблівай службай. Галоўнай іх павіннасцю была вайсковая служба. У мірны час яны раз'язджалі па справах княжацкай і феадальнай адміністрацыі.

У сярэдзіне XVI ст. велікакняжацкі двор стаяў перад праблемай павелічэння прыбытковасці гаспадаркі. Частыя войны паставілі вялікага князя літоўскага ў залежнасць ад шляхты, бо толькі з яе згоды зараз можна было ваціраваць надзвычайныя падаткі на ўтрыманне наёмнага войска. Гаспадарскія маёнткі аддаваліся ў заставу пад вялікія грашовыя заклады. Выкупліваць іх удавалася далёка не заўсёды. Гэта прывяло да моцнага скарачэння велікакняжацкага дамену. Таму, каб павысіць прыбытковасць застаўшыхся маёнткаў, Жыгімонт Аўгуст у 1557 г. абвясціў аб правядзенні на дзяржаўных землях рэформы, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай ***"Валочная памера"***. Уся зямля падзялялася на роўныя надзелы, "валокі", памерам 21,3 га. кожны. Лепшыя ўрадлівыя землі забіраліся пад княжацкія фальваркі, у якіх сяляне адбывалі паншчыну. Кожная сялянская гаспадарка замацоўвалася за часткай

валокі. Сяляне гублялі права пераходу да іншага гаспадара і станавіліся прыгоннымі. З валокі вызначалася і сума розных павіннасцей. Яны былі рознымі для цяглых і асадных сялян. Так, цяглыя сяляне павінны былі за кожную валоку працаваць па 2 дні ў тыдзень у фальварку, а таксама плаціць натуральны аброк аўсом, сенам, хатняй птушкай, уносіць невялікі грашовы чынш і выконваць працоўную павіннасць у княжацкіх замках. Асадныя (чыншавыя) сяляне павінны былі плаціць чынш ад 66 да 106 грошаў у год. Пасля дзяржаўных маёнткаў "Валочная памера" была праведзена і ў маёнтках феадалаў. К канцу XVI ст. яна ўжо скончылася ў заходніх і цэнтральных абласцях Беларусі, некалькі пазней – ва ўсходніх і паўднёвых.

Зараз уся зямля, маёмасць сялян і самі сяляне сталі ўласнасцю феадала ці дзяржавы ў залежнасці ад таго, на чыёй зямлі яны сядзелі. Прынятыя ў хуткім часе Статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг. устанавілі спачатку 10-, а потым 20-гадовы тэрмін вышуку беглых сялян і вяртання іх гаспадарам. Гэта азначала канчатковае юрыдычнае афармленне прыгоннага права на Беларусі і ва ўсім ВКЛ.

У XIV – XVI стст. назіраўся значны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Гарады былі цэнтрамі рамяства і гандлю. Па памерах яны адрозніваліся, большая частка з іх былі невялікія. Гэта былі паселішчы з некалькіх вуліц з 200 – 300 дварамі. Найбольш буйнымі гарадамі на тэрыторыі Беларусі ў гэты час былі Вільня, Полацк, Магілёў, Віцебск, Мінск, Брэст, Гародня, Слуцк, Навагародак. Павялічваліся і паселішчы гарадскога тыпу – мястэчкі. Гарады і мястэчкі ўзнікалі як на дзяржаўных, так і на прыватнаўласніцкіх землях. Мястэчкі ў асноўным належалі феадалам. Каля 40% усіх гарадоў таксама былі прыватнаўласніцкімі. Гарады, што належалі феадалам, былі адміністрацыйнымі, гаспадарчымі і культурнымі цэнтрамі іх зямель. Жыхары гэтых гарадоў неслі феадальныя павіннасці на карысць свайго гаспадара.

Разам з прыватнаўласніцкімі былі і дзяржаўныя, ці велікакняжацкія гарады. Іх насельніцтва лічылася асабіста вольным. Аднак у XVI ст. у гэтых гарадах з'явіліся ўладанні свецкіх і духоўных феадалаў разам з залежным ад іх насельніцтвам. Прыватныя ўладанні ў велікакняжацкіх гарадах атрымалі назву "юрыдык". Яны складалі адасобленую частку горада і не падпарадкоўваліся ўладзе гарадскога самакіравання. Да другой паловы XVI ст. магдэбургскае права атрымалі амаль усе буйнейшыя гарады Беларусі.

Гарадское самакіраванне мела свае асаблівасці. Галоўным органам адміністрацыйнага кіравання горада быў магістрат. Ён складаўся з Рады (выбарнага органа кіравання) і лавы (суда). На чале Рады стаяў войт, як правіла, прызначаны вялім князем. Члены Рады – райцы – выбіраліся з ліку заможных гараджан. Радзе належалі не толькі функцыі кіраванні жыццём горада, але і суда. Але ж судовыя функцыі яна выконвала толькі па маёмасных і грамадзянскіх справах. Крымінальныя справы разбіраліся лавай. Члены лавы –

лаўнікі – выбіраліся гараджанамі. Месцам знаходжання Рады ў гарадах былі адмыслова пабудаваныя для гэтай мэты будынкі – ратушы.

Насельніцтва гарадоў фарміравалася за кошт беглых сялян, з рамеснікаў, перасеrange феадаламі ў горад, а таксама за кошт натуральнага прыросту. Сярод жыхароў гарадоў большасць (каля 80%) складалі беларусы. Акрамя таго тут жылі рускія, украінцы, літоўцы, палякі, яўрэі, немцы, татары. Большую частку насельніцтва складалі рамеснікі і гандляры. Жыхары гарадоў і мястэчак называліся мяшчанамі.

Рамеснікі адной спецыяльнасці былі аб'яднаныя ў цэхі. Яны ствараліся з мэтай абароны грамадскіх, палітычных і маёмасных правоў рамеснікаў. Гэта былі своеасаблівыя манапалізаваныя структуры, якія дапамагалі сваім стваральнікам пазбегнуць канкурэнцыі, а таксама засцерагчы мясцовы гарадскі рынак ад вырабаў іншагародніх і іншаземных рамеснікаў. У час ваенных дзеянняў цэхі пераўтвараліся ў вайсковыя атрады.

У XIV – XVI стст. развіваўся ўнутраны і знешні гандаль на беларускіх землях. Таргі і кірмашы сталі атрыбутам гаспадарчай дзейнасці гарадоў і мястэчак. Таргі, як правіла, наладжваліся 1 – 2 разы на тыдзень. Кірмашы існавалі толькі ў буйных гарадах і ладзіліся раз у год. На знешні рынак Беларусь пастаўляла жыта, сала, лес, паташ, футра, скуры, вырабы рамеснікаў. Імпартавалася жалеза, медзь, волава, свінец, металічныя вырабы, фламандскае і англійскае сукно, галандскае палатно, віно, соль, селядцы, прадметы раскошы.

Такімі былі асноўныя асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў XIV – XVI стст. Мацнела феадальная залежнасць сялян ад феадалаў. Ішоў працэс іх асабістага запрыгоньвання. Цэнтрамі культурнага жыцця, развіцця рамёстваў і гандлю станавіліся гарады. Узрастала іх роля ў эканоміцы Беларусі.

## ГЛАВА 4. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI стст.

### § 1. Фарміраванне беларускай народнасці

Народнасць – форма моўнай, тэрытарыяльнай, эканамічнай і культурнай супольнасці людзей, якая ўтвараецца гістарычна ў выніку кансалідацыі, зліцця плямён і папярэднічае ўтварэнню нацыі. Яна ўласціва рабаўладальніцкаму і феадальнаму ладу. Асноўнымі прыкметамі народнасці з'яўляюцца: адносная агульнасць мовы, агульнасць тэрыторыі, культуры, пэўныя гаспадарчыя сувязі, этнічная самасвядомасць і саманазва.

Працэс фарміравання беларускай народнасці заняў дастаткова працяглы перыяд і адбываўся пад уздзеяннем геаграфічна-кліматычных, сацыяльна-эканамічных, палітычных, царкоўна-рэлігійных фактараў, а таксама агульнаеўрапейскіх этнічных тэндэнцый.

Вядома, што на мяжы III – II тыс. да н.э. сучасную тэрыторыю беларусі засялялі плямёны фіна-ўграў, якіх з пачаткам веку металаў змянілі балты. У час

“Вялікага перасялення народаў” сюды з поўдня і захаду прыйшлі славяне, якія на працягу V – VIII стст. здолелі асіміляваць мясцовае балцкае насельніцтва і ўтварыць новыя раннефеадальныя этнічныя супольнасці крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. У далейшым у перыяд існавання старажытнабеларускіх княстваў адбывалася актыўнае ўзаемадзеянне гэтых супольнасцей, што было выклікана дзяржаўна-палітычнай і канфесійнай інтэграцыяй у межах Кіеўскай Русі. Менавіта ў гэты перыяд завяршылася складванне тыповых для славян рыс культуры, мовы і самасвядомасці. Разам з тым прысутнасць у рэгіёне моцных цэнтрабежных тэндэнцый абумовіла адасабленне гэтых тэрыторый. Таму з сярэдзіны XIII ст. і актывізаваўся працэс складвання беларускай народнасці.

Стымулюючым фактарам паскарэння кансалідацыі беларускага этнасу было ўтварэнне ВКЛ, у межах якога былі створаны неабходныя палітычныя ўмовы ўтварэння беларускай народнасці. У межах ВКЛ была створана адзіная сістэма дзяржаўнага кіравання, уведзена адзінае заканадаўства, што сведчыла аб складванні сістэмы палітыка-прававой цэнтралізацыі ў краіне, узмацненні палітычных сувязей паміж яе рознымі тэрыторыямі.

Аднак палітычнае аб’яднанне не знішчыла цалкам лакальнай аўтаномнасці асобных зямель. Наяўнасць жа ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ як аб’яднальных, так і сепаратысцкіх тэндэнцый ускладняла працэс фарміравання беларускай народнасці.

Эканамічнай асновай этнаўтваральных працэсаў стала далейшае развіццё сельскай гаспадаркі, удасканаленне рамяства. Узрастала роля буйных гарадоў Беларусі як цэнтраў рэгіянальнага і транзітнага гандлю, сродкаў умацавання тэрытарыяльна-эканамічных сувязей беларускіх зямель. Паступова ў ВКЛ усталявалася адзіная грашовая сістэма, ішоў працэс усталявання гандлёва-вымяральных стандартаў. Развіццё таварна-грашовых адносін і ўнутраных гаспадарчых сувязей садзейнічала інтэнсіфікацыі інтэграцыйных этнічных працэсаў у межах дзяржавы. Аднак працэсы гэтыя на ўзроўні дзяржавы стрымліваліся існаваннем склаўшыхся рэгіянальных, лакальных рынкаў.

Што датычыць сацыяльных фактараў, то далейшае развіццё феадальных адносін, паступовае ўсталяванне прыгоннага права садзейнічалі кансалідацыі шматлікіх катэгорый насельніцтва зямель Беларусі ў сацыяльныя групы з агульнымі правамі і абавязкамі для кожнай з іх. Сфарміраваліся чатыры асноўных саслоўі: шляхта, духавенства, мешчанства і сялянства. Гэты працэс садзейнічаў усталяванню больш шырокіх сувязей у межах кожнага саслоўя і паміж імі.

Пэўную этнакансалідуючую ролю адыгрываў канфесійны фактар. Канфесійныя антагантзмы актывізавалі складанне і ўмацаванне розных форм самасвядомасці насельніцтва. Прыкмета веры станавілася своеасаблівай прыкметай народа, а барацьба за веру з’яўлялася часткай барацьбы за яго самабытнасць.

Сукупнасць дзейнасці этнаўтваральных фактараў спрыяла фарміраванню беларускай народнасці і такіх яе агульных прыкмет, як этнічная тэрыторыя,

адносная агульнасць мовы, своеасаблівая матэрыяльная і духоўная культура, этнічная самасвядомасць і саманазва.

Ядро этнічнай тэрыторыі беларускай народнасці ў асноўных рысах адпавядала арэалам рассялення яе старажытных продкаў – крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Тут адбыліся значныя змены ў мове ўсходнеславянскага насельніцтва. На працягу XIV – XV стст. у ёй развіваліся такія спецыфічныя рысы беларускай гаворкі, як цвёрдае "р", "дзеканне" і "цеканне", "аканне" і "яканне", прыстаўныя гукі на пачатку слова. Фарміравалася гутарковая мова як сродак зносін паміж людзьмі. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага этнасу базіравалася на шэрагу элементаў, атрыманых у спадчыну са старажытнарускага часу. Другой яе складовай часткай былі новаўводзіны, якія закранулі сямейны і абшчынны побыт, навуку і асвету, фальклор, звычаі і абрады, мастацтва. Трэцяй часткай комплексу культуры былі элементы, запазычаныя ў суседніх народаў.

У XV – XVI стст. на тэрыторыі Беларусі з'явіўся шэраг новых тыпаў пасяленняў: мястэчка, фальварак, засценак, ваколіца. Змянілася планіроўка вёсак ў Заходняй і Цэнтральнай Беларусі. Гэтаму спрыяла правядзенне аграрнай рэформы 1557 г., калі ў гэтых раёнах было ўведзена падворнае землекарыстанне і распаўсюдзіўся пагонны тып двара з уласцівым яму размяшчэннем пабудоў у адзін рад. У Паўночнай і Усходняй Беларусі ўсталяваўся пераважна вяночны тып двара з размяшчэннем пабудоў па перыметры.

На ўсёй тэрыторыі Беларусі склаўся цэлы комплекс сельскагаспадарчых прылад працы (літоўская саха, драўляная частаплецёная барана, матыка, серп, цэп і інш.), дапаможных гаспадарчых пабудоў, ветраных і вадзяных млыноў.

У гэты час зацвердзіліся характэрныя для нашай тэрыторыі строі народнага адзення. На ўсёй тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны саматканыя суконныя спадніцы з клятчатай ці паласатай тканіны, стракатыя безрукаўкі, світкі, упрыгожаныя кажухі.

У XV – XVI стст. склалася і своеасаблівая духоўная культура новага этнасу. Былі выпрацаваны асноўныя віды і жанры беларускага фальклору: чарадзейныя казкі, абрадавая паэзія, песні (хрэсьбінныя, калыханкі, хаўтурныя, песні-плачы, валачобныя, вясельныя, жніўныя, жартоўныя). Узнік і новы эпічны жанр – гістарычныя песні і паданні. Жыццёвы і гаспадарчы вопыт народа знайшоў свай ўвасабленне ў шматлікіх прыказках, прымаўках і загадках.

Першымі тэатральнымі відовішчамі былі карагоды, народныя гульні, прадстаўленні скамарохоў. Паступова ў карагодзе зараджалася драматычнае дзеянне, якое адлюстроўвала розныя бакі жыцця. Узнік таксама народны лялечны тэатр – батлейка. У XVI ст. з'явіліся і новыя музычныя інструменты – скрыпка, цымбалы, дудка.

Адным са значных кампанентаў народнасці з'яўляецца самасвядомасць. У ВКЛ жыхар беларускіх зямель адрозніваў сябе ад іншых народаў. Значны час

насельніцтва беларускай тэрыторыі ВКЛ называла сябе рускім і сваю мову рускай. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена тым, што насельніцтва гэтых зямель у пераважнай большасці прытрымлівалася праваслаўя, або рускай веры. У выніку склалася так, што самасвядомасць і саманазва ў беларусаў фарміравалася пазней за іншыя этнічныя прыкметы. Але трэба адзначыць, што "рускае" насельніцтва ВКЛ ужо ў той час адрознівала сябе ад жыхароў Маскоўскай дзяржавы.

Такім чынам, у XV – XVI стст. завяршыўся працэс фарміравання беларускага этнасу пад уздзеяннем розных этнаўтвараючых фактараў.

## § 2. Культура Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI стст.

Беларусь у складзе ВКЛ уяўляла сабой рэгіён, адкрыты для знешняга культурнага ўздзеяння. Аднак адной з асноўных крыніц фарміравання самабытнай беларускай культуры быў фальклор, які служыў сродкам захавання нацыянальных традыцый і адыграў вырашальную ролю ў станаўленні беларускай мовы. Гістарычны шлях развіцця культуры Беларусі ішоў праз засваенне і развіццё каштоўнага народнага мастацкага вопыту.

Беларуская культура мела ў асноўных рысах сярэдневяковы характар, развівалася на феадальна-прыгоннай аснове. Культурныя здабыткі з'яўляліся прывілеяй вышэйшых саслоўяў. Значны ўклад у развіццё асветы, грамадска-палітычнай думкі, літаратуры, дойлідства, жывапісу, музыкі ўнесла царква. Калі праваслаўная царква з'яўлялася носьбітам візантыйска-старажытнарускіх традыцый, то каталіцкая прыўносіла элементы польскай і пераважна заходнееўрапейскай культуры. Геапалітычнае становішча Беларусі абумовіла яе ролю культурнага пасрэдніка паміж праваслаўным Усходам і каталіцкім Захадам. Гэта вяло да ўзаемаўзбагачэння розных культур здабыткамі іншых культурных асяродкаў.

**Развіццё старабеларускай мовы, літаратуры, летапісання.** У другой палове XIII – першай палове XVI стст. паралельна з працэсам стварэння беларускай арыгінальнай літаратуры ішло развіццё старабеларускай літаратурнай мовы, якая замацоўвала характэрныя асаблівасці гаворкі насельніцтва Беларусі.

Пісьмовыя помнікі з беларускамоўнай асновай умоўна можна падзяліць на тры групы: юрыдычна-дзелавыя, свецка-мастацкія і канфесійныя. З часоў Старажытнай Русі на беларускіх землях захавалася сістэма пісьмовага двухмоўя, калі старажытная славянская літаратурная мова задавальняла духоўныя інтарэсы і дзелавыя патрэбы насельніцтва, а царкоўнаславянская выкарыстоўвалася ў набажэнстве і рэлігійнай літаратуры. Паступова царкоўнаславянская мова страчвала на Беларусі свае пазіцыі. З'явілася так званая беларуская рэдакцыя царкоўнаславянскай мовы. Аб гэтым сведчыць мова такіх твораў канфесійнай літаратуры XV ст. як "Жыціе Аляксея, чалавека Божага", "Пакуты Хрыста" і інш.

Найбольш адчувальна на гаворку народа рэагавала юрыдычна-дзелавая пісьменнасць. Асноўнымі цэнтармі яе былі дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія і магістрацкія канцылярыі. Велікакняжацкая канцылярыя мела свой архіў, які называўся "Метрыкай Вялікага княства Літоўскага". Большасць актаў і грамат ВКЛ у XIV – XVI стст. былі напісаны кірыліцай на старабеларускай мове. Старабеларуская мова – афіцыйная мова дзяржаўных дакументаў і заканадаўства – канчаткова сфарміравалася ў XVI ст.

Прамежкавае становішча паміж юрыдычна-дзелавой пісьменнасцю і канфесійнай займала мова свецкіх мастацка-літаратурных твораў. У XIII – XVI стст. на Беларусі па-ранейшаму была шырока распаўсюджана царкоўна-рэлігійная літаратура: кнігі Бібліі, жыціі святых, апокрыфы. Творы былі перакладныя ці арыгінальныя. Сярод свецкіх літаратурных твораў асаблівай папулярнасцю карысталіся такія перакладныя рэчы, як "Александрыя", "Троя", "Трыстан і Ізольда" і г.д.

З усіх жанраў беларускай літаратуры перыяду яе станаўлення найбольш дынамічна развіваліся летапісы – гістарычна-літаратурныя творы з апісаннем падзей па гадах.

Беларуска-літоўскія летапісы падзяляюцца на 4 групы: "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх", "Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.", "Хроніка Вялікага княства Літоўскга і Жамойцкага", "Хроніка Быхаўца".

"Летапісец вялікіх князёў літоўскіх" – адзін з першых твораў уласнабеларускай гістарычна-дакументальнай літаратуры. Ён быў напісаны невядомым аўтарам каля 1430 г. у Смаленску ў форме суцэльнага апавядання без выкарыстання дат. Тут выкладаецца гісторыя ВКЛ з 1341 г. (ад смерці Гедыміна) да канца XIV ст. Асноўную ўвагу храніст надаў апісанню барацьбы за ўладу паміж Кейстутам і Ягайлам, шмат расказваў пра дзейнасць Вітаўта. Галоўная ідэя "Летапісца ..." – абгрунтаванне цэнтралізатарскай палітыкі літоўскіх вялікіх князёў.

"Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г." – помнік першага беларускага летапіснага звода. Храналагічна ён ахоплівае перыяд ад сярэдзіны XI ст. да 1446 г. У ім змешчаны як рускія летапісы, так і творы мясцовага паходжання: "Смаленская хроніка", "Пахвала Вітаўту", "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх".

У пачатку XVI ст адбыліся некаторыя змены ў летапісным жанры: аўтары сваю ўвагу амаль цалкам сканцэнтравалі на гісторыі ВКЛ. У 20-я гг. XVI ст. была сворана "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага", дзе выкладалася гісторыя ВКЛ ад легендарнага князя Палемона да Гедыміна. У гэтым творы, напісаным у жанры гістарычнай аповесці, сцвярджалася паходжанне літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў.

"Хроніка Быхаўца" – яшчэ адзін найбольш поўны агульнадзяржаўны летапісны звод. Сваю назву яна атрымала ад прозвішча пана А. Быхаўца, якому належаў адзіны вядомы рукапісны экземпляр. "Хроніка" апісвае падзеі палітычнай гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пачатку XVI ст. У ім упершыню была створана найбольш поўная сістэматызаваная палітычная

гісторыя ВКЛ на працягу значнага прамежку часу. Цэнтральная тэма твора – ваенна-патрыятычная. Храніст шмат увагі надаў апісанню паходаў і бітваў, ратных подзвігаў суайчыннікаў.

У другой палове XVI ст. летапісы пачалі паволі адміраць, саступаючы месца іншым гістарычным творам.

**Пачатак Адраджэння на Беларусі. Узнікненне кнігадрукавання. Ф. Скарына і М. Гусоўскі.**

Беларускую культуру не абмінула такая з’ява як Адраджэнне, або Рэнесанс – эпоха станаўлення і росквіту ранняй буржуазнай культуры. Адраджэнне было абумоўлена якаснымі зменамі ў эканамічным і палітычным жыцці краін: зараджэннем капіталістычных адносін, фарміраваннем нацыянальных дзяржаў і абсалютных манархій, узмацненнем антыфеадальнай і рэлігійнай барацьбы. Вялікія геаграфічныя адкрыцці, з’яўленне кнігадрукавання, развіццё навукі і тэхнікі прывялі да ўзнікнення новай, пераважна свецкай культуры. На гэтай аснове сфарміраваўся новы, гуманістычны светапогляд. Гуманізм – філасофска-светапоглядная пазіцыя, яка сцвярджае высокую годнасць чалавека – творцы зямнога шчасця, прызнае права на свабоднае развіццё яго здольнасцей, абараняе ідэалы справядлівасці, чалавекалюбства, свабоды і дасканаласці асобы.

У канцы XV – пачатку XVI ст. склаліся перадумовы Рэнесанса на Беларусі: рост гарадоў, фарміраванне беларускай народнасці, ажыўленне грамадска-палітычнай дзейнасці і г.д.

Прадстаўніком рэнесансавай культуры на Беларусі быў першадрукар, гуманіст і асветнік Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1551 гг.)

У Празе Ф. Скарына пры дапамозе заможных віленскіх і полацкіх мяшчан заснаваў друкарню. Тут 6 жніўня 1516 г. выйшла з друку першая кніга “Псалтыр”. Першадрукар выдаў пераважную частку Старога Запавету Бібліі, прычым выбраў найбольш важныя кнігі.

У 1520 г. Ф. Скарына пераехаў у Вільню, дзе ў 1522 г. выйшла ў свет “Малая падарожная кніжка” – зборнік рэлігійных і свецкіх твораў. Як і апошняе выданне Ф. Скарыны “Апостал” (1525 г.), “Малая падарожная кніжка” была больш таннай, а значыць і больш даступнай шырокаму колу насельніцтва.

Ф. Скарына выступіў стваральнікам новага літаратурнага жанру – прадмоў. Яны змяшчалі ў сабе кароткі змест твора. Ф. Скарына ўнёс значны ўклад у распрацоўку беларускай літаратурнай мовы.

Выдатным дзеячам беларускай культуры быў паэт-гуманіст, прадстаўнік навалацінскай літаратурнай школы М. Гусоўскі. Нарадзіўся ён у сям’і велікакняжацкага лоўчага і атрымаў адукацыю ў ВКЛ, Польшчы, Італіі.

У 1518 г. М. Гусоўскі трапіў у Рым у складзе польскай дыпламатычнай місіі. Па заказу папы рымскага Льва X у 1522 г. М. Гусоўскі стварыў свой лепшы твор “Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго”. Напісаная на класічнай латыні, паэма не засталася толькі апавяданнем пра паляванне на зубра, яна стала творам, дзе адлюстравана жыццё народа і лёс краіны ў

пераломны момант гісторыі. Праз усе часткі паэмы праходзіць тэма Радзімы, а зубр выступае як алегарычны вобраз роднага краю.

**Архітэктура і выяўленчае мастацтва.**

На працэс станаўлення і развіцця беларускай архітэктуры і выяўленчага мастацтва значна паўплывалі старажытнарускія традыцыі, а таксама лепшыя дасягненні архітэктуры і мастацтва заходнееўрапейскіх краін. Шырокае распаўсюджанне на Беларусі набыла готыка – мастацкі стыль, запазычаны з Заходняй Еўропы. Найбольш тыповыя гатычныя пабудовы вылучаліся вялікай вышынёй, стромкім сілуэтам і вертыкальнымі лініямі, вузкімі стрэльчатымі парталамі і вокнамі з каляровымі вітражамі, высокімі вежамі.

Готыка на Беларусі была прадстаўлена шматлікімі абарончымі збудаваннямі – замкамі, якія адначасова з’яўляліся адміністрацыйнымі, палітычнымі, эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі. Мураваныя замкі пачалі будавацца ў першай палове XIV ст. Узнікла абарончая сістэма замкаў у Лідзе, Навагародку, Крэве, Вільні і Троках.

Абарончая сістэма складалася з замкаў розных тыпаў. Адны з іх будаваліся на ўзвышшах, другія размяшчаліся ў нізіннай балоцістай мясцовасці на штучным насыпе. Гэта быў новы тып замкаў – кастэлі. Да тыпу кастэляў належалі, напрыклад, Лідскі замак, пабудаваны ў 30-я гг. XIV ст., замак у Крэве, які спалучаў рысы абарончага збудавання і велікакняжацкай рэзідэнцыі.

Акрамя будаўніцтва кастэляў, перабудоўваліся і старыя драўляныя замкі. Да іх адносіўся і Навагародскі замак, які існаваў у X – XVII стст. Ён пэўны час з’яўляўся рэзідэнцыяй вялікіх князёў літоўскіх, шмат разоў перабудоўваўся.

У пачатку XVI ст. з’явіўся Мірскі замак, пабудаваны магнацкім родам Ільінічаў па тыпу кастэляў. Аднак у першых гаспадароў замка не хапіла грошай на яго дабудову, а пазней гэты род вымер. У1568 г. замак перайшоў да Радзівілаў, якія і завяршылі замак у стылі рэнесанса.

Разам з замкамі другім пануючым архітэктурна-кампазіцыйным цэнтрам гарадскіх пасяленняў былі гандлёвыя плошчы, дзе размяшчаліся будынкі магістратаў, купецкія лаўкі, крамы.

Значнае месца ў архітэктуры азначанага перыяду займала культавае дойлідства. У сувязі з пашырэннем каталіцызму на ўсёй тэрыторыі Беларусі пачалося будаўніцтва касцёлаў. У гатычным стылі быў пабудаваны Троіцкі касцёл у вёсцы Ішкалдзь (Баранавіцкі раён), захаваўшыяся да нашых дзён касцёлы ў вёсцы Усялюб (Навагрудскі раён) і ў Іўі. У культавай архітэктуры канца XV – першай паловы XVI ст. з’яўляецца новы тып пабудоў – інкастэляваныя храмы, прыстасаваныя да абароны. На Беларусі да нашых дзён захаваўся шэраг абарончых храмаў: Сынкавіцкая царква-крэпасць, Мураванкаўскай (Маламажэйкаўская) царква, Барысаглебская царква ў Навагародку, Спаса-Праабражэнская царква ў Заслаўі.

У выяўленчым мастацтве Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVI стст. вылучаюцца іканапіс, фрэскі, кніжная мініяцюра, гравюра, арнамент, драўляная разьбяная скульптура.

Творы манументальнага жывапісу гэтага перыяду амаль не захаваліся (дайшлі толькі фрагменты фрэсак).

Найбольш актыўна развіваўся іканапіс. Абразы захоўвалі традыцыі старажытнарускага і візантыйскага мастацтва, напрыклад, абразы “Маці боская Замілаванне” (канец XIV – пачатак XV ст.), “Маці боская Ерусалімская” (першая палова XV ст.), “Маці боская Смаленская” (мяжа XV – XVI стст.) і інш. З пачаткам XVI ст. пад уплывам рэнесансавых павеваў у абразах персанажы пачалі надзяляцца індывідыяльнымі рысамі, у сюжэце з’яўляюцца элементы пабытовага, этнаграфічнага характару (абраз “Пакланенне вешчуноў” (каля 1514 г.) з в. Дрысвяты і г.д.).

З распаўсюджаннем ідэй Адраджэння звязана і развіццё свецкага жывапісу, пераважна партрэтнага па жанры. Захаваліся выявы партрэта Ягайлы ў касцёле ў Сандаміры. У Трокскім замку знаходзіцца шэраг фрэсак, прысвечаных Вітаўту. У XV ст. партрэт ужо перастае належаць да твораў манументальнага жывапісу і паступова набывае самастойнае значэнне. Шырокае распаўсюджанне партрэта прыходзіцца на XVI ст. Тады сярод вярхоў грамадства з’яўляецца мода на зборы карцін і ствараюцца цэлыя партрэтныя галерэі (Радзівілаў, Сапегаў, Тышкевічаў і інш.).

У рамках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст. развівалася размалёўка па дрэву, чаканка па металу, выраб керамікі. Беларускія майстры добра ведалі тэхналогію металаапрацоўкі, выраблялі металічныя ўпрыгожванні і посуд. Развівалася касцярэзная вытворчасць. Беларускія рамеснікі таксама стваралі розныя рэчы з каменю: надмагільныя крыжы і бюсты, статуі, рэльефы.

Разнавіднасцю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з’яўлялася кафлярства. У пачатку XVI ст. беларускія кафляры авалодалі тэхнікай стварэння шматколернай паліхромнай кафлі.

Побач з іншымі відамі выяўленчага мастацтва на Беларусі развівалася скульптура. Скульптурныя творы ўпрыгожвалі каталіцкія манастыры, касцёлы, палацы феадалаў.

Такім чынам, другая палова XIII – першая палова XVI стст. – яркі і самабытны перыяд у развіцці беларускай культуры, час росту палітычнай і патрыятычнай свядомасці беларусаў, сінтэзу рэнесансава-гуманістычных павеваў і сярэдневяковых рэлігійных традыцый ў духоўным жыцці, пашырэння культурных сувязей паміж беларускім і іншымі народамі.

# РАЗДЗЕЛ III. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (1569 – 1795)

## ГЛАВА 1. ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ. УТВАРЭННЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

### § 1. Гістарычныя ўмовы Люблінскай уніі

У сярэдзіне XVI ст. склаліся ўмовы, якія садзейнічалі ператварэнню уніі паміж ВКЛ і Польшчай з дынастычнай і персанальнай у рэальную:

- Жыгімонт Аўгуст, кароль польскі і вялікія князь літоўскі, не меў нашчадкаў і палякі баяліся, што спыніцца асабістая унія, якая злучала дзве краіны;
- у ВКЛ існаваў пласт дробнай шляхты, які падтрымліваў унію;
- дзяржаўны і палітычны лад Польшчы і ВКЛ зблізіліся;
- склаліся спрыяльныя знешнія ўмовы. У 1558 г. Расія пачала вайну з Лівонскім ордэнам. ВКЛ было ўцягнута ў гэтую вайну. Вайна выцягнула са скарбу ўсе сродкі, патрабаваўся саюзнік. Позірк быў кінуты на захад, таму што княства мела значны вопыт сужыцця з Польшчай.

Чарговая спроба заключыць унію прызначалася на сейм у Любліне, які пачаўся 10 студзеня 1569 г. і працягваўся амаль 6 месяцаў. Кожны з бакоў ставіў свае ўмовы, якія не прымаліся супрацьлеглым. Ніхто не саступаў. Калі паслы Вялікага княства ўбачылі пагрозу гвалтоўнага заключэння уніі на непрымальных для іх умовах, яны 1 сакавіка 1569 г. пакінулі Люблін. Тады польскі бок пайшоў на дэманстрацыю сілы. Скарыстаўшы цяжкае знешнепалітычнае становішча княства, польскія феадалы дабіліся ад Жыгімонта Аўгуста выдання ўказаў аб далучэнні да каралеўства Польскага Падляшша, Валыні, Падолля і Кіеўшчыны. На працягу сакавіка – чэрвеня 1569 г. гэтыя землі былі ўключаны ў склад Польшчы, што аслабіла і без таго падарваную Лівонскай вайной эканоміку Вялікага княства. Яго тэрыторыя звузілася ў асноўным да літоўскіх і беларускіх зямель. Прычым на значнай частцы апошніх гаспадарыла маскоўскае войска. У такіх умовах прадстаўнікі ВКЛ вымушаны былі зноў сесці за стол перамоў.

1 ліпеня 1569 г. быў падпісаны акт Люблінскай уніі. Згодна з ёй, ВКЛ і Польшча злучаліся ў адзін дзяржаўны арганізм – Рэч Паспалітую на чале з адным выбарным гаспадаром. Абранне павінна было адбывацца ў Варшаве, а каранацыя—у Кракаве. Абранне вялікага князя літоўскага спынялася, хаця тытул “вялікі князь літоўскі і рускі” і назва “Вялікае княства Літоўскае” захоўваліся. Спадчыннае права на княства перадавалася Польшчы. Асобныя сеймы для ВКЛ і Польшчы скасоўваліся. Агульныя сеймы павінны былі склікацца толькі ў Польшчы. Пастановы, супрацьлеглыя уніі, скасоўваліся, ліквідавалася мытня паміж краінамі. Унія абвясціла ўвядзенне адзінай манеты, дазвол усім жыхарам дзяржавы набываць маёнткі, зямлю ў любой частцы Рэчы Паспалітай. Павінна была стаць агульнай знешняя палітыка. Такім чынам, вынікам Люблінскай уніі была інкарпарацыя княства ў Польскае каралеўства.

# ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАСЛЯ ЛЮБЛІНА (другая палова XVI – першая палова XVII ст.)

## § 1. Грамадска-палітычны лад Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча княства ў складзе Рэчы Паспалітай

Рэч Паспалітая была канстытуцыйнай, саслоўнай манархіяй, на чале з выбарным каралем. Заканадаўчым органам у ёй быў двухпалатны агульны (вальны) сейм, які складаўся з сената (рады) і пасольскай ізбы. У сенат уваходзілі найбольш знатныя феадалы ў колькасці каля 150 чалавек. Ніжэйшай палатай сейма была пасольская ізба, якая складалася з дэпутатаў ад шляхецкіх павятовых сеймікаў. Яны склікаліся за шэсць тыдняў да агульнадзяржаўнага сейма і не толькі выбіралі паслоў на апошні, але і выпрацоўвалі інструкцыі, якія паслы павінны былі праводзіць на вальным сейме. Колькасць дэпутатаў пасольскай ізбы перавышала 200 чалавек.

Вальныя (агульныя) сеймы разглядалі і прымалі пастановы на асобных пасяджэннях сената і пасольскай ізбы. На агульных пасяджэннях у выпадку супадзення пастаноў яны прымаліся і пасля зацвярджэння каралём набывалі сілу закона. Пастановы прымаліся аднагалосна. Група дэпутатаў альбо адзін дэпутат мог сказаць “не дазваляю” і пастанова прыпынялася. Гэта права ***liberum veto*** (свабоднае вета) разглядалася як адна з важнейшых “залатых шляхецкіх вольнасцей”.

На чале выканаўчай улады стаяў кароль, пры абранні якога таксама захоўвалася права вета. Кароль узначальваў сенат, “паспалітае рушанне”, склікаў сеймы, прызначаў на вышэйшыя ўрадавыя пасады. Улада караля была абмежавана “залатымі шляхецкімі вольнасцямі”. З кожным прэтэндэнтам на трон заключаўся ***“Pacta conventa”*** – дагавор, згодна з якім кароль ускладаў на сябе шэраг абавязкаў па вырашэнні некаторых унутраных і знешніх праблем. У 1573 г., у час абрання Генрыха Валуа, былі распрацаваны “Генрыхавы артыкулы”, згодна з якімі кароль траціў права без згоды сейма ўстанаўліваць новыя падаткі і пошліны, склікаць агульнае апалчэнне, абавязваўся мець пры сабе пастаянную раду з 16 сенатараў, якая ажыццяўляла фактычнае кіраўніцтва дзяржавай. і г.д. Калі кароль дзейнічаў насуперак праву і сваім абавязкам, то шляхта мела права склікаць ***канфедэрацыі*** (саюзы ўзброенай шляхты) і пачаць ***“рокаш”*** – узброенае паўстанне супраць караля. Свабоднае вета і канфедэрацыі былі легальнай формай феадальнай анархіі.

У часы бескаралеўя існавала асобая пасада інтэррэкса, якую звычайна займаў прымас польскай каталіцкай царквы. Ён склікаў сеймы для абрання новага караля: канвакацыйны, элекцыйны і каранацыйны.

Рэч Паспалітая з’яўлялася феадальна-прыгонніцкай дзяржавай. Пануючым класам былі землеўладальнікі: магнаты (паны), сярэдняя і дробная шляхта.

Толькі паны і шляхта мелі права валодаць зямлёй. Шляхціца мог судзіць толькі шляхецкі суд. Шляхта была свабодная ад пабораў. Адзінай павіннасцю яе з'яўлялася вайсковая служба.

У склад пануючага класа ўваходзіла і духавенства, якое валодала велізарнай зямельнай маёмасцю. Духавенства збірала дзесяціну з каралеўскіх і шляхецкіх маёнткаў. Прадстаўнікі вышэйшага кліру ўваходзілі ў склад сената.

Польская праграма уніі мела на мэце стварэнне унітарнай дзяржавы і ВКЛ адводзілася роля правінцыі Рэчы Паспалітай. Аднак у Люблінскім акце былі закладзены супярэчнасці, якія дапускалі магчымасць будавання як унітарнай, так і федэратыўнай ці канфедэратыўнай дзяржавы. Захоўваліся тытулы "Вялікага княства Літоўскага" і "вялікага князя літоўскага", дзейнічаў амаль не парушаны апарат дзяржаўнага кіравання, меліся свой скарб, дзяржаўная пячатка, свае войска і свой звод законаў – Статут ВКЛ.

Узаемаадносіны паміж дзяржавамі не спрыялі ўтварэнню унітарнай дзяржавы. Напярэдадні Люблінскай уніі Жыгімонт Аўгуст абяцаў дапамогу палякаў у вайне, але вальны сейм у 1573 г. выдаў пастанову аб вядзенні Лівонскай вайны на сродкі ВКЛ.

Пасля Люблінскай уніі ў ВКЛ дзейнічаў генеральны сеймік, які з цягам часу набываў рысы заканадаўчага органа княства. Адраджэнню яго заканадаўчай кампетэнцыі спрыялі наступныя абставіны. ***Па-першае***, сеймік складаўся з сенатараў і паслоў ад усіх зямель княства, што надавала яго пастановам агульнадзяржаўнае значэнне. ***Па-другое***, у час бескаралеўя ўсе сеймікі Рэчы Паспалітай бралі ў свае рукі і заканадаўчую, і адміністрацыйную, і судовую ўладу. ***Па-трэцяе***, агульны сейм з-за сваёй слабай згуртаванасці і "liberum veto" паціху ператвараўся ў кангрэс, дзе пытанні не вырашаліся, а абмяркоўваліся. У 1673 г. сейм ухваліў пастанову: кожны трэці сейм збіраць у Гродне, а не ў Кароне. На сеймах у Гродне маршалкам выбіраўся адзін з мясцовых дэпутатаў. Гэты акт юрыдычна прызнаў існаванне ВКЛ у якасці асобнага дзяржаўнага арганізма.

У ВКЛ захаваўся цалкам адміністрацыйны апарат кіравання. З 1581 г. пачаў дзейнічаць Галоўны трыбунал ВКЛ – вышэйшая судовая ўстанова. Таксама новы Статут ВКЛ І588 г. не ўспомніў аб Люблінскай уніі. Ён складаўся з 14 раздзелаў і 487 артыкулаў. У трэцім раздзеле абвяшчалася самастойнасць Вялікага княства Літоўскага, недатыкальнасць яго межаў, яго тэрытарыяльная цэласнасць. Статут ВКЛ І588 г. забараняў іншаземцам набываць у княстве землі, маёнткі, пасады. А палякі – уладальнікі падараваных у княстве маёнткаў – павінны былі несці земскую службу, у адваротным выпадку яны трацілі правы на ўладанні. Статут ВКЛ 1588 г. заставаўся галоўнай крыніцай права на Беларусі да 1840 г. Але паколькі ВКЛ уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, то неаднаразова рабіліся спробы прымаць новыя законы, якія пярэчылі нормам Статута. Але, нягледзячы на гэта, Статут ВКЛ 1588 г. падвёў заканадаўчую аснову пад новыя ўзаемаадносіны паміж княствам і Польшчай.

## § 2. Барацьба беларускага народа супраць польска-каталіцкай экспансіі

На шляху да рэлігійнай еднасці народаў Рэчы Паспалітай было шмат перашкод. ***Па-першае***, да сярэдзіны XVI ст. насельніцтва Польшчы і ВКЛ мела розныя веравызнанні. У Польшчы пануючай рэлігіяй быў каталіцызм, а ў ВКЛ – праваслаўе (Беларусь і Украіна) і пратэстантызм (Літва). ***Па-другое***, каталіцызм і праваслаўе перажывалі крызіс. ***Па-трэцяе***, былі вельмі складаныя рэлігійныя абставіны.

Праваслаўе да 1385 г. было амаль дзяржаўнай рэлігіяй. Але пасля Крэўскай уніі пануючай рэлігіяй у ВКЛ стала каталіцтва. На пачатку XVI ст. каталіцкая рэлігія ўвайшла ў паласу крызісу. Сутнасць яго зводзілася да крытычных адносін шляхты як да каталіцкага культу, так і да арганізацыі касцёла і яго палітыкі. На глебе барацьбы паміж свецкай і духоўнай уладамі прарасла Рэфармацыя.

Рэфармацыя – грамадска-палітычны і рэлігійны рух, накіраваны супраць каталіцкай царквы як ідэйнай асновы феадалізму. У Рэфармацыі можна выдзеліць тры напрамкі:

1) каралеўска-княжацкі, які абараняў інтарэсы манархаў і свецкіх феадалаў ва ўмацаванні сваёй улады і захопе зямельных багаццяў царквы;

2) бюргерска-буржуазны з яго прапаведдзю “мірскога аскетызму” і рэспубліканскага ўладкавання царквы;

3) народны, які патрабаваў ліквідацыі царквы, феадальнага прыгнёту і ўзаконення роўнасці.

Шляхту і заможных гараджан Рэфармацыя прывабіла магчымасцю падарваць магутнасць царквы, якая ўшчымляла іх правы. У адрозненне ад заходнееўрапейскай, Рэфармацыя на Беларусі праходзіла на феадальным сацыяльна-эканамічным базісе, а яе асноўнай рухаючай сілай была феадальная знаць.

Найбольшае пашырэнне ў княстве атрымаў кальвінізм, абаронцам якога стаў Мікалай Радзівіл Чорны. Ён заснаваў у Вільні першую пратэстанцкую абшчыну. На тэрыторыі Беларусі было арганізавана больш за 50 кальвінісцкіх абшчын, а пры іх – цэрквы, школы, друкарні. Найбуйнейшымі рэфармацыйнымі цэнтрамі на Беларусі сталі Бярэсце, Нясвіж, Віцебск, Навагародак, Клецк, Іўе, Слуцк, Койданава і іншыя. Вакол іх групаваліся выдатныя вучоныя, прапаведнікі, пісьменнікі, кнігавыдаўцы.

У 60-я гг. XVI ст. на Беларусі, у Літве і на Украіне з кальвінізму вылучыўся больш радыкальны напрамак – арыянства, ці антытрынітарызм. Яго ідэолагі (Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і іншыя) патрабавалі радыкальных сацыяльных пераўтварэнняў, асуджалі прыгонніцтва, прапаведвалі агульнасць маёмасці, што прывяло іх да канфлікту з кальвінісцкай шляхтай. У сярэдзіне XVII ст. члены арыянскіх абшчын былі выгнаны з Рэчы Паспалітай. У другой палове XVII ст. пад ударамі Контррэфармацыі Рэфармацыя сыходзіць з гістарычнай арэны.

Папства зрабіла стаўку ў выратаванні каталіцкай царквы на ордэн езуітаў. У ВКЛ езуіты з'явіліся на наступны год пасля Люблінскай уніі, выклікаными віленскім біскупам для барацьбы з Рэфармацыяй. Галоўным ідэолагам Контррэфармацыі на Беларусі і ў Літве стаў Пётр Скарга. Правячыя колы Рэчы Паспалітай надзялялі езуітаў вялікімі зямельнымі ўладаннямі. Эканамічная моц забяспечыла ім магутны ідэалагічны і палітычны ўплыў.

Езуіты ўзялі ў свае рукі адукацыю – адкрылі акадэмію ў Вільні і 11 калегіумаў на Беларусі, пакрылі яе сеткай сваіх касцёлаў і кляштароў, заняліся дабрачыннай дзейнасцю. Адноўлены і ўзмоцнены каталіцызм пачаў выціскаць пратэстанцкія абшчыны. К канцу XVII ст. Контррэфармацыя ў княстве перамагла.

Да сярэдзіны XVII ст. – польскія каралі практычна падпарадкавалі сабе праваслаўную царкву.

Распрацаваная Трыдэнцкім саборам праграма рэстаўрацыі касцёла прадугледжвала распаўсюджванне яго ва ўсходнеславянскім свеце. Заснаванне Маскоўскага патрыярхату ў 1589 г. узмацняла праваслаўе на рускіх землях. Таму Ватыкан паспяшаўся з набліжэннем да сябе другой часткі гэтага свету – беларуска-украінскай – праз унію. Яго намеры супалі з імкненнем палітыкаў умацаваць Рэч Паспалітую праз адзінавер'е ўсіх яе падданых.

Некаторых мясцовых праваслаўных лідэраў (К. Астрожскі, І. Пацей, К. Тарлецкі і іншыя) прывабіў сваёй жыццяздольнасцю каталіцкі захад. Яны ўбачылі шлях да пераадолення духоўнага крызісу ў заключэнні уніі з Рымам. Гэты шлях быў рэалізаваны ў выглядзе Берасцейскай уніі.

Новы накірунак хрысціянства – уніяцтва – быў аформлены на Берасцейскім саборы 6 – 9 кастрычніка 1596 г. Ён прадугледжваў захаванне праваслаўнай абраднасці, царкоўна-славянскай мовы ў набажэнстве, але прызнаваў вяршэнства папы рымскага, каталіцкае веравучэнне.

Але замест спакою унія стала крыніцай раздораў. **Першым** напрамкам рэлігійнай барацьбы была літаратурна-багаслоўская палеміка. **Другім** напрамкам была парламенцкая барацьба. На соймах паміж праваслаўнымі і уніятамі адбываліся вострыя спрэчкі. **Трэцяй** формай рэлігійнай барацьбы была адміністрацыйная барацьба: закрыццё праваслаўных цэркваў, перадача іх і манастыроў уніятам.

Па Беларусі пракацілася хваля антыуніяцкіх выступленняў. Першай акцыяй стала паўстанне Севярына Налівайкі (1595 – 1596). З пачатку XVII ст. усё большую вагу пачалі набываць казакі. Яны пачалі бараніць пакрыўджаную царкву. У 1648 г. на барацьбу з прыгнятальнікамі ўзнялося запарожскае казацтва на чале з Б.Хмяльніцкім, адным з галоўных патрабаванняў паўстання была ліквідацыя уніяцкай царквы.

У XVII – XVIII стст. на Беларусі ўзмацнілася дзейнасць каталіцкіх і уніяцкіх манаскіх ордэнаў – францысканцаў, дамініканцаў, базыльян, бернардзінцаў, бенедыктынцаў і інш. Яны праводзілі гвалтоўнае акаталічванне беларускага насельніцтва. Абаронцамі праваслаўя сталі праваслаўныя брацтвы,

якія ўзніклі ў XVI ст. Галоўны напрамак іх дзейнасці – захаванне чысціні праваслаўнага вучэння, богаслужэння і царкоўнага кіравання.

Такім чынам, на працягу ўсяго існавання Рэчы Паспалітай беларускі народ вымушаны быў весці цяжкую барацьбу за сваю веру, мову, культуру.

## ГЛАВА 3. ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА. ВОЙНЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI – XVІІІ стст.

Першай вайной Рэчы Паспалітай, атрыманай ёй у спадчыну ад ВКЛ, была Лівонская. У падзеле Лівонскай спадчыны пачалі праяўляць зацікаўленасць яе суседзі: Швецыя, Польшча, ВКЛ, Данія і Расія. Згодна з пагадненнем паміж Расіяй і Лівонскім ордэнам (1554), апошні абавязваўся не заключаць дагавораў з ВКЛ. Пазней Лівонскі ордэн парушыў гэта абяцанне і заключыў абарончанаступальны саюз з ВКЛ супраць Масквы. Гэта стала повадам для ўрада Івана Грознага пачаць у 1558 г. ваенныя дзеянні супраць Лівоніі. У 1559 г. Віленскі сейм прыняў уладанні Лівонскага ордэна пад пратэктарат. Аднак пасля таго як у лівонскую праблему ўмяшаліся Данія і Швецыя, 28 лістапада 1561 г. у Вільні было падпісана пагадненне, згодна з якім землі Лівонскага ордэна пераходзілі ў сумеснае ўладанне Польшчы і ВКЛ. ВКЛ у Лівонскай вайне мела на ўвазе дзве мэты: 1) далучыць да сваіх уладанняў тэрыторыю Лівонскага ордэна; 2) не дапусціць Расію да Балтыйскага мора, г.зн. на заходнееўрапейскі рынак. У 1562 г. Расія перанесла ваенныя дзеянні на тэрытррыю Беларусі і ў 1563 г. захапіла Полацк, які адкрываў рускай арміі шлях на Вільню і Рыгу. Абраны каралём Стэфан Баторый (1576 – 1586) пачаў з наёмным войскам контрнаступленне супраць Расійскай арміі ў Лівоніі і на Беларусі. У 1579 г. быў адваяваны Полацк, пазней вызвалена Лівонія, а ваенныя дзеянні перанесены на рускую тэрыторыю. Знясіленыя 25-гадовай барацьбой дзяржавы вымушаны былі пачаць мірныя перагаворы. У 1582 г. было падпісана Ям-Запольскае перамір’е, згодна з якім Рэчы Паспалітай вярталіся ўсе землі, страчаныя падчас вайны, а таксама тэрыторыі ў раёне г. Веліжа, дзе адраджалаея мяжа, што існавала да 1514 г. Да Рэчы Паспалітай таксама адыходзіла большая частка Лівоніі.

У выніку Лівонскай вайны аказалася спустошанай і зруйнаванай паўночнаўсходняя частка Беларусі, загінула шмат насельніцтва, знішчаны культурныя каштоўнасці.

На мяжы XVI – XVII стст. да актыўнан рускай палітыкі польскіх і літоўскіх феадалаў падштурхнула “смута” ў Расіі – барацьба працоўных мас супраць феадалаў. Таксама спрыяльныя ўмовы для правядзення актыўнай рускай палітыкі скл аліся і ў тым, што 15 мая 1591 г. памёр брат цара – васьмігадовы царэвіч Дзмітрый – фактычны спадчыннік рускага прастола. У 1600 г. пачалі распаўсюджвацца чуткі, быццам царэвіч Дзмітрый выратаваўся. У ролі самазванца выступіў Грыгорый Атрэп’еў, беглы манах, які перабраўся пасля блуканняў па Расіі ў Рэч Паспалітую.

Арганізатарам пахода Лжэдзмітрыя ў Расію стаў другарадны чыноўнік Рэчы Паспалітай сенатар Юрый Мнішак. Абяцанне Лжэдзмітрыя перадаць частку рускіх зямель каралю Жыгімонту Вазе (1587 – 1632) і Мнішаку прымусіла караля, магнатаў і касцёл фінансаваць паход. Войска самазванца несла паражэнні, але Лжэдзмітрый заўсёды знаходзіў падтрымку насельніцтва, якое верыла ў "сапраўднасць" цара. 20 чэрвеня 1605 г. самазванец уступіў у Маскву і ў ліпені 1605 г. вянчаўся на царства. Праз год падман пачаў выкрывацца і масквічы звергі Лжэдзмітрыя з прастолу.

Праз некаторы час з'віўся новы Лжэдзмітрый, які нібыта ў другі раз цудам выратаваўся ад смерці. Гэта быў паплечнік першага самазванца – дваранін Міхаіл Малчанаў. На дапамогу яму прыйшлі атрады польскіх магнатаў Лісоўскага і Ражынскага, а таксама Льва Сапегі. Але ж і ён пацярпеў паражэнне.

У 1609 г. польскі кароль Жыгімонт Ваза распачаў адкрытую інтэрвенцыю супраць Расіі. Рускае войска пацярпела паражэнне і рускім царом у жніўні 1610 г. быў абраны польскі каралевіч Уладзіслаў, сын Жыгімонта Вазы. Сам кароль узначаліў армію і, размясціўшыся на Дняпры, узяў Смаленск у аблогу. 3 чэрвеня 1611 г., калі ў Смаленску засталося 200 абаронцаў, горад капітуліраваў. Жыгімонт III абвясціў сябе рускім царом.

У 1611 г. у Ніжнім Ноўгарадзе было створана народнае апалчэнне супраць інтэрвентаў на чале з Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім. У кастрычніку 1612 г. апалчэнцы вызвалілі Маскву. У 1613 г. на расійскі прастол быў абраны Міхаіл Раманаў, які быў сваяком Івана Грознага па жаночай лініі.

У снежні 1618 г. было заключана перамір'е на 14,5 гадоў у в. Дэуліна, паводле якога да Рэчы Паспалітай адышлі Ноўгарад-Северская, Чарнігаўская і Смаленская землі.

У 1632 – 1634 гг. Расія зрабіла спробу вярнуць сабе Смаленск. Гэта вайна ўвайшла ў гісторыю пад назвай Смаленскай. Яна была паспяховай для Рэчы Паспалітай і закончылася Паляноўскім мірным дагаворам, падпісаным у в. Семлеве на р. Паляноўцы. Рэч Паспалітая захавала за сабой усе землі, атрыманыя па Дэулінскаму дагавору, акрамя г. Сярпейска з невялікім пагранічным раёнам Севершчыны, якія адышлі да Расіі. Акрамя таго Уладзіслаў канчаткова адмаўляўся ад тытула маскоўскага цара.

Вясной 1654 г. пачалася чарговая вайна Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай. Амаль адразу былі заняты 33 гарады. Шэраг з іх здаваліся без бою, бо сярод праваслаўнага насельніцтва ВКЛ былі моцныя прарасійскія настроі, а сярод мясцовай шляхты і духавенства вялася прапаганда, што за імі будуць захаваны іх правы і прывілеі, а тым, хто пяройдзе на царскую службу, гарантаваліся новыя ўладанні. Летам 1655 г. амаль уся Беларусь была занята рускімі войскамі. 31 ліпеня была захоплена Вільня.

Цяжкае становішча для Рэчы Паспалітай вырашыла выкарыстаць Швецыя. Летам 1655 г. шведскія войскі напалі на Польшчу і даволі хутка занялі большую частку Польшчы і Жамойць. У жніўні 1655 г. частка магнатаў ВКЛ на

чале з канцлерам Янушам Радзівілам падпісалі ў Кейданах унію са Швецыяй, якая разрывала унію з Польшчай. У гэты час рускі цар Аляксей Міхайлавіч заключыў з Рэччу Паспалітай Віленскае перамір’е (24 кастрычніка 1656 г.), у адпаведнасці з якім Польшча і Расія спынялі ваенныя дзеянні паміж сабою і аб’ядноўваліся для барацьбы са шведамі. У маі 1657 г. супраць Швецыі выступілі Аўстрыя і Расія, у чэрвені – Данія. Шведы паступова выціскаліся з захопленых зямель.

Віленскае перамір’е прыпыніла рух расійскіх войск на яшчэ не занятыя тэрыторыі Беларусі. Разам з гэтым на акупіраваных землях расла незадаволенасць царскай адміністрацыяй. Узмацніліся антымаскоўскія тэндэнцыі і сярод дзеючых у Беларусі казакоў. На гэта паўплывала смерць Б.Хмяльніцкага ў 1657 г., на замену якому прыйшлі гетманы, што прытрымліваліся прапольскай палітыкі.

У 1658 г. баявыя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй узнавіліся. Адначасова працягваліся ваенныя дзеянні супраць Швецыі. У 1660 г. паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй быў падпісаны Оліўскі мірны дагавор. Амаль уся Лівонія адыходзіла да Швецыі. Толькі невялікая яе частка – Латгалія – засталася за Рэччу Паспалітай.

Пасля гэтага ўсё польскае войска было накіравана на Беларусь, дзе яно атрымала шэраг перамог. Ужо ў 1661 г. рускія войскі пакідаюць Мінск, Барысаў, Магілёў.

У далейшым вайна вялася з пераменным поспехам і пасля працяглых перамоў скончылася падпісаннем у 1667 г. Андрусаўскага перамір’я тэрмінам на 13,5 гадоў. У адпаведнасці з яго ўмовамі да Расіі адыходзілі Смаленскае ваяводства з усімі паветамі і гарадамі, Старадубскі павет, Чарнігаўскае ваяводства і Левабярэжная Украіна. Кіеў з акругай у адну мілю быў перададзены Расіі на два гады. У 1686 г. у Маскве быў падпісаны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай “вечны мір”, у адпаведнасці з якім Польшча канчаткова адмовілася ад Кіева, атрымаўшы грашовую кампенсацыю.

Не абмінула Беларусь і Паўночная вайна (1700–1721). Данія, Расія, Саксонія і Рэч Паспалітая (саксонскі курфюрст Аўгуст II быў адначасова і каралём Рэчы Паспалітай – з 1697 г.) заключылі саюз супраць Швецыі. Кожная з саюзных дзяржаў мела свой уласны тэрытарыяльны інтарэс. Аўгуст II быў зацікаўлены ў тым, каб далучыць да Саксоніі ці да Рэчы Паспалітай тэрыторыю Ліфляндыі і Эстляндыі, стаць цвёрдай нагой на берагах Фінскага заліва.

Ваенныя дзеянні распачаў Аўгуст II. Праз некаторы час Данія пацярпела паражэнне ад Карла XII у Гальштыніі і выйшла з вайны. Засталіся Аўгуст II і Пётр I. У 1702 г. Карл XII перанёс асноўныя баявыя дзеянні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, спадзеючыся бліскучай перамогай хутка скончыць усю вайну. Удала выкарыстаўшы сепаратысцкія настроі шляхты на чале з вялікім гетманам літоўскім Казімірам Янам Сапегам, усяго за некалькі месяцаў Карл XII здолеў захапіць Вільню, Гродна і Варшаву. У 1704 г. шведы дамагліся ад Варшаўскай канфедэрацыі абрання новага караля, якім стаў познанскі ваявода Станіслаў

Ляшчынскі. У сваю чаргу Аўгуст II звярнуўся за дапамогай да Расіі і восенню 1704 г. у ВКЛ увайшла буйная армія Пятра І, да якой далучыліся атрады Радзівілаў, Агінскіх і Вішнявецкіх, што надало баявым дзеянням характар грамадзянскай вайны.

На працягу 1705 – 1706 гг. шведская армія заваявала большую частку Цэнтральнай і Заходняй Беларусі. У 1707 – 1708 гг. баявыя дзеянні перанесліся на ўсходнебеларускія землі . Расійскія войскі вымушаны былі паступова адыходзіць на поўдзень. Менавіта на ўсходзе Беларусі адбылося і першае значнае паражэнне шведскай арміі – 28 верасня (9 кастрычніка) 1708 г. пад в. Лясная (Слаўгарадскі раён) быў разбіты 16-тысячны корпус генерала А. Левенгаўпта і захоплены вялікі абоз. Гэта перамога шмат у чым паспрыяла разгрому войска Карла XII 27 чэрвеня (8 ліпеня) 1709 г. у час славутай Палтаўскай бітвы.

У далейшым Рэч Паспалітая практычна не прымала ўдзелу ў ходзе Паўночнай вайны, якая і так паглыбіла яе гаспадарчы заняпад. На Беларусі за яе гады на трэць скарацілася колькасць насельніцтва.

Такім чынам, амаль бесперапынныя войны, якія вяла Рэч Паспалітая ў другой палове XVI – XVIII ст. прывялі да страты ёю ранейшага становішча на міжнароднай арэне. Яны спрычыніліся і да эканамічнага крызісу дзяржавы, а таксама прывялі да велізарных дэмаграфічных страт.

## ГЛАВА 4. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ (другая палова XVI – канец XVIII стст.)

Напярэдадні Люблінскай уніі на Беларусі пражывала 1 800 тыс. жахароў, якія па свайму сацыяльна-эканамічнаму становішчу адносіліся да чатырох саслоўяў: шляхты, сялян, мяшчан, духавенства. Шяхецкае саслоўе дзялілася на групоўкі паводле сваёй эканамічнай моцы. Найбольш буйнымі былі магнаты, якія мелі маёнткі на Беларусі і валодалі не менш як 1000 – 500 сялянскіх "дымоў". Яны складалі сенатарскае саслоўе і валодалі ў 1568 г. 48,4% сялянскіх гаспадарак.

Самай шматлікай была група дробнай шляхты, якая налічвала больш за 3 тыс. чалавек і ў пануючым класе складала больш за 70%, але ў яе руках былі толькі 28% сялянскіх гаспадарак.

Сярэдні пласт шляхты налічваў 650 феадалаў, якія складалі 16% пануючага класа.

Ніжэйшым пластом (142 шляхцічы) была пешая шляхта, якая складала 3,6% пануючага класа і не мела сялянскіх гаспадарак.

У сярэдзіне XVI ст. шляхта, як ваенна-служылае саслоўе, пачала разлагацца знутры: шукала багацця праз рамяство і гандаль. У 1633 г. сейм абвясціў, што не толькі шляхціч, але і яго нашчадкі назаўсёды будуць пазбаўлены шляхецкіх правоў за ганебныя для шляхецкай асобы справы: гандаль ці шынкарства.

Самым шматлікім саслоўем феадальнага грамадства былі сяляне. На становішча сялян вялікі ўплыў аказала так званая “Валочная памера”. Аграрная перабудова гаспадаркі, згодна з “Уставай на валокі”, была вызначана каралём у 1557 г. Незалежна ад мясцовых асаблівасцей рэформы, яе выніκі ўсюды былі аднолькавыя: заснаванне фальваркавай гаспадаркі, канчатковае запрыгоньванне сялян, павелічэнне сялянскіх павіннасцей, рост даходаў дзяржаўнага скарбу і шляхты. Пад фальварак адводзілася лепшая ворная зямля памерам у 8 – 15 валок. Сяляне атрымлівалі ў спадчыннае карыстанне ад валокі да паўвалокі зямлі, якая заставалася маёмасцю феадала. Велічыня валокі павінна была складаць 21,37 га.

У выніку рэформы адбыліся змены ў прававым становішчы сялян. Сяляне да рэформы складалі такія асноўныя групы: чэлядзь нявольная, людзі “пахожыя”, “непахожыя”, сяляне-слугі. Пасля рэформы сяляне дзяліліся на наступныя катэгорыі: ***цяглыя*** – яны павінны былі адбываць паншчыну па 2 дні на тыдзень, талокі, гвалты, плаціць чынш ад 6 да 21 гроша з валокі і натуральны аброк; ***асадныя*** – гэта былі аброчныя сяляне, яны не хадзілі на паншчыну, а плацілі 30 грошаў чыншу і адбывалі астатнія павіннасці нароўні з цяглымі, яны былі менш залежныя, чым цяглыя; ***агароднікі*** – не мелі палявой зямлі, толькі агарод, ***халупнікі*** мелі толькі хату, а ***кутнікі*** туліліся ў кутках хат багатых сялян; ***сяляне-слугі*** – рамеснікі, конюхі – яны былі больш заможныя. Вышэйшую групу ўтваралі ваенна-служылыя людзі: баяры-путныя, баяры-панцырныя. З гэтай групы рэкруціраваўся шляхецкі стан.

У выніку аграрнай рэформы адбыліся амаль што рэвалюцыйныя змены:

1) была разбурана сялянская абшчына ў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, дзе пачало ўкараняцца падворнае землекарыстанне;

2) змяніліся катэгорыі сялян, іх прававое і эканамічнае становішча: адны групы сялян зніклі, іншыя апынуліся ў большай залежнасці ад пана; завяршыўся працэс запрыгоньвання сялян;

3) сялянская гаспадарка пачала ўцягвацца ў рыначныя адносіны, што вяло да дыферэнцыяцыі вёскі;

4) псіхалогія абшчыннага калектывізму пачала замяшчацца псіхалогіяй індывідуалізму.

З другой паловы XVII ст. пачынаецца эканамічны заняпад Беларусі. Ён быў выкліканы ўзмацненнем феадальнага прыгнёту, разбурэннем гаспадаркі, як у выніку антыфеадальнай, нацыянальна-вызваленчай барацьбы, так і ў значнай меры ў выніку знешніх войнаў. Аднаўляць разбураную гаспадарку пачалі з раздачы зямлі сялянам і пераводу іх на грашовы і натуральны аброк. Да 60-х гадоў XVIII ст. сельская гаспадарка была ў асноўным адноўлена: павялічылася плошча ворных зямель, павялічылася пагалоўе прадукцыйнай жывёлы. У другой палове XVIII ст. улады Рэчы Паспалітай пачалі рэфармаванне эканомікі. Кіраваў гэтымі працэсамі А. Тызенгаўз.

З аднаўленнем гаспадаркі вярталася паншчына і павялічваліся павіннасці.

Маемасная дыферэнцыяцыя вёскі стварала рынак працоўных рук. Наёмныя рабочыя атрымлівалі грашовую плату і плату натурай.

Побач з тэндэнцыяй да росту землеўладанняў свецкіх феадалаў з другой паловы XVIII ст. назіралася і іншая тэндэнцыя – перадача маёнткаў у заклад, якія з цягам часу пачалі пераходзіць ва уласнасць крэдытораў. Гэта быў першы эканамічны парастак капіталізму ў нетрах феадалізму.

Другім парасткам было з'яўленне ў буйной памеснай гаспадарцы прадпрымальніцтва і прадпрыемстваў-мануфактур. Найбуйнейшымі феадальнымі прадпрыемствамі былі: Урэцкі і Налібоцкі шкляныя заводы князёў Радзівілаў, фаянсавы завод князя Агінскага і інш.

Яшчэ адным саслоўем былі мяшчане – жыхары гарадоў. На працягу XVI – першай паловы XVII ст. колькасць гарадоў дасягнула 37. Саслоўе мяшчан павялічвалася за кошт вольных сялян, уцекачоў і прыгонных.

Да першай паловы XVIII ст. магдэбургскае права мелі ўсе буйныя гарады. Магістрат быў вышэйшым органам самакіравання.

Саслоўе мяшчан складалася з заможных вярхоў (багатыя купцы і частка майстроў), сярэдняга пласта (пераважна частка майстроў і гандляроў) і беднаты. За межамі гарадской абшчыны знаходзіліся наёмныя людзі (землякопы, грузчыкі, вадавозы і г.д.).

Юрысдыкцыі магістрата не падлягалі сяляне, якіх пасялялі ў горадзе феадалы (мяшчане прыватных "юрыдык"), а таксама татары і яўрэі, што мелі свае судова-адміністрацыйныя органы.

Асновай эканамічнага жыцця гарадоў былі рамёствы і гандаль. У крыніцах таго часу ўпамінаецца каля 200 прафесій і спецыяльнасцей: па апрацоўцы металу, дрэва, скуранной і футравай вытворчасці і г.д.

У той час пачалі ствараццa ўласныя карпарацыі рамеснікаў – цэхі. Звычайна ў цэхі ўваходзіла 60 – 70 чалавек. Цэхі былі трох тыпаў: спецыялізаваныя (адной прафесіі), аб'яднаныя (дзвюх і больш блізкіх прафесій), зборныя (розных прафесій). Цэхавыя статуты рэгламентавалі вытворчую дзейнасць цэха, імкнуліся ахоўваць сваіх рамеснікаў ад канкурэнцыі на рынку. Рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэхі, называлі "партачамі".

Пашыраўся гандаль як унутраны, так і знешні. Найбольш трывалыя сувязі былі з Расіяй, Польшчай, Левабярэжнай Украінай, Рыгай, з краінамі Заходняй Еўропы. У Заходнюю Еўропу з Беларусі вывозілася жыта, лес і іншыя тавары лясной і сельскай гаспадаркі. Завозілася на Беларусь футра, абутак, мыла, жалеза, сталь, свінец і г.д.

Пастаяннай пагрозай для купецтва было самавольства шляхты, якая рабавала купцоў, разганяла кірмашы. Каб абараніць свае інтарэсы, ствараліся цэхі купцоў, якія рэгулявалі парадак куплі і продажу тавараў і іншыя справы.

Будаваліся новыя шляхі зносін. У 1784 г. было завершана будаўніцтва канала Агінскага, які злучаў Нёман з Прыпяццю. У 1781 г. пачалося будаўніцтва Днепра-Бугскага канала.

Такім чынам, сельская і гарадская гаспадарка Беларусі да сярэдзіны XVIII ст. была ў асноўным адноўлена.

## ГЛАВА 5. ПАГЛЫБЛЕННЕ ПАЛІТЫЧНАГА КРЫЗІСУ. ПАДЗЕЛЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

У канцы XVIII ст. у Рэчы Паспалітай назіраўся ўнутрыпалітычны крызіс, які быў вынікам дзеяння шэрагу ўзаемазвязаных фактараў.

***Першым*** вытокам крызісу была Люблінская унія, якая заклала аснову нераўнапраўнага становішча ВКЛ у складзе дзяржавы і паклала пачатак унутранага антаганізму паміж дзвюма складовымі часткамі краіны.

***Другім*** вытокам стаў палітычны лад Рэчы Паспалітай, які падрываў асновы дзяржаўнасці. Найбольш небяспечным было спалучэнне “залатых шляхецкіх вольнасцей”: выбранне манарха, liberum veto і “Pacta conventa”. У час бескаралеўя шляхецтва раз’ядноўвалася на супрацьлеглыя партыі: рускую, французскую, шведскую, аўстрыйскую, краіна апускалася ў бездань бязладдзя, анархіі.

Выбранне манарха мела адмоўнай рысай подкуп. Зніклі паняцці маральнасці, патрыятызму і інш. Асабісты інтарэс пераважаў над усім грамадскім жыццём. Каронны сейм у Рэчы Паспалітай дыктаваў каралю сваю волю. Кароль павінен быў строга выконваць як “Pacta conventa”, так і пастановы сейма.

Liberum veto магло паралізаваць цэнтральную ўладу. У 1652 г. дэпутат Сіцінскі ўпершыню ўжыў слова “не дазваляю” і прыпыніў пастанову сейма. Так, за 1744 – 1762 гг. усе адзінаццаць сеймаў не здолелі прыняць патрэбных рашэнняў. Любая пастанова караля ці сейма магла быць адхілена шляхтай.

У выніку асаблівасцей палітычнага ладу Рэчы Паспалітай да канца XVII ст. у дзяржаве назіралася аслабленне манархічнай улады; узмацненне шляхты, заняпад адміністрацыйнага кіравання, духоўнасці і грамадзянскага сумлення.

***Трэцім*** вытокам палітычнага крызісу з’явілася бязглуздая рэлігійная палітыка. Берасцейская царкоўная унія не дала жаданых вынікаў. Лацінізацыя уніяцкай царквы прывяла да расколу грамадства на яе прыхільнікаў і праціўнікаў. Гэта паглыбіла існуючыя ў грамадстве супярэчнасці.

***Чацвёртым*** вытокам было спалучэнне нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту з феадальным. Распаўсюджанне аграрнай рэформы Жыгімонта Аўгуста на Усходнюю Беларусь выклікала супраціўленне народных мас: уцёкі ад гаспадароў, падпальванне маёнткаў, узброеныя паўстанні.

Адным з буйнейшых сялянскіх рухаў у XVIII ст. было .паўстанне пад кіраўніцтвам В. Вашчылы ў Крычаўскім старостве, уладанні князя Г. Радзівіла, у 1740 – 1744 гг. Паўстанне было жорстка падаўлена: 74 паўстанцы былі закатаваны (адны павешаны, іншыя – жывымі пасаджаны на кол).

***Пятым*** вытокам паглыблення палітычнага крызісу была барацьба паміж магнатамі за ўладу. У другой палове XVII ст. у ВКЛ асноўнымі сапернікамі былі Радзівілы, Пацы і Сапегі.

У 1696 г. большая частка беларуска-літоўскай шляхты выступіла супраць усемагутнасці Сапегаў. Барацьбу ўзначалілі Агінскія і Вішнявецкія. Яны выдалі ў Вільні універсал, у якім абвяшчалі гетмана Казіміра Яна Сапегу і яго сяброў ворагамі Айчыны і прыгаварылі іх да пакарання смерцю з канфіскацыяй маёмасці. Барацьба прыняла характар грамадзянскай вайны. У час Паўночнай вайны Сапега перайшоў на бок Карла XII і разам з ім пачаў граміць маёнткі праціўнікаў.

У часы кіравання Аўгуста III (1733 – 1763, сын Аўгуста II) у палітычным жыцці з’явілася новая рыса – зварот шляхты за дапамогай да суседніх краін дзеля вырашэння ўнутраных спраў.

У 1768 г. сейм (пад націскам рускіх войск) прыняў пастанову аб ураўнаванні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з католікамі.

У лютым 1768 г. каталіцкія фанатыкі стварылі ў Бары (на Украіне) канфедэрацыю з мэтай супрацьдзеяння ўплыву рускай імператрыцы ў Польшчы. Хутка разгарэлася грамадзянская вайна, у якой канфедэратыўны рух быў задушаны з дапамогай царскай арміі.

Па прапанове прускага караля Фрыдрыха II 5 жніўня 1772 г. у Пецярбургу была падпісана канвенцыя аб падзеле Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Прусія атрымала паўночна-заходнюю частку Польшчы, Аўстрыя – паўднёвую Польшчу і частку Заходняй Украіны са Львовам. Да Расіі адышлі Інфлянты, болыпая частка Полацкага ваяводства, амаль усё Віцебскае, амаль усё Мсціслаўскае ваяводства і ўсходняя частка Рэчыцкага павета, Магілёўскае ваяводства.

Спроба карэнных пераўтварэнняў адбылася на Вялікам альбо Чатырохгадовым сейме (1788 – 1792 гг.). 3 мая 1791 г. на ім была прынята канстытуцыя Рэчы Паспалітай, якая адмяняла выбарнасць каралёў, liberum veto і права на канфедэрацыі. Заканадаўчая ўлада належала двухпалатнаму сейму, які выбіраўся на два гады і павінен быў прымаць рашэнні большасцю галасоў. Каралю і радзе належала выканаўчая ўлада. Урад, войска і бюджэт былі абвешчаны агульнымі для ўсёй Рэчы Паспалітай. Канстытуцыя зрабіла крок у напрамку збліжэння мяшчанства са шляхтай: шляхта атрымала дазвол займацца гандлем, а мяшчанне – набываць зямельныя ўладанні, займаць цывільныя пасады. Зусім не змянілася становішча сялян.

14 мая 1792 г. праціўнікі канстытуцыі пад пакравіцельствам Расіі ў мястэчку Таргавіцы (на Украіне) стварылі канфедэрацыю і абвясцілі акт аб абароне ранейшага парадку кіравання краінай, Зноў пачалася грамадзянская вайна, кароль далучыўся да канфедэратаў.

У 1793 г. адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Расіяй і Прусіяй. Да Прусіі адышлі Данцыг і Вялікая Польшча, а да Расіі – частка Полацкага ваяводства, рэшткі Віцебскага і Мсціслаўскага, Мінскае і ўсходнія часткі

Навагрудскага і Брэсцкага ваяводстваў, а таксама частка Правабярэжнай Украіны.

Гэты падзел выклікаў пратэст розных пластоў шляхецтва. 24 сакавіка 1794 г. у Кракаве пачалося паўстанне на чале з генерал-лейтэнантам Тадэвушам Касцюшкам. Мэтай паўстання было адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

З 22 па 23 красавіка 1794 г. паўстанцы захапілі Вільню і ўтварылі найвышэйшую раду літоўскага народа на чале з віленскім камендантам палкоўнікам Якубам Ясінскім. Але абаронцы Айчыны не здолелі згуртавацца. Паміж імі адсутнічала дысцыпліна, працягваліся сваркі і спрэчкі. Хутка ўся Беларусь і Літва былі ахоплены паўстаннем, да якога далучылася частка сялян, што паверылі абяцанням Касцюшкі вызваліць іх ад феадальнага прыгнёту. Аднак выкананне абяцання затрымлівалася, сяляне пачалі адыходзіць ад паўстання.

Супраць Рэчы Паспалітай выступілі Прусія, Аўстрыя і Расія. У бітве пад Мацяёвіцамі (ля Варшавы) Касцюшка трапіў у палон, а ў Варшаву былі ўведзены рускія, прускія і аўстрыйскія войскі. Апошні кароль Рэчы Паспалітай Аўгуст IV (Станіслаў Панятоўскі) адрокся ад прастола.

У 1795 г. адбыўся апошні падзел Рэчы Паспалітай. Расія атрымала Заходнюю Беларусь і Усходнюю Літву, а таксама Украіну да Заходняга Буга. Аўстрыя і Прусія захапілі карэнныя польскія землі, частку ўкраінскіх і літоўскіх зямель.

Такім чынам палітычны крызіс, які ўжо даўно раздзіраў Рэч Паспалітую, у сярэдзіне XVIII ст. перарос у агонію і прывёў дзяржаву да канчатковай гібелі.

## ГЛАВА 6. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (другая палова XVI – канец XVIII стст.)

У гісторыі культуры Беларусі сярэдзіны XVI – XVIII стст. можна выдзеліць тры перыяды:

1) другая палова XVI ст. – рэфармацыйна-гуманістычны рух;

2) канец XVI – першая палова XVII ст. – эпоха Контррэфармацыі і ўсталявання барока;

3) другая палова XVII – XVIII ст. – панаванне ў мастацтве стылю барока і пачатак стылю класіцызму.

**Асвета і кнігадрукаванне.** У XVI ст. разам з развіццём традыцый Старажытнай Русі на асвету пашырыўся ўплыў рэнесансавага гуманізму. На тэрыторыі Беларусі з’явіліся найбольш перадавыя для свайго часу пратэстанцкія і брацкія школы. У 70 – я гг. XVI ст. на Беларусі існавалі кальвінісцкія школы ў Брэсце, Нясвіжы, Мінску і г.д. У школах вывучаліся гуманітарныя навукі – лацінская, грэчаская, польская, нямецкая мовы, рыторыка, гісторыя, правазнаўства, матэматыка, фізіка. Таксама існавалі і арыянскія школы.

У канцы XVI – першай палове XVII ст. на Беларусі адчыняліся брацкія школы, спачатку ў Вільні, а затым і ў іншых гарадах. У школах вывучаліся пяць моў (беларуская, славянская, грэчаская, лацінская, польская), арыфметыка, геаграфія і іншыя дысцыпліны. Індывідуальнае навучанне ў іх замянялася класна-ўрочным, якое дажыло да нашага часу. Навучальны год пачынаўся 1 верасня. Брацкія школы з’яўляліся і цэнтрамі кнігадрукавання. Брацкія друкарні ў Вільні, Куцейне і Магілёве выдавалі большасць кніг богаслужэбнага зместу.

Адметную ролю ў кірылічным кнігадрукаванні адыграў беларускі друкар магіляўчанін Спірыдон Собаль, які на тэрыторыі Беларусі адчыніў дзве друкарні. Адну – у Куцейне (ля Оршы) у 1630 г. і выдаў тут на беларускай мове “Малітвы паўсядзённыя”, “Буквар”, “Часаслоў”. У 1635 г. ён адчыніў друкарню і ў Буйнічах (пад Магілёвам), дзе выдаў “Псалтыр”. У літаратуры апісаны 18 яго выданняў.

У XVIII ст. на беларускіх землях пашырылася свецкая адукацыя. Гэтаму садзейнічала рэформа школ, якая праводзілася пад кіраўніцтвам С. Канарскага. Рэформа пахіснула манаполію езуітаў у галіне асветы, значную ўвагу надала прыродазнаўчым навукам. Створаная ў 1773 г. Адукацыйная камісія адмяніла выкладанне ў рамках школьных праграм рэлігіі.

**Бібліятэчная і архіўная справа**. Багацейшай у Рэчы Паспалітай з’яўлялася Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў, заснаваная ў 1600 г. У бібліятэцы налічвалася больш за 20 тыс. тамоў кніг амаль на ўсіх еўрапейскіх мовах. У 1772 г. бібліятэка была канфіскавана і перавезена ў Пецярбург. У бібліятэцы захоўваліся таксама рэдкія рукапісы. Сярод іх – Радзівілаўскі летапіс, упрыгожаны 617 каляровымі малюнкамі.

Больш за 6 тыс. рэдкіх кніг, старажытных рукапісаў, геаграфічных карт Беларусі, Літвы і Польшчы знаходзіліся ў Шчорсах, у маёнтку магната Храптовіча.

У Нясвіжскім замку знаходзіўся і архіў, у якім налічвалася больш за 500 тыс. гістарычных актаў, грамат, лістоў і іншых дакументаў. Гэтыя матэрыялы былі сабраны з 1551 г., калі Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў права захоўвання ў Нясвіжы т. зв., “Літоўскай метрыкі” – дзяржаўнага архіва ВКЛ.

**Літаратура.** У разглядаемы перыяд агульнадзяржаўныя летапісы і хронікі паступова саступаюць месца новым літаратурным відам і жанрам: публіцыстыцы, гісторыка-мемуарнай літаратуры, палітычнай сатыры, паэзіі.

***Сымон Будны*** (1530–1593) упершыню ў сусветнай літаратуры выдаў Евангелле (1574) з прадмовай, каментарыямі і заўвагамі, у якіх спрабаваў даць радыкальную рацыяналістычную крытыку кніг Новага Запавету. У творы “Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры” (1576 г., Лоск) ён адстойваў чалавечую прыроду Хрыста, выступаў супраць замагільнага жыцця, Боскай Троіцы. Грамадска-палітычныя погляды яго былі памяркоўна гуманістычнымі. Крытыкаваў феадальнае самавольства, захопніцкія войны, быў абаронцам верацярпімасці і інтэлектуальнай свабоды.

***Васіль Цяпінскі*** (1540–1600) у прадмове да Евангелля, якое ён выдаў на беларускай мове, крытыкаваў палітыку акаталічвання беларускага народа, выступаў за развіццё беларускай мовы, быў прыхільнікам збліжэння славянскіх народаў. Выступаў за набліжэнне асветы да простага народа.

***Лявонцій Карповіч*** (1580–1620) — змагар за веру продкаў і нацыянальныя традыцыі – быў вядомым прадстаўніком аратарскай прозы. Яго асноўныя творы – "Казанні" – аказвалі вялікае ўздзеянне на слухача і чытача.

***Афанасій Філіповіч*** – выступаў абаронцам інтарэсаў сацыяльных нізоў беларускага і ўкраінскага народаў. Праз свой "Дыяруш", які з'яўляўся зборам твораў, ён крытыкаваў знешнюю і ўнутраную палітыку, а таксама духоўных і свецкіх феадалаў за іх імкненне да раскошы.

Адной з зорак старажытнай беларускай літаратуры быў аўтар "Граматыкі" ***Мялецій Сматрыцкі*** (1572–1630). Асобае месца сярод яго твораў займае "Фрынас" (1610), у якім Сматрыцкі звяртаецца да народа з заклікам еднасці ўсіх сіл у барацьбе з наступаючым каталіцызмам.

Новай з'явай у беларускай літаратуры была палітычная сатыра –"Прамова Мялешкі", "Ліст да Абуховіча". Аўтары высмейвалі самавольства шляхты, прадажнасць, ваенна-палітычную бяздарнасць.

Ананімная лірычная паэма "Лямант на смерць Лявона Карповіча" ўслаўляла чалавека як носьбіта высокіх маральных якасцей, мужнага змагара за веру продкаў, узнімала яго да ўзроўню хрысціянскага святога.

***Сімяон Полацкі*** (1629–1680) – паэт і драматург, кнігавыдавец і грамадскі дзеяч. Ён лічыў, што пашырэнне асветы ўсталюе поўную гармонію і мір, асуджаў багацце, апяваў беларускія землі. асабліва Полацк і Віцебск, пісаў п'есы на біблейскія тэмы. Адна з іх мела назву "Комедия притчи о блудном сыне". Найбольш значнымі зборнікамі яго паэтычных твораў з'яўляюцца "Вертоград многоцветный" і "Рифмологион".

**Тэатр і музыка.** Развіццё драматургіі выклікала да жыцця тэатр. Спачатку з'явіўся школьны тэатр. Шырокае распаўсюджанне на Беларусі ў XVI ст. атрымаў тэатр лялек – батлейка. Сюжэты батлейкі былі заснаваны на біблейскай і евангельскай тэматыцы, а таксама бытавых матывах.

Важнай з'явай жыцця другой паловы XVIII ст. стаў прыгонны тэатр. Многія беларускія магнаты: Радзівілы, Сапегі, Тызенгаўзы і іншыя, – утрымлівалі ў сваіх маёнтках капэлы, аркестры, тэатры, а нярэдка і самі станавіліся кампазітарамі і музыкантамі, як Міхал Клеафас Агінскі, аўтар паланеза "Развітанне з Радзімай".

У свецкай музыцы XVI–XVIII стст. найболын характэрным жанрам быў кант – шматгалосая песня свецкага зместу.

У Нясвіжскай друкарні быў надрукаваны "Канцыянал" – адзін з першых на Беларусі нотных зборнікаў. У Нясвіжы была створана адна з першых на Беларусі майстэрань па вырабу музычных інструментаў. Аркестры беларускіх магнатаў часам былі буйнейшыя за вядомыя заходнееўрапейскія. Напрыклад, аркестр М. Агінскага налічваў 106 інструментаў, а аркестр Гайдна толькі 14.

Асабліва цікавым быў Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага. Рэпертуар тэатра складаўся з опер і балетаў італьянскіх кампазітараў, а таксама твораў М.К. Агінскага. Сцэна тэатра дазваляла ставіць спектаклі барочнага тыпу з выхадам вялікай колькасці спевакоў, з паказам водных феерый. Частка сцэны затаплялася вадой і па ёй плавалі лодкі.

Не менш вядомы быў Нясвіжскі тэатр Францішкі Уршулі Радзівіл. Для свайго тэатра яна напісала 16 драматычных і оперных лібрэта. Спачатку тэатр з'яўляўся аматарскім: на сцэне выступалі члены княжацкай сям'і, госці, сваякі. У другой палове XVIII ст. выступалі ўжо іншаземныя майстры і артысты з прыгонных сялян.

Для падрыхтоўкі акцёраў оперы і балета на Беларусі існавалі некалькі школ (у Слуцку, Нясвіжы, Слоніме). Прыгонныя і прыватныя тэатры таксама працавалі ў Слуцку, Шклове, Магілёве, Чачэрску, Свіслачы.

**Выяўленчае мастацтва.** Ідэі Адраджэння, а затым і барока, праніклі ў майстэрні мастакоў. У беларускім жывапісе акрэсліліся два напрамкі. Першы – мастацтва, заснаванае на старажытнарускіх традыцыях; другі – жывапіс, які знаходзіўся пад уплывам заходнееўрапейскай мастацкай школы. Адбывалася перапляценне візантыйскага і заходнееўрапейскага стыляў з мясцовай беларускай школай.

У выніку сінтэзу розных школ і напрамкаў склалася самабытная беларуская іканапісная школа, якой уласціва вернасць канону, шырокае выкарыстанне этнаграфічных элементаў. На Беларусі існавалі некалькі іканапісных школ: магілёўская, полацка-віцебская, палеская, гродзенская, слуцка-мінская.

Другім важным напрамкам быў манументальны жывапіс. Сапраўдным творам мастацтва ў манументальным жывапісе з'яўляецца роспіс Мікалаеўскай царквы ў Магілёве – "Новазапаветная Троіца.

У пачатку XVIII ст. у манументальным жывапісе распаўсюдзіўся стыль барока, якому была характэрна маляўнічасць, багацце ўзору, прасторавасць.

Папулярным відам станкавага жывапісу ў ХУІ–ХУПІ стст. стаў партрэт. Ствараліся родавыя галерэі (партрэтныя галерэі Тышкевічаў, Радзівілаў і інш.).

Таленавітым мастаком і гравёрам XVI – пачатку XVII ст. з'яўляўся Тамаш Макоўскі. У 1613 г. у Амстэрдаме ён надрукаваў карту Вялікага княства Літоўскага. У дадатку да яе давалася падрабязнае апісанне Беларусі і Літвы: прыродныя багацці, народныя звычаі, гандлёвыя шляхі, навучальныя ўстановы Полацка і Нясвіжа, рэкі, азёры, гарады, рэзідэнцыі епіскапаў і мітрапалітаў. Тамаш Макоўскі з'яўляецца аўтарам гравюр з краявідамі Вільні, Клецка, Смаленска і іншых старажытных гарадоў.

У канцы XVIII ст. барока саступае месца новаму стылю ў выяўленчым мастацтве – класіцызму.

**Архітэктура.** У XVI – першай палове XVII ст. працягвалася стварэнне абарончых і культавых збудаванняў у стылі барока. Беларускі феадальны горад,

як і раней, меў тыповую забудову: умацаваны замак – рэзідэнцыя феадала і размешчаны вакол замка гандлёва – рамесны пасад пад аховай замкавых сцен.

У XVI – першай палове XVII ст. былі пабудаваны: Нясвіжскі замак, Нясвіжскі фарны касцел – першы помнік барока на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Таксама замкі і касцелы хутка будаваліся і ў іншых гарадах Беларусі. Позняму беларускаму барока ўласцівы стромкасць і лёгкасць, хвалістыя абрысы вежаў і франтонаў. Яно атрымала назву “віленскае барока”.

У гэты час пачынаюць будаваць ратушы, будынкі навучальных установ, палацы. Найбольш знакамітыя палацавыя ансамблі той эпохі: палац Тызенгаўза ў Гродне і палацава-паркавы ансамбль Радзівілаў у Нясвіжы.

У пачатку XVIII ст. была заснавана ў Слуцку мануфактура па вытворчасці паясоў. Паясы ткаліся з залатых, шаўковых і сярэбраных нітак. Усяго было выраблена каля 10 тыс. слуцкіх паясоў.

Такім былі асноўныя накірункі развіцця культуры на беларускіх землях у другой палове XVI – канцы XVIII стст.

# РАЗДЗЕЛ IV. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ. КРЫЗІС ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ (канец XVIII – 50-я гг. XIX ст.)

## ГЛАВА 1. УВАХОДЖАННЕ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ. ПАЛІТЫЧНАЕ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

### § 1. Унутраная палітыка расійскага ўрада на Беларусі у канцы XVIII – першай чвэрці XIX ст.

У выніку трох падзелаў (*1772, 1793, 1795 гг.*) Рэч Паспалітая спыніла сваё існаванне. Да Расіі адышла тэрыторыя Беларусі з насельніцтвам каля 3,3 млн. чалавек. З канца XVIII ст. пачынаецца новы этап беларускай гісторыі, цесна звязаны з гісторыяй Расійскай дзяржавы.

**Адміністрацыйны падзел.** Пасля далучэння да Расійскай імперыі на беларускія землі былі распаўсюджаны агульныя прынцыпы расійскага кіравання. Так, паводле праведзенай у ***1796 г.*** адміністрацыйнай рэформы ў Беларусі ствараліся губерні: Беларуская з губернскім горадам Віцебскам; Мінская з губернскім горадам Мінскам і Літоўская з губернскім горадам Вільняй.

У выніку новага адміністрацыйнага падзелу Расіі ў 1801 – 1802 гг. Беларуская губерня падзялілася на Магілёўскую і Віцебскую. Яны ўвайшлі ў склад Беларускага генерал-губернатарства (па 1856 г.). Літоўская губерня падзялілася на Гродзенскую і Віленскую, якія склалі разам з Мінскай губерняй Літоўскае (Віленскае) генерал-губернатарства (па 1912 г.). У час польскага паўстання 1830 – 1831 гг. і некаторы час пасля яго Мінская губерня мела статус генерал-губернатарства (1831 – 1834).

Генерал-губернатары з'яўляліся даверанымі асобамі імператара і надзяляліся фактычна неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Выканаўчая ўлада ў губернях належала губернатарам, якія кіравалі праз канцылярыі ў складзе віцэ-губернатара, саветнікаў, пракурора, сакратароў і іншых чыноўнікаў. Як правіла, вышэйшыя пасады займалі чыноўнікі з рускіх, на іншыя чыноўніцкія пасады ў беларускіх губернях дапушчаліся мясцовыя ўраджэнцы. Толькі дваране-католікі, якія жадалі паступіць на дзяржаўную службу, павінны былі прайсці абавязковую 5-гадовую "стажыроўку" у вялікарасійскіх губернях.

**Сацыяльна-палітычнае становішча беларускіх губерняў у канцы XVIII ст.** Расійскі ўрад дзяля ўзмацненні свайго ўплыву на далучаных землях адразу ажыццявіў шэраг мер. Насельніцтва на працягу месяца пасля выхаду ўказа аб уключэнні беларускіх зямель ў склад Расіі прыводзілася да прысягі. Сялян, як прыгонных, запісалі за новай дзяржавай іх паны з паручыцельствам духавенства. Асобам, якія не жадалі прысягаць новай уладзе, было прапанавана ў 3-месячны тэрмін прадаць сваю нерухомасць і выехаць за мяжу. Па заканчэнні гэтага тэрміну маёмасць асоб, якія не прынялі прысягі, падлягала

перадачы ў дзяржаўную казну. Большасць магнатаў і шляхты прысягнула новай уладзе.

У эканамічным і палітычным развіцці Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. меліся адрозненні.

У Расійскай імперыі з яе абсалютнай уладай манарха дваране, нягледзячы на моцную залежнасць ад цэнтральнай улады, імкнуліся прыстасавацца да новых умоў гаспадарання. Рускія памешчыкі раней, чым памешчыкі Рэчы Паспалітай, пачалі пераводзіць сялян на больш прагрэсіўную форму рэнты – грашовы чынш. Разам з тым дваранская зямельная ўласнасць у Рэчы Паспалітай раней, чым у Расіі, згубіла свой умоўны характар. Яшчэ ў пачатку XVIII ст. "паспалітае рушэнне", служба ў якім лічылася неабходнай умовай для валодання шляхтай землямі, ужо не склікалася. У Расіі толькі маніфест Пятра III ад 1762 г. вызваліў дваранства ад нясення дзяржаўнай службы.

Існавалі адрозненні і ў формах дваранскага землеўладання, і ў прававым статусе дваранства. Расія не ведала землеўладання дробнай шляхты. У Рэчы Паспалітай дробная шляхта па свайму прававому становішчу амаль не адрознівалася ад магнатаў. З эпохі "залатых вольнасцей шляхецтва" яна не прывыкла да бясспрэчнага паслухмянства цэнтральнай уладзе. Улада караля ў Рэчы Паспалітай была вельмі слабай. Ён быў пазбаўлены заканадаўчых паўнамоцтваў і з'яўляўся толькі вярхоўнай выканаўчай уладай. Дзейнасць вышэйшага заканадаўчага органа ў краіне – Сейма – была паралізавана. Таму палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі спачатку вызначалася асцярожнасцю.

Урачыстыя абяцанні расійскага ўрада не кранаць набытых беларускай шляхтай правоў і існуючых грамадскіх адносін абумовілі спакойны пераход новападданых у новую дзяржаўную залежнасць. Тым, хто прыняў прысягу, даваліся правы расійскага дваранства (пры захаванні многіх ранейшых правоў), маёнткі з сялянамі. Ухіліліся ад прысягі толькі некаторы буйныя магнаты: два Радзівілы (ваявода віленскі і староста рэчыцкі); тры Агінскя (вялікі гетман літоўскі, кашталян віленскі і ваявода трокскі); Сапега (ваявода полацкі і гетман польскі і літоўскі); Салагуб (ваявода віцебскі); Пацей (вялікі стражнік літоўскі); Чартарыйскі (ваявода рускі). Але расійскі ўрад ліквідаваў бескантрольную самастойнасць феадалаў. Шляхта страціла правы на канфедэрацыі, на ўтрыманне свайго войска і ўласных крэпасцей.

Дваранству і купецтву беларускіх зямель у ***1773 г.*** дазвалялася выбіраць дэпутатаў для выпрацоўкі праекта новага агульнадзяржаўнага Улажэння. У 1777 г. былі праведзены выбары павятовых і губернскіх прадвадзіцеляў дваранства, створаны павятовыя і губернскія дваранскія сходы. Асноўная частка беларускай шляхты задаволілася сваім новым становішчам.

У ***1785 г.*** на далучаныя гарады Беларусі былі распаўсюджаны прынцыпы, абвешчаныя Кацярынай II у "Даравальнай грамаце гарадам". У гарадах адмянялася панаванне свецкіх ці духоўных феадалаў, скасоўвалася магдэбургскае права. Шматлікія прыватныя гарады і мястэчкі былі выкуплены

урадам. Кіраванне гарадскім жыццём канцэнтравалася ў Думе – прадстаўнічым органе з гарадскіх саслоўяў. Купецтва атрымала права на арганізацыю гільдый, як гэта было ў Расіі.

На беларускае насельніцтва была распаўсюджана расійская падатковая сістэма. Ліквідаваліся розныя дзяржаўныя зборы з насельніцтва. Замест іх уводзіліся ***падушны падатак*** і ***земскі збор***. Але, прыняўшы пад увагу цяжкі стан беларускага насельніцтва, выяўлены ў час перапісу (пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай), расійскі ўрад на два гады вызваліў яго ад выплаты дзяржаўных падаткаў. На працягу наступных 10 гадоў падушны падатак збіраўся ў палавінным памеры.

Расійскі ўрад імкнуўся паказаць, што не мае намеру замахвацца на прававыя нормы, якія здаўна існавалі на далучаных землях. Асноўным заканадаўчым кодэксам тут заставаўся Статут Вялікага княства Літоўскага. Але мясцовая адміністрацыя ўсталёўвалася на расійскі ўзор і была строга падсправаздачна цэнтральнай уладзе.

Такім чынам, у першы час пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі яе ўрад імкнуўся не ўжываць жорсткія меры да мясцовага насельніцтва, каб прыглушыць апазіцыйныя настроі. Але значная частка апалячанай шляхты і каталіцкага духавенства, якія страцілі сваё прывілеяванае становішча, засталіся незадаволенымі. Гэта прымусіла расійскі ўрад устаць на шлях узмацнення сваіх пазіцый у беларускіх землях.

**Канфесійная і нацыянальная палітыка.** У канцы XVIII ст. на беларускіх землях пражывала каля 39 % уніятаў, 38 – католікаў, 10 – іудзеяў, 6,5 – праваслаўных, 4 – старавераў, астатнія 2,5 % прыходзіліся на пратэстантаў, мусульман і караімаў. Расійскі ўрад дазволіў дзейнасць усіх канфесій, аднак верацярпімасць была адноснай. Галоўнай задачай канфесійнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі было ўзмацненне пазіцый праваслаўя. З далучэннем Беларусі да Расійскай імперыі мясцовая праваслаўная царква перайшла пад юрысдыкцыю Свяцейшага Сінода. Сінод з'яўляўся вышэйшым органам кіравання ў Рускай праваслаўнай царкве. Яго ўзначальваў обер-пракурор – свецкі чыноўнік, які прызначаўся імператарам. На беларускіх землях існавалі Магілёўская (створана ў 1632 г.) і Мінская (створана ў 1793 г.) епархіі, куды ўваходзілі тэрыторыі Міншчыны, Віленшчыны, і Гродзеншчыны. Нягледзячы на сваё пануючае становішча, праваслаўная царква знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным стане. Праваслаўнымі вернікамі ў асноўным былі прыгонныя сяляне, бедная шляхта і мяшчане. Дваране (у большасці сваёй католікі) мала клапаціліся пра ўладкаванне праваслаўных прыходаў.

Каталіцтва і пратэстантызм карысталіся шырокай свабодай на тэрыторыі беларускіх губерняў. Расійскі ўрад улічваў, што практычна ўсе беларускія магнаты і шляхта з'яўляліся католікамі. Таму за католікамі захоўвалася права на свабоднае выкананне абрадаў, маёмасць каталіцкіх касцёлаў і кляштараў захоўвалася ў недатыкальнасці. Згодна з даравальнай граматай Кацярыны II ад ***1774 г.*** засноўвалася Беларуская каталіцкая епархія з цэнтрам у Магілёве, што

адпавядала інтарэсам польскага і апалячанага беларускага дваранства. Адзінае, што катэгарычна забаранялася каталіцкаму духавенству – гэта схіляць да сваёй веры праваслаўных.

Забаронены рымскім папам у ***1773 г.*** ордэн езуітаў знайшоў сабе часовы прытулак на землях Беларусі. Езуіты з дазволу ўлад маглі займацца місіянерскай дзейнасцю па ўсёй Беларусі. Езуіцкія калегіі былі адкрыты ў Магілёве, Мсціслаўлі, Чачэрску, Віцебску, Дзвінску і Оршы. 12 студзеня 1812 г. Полацкай езуіцкай калегіі быў нададзены статус акадэміі з правамі універсітэта. Толькі пасля вайны 1812 г., у ходзе якой каталіцкае духавенства супрацоўнічала з французскай акупацыйнай адміністрацыяй, езуіты былі выгнаны з Расіі, а іх маёмасць канфіскавана. У 1820 г. была зачынена і Полацкая езуіцкая акадэмія.

Такая ж верацярпімасць была праяўлена і ў адносінах да уніятаў. Кіраўнікі мінскай і магілёўскай праваслаўных епархій былі папярэджаны аб тым, што нельга прымушаць уніятаў пераходзіць у праваслаўе, а трэба “абуджаць добраахвотнае жаданне”. Святары, якія парушалі гэты ўказ, падлягалі адлучэнню ад сваіх прыходаў. Толькі ў 1794 г. пасля паўстання Т. Касцюшкі Кацярына II выдала ўказ, каб ніхто з шляхты, духоўных або ўрадавых асоб не рабіў перашкоды пры пераходзе з уніяцтва ў праваслаўе.

Аднак умацаванне каталіцтва адмоўна адбілася на становішчы уніятаў. Вернікамі уніяцкай царквы былі прыгонныя сяляне, мяшчане і дробная шляхта. Таму, нягледзячы на колькасную перавагу ў верніках, уніяцтва не з’яўлялася ўплывовай канфесіяй у краі. Да таго ж уніяты юрыдычна падпарадкоўваліся каталіцкай царкве. У пачатку XIX ст. пад ціскам мясцовых памешчыкаў-католікаў распачаўся перавод уніятаў у каталіцтва. Так, ў 1803 г. у Полацкай архіепіскапіі лацінскі абрад прынялі 100 тыс. вернікаў (паводле іншых звестак, каля 200 тыс.), у Дзісенскім і Вілейскім паветах Мінскай губерні – каля 20 тыс. і г. д. Акрамя таго, у гэты перыяд уніяцкая царква называлася не грэка-каталіцкая, а рымска-уніяцкая.

Рэскрыптам ад ***4 ліпеня 1803 г.*** Аляксандр І забараняў пераходы ў каталіцтва. Каб захаваць цэласнасць уніяцкай царквы, указам Аляксандра І ад ***16 ліпеня 1805 г.*** у Рыма-каталіцкай калегіі быў створаны уніяцкі дэпартамент, які ўзначальваў архіепіскап Іраклій Лісоўскі. Годам пазней І. Лісоўскі быў прызначаны уніяцкім мітрапалітам. І надалей урад неаднаразова прымаў указы, якія забаранялі каталіцкаму духавенству далучаць уніятаў, аднак яны фактычна не выконваліся.

Значныя абмежаванні ўводзіліся толькі ў адносінах да аднаго народа – яўрэяў. У Рэчы Паспалітай яўрэі не былі запрыгонены і не атрымалі права сяліцца на зямлі. У выніку гэтага яны прывыклі пастаянна перамяшчацца і займацца часовай дзейнасцю (Асноўная частка яўрэйскага насельніцтва жыла ў гарадах і таму запісвалася ў лік мяшчан або купцоў). Гэта з’ява супярэчыла парадкам у Расійскай дзяржаве, дзе ўсё насельніцтва рэгістравалася і пражывала ў канкрэтным месцы.

Расійскія ўлады імкнуліся зберагчы інтарэсы свайго карэннага насельніцтва. Калі яўрэйскія купцы пачалі канкурыраваць з рускімі, то Кацярына II указам ад ***23 снежня 1791 г.*** забараніла яўрэям запісвацца ў купецтва ва ўнутраных расійскіх гарадах. Яўрэям дазвалялася жыць толькі ў межах беларускіх губерняў і Таўрычаскай вобласці. З гэтага ўказа пачалося фарміраванне “***мяжы аселасці***” яўрэйскага насельніцтва. Указам ад ***23 верасня 1794 г.*** права аселага жыхарства і купецка-мяшчанскіх заняткаў для яўрэяў дазволена ў 10 заходніх губернях (беларускіх, літоўскіх і часткі ўкраінскіх). Яўрэям дазвалялася сяліцца ў гарадах, займацца рамяством і гандлем. Яўрэі маглі запісвацца ў мяшчанскія і купецкія саслоўі з умовай, што будуць плаціць падвойны дзяржаўны падатак у параўнанні з хрысціянскім насельніцтвам. Каб забяспечыць паступленне падаткаў, урад пакінуў ***кагал*** у якасці органа абшчыннага яўрэйскага самакіравання. У ***1795 г.*** яўрэям-купцам і мяшчанам было забаронена перамяшчацца з губерні ў губерню. “Палажэнне аб уладкаванні яўрэяў” ад ***9 снежня 1804 г.*** захоўвала мяжу аселасці, адмяняла падвоены падатак з фабрыкантаў, раменнікаў і землеўладальнікаў. Выбарчыя пасады ў гарадскім самакіраванні было дазволена займаць толькі адукаваным яўрэям, якія ведалі рускую, польскую або нямецкую мову. Па гандлёвых справах яўрэі маглі прыязджаць ва ўнутраныя губерні, але толькі па асобных пашпартах. “Палажэнне…” прадугледжвала новую дыскрымінацыйную меру – ссяленне да 1 студзеня 1808 г. яўрэйскага сельскага насельніцтва ў гарады і мястэчкі. Гэта акцыя мела цяжкія наступствы для яўрэяў, паколькі многія з іх гублялі сродкі для існавання – арэнду зямлі, корчмаў і г. д.

**Сацыяльная структура насельніцтва беларускіх губерняў.** Большую частку насельніцтва пяці заходніх губерняў складалі беларусы. Толькі ў Віленскай губерні пераважала літоўскае насельніцтва – 48 % ад агульнай колькасці жыхароў, а беларусы (іх было 20 %) канцэнтраваліся пераважна ў Віленскім, Дзісенскім і Свянцянскім паветах. На тэрыторыі беларускіх зямель таксама жылі палякі, рускія, украінцы, літоўцы, латышы, татары і яўрэі.

Сацыяльная структура насельніцтва Беларусі мела ***саслоўны*** характар. Саслоўі падзяляліся на прывілеяваныя і падатковыя. Да прывілеяваных саслоўяў належала дваранства, духавенства, купецтва і нешматлікая група ганаровых грамадзян*,* якая з’явілася ў 1832 г. Усе яны вызваляліся ад рэкрутчыны, цялесных пакаранняў, падушнага падатку і іншых дзяржаўных павіннасцей.

***Дваранства*** Беларусі налічвала амаль 100 тыс. чалавек мужчынскага полу і падзялялася на ***радавое*** і ***асабістае***. Прычым радавога (“сапраўднага”) дваранства было значна больш, чым асабістага (служылага). Гэта тлумачылася адсутнасцю ў былой Рэчы Паспалітай дараванняў “высакароднасці” за службу, як гэта практыкавалася ў Расіі паводле Табелі аб рангах. Яшчэ адной асаблівасцю Беларусі была перавага дробнамаянтковага і безмаянтковага дваранства.

Па канфесійнай прыналежнасці большая частка дваранства Беларусі была каталіцкага веравызнання – каля 87 %, праваслаўных было 6 %, мусульман – 0,9 %, пратэстантаў – 0,7 %. У нацыянальным складзе вышэйшага саслоўя беларускіх губерняў пераважалі палякі і беларусы (95 %). Рускіх і ўкраінцаў сярод дваран было не больш за 2 % ад агульнай колькасці. Каля 2 % дваран былі татарамі, менш за 1 % мелі нямецкае і французскае паходжанне.

***Духавенства*** з'яўлялася другім прывілеяваным саслоўем. Сярод яго пераважную большасць складала хрысціянскае духавенства. Яно падзялялася на праваслаўнае, уніяцкае (да 1839 г.), рымска-каталіцкае і пратэстанцкае. Праваслаўнае і уніяцкае духавенства складалася з дзвюх катэгорый: чорнага (манаства) і белага (прыходскага). Акрамя хрысціянскага існавала іудзейскае і мусульманскае духавенства.

Да ***ганаровых грамадзян*** адносіліся купцы першай гільдыі, вучоныя, мастакі, дзеці асабістых дваран і дзеці духавенства, якія мелі адукацыйны цэнз.

На працягу першай паловы XIX ст. у Беларусі больш як у два разы павялічылася ***купецкае*** саслоўе, якое складалася з трох гільдый (у залежнасці ад сумы аб'яўленага капіталу). Пераважная большасць беларускага купецтва належала да 3-й (ніжэйшай) гільдыі. Агульная колькасць усіх трох гільдый у 1861 г. складала каля 7 тыс. чалавек. Купецтва вызвалялася ад падушнага падатку і цялесных пакаранняў, а купцы 1 – 2-й гільдый – і ад рэкруцкай павіннасці. Саслоўны статус купца цалкам залежаў ад яго маёмаснага стану: у выпадку банкруцтва купец "выпадаў" са свайго саслоўя.

Асноўную масу падатковага саслоўя і ўсяго насельніцтва Беларусі (53,5 %) складалі ***прыгонныя сяляне***, якія падзяляліся на дзве асноўныя групы – ***памешчыцкія*** і ***дзяржаўныя***.

Пераважную большасць прыгонных складалі ***памешчыцкія сяляне*** – 2 369 050 мужчын і жанчын. Памешчыцкія сяляне падзяляліся на ***паселеных*** і ***дваровых***. Паселеныя сяляне атрымлівалі ў карыстанне зямельны надзел, які юрыдычна належаў памешчыку, і займаліся сельскай гаспадаркай. Дваровыя былі пазбаўлены сродкаў вытворчасці, жылі пры двары памешчыка і абслугоўвалі яго сядзібу.

Значную частку памешчыцкіх сялян Беларусі складалі ***агароднікі***. Яны не мелі ворнай зямлі, а толькі сядзібу з агародам. Да прыгонных сялян адносіліся таксама ***бабылі*** або ***кутнікі*** – беззямельныя і бяздомныя сяляне, якія здымалі куток у цяглых сялян і наймаліся да іх батракамі.

***Дзяржаўныя*** сяляне Беларусі ўтварыліся з розных катэгорый сельскага насельніцтва былой Рэчы Паспалітай, жылі на казённых землях і плацілі падаткі ў дзяржаўную казну. Блізкімі па свайму становішчу да дзяржаўных сялян былі "***панцырныя баяры***" (збяднелая шляхта), велікарускія стараверы, вольныя людзі і інш.

Памешчыцкія сяляне знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад сваіх уладальнікаў. Памешчыкі адвольна прызначалі віды і памеры павіннасцей, мелі права без чаргі здаваць у рэкруты непажаданага ім селяніна, маглі адабраць у

прыгонных усю іх маёмасць, цялесна пакараць. Сяляне Беларусі выконвалі розныя павіннасці, якія падзяляліся на галоўныя і дадатковыя. Да галоўных адносіліся паншчына, аброк і згоны (гвалты). Дадатковымі павіннасцямі былі: шарваркі (будаўнічыя работы), вартаўніцтва (начны каравул) і фурманачная (падводная) павіннасць (прадастаўленне фурманкі для перавозак). Усё гэта сяляне выконвалі за права карыстацца зямлёй памешчыка, лавіць рыбу, займацца ляснымі промысламі, здабываннем вапны і г. д. Па патрабаванні памешчыка сяляне прыносілі "даніну" ягадамі, грыбамі, мёдам, палатном і інш.

Развіццё памешчыцкага прадпрымальніцтва выклікала павелічэнне агульнага аб'ёму павіннасцей сялян, а іх эксплуатацыя прыняла яшчэ больш цяжкія формы. Акрамя палявых работ на панскай ворыўнай зямлі, прыгонных вымушалі яшчэ працаваць на вотчынных мануфактурах. Сяляне нават не ведалі сумы сваіх заробкаў, бо разлікаў з імі, як правіла, не праводзілі.

Дзяржаўныя сяляне належалі казне і афіцыяльна называліся "свабоднымі сялянскімі абывацелямі". Аднак калі дзяржаўныя сяляне ўнутраных расійскіх губерняў ужо знаходзіліся на "чыншавым становішчы" (за карыстанне зямлёй плацілі грошы ў дзяржаўную казну), беларускія дзяржаўныя сяляне заставаліся на "гаспадарчым становішчы". Яно характарызавалася тым, што большая частка казённых маёнткаў у губернях Беларусі здавалася ў арэнду (часцей на кароткі тэрмін) мясцовым памешчыкам ці буйным чыноўнікам. Як правіла, дзяржаўныя сяляне таксама адбывалі паншчыну. Як вынік, вельмі часта дзяржаўныя сяляне эксплуатаваліся часовымі арандатарамі больш жорстка, чым памешчыцкія.

Яшчэ адным падатковым саслоўем былі ***мяшчане***. Гэта – асабіста свабоднае насельніцтва гарадоў (у канцы XVIII ст. яны складалі 80 % насельніцтва беларускіх гарадоў), якое павінна было плаціць падушны падатак, адбываць рэкрутчыну і іншыя грашовыя і натуральныя павіннасці. Аднак прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя жылі не толькі ў гарадах. Заможныя сяляне, што сталі вольнымі і перайшлі ў саслоўе мяшчан, звычайна "прыпісваліся" да таго ці іншага горада, але жылі ў сваёй вёсцы, дзе ў іх была наладжана прадпрымальніцкая справа. Насельніцтва гарадоў і мястэчак Беларусі было шматэтнічным і шматканфесійным. Напрыклад, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. у гарадах Мінскай губерні іудзеі складалі 50,5 %, праваслаўныя – 38,4 %, уніяты – 5,4 %, каталікі – 4,8 %.

У першай палове XIX ст. у Беларусі аформілася асобая непадатковая, але і не прывілеяваная група насельніцтва – ***разначынцы*** (выхадцы з "розных чыноў і званняў"). Яны ўяўлялі сабой свабодную, служылую катэгорыю насельніцтва, даволі аднастайную па сваім становішчы ў грамадстве. У гэтую катэгорыю ўваходзілі адукаваныя інтэлігенты, выхадцы з сялянства, мяшчанства, купецтва, духавенства, збяднелага дваранства. Як правіла, разначынцы – гэта ніжэйшыя чыноўнікі, настаўнікі гімназій, работнікі навукі, літаратуры і мастацтва Агульны іх лік і ўдзельная вага сярод насельніцтва Беларусі не вызначаны.

**Саслоўная палітыка расійскага ўрада.** Саслоўная палітыка, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі, была скіравана на ўмацаванне пазіцый Расіі. Першым крокам у гэтым напрамку стала ўвядзенне ў Беларусі землеўладання рускага дваранства за кошт дзяржаўнага фонду. Яшчэ Кацярынай II асноўная частка дзяржаўных зямель разам з сялянамі (звыш 180 тыс. чалавек мужчынскага полу) была раздадзена рускім дваранам і чыноўнікам. Павел I аддаў рускім памешчыкам яшчэ каля 28 тыс. сялян-мужчын. Пасля 1801 г. раздача маёнткаў у Беларусі была спынена ўрадам Аляксандра I з-за супраціўлення дзяржаўных сялян пераводу іх у разрад памешчыцкіх.

У адносінах да беларускага дваранства ўрад ўлічваў гістарычныя асаблівасці, якія склаліся на працягу стагоддзяў.

У Расіі не існавала такой сацыяльнай групы як дробная шляхта. Яе эканамічнае становішча часам набліжалася да становішча селяніна-аднадворца. Аднак збяднелая шляхта фармальна не адрознівалася ад магнатаў і юрыдычна мела з імі аднолькавыя правы. Таму ўдзельная вага дваранства ў беларускіх губернях была самай высокай у імперыі – 5 – 6 % (у сярэднім 1,5 % па Еўрапейскай Расіі).

Палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі вызначалася надзвычайнай асцярожнасцю. Мясцовым дваранам надаваліся ўсе правы і прывілеі, якімі валодала расійскае дваранства, але дазвалялася карыстацца "мясцовымі законамі", калі яны не супярэчылі расійскім. Так, да 1831 г. Статут Вялікага княства Літоўскага дзейнічаў ва ўсіх беларускіх губернях, а ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай – да 1840 г.

Новым ва ўрадавай палітыцы быў дыферэнцыраваны падыход да розных груп беларускага дваранства. У адносінах да дробнай шляхты, якая складала абсалютную большасць мясцовага прывілеяванага саслоўя, праводзіўся так званы ***"разбор шляхты":*** шляхціцы, якія не змаглі дакументальна пацвердзіць сваё дваранскае паходжанне, прыпісваліся да розных груп падатковага саслоўя. Хоць "разбор" шляхты быў дэклараваны яшчэ ў 1772 г., яго рэалізацыя праводзілася марудна, непаслядоўна, у асноўным з-за складанай юрыдычнай сістэмы доказаў дваранскага паходжання.

З пачатку новага стагоддзя адным са шляхоў паслаблення пазіцый дробнага дваранства была змена заканадаўства ў сістэме выбарных судовых органаў. Змяненні ажыццяўляліся ў напрамку скарачэння органаў дваранскага самакіравання.

Важным крокам, які павінен быў умацаваць пазіцыі расійскага ўрада на беларускіх землях, была ***канфіскацыя маёнткаў*** за ўдзел у антыўрадавай дзейнасці. Канфіскацыі праводзіліся ў некалькі этапаў. З 1773 па 1775 г. яны былі накіраваны супраць той часткі магнатаў і шляхты, якія не захацелі прынесці прысягу новаму гаспадару, а пазней – супраць удзельнікаў паўстання Тадэвуша Касцюшкі. У 1812 – 1813 гг. пачалася новая хваля канфіскацый, яна

была звязана з вайной 1812 г. У выніку становішча магнатаў і шляхты пагоршылася, а іх імкненне да аднаўлення Рэчы Паспалітай узмацнілася.

Частка буйных землеўласнікаў звязвала надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай з аўтаноміяй у складзе Расіі. У канцы 1811 – пачатку 1812 г. М. Агінскі па прапанове Аляксандра I падрыхтаваў праект аб адраджэнні Вялікага княства Літоўскага пад пратэктаратам Расіі (па прыкладу Фінляндыі). План не быў рэалізаваны, але разам з тым адыграў пэўную ролю ў фарміраванні ўрадавай палітыкі на тэрыторыі заходніх губерняў імперыі.

Пры Аляксандры I урад лічыўся толькі з дваранствам. Мерапрыемствы расійскага ўрада па сялянскаму пытанню не маглі не зацікавіць беларускіх памешчыкаў. "Вызваленне сялян" у Остзейскім краі (частка Латвіі) ў 1816 – 1819 гг., дзе сяляне атрымлівалі асабістую свабоду, а памешчык заставаўся ўласнікам усіх зямельных угоддзяў, умацавала памешчыкаў памежных раёнаў у жаданні беззямельнага вызвалення сялян. Так, дваранства Віцебскай губерні стварыла камітэт для выпрацоўкі адпаведнага палажэння, але яго распрацоўка зацягнулася і не была даведзена да канца.

Адным са сродкаў рашэння сялянскага пытання было ўвядзенне з ***1810*** г. ***ваенных пасяленняў*** (ініцыятарам гэтай палітыкі быў А. Аракчэеў). Мэтай іх арганізацыі было стварэнне з сялян ізаляванай ваеннай касты, якая б забяспечвала сябе харчаваннем і фуражом і з'яўлялася б апорай ураду. Аднак вопыт іх стварэння ў Магілёўскай і Віцебскай губернях быў няўдалы. Яны не здзейснілі ніводнай з пастаўленых задач.

**"Польскае пытанне" ва ўрадавай палітыцы Расіі.** Падзелы Рэчы Паспалітай абумовілі ўзнікненне ***"польскага пытання"***, сутнасць якога заключалася ў пастаянным імкненні пераважнай большасці польскага грамадства да аднаўлення страчанай дзяржаўнасці. У шматнацыянальных заходніх губернях Расійскай імперыі "польскае пытанне" было амаль што самым вострым і аказвала ўплыў на ўсе сферы ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі.

У пачатку XIX ст. па ініцыятыве Аляксандра I пачала абмяркоўвацца магчымасць аднаўлення дзяржаўнасці Польшчы. Гэта дапамагло прыцягнуць да супрацоўніцтва з імперскімі ўладамі польскіх дзеячаў, у тым ліку А. Чартарыйскага і М. Агінскага. У ***1815 г.*** Каралеўству Польскаму, створанаму паводле пастановы Венскага кангрэсу, была падаравана Канстытуцыя, у адпаведнасць з якой у Польшчы стваралася мясцовая адміністрацыя.

Канстытуцыйныя імкненні Аляксандра I (ёсць звесткі, што ён нават планаваў перадаць у склад будучай Польшчы заходнія губерні Беларусі) выклікалі ў польскім грамадстве хвалю паланафільскіх настрояў і падагравалі надзею на хуткае аднаўленне дзяржаўнай самастойнасці. Узмацненню польскага ўплыву ў галіне культуры і мовы, умацаванню пазіцый каталіцызму ў беларускіх губернях спрыяла і тое, што ўся тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Віленскай навучальнай акругі, польскай па характару сваёй дзейнасці.

Аднак выкрыццё ў пачатку 1820-х гадоў у Віленскім універсітэце тайных студэнцкіх гурткоў польскай моладзі выклікала змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі. З гэтага часу асноўным яе кірункам стала паслабленне польскага палітычнага і культурнага ўплыву. Менавіта гэтай мэце адпавядала перадача ў 1824 г. з Віленскай навучальнай акругі ў Пецярбургскую дзвюх беларускіх губерняў – Віцебскай і Магілёўскай, а таксама замена А. Чартарыйскага М. Навасільцавым на пасадзе папячыцеля Віленскай навучальнай акругі.

Курс на аслабленне польскага ўплыву на беларускіх землях яшчэ больш узмацніўся ў канцы 20-х гадоў і асабліва ў сувязі з польскім нацыянальным паўстаннем ***1830 – 1831 гг.***

## § 2. Беларусь у Айчыннай вайне 1812 г.

**Міжнароднае становішча ў Еўропе напярэдадні вайны.** Захапіўшы ўладу ў Францыі, Напалеон пачаў відавочна праяўляць свае прэтэнзіі на сусветнае панаванне. У ходзе войн 1796 – 1809 гг. Францыя падпарадкавала амаль усе краіны Заходняй Еўропы, за выключэннем Англіі і Швецыі. Такая сітуацыя пагражала інтарэсам Расійскай імперыі. Расія актыўна ўдзельнічала ў ваенных кааліцыях еўрапейскіх манархій, накіраваных супраць Францыі. Але ў руска-франка-прускай вайне 1805 – 1807 гг. кааліцыя пацярпела паражэнне. Аўстрыя і Прусія сталі сатэлітамі Францыі. Англіі Напалеон абвясціў кантынентальную блакаду і прымусіў далучыцца да яе ўсе заваяваныя ім дзяржавы. Расія таксама вымушана была заключыць ў ***1807 г. Тыльзіцкі мір***, які меў антыбрытанскую накіраванасць. Згодна з гэтым дагаворам, Напалеон стварыў з польскіх зямель, што належалі Прусіі, Герцагства Варшаўскае, васальную Францыі дзяржаву на граніцы з Расіяй. Расіі Напалеон навязаў Беластоцкую акругу з мэтай паглыбіць руска-прускія супярэчнасці. Герцагства Варшаўскае Напалеон выкарыстоўваў у якасці свайго плацдарма на выпадак вайны з Расіяй. Ён нават пагражаў Аляксандру І, што гатовы аднавіць Польшчу ў межах 1772 г.

Да пачатку 1810 г. адносіны паміж Францыяй і Расіяй яшчэ больш абвастрыліся, і яны пачалі рыхтавацца да вайны. Узрастае ваенны бюджэт Францыі, яе войска папаўняецца навабранцамі. Напалеон сцягвае свае войскі ў Прусію і Герцагства Варшаўскае, пастаянна папаўняючы іх кантынгент. Адначасова ён стварае з суседзяў Расіі – Аўстрыі і Прусіі франка-аўстра-прускі ваенны саюз, абяцаючы ім пашырыць іх тэрыторыі за кошт зямель, якія ўваходзілі ў склад Расіі. У лютым 1812 г. Напалеон заключыў дагавор з Прусіяй, а ў сакавіку – з Аўстрыяй. Прусія абавязалася выставіць 20 тыс. салдат, Аўстрыя – 30 тыс., перадаць іх пад французскае камандаванне і прадставіць усё неабходнае для забеспячэння саюзнай арміі. Армія Герцагства Варшаўскага ўжо ў сакавіку 1811 г. налічвала 60 тыс. чалавек. Такім чынам, супраць Расіі Напалеон здолеў выставіць 647 158 чалавек войска і 1 372 гарматы.

Падрыхтоўка Францыі да вайны не была тайнай для Расіі. Расійскі ўрад рыхтаваўся да абароны. Буйным поспехам расійскай дыпламатыі напярэдадні вайны стала заключэнне саюзных дагавораў з Швецыяй, Вялікабрытаніяй і Іспаніяй. Перамога Расіі ў руска-турэцкай вайне 1806 – 1812 гг. і Бухарэсцкі мірны дагавор, заключаны ў маі 1812 г., выключылі магчымасць удзелу Турцыі ў вайне на баку Францыі.

**Падрыхтоўка Расіі да вайны і сацыяльна-палітычная сітуацыя ў заходніх губернях.** Тэрыторыя Беларусі і Літвы разглядалася расійскім камандаваннем у якасці будучага галоўнага тэатра ваенных дзеянняў. Таму ўрад прыняў шэраг мер для яе ўмацавання ў інжынерных і інтэнданцкіх адносінах. У жніўні 1810 г. было вырашана пабудаваць ваенныя цытадэлі ў Бабруйску і Дынабургу і ваенны лагер каля Дрысы, а каля Барысава – масты праз Бярэзіну. У будаўніцтве гэтых абарончых збудаванняў прымала актыўна ўдзел насельніцтва Беларусі. Напрыклад, на работы па пабудове Дрысенскага ваеннага лагера кожны дзень прыцягвалася каля 2 500 чалавек.

У ваенна-стратэгічных планах расійскага камандавання беларускія землі адыгрывалі значную ролю ў бягучым забеспячэнні дыслацыраваўшыхся тут палявых рэгулярных войск, стварэнні харчова-фуражных запасаў, пастаўцы для арміі коней, транспартных сродкаў і іншых неабходных для арміі рэчаў. Ішло таксама камплектаванне расійскай арміі. Толькі за 1811 г. з пяці беларускіх губерняў у расійскія войскі паступіла 14 750 рэкрутаў, а разам з наборам 1808 – 1810 гг. агульная колькасць рэкрутаў з Беларусі складала некалькі дзесяткаў тысяч чалавек.

Падрыхтоўка да вайны ўскладнялася супярэчнасцямі ў палітычным настроі беларуска-літоўскага грамадства, у першую чаргу ў асяроддзі шляхецкага саслоўя. Дэмакратычныя шляхецкія, мяшчанскія, інтэлігенцкія колы арыентаваліся на Напалеона. Вялікая колькасць шляхецкай моладзі яшчэ з часоў аўстра-франка-польскай вайны 1809 г. эмігравала ў Герцагства Варшаўскае і паступала служыць у польскае войска. Прынятыя ў гэтай сувязі расійскімі ўладамі захады (секвестр і канфіскацыя маёмасці, судовыя прыгаворы) асаблівага поспеху не мелі.

Аднак пераважная большасць шляхты з асцярогай глядзела на сацыяльныя рэформы ў герцагстве, асабліва на адмену прыгоннага права. Для многіх шляхціцаў імя Напалеона было непарыўна звязана з Французскай рэвалюцыяй, якая знішчыла ўсе феадальныя інстытуты. Частка арыстакратаў і буйных землеўласнікаў звязвала свае надзеі на аднаўленне элементаў “літоўскай” дзяржаўнасці (ВКЛ) у саюзе з Расіяй і на чале з Аляксандрам І.

Са свайго боку, для забеспячэння падтрымкі з боку дваранства Літвы і Беларусі напярэдадні вайны з Францыяй імператар Аляксандр І істотна знізіў падаткі, якія паступалі ў казну з тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага, і выказаў жаданне аднавіць цэласнасць краю пад эгідай Расіі. Па даручэнню імператара ў ***1811 г.*** магнаты ***М. Агінскі, К. Любецкі, К. Плятэр, К. Любамірскі, С. Грабоўскі*** склалі праект ***“Палажэння аб кіраванні***

***аўтаномным Вялікім Княствам Літоўскім***”. У склад апошняга павінны былі ўвайсці ўсе тэрыторыі, што адышлі да Расіі ад былой Рэчы Паспалітай. Першым крокам на шляху да аўтаноміі павінна было быць абвяшчэнне Маніфеста Вялікага княства Літоўскага. Прадугледжвалася таксама паступовае, на працягу 10 гадоў, асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Аднак ажыццяўленне праекта адкладвалася. У вышэйшым расійскім кіраўніцтве гэты праект разглядалі як спробу раздзялення і аслаблення імперыі.

**Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г.** Расійскае войска на заходняй мяжы імперыі складалася з трох армій і трох асобных карпусоў. Першая Заходняя армія на чале з ваенным міністрам ***М.Б. Барклаем дэ Толі*** (120,2 тыс. чалавек і 580 гармат) дыслацыравалася ў Віленскай губерні, па лініі Расоны – Ліда і прыкрывала пецярбургскі кірунак. Другая Заходняя армія пад камандаваннем генерала ад інфантэрыі ***П.І. Баграціёна*** (49,4 тыс. чалавек і 180 гармат) знаходзілася ў Гродзенскай губерні, паміж Нёманам і Бугам і засланяла маскоўскі напрамак. Трэцяя Заходняя армія на чале з генералам ад кавалерыі ***А.П. Тармасавым*** (44,2 тыс. чалавек і 168 гармат) была размешчана каля г. Луцка ў Валынскай губерні і закрывала кіеўскі напрамак. Акрамя таго, пад Рыгай знаходзіўся асобны корпус генерал-лейтэнанта І. Эсена (38,1 тыс. чалавек), каля Тарапца – рэзервовы корпус генерал-ад’ютанта Я. Мелера-Закамельскага (27,5 тыс. чалавек) і войскі генерал-лейтэнанта Ф. Эртэля (37,5 тыс. чалавек). Паводле плана, распрацаванага саветнікам Аляксандра І прускім генералам К. Фулем, рускія арміі былі размешчаны на фронце ў 600 км і аказаліся адарванымі адна ад другой на 100 – 200 км. Гэта стварала рэальную пагрозу разгрому іх паасобку, на што і разлічваў Напалеон.

У ноч на ***12 чэрвеня 1812 г.*** пачалася пераправа войскаў Напалеона праз Нёман. Адразу быў заняты г. Коўна. Напалеон спадзяваўся разбіць рускія войскі ў прыгранічных раёнах і прымусіць Расію заключыць мір. На нарадзе ў Дрысенскім лагеры расійскае камандаванне прыняло рашэнне не ўступаць у рашаючую бітву да аб’яднання 1-й і 2-й армій у Віцебску. Армія М.Б. Барклая дэ Толі адыходзіла на Віцебск праз Вільню – Свянцяны – Дрысу – Полацк. Для прыкрыцця Пецярбургскага напрамку ў Дрысенскім лагеры быў пакінуты корпус П.Х. Вітгенштэйна. У асабліва цяжкім становішчы апынулася 2-я армія П.І. Баграціёна, якая адступала ў напрамку Ваўкавыск – Слонім – Навагрудак – Нясвіж – Магілёў. Яна страціла сувязі з асноўнымі рускімі войскамі і праследавалася французскай арміяй.

Беларусь стала арэнай ваенных дзеянняў. ***16 чэрвеня 1812 г.*** французская армія заняла Вільню. У той жа дзень сюды прыехаў Напалеон. У чэрвені – ліпені адбыліся жорсткія баі каля вёсак Вароны, Закрэўшчына, Гудзявічы Гродзенскай губерні, пад мястэчкамі Вішнева, Карэлічы Віленскай губерні; паблізу мястэчкаў Мір і Раманава Мінскай губерні, каля мястэчка Астроўна і вёскі Кукавячыны Віцебскай губерні, пад Клясціцамі каля Полацка. ***15 ліпеня*** А.П. Тармасаў разбіў пад Кобрынам саксонскі корпус Ж. Рэнье і знішчыў больш за 6 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. Аднак у ліпені 1812 г. злучыцца

расійскім арміям у раёне Віцебска не атрымалася. Корпус Даву апярэдзіў рускую армію, заняў Магілёў і перагарадзіў ёй шлях каля вёскі Салтанаўка. Спроба рускіх войск праравацца не ўдалася. Тады П.І Баграціён пераправіў армію праз Днепр каля Нова-Быхава і выратаваў яе ад разгрому. Чарговым пунктам сустрэчы рускіх армій быў прызначаны Смаленск.

**Палітыка французскіх улад на акупіраванай тэрыторыі.** Амаль уся Беларусь, апрача паўднёвых паветаў, кантралявалася французскім ваенным камандаваннем. Але ўжо на пачатку вайны Напалеон вымушаны быў пакідаць значныя сілы ў гарнізонах, асабліва ў Вільні, Мінску, Віцебску. Напалеонаўская армія разам з хворымі і дэзерцірамі страціла да 150 тыс. чалавек, у ёй пагоршылася дысцыпліна, шырока распаўсюдзілася марадзёрства.

Напалеон разлічваў, што значная частка літоўска-беларускай шляхты спадзявалася на аднаўленне пры яго дапамозе Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Каб яшчэ больш схіліць шляхту на свой бок, Напалеон распарадзіўся стварыць у захопленай Вільні Часовы ўрад пад назвай “***Камісія Вялікага княства Літоўскага***”. Дзейнасць Камісіі распаўсюджвалася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць, якія былі ў хуткім часе ператорваны ў дэпартаменты з двайной (мясцовай і французскай) адміністрацыяй. Галоўныя пасады ў іх занялі французскія военачальнікі – інтэнданты. У склад Камісіі ВКЛ увайшлі мясцовыя землеўласнікі і палітычныя дзеячы: С. Солтан (старшыня), К. Прозар, Ю. Серакоўскі, А. Сапега, Ф. Ельскі, А. Патоцкі, Я. Снядзецкі. У яе функцыі ўваходзілі фінансавыя пытанні (збор падаткаў і размеркаванне бюджэтных сум), арганізацыя ўзброеных сіл, фарміраванне жандармерыі і суда. Вышэйшая ваенная ўлада ў княстве належала прызначанаму 8 ліпеня 1812 г. генерал-губернатару графу Дзірку ван Гогендорпу, а ў кожным дэпартаменце дзейнічаў ваенны губернатар. Для Віцебскай і Магілёўскай губерняў было вызначана асобнае, “польскае праўленне”. Неўзабаве Расійскі герб быў заменены на польскага белага арла.

Французскай арміі патрэбны былі салдаты і афіцэры, харчаванне, коні і фураж. Марыянетачны Часовы ўрад ВКЛ павінен быў перш за ўсе забяспечваць усім гэтым войскі Напалеона. Палякі заклікалі аднавіць Польскае каралеўства ў старых межах. Аднак Напалеон ухіляўся ад прамога адказу – ён не жадаў, каб паміж ім і Аляксандрам І паўставала непераадольная перашкода для заключэння міру. Да таго ж літоўска-беларуская шляхта не жадала аб’яднання з Польшчай, бо марыла аб стварэнні самастойнай дзяржавы. Менавіта таму Напалеон не далучыў тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага да герцагства Варшаўскага, праігнараваўшы просьбы польскага сейма.

**Адносіны розных слаёў насельніцтва Беларусі да падзей вайны 1812 г.** Прыход французскай арміі насельніцтва Беларусі сустрэла неадназначна. Гараджане ўрачыста віталі французаў. Шляхта амаль усюды сустракала французскія войскі як вызваліцеляў ад расійскіх захопнікаў. Падтрымку Напалеону аказала і каталіцкая царква. Аднак па меры прасоўвання французскіх войск на ўсход Беларусі шляхта, асабліва ў Віцебскай і

Магілёўскай губернях, пачынае выказваць свае пачуцці ўсё больш стрымана. Масавыя рэквізіцыі, недастаткова паважлівыя адносіны французаў да мясцовых органаў улады, ваенныя няўдачы прывялі да ахаладжэння ў адносінах шляхты да французаў. Захапленне змянілася трывожным чаканнем.

Асноўны цяжар вайны лёг на плечы сялян. Новая ўлада не толькі не адмяніла прыгон, але і павялічыла паборы з сялян, чым выклікала ўзмоцненае супрацьдзеянне і варожасць апошніх. Жыхары многіх вёсак пакідалі хаты, забіралі маёмасць і ўцякалі ў лясы, стваралі ў тыле акупантаў партызанскія атрады. Вядомы партызанскія атрады вёсак Стараселле, Мажаны, Есьманы і Кляўкі ў Барысаўскім, Варанкі ў Дрысенскім, Жарцы ў Полацкім паветах і інш. 18 ліпеня Аляксандр I падпісаў у Полацку маніфест аб скліканні народнага апалчэння. Трэба адзначыць, што ў чэрвені – ліпені 1812 г. разам з выступленнямі сялян супраць французскай арміі шырока распаўсюдзіліся выступленні сялян супраць памешчыкаў.

**Ваенныя дзеянні ў Беларусі восенню 1812 г.** ***22 ліпеня 1812 г.*** арміі Баграціёна і Барклая дэ Толі злучыліся пад Смаленскам. У пачатку жніўня адбылася ***Смаленская бітва***, у якой Напалеон страціў больш за 14 тыс. чалавек. Пасля Смаленска рускую армію ўзначаліў ***М.І. Кутузаў***. Генеральная бітва адбылася ***26 жніўня*** каля вёскі ***Барадзіно***. На Барадзінскім полі супраць французаў актыўна змагаліся ўраджэнцы Беларусі. Так, сфарміраваныя на Віцебшчыне чатыры палкі 3-й пяхотнай дывізіі, абаранялі вядомыя Баграціёнавы флешы, а 24-я пяхотная дывізія, складзеная з ураджэнцаў Мінскай губерні, гераічна змагалася каля батарэі Раеўскага.

Аднак Барадзінская бітва не прынесла перамогі ніводнаму з бакоў. М.І. Кутузаў дзеля далейшага захавання арміі пакінуў Маскву, якую хутка занялі французы. Не дачакаўшыся адказу Аляксандра I на прапановы аб міры, Напалеон у пачатку кастрычніка 1812 г. пачаў адступаць з Масквы па спустошанай Смаленскай дарозе. 7 кастрычніка 1812 г. рускія войскі вызвалілі Полацк, 26 кастрычніка – Віцебск, 4 лістапада – Мінск, 9 лістапада – Барысаў, 12 лістапада – Магілёў.

Завяршальны ўдар па французах быў нанесены рускімі войскамі ў лістападзе 1812 г. пры іх пераправе праз Бярэзіну, каля вёскі ***Студзёнка*** непадалёку ад Барысава. Тут загінула 20 тыс. іншаземных захопнікаў, 50 тыс. трапілі ў палон. Пасля гэтага напалеонаўская армія фактычна перастала існаваць. Галодныя і замёрзлыя салдаты кідалі зброю і натоўпамі рухаліся да Вільні. 23 лістапада ў Смаргоні Напалеон, даручыўшы камандаванне Мюрату, пакінуў армію і паехаў у Парыж.

**Вынікі вайны для Беларусі.** Вайна прынесла Беларусі велізарныя людскія, матэрыяльныя і культурныя страты. Многія гарады і вёскі былі разбураны і знішчаны. У гарадах Беларусі колькасць насельніцтва зменшылася ў 2 – 3 разы. У Мінску, напрыклад з 11 200 чалавек да 3 480. У Гродзенскай губерні загінула звыш 37 тыс. душ мужчынскага насельніцтва. Прыйшла ў заняпад сельская гаспадарка. Амаль напалову скараціліся пасяўныя плошчы і

пагалоўе жывёлы. У грашовым вылічэнні страты Беларусі ад вайны, паводле няпоўных звестак, складалі каля 52 млн. руб. серабром.

Ад французаў пацярпелі помнікі царкоўнага дойлідства: Сафійскі сабор у Полацку, Барысаглебская царква ў Віцебску, Екацярынінскі храм у Мінску. Свята-Духаў храм у Вільні быў ператвораны захопнікамі ў звычайную стайню.

Расійскія ўлады не спяшаліся палепшыць становішча ў Беларусі. Прыгоннае права было захавана, працягваліся рэкруцкія наборы, падаткі амаль не зменшыліся. Негатыўныя наступствы падзей 1812 г. адчуваліся ў Беларусі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. У той жа час мясцовая шляхта, нават скампраметаваная супрацоўніцтвам з Напалеонам, у большасці захавала свае правы і прывілеі. Маніфестам Аляксандра I ад 12 снежня 1812 г. калабарацыяністам абвяшчалася "уселітасцівейшае дараванне" і "вечнае забыццё" мінулага. Пачатыя да маніфеста канфіскацыі былі адменены і памешчыкам былі вернуты іх маёнткі. Напрыклад, С. Камінскі, які ўзначальваў створаную Напалеонам "Камісію Вялікага княства Літоўскага", захаваў пасаду старшыні ў мінскім галоўным судзе. В. Гяцэвіч, член савета ў Вільні, стаў мінскім віцэ-губернатарам і г. д.

У гонар перамогі расійскіх войск над арміяй Напалеона на тэрыторыі Беларусі пастаўлены помнікі ў Брэсце, Верхнядзвінску, Віцебску, Кобрыне, Маладзечне, Полацку, Друі, у вёсках Астроўна, Капцэвічы, Клясціцы, Салтанаўка і інш.

## § 3. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух

**Польскія і расійскія дваранскія рэвалюцыянеры ў Беларусі.** Вынікі ***Венскага кангрэса 1815 г.***, наданне аўтаноміі і канстытуцыі Царству (Каралеўству) Польскаму выклікалі ў адукаваных колах Літвы і Беларусі спадзяванні на далучэнне беларуска-літоўскіх зямель да Царства Польскага. Гэтыя надзеі падмацавала стварэнне ў 1817 г. асобнага Літоўскага корпуса з ураджэнцаў беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх губерняў. Яго ўзначаліў галоўнакамандуючы польскім войскам, вялікі князь Канстанцін Паўлавіч. Штандарам Літоўскага корпуса была зацверджана "Пагоня" Вялікага княства Літоўскага, змешчаная на двухгаловым срэбным арле.

Але для найбольш радыкальнай і актыўнай часткі шляхты былой Рэчы Паспалітай існаванне куртатага польскага нацыянальнага дзяржаўнага ўтварэння было недастаткова. Яшчэ ў ***1796 г.*** ў Вільні было заснавана першае тайнае антырасійскае згуртаванне *"**Віленская асацыяцыя**"*. Сваёй мэтай таварыства вызначыла барацьбу за адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Члены таварыства склалі "Акт паўстання", але ў 1797 г. ўлады выкрылі арганізацыю.

Значны ўплыў на распаўсюджванне тайных арганізацый аказала адраджэнне ў 1815 г. ў Царстве Польскім дзейнасці легальнага масонства. У 1819 г. таварыства "Нацыянальнае масонства" паставіла сабе за мэту аднаўленне незалежнай "Польшчы ў магчыма больш шырокіх межах". Для яе

рэалізацыі меркавалася стварыць аддзяленні таварыства ў кожнай правінцыі былой Рэчы Паспалітай. У склад арганізацыі ўвайшлі былы маршалак Віленскай губерні М. Ромер, сакратар канцылярыі віленскага маршалка Ю. Струміла, князь К. Радзівіл, граф С. Солтан. У маі ***1821 г.*** таварыства было пераўтворана ў тайную арганізацыю, якая атрымала назву *“**Патрыятычнае таварыства**”*. Ініцыятарамі выступілі генерал Я. Ушынскі, маёр В. Лукасінскі і іншыя польскія афіцэры. Цэнтральны Камітэт арганізацыі накіраваў эмісараў у Літву, Кракаў, Падолле для стварэння мясцовых аддзелаў. Асноўную ўвагу ў сваёй дзейнасці ён звярнуў на асобны Літоўскі корпус. У 1824 – 1825 гг. паміж Патрыятычным таварыствам і Паўднёвым таварыствам дзекабрыстаў адбыліся перамовы аб будучыні адроджанай Польшчы. Землі Беларусі сталі прадметам спрэчак. У 1826 г. існаванне “Патрыятычнага таварыства” было выкрыта па справе дзекабрыстаў.

У канцы ***1817 г.*** студэнты Віленскага універсітэта А. Міцкевіч, Я. Чачот, Ю. Яжоўскі і інш. заснавалі тайнае патрыятычнае ***Таварыства філаматаў*** (прыхільнікаў ведаў), члены якога першапачаткова ставілі асветніцка-культурныя мэты. Пастулова філаматы прыйшлі да ідэі карэнных сацыяльна-эканамічных рэформ: ліквідацыі прыгоннага права, увядзення канстытуцыйнага кіравання. У праграме таварыства выказвалася ідэя аб праве народаў на незалежнае існаванне. У ***1818 г.*** філаматы пашыраюць сферу сваёй дзейнасці. Яны засноўваюць філіялы – “***Таварыства прамяністых***” і “***Саюз літаратараў***”. У ***1819 г.*** у Свіслацкай гімназіі ўзнікае “***Таварыства аматараў навук***”, члены якога прапаведавалі ідэі волі і роўнасці. На працягу 1817 – 1823 гг. у асяроддзі студэнцкай моладзі Каралеўства Польскага і заходніх губерняў Расіі існавала каля 50 тайных згуртаванняў.

У канцы ***1820 г.*** філаматы заснавалі новую тайную арганізацыю ***філарэтаў*** (аматараў дабрачыннасці). Гэта таварыства ўключала ў сябе больш шырокія колы моладзі, ў тым ліку за межамі Вільні. Галоўная мэта філарэтаў – аднаўленне Рэчы Паспалітай і адмена прыгоннага права. Члены таварыства займаліся вывучэннем беларуска-літоўскага краю, яго гісторыі, фальклору, побыту насельніцтва. У асяроддзі віленскай моладзі выказваліся і планы ўзброенага выступлення. Аднак уладам стала вядома аб існаванні тайных студэнцкіх арганізацый. Дзевяць філарэтаў і адзінаццаць філаматаў былі высланы ва ўнутраныя губерні Расіі, у тым ліку А. Міцкевіч, Т. Зан, І. Дамейка. Ад працы ў Віленскім універсітэце былі адхілены І. Лялевель, І. Даніловіч, М. Баброўскі. Сваіх пасад пазбавіліся рэктар універсітэта Ю. Твардоўскі і папячыцель Віленскай навучальнай акругі А. Чартарыйскі.

У 1824 – 1825 гг. урад, улічваючы, што цэнтрамі большасці тайных таварystваў былі навучальныя ўстановы, прымае меры па наглядзе за навучэнцамі. У адпаведнасці з указам Аляксандра I жыхарам Беларусі і Літвы забаранялася адпраўляць дзяцей на вучобу ў Гейдэльбергскі, Іенскі, Гесенскі і Вюртэмбергскі універсітэты. Чыноўнікі абавязаны былі даваць падпіску аб непрыналежнасці студэнтаў і настаўнікаў да тайных суполак.

Пасля паўстання Сямёнаўскага палка ў Пецярбургу ў 1820 г. у Беларусь былі пераведзены гвардзейскія часці, у якіх служылі будучыя дзекабрысты А. Бястужаў, М. Лунін, А. Адаеўскі, К. Рылееў і інш. М. Мураўёў, кіраўнік "Паўночнага таварыства", падчас знаходжання ў Мінску, напісаў свой першы варыянт "Канстытуцыі". У Віцебску жыў і вучыўся вядомы дзекабрыст, сябра "Таварыства з'яднаных славян" І. Гарбачэўскі. Дзекабрыстамі распрацоўваўся план паўстання ў Бабруйскай крэпасці, якое павінна было даць штуршок дзяржаўнаму перавароту ў Расіі. Дзекабрысты і члены мясцовых тайных таварыстваў спрабавалі наладзіць супрацоўніцтва. Аднак пытанне аб самастойным развіцці Беларусі не ўздымалася.

У 1825 – 1826 гг. у Магілёве існавала ўправа Паўночнага таварыства, арганізаваная па ініцыятыве М. Нарышкіна ад'ютантамі галоўнакамандуючага 1-й арміі В.А. Мусіным-Пушкіным і П.П. Цітовым. У Гродзенскай губерні дзейнічалі два тайных дзекабрысцкіх таварыствы – "Таварыства сяброў" (1822 – 1826 гг.) і "Таварыства ваенных сяброў" (1825 – 1826 гг.). Апошняе па ініцыятыве К.Г. Ігельстрома і А.І. Вягеліна, 24 снежня 1825 г. падняло паўстанне Літоўскага піянернага (сапёрнага) батальёна. У пачатку лютага 1826 г. спрабаваў падняць паўстанне ў Бабруйскай крэпасці С. Трусаў.

Пасля разгрому дзекабрыстаў праз ваенна-судовую камісію, якая працавала ў Магілёве, прайшлі 15 чалавек. Другім цэнтрам следства і суда над дзекабрыстамі быў Беласток. Бабруйская крэпасць стала "турмой на Бярэзіне" для 20 дзекабрыстаў, у тым ліку І. Бурцова, В. Норава, С. Трусава і інш.

Разгром дзекабрыстаў у Расіі прывёў да росту апазіцыйнага руху ў Царстве Польскім. Ідэі ўзброенага паўстання супраць самадзяржаўя, якія існавалі ў польскіх тайных таварыствах, знаходзілі водгук і сярод студэнцкай моладзі Віленскага універсітэта.

**Паўстанне 1830 – 1831 гг.** Набліжэнне паўстання ў Каралеўстве Польскім паскорылі рэвалюцыя ў Францыі, нацыянальна-вызваленчыя рухі ў Бельгіі і Італіі. У ноч на ***29 лістапада 1830 г.*** пачалося паўстанне ў Варшаве. Галоўнымі прычынамі паўстання былі незадаволенасць шляхты падзеламі Рэчы Паспалітай і парушэнне расійскім урадам польскай Канстытуцыі 1815 г. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя сілы Польшчы адстойвалі лозунгі буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў. Але кіраўніцтва паўстаннем апынулася ў руках польскіх арыстакратаў. Яны імкнуліся дабіцца незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., абапіраючыся на армію Царства Польскага і дапамогу заходнееўрапейскіх краін. Ні правыя, ні левыя не ўздымалі пытання нацыянальнага вызначэння беларускага народа. На іх думку, Беларусь павінна была ўліцца ў склад незалежнай Польшчы.

Расійскі ўрад імкнуўся не дапусціць пашырэння паўстання на тэрыторыю Беларусі, Літвы і Украіны. Тут у ***снежні 1830 г.*** было ўведзена ваеннае становішча. На гэтых тэрыторыях павялічвалася колькасць войска. На маёнткі памешчыкаў, якія з'ехалі ў Каралеўства Польскае, быў накладзены арышт, звольнены многія з мясцовых чыноўнікаў. Аднак у пачатку красавіка 1831 г.

паўстанне дасягнула Літвы і Паўночна-Заходняй Беларусі – Ашмянскі, Браслаўскі, Дзісненскі і Вілейскі паветы. Паўстанне развівалася тут пераважна стыхійна, хоць у ***студзені 1831 г.*** пры падтрымцы эмісараў з Варшавы і быў створаны ***Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт***. Камітэт распрацаваў план паўстання, згодна з якім для падрыхтоўкі паўстання на месцах было вырашана стварыць тайныя павятовыя паўстанцкія камітэты. У ***лютым 1831 г.*** Цэнтральны камітэт сабраў у Вільні прадстаўнікоў павятовых камітэтаў. Пачаць паўстанне было вырашана з Віленскай губерні, дзе знаходзілася невялікая колькасць расійскіх войск.

У канцы ***сакавіка 1831 г.*** пачалося паўстанне ў Літве і Заходняй Беларусі. Віленскі цэнтральны камітэт не здолеў кантраляваць ход гэтага паўстання. У кожным павеце быў створаны свой павятовы ўрад, які ўзначальвалі мясцовыя памешчыкі. Урад кожнага павета пры дапамозе каталіцкага духавенства прыводзіў насельніцтва да прысягі, аб’яўляў рэкруцкі набор ў войска, выдаваў розныя звароты да насельніцтва. Сяляне і мяшчане мабілізоўваліся ў паўстанцкія атрады пераважна пад прымусам і не былі зацікаўлены ваяваць без вырашэння сваіх сацыяльных праблем. У той жа час імперскія ўлады абяцалі ім вызваленне ад паноў-паўстанцаў. Ядро паўстанцаў складалі шляхта, навучэнцы, афіцэры-палякі, каталіцкае і ўніяцкае духавенства. Увогуле ў Літве і Беларусі ў паўстанні прымалі ўдзел каля 10 тыс. чалавек. Вузкія палітычныя мэты кіраўнікоў паўстання абумовілі той факт, што яно не атрымала значнай падтрымкі насельніцтва.

У красавіку паўстанне ахапіла ўсю Віленскую губерню, але сувязь паміж паветамі была перарвана. Таму Віленскі Цэнтральны камітэт вырашыў пачаць падрыхтоўку да захопу Вільні і стварыць аб’яднанае войска. Бітва за Вільню ***19 чэрвеня 1831 г.*** стала кульмінацыяй паўстання, у якой аб’яднаныя паўстанцкія сілы краю разам з прысланым на дапамогу польскім корпусам (12 тыс. чалавек) не змаглі дасягнуць перамогі над расійскім войскам. Тым не менш, у Беларусі і Літве было арганізавана каля трыццаці партызанскіх атрадаў, якія налічвалі 12 тыс. чалавек. Найбольш буйнымі былі атрады пад агульным кіраўніцтвам С. Радзішэўскага ў Вілейскім павеце (3,3 тыс. чалавек), В. Брахоцкага ў Дзісненскім павеце (3 тыс. чалавек), К. Пшаздзецкага ў Ашмяскім павеце (2,5 тыс. чалавек), Ю. Кашыца і М. Мяржэўскага ў Навагрудскім (1 тыс. чалавек). На дапамогу ім прыйшлі рэгулярныя польскія войскі на чале з генераламі Д. Хлапоўскім і А. Гелгудам.

У ***жніўні 1831 г.*** паўстанне было падаўлена па ўсёй Беларусі і Літве, а потым і ў Польшчы. Указам ***6 мая 1831 г.*** былі выдзелены тры разрады “злачынцаў”: да першага адносілі кіраўнікоў, да другога – тых, хто ўдзельнічаў у баявых дзеяннях, да трэцяга – усіх іншых. Сялянам, якія вярталіся да свайго памешчыка, давалася дараванне. Маёнткі абвінавачаных падлягалі секвестру. Ад секвестру пазбаўляліся тыя, хто сам з’явіўся на працягу месяца пасля публікацыі ўказа і пакаяўся або даказаў, што яго прымусілі далучыцца да паўстання. Да следства за ўдзел у паўстанні ў беларуска-літоўскіх губернях

было прыцягнута 2 878 чалавек. Сваіх маёнткаў пазбавіліся магнаты, якія валодалі тысячамі прыгонных (Агінскія, Плятэры, Радзівілы, Сапегі, Чартарыйскія і інш.). На тэрыторыі Беларусі ў 1837 г. лічыліся канфіскаванымі 115 маёнткаў з больш як 38 тыс. сялян мужчынскага полу, яны папоўнілі дзяржаўны фонд.

Але і пасля падзей 1830 – 1831 гг. рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі і Літве не спыніўся. Адна з найбольш радыкальных у Беларусі і Літве тайных суполак – ***“Дэмакратычнае таварыства”*** – была створана ў ***1836 г.*** па ініцыятыве ***Ф. Савіча*** пры Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. У 1837 г. Ф. Савіч наладзіў сувязі з Пінскай і Слуцкай ячэйкамі тайнага таварыства “***Садружнасць польскага народа***”, якое ўзначальваў польскі рэвалюцыянер-дэмакрат Ш. Канарскі. У статуце “Дэмакратычнага таварыства” – “Прынцыпах дэмакратызму” – былі абвешчаны ідэі сацыяльнай роўнасці, вызвалення сялян з зямлёй ад прыгоннай залежнасці, права кожнага народа на нацыянальную самастойнасць. У 1838 г. “Дэмакратычнае таварыства” было выкрыта, а праз год Ф. Савіч быў высланы на Каўказ у дзеючую армію.

У 1846 – 1849 гг. у Ашмянах, Вільне, Гродне, Лідзе і Мінску дзейнічалі суполкі тайнай арганізацыі “***Саюз свабодных братоў***”. Ён меў на мэце сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, барацьбу за свабодную Польшчу і Расію.

## § 4. Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі ў 30 – 50-я гг. XIX ст.

**Пашырэнне расійскага ўплыву на беларускіх землях.** Паўстанне 1830 – 1831 гг. выклікала рэзкую перамену палітычнага курса расійскага ўрада ў Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне. Пераканаўшыся ў палітычнай нядобранадзейнасці мясцовага дваранства, урад Мікалая I зрабіў стаўку на поўную уніфікацыю дзевяці заходніх губерняў з Цэнтральнай Расіяй як адзіную надзейную гарантыю ўтрымання гэтай тэрыторыі ў складзе Расійскай імперыі. У ***верасні 1831 г.*** у Пецярбургу быў створаны ***“Асобы камітэт па справах заходніх губерняў”***, які распрацоўваў палітыку ўрада ў дзевяці заходніх губернях адносна сістэмы кіравання, суда, асветы, культуры, шляхецкага саслоўя і інш.

Указам ад ***1 студзеня 1831 г.*** ў Магілёўскай і Віцебскай губернях адмянялася дзеянне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. і ўводзілася расійскае заканадаўства. На тэрыторыі Беларусі ўводзілася новае заканадаўчае ўлажэнне – “Установа аб губернях”, усім дзяржаўным установам і пасадам даваліся расійскія назвы. У мясцовыя адміністрацыйныя органы пачалі прызначацца пераважна расійскія чыноўнікі, польская мова ў судовай справе замянялася на рускую.

У ***1840 г.*** было поўнасцю адменена дзеянне Літоўскага Статута. Расійскае заканадаўства распаўсюдзілася на ўсю тэрыторыю Беларусі. Адначасова была праведзена адміністрацыйная рэформа. Яе вынікам стаў указ ***18 ліпеня 1840 г.***,

якi прадпісаў замест агульнага найменя беларускіх і літоўскіх губерняў выкарыстоўваць іх назвы: Віцебская, Магілёўская, Віленская і Гродзенская.

**Полацкі царкоўны сабор і яго вынікі.** У 1827 – 1830 гг. праводзяцца мерапрыемствы, накіраваныя на рэфармаванне уніяцкай царквы і збліжэнне яе з праваслаўнай. Была створана асобная грэка-уніяцкая калегія, чатыры уніяцкія епархіі рэарганізаваны ў Беларускую і Літоўскую. У практыцы богаслужэння прадугледжвалася выкарыстоўваць “мясцовы дыялект”. У аснову адукацыі дзяцей уніятаў была пакладзена праваслаўная сістэма навучання. У Віленскую каталіцкую семінарыю забаранялася прымаць уніятаў. Для іх у 1828 г. была створана асобная семінарыя ў Жыровічах (каля Слоніма).

Польскае паўстанне 1830 – 1831 гг. вызначыла лёс уніяцкай царквы. У ***1836 г.*** ствараецца Сакрэтны камітэт па уніяцкіх справах. У ***студзені 1837 г.*** кіраванне уніяцкай царквой пераходзіць да Свяцейшага Сінода. У лютым 1838 г. памёр уніяцкі мітрапаліт І. Булгак, які быў апошняй перашкодай у справе скасавання уніі. Грэка-уніяцкую калегію ўзначаліў літоўскі епіскап І. Сямашка, які разам з епіскапамі В. Лужынскім і А. Зубко падтрымлівалі ідэю ліквідацыі уніяцтва. ***12 лютага 1839 г.*** ў Полацку ў прысутнасці вышэйшага уніяцкага духавенства быў падпісаны “***Саборны Акт***” з просьбай на вышэйшае імя аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай. Да прашэння быў прыкладзены спіс 1 305 свяшчэннікаў, якія падтрымалі аб’яднанне. “***Сінадальны ўчынак***” зацвердзіў Мікалай І. Усяго ў 1839 г. да праваслаўнай царквы далучылася каля 1,5 млн. вернікаў.

**Змяненні палітыкі ў галіне асветы.** З ўступленнем на прастол імператара Мікалая І у Расіі пачалося рэфармаванне сістэмы асветы. У аснову народнай асветы быў пакладзены прынцып строгай саслоўнасці. Гэта адлюстроўваў выдадзены ў ***1828 г.*** “***Статут навучальных устаноў***”. Згодна з ім пачатковая і сярэдняя адукацыя падзялялася на тры катэгорыі: для дзяцей ніжэйшага саслоўя (сялян) прызначаліся аднакласныя прыходскія вучылішчы з элементарнай праграмай навучання; для сярэдняга саслоўя – трохкласныя вучылішчы з больш шырокай праграмай пачатковага навучання; для дзяцей дваран і чыноўнікаў уводзіліся сямікласныя гімназіі, заканчэнне якіх давала права для паступлення ва універсітэты. Статут ліквідаваў пераемную сувязь паміж ступенямі. Такім чынам, узровень адукацыі павінен быў адпавядаць сацыяльнаму становішчу вучня. Згодна з новым палажэннем аб навучальных акругах (1835 г.) яны выключаліся з-пад улады універсітэтаў, істотна пашыраліся правы папячыцеляў навучальных акруг.

У поўнай адпаведнасці з палажэннем “Статута” 1828 г. была створана ***Беларуская навучальная акруга*** (1829 г.). Дадатковыя палажэнні Статута 1828 г. так тлумачылі мэту стварэння акругі: “неабходнасць навучання юнакоў у адпаведнасці з асаблівасцямі Беларусі” і прадпісвалі “навучаць роднай мове”. У новую навучальную акругу ўвайшлі Віцебская, Магілёўская, а ў 1831 г. – і Мінская губерні.

Пасля паўстання 1830 – 1831 гг. апекуну Беларускай навучальнай акругі рэкамендавалася найхутчэй перайсці да выкладання ў свецкіх вучылішчах усіх прадметаў на рускай мове ў мэтах збліжэння тутэйшых жыхароў з “прыроднымі рускімі”. У ***маі 1832 г.*** у сувязі з закрыццём Віленскага універсітэта была ліквідавана Віленская навучальная акруга. Навучальныя ўстановы Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці ўвайшлі ў склад Беларускай навучальнай акругі. Цэнтр навучальнай акругі знаходзіўся ў Віцебску, яго папячыцелямі былі вядомы матэматык Р.І. Карташэўскі (1829 – 1835 гг.) і былы дырэктар вучылішчаў Закаўказскай вобласці і Тыфліскага шляхецкага пансіёна Е.А. Грубер (1836 – 1850 гг.).

Замест закрытага Віленскага універсітэта планавалася адкрыць у Оршы вышэйшае вучылішча для дзяцей дваран з далейшым яго пераўтварэннем у вышэйшую навучальную ўстанову. Але ў ходзе паўстання пачатая справа была спынена. Асігнаваныя для гэтага грошы былі пераведзены ў Кіеў на будаўніцтва універсітэта Святога Уладзіміра.

Дзеля абмежавання польскага ўплыву польская мова была выключана з праграм адукацыі. Толькі ў заходніх губернях акругі яна вывучалася як асобны прадмет па скарочанай праграме. У мясцовых школах забаранялася выкладаць выпускнікам Віленскага універсітэта. Падрыхтоўку выкладчыкаў для Беларусі пачала весці настаўніцкая семінарыя, створаная ў 1834 г. у Віцебску.

Важнай падзеяй у галіне асветы на Беларусі было адкрыццё ў ***1840 г. Горы-Горацкай земляробчай школы***, пераўтворанай у 1848 г. ў земляробчы інстытут. На пачатку 60-х гг. усяго на Беларусі налічвалася 567 навучальных установ усіх тыпаў, у тым ліку адно вышэйшае, 12 сярэдніх, 21 духоўнае вучылішча, звыш 400 пачатковых школ.

Адметнай рысай сістэмы асветы ў беларускіх губернях стала пашырэнне ваенна-вучэбных устаноў. Калі ў эпоху Аляксандра І, яны былі прадстаўлены юнкерскімі вучылішчамі ў Бабруйску, Дзінабургу і Магілёве, то пры Мікалаі І дадаткова адкрыліся кадэцкія карпусы ў Полацку (1835 г.) і Брэсце (1842 г.). Расійскім урадам яны разглядаліся як сродак выхавання дваранства ў духу вернасці самадзяржаўю і таму напалову камплектаваліся з дваранства беларускіх губерняў.

**Супраць міфа беларускай савецкай гістарыяграфіі аб “забароне” расійскім урадам назваў “Беларусь” і “Літва”, “беларускія і літоўскія губерні”, беларускай мовы і беларускага друкаванага слова.** У беларускай савецкай гістарыяграфіі, а таксама ў публікацыях апошніх дзесяцігоддзяў шырока выкарыстаны тэзісы аб т. зв. “забароне” Мікалаем І назваў “Беларусь” і “Літва”, “беларускія і літоўскія губерні”, аб забароне беларускай мовы і беларускага друкаванага слова. Ля вытокаў гэтых тэзісаў знаходзіліся складальнікі 2-га тома дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі акадэмік М.М. Нікольскі, навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі АН БССР Д.А. Дудкоў, І.Ф. Лочмель і інш. Яны, перадрукоўваючы ўказ ад 18 ліпеня 1840 г. з “Хронологического указателя указов и правительственных

распоряжений…”, на што зроблена адпаведная спасылка, замянілі яго назву: замест “Об именовании губерний Белорусских и Литовских, каждою отдельно: Витебскою, Могилевскою, Виленскою и Гродненскою” па палітыка-ідэалагічных матывах назвалі гэты дакумент так: “Забарона царом Мікалаем ужываць назвы Беларусь і Літва” (гл.: Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903). Мн.: Выдавецтва АН БССР, 1940. Т. 2. С. 369). Аналагічным чынам зрабілі і складальнікі 4-га тома зборніка дакументаў і матэрыялаў “Белоруссия в эпоху феодализма”, якія далі такі загаловак указу ад 18 ліпеня 1840 г.: “Указ Сената о запрещении употребления терминов “Белоруссия и Литва” (гл.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 131).

Каб высветліць, аб чым ідзе размова ва ўказе ад ***18 ліпеня 1840 г.***, прывядзём яго цалкам.

“1840. 18 июля. Сенатский, по Высочайшему повелению.

Об именовании губерний Белорусских и Литовских, каждою отдельно: Витебскою, Могилевскою, Виленскою и Гродненскою.

Правительствующий Сенат слушали предложение управляющего Министерством Юстиции, что управляющий делами Комитета Министров, по поручению оного, отношением от 26 минувшего июня сообщил ему, что по случаю внесения по высочайшему предписанию проекта указа, в котором упоминались губернии Белорусския и Литовския под сими наименованиями, государь император, зачеркнув название Белорусских и Литовских, изволил приказать переписать указ с поименованием губерний, каждой отдельно, Витебскою, Могилевскою, Виленскою и Гродненскою; при чем последовало собственноручное высочайшее повеление: “Правила сего держаться и впредь, никогда иначе не прописывая как поименно губернии”. О таковом высочайшем повелении он, управляющий Министерством Юстиции, предлагает Правительствующему Сенату. Приказали: (послать куда следует указы)” (гл.: Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 год. Составитель С.Ф. Рубинштейн. Вильна, 1894. С. 495).

***Па-першае***, у гэтым указе не названа Мінская губерня. І гэта невыпадкова. Як відаць з царскіх указаў і ўрадавых распараджэнняў, да ліку беларускіх губерняў адносіліся Магілёўская і Віцебская губерні, а да літоўскіх – Віленская і Гродзенская. Мінская губерня ні да беларускіх, ні да літоўскіх губерняў не адносілася. Так, 11 кастрычніка 1821 г. былі “высочайше” зацверджаны правілы “О взыскании недоимок в губерниях Белорусских, Литовских, Минской, Киевской, Волынской, Подольской и Белостокской области”.

***Па-другое***, у гэтым указе няма ні слова аб забароне ўжываць назвы “Беларусь” і “Літва”. Размова ў ім ідзе толькі аб упарадкаванні дзяржаўнага справаводства, што бачна з далейшых царскіх загадаў і ўрадавых распараджэнняў. Так, 3 снежня 1840 г., праз 4 месяцы пасля т.зв. “забароны”, з’явіўся “именный, объявленный обер-прокурором Святейшего Синода” указ

“О введении Белоруско-Литовской духовной коллегии в один разряд с конторами Синода по предмету определения на службу молодых людей дворянского происхождения или приобревших право на классные чины”. 28 лютага 1856 г. было абнародавана “Высочайше утвержденное положение комитета министров о выдаче безденежных паспартов жителям некоторых Западных и Белорусских губерний для отлучек на заработки”, 19 лютага 1861 г. – “Высочайше утвержденное местное положение об устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях Великороссийских, Новороссийских и Белорусских” і г. д. Можна назваць больш за 10 урадавых распараджэнняў, выдадзеных у 40 – 80-я гады XIX ст., у якіх ужываецца назва “беларускія і літоўскія губерні”.

***Па-трэцяе***, тэрміны “Беларусь” і “Літва”, “беларускія і літоўскія губерні” ўжывалі ў сваіх запісках, справаздачах і іншых дакументах расійскія чыноўнікі. Так, віленскі генерал-губернатар У.І. Назімаў пісаў 14 лютага 1862 г. аб тым, што “вслед за высоч. Манифестом (19 лютага 1861 г. аб адмене прыгоннага права) в пределах Царства Польского, Литовских, Белорусских и некоторых других западных губерниях возникли беспорядки…”.

***Па-чацвёртае***, у тыя гады, калі быццам бы дзейнічаў указ аб забароне тэрмінаў “Беларусь”, “беларускія”, існавала Беларуская навучальная акруга. Яна была створана ў 1829 г. для арганізацыі і кіравання навучальнымі ўстановамі Віцебскай і Магілёўскай губерняў, кіраўніцтва якімі да гэтага часу ажыццяўляла Пецярбургская навучальная акруга. З закрыццём Віленскага універсітэта ўсе падначаленыя яму вучылішчы былі далучаны да Беларускай навучальнай акругі. 20 мая 1850 г. была адноўлена Віленская навучальная акруга. Віцебская і Магілёўская губерні спачатку былі далучаны да Пецярбургскай навучальнай акругі, а 7 кастрычніка 1864 г. – да Віленскай навучальнай акругі.

***Па-пятае***, малавядомым фактам гісторыі з’яўляецца існаванне ў расійскай арміі 7-га гусарскага Беларускага палка імя імператара Аляксандра І. Полк удзельнічаў у руска-турэцкіх войнах 1806 – 1812, 1828 – 1829, 1877 – 1878 гг., Айчыннай вайне 1812 г., Крымскай вайне 1853 – 1856 гг., у падаўленні паўстання 1830 – 1831 гг.

***Па-шостае***, у друкарнях Пецярбурга, Масквы, Мінска, Вільні і іншых гарадоў Расійскай імперыі выдаваліся кніжкі, брашуры, артыкулы з назвамі “Беларусь”, “беларускі”. Паводле няпоўных падлікаў доктара гістарычных навук А.П. Ігнаценкі, з 1841 па 1917 г. было выдадзена каля 190 такіх кніг і брашур. Гэта сведчыць аб тым, што ніякай афіцыйнай забароны тэрмінаў “Беларусь”, “беларускі” не існавала.

***Па-сёмае***, многія навукоўцы і пісьменнікі сцвярджаюць, што пасля забароны тэрмінаў “Беларусь” і “Літва” было ўведзена “невыразнае штучнае найменне” “Паўночна-Заходні край”, “Заходні край”. Але гэта яўная недарэчнасць або свядомая фальсіфікацыя гісторыі. Заходнія губерні, Заходні край, Заходняя паласа Расіі – гэта тэрыторыя Украіны, Беларусі і Літвы

(Кіеўская, Валынская, Падольская, Магілёўская, Віцебская, Мінская, Віленская, Гродзенская губерні і Беластоцкая вобласць). Паўднёва-Заходні край – гэта тэрыторыя Украіны, Паўночна-Заходні край – тэрыторыя тагачаснай Літвы, як яе тады разумелі (сучасная Літва і Заходняя Беларусь). Указ ад 18 снежня 1842 г. "О преобразовании Северо-Западных губерний" сведчыць аб тым, што Паўночна-Заходні край – гэта тэрыторыі Мінскай, Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губерняў. Але 22 снежня 1870 г. быў абвешчаны новы ўказ "Об изъятии Минской губернии из ведения главного управления Северо-Западным краем". Гэта дае падставу лічыць, што Мінская губерня была аднесена да беларускіх губерняў Беларускага краю (разам з Віцебскай і Магілёўскай губернямі).

Можна прывесці шмат іншых дакументаў, у якіх размяжоўваюцца паняцці "Беларускія губерні", "Беларускі край" і "Паўночна-Заходнія губерні", "Паўночна-Заходні край". Напрыклад, 12 чэрвеня 1893 г. з'явілася "Распоряжение, объявленное Правительствующему Сенату министром внутренних дел. Об утверждении формы выкупного акта на участки земли, выкупаемые русскими арендаторами православного исповедания, водворенными на владельческих землях в губерниях Северо-Западных и Белорусских до 19 февраля 1861 г.". З цягам часу тэрмін "Паўночна-Заходні край" пачаў распаўсюджвацца на ўсе 6 беларуска-літоўскіх губерняў. Аднак тэрміны "Беларусь" і "беларускі" ніколі не забараняліся і не выключаліся з дзяржаўнага і афіцыйнага ўжывання, бо яны разам з назвамі "Велікаросія", "велікароскі", "Маларосія", "малароскі", маючы адзіны корань "рос", служылі для самадзяржаўя пацвярджэннем яго тэорыі "о трёх племенах единого русского народа".

***Па-восьмае***, гістарычнай навуцы невядомы царскі ўказ ці ўрадавае распараджэнне аб забароне беларускай мовы і беларускага друкаванага слова. Наадварот, кнігі на беларускай мове выдаваліся ў друкарнях Расійскай імперыі, асабліва ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

## § 5. Крызіс прыгоннага ладу. Эканамічныя рэформы 30 – 50-х гадоў XIX ст.

**Сельская гаспадарка. Сацыяльныя супярэчнасці.** Адной з асаблівасцей развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі было панаванне буйнога дваранскага землеўладання. У сярэдзіне 30-х гг. XIX ст. 3,6 % буйных памешчыкаў валодалі 50 % прыгонных сялян. Дробныя і сярэднія памешчыкі (да 100 душ прыгонных), якія складалі 80 % агульнай колькасці, валодалі ўсяго 15,8 % сялян.

У сваіх маёнтках памешчыкі будавалі прамысловыя прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны: суконныя, вінакурныя, цукраварныя, смалакурныя, жалезаапрацоўчыя. Вельмі важнай галіной прыбытку быў продаж лесу.

Асновай сельскай гаспадаркі з’яўлялася земляробства, ад якога памешчыкі атрымлівалі галоўную частку сваіх даходаў. Яны імкнуліся павялічваць плошчу ворных зямель. З канца XVIII да сярэдзіны XIX ст. плошча ворных зямель павялічылася ў 3–4 разы. Вырошчвалася жыта, авёс, ячмень. Папулярнай культурай стала бульба. У сувязі з пераўтварэннем бульбы з агароднай культуры ў палявую яе пасевы з пачатку XIX ст. да канца 30-х гг. узраслі ў 20–25 разоў. У многіх памешчыцкіх маёнтках пашыралася вытворчасць ільну. Раслі пасевы канапель, цукровых буракоў.

Важнейшым напрамкам спецыялізацыі памешчыцкіх гаспадарак, асабліва на Гродзеншчыне, становіцца танкарунная авечкагадоўля. На мяса-малочнай жывёлагадоўлі ў той час спецыялізаваліся толькі асобныя памешчыкі, якія мелі ў сябе вінакурныя заводы.

Некаторыя памешчыкі ў мэтах павелічэння таварнасці гаспадаркі выпісвалі з Англіі сельскагаспадарчыя машыны, уводзілі шматпольны севазварот, паляпшалі пароды жывёлы. У памешчыцкіх гаспадарках стала шырэй выкарыстоўвацца наёмная праца, галоўным чынам на прамысловых прадпрыемствах, на будаўнічых работах. Прапагандай перадавых метадаў земляробства і жывёлагадоўлі займалася Беларускае вольнае эканамічнае таварыства, што існавала з 1826 па 1841 г. у Віцебску. Развіццю капіталістычных адносін спрыяла і тое, што мясцовае дваранства атрымала доступ да пазык у цэнтральных банках з правам закладу маёнткаў разам з сялянамі. Перад адменай прыгоннага права ў банках было закладзена каля 68 % беларускіх сялян. Так феадальная памешчыцкая ўласнасць пераўтваралася ў капіталістычную ўласнасць банкаў і крэдытных устаноў.

Асноўнай вытворчай базай маёнтка памешчыка з’яўлялася сялянская гаспадарка. Зямельныя надзелы сялян у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях адводзіліся ў падворнае карыстанне; у Віцебскай, за выключэннем інфлянцкіх (латышскіх) паветаў, і Магілёўскай губернях пераважала абшчыннае землекарыстанне. Размеркаванне зямельных надзелаў паміж сялянамі было нераўнамерным. Так, у канцы 50-х гг. сярэдні надзел у Віцебскай губерні складаў 6,5 дзесяціны (дзесяціна – 1,09 га), у Магілёўскай – 7,3 дзесяціны. У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях асноўнай адзінкай зямельнага забеспячэння лічылася валока (каля 21 га сенажаці, ворыўнай і прысядзібнай зямлі). Гэтых надзелаў ледзьве хапала для забеспячэння пражытачнага мінімуму сялянскай сям’і. Дзяржаўныя сяляне таксама пакутавалі ад малазямелля. Сярэднія надзелы на рэвізскую душу складалі ў Гродзенскай губерні ад 1 да 2 дзесяцін, у Віцебскай і Магілёўскай ад 3 да 5. Гаспадарка сялян, як дзяржаўных, так і памешчыцкіх, была вельмі прымітыўнай. Жывёлы не хапала, глеба ўгнойвалася рэдка, ураджаі былі нізкімі. У пошуках выхаду невялікая частка сялян займалася промысламі, гандлем і іншымі пабочнымі заробкамі.

Аднак, нягледзячы на панаванне паншчыннай сістэмы, сялянская гаспадарка паступова звязвалася з рынкам. З пачатку XIX ст. развівалася і

прамысловая дзейнасць сялян. Яны выраблялі на продаж ільняныя і суконныя тканіны, аўчыну, хатнія драўляныя вырабы.

Пашыралася маёмасная дыферэнцыяцыя сярод сялян. З'явіліся заможныя сяляне. Многія з іх арандавалі млыны, займаліся дробным гандлем, карысталіся ў сваіх гаспадарках рознымі механічнымі прыстасаваннямі. У той жа час у беларускай вёсцы расла колькасць беззямельных сялян (бабылёў, кутнікаў і інш.). Сяляне ў масе сваёй усё больш разараліся і не маглі, як раней, несці павіннасці. Паншчына ў большасці маёнткаў Заходняй і Цэнтральнай Беларусі складала 6 чалавека-дзён у тыдзень з сялянскай гаспадаркі.

Адным з яскравых паказчыкаў крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы было нарастанне сялянскага руху. Калі ў першай трэці XIX ст. адбылося 46 буйных сялянскіх хваляванняў, то ў другой трэці, – больш за 90. Асаблівасцю сацыяльных супярэчнасцей у Беларусі з'яўлялася іх пераплятанне з нацыянальна-рэлігійнай варожасцю паміж сялянамі і панамі.

Своеасаблівай формай пратэсту сялян было тое, што некаторыя з іх пакідалі родныя мясціны ў пошуках "вольных зямель". Так, напрыклад, у пачатку 40-х гг. 1200 прыгонных Беліцкага павета Магілёўскай губерні пакінулі свае вёскі і групамі накіраваліся на пасяленне ў Херсонскую, Екацярынаслаўскую губерні і Бесарабію. Для таго каб затрымаць і вярнуць іх на радзіму, была паслана ваенная каманда.

У канцы 40-х гг. сярод сялян Беларусі пашырыліся чуткі, што рыхтуецца адмена прыгоннага права. У сувязі з гэтым сяляне пачалі часцей уцякаць ад памешчыкаў. У 1847 г. каля 10 тыс. сялян Віцебскай губерні групамі па 200 чалавек накіраваліся на будаўніцтва Мікалаеўскай чыгункі, спадзеючыся, што, адпрацаваўшы там 3 гады, яны будуць вызвалены ад прыгоннай залежнасці.

Але найбольш распаўсюджанымі формамі сялянскага руху з'яўлялася адмова ад выканання павіннасцей і падача "іскаў аб вольнасці" на імя цара.

З 40-х гг. XIX ст. працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкай сістэмы на Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, перарастае ў крызіс. У сельскай гаспадарцы ён выявіўся ў рэзкім зніжэнні прыбытковасці памешчыцкай і дзяржаўнай вёскі, у абеззямельванні і збядненні сялянства, у росце сацыяльных канфліктаў.

Барацьба дзяржаўных і памешчыцкіх сялян за паляпшэнне свайго становішча прымусіла расійскі ўрад змяніць сялянскую палітыку ў Беларусі. У гэтых умовах урад праводзіць рэформы, мэтай якіх было захаваць сістэму феадальнага землеўладання, падняць прыбытковасць памешчыцкай і дзяржаўнай вёскі, ураўнаваць гаспадарчы ўзровень сялян. Аўтарам адной з рэформ быў граф ***П.Д. Кісялёў*** – кіраўнік Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, прыхільнік абмежавання прыгоннага права.

**Рэформа дзяржаўнай вёскі.** Рэформа ў сістэме феадальнага землеўладання пачалася з дзяржаўнай вёскі, становішча якой у Расіі і Беларусі было розным. У Расіі інстытут "дзяржаўнага феадалізму" выступаў як сістэма эксплуатацыі, пад якую непасрэдна падпадалі дзяржаўныя сяляне з боку казённага ведамства. Нормы эксплуатацыі дзяржаўных сялян тут

абмяжоўваліся інвентарамі, ніхто не меў права іх перавышаць. У Беларусі ж дзейнічала сістэма часовага ўладання. Дзяржаўныя маёнткі здаваліся ў арэнду мясцовым памешчыкам.

Розным было і прававое становішча дзяржаўных сялян Расіі і Беларусі. У Расіі з паскарэннем тэмпаў развіцця капіталізму значна пашырыліся саслоўныя правы дзяржаўных сялян. Яны былі абвешчаны вольнымі грамадзянамі, маглі мяняць месца жыхарства, пераходзіць у іншыя саслоўі, мяняць накірунак дзейнасці, звяртацца са скаргамі ў судовыя інстанцыі. У Беларусі прававое становішча дзяржаўных сялян нічым не адрознівалася ад становішча памешчыцкіх. Часовы ўладар быў надзелены адміністрацыйнай, судовай і эканамічнай уладай над сялянамі. Але галоўнае адрозненне двух рэгіёнаў было ў сістэме збору феадальнай рэнты: у Расіі дзяржаўныя маёнткі былі на падушным аброку, у Беларусі – на паншчыне.

Першай часткай рэформы дзяржаўнай вёскі стала перабудовы яе апарату кіравання. Агульнае кіраванне было сканцэнтравана ў Дэпартаменце дзяржаўных маёмасцей Міністэрства фінансаў. З ***1 студзеня 1836 г.*** яны перадаваліся новаму Міністэрству дзяржаўных маёмасцей, першым міністрам якога быў прызначаны П.Д. Кісялёў. Замест чатырох’яруснай сістэмы мясцовага кіравання, уведзенай у расійскіх губернях, у Беларусі ўстанаўліваліся тры адміністрацыйныя ярусы: ***губерня – акруга – сельская ўправа***. У выніку рэформы абшчына ў Беларусі была максімальна набліжана да агульнарасійскага ўзору. Было ўпарадкавана кіраванне дзяржаўнымі маёнткамі, уведзены жорсткі адміністрацыйны кантроль за часовымі ўладальнікамі, павышаны статус сельскай абшчыны.

Другой часткай рэформы П.Д. Кісялёва з’яўлялася палітыка “апякунства” над дзяржаўнымі сялянамі. Прадугледжвалася арганізацыя дапамогі сялянам на выпадак неўраджаяў, эпідэмій, падзяжу жывёлы і іншых бедстваў. Акрамя гэтага, ставілася пытанне аб арганізацыі пачатковага навучання дзяцей дзяржаўных сялян, аказання медыцынскай дапамогі, правядзення розных аграномічных мерапрыемстваў, актывізацыі гандлю, развіцця сістэмы страхавання, барацьбы з п’янствам. Аднак недахоп сродкаў, жаданне палепшыць сялянскі побыт цалкам за кошт сялян перашкаджалі ажыццяўленню планаў рэфарматараў.

Трэцяя і галоўная частка рэформы П.Д. Кісялёва – ***люстрацыя дзяржаўных маёмасцей***. Гэта было мерапрыемства, якое ставіла тры мэты: дакладны ўлік дзяржаўных маёмасцей, выраўноўванне гаспадарчага ўзроўню сялян шляхам скасавання малазямелля і рэгламентацыі павіннасцей, павышэнне плацежаздольнасці дзяржаўных сялян. У працэсе люстрацый у Беларусі знішчаюцца фальваркова-паншчынная сістэма і сістэма часовага ўладання. Дзяржаўныя сяляне паскоранымі тэмпамі пераводзяцца на пазямельны аброк. З фальварковых зямель ім былі зроблены прырэзкі да надзелаў. Да канца 1857 г. на аброк пераведзены ўсе дзяржаўныя маёнткі Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

Адмова ад фальваркова-паншчыннай сістэмы і перавод дзяржаўных сялян на аброк з'явіліся галоўнымі вынікамі рэформы, якія вызначылі яе буржуазна-прагрэсіўны характар. Агульная плошча сялянскага надзельнага фонду ў выніку рэформы П.Д. Кісялёва павялічылася на 10,73 %. І хоць гэта мала што змяніла ў забяспечанасці сялян зямлёй (за гады рэформы колькасць рэвізскіх душ узрасла на 38,5 %), але затое было некалькі ўраўнавана становішча сялян, знізіўся цяжар павіннасцей. Асабліва значныя перамены адбыліся ў прававым статусе дзяржаўных сялян. За імі прызнавалася грамадзянская свабода, што выгадна адрознівала іх ад бяспраўных памешчыцкіх сялян. Прынцыповае значэнне мелі правы ўступлення ў шлюб, бацькоўскія і апякунскія правы, правы атрымання спадчыны і ўласнасці, правы на занятак гандлем і промысламі.

**Інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы.** З 1840 г. П.Д. Кісялёў пачаў займацца падрыхтоўкай інвентарнай рэформы з мэтай падцягнуць узровень памешчыцкай вёскі да дзяржаўнай. Памешчыкі рашуча сталі на абарону сваёй уласнасці. З-за супраціўлення памешчыкаў інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы была значна менш радыкальнай. Яна ўніфікавала памер павіннасцей сялян шляхам увядзення ў памешчыцкіх маёнтках абавязковых інвентароў па адзіных правілах. Па сутнасці, ў становішчы сялян мала што змянілася, значнага скарачэння павіннасцей не адбылося. У адрозненне ад дзяржаўнай вёскі, пераведзенай на аброк, у памешчыцкай засталіся многія ранейшыя павіннасці: паншчына (штодзённая), згоны, шарваркі, жаночая праца, старажоўства, даніна. Агульны памер павіннасцей складаў 1/3 частку валавога даходу з надзелу.

Інвентарная рэформа не вырашыла найважнейшага пытання – аб сялянскім землекарыстанні. Сцвярджалася толькі, што сялянскія надзелы не павінны змяншацца, але гэта з самага пачатку не было замацавана заканадаўствам. Толькі ***14 мая 1855 г.*** Аляксандр II зацвердзіў перагледжаныя ў інвентарных камітэтах правілы для маёнткаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў, у якіх вызначаўся мінімальны сялянскі надзел у 4,75 дзесяціны на рэвізскую душу, а паншчына – 3 дні ў тыдзень.

У цэлым рэформы 1830 – 1850-х гг. мелі дваранскую скіраванасць. Прынцыпы рэфармавання дзяржаўнай вёскі былі прызнаны памешчыкамі занадта радыкальнымі. Сацыяльна-прававое становішча памешчыцкіх сялян змянілася мала. Феадальная ўласнасць засталася некранутай.

**Прамысловасць.** Да сярэдзіны XIX ст. прамысловая вытворчасць у Беларусі знаходзілася пераважна на ***дробнатаварнай*** і ***мануфактурнай*** ступенях развіцця. Асноўнымі прадпрыемствамі гэтага часу былі прыгонныя мануфактуры, гаспадарамі якіх з'яўляліся памешчыкі. Яны прымушалі працаваць на мануфактурах сваіх сялян. Пераважнае выкарыстанне працы прыгонных на прамысловых прадпрыемствах Беларусі ўяўляла сабой важную асаблівасць яе эканамічнага развіцця.

Акрамя таго, у гарадах і мястэчках мелася шмат розных дробных прадпрыемстваў і майстэрань з 1–3 рабочымі, гаспадарамі якіх былі купцы і

мяшчане. Сярод прадпрыемстваў, якімі яны валодалі, былі скураныя, медныя, цагельныя, капялюшныя. Вырабы гэтых прадпрыемстваў збываліся ў асноўным на мясцовых рынках.

Былі ў Беларусі і прадпрыемствы, заснаваныя на вольнай працы. Большасць "вольнанаёмных" складалі прыгонныя, якіх паны на кароткі тэрмін адпускалі на заробкі. Па сканчэнні гэтага тэрміну яны пакідалі прадпрыемства. Часовыя рабочыя-прыгонныя не маглі задаволіць прамысловасць, якой былі патрэбны кваліфікаваныя майстры і працоўныя. Прыгоннае права ставіла сур'ёзныя перашкоды для развіцця капіталістычнай прамысловасці.

Новай з'явай у прамысловым развіцці Беларусі было выкарыстанне на асобных прадпрыемствах машын і паравых рухавікоў. Аднак колькасць прадпрыемстваў, якія мелі машынную тэхніку, была нязначнай. Уладальнікамі большасці такіх прадпрыемстваў спачатку былі памешчыкі, хаця ўжо з 30-х гг. больш за палову іх належала купцам і мяшчанам.

Па колькасці занятых у прамысловасці рабочых сярод беларускіх губерняў першае месца займала Гродзенская губерня. У канцы 50-х гг. на яе прадпрыемствах працавала 5 112 рабочых з 9 714. Другое месца са значным адставанем належала Магілёўскай губерні, дзе ў гэты час на прадпрыемствах было занята 1 882 рабочыя. На апошнім месцы знаходзілася Мінская губерня, на прадпрыемствах якой працавала ўсяго 815 рабочых.

У Беларусі найбольш распаўсюджанымі былі прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны – вінакурныя, суконныя, палатняныя, цукровыя, мукамольныя. Вядучай галіной прамысловасці Беларусі ў першай палове XIX ст. заставалася суконная. Каб заахвоціць да стварэння новых суконных мануфактур, прадпрымальнікам даваліся дзяржаўныя пазыкі. Ужо ў 1861 – 1863 гг. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 64 суконныя прадпрыемствы, на якіх працавала звыш 51 тыс. рабочых. Суконная прамысловасць была ў асноўным сканцэнтравана ў Гродзенскай губерні (55 прадпрыемстваў).

Другое месца займала вытворчасць шарсцяных вырабаў. У 1857 г. налічвалася сем прадпрыемстваў гэтай галіны, на якіх працавала 1 444 рабочых. Усе яны знаходзіліся ў Гродзенскай губерні. Сярод прадпрыемстваў Беларусі значная доля належала папяровым, шкляным, чыгунным, медзеплавільным, жалезаапрацоўчым, цагельным і інш. Жалезаробчыя прадпрыемствы працавалі на мясцовай сыравіне. Жалеза здабывалі з балотнай руды. Шкляная прамысловасць была найбольш развітой у Магілёўскай губерні, дзе знаходзілася 8 з 14 заводаў.

Фабрыкі ў Беларусі пачалі ўзнікаць з 20-х гг. XIX ст. Першымі былі пабудаваны суконныя фабрыкі ў мястэчках Хомску Кобрынскага і Косаве Слонімскага паветаў. На металаапрацоўчым прадпрыемстве Бенкендорфа ў маёнтку Старынцы Чэрыкаўскага ўезда працавала каля 900 рабочых. Ствараліся ў Беларусі цукровыя прадпрыемствы. У 1857 г. было 13 цукровых заводаў, якія мелі паравыя рухавікі і штогод выраблялі 12,5 тыс. пудоў цукру. На іх

працавала 1 164 вольнанаёмныя рабочыя. Цукар, які вырабляўся на прадпрыемствах Беларусі, прадаваўся не толькі на мясцовых рынках, але вывозіўся і ў Маскву. Аднак “цукровая гарачка” працягвалася нядоўга. Цукровыя заводы Беларусі не вытрымалі канкурэнтнай барацьбы з больш буйнымі прадпрыемствамі Расіі, Украіны і Польшчы і ў сярэдзіне 60-х гг. спынілі сваё існаванне.

Нягледзячы на істотныя зрухі ў развіцці прамысловасці Беларусі першай паловы XIX ст., яе памеры ў параўнанні з агульнарасійскай былі нязначнымі, а тэмпы развіцця – надзвычай маруднымі. Пры гэтым дробнатаварная і мануфактурная вытворчасць у Беларусі з пачатку 30-х гг. перажывала крызіс, які быў звязаны з паглыбленнем крызісу ўсёй прыгонніцкай сістэмы. Прамысловасць адчувала востры недахоп у працоўнай сіле і асабліва ў людзях, якія валодалі тэхнічнымі ведамі.

**Гарады.** У першай палове XIX ст. у Беларусі назіраўся рост гарадскога насельніцтва. Колькасць насельніцтва беларускіх гарадоў расла як за кошт натуральнага прыросту, так і ў выніку прымусовага перасялення яўрэяў з сельскай мясцовасці, якія неўзабаве склалі пераважную колькасць гарадскога насельніцтва і якія засяродзілі ў сваіх руках рамяство і гандаль. 70 – 90 % гарадскога насельніцтва складала мяшчанства (рамеснікі, дробныя гандляры), 6 – 7 % – дваранства і духавенства, 2 – 2,5 % – купецтва. У сярэдзіне XIX ст. у Беларусі налічвалася 40 гарадоў і больш за 300 мястэчак. Найбольш буйнымі гарадамі былі Віцебск, Мінск, Магілёў, Гродна. Аднак у першай палове XIX ст. гарады яшчэ не сталі цэнтрамі прамысловасці, у іх працягвалі развівацца гандаль і рамяство.

**Гандаль. Шляхі зносін.** Развіццё прамысловасці, рост гарадскога насельніцтва стымулявалі пашырэнне ўнутранага рынку. Гандаль Беларусі развіваўся пераважна ў форме ***кірмашоў***, часта з вялікім гандлёвым абаротам. Усяго ў Беларусі штогод праходзіла каля 200 кірмашоў. На самым буйным з іх – ***Зэльвенскім*** (Гродзенская губерня) – гадавы абарот перавышаў 1 млн. руб. Сярод буйных кірмашоў былі Любавіцкі ў Магілёўскай губерні і Мінскі. Сюды прывозілі сельскагаспадарчыя і прамысловыя тавары не толькі з Беларусі, але і з Маскоўскай, Уладзімірскай, Ніжагародскай губерняў, Украіны, Польшчы, Прусіі і іншых месцаў.

Важнае значэнне ў Беларусі набыў вывазны гандаль. Прадметамі экспарту былі збожжа, лён, пянька, каноплі, лес, спірт, смала, паташ і г. д. У Беларусь завозілі шэрсць, металічныя вырабы, галантарэю, прадметы раскошы: фарфоравы і фаянсавы посуд, крышталь, люстэркі і г. д. Назіралася паступовае змяненне асартыменту прывезеных тавараў. Напрыклад, на Стаўпянскую прыстань у 1827 г. прывозілі пераважна прадметы раскошы: фарфоравы і фаянсавы посуд, крышталь, люстэркі, дарагое віно, а ў 1850-я гг. выгружалі пераважна чыгунныя вырабы, свінец, волава, паперу.

У развіцці гандлю важную ролю адыгралі суднаходныя рэкі – Бярэзіна, Прыпяць, Днепр, Заходняя Дзвіна, Нёман, якія праз каналы звязвалі Беларусь з

балтыйскімі і чарнаморскімі портамі. У 1804 – 1805 гг. скончылася будаўніцтва Агінскага і Бярэзінскага каналаў. Яны звязалі Днепр з Заходняй Дзвіной, Нёманам і Віслай. На беларускіх рэках і каналах знаходзілася каля 85 прыстаней. Праз Рыгу, Гданьск, Кёнігсберг адпраўлялі буйныя баржы з таварамі з Беларусі за мяжу.

Развіццю гандлю спрыяла таксама паляпшэнне сродкаў сувязі і будаўніцтва сухапутных дарог. На працягу першай паловы XIX ст. былі пашыраны ўжо існуючыя і пабудаваны новыя грунтовыя шасэйныя дарогі, якія злучалі Маскву і Пецярбург з заходнімі і паўднёвымі рэгіёнамі імперыі. Некаторыя з іх пралягалі праз Беларусь. Гэта Пецярбургска-Кіеўская, Маскоўска-Рыжская. Была пабудавана Маскоўска-Варшаўская шаша, якая прайшла праз 3 беларускія губерні: Магілёўскую, Мінскую, Гродзенскую. Агульная працягласць шасэйных дарог у 1860 г. у Беларусі дасягнула 1 100 км.

Развіццё гандлю было цесна звязана са станам прамысловасці, сельскай гаспадаркі, плацежаздольнасцю насельніцтва. Феадальна-прыгонніцкая сістэма стрымлівала развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі, абмяжоўвала пашырэнне ўнутранага рынку. Знішчэнне прыгонніцкіх адносін з’яўлялася неабходнай перадумовай далейшага эканамічнага развіцця Беларусі.

## ГЛАВА 2. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

### § 1. Асаблівасці культурнага развіцця Беларусі. Адукацыя і навука. Беларусазнаўства – частка славістыкі

Перыяд з канца XVIII па 10-я гг. XIX ст. адносіцца да эпохі Асветніцтва ў Беларусі. Ідэйнай асновай дадзенай эпохі сталі працы філосафаў-асветнікаў, якія заклікалі да пераўтварэння грамадскага ладу на рацыянальных, гэта значыць разумных, пачатках. Яны лічылі, што прычына ўсіх пакут народа – невуцтва, таму дасягнуць “Царства розуму” на Зямлі магчыма толькі шляхам развіцця навукі і шырокай асветы народных мас. Менавіта адсюль і ўтварылася сама назва эпохі.

У эпоху Асветніцтва ў Беларусі набыў распаўсюджанне своеасаблівы мастацкі стыль – ***класіцызм*** (ад лац. *classicus* – узорны). Рацыяналізму асветніцкай філасофіі найбольш адпавядала антычная спадчына. Яна разглядалася ў рамках класіцызму як ідэальны ўзор. Творчая перапрацоўка набыткаў антычнага мастацтва прывяла да ўзнікнення непаўторных помнікаў літаратуры, выяўленчага мастацтва, архітэктуры.

Прыкладна з 10-х гг. XIX ст. у культуры Беларусі ўзнікаюць парасткі новага ідэйнага і мастацкага напрамку – ***рамантызму***. У Заходняй Еўропе рамантызм узнік раней. Ён адлюстраваў расчараванне тымі вынікамі, якімі скончылася французская буржуазная рэвалюцыя канца XVIII ст. Пераўтварэнне грамадства шляхам, прапанаваным філосафамі, не прывяло да стварэння “Царства розуму” на Зямлі.

У процівагу асветніцкаму рацыяналізму светапогляд эпохі рамантызму прасякнуты сцвярджэннем перавагі духоўнага пачатку над розумам. Рамантызм не з'яўляўся акрэсленым мастацкім стылем, але ў некаторых сферах мастацкай культуры ён выступаў як альтэрнатыва класіцызму (у літаратуры, жывапісе). Расчараваныя ў рэчаіснасці, рамантыкі звярнуліся да гістарычнага мінулага. Гэта выклікала шырокае распаўсюджанне ў выяўленчым мастацтве і літаратуры гістарычнага жанру. Рамантызм прыўнёс у мастацтва ідэі народнасці, каштоўнасці нацыянальных традыцый і быту.

**Адукацыя.** З пункту гледжання асветнікаў стварыць ідэальнае грамадства можна перш за ўсё з дапамогай правільнага выхавання і адукацыі. Пад уплывам асветніцкіх ідэй адукацыя паступова пазбаўлялася царкоўнага ўплыву, пераходзіла ў падпарадкаванне да дзяржавы і набывала свецкі характар. Гэта абумовіла правядзенне ў апошняй трэці XVIII – пачатку XIX ст. шэрагу рэформ у галіне адукацыі Расійскай імперыі.Да гэтага часу ў Беларусі склалася даволі заблытаная сетка навучальных устаноў, пазбаўленых адзінага кіраўніцтва і не звязаных паміж сабой.

У ***1802 г.*** было ўтворана ***Міністэрства народнай асветы***. Еўрапейская частка Расіі дзялілася на 6 навучальных акруг, кожную з якіх узначальваў папячыцель. Віцебская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская губерні ўвайшлі ў склад ***Віленскай навучальнай акругі***, якую ўзначаліў магнат Адам Чартарыйскі. Навуковым і адміністрацыйным цэнтрам акругі быў Віленскі універсітэт, створаны ў 1803 г. на базе рэарганізаванай Галоўнай Віленскай школы. Ва універсітэце меліся 4 факультэты: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычны, медыцынскі, літаратурны і вольных мастацтваў. Ва універсітэце працавалі такія вядомыя вучоныя як І. Страйноўскі, Я. Снядэцкі, І. Даніловіч, М. Баброўскі, І. Лялевель і інш. Пры універсітэце дзейнічалі медыцынскі, ветэрынарны, аграрнамічны інстытуты, астранамічная абсерваторыя, адзін з самых багатых у Еўропе батанічных садоў, першы ў Расіі заалагічны музей, тры клінікі, аптэка, бібліятэка. З'яўляючыся цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, універсітэт распрацоўваў праграмы і падручнікі для падначаленых школ. Адукацыя, атрыманая ў Віленскім універсітэце, не саступала адукацыі ў лепшых заходнееўрапейскіх інстытутах. У ***1832 г.*** універсітэт быў закрыты за ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у паўстанні 1830 – 1831 гг.

Паводле Статута 1804 г., які складзены ў адпаведнасці з французскай асветніцкай філасофіяй XVIII ст., школьная сістэма будавалася па прынцыпе адзінства і пераемнасці: кожная школьная ступень была звязана з папярэдняй і наступнай, пераход у школу ажыццяўляўся без экзамена, на падставе дакумента аб заканчэнні папярэдняй школы. Навучанне аб'яўлялася бясплатным. Сістэма адукацыі ўключала ў сябе прыходскія вучылішчы з гадавым тэрмінам навучання (пачатковая школа), двухгадовыя павятовыя вучылішчы, чатырохгадовыя гімназіі і універсітэты. Станоўчымі вынікамі рэформы на Беларусі з'явіліся рост свецкіх агульнаадукацыйных школ і колькасці

навучэнцаў, увядзенне ў навучальныя планы прыродазнаўчых дысцыплін, развіццё жаночай адукацыі.

У 1828 г. быў выдадзены новы статут навучальных устаноў. Замест адзінай сістэмы пераемна звязаных паміж сабой тыпаў школ, створанай паводле Статута 1804 г., уводзіліся дзве сістэмы, сфарміраваныя па саслоўным прынцыпе: адна з іх павінна была даваць элементарную адукацыю для ніжэйшых саслоўяў (прыходскае вучылішча з 1 – 2 гадамі навучання, затым трохгадовае павятовае вучылішча), другая – сярэдняй і вышэйшай адукацыі – пераважна для дваран (дамашняе навучанне, сямігадовая гімназія, універсітэт).

Важную ролю ў сістэме школьнай адукацыі працягвалі адыгрываць ***каталіцкія навучальныя ўстановы***, якія належалі розным каталіцкім ордэнам. Значная частка гэтых навучальных устаноў падпарадкоўвалася ордэну езуітаў. У 1818 – 1820 гг. дзейнічала ***Полацкая езуіцкая акадэмія***, якая мела правы вышэйшай навучальнай установы і была цэнтрам асобай езуіцкай навучальнай акругі. Каталіцкія навучальныя ўстановы імкнуліся выхаваць у навучэнцаў прапольскі настрой. Мовай навучання была польская. Прапольскай арыентацыі прытрымлівалася і кіраўніцтва Віленскага універсітэта. Усё гэта спрыяла паланізацыі пераважнай часткі адукаванага насельніцтва Беларусі.

Расійскі ўрад добра разумеў небяспечнасць такой сітуацыі ў галіне адукацыі, асабліва пасля паўстання 1830 – 1831 гг. У шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэнне рускага ўплыву ў краі, было закрыццё ў 1832 г. Віленскага універсітэта і часовая ліквідацыя Віленскай навучальнай акругі (да 1850 г.). У школах у абавязковым парадку ўводзілася навучанне на рускай мове. Аб'яднанне уніяцкай царквы з праваслаўнай паскорыла закрыццё каталіцкіх манастыроў і іх навучальных устаноў.

Адбывалася зараджэнне прафесіянальнай адукацыі ў Беларусі. У 1840 г. пачала дзейнічаць Горы-Горацкая земляробчая школа. У 1848 г. на яе базе адкрыўся ***Горы-Горацкі земляробчы інстытут*** – першая ў Расіі і адна з першых у Еўропе вышэйшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў. Горы-Горацкі земляробчы інстытут узнік у 1848 г. у выніку рэарганізацыі Горы-Горацкай земляробчай школы, што пераўтварыла яе ў вышэйшую сельскагаспадарчую навучальную ўстанову. Тэрмін навучання ў інстытуце працягваўся чатыры гады. Тут выкладаліся агульнаадукацыйныя і спецыяльныя сельскагаспадарчыя дысцыпліны. Пры інстытуце дзейнічаў завод па вырабе цэглы і дрэнажных труб, майстэрня сельскагаспадарчых машын, сыраварня, вучэбны пчальнік, музеі, батанічны сад, бібліятэка. Студэнты і выкладчыкі займаліся навукова-даследчай дзейнасцю, удзельнічалі ў сельскагаспадарчых з'ездах і выставах. За ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у паўстанні 1863 – 1864 гг. інстытут быў пераведзены ў Пецярбург. Вышэйшая сельскагаспадарчая навучальная ўстанова аднавіла сваю дзейнасць у Горках толькі ў 1919 г. Зараз тут дзейнічае Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.

**Беларусазнаўства**. Першая палова XIX ст. – час узнікнення навуковага беларусазнаўства. Вывучэнне Беларусі ажыццяўлялі Расійская акадэмія навук,

Рускае геаграфічнае таварыства, Віленскі універсітэт, Маскоўскае таварыства аматараў старажытнасцей расійскіх, створаныя па ініцыятыве Я. Тышкевіча Віленскі музей старажытнасцей і Віленская археалагічная камісія.

Гісторыю, этнаграфію, фальклор беларусаў яшчэ ў 1780 г. пачала вывучаць экспедыцыя рускага акадэміка І.І. Ляпёхіна. Гэта было знаёмства рускіх вучоных з Беларуссю пасля далучэння яе да Расійскай імперыі. Праца рускага вучонага К.Ф. Калайдовіча "Пра беларускую гаворку" (1822) уяўляла сабой першую спробу навуковага даследавання мовы беларусаў.

Вялікі інтарэс да Беларусі праявілі польскія вучоныя. Лінгвіст С. Ліндэ і гісторык Т. Чацкі першымі загаварылі пра самабытнасць беларускай мовы і неабходнасць яе вывучэння.

У першай палове XIX ст. убачылі свет шматлікія дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: "Беларускі архіў" І.І. Грыгаровіча, "Летапісец Літвы і руская хроніка" І. Даніловіча, "Акты Заходняй Расіі", "Кнігі пасольскія Метрыкі Вялікага княства Літоўскага" і інш. Выдадзены "Помнікі гісторыі Літвы" Т. Нарбута, выйшлі ў рускім друку Статуты Вялікага княства Літоўскага.

Значны ўклад у развіццё беларусазнаўства ўнеслі ўраджэнцы Беларусі: гісторыкі Іван Грыгаровіч, Ігнат Даніловіч, аўтар дзевяцітомнай "Гісторыі літоўскага народа" Тэадор Нарбут, Міхаіл Без-Карніловіч, які ў 1855 г. выдаў у Пецярбургу "Гістарычныя звесткі аб знамянальных мясцінах у Беларусі", лінгвісты Іван Насовіч і Станіслаў Мікуцкі. Пісьменнік-этнограф Павел Шпілеўскі з'яўляўся аўтарам навукова-пазнавальных твораў "Падарожжа па Палессі і беларускім краі" і "Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках". На карысць беларускай гісторыі, археалогіі, этнаграфіі і краязнаўства працавалі браты Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы, вучоны і грамадскі дзеяч Адам Кіркор, публіцыст і адзін з першых даследчыкаў беларускай літаратуры Рамуальд Падбярэзскі.

## § 2. Літаратура. Музычна-тэатральная культура. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура

**Літаратура.** Беларуская літаратура першай паловы XIX ст. адлюстравала перапляценне ідэй Асветніцтва і рамантызму, хаця вызначальнымі былі рамантычныя прынцыпы. Менавіта рамантычны светапогляд з яго ўвагай да нацыянальнай культуры спрыяў развіццю фалькларыстыкі, выкарыстанню ў мастацкай творчасці народных песень, казак, паданняў, што і прывяло да ўзнікнення першых твораў на беларускай мове.

Праблемы народнасці, нацыянальнай самабытнасці ставіліся лепшымі літаратурнымі творамі таго часу, у прыватнасці ананімнымі паэмамі "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе". У першым творы ў сатырычным выглядзе паказаны прыгонніцкі лад, упершыню загучала жывая гутарковая беларуская мова, у другім – адлюстравана жыццё беларускай вёскі: антычныя героі і багі

паводзілі сябе, апраналіся, весяліліся і бедавалі, як беларускія сяляне і збяднелыя шляхціцы.

Варта адзначыць, што частка ўраджэнцаў Беларусі працавала на карысць польскай культуры. Найбольш вядомай постаццю сярод іх з'яўляецца ***Адам Міцкевіч.*** Свае творы ён пісаў на польскай мове, выкарыстоўваючы сюжэты беларускай гісторыі і фальклору. Як прадстаўнік рамантызму ў польскай літаратуры Адам Міцкевіч паўплываў на творчую дзейнасць пачынальнікаў беларускай літаратуры.

У першай палове XIX ст. з асяроддзя апалячанай беларускай шляхты з'яўляюцца паэты і празаікі, якія ствараюць беларускамоўныя творы. Так, паэт і фальклярыст ***Ян Чачот*** выдаў 6 фальклорных зборнікаў, дзе змясціў беларускія песні ў польскім перакладзе і арыгінале. На іх узор ён і сам пісаў вершы на беларускай мове, у якіх заклікаў гуманна адносіцца да прыгонных сялян. ***Ян Баршчэўскі*** амаль усё сваё жыццё прысвяціў збіранню народнай творчасці. Ён стварыў некалькі вершаў на беларускай мове і паэму "Рабункі мужыкоў". У сваім галоўным творы "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях", напісаным на польскай мове, аўтар літаратурна перапрацаваў фальклорны матэрыял. Сюжэты і вобразы беларускага фальклору шырока выкарыстоўваў ***Уладзіслаў Сыракомля***. Большасць яго твораў напісана на польскай мове, аднак захаваліся і некаторыя беларускамоўныя вершы паэта. Менавіта Сыракомля падтрымаў імкненне Дуніна-Марцінкевіча пісаць па-беларуску.

Паэт і драматург ***Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*** ажыццявіў пераход ад польскай літаратурнай традыцыі да ўласна беларускай. Пры стварэнні беларускамоўных твораў перад аўтарам паўставала пытанне, для каго ён піша па-беларуску. Ва ўмовах, калі шляхта грэбавала "мужыцкай" мовай, а асноўная маса насельніцтва была непісьменнай, ён мог разлічваць толькі на невялікую групу патрыятычна настроеных інтэлігентаў. Аднак паэт усё ж стаў на шлях выкарыстання беларускага слова як мастацкага сродку.Вершаваныя аповесці "Вечарніцы", "Гапон", "Купала", "Шчароўскія дажынкі", "Халімон на каранацыі" і іншыя склалі сапраўдны вершаваны эпас. У іх пісьменнік паказаў духоўную прыгажосць і высакароднасць беларускага селяніна, яго побыт, лад жыцця і думкі, а таксама гістарычнае мінулае свайго краю. Дунін-Марцінкевіч з'яўляецца аўтарам славутых драматычных твораў: камедыі "Пінская шляхта" і "Залёты".

**Музыка і тэатр.**У музычна-тэатральнай культуры канца XVIII – першай паловы XIX ст. вылучаецца сваёй адметнасцю прыгонны прафесійны тэатр магнатаў, у якім адпаведна тагачасным дваранскім густам вялікае месца адводзілася спектаклям. Гэты тэатр меў змешаныя оперна-драматычныя трупы, у якіх адны і тыя ж акцёры выконвалі ролі ў оперы, драме, камедыі. Оперы ставілі ў Нясвіжскім і Слуцкім тэатрах Радзівілаў, Ружанскім і Дзярэчынскім (Зэльвенскі р-н) тэатрах Сапегаў і інш.

Значную частку рэпертуару Гродзенскага, Слонімскага і Шклоўскага тэатраў складалі балеты. Пры некаторых магнацкіх тэатрах існавалі балетныя школы. Высокае прафесійнае майстэрства беларускіх артыстаў балета пацвярджаецца тым, што яны папаўнялі трупы варшаўскіх і пецярбургскіх тэатраў. У 1785 г. гродзенская трупа стала асновай польскага “Таварыства танцораў Яго Каралеўскай Вялікасці”, а 14 прыгонных танцораў Шклоўскага тэатра графа С.Зорыча ўвайшлі ў склад пецярбургскіх тэатраў.

Прыватныя магнацкія тэатры дзейнічалі таксама і ў іншых гарадах і мястэчках Беларусі: В. Тышкевіча – у Свіслачы і Плешчаніцах, Л. Ракіцкага – у Гарадзішчы пад Мінскам, А. Буйніцкага – у Забор’і, А. Галіцына – у Віцебску, З. Чарнышова – у Магілёве. Пры многіх магнацкіх тэатрах, у панскіх сядзібах існавалі аркестры, харавыя капэлы і іншыя музычныя калектывы. Напрыклад, маёнтак Гарадзец у Магілёўскай губерні, які належаў рускаму арыстакрату, кампазітару-аматару У.Р. Кастрыёту-Скандэрбеку, сябру М.І. Глінкі і А.С. Даргамыжскага, славіўся адным з лепшых у Расіі прыгонным квартэтам.

Разам з прафесійным тэатрам развіваўся аматарскі, які быў папулярны ў шляхецкім, чыноўніцкім і афіцэрскім асяроддзі. На аматарскай сцэне рабіў першыя крокі беларускі нацыянальны тэатр. Ля яго вытокаў стаялі ***В. Дунін-Марцінкевіч*** і тыя мінскія акцёры і музыканты-аматары, якія гуртаваліся вакол гэтага выдатнага драматурга, рэжысёра і акцёра. 23 верасня 1841 г. адбылася прэм’ера аматарскага спектакля – камічнай оперы “Рэкруцкі яўрэйскі набор”, музыку для якой напісалі С. Манюшка і К. Кжыжаноўскі, а лібрэта – В. Дунін-Марцінкевіч. 9 лютага 1852 г. мінскія аматары паставілі “Ідылію” Дуніна-Марцінкевіча на музыку С. Манюшкі і К. Кжыжаноўскага.

Глыбокі след у беларускай музычнай культуры пакінуў класік польскай музыкі, ураджэнец Ігуменскага (цяпер Чэрвеньскі р-н) павета Мінскай губерні ***Станіслаў Манюшка***. У Мінску ў таленавітага музыканта і выкладчыка Д. Стэфановіча ён атрымаў пачатковую музычную адукацыю. З Мінскам звязана стварэнне і пастаноўка яго першых вадэвіляў, музычных камедый і камічных опер. Творчая дружба С. Манюшкі з В. Дуніным-Марцінкевічам прынесла вялікі плён: на лібрэта апошняга былі напісаны оперы “Спаборніцтва музыкантаў”, “Чарадзейная вада”, “Сялянка”, пастаўленыя ў Мінску і іншых беларускіх гарадах. Беларускія народныя песні і мелодыі арганічна ўвайшлі ў творы С. Манюшкі.

Сярод вядомых дзеячаў музычнай культуры, якія працавалі на Беларусі, ***Міхал Клеафас Агінскі***, аўтар славутага паланеза “Развітанне з Радзімай”; ***Фларыян Міладоўскі***, аўтар пастаўленай у Мінску аперэты “Канкурэнты”; ***Міхаіл Ельскі***, мінскі скрыпач і кампазітар; ***І. Глінскі***, гродзенскі спявак і кампазітар; ***Тэафіля Юзафовіч***, скрыпачка; дзеці Дуніна-Марцінкевіча Каміла і Міраслаў, бліскучыя піяністы; ***Міхаіл Гузікаў***, ксілафаніст з еўрапейскім імем; браты ***Дамінік і Вікенцій Стэфановічы***, дырыжоры мінскага духавога аркестра, кіраўнікі фартэпіянных класаў і інш.

**Выяўленчае мастацтва.** У выяўленчым мастацтве Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. наглядалася ўзаемадзеянне дзвюх плыняў – класіцызму і рамантызму. Класіцызм быў афіцыйным стылем, якога прытрымлівалася Пецярбургская акадэмія мастацтваў. Аднак у выяўленчае мастацтва пранікаюць і элементы рамантызму.

Перапляценне рысаў класіцызму і рамантызму наглядаецца ў творчасці беларускага мастака ***Іосіфа Аляшкевіча***. Мастак жыў у Пецярбургу, аднак часта прыязджаў у Беларусь. Тут ён стварыў шэраг партрэтаў. Некаторыя з іх выкананы ў стылі класіцызму (партрэт А. Чартарыйскага). Асобныя творы І. Аляшкевіча адлюстравалі рамантычныя павевы.

***Валенцій Ваньковіч*** увайшоў у гісторыю беларускага жывапісу як прадстаўнік рамантызму. Майстэрня Ваньковіча ў Мінску была цэнтрам, вакол якога групаваліся лепшыя мастацкія сілы горада. Яе часта наведвалі мастакі Я. Дамель, М. Кулеша. Сярод знаёмых і сяброў В. Ваньковіча было шмат дзеячаў літаратуры і мастацтва Беларусі, Літвы, Польшчы, у тым ліку і Адам Міцкевіч. Мастак стварыў шэраг іх партрэтаў у стылі рамантызму. Палатно В. Ваньковіча “Міцкевіч на скале Аюдаг” з’яўляецца тыповым прыкладам рамантычнага партрэта.

Таленавіты мастак, этнограф і кампазітар ***Н. Орда*** абышоў і аб’ездзіў амаль усю Беларусь, Польшчу і Літву, зрабіў каля 500 акварэляў і малюнкаў з натуры, захаваўшы такім чынам для нашчадкаў аблічча цудоўных помнікаў архітэктуры, замкаў, палацаў, вуліц гарадоў, гістарычных мясцін. Яго акварэлі і малюнкі пераводзіліся ў літаграфіі, выдаваліся альбомамі, графічнымі серыямі. Вялікае грамадскае прызнанне атрымалі карціны Н. Орды “Лагойск”, “Крыжоўка”, “Руіны замка ў Лідзе”, “Мір”, “Нясвіж”, “Белая вежа” і інш.

Мастак ***Ян Дамель*** пакінуў значны след амаль ва ўсіх жанрах выяўленчага мастацтва. Найбольш вядомы ён як майстар гістарычнага жанру. Ян Дамель добра ведаў айчынную і антычную гісторыю, валодаў некалькімі замежнымі мовамі. У сваіх палотнах ён імкнуўся адлюстраваць найбольш яркія, кульмінацыйныя моманты гістарычнага развіцця краю. Мастак стварыў такія карціны, як “Смерць князя Панятоўскага”, “Смерць Глінскага ў няволі”, “Вызваленне Т. Касцюшкі з цямніцы”, “Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.” і інш. Акрамя гістарычных палотнаў, Я. Дамель напісаў шэраг партрэтаў і пейзажаў.

***Вікенцій Дмахоўскі*** вядомы як стваральнік рамантычных пейзажаў. Мастак у асноўным маляваў месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю А. Міцкевіча, сябрам якога ён быў (“Возера Свіцязь”, “Дом Міцкевіча ў Навагрудку”, “Заход сонца” і інш.). У пейзажах В. Дмахоўскага няма акадэмічнай умоўнасці і скаванасці, яны простыя і звычайныя, але разам з тым паэтычныя і хвалюючыя.

***Іван Хруцкі*** ўвайшоў у гісторыю мастацтва як заснавальнік рэалістычнага нацюрморта. І.Ф. Хруцкі нарадзіўся ў сям’і уніяцкага святара ў мястэчку Ула Лепельскага павету Віцебскай губерні. Адукацыю мастак атрымаў у

Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Творы мастака прасякнуты паэтычным адчуваннем быту, вызначаюцца дакладнасцю ў перадачы натуры. У 1839 г. за нацюрморт "Кветкі і садавіна" ён атрымаў званне акадэміка Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Акрамя нацюрмортаў і пейзажаў І. Хруцкі напісаў шмат партрэтаў, у тым ліку "Сямейны партрэт", "Партрэт хлопчыка ў саламяным брылі".

Прадстаўнікамі бытавога жанру ў выяўленчым мастацтве былі выхаванцы Віленскай школы жывапісу К. Кукевіч, К. Русецкі, Ю. Карчэўскі, Ц. Бычкоўскі і інш. Выразнай манерай пісьма вылучаюцца творы К. Русецкага: "Жняя", "Вербная нядзеля", пейзажы ваколіц Навагрудка, Ашмяншчыны, Белавежскай пушчы.

У першай палове XIX ст. у мастацтве Беларусі вырасла папулярнасць графікі. Гэта было выклікана развіццём паліграфічнай вытворчасці, выданнем масавымі тыражамі друкаваных твораў. Звярталіся да мастацкага прыёму графікі ілюстратары, картографы. Найбольш вядомымі графікамі былі М. Падалінскі, Ю. Главацкі, Ю. Азямблоўскі, Б. Клямбоўскі.

**Архітэктура.** З эпохай Асветніцтва звязана ўсталяванне стылю класіцызму ў архітэктуры. Архітэктары паступова адмаўляліся ад празмернай складанасці і заблытанасці архітэктурных форм, характэрных для стыляў барока і ракако. У архітэктурных кампазіцыях пачалі выкарыстоўвацца выразныя геаметрычныя формы. Набывалі распаўсюджанне антычная ордэрная сістэма і простыя дэкаратыўныя ўпрыгожванні. Класічны ордэрны порцік станавіўся характэрнай часткай палацаў, сядзіб некаторых культавых пабудоў.

Станаўленне класіцызму найперш было звязана з інтэнсіўным развіццём горадабудаўніцтва. У беларускіх гарадах пачалі з'яўляцца новыя тыпы жылых і грамадскіх будынкаў (канцылярыі, бальніцы, гімназіі), якія вылучаліся на фоне сярэдневяковай забудовы сваімі правільнымі абрысамі. Упершыню горадабудаўніцтва стала разглядацца як адзіная прасторавая сістэма, спланаваная на рацыянальных пачатках. Горадабудаўніцтва станавілася дзяржаўнай справай. У першай палове XIX ст. былі распрацаваны планы забудовы звыш 40 беларускіх гарадоў.

Яскравае адлюстраванне класіцызм знайшоў у палацава-сядзібнай архітэктуры. Дыяпазон палацава-сядзібнага будаўніцтва быў вельмі шырокі – ад невялікіх сядзіб дробнай шляхты да манументальных пабудоў буйных магнатаў. Сярод выдатных помнікаў беларускага класіцызму вылучаюцца ***Гомельскі***, ***Жыліцкі*** (Кіраўскі раён), ***Сноўскі*** (Нясвіжскі раён) палацы. Будаўніцтва палаца ў Гомелі пачалося ў 1785 г., калі яго ўладальнікам стаў вядомы рускі палкаводзец граф П. Румянцаў. Палац быў выкананы ў стылі класіцызму з выкарыстаннем такіх яго характэрных элементаў як порцік і каланада. Велічная класічная пабудова сімвалізавала высокі сацыяльны статус яе ўладальніка. У 1834 г. гомельскі маёнтак набыў фельдмаршал граф І. Паскевіч, які ажыццявіў рэканструкцыю палаца з элементамі рамантызму. У выніку палац захаваў свае класічныя рысы, аднак некаторыя элементы дэкору

набылі рысы рэнесанснай ці гатычнай архітэктуры. У гэты ж час быў створаны пейзажны парк, аздоблены гротамі, мосцікамі, керамічнымі вазамі, штучнымі вадаёмамі і іншымі ўпрыгажэннямі.Пры гэтых збудаваннях звычайна ствараліся паркі ў стылі рамантызму, аздобленыя штучнымі гротамі, каскадамі, руінамі. Найбольш значная з культавых пабудоў эпохі класіцызму ў Беларусі – ***Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі***. Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі быў пабудаваны ў 1809 – 1819 гг. па праекту англійскага архітэктара Дж. Кларка. Сабор быў створаны ў той час, калі ідэі класіцызму атрымалі перавагу над традыцыямі будаўніцтва праваслаўных храмаў, што існавалі на працягу стагоддзяў. Характэрныя прыёмы кампазіцыі – шасцікалонныя порцікі дарычнага ордэра, трохвугольныя франтоны. Велічнае ўяўленне ставарае прарэзаны 12 вокнамі барабан, які завяршаецца паўсферычным купалам.

Класіцызм панаваў у архітэктуры Беларусі да сярэдзіны XIX ст. Альтэрнатывай класіцызму выступаў рамантызм, які праявіўся пераважна ў пейзажна-паркавым мастацтве. Рамантычныя пейзажныя паркі ствараліся па прынцыпе свабоднай кампазіцыі, аздабляліся штучнымі гротамі, каскадамі, руінамі (Гомельскі, Лагойскі, Жыліцкі, Савейкаўскі паркі).

# РАЗДЗЕЛ V. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА. БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ. БАРАЦЬБА ЗА НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ (60-я гады XIX ст. – люты 1917 г.)

## ГЛАВА 1. БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ. ПЕРАХОД ДА КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

### § 1. Адмена прыгоннага права

**Прычыны і падрыхтоўка сялянскай рэформы.** Адмену прыгоннага права ў Расійскай імперыі абумовілі дзве галоўныя прычыны: існаванне прыгонніцтва стрымлівала эканамічнае развіццё дзяржавы; узрастанне антыпрыгонніцкага руху, перш за ўсё сярод сялянства, пагражала моцным сацыяльным выбухам. У сярэдзіне XIX ст. Расія заставалася адной з нямногіх вялікіх дзяржаў, дзе захавалася права адных людзей валодаць другімі. Ужо не менш як пяць дзесяцігоддзяў пытанне аб прыгонніцтве займала цэнтральнае месца ў ідэалагічных спрэчках розных кірункаў грамадскай думкі Расіі. Але толькі паражэнне ў Крымскай вайне 1853 – 1856 гг. здолела прымусіць кіраўніцтва імперыі перайсці да непасрэднага вырашэння сялянскай праблемы. Ва ўрадавых колах разумелі, што рэформу лепш правесці “зверху”, інакш можна дачакацца адмены прыгонніцтва “знізу”.

Новы ўрад Расіі на чале з імператарам Аляксандрам II пачаў падрыхтоўку да скасавання прыгону. Спачатку падрыхтоўка сялянскай рэформы вялася ў сакрэце ад шырокіх колаў грамадскасці. У ***студзені 1857 г.*** быў створаны ***Сакрэтны камітэт*** “для абмеркавання мер па ўладкаванні побыту памешчыцкіх сялян”. Члены камітэта спрачаліся наконт умоў адмены прыгоннага права. Адны прапаноўвалі остзейскі варыянт, г. зн. вызваленне сялян без зямлі; іншыя жадалі, каб цар узяў ініцыятыву на сябе і дараваў вольнасць сялянам ад свайго імя; некаторыя лічылі, што ўмовы вызвалення сялян павінны выпрацаваць памешчыкі.

Рэформу было вырашана пачынаць з заходніх губерняў. Па-першае, мясцовыя памешчыкі былі значна больш, чым памешчыкі ў іншых раёнах Расіі, уцягнуты ў таварна-грашовыя адносіны з прычыны блізкасці да заходнееўрапейскага рынку. Па-другое, увядзенне ў 1840-я гг. абавязковых інвентароў у тутэйшых памешчыцкіх гаспадарках прывяло памешчыкаў Беларусі да ўсведамлення хуткай і непазбежнай страты імі сваёй улады над сялянамі і, разлічваючы на больш выгадныя для сябе ўмовы адмены прыгонніцтва, яны мусілі першымі адгукнуцца на прапанову ўрада. Па-трэцяе, для самадзяржаўя апазіцыйна настроенае польскае дваранства ўяўляла палітычную небяспеку, таму неабходна было найхутчэй пазбавіць яго магчымасці выкарыстаць сялянскія хваляванні ў сваіх нацыянальных інтарэсах.

Для расійскага ўрада было важна, каб ініцыятыва адмены прыгоннага права зыходзіла ад памешчыкаў – галоўнай сацыяльнай апоры ўлады. Паколькі

памешчыкі асабліва не спяшаліся з прапановамі аб скасаванні прыгонніцтва, памешчыцкую "ініцыятыву" трэба было арганізаваць. Зрабіць гэта аказалася не вельмі цяжка. Яшчэ ў маі 1856 г. генерал-губернатар Віленскай, Ковенскай і Гродзенскан губерняў У.І. Назімаў на сустрэчы з Аляксандрам II у Брэсце запэўніў імператара, што дваране яго генерал-губернатарства, бачачы вынікі вызвалення сялян у суседніх прыбалтыйскіх губернях, дзе сяляне атрымалі асабістую свабоду яшчэ ў пачатку XIX ст., пагадзіліся б на падобную рэформу. Летам 1857 г. Аляксандр II зноў сустрэўся з У.І. Назімавым, цяпер ужо ў Вільні, і генерал-губернатар пацвердзіў, што памешчыкі паўночна-заходніх губерняў гатовы выступіць з ініцыятывай адмовы ад прыгоннага права.

Пад уплывам У.І. Назімава інвентарныя камітэты Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў прынялі рашэнне не займацца пытаннямі рэгулявання адносін паміж памешчыкамі і сялянамі, для чаго яны і былі калісьці створаны, а пагадзіліся бязвыплатна вызваліць сялян, пакінуўшы памешчыкам усю зямлю, у тым ліку і сялянскія надзелы. Гэта рашэнне У.І. Назімаў у верасні 1857 г. накіраваў міністру ўнутраных спраў. У кастрычніку ён асабіста прыехаў у Пецярбург і папрасіў даць яму далейшыя інструкцыі. ***20 лістапада 1857 г.*** Аляксандр II падпісаў і накіраваў ***рэскрыпт*** (прадпісанне) генерал-губернатару Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губерняў У.І. Назімаву аб заснаванні з прадстаўнікоў мясцовых памешчыкаў трох губернскіх камітэтаў і адной агульнай камісіі ў Вільні для падрыхтоўкі мясцовых праектаў паляпшэння побыту памешчыцкіх сялян. Крыху пазней падобныя камітэты былі створаны і ў іншых губернях Расіі.

У рэскрыпце нічога не было сказана аб адмене прыгоннага права, але ***21 лістапада 1857 г.*** у ***"Дадатковай адносіне"*** ўжо недвухсэнсоўна тлумачылася, што галоўным у "паляпшэнні быту памешчыцкіх сялян" з'яўляецца адмена прыгоннага права. Менавіта прыняцце гэтых двух дакументаў зрабіла незваротным працэс падрыхтоўкі да адмены прыгоннага права па ўсёй імперыі, а іх апублікаванне легалізавала абмеркаванне праблемы. Неабходнасць рэформы была публічна пацверджана. Стала зразумелым, што прыгоннае права дажывае апошнія гады. Пераважная большасць дваранскіх камітэтаў ва ўсіх губернях Расіі выказалася за вызваленне сялян без зямлі. Але такі варыянт ужо не адказваў патрабаванням часу, не мог даць пажаданага эфекту і быў адхілены ўрадам.

**Заканадаўчая база адмены прыгоннага права. Маніфест і "Палажэнні" 19 лютага 1861 г.** ***19 лютага 1861 г.*** Аляксандр II падпісаў "Маніфест" і зацвердзіў усе заканадаўчыя акты (іх было 17), якія тычыліся адмены прыгоннага права. Але апублікаваны гэтыя дакументы былі толькі 5 сакавіка 1861 г. Такі значны разрыў паміж датамі зацвярджэння царом заканадаўчых актаў і іх апублікаваннем для ўсеагульнага азнаямлення тлумачыцца тым, што патрэбна было не толькі надрукаваць неабходную колькасць экземпляраў гэтых аб'ёмных дакументаў, але і прыняць шэраг прэвентыўных (папераджальных) захадаў на выпадак сялянскіх хваляванняў,

якія небеспадстаўна прагназаваліся ўладамі. Былі падрыхтаваны неабходныя вайсковыя часці ў сталіцах, а ў губерні для нагляду за парадкам накіраваны флігель-ад'ютанты, якія ў неабходных выпадках мелі права дзейнічаць ад імя цара.

Усе дакументы, апублікаваныя 5 сакавіка 1861 г., можна падзяліць на тры групы: агульныя палажэнні, мясцовыя палажэнні, дадатковыя правілы. З мясцовых палажэнняў непасрэдна тэрыторыі Беларусі тычыліся два: "Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, якія паселены на памешчыцкіх землях у губернях: Вялікарасійскіх, Новарасійскіх і Беларускіх" (пад гэта палажэнне падпадалі Магілёўская губерня і большая частка Віцебскай) і "Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, якія паселены на памешчыцкіх землях у губернях: Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і частцы Віцебскай" (ахоплівала астатнюю тэрыторыю Беларусі).

**Правы сялян. Устаўныя граматы і выкупныя акты.** У маніфесце і агульных палажэннях былі заканадаўча замацаваны ўсе агульныя для сялян асабістыя і маёмасныя правы, правы грамадскага кіравання, дзяржаўныя і земскія павіннасці. Галоўным звяном у заканадаўчых актах рэформы былі асабістыя правы сялян. У маніфесце падкрэслівалася, што адмена прыгоннага права з'яўлялася вынікам добраахвотнай ініцыятывы "шляхетнага дваранства". У адпаведнасці з маніфестам былыя памешчыцкія сяляне абвяшчаліся асабіста свабоднымі і атрымлівалі шэраг грамадзянскіх правоў: заключаць ад свайго імя розныя грамадзянскія і маёмасныя пагадненні, адкрываць гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы, пераходзіць у іншыя саслоўі.

Агульныя палажэнні ўводзілі новую сістэму кіравання вёскай. Яна была заснавана на выбарнасці ніжэйшых службовых асоб. Сяляне, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, складалі ***сельскую грамаду*** (абшчыну). На сходзе сельскай грамады выбіраўся ***староста***. Некалькі сельскіх абшчын, якія адносіліся да аднаго царкоўнага прыхода, стваралі ***воласць***. На валасным сходзе сельскія старасты і ўпаўнаважаныя ад кожных 10 двароў выбіралі ***валаснoе праўленне***, ***валаснога старшыню*** і ***суддзю***. Сельскія і валасныя праўленні займаліся раскладкай і зборам падаткаў, выконвалі распараджэнні мясцовых улад, рэгулявалі пазямельныя адносіны сялян, сачылі за парадкам у вёсцы. За своечасовае выкананне ўсіх павіннасцей сяляне неслі адказнасць на аснове кругавой парукі. Валасны сялянскі суд вырашаў дробныя крымінальныя і грамадзянскія справы сялян і дзейнічаў паводле норм і традыцый звычаёвага права.

Першай інстанцыяй па ўрэгуляванні адносін паміж сялянамі і памешчыкамі з'яўляліся ***міравыя пасрэднікі***, якія выбіраліся з мясцовых дваран і зацвярджаліся сенатам. Асноўным абавязкам міравых пасрэднікаў было садзейнічанне складанню ***ўстаўных грамат*** – нарматыўных актаў, дзе вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў. На складанне і падпісанне ўстаўных грамат адводзіліся два гады. Для непасрэднага правядзення рэформы на месцах ствараліся спецыяльныя органы – ***павятовыя***

***міравыя з'езды*** і ***губернскія па сялянскіх справах установы***, дзейнасць якіх кантралявалі губернатары.

**Спецыфіка "Мясцовых палажэнняў…" для беларускіх губерняў.** Пазямельнае ўладкаванне сялян Беларусі ажыццяўлялася на аснове ***двух "Мясцовых палажэнняў…"***. У Віцебскай і Магілёўскай губернях, дзе захавалася ***абшчыннае землекарыстанне***, устанаўлівалася ніжэйшая (ад 1 да 2 дзесяцін) і вышэйшая (ад 4 да 5,5 дзесяціны) плошча зямлі на адну мужчынскую душу. Калі да рэформы ў карыстанні селяніна зямлі было больш за вышэйшую норму, то памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць. У Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях існавала ***падворнае землекарыстанне***. Тут сялянам пакідаўся іх дарэформенны надзел. Адрэзкі дазваляліся рабіць, калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 усёй зямлі, але сялянскі надзел не мог быць скарочаны больш як на 1/6.

Уся зямля ў маёнтку прызнавалася ўласнасцю памешчыка, ў тым ліку і тая, якая знаходзілася ў карыстанні сялян. За карыстанне сваімі надзеламі асабіста свабодныя сяляне на працягу не менш як 9 гадоў (да правядзення выкупной аперацыі) павінны былі адбываць паншчыну або плаціць памешчыку аброк, гэта значыць выконваць фактычна тыя ж павіннасці, што і ў часы прыгоннага права. Адмяняліся толькі дадатковыя зборы (яйкі, масла, лён, палатно і да т.п.), крыху скарачалася фурманачная павіннасць, забараняўся перавод сялян з аброку на паншчыну і ў дваровыя. Такое становішча сялян закон прызнаваў часовым. Таму асабіста свабодныя сяляне, якія працягвалі выконваць павіннасці на карысць памешчыка, называліся ***часоваабавязанымі***.

Да правядзення выкупной аперацыі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях паншчына за вышэйшы надзел складала 40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год (ці 8 рублёў аброку). У заходняй частцы Беларусі павіннасці памяншаліся на 10 % супраць інвентароў і вызначаліся наступным чынам: для паншчыны – не больш за 23 дні, для аброку – не больш як 3 рублі з дзесяціны ў год.

**Выкупная аперацыя.** Свой палявы надзел зямлі сяляне выкуплялі ва ўласнасць. Правілы ***выкупной аперацыі*** былі аднолькавыя для ўсёй Расіі. ***Выкупная сума*** за сялянскі надзел вылічвалася так, каб, паклаўшы яе ў банк пад 6 % гадавых, памешчык мог штогод атрымліваць даход, роўны гадавому аброку з гэтага надзела. Напрыклад, калі аброк з сялянскага надзелу складаў 6 рублёў у год, то агульная сума, якую селяніну трэба было заплаціць, складала 100 рублёў (6 р. – 6 %, 100 р. – 100 %). Ад 20 да 25 % выкупной сумы (у залежнасці ад велічыні надзелу) сяляне плацілі непасрэдна памешчыку. Астатнюю частку памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер, якія можна было прадаваць, ці закладваць. У выніку такой аперацыі сяляне станавіліся даўжнікамі дзяржавы. На працягу 49 гадоў трэба было вярнуць доўг у выглядзе ***выкупных плацяжоў***, куды ўключаліся яшчэ і працэнты за пазыку. За гэты час сялянам даводзілася выплаціць да 300 % пазычанай ім сумы.

Такім чынам, агульная сума, якую сяляне вымушаны былі заплаціць за атрыманыя надзелы, значна перавышала рыначны кошт гэтай зямлі (у Беларусі – у 3 – 4 разы). Выходзіла, што сяляне не толькі выкуплялі зямлю, але і кампенсавалі памешчыкам страту іх уласнасці ў асобе селяніна. Праводзячы выкупную аперацыю, казна вырашыла і праблему спагнання дарэформенных даўгоў з памешчыкаў. У Беларусі, паводле даных за 1859 г., 59,8 % прыгонных сялян (увогуле па Расіі – 65 %) былі закладзены іх уладальнікамі ў розных крэдытных установах. Гэты доўг утрымліваўся з выкупной пазыкі памешчыкам, што вызваліла іх ад даўгоў і выратавала ад фінансавага банкруцтва.

**Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 – 1864 гг.** Істотныя змены ў ажыццяўленне сялянскай рэформы ў Беларусі ўнесла паўстанне 1863 – 1864 гг. Указ ад ***1 сакавіка 1863 г.*** уводзіў абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губернях і ў інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні. Сяляне пераставалі быць часоваабавязанымі і станавіліся ўласнікамі зямлі, выкупныя плацяжы зніжаліся на 20 %. ***2 лістапада 1863 г.*** гэты ўказ распаўсюджваўся на ўсю Віцебскую і Магілёўскую губерні. 9 красавіка 1863 г. у Беларусі былі створаны павятовыя камісіі для праверкі і выпраўлення ўстаўных грамат. Згодна з цыркулярам ад 18 кастрычніка 1863 г. абеззямеленым у 1846 – 1856 гг. сялянам выдаваўся 3-дзесяцінны сямейны надзел і ў поўным аб’ёме вярталася зямля, адабраная ў іх з 1857 г. Паўстанне 1863 – 1864 гг. паўплывала і на становішча дзяржаўных сялян у Беларусі. Паводле закона ***1867 г.*** яны пераводзіліся з аброку на выкуп і станавіліся ўласнікамі сваіх надзелаў. Зробленыя ўрадам саступкі палепшылі становішча сялян заходніх губерняў у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расіі і стварылі больш спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталізму ў Літве і Беларусі.

**Вынікі і значэнне аграрнай рэформы.** Рэформа 1861 г. дала значны штуршок развіццю буржуазных адносін у Расіі. За некалькі дзесяцігоддзяў тут адбыліся такія пераўтварэнні, на якія ў некаторых краінах Захаду спатрэбіліся цэлыя стагоддзі. Разам з тым рэформа несла ў сабе шмат супярэчнасцей. У Расіі захавалася мноства феадальных перажыткаў, што стала адметнай рысай і асноўнай асаблівасцю расійскага капіталізму.

## § 2. Буржуазныя рэформы 60–70-х гадоў і контррэформы 80–90-х гадоў

**Неабходнасць рэфармавання дзяржаўна-палітычнага ладу Расіі.** Рэформа 1861 г. ліквідавала галоўную перашкоду, якая стрымлівала развіццё капіталізму ў Расіі, – прыгоннае права. Але каб рухацца наперад да сапраўды буржуазнага грамадства, Расіі былі патрэбны іншыя рэформы дзяржаўна-палітычнага ладу. У 1860 – 1870-я гг. урад Аляксандра ІІ прыняў шэраг пастаноў аб правядзенні такіх рэформ: ***земскай, судовай, гарадской, ваеннай, школьнай і цэнзурнай***.

Аднак у Беларусі гэтыя рэформы ажыццяўляліся са значнымі абмежаваннямі, якія былі выкліканы мерамі, што прымаліся ўрадам у сувязі з

паўстаннем 1863 – 1864 гг., у першую чаргу абвяшчэннем тут ваеннага становішча, якое было адменена толькі ў 1870 г.

**Судовая рэформа.** З усіх рэформ самай радыкальнай з'яўлялася ***судовая***. Новыя судовыя статуты, прынятыя ***20 лістапада 1864 г.***, уводзілі бессаслоўнасць у судзе. Абвяшчаліся нязменнасць суддзяў, незалежнасць суда ад адміністрацыі, спаборніцтва і галоснасць судовага працэсу. Пры разглядзе крымінальных спраў прадугледжваўся ўдзел у судовым працэсе ***прысяжных засядацеляў***, якія незалежна ад суддзяў выносілі рашэнне, вінаваты падсудны ці не. Для юрыдычнай дапамогі падсудным быў створаны інстытут ***прысяжных паверaных*** (адвакатаў), якія не знаходзіліся на дзяржаўнай службе і не залежалі ад урада. Працэс папярэдняга следства перадаваўся ад паліцыі ***судовым следчым***. Значна скарачалася сістэма судаводства. Першай інстанцыяй стаў ***міравы суд*** з адзіным суддзёй, другой – ***павятовы з'езд міравых суддзяў***, потым ішлі ***акруговыя суды*** (у губернях) і ***судовыя палаты*** (аб'ядноўвалі некалькі губерняў). Для ўсіх судоў імперыі існавала адзіная ***апеляцыйная інстанцыя – Сенат***. Міравыя суддзі павінны былі выбірацца на павятовых земскіх сходах і ў гарадскіх думах. Члены судовых палат і акруговых судоў зацвярджаліся імператарам, а міравыя суддзі – сенатам. Нагляд за дзейнасцю судовых устаноў ажыццяўлялі пракуроры, якія падначальваліся непасрэдна міністру юстыцыі. Разам з тым судовая рэформа пакідала ***валасны суд*** для сялян (па грамадзянскіх і дробных крымінальных справах), ***духоўны суд*** (кансісторыю) па справах духавенства і ***ваенныя суды*** для вайскоўцаў. Вышэйшыя дзяржаўныя чыны падлягалі ***Вышэйшаму крымінальнаму суду***.

У Беларусі судовая рэформа пачалася толькі ў ***1872 г.*** з увядзення міравых судоў. Паколькі ў Беларусі адсутнічалі земствы, то міравыя суддзі, у адрозненне ад цэнтральных губерняў Расіі, тут не выбіраліся, а прызначаліся міністрам юстыцыі па рэкамендацыі мясцовай адміністрацыі. Акруговыя суды, судовыя палаты, прысяжныя засядацелі і прысяжныя паверaныя з'явіліся ў заходніх губернях толькі ў ***1882 г.*** Спіс прысяжных засядацеляў таксама зацвярджаўся ўладамі. Усё гэта было вынікам паўстання 1863 – 1864 гг. – самадзяржаўе не давярала мясцовым памешчыкам, сярод якіх былі моцныя прапольскія настроі.

**Земская рэформа.** ***Земская рэформа,*** аб'яўленая ***1 студзеня 1864 г.***, прадугледжвала стварэнне ў паветах і губернях выбарных устаноў для кіраўніцтва мясцовай гаспадаркай, народнай асветай, медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва і іншымі непалітычнымі справамі. У Беларусі ў сувязі з падзеямі 1863 – 1864 гг. уводзіць выбарныя ўстановы ўрад не адважыўся. Палітыка недаверу мясцовым памешчыкам працягвалася аж да 1911 г., калі ва ўсходніх губернях Беларусі былі створаны земствы, і то згодна са спецыяльным выбарчым законам.

**Гарадская рэформа.** Са спазненнем на 5 гадоў у Беларусі была праведзена ***гарадская рэформа*** (у Расіі прынята ў 1870 *г.).* Яна абвяшчала прынцып усесаслоўнасці пры выбарах органаў гарадскога самакіравання – ***гарадской думы*** і ***гарадской управы*** на чале з гарадскім галавой. Пры выбарах членаў

думы (***гласных***) права голасу атрымлівалі гараджане з 25-гадовага ўзросту. Аднак гэтым правам маглі карыстацца не ўсе жыхары горада, а толькі тыя, хто плаціў гарадскія падаткі. У сваю чаргу яны падзяляліся на тры выбарчыя курыі (у залежнасці ад памеру выплачваемага ў гарадскую казну падатку). У першую ўваходзілі найбольш буйныя плацельшчыкі, якія плацілі трэць агульнай сумы гарадскіх падаткаў (такіх людзей у горадзе звычайна налічвалася некалькі дзесяткаў); у другую – сярэднія падаткаплацельшчыкі, што таксама плацілі трэць гарадскіх падаткаў (такіх было некалькі соцень); у трэцюю – дробныя падаткаплацельшчыкі, што выплачвалі астатнюю трэць агульнай сумы (іх было ў некалькі разоў больш, чым выбаршчыкаў 1-й і 2-й курый). Пры гэтым кожная курыя выбірала аднолькавую колькасць членаў гарадской думы. Такім чынам, уведзеная сістэма гарадскога самакіравання забяспечвала ўладу купцам, прадпрымальнікам, уладальнікам нерухомасці. Напрыклад, у выбраных гарадскіх думах першага 4-годдзя дваране і духавенства складалі 15 % усіх гласных, у другім 4-годдзі – звыш 18 %, у трэцім – больш за 20 %. Домаўладальнікамі былі да 90 % гарадскіх гласных. У сваю чаргу, рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя, якія складалі асноўную масу насельніцтва гарадоў, не мелі магчымасці ўдзельнічаць у гарадскім самакіраванні, бо не плацілі падаткі ў гарадскую казну.

Гарадская дума непасрэдна не падначальвалася мясцовай адміністрацыі, але нагляд за дзейнасцю думы ажыццяўляў губернатар праз спецыяльна створаныя губернскія ўстановы па гарадскіх справах. Гарадскі галава ў буйных гарадах зацвярджаўся на сваёй пасадзе міністрам унутраных спраў, а ў дробных – губернатарам. Кампетэнцыя органаў гарадскога самакіравання была абмежавана вузкімі рамкамі гаспадарчых пытанняў: добраўпарадкавання тэрыторыі горада, арганізацыі гарадскога гандлю і транспарту, народнай адукацыі і аховы здароўя, прыняцця санітарных і супрацьпажарных мер. Дума мела права абкладваць падаткамі маёмасць і прыбыткі прыватных асоб, але ў вельмі абмежаваных памерах – не больш за 1 % кошту нерухомасці альбо гандлёвага ці прамысловага прыбытку. Пры гэтым больш за палову сабраных сродкаў выкарыстоўвалася не на гарадскія, а на казённыя патрэбы – утрыманне паліцыі і органаў улады. Разам з тым, нягледзячы на значную абмежаванасць, рэформа гарадскога самакіравання ўсё ж замяніла былыя феадальныя саслоўна-бюракратычныя органы гарадскога кіравання на новыя, заснаваныя на буржуазным прынцыпе маёмаснага цэнзу. Рэформа спрыяла ўмацаванню пазіцый буржуазіі ў дзяржаве, садзейнічала паляпшэнню гарадской гаспадаркі. Аднак феадальныя перажыткі не давалі магчымасці выкарыстаць гарадскую рэформу ў поўнай меры.

**Ваенная рэформа.** Рэфармаванне арміі ў Расіі пачалося ў ***1862 г.***, калі былі ўтвораны 15 ваенных акруг (у тым ліку і ***Віленская***, у якую ўвайшлі ўсе беларускія губерні) і ўведзены скарочаны тэрмін службы: ў сухапутным войску да сямі і на флоце да васьмі гадоў. У ***1867 г.*** быў прыняты новы ваенна-судовы статут, які зыходзіў з прынцыпаў судовай рэформы 1864 г. Згодна з ім

уводзіліся тры судовыя інстанцыі – ***палкавы, ваенна-акруговы*** і ***галоўны ваенны суд***. На час вайны ствараўся ***Галоўны палявы ваенны суд***. Рашэнні ваенных судоў падлягалі зацвярджэнню палкавога і акруговага военачальнікаў.

Разам з тым у расійскай арміі яшчэ працягваў дзейнічаць саслоўны прынцып камплектавання войска. І толькі закон ***1874 г.*** увёў замест рэкруцкіх набораў усеагульную воінскую павіннасць. Усе мужчыны з 20-гадовага ўзросту павінны былі служыць у войску (акрамя карэннага насельніцтва Сярэдняй Азіі, Казахстана, Сібіры і Поўначы). У сухапутных войсках тэрмін службы паніжаўся да 6 гадоў абавязковай і 9 гадоў у запасе, на флоце – адпаведна да 7 і 3 гадоў. Таксама ўводзіліся льготы для людзей, якія мелі адукацыю. Тыя, хто скончыў вышэйшыя навучальныя ўстановы, служылі 6 месяцаў, гімназіі – 1,5 года, гарадскія вучылішчы – 3, пачатковыя школы – 4 гады. З увядзеннем усеагульнай воінскай павіннасці ў Расіі былі фармальна рэалізаваны буржуазныя прынцыпы камплектавання арміі. Але на практыцы саслоўнасць не была ліквідавана. Сярод расійскага афіцэрства пераважалі дваране, а ўвесь цяжар салдацкай службы неслі ніжэйшыя саслоўі, у асноўным сяляне, бо прывілеяваныя саслоўі дзякуючы высокай адукацыі і іншым ільготам фактычна вызваляліся ад службы ў войску.

**Школьная рэформа.** Рэфармаванне школьнай сістэмы (***1864 г.***) таксама мела буржуазны характар. Школа абвяшчалася ўсесаслоўнай, павялічвалася колькасць пачатковых школ, уводзілася пераемнасць розных ступеняў навучання. У адрозненне ад цэнтральных губерняў Расіі ў Беларусі не было земскіх школ і грамадскасць не дапускалася да кіраўніцтва народнай адукацыяй. Для Беларусі і Літвы былі выпрацаваны спецыяльныя “Часовыя правілы для народных школ”. У адпаведнасці з імі ў кожнай губерні ствараліся дырэкцыі народных вучылішчаў з ліку чыноўнікаў, якія ажыццяўлялі нагляд за работай школ, прымалі на працу і звальнялі настаўнікаў, давалі дазвол на адкрыццё новых школ.

Агульную сярэднюю адукацыю давалі ***сямігадовыя гімназіі***, якія падзяляліся на ***класічныя*** і ***рэальныя***. У класічных гімназіях у аснове навучання знаходзілася выкладанне гэтак званых класічных моў – грэчаскай і лацінскай, а таксама гуманітарных дысцыплін. Рэальныя гімназіі павялічвалі аб’ём выкладання матэматыкі і прыродазнаўства за кошт старажытных моў. Выпускнікі класічных гімназій атрымлівалі права паступаць без экзаменаў ва універсітэты. Тым, хто скончыў рэальныя гімназіі, доступ ва універсітэты быў абмежаваны. Яны маглі паступаць пераважна ў вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы.

У ***1871 г.*** рэальныя гімназіі былі пераўтвораны ў шасцікласныя ***рэальныя вучылішчы***, у якіх рэзка скарачалася выкладанне агульнаадукацыйных дысцыплін і пашыралася вывучэнне прыкладных, тэхнічных навук. Выпускнікі гэтых вучылішчаў ужо не маглі паступаць у тэхнічныя інстытуты без экзаменаў, а прыём іх ва універсітэты быў забаронены. З гэтага ж года ў класічных гімназіях спынялася выкладанне прыродазнаўства, скарачалася на

палову колькасць гадзін па літаратуры і гісторыі і адпаведна павялічваўся час на вывучэнне старажытных моў. Увогуле, з-за даволі высокай платы за навучанне магчымасць атрымаць добрую адукацыю мелі пераважна прадстаўнікі прывілеяваных і заможных саслоўяў. Для жыхароў Беларусі становішча ўскладнялася яшчэ і тым, што ў краі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы.

**Цэнзурная рэформа.** Новы цэнзурны статут, прыняты ў ***1865 г.***, значна пашыраў магчымасці друку. Адмянялася папярэдняя цэнзура для твораў памерам не менш як 10 друкаваных аркушаў, а для перакладаў – 20. Выданні меншых памераў абавязкова падлягалі папярэдняй цэнзуры. Буйным перыядычным выданням дазвалялася выходзіць без папярэдняй цэнзуры, але толькі пры ўнясенні вялікіх грашовых закладаў. Пры гэтым органы ўлады мелі права кантролю і прымянення розных санкцый да парушальнікаў закону аб друку – ад грашовага спагнання да закрыцця "нядобранадзейных" газет і часопісаў. Аднак гэта тычылася перш за ўсё цэнтральных выданняў і выдавецтваў. У Беларусі да сярэдзіны 1880-х гг. усе перыядычныя выданні залежалі ад урадавых устаноў і праваслаўнай царквы.

**Значэнне рэформ.** Буржуазныя рэформы 1860 – 1870-х гг. XIX ст., пачынаючы з адмены прыгоннага права, прывялі да значных змен у палітычным жыцці Расіі. Быў зроблены крок наперад па шляху пераўтварэння феадальнай манархіі ў буржуазную. Разам з тым рэформы неслі ў сабе перажыткі феадалізму, былі непаслядоўныя і абмежаваныя. Вялікія адрозненні і адтэрміноўкі ў правядзенні рэформ у Беларусі надавалі ім яшчэ больш абмежаваны і непаслядоўны характар у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расіі, рабілі сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў беларускіх губернях складанай і супярэчлівай.

**Умацаванне "традыцыяналісцкіх" пачаткаў ва ўрадавай палітыцы Беларусі.** Пасля забойства народавольцамі Аляксандра II на прастол уступіў яго другі сын ***Аляксандр III*** (1881 – 1894 гг.). Ва ўнутранай палітыцы Расіі адбыліся значныя змены. Урад Аляксандра III расцаніў дзеянні народавольцаў як праяўленне "заходніх тэндэнцый" і сканцэнтраваў сваю ўвагу на ўзмацненні "традыцыяналісцкіх" пачаткаў у палітыцы, эканоміцы і культуры. У 1880-х – пачатку 1890-х гг. з'явіўся шэраг заканадаўчых актаў, якія ў гістарыяграфіі ацэньваюцца як "контррэформы", таму што яны мелі на мэце абмежаваць характар і дзеянне рэформ 1860 – 1870-х гадоў. Менавіта таму, 1880 – 1890-я гг. увайшлі ў гісторыю Расіі як ***перыяд контррэформ***.

Традыцыяналізм урадавай палітыкі ў Беларусі, перш за ўсё, праяўляўся ў недапушчэнні гвалтоўнай ломкі ладу жыцця мясцовага насельніцтва, які склаўся гістарычна. Аднак, менавіта ў гэты час агульнаімперскае заканадаўства, адміністрацыйна-палітычнае кіраванне, сістэма адукацыі распаўсюджваюцца на ўсе "ускраіны" Расіі, у тым ліку і на Беларусь, без уліку іх нацыянальных асаблівасцей.

**Асаблівасці эканамічнай і саслоўнай палітыкі ў Беларусі.** Асновай усёй дзейнасці ўрада Аляксандра III стала ярка выяўленая саслоўная палітыка. Яна была скіравана ў першую чаргу на падтрыманне эканамічнага і палітычнага статусу дваранства. Перавага, як і ў часы Аляксандра II, аддавалася рускім землеўладальнікам. У ***1885 г.*** быў заснаваны ***Дваранскі пазямельны банк***. У Беларусі ён даваў права "рускім землеўладальнікам" (у тым ліку праваслаўным памешчыкам Беларусі) карыстацца крэдытам пад заклад іх зямель на льготных умовах. У інтарэсах дваран-землеўладальнікаў у ***1886 г.*** было выдадзена ***"Палажэнне аб найме на сельскія працы"***. Яно пашырала права землеўладальніка, які мог патрабаваць звароту рабочых, якія пакінулі працу да сканчэння тэрміну, штрафаваць іх не толькі за ўчынены гаспадару матэрыяльны ўрон, але і за "непадпарадкаванне", падвяргаць арышту і цялеснаму пакаранню.

Для палітыкі ўрада адносна сялянства было характэрна спалучэнне кансерватыўных мер з дзеяннямі па ўмацаванні яго эканамічнага становішча. Гэтым мэтам служыла заканадаўства, якое было накіравана на захаванне разбураных пад націскам капіталізму патрыярхальных устояў у вёсцы, у першую чаргу, патрыярхальнай сялянскай сям'і і абшчыны. Гэтаму ж спрыяла дзейнасць заснаванага ў ***1882 г.*** Сялянскага пазямельнага банка (у Мінску яго аддзяленні былі адчынены ў ***1886 г.***), які выдаваў пазыкі на пакупку зямлі як асобным домаўладальнікам, так і сельскім таварыствам. Праз яго пасрэдніцтва прадаваліся і памешчыцкія землі; вялікія плошчы зямлі сталі паступова пераходзіць да сялян. Гэтымі мерамі заходнія губерні збліжаліся з іншымі губернямі Расіі.

Аднак, прававое становішча сялян зведала істотныя абмежаванні. ***12 ліпеня 1889 г.*** было выдадзена ***"Палажэнне аб земскіх начальніках"***. У Беларусі гэты закон быў уведзены ў чэрвені 1900 г. і толькі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях. У кіраванні сялянскімі справамі на месцах з'явілася новая асоба – ***земскі начальнік***, паўнамоцны распарадчык жыцця вёскі і нават ў пэўнай ступені і асобы селяніна. Дзейнасць сялянскага сходу ставілася ў поўную залежнасць ад земскага начальніка. Валасны міравы суд, да таго часу незалежны ад адміністрацыі, скасоўваўся. Земскім начальнікам было дадзена права накладваць штрафы і арыштоўваць сваіх падапечных на тэрмін да трох дзён.

***11 чэрвеня 1892 г.*** было зацверджана новае ***"Гарадское палажэнне"***, якое рэзка павышала маёмасны цэнз пры выбарах органаў гарадскога самакіравання і ўзмацняла кантроль над ім з боку ўрадавай адміністрацыі. Права ўдзелу ў выбарах гарадской думы пазбаўляліся не толькі немаёмныя слаі гарадскога насельніцтва, але і дробная буржуазія – дробныя гандляры, прыказчыкі і інш. Перавага аддавалася дваранам-домаўладальнікам, буйной гандлёвай, прамысловай і фінансавай буржуазіі, вынікам чаго стала рэзкае скарачэнне колькасці выбаршчыкаў. Напрыклад, у Мінску ў 1893 г. яны склалі ўсяго 1 %

насельніцтва горада (ў 14 разоў меней у параўнанні з выбарамі паводле закона 1870 г.).

Развіццё прамысловасці і ўздым рабочага руху ў буйных прамысловых цэнтрах Расіі паставілі на чаргу рабочае пытанне. У 1880 – 1890-я гг. урадам прымаецца шэраг заканадаўчых актаў, якія абмяжоўвалі эксплуатацыю фабрычна-заводскіх рабочых. У ***1882 г.*** быў выдадзены закон, які забараняў начную працу на фабрыках дзецям да 12-гадовага ўзросту. У тым жа годзе быў прыняты закон аб увядзенні фабрычнай інспекцыі для нагляду за выкананнем фабрычнага заканадаўства. За ім услед прынялі закон ***12 чэрвеня 1884 г.*** аб школьным навучанні малалетніх, якія працуюць на фабрыках. ***3 чэрвеня 1885 г.*** быў выдадзены закон аб забароне начной працы падлеткам (да 17 гадоў) і жанчынам. У ***1886 г.*** быў абмежаваны памер штрафаў і ўводзіліся разліковыя кніжкі, дзе вызначаліся ўмовы найму рабочых. У ***1897 г.*** працягласць працоўнага дня абмяжоўвалася 11,5 гадзінамі. Аднак прынятыя законы асабліва не паўплывалі на становішча рабочых Беларусі. Кантроль за ажыццяўленнем законаў аказаўся вельмі слабым, у дадатак яны не распаўсюджваліся на дробную і рамесніцкую вытворчасць, а буйных прадпрыемстваў на Беларусі было мала.

**Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальнаму і рэлігійнаму пытаннях.** Становішча ў Беларусі ўскладнялася рознымі абмежаваннямі ў дачыненні да польскага (каталіцкага) і яўрэйскага (іудзейскага) насельніцтва. У сувязі з паўстаннем 1863 – 1864 гг. палякам з ***1865 г.*** забаранялася набываць маёнткі інакш як па спадчыне. Польскія памешчыкі былі пазбаўлены магчымасці карыстацца льготнымі пазыкамі Дваранскага банка. Беларускія сяляне-католікі маглі набываць не больш як 60 дзесяцін зямлі на сям’ю. У пачатку 1890-х гадоў у беларускія губерні была выселена значная колькасць яўрэяў з гарадоў Цэнтральнай Расіі, у выніку чаго стварылася штучная перанаселенасць беларускіх гарадоў. Яўрэяў не прымалі на работу ў дзяржаўныя ўстановы, паліцыю, на афіцэрскія пасады ў арміі, на чыгуначны транспарт. Існавала працэнтная норма прыёму яўрэяў у сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

**Цэнзура і асвета.** У ***1882 г.*** быў устаноўлены строгі адміністрацыйны нагляд за газетамі і часопісамі. Іх рэдакцыі павінны былі па першым патрабаванні Міністэрства ўнутраных спраў называць імёны аўтараў, якія друкаваліся пад псеўданімамі. Узмацніліся рэпрэсіі супраць апазіцыйных выданняў, многія з якіх былі закрыты.

У 1880-я гады ўрад прыняў шэраг пастаноў, якія ўводзілі шмат абмежаванняў у сістэму адукацыі. Выдадзенае ў ***1884 г.*** ***“Палажэнне аб царкоўнапрыходскіх школах”***, у якіх вучыліся ў першую чаргу дзеці сялян, падкрэслівала рэлігійную аснову пачатковага навучэння. Узмацніўся кантроль за кантынгентам навучэнцаў сярэдняй школы. У ***1887 г.*** міністр народнай адукацыі выдаў цыркуляр (у грамадстве яго называлі цыркуляр “Аб кухарчыных дзецях”), які забараняў прымаць у гімназіі дзяцей ніжэйшых

саслоўяў гарадскога насельніцтва. У гэты ж час рэальныя вучылішчы былі пераўтвораны ў тэхнічныя вучылішчы, заканчэнне якіх не давала права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Вышэйшая адукацыя таксама была пастаўлена пад больш жорсткі кантроль з боку ўрадавай адміністрацыі. ***Універсітэцкі статут 1884 г.*** фактычна ліквідаваў аўтаномію універсітэтаў у кіраванні. З ***1887 г.*** каб паступіць ва універсітэт, трэба было прадставіць характарыстыку аб “добранадзейнасці”, а плата за год навучання павялічвалася з 10 да 50 рублёў. Усё гэта, безумоўна, закранала інтарэсы жыхароў Беларусі, дзе пасля закрыцця ў 1864 г. Горы-Горацкага земляробчага інстытута не засталося ніводнай вышэйшай навучальнай установы і, каб атрымаць вышэйшую адукацыю, трэба было ехаць у Пецярбург, Маскву ці Кіеў.

Такім чынам, эпоха Аляксандра III у сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным развіцці Беларусі адзначаецца супярэчлівасцю. З аднаго боку, гэты быў час эканамічнай стабілізацыі грамадства, павелічэння насельніцтва Беларусі. З другога боку, мела месца поўнае неразуменне асаблівасцей гістарычнага і нацыянальнага развіцця краю. Палітыка расійскага ўрада спрыяла зараджэнню і актыўнаму праяўленню нацыянальнага руху ў Беларусі.

## § 3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх губерняў у 60-я гады XIX ст. – першыя гады XX ст.

**Характарыстыка землеўладання на Беларусі.** Рэформа 1861 г., праведзеная ў інтарэсах памешчыкаў, абумовіла ***“пpycкi” варыянт развіцця капіталізму*** ў сельскай гаспадарцы Расіі. У Беларусі яго рысы былі яшчэ больш выразныя. Тут пераважала памешчыцкае землеўладанне. Паводле даных 1877 г., памешчыкам належала 50,3 % зямлі, сялянам – 33,4, казне, царкве, розным установам – 11,2 %. Буржуазнае (бессаслоўнае) землеўладанне складала ўсяго 5,1 % ад агульнай зямельнай плошчы.

Памешчыцкае землеўладанне на тэрыторыі Беларусі мела выразны ***латыфундыяльны характар***. На долю латыфундый (больш за 500 дзесяцін на аднаго ўладальніка) у 1877 г. прыпадала 88,6 % памешчыцкай зямлі. Самыя буйныя памешчыкі ў Беларусі валодалі дзесяткамі і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі: графу Чарнышову-Круглікаву належала 74,5 тыс. дзесяцін, князю Паскевічу – 83,5 тыс., графу Патоцкаму – 121,6 тыс., князю Радзівілу – 150 тыс., а князю Вітгенштэйну – амаль 1 млн. дзесяцін. У той жа час больш як 60 % сялянскіх сем’яў у Беларусі атрымалі зямельныя надзелы менш за 15 дзесяцін, 32 % – ад 15 да 20 і толькі 8 % – звыш 20 дзесяцін. Сярэдні памер сялянскіх надзелаў у беларускіх губернях вагаўся ад 8 да 12 дзесяцін на двор. Такім чынам, на кожнага памешчыка ў сярэднім прыходзілася 1 097 дзесяцін зямлі, альбо ў 75 разоў больш, чым на сялянскі двор.

Пры тагачаснай культуры земляробства надзел да 15 дзесяцін не мог забяспечыць селяніну даход, дастатковы для ўтрымання сям’і з 6 – 7 чалавек, выплаты выкупных плацяжоў, дзяржаўных падаткаў і іншых збораў. Акрамя таго, памешчыкі захавалі за сабой так званыя ***сервітутныя землі*** (сенажаці,

выганы, выпасы, вадаёмы, лясныя ўгоддзі і інш.), без якіх сялянская гаспадарка не магла абысціся. Гэта вымушала сялян ісці ў кабалу да памешчыкаў: арандаваць у іх зямлю, сервітутныя ўгоддзі, браць натуральныя і грашовыя крэдыты. У пачатку XX ст. сяляне Беларусі арандавалі ў памешчыкаў 1/10 частку ворнай зямлі, каля 1/4 сенажацей і пашаў. Гэтая арэнда мела напаўпрыгонніцкі характар.

Малазямелле сялян узмацнялася ***цераспалосіцай***. Вельмі часта сялянскія надзелы размяшчаліся не ў адным месцы, а ў некалькіх, маглі знаходзіцца сярод памешчыцкіх угоддзяў. У заходніх губернях цераспалосіца была пашырана больш, чым ва ўнутраных раёнах Расіі. Яна затрымлівала ўвядзенне рацыянальнай сістэмы земляробства, інтэнсіфікацыю сялянскай гаспадаркі.

**Асаблівасці развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі.** Пераход да капіталістычнага земляробства ў Беларусі адбываўся паступова. На змену прыгонніцтву спачатку прыйшла ***змешаная сістэма гаспадаркі***, у якой перапляталіся феадальныя і капіталістычныя формы гаспадарання. Феадальныя рысы ў сельскай гаспадарцы праяўляліся ў выглядзе адпрацовак. ***Адпрацовачная сістэма*** была найбольш пашырана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. Яе сутнасць заключалася ў апрацоўцы памешчыцкай зямлі інвентаром сялян, якія атрымлівалі за гэта ад памешчыка зямельныя ўгоддзі ў арэнду. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях памешчыкі шырока выкарыстоўвалі ***працу наёмных рабочых*** (гадавых, тэрміновых, падзённых), якія апрацоўвалі зямлю інвентаром памешчыка. Гэта была ўжо капіталістычная форма гаспадарання. Аднак і тут адпрацоўкі займалі значнае месца.

Пасля рэформы 1861 г. сельская гаспадарка Беларусі ўсё шырэй уцягвалася ў рыначныя сувязі. Развіццё капіталізму ў Беларусі адбывалася пад непасрэдным уплывам агульнарасійскага рынку. У параўнанні з цэнтральнымі прамысловымі губернямі, значнай часткай Украіны, Польшчай і Прыбалтыкай Беларусь адставала ў прамысловым развіцці і заставалася галоўным чынам сельскагаспадарчым раёнам. Аднак па ўзроўні развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы яна ішла наперадзе многіх рэгіёнаў Расіі. Гэтаму спрыяла, у прыватнасці, геаграфічнае становішча Беларусі, праз тэрыторыю якой праходзілі стратэгічныя і гандлёвыя шляхі ў Польшчу, Прыбалтыку, Заходнюю Еўропу. Хутчэй складваліся капіталістычныя адносіны ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, дзе пераважала падворнае землекарыстанне. Гэтыя губерні знаходзіліся ў больш спрыяльным становішчы ў параўнанні з Віцебскай і Магілёўскай адносна рынку збыту сельскагаспадарчай прадукцыі.

У выніку малазямелля сялян таварная вытворчасць іх гаспадарак была вельмі нізкай, таму асноўнымі пастаўшчыкамі таварнай прадукцыі ў Беларусі былі памешчыкі. Шмат памешчыцкіх гаспадарак, асабліва на захадзе і ў цэнтры Беларусі, перайшлі на капіталістычны шлях развіцця, у іх адкрываліся вінакурныя, цагельныя, смалакурныя заводы, млыны, лесапільні. Разам з тым многія памешчыкі самі не вялі гаспадарку, а здавалі зямлю ў арэнду. Так, у 1887 г. у Беларусі ў арэнду здавалася 2,5 млн. дзесяцін дваранскай зямлі.

**Уплыў сусветнага аграрнага крызісу на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі Беларусі.** Аб развіцці капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў другой палове XIX ст. сведчыць паступовая ***спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці***. У першыя два дзесяцігоддзі пасля рэформы найважнейшай галіной земляробства заставалася вытворчасць збожжа. Аднак у выніку сусветнага аграрнага крызісу 1880 – 1890-х гг. цэны на яго рэзка панізіліся (толькі за 1880-я гг. больш як у 2 разы). Збожжавыя гаспадаркі Беларусі не былі здольны канкурыраваць на рынках Заходняй Еўропы з вытворцамі таннага і высокаякаснага хлеба з ЗША, Аргенціны, Аўстраліі. Гэта прымусіла беларускіх памешчыкаў пераходзіць на вытворчасць прадуктаў, што давалі большы прыбытак. Паступова ў Беларусі аформіліся пэўныя раёны, дзе пераважную ролю адыгрывала тая ці іншая галіна сельскагаспадарчай вытворчасці.

У 1890-я гг. галоўнай галіной у сельскай гаспадарцы Беларусі стала ***малочная жывёлагадоўля***. З 1883 да 1900 г. колькасць буйной рагатай жывёлы ў памешчыцкіх гаспадарках Беларусі вырасла амаль удвая. Лепш развіта была жывёлагадоўля ў Мінскай, Віленскай і Віцебскай губернях. У краі з'явіліся высокапрадукцыйныя пароды кароў (галандская, сіментальская, цірольская і інш.) і спецыяльныя фермы для іх гадоўлі. Многія памешчыкі адкрывалі ў сваіх маёнтках сыраварні і масларобчыя заводы. У канцы XIX ст. у Беларусі ўжо налічвалася не менш за 200 масларобчых і сыраварных заводаў, на якіх штогод выраблялася ад 500 да 650 тыс. пудоў масла і сыру. Дзякуючы высокаму попыту, малочныя прадукты мелі пастаянны збыт у Цэнтральнай Расіі, Польшчы, Прыбалтыцы.

Другім важным кірункам спецыялізацыі памешчыцкіх гаспадарак Беларусі было ***вінакурэнне***, якое мела гандлёвы характар. Ад продажу спірту памешчыкі атрымлівалі буйныя даходы. У 1905 г. у пяці беларускіх губернях налічвалася 536 вінакурных заводаў. Асноўнай сыравінай для вырабу спірту з'яўлялася бульба. Адходы ад вінакурэння – брага – выкарыстоўваліся на корм жывёле. Спецыялізацыя памешчыцкіх гаспадарак на малочнай жывёлагадоўлі і вінакурэнні суправаджалася значнымі зменамі ў структуры пасяўных плошчаў. Найбольш высокімі тэмпамі развівалася травасеянне. Плошчы пад кармавымі культурамі (канюшына, віка, сырадэля, цімафееўка і інш.) у 1880 – 1890-я гг. павялічыліся на тэрыторыі Беларусі ў 7 разоў.

З сярэдзіны 1860-х гг. у памешчыцкіх гаспадарках інтэнсіўна развівалася ***свінагадоўля***. У Мінскай і Гродзенскай губернях значнага развіцця дасягнула ***танкарунная авечкагадоўля***. Воўна з гэтых губерняў паступала як на мясцовыя суконныя фабрыкі, так і ў Польшчу, Германію і Аўстра-Венгрыю. Але пазней, з-за канкурэнцыі больш таннай воўны з паўднёвых раёнаў Расіі і Аўстраліі, авечкагадоўля ў Беларусі пачала прыходзіць у заняпад.

Яшчэ адным кірункам спецыялізацыі памешчыцкай гаспадаркі з'яўлялася ***вытворчасць тэхнічных культур***. Сярод іх першае месца займала бульба. Плошча пад яе пасевамі за 1881 – 1899 гг. узрасла ў 2,5 раза. Другое месца пасля бульбы ў памешчыцкіх гаспадарках Беларусі належала лёну. За апошнія

два дзесяцігоддзі XIX ст. плошча пад пасевы гэтай культуры павялічылася на 48,5 %. Вытворчасць лёну, асабліва ў Віцебскай губерні, мела пераважна гандлёвы характар. Значнае месца ў беларускіх губернях ў канцы XIX ст. займала прамысловае садоўніцтва і агародніцтва.

Капіталізацыя памешчыцкай гаспадаркі Беларусі выклікала неабходнасць выкарыстання машын. У сярэдзіне 1890-х гг. па распаўсюджанасці розных сельскагаспадарчых прылад працы Беларусь знаходзілася на другім месцы ў Расіі пасля Новарасійскага рэгіёна. Лепш былі забяспечаны машынамі памешчыцкія гаспадаркі Мінскай і Гродзенскай губерняў. Тут даволі шырока выкарыстоўвалі малатарні, веялкі, жняяркі, сеялкі. Менш іх было ў Магілёўскай і Віцебскай губернях. Але ў большасці памешчыцкіх гаспадарак Беларусі прымянялі ў асноўным адсталую ручную тэхніку.

**Фарміраванне аграрнай буржуазіі.** Да пачатку XX ст. перабудова сельскай гаспадаркі Беларусі на капіталістычны лад яшчэ не завяршылася. Адпрацовачная сістэма не была канчаткова адменена нават у перадавых гаспадарках, захоўваліся і іншыя перажыткі феадалізму. У дадатак да цяжкіх эканамічных умоў свайго існавання сяляне ў прававых адносінах заставаліся ніжэйшым саслоўем у дзяржаве. У адрозненне ад дваранства, духавенства і купецтва, яны плацілі дзяржаве падушны падатак, выкупныя плацяжы, пазямельны падатак, выконвалі фурманачную, дарожную, паліцэйскую павіннасці. Да іх прымяняліся цялесныя пакаранні.

З-за перавагі памешчыцкай зямельнай уласнасці ў Беларусі не склалася развітая сялянская заможная гаспадарка. У канцы XIX ст. сярод сялян было 61 % беднякоў, 28 % серадdespite, і толькі 11 % заможных. Працэс распаду дваранскай зямельнай уласнасці ў Беларусі ішоў значна марудней, чым у Цэнтральнай Расіі. За 1877 – 1905 гг. дваране ў беларускіх губернях страцілі толькі 10,8 % сваіх зямель, а ў Цэнтральнай Расіі – 27,2 %. У першую чаргу гэта з’яўлялася вынікам большай эканамічнай устойлівасці памешчыцкіх гаспадарак Беларусі, што было звязана са значным развіццём тут таварна-грашовых адносін.

Аднак пераход зямлі ад памешчыкаў да іншых саслоўяў на тэрыторыі Беларусі стрымліваўся і ўрадавай палітыкай. У заходніх губернях стымулявалася пашырэнне рускага землеўладання. За кошт казённых зямель і зямель, канфіскаваных у польскіх памешчыкаў за ўдзел у паўстанні 1863 – 1864 гг., быў створаны спецыяльны фонд для рускіх пасяленцаў. Адпаведную фінансавую палітыку праводзіў і Сялянскі банк, заснаваны ў 1882 г. Ён выдаваў сялянам доўгатэрміновыя крэдыты для куплі зямлі і садзейнічаў памешчыкам у выгадным продажы зямлі сялянам па завышаных цэнах. Пазыкі выдаваліся, як правіла, на 55 з паловай гадоў пры ўмове штогадовага пагашэння іх у памеры 6,5 % даўгавой сумы. Да 1890 г. сяляне ў пяці заходніх губернях набылі праз Сялянскі банк 984,3 тыс. дзесяцін зямлі. Аднак сялянам-католікам забаранялася купляць больш як 60 дзесяцін на аднаго чалавека, а памешчыкі каталіцкага веравызнання не мелі права набываць зямлю, акрамя як у спадчыну. Яўрэі

наогул былі пазбаўлены права купляць зямлю па-за межамі гарадоў і мястэчак. Такім чынам, феадальныя перажыткі і ўрадавая палітыка стрымлівалі развіццё капіталістычнага бессаслоўнага землеўладання, якое нават у пачатку XX ст. у Беларусі ахоплівала толькі 16,5 % ад агульнай зямельнай плошчы.

**Асаблівасці пераходу ад ручной да машыннай вытворчасці ў прамысловасці Беларусі.** Прамысловы пераварот у асноўных галінах прамысловасці Расіі завяршыўся ў пачатку 1880-х гг. Прамысловасць Беларусі пасля рэформы 1861 г. развівалася ў цеснай сувязі з агульнарасійскай, але мела і свае асаблівасці. Характэрнай рысай прамысловага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст. разам з адносна хуткім ростам фабрычнай індустрыі было пашырэнне дробнай вытворчасці і мануфактур, пераважна невялікіх фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў.

У 1860-я гады ў прамысловасці Беларусі пераважалі дробныя рамесныя прадпрыемствы і мануфактуры. ***Рамесныя*** прадпрыемствы былі заснаваны на ручной працы. Перш за ўсё гэта былі промыслы па перапрацоўцы мясцовай сыравіны: дрэва (сталярны), гліны (ганчарны), скуры (кушнерскі, шавецкі), воўны і лёну (ткацкі). Рамесная вытворчасць канцэнтравалася ў гарадах і шматлікіх мястэчках. Да канца стагоддзя назіраўся рост колькасці дробных рамесных прадпрыемстваў, павялічваўся аб'ём іх прадукцыі. У канцы 1890-х гг. ён складаў 37,8 % ад ўсей прамысловасці Беларусі.

Пасля рэформы 1861 г. паскорыўся рост ***мануфактурнай*** вытворчасці. Тут выкарыстоўвалася ручная праца, але існаваў яе падзел па спецыяльнасцях. Мануфактуры ўзнікалі з сялянскіх промыслаў і гарадскога рамяства. У канцы XIX ст. мануфактуры пераважалі ў гарбарнай, ганчарнай, цагельнай, суконнай, шкляной і тытунёвай вытворчасці і давалі 15,4 % валавой прамысловай прадукцыі Беларусі.

Нягледзячы на вялікую долю рамеснай і мануфактурнай вытворчасці, на працягу другой паловы XIX ст. у прамысловасці Беларусі ішоў ***працэс пераходу ад ручной працы да машыннай***. Рамяство і мануфактуру паступова выцясняла ***капіталістычная фабрыка***. Калі ў 1860 г. у Беларусі дзейнічалі толькі 76 фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, то ў 1900 г. іх было ўжо 1137. У канцы XIX ст. фабрычна-заводская прамысловасць давала 46,8 % валавога прадукту.

Беларусь значна адставала ад Расіі па ***ўзроўні канцэнтрацыі вытворчасці***. Дробныя прадпрыемствы (да 50 рабочых) складалі ў Беларусі 85,5 % усіх фабрык і заводаў. Калі прадпрыемствы, якія мелі больш за 500 рабочых, у расійскай прамысловасці складалі 3,5 %, то ў беларускай – толькі 1,2 %. Сярэдні памер прадпрыемстваў Беларусі быў у 2,3 раза меншы, чым увогуле па Расіі.

Прамысловасць Беларусі пасля рэформы 1861 г. ***развівалася нераўнамерна***. Калі ў першыя два дзесяцігоддзі ўдзельная вага ўсіх прадпрыемстваў Беларусі, якія ўзніклі ў гэты час, складала 18,5 %, а ў Расіі – 23,4 %, то ў 1880 – 1890-я гг. на тэрыторыі Беларусі было ўведзена ў дзеянне

фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў у 4 разы больш, чым за папярэднія 20 гадоў (у Расіі толькі ў 2,6 раза).

**Галіновая структура прамысловасці Беларусі.** У Беларусі з-за адсутнасці неабходнай сыравіны вельмі марудна развівалася цяжкая прамысловасць. Пераважнае значэнне тут атрымалі галіны вытворчасці, звязаныя з перапрацоўкай мясцовай сыравіны. Сярод іх вядучая роля належала вінакурэнню і лясной прамысловасці.

Беларусь была адным з галоўных раёнаў вінакурэння ў Расіі. Тут у 1890 г. дзейнічала 18 % усіх вінакурных заводаў краіны. У 1900 г. на вінакурных заводах Беларусі працавала 470 паравых рухавікоў, валавая прадукцыя складала 23,5 % ад усёй прадукцыі беларускай прамысловасці.

Адно з важных месц у прамысловасці Беларусі займалі прадпрыемствы па перапрацоўцы драўніны – асноўнага багацця краю. Асаблівае значэнне адыгрывалі лесапільныя заводы. Лесапільная прамысловасць стаяла на другім месцы пасля вінакурэння, аднак у ёй пераважалі дробныя прадпрыемствы, на якіх працавала да 20 чалавек. Фабрычна-заводскія прадпрыемствы занялі ў галіне пануючае становішча толькі ў 1890-я гг.

Значнае развіццё ў беларускіх губернях атрымалі запалкавая і папярова-кардонная вытворчасць. Напрыклад, у Мінскай губерні ў 1900 г. дзейнічалі чатыры запалкавыя фабрыкі: Барысаўская (759 рабочых), Мазырская (616), Пінская (590) і Койданаўская (208 рабочых). Па колькасці працуючых на іх рабочых гэтыя фабрыкі былі найбуйнейшыя ў губерні. Папярова-кардонная прамысловасць Беларусі была сканцэнтравана галоўным чынам у Магілёўскай і Віцебскай губернях. Сярод папяровых фабрык найбуйнейшай з’яўлялася Добрушская (900 рабочых і гадавая сума вытворчасці 1,6 млн. рублёў). Да таго ж яна была абсталявана навейшымі па тым часе машынамі. У Гродзенскай губерні пераважалі гільзавыя і пераплётныя прадпрыемствы. Найбольш буйнымі з іх былі гільзавыя фабрыкі ў Брэсце.

Вельмі шмат на тэрыторыі Беларусі было прадпрыемстваў, звязаных з ***перапрацоўкай сельскагаспадарчай сыравіны***: мукамольна-крупяных, крухмальна-патачных, маслабойных, піваварных, тэкстыльных, ільно- і пенькаапрацоўчых, гарбарных. Асноўная колькасць крухмальна-патачных і маслабойных прадпрыемстваў краю ў канцы XIX ст. заставалася на стадыі дробнатаварнай вытворчасці і мануфактуры. Але ў мукамольна-крупяной прамысловасці ў 1900 г. 93,1 % усіх прадпрыемстваў складалі фабрыкі.

Колькасць тэкстыльных фабрык у канцы XIX ст. дасягнула 24, на іх было занята звыш 1 800 рабочых. Найбольш значнымі ў гэтай галіне прамысловасці былі льнопрадзільная фабрыка “Дзвіна” у Віцебску і суконная фабрыка ў маёнтку Парэчча Пінскага павета.

Гарбарная вытворчасць была прадстаўлена дробнымі прадпрыемствамі, на якіх ужывалася ручная праца. Параўнальна буйныя гарбарныя прадпрыемствы ў Беларусі пачалі ўзнікаць з 1880-х гг. Найбуйнейшым цэнтрам гарбарнай вытворчасці з’яўлялася Смаргонь. У 1900 г. тут працавалі некалькі буйных

заводаў і да 50 мануфактур. У працэсе вытворчасці на буйнейшых прадпрыемствах выкарыстоўваліся ўдасканаленыя прыёмы апрацоўкі сыравіны, якая дастаўлялася з усіх канцоў Расіі. У Смаргонь, напрыклад, сыравіна прывозілася з Растова.

Значнае развіццё атрымала тытунёвая прамысловасць, якая таксама працавала на прывазной сыравіне. Найбуйнейшай з’яўлялася тытунёвая фабрыка Шарашэўскага ў Гродне, заснаваная ў 1862 г. У 1900 г. на ёй працавала 1 445 рабочых, а аб’ём прадукцыі складаў 2,4 млн. руб. Тытунёвае лісце завозілася галоўным чынам з поўдня Расіі, часткова з-за мяжы, а прадукцыя збывалася па ўсёй Расіі, а таксама ў Польшчы.

У другой палове XIX ст. хуткі рост гарадоў і развіццё прамысловага будаўніцтва выклікалі патрэбу ў вялікай колькасці будаўнічых матэрыялаў. У Беларусі атрымала развіццё, у першую чаргу, вытворчасць цэглы. Сярод буйных прадпрыемстваў гэтай галіны вызначаліся цагельныя заводы ў маёнтку Івацэвічы Слонімскага павета (200 рабочых) і ў маёнтку Храповішчы (203 рабочыя), у Бабруйску (156 рабочых) і Мінску (74 рабочыя). Існавалі таксама прадпрыемствы па вытворчасці кафлі (некалькі кафляных заводаў у Копысі) і шклозаводы. Найбольш буйным са шклозаводаў быў крыштальны завод “Нёман” у Лідскім павеце Віленскай губерні, які пачаў выпускаць сваю прадукцыю ў 1875 г.

Металаапрацоўчая прамысловасць Беларусі з-за адсутнасці дастатковай колькасці мясцовай сыравіны развівалася запаволена. Заводы, якія выкарыстоўвалі мясцовую балотную руду, у канцы 1870-х гг. зачыніліся. Яны былі эканамічна нявыгаднымі і не маглі канкурыраваць з металургічнымі заводамі Польшчы і Расіі. У 1880-я гг. у Беларусі дзейнічалі сярэднія па велічыні металаапрацоўчыя прадпрыемствы: завод землеробчых прылад у Ракаве, які вырабляў малатарні, веялкі, бароны, плугі, запашнікі; чыгуналіцейны завод у Мінску, на якім выраблялі сельскагаспадарчыя прылады, абсталяванне для вінакурных, лесапільных, гарбарных, шкляных заводаў. У 1897 г. у Мінску былі заснаваны яшчэ два прадпрыемствы гэтай галіны, якія выпускалі паравыя катлы, турбіны, маслабойкі і інш.

З будаўніцтвам чыгунак на тэрыторыі Беларусі пачалі працаваць майстэрні па рамонце рухомага саставу. Гэта былі буйныя капіталістычныя прадпрыемствы, абсталяваныя сучаснай тэхнікай. У 1900 г. дзейнічалі ўжо 19 такіх майстэрань. Аднак удзельная вага металаапрацоўчых прадпрыемстваў ва ўсёй прамысловасці Беларусі ў 1890-я гг. не перавышала 3 %.

**Вынікі прамысловага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст.** Прамысловасць Беларусі ў другой палове XIX ст. дасягнула таго ж узроўню развіцця, што і ў іншых аграрных раёнах Расіі, але значна адставала ад асноўных індустрыяльных цэнтраў. Галоўнымі прычынамі гэтага былі адсутнасць прамысловых запасаў карысных выкапняў і рэшткі прыгонніцтва, якія стрымлівалі развіццё капіталістычных адносін.

Беларусь знаходзілася ў непасрэднай блізкасці да Цэнтральнага, Пецярбургскага, Прыбалтыйскага і Польскага прамысловых раёнаў, у якіх буйная прамысловасць склалася раней, чым у Беларусі. Таму ў апошняй атрымалі развіццё галіны прамысловасці, заснаваныя на перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, лясной і мясцовай мінеральнай сыравіны, а таксама рамесна-саматужная вытворчасць, што абслугоўвала побытавыя патрэбы насельніцтва. У сістэме агульнарасійскага капіталізму Беларусь уяўляла рэгіён з высокаразвітой лёгкай прамысловасцю.

**Будаўніцтва чыгунак. Водны транспарт.** Значнаму паскарэнню тэмпаў развіцця прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. спрыяла ***стварэнне густой сеткі чыгуначных дарог***. Першай праз тэрыторыю Беларусі прайшла ў 1862 г. ***Пецярбургска-Варшаўская чыгунка*** (праз Гродна). У 1866 г. пачала дзейнічаць ***Рыга-Арлоўская чыгунка*** (Дзвінск – Полацк – Віцебск), у 1871 г. – ***Маскоўска-Брэсцкая*** (Смаленск – Орша – Баранавічы – Брэст), у 1871 – 1874 гг. – ***Лібава-Роменская*** (Вільня – Маладзечна – Мінск – Асіповічы – Бабруйск – Жлобін). У 1880-я гг. былі пабудаваны ***Палескія чыгункі*** (Вільня – Баранавічы – Лунінец, Гомель – Лунінец – Пінск – Жабінка, Баранавічы – Слонім – Ваўкавыск – Беласток). У 1902 г. адкрылася ***Пецярбургска-Адэская магістраль*** (Віцебск – Орша – Магілёў – Жлобін). Увогуле даўжыня чыгуначнай сеткі ў Беларусі з 1867 г. да 1904 г. вырасла ў 12 разоў. Чыгункі звязалі Беларусь з галоўнымі індустрыяльнымі цэнтрамі Расійскай імперыі – Пецярбургам, Масквой, Кіевам, Варшавай, прыбалтыйскімі партамі.

Важную ролю ў эканоміцы Беларусі адыгрываў рачны транспарт. Водныя шляхі праходзілі па Прыпяці, Бярэзіне, Сожы. Водны транспарт у 1900 г. налічваў 310 непаравых і 23 паравыя судны.

**Гандлёвыя сувязі.** Будаўніцтва чыгунак паскорыла развіццё ўнутранага і знешняга гандлю. Хутка рос вываз як на рускі, так і на замежны рынак прадукцыі сельскагаспадарчай вытворчасці – масла, хлеба, яек, сыру, мяса птушкі, садавіны, прычым значна зменшыўся вываз жывой жывёлы і рэзка павялічыўся вываз жывёлы ў перапрацаваным выглядзе. Спірт вывозіўся ў Пецярбург, Маскву, Цвер, Кіеў, Растоў-на-Доне, Адэсу, Крамянчуг, а таксама за мяжу.

За мяжу вывозіліся і тавары лесаперапрацоўчай, шкляной, керамічнай і іншых галін прамысловасці. Галоўнымі экспартнымі таварамі ў Беларусі былі лес і лён. На долю Беларусі, напрыклад, прыходзілася 54,1 % агульнарасійскага экспарту лесу ў Германію. Прадукцыя запалкавых фабрык вывозілася ў Ромны, Харкаў, Баку, Кішынёў, Уладзікаўказ, Варшаву; папера і кардон – у Кіеў, Екацярынаслаў, Харкаў, Вязьму, Беласток, Рыгу. Вырабы шкляной і керамічнай прамысловасці збываліся ў Маскву, Кіеў, Адэсу.

З развіццём транспарту ў Беларусі хутка памяншалася роля кірмашовага гандлю, усё большае значэнне набываў крамны і магазінны гандаль. Гэта сведчыла аб тым, што рыначныя сувязі беларускіх гарадоў і вёсак, а таксама

Беларусі з іншымі часткамі краіны станавіліся ўсё больш рэгулярнымі і трывалымі.

**Фарміраванне нацыянальнага рынку.** У канцы XIX ст. у Беларусі ўжо склаліся мясцовыя (абласныя) рынкі, якія былі цесна звязаны паміж сабой. У той жа час наладжваліся сувязі з усерасійскім рынкам. Асаблівасцю ўтварэння нацыянальнага рынку на тэрыторыі Беларусі з'яўлялася тое, што тут эканамічная агульнасць не ўмацоўвалася дзяржаўным аб'яднаннем у рамках этнічнай тэрыторыі. Цэнтрамі абласных рынкаў у канцы XIX ст. сталі найбольш буйныя гарады: Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Гродна, Брэст і Пінск. Характар гандлёвых сувязей унутры мясцовых рынкаў вызначаўся асаблівасцямі эканамічнага развіцця кожнага з раёнаў.

Галоўным гандлёва-прамысловым цэнтрам Беларусі ў гэты час стаў Мінск. Ён знаходзіўся ў прамых ці ўскосных сувязях з усёй тэрыторыяй краю. На мінскім рынку гандлявалі вырабамі шкляной вытворчасці, паперай, кардонам, сельскагаспадарчымі машынамі. Сюды прывозілі шмат прамыслова-мануфактурных тавараў з Маскоўскага, Пецярбургскага раёнаў, Польшчы. Мінск як зборны і размеркавальны пункт абслугоўваў большую частку раёнаў Палесся, многія раёны поўначы і захаду Беларусі. З прадуктаў сельскай гаспадаркі на мінскім рынку пераважалі збожжа, малочныя прадукты, мяса, рыба.

Буйным гандлёвым цэнтрам з'яўляўся Гомель, які абслугоўваў таксама суседнія паветы Магілёўскай, Мінскай і Чарнігаўскай губерняў. Прамысловыя тавары, што выраблялiся ў Гомельскім раёне, – папера, запалкі, цэгла, кафля, аконнае шкло, вяроўкі, канаты і інш. – вывозіліся і за межы Беларусі. Гомель быў размеркавальным пунктам для лясных матэрыялаў і дроў, якія сплаўляліся ў сярэдняе і ніжняе Падняпроўе, галоўным чынам у Адэсу, Екацярынаслаўскую, Кіеўскую і іншыя губерні.

Частка грузаў з Гомеля вывозілася па чыгунцы на поўнач і ўсход, у Рыгу, Пецярбург, Лібаву. У Гомель жа лясныя матэрыялы дастаўляліся з Рэчыцкага, Рагачоўскага, Мазырскага і іншых паветаў. З сельскагаспадарчых прадуктаў, якія траплялі на гомельскі рынак, пераважала ўкраінскае збожжа.

Для Магілёўскага эканамічнага раёна найбольш характэрным з'яўляўся гандаль ляснымі і сельскагаспадарчымі прадуктамі. Магілёў знаходзіўся ў цеснай сувязі з сярэднім і ніжнім Падняпроўем, а таксама з Оршай, праз якую ішлі тавары ў Мінскую і Смаленскую губерні. З Оршы адпраўляліся галоўным чынам лясныя грузы, збожжа, пянька, макуха, вотруб'е, яблыкі і іншыя тавары. Прывозілі на аршанскі рынак хлебныя прадукты, соль, газу, нафту, будаўнічыя матэрыялы.

Значная частка Магілёўскай губерні мела сувязі з Віцебскім эканамічным раёнам. Галоўнымі прадуктамі вывазу адсюль былі лес і прадукты льнаводства, якія ў асноўным вывозіліся за мяжу. Лясныя грузы сплаўляліся па Заходняй Дзвіне ў Рыгу, а з Украіны прывозіліся пшанічная мука і цукар.

Важнае месца ў гандлёвых сувязях Беларусі займаў горад Гродна. Праз яго ажыццяўляўся гандаль з Польшчай, Літвой і замежнымі краінамі. Гродзенскі рынак быў цесна звязаны з Ваўкавыскім рэгіёнам, Мінскам, Вільняй, Масквой, Пецярбургам. Галоўнымі прадметамі збыту з Гродзенскага раёна былі лясныя грузы, жытняя мука, вотруб’е, спірт, малочныя прадукты, бульбяная мука.

Сярод гандлёвых цэнтраў Беларусі асабліва вылучаўся Пінск. Ён служыў размеркавальным цэнтрам збыту прамысловых тавараў і лясных грузаў, якія перавозіліся з басейнаў Дняпра і Прыпяці ў сістэмы Нёмана і Віслы.

Развіццё капіталізму прыводзіла да зліцця мясцовых рынкаў Беларусі ў адзіны нацыянальны рынак. Адначасова ўнутраны рынак Беларусі з’яўляўся складовай часткай усерасійскага рынку. У беларускім гандлі пераважаў вываз сельскагаспадарчай сыравіны і лясных матэрыялаў. У той жа час беларускія губерні служылі рынкам збыту прамысловых тавараў і збожжа, якія ўвозіліся з іншых раёнаў Расіі. Напрыклад, на тэрыторыю Беларусі ўвозіліся вырабы з жалеза, жалезныя і стальныя загатоўкі, якія перапрацоўваліся на мясцовых заводах.

**Развіццё фінансава-крэдытнай сістэмы.** Канцэнтрацыя вытворчасці абумовіла стварэнне ў Беларусі акцыянерных кампаній. У канцы XIX ст. у Беларусі дзейнічала каля 10 ***акцыянерных таварыстваў***, якім належалі буйныя прадпрыемствы. Так, з 1877 г. пачало дзейнічаць “Гродзенскае таварыства водазабеспячэння і эксплуатацыі водаправодаў”, у 1895 г. – “Таварыства віцебскіх водаправодаў”, у 1898 г. – бельгійскае акцыянернае таварыства “Віцебскі трамвай”.

Разам з канцэнтрацыяй вытворчасці адбывалася цэнтралізацыя капіталу. У эканамічным жыцці Беларусі, асабліва ў апошняй трэці XIX ст., значную ролю пачалі адыгрываць ***банкі***. Вядучае месца сярод крэдытных устаноў займаў ***Мінскі камерцыйны банк***, заснаваны ў 1873 г. У шэрагу гарадоў дзейнічалі аддзяленні найбуйнейшых расійскіх банкаў. У Беларусі было пяць аддзяленняў Дзяржаўнага банка. З 1871 г. свае філіялы ў Мінску, Магілёве, Пінску меў Азова-Данскі камерцыйны банк. У Мінску ў 1890-я гг. дзейнічала аддзяленне Пецярбургска-Азоўскага банка. Віленскі прыватна-камерцыйны банк і камерцыйны банк у Беластоку мелі свае філіялы ў Бабруйску, Гомелі і Слоніме. У Бабруйску, Гомелі і Брэсце былі адкрыты філіялы Арлоўскага камерцыйнага банка.

У выніку дзейнасці банкаў назапашваліся значныя капіталы, якія ўкладваліся пераважна ў сферу гандлю. Банкаўскія сродкі накіроўваліся таксама ў прамысловасць па першаснай апрацоўцы лесу і лёну. Істотную ролю ў вывазе за мяжу гэтых тавараў адыгрываў германскі капітал, які актыўна ўкладваўся ў большасць леса- і льногандлёвых фірм.

Увогуле ў пачатку XX ст. узмацнілася пранікненне ў эканоміку Беларусі замежнага капіталу. Гэта спрыяла павелічэнню колькасці прамысловых прадпрыемстваў, якія належалі акцыянерным таварыствам, і пашырэнню дзейнасці банкаў. Так, у Віцебску дзейнічаў ***сіндыкат*** гаспадароў цагельных

заводаў, у Оршы – піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю. Аднак узровень манапалізацыі прамысловасці Беларусі быў ніжэйшы, чым ў індустрыяльна развітых раёнах Расіі.

**Урбанізацыя.** Развіццё прамысловасці і чыгуначнай сеткі садзейнічалі росту гарадоў. У 1897 г. у гарадах Беларусі пражывала 648 тыс. чалавек, або 9,8 % ад усяго насельніцтва беларускіх губерняў. Па тэмпах росту гарадскога насельніцтва беларускія гарады адставалі ад гарадоў Еўрапейскай часткі Расіі. Прычынамі былі адносна слабае развіццё прамысловасці і штучная канцэнтрацыя ў гарадах Беларусі яўрэйскага насельніцтва, якое стварала значны рэзерв рабочай сілы. Перанаселенасць беларускіх гарадоў стрымлівала прыток у іх як пралетарызаванага, так і буржуазнага сельскага насельніцтва. Тым не менш насельніцтва гарадоў Беларусі павялічвалася. Значнымі цэнтрамі фабрычна-заводскай прамысловасці сталі Мінск, Пінск, Гродна, Магілёў, Віцебск, Гомель, Бабруйск. У многіх з іх у канцы XIX – пачатку XX ст. буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі сталі чыгуначныя майстэрні і дэпо. У канцы XIX ст. найбольш буйнымі гарадамі краю былі Мінск (90,9 тыс. жыхароў) і Віцебск (65,9 тыс. жыхароў), насельніцтва астатніх гарадоў складала менш за 50 тыс. чалавек.

У гарадах Беларусі выраблялася толькі каля 31 % прамысловай прадукцыі. Пераважная колькасць прадпрыемстваў размяшчалася ў мястэчках і маёнтках. Некаторыя мястэчкіператварыліся ў прыкметныя прамысловыя цэнтры рэгіянальнага значэння (Смаргонь, Дуброўна і інш.). У канцы XIX ст. у мястэчках Беларусі было 679 тыс. жыхароў.

## § 4. Беларусь напярэдадні першай сусветнай вайны. Сталыпінскія рэформы

**Асаблівасці прамысловага развіцця Беларусі на манапалістычнай стадыі капіталізму.** На мяжы XIX – XX стст. расійскі капіталізм уступіў у новую стадыю свайго развіцця – ***імперыялістычную***.

Прамысловасць Беларусі працягвала развівацца на базе інтэнсіўнага выкарыстання лясных багаццяў краю і перапрацоўкі мясцовай сельскагаспадарчай сыравіны. Эканамічны крызіс 1900 – 1903 гг. паскорыў стварэнне ў Беларусі ***манапалістычных аб’яднанняў*** з удзелам мясцовага, расійскага і замежнага капіталу, якія паступова выцяснялі дробную вытворчасць.

Акцыянерным таварыствам належалі такія буйныя прадпрыемствы Беларусі, як Віцебская ільнопрадзільная фабрыка “Дзвіна” (Руска-Бельгійскае акцыянернае таварыства), трамвай і электрычная станцыя ў Віцебску (Бельгійскае акцыянернае таварыства), Шклоўская папяровая фабрыка (Рускае акцыянернае таварыства карданажна-папяровай вытворчасці). У гэты час былі створаны і мясцовыя манапалістычныя аб’яднанні: акцыянерныя таварыствы тытунёвай фабрыкі “Нёман” (былая фабрыка Шарашэўскага) у Гродне, запалкавых фабрык “Прагрэс-Вулкан” у Пінску і “Маланка” у Мазыры.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Беларусі існавалі 34 акцыянерныя таварыствы. Але па ўзроўні манапалізацыі і канцэнтрацыі прамысловасці Беларусь значна адставала ад агульнарасійскіх паказчыкаў. Тут па-ранейшаму вялікую ролю працягвалі адыгрываць дробныя рамесныя прадпрыемствы, якія ў 1913 г. давалі 50 % валавой прадукцыі прамысловасці.

У 1900 – 1913 гг. у эканоміцы Беларусі значна ўзрасла ***роля банкаў***. Акрамя губернскіх аддзяленняў цэнтральных расійскіх банкаў (Дзяржаўнага, Сялянскага і Дваранскага) у краі дзейнічала шмат камерцыйных банкаў: Мінскі, Магілёўскі, а таксама губернскія і павятовыя аддзяленні Руска-Азіяцкага, Азова-Данскога, Руска-Французскага, Віленскага, Беластоцкага банкаў.

Дзяржаўны банк, абапіраючыся галоўным чынам на бюджэтныя і эмісійныя рэсурсы, праз губернскія аддзяленні абслугоўваў у Беларусі ў асноўным буйны гандаль і больш дробныя крэдытныя ўстановы. Камерцыйныя банкі, як правіла, не ўкладвалі свае капіталы непасрэдна ў прамысловасць. Яны выдавалі крэдыты пад кароткатэрміновыя вэксалі прыватных банкірскіх кантор, якім належалі прамысловыя прадпрыемствы. Менавіта банкірскія канторы ўкладвалі атрыманыя сродкі ў прамысловасць і гандаль.

З развіццём транспарту ў Беларусі хутка памяншалася роля кірмашовага гандлю, усё большае значэнне набываў ***крамны*** і ***магазінны гандаль***. За 1900 – 1913 гг. рознічны тавараабарот павялічыўся на 72 %. Рыначныя сувязі беларускіх гарадоў і вёсак рабіліся ўсё больш рэгулярнымі і трывалымі. У рознічным тавараабароце пераважаў прыватнакапіталістычны гандаль, які ў 1913 г. складаў 78,9 %.

У выніку развіцця прамысловасці, транспарту, гандлю ў Беларусі паскорыўся ***рост гарадоў***, якія ператвараліся ў фабрычна-заводскія і гандлёвыя цэнтры. За паўстагоддзе (1863 – 1913 гг.) колькасць гарадскіх жыхароў Беларусі павялічылася ў 2,8 раза (з 350,8 да 983,3 тыс. чалавек). Прычым найбольшая частка гараджан (у 1913 г. – 54,8 %) канцэнтравалася ў буйных гарадах, якія налічвалі больш за 40 тыс. чалавек. У 1913 г. самым буйным гарадам быў Мінск, другім па значэнні – Віцебск, трэцім – Гродна, потым ішлі Пінск, Гомель, Магілёў, Бабруйск, Барысаў, Рэчыца.

Уваходжанне тэрыторыі Беларусі ў “мяжу яўрэйскай аседласці” прывяло да таго, што па сваім нацыянальным складзе гарады Беларусі не былі беларускімі. Па дадзеных перапісу 1897 г., большую частку гараджан Беларусі складалі яўрэі – 53,5 %, каля 18 % – рускія, а ўдзельная вага беларусаў не перавышала 17 %.

Развіццё капіталізму ў Беларусі прывяло да змен у сацыяльным складзе насельніцтва. Адбываўся паступовы пераход ад падзелу грамадства на шматлікія саслоўі, што было характэрна для эпохі феадалізму, да класавай структуры буржуазнага грамадства, у якім вядучая роля належала ***пралетарыяту*** і ***буржуазіі***. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і нацыянальныя асаблівасці Беларусі накладвалі на гэты працэс свой адбітак.

Гандлёва-прамысловая буржуазія фарміравалася з асяроддзя памешчыкаў, купцоў, мяшчан, заможных рамеснікаў. У яе нацыянальным складзе пераважалі яўрэі – 84,5 %, рускіх было 10,7 %, а беларусаў – толькі 1,7 %. Беларускай па нацыянальнасці была толькі аграрная буржуазія. Клас наёмных рабочых складваўся са збяднелых сялян, рамеснікаў, мяшчан, дробных гандляроў. Беларусаў тут было 17 %, рускіх – 10 %, палякаў – 10,2 % і яўрэяў – 60 %. Рускія пераважалі на чыгуначным транспарце і ў чыгуначных майстэрнях, беларусы – на рамонце чыгуначных і шашэйных дарог, на прамысловых прадпрыемствах у сельскай мясцовасці. Яўрэі складалі асноўную масу рабочых у дробнай і рамеснай вытворчасці.

**Паступовая капіталізацыя аграрных адносін у беларускай вёсцы.** Да пачатку XX ст. перабудова сельскай гаспадаркі Беларусі на капіталістычны лад яшчэ не завяршылася. У першае дзесяцігоддзе XX ст. Беларусь па-ранейшаму заставалася адным з аграрных рэгіёнаў Расіі. У 1913 г. яе сельская гаспадарка давала 56,9 % нацыянальнага даходу, а прамысловасць – толькі 15 %. Пад уплывам попыту рынку сельская гаспадарка Беларусі ўсё больш уцягвалася ў гандлёва-эканамічныя адносіны, больш выразна праяўлялася яе спецыялізацыя на вытворчасці малака, малочнай прадукцыі і мяса. Хутка пашыраліся плошчы пад тэхнічныя і кармавыя культуры, асабліва бульбу і травы. Адбываўся пераход ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы земляробства. Да 1913 г. істотна пашырылася выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі (малатарняў, веялак, сеялак, жняярак, сенакасілак) у памешчыцкіх гаспадарках і ў заможных сялян. У Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях значную ролю ў павышэнні культуры земляробства і жывёлагадоўлі адыгрывалі ўведзеныя ў 1911 г. земствы. Яны арганізоўвалі агранамічныя, зоатэхнічныя і ветэрынарныя службы, садзейнічалі продажу і пракату сельскагаспадарчай тэхнікі.

У пачатку XX ст. паскорыўся працэс распаду феадальнай і фарміраванне буржуазнай зямельнай уласнасці. Да 1914 г. дваранскае землеўладанне ў беларускіх губернях зменшылася на 12,7 %, пры гэтым 2/3 памешчыцкіх зямель былі закладзены ў банках. Зямлю інтэнсіўна прадавалі дваране, чыноўнікі, афіцэры, а куплялі пераважна заможныя сяляне, купцы, мяшчане.

**Сталыпінская аграрная рэформа.** Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. паказала асаблівую вастрыню ў Расіі аграрнага пытання і, як вынік, адсутнасць дастатковай сацыяльнай падтрымкі самадзяржаўя з боку сялянства. Вырашыць гэтыя праблемы павінна была ***сталыпінская аграрная рэформа*** (П.А. Сталыпін – старшыня Савета Міністраў, міністр унутраных спраў: загінуў у 1911 г.). Яна мела на мэце разбурэнне сялянскай абшчыны і стварэнне ў вёсцы шырокай праслойкі эканамічна самастойных заможных сялян.

У адпаведнасці з указам ад ***9 лістапада 1906 г.*** кожны селянін мог выйсці з абшчыны і атрымаць зямлю, якой карыстаўся, у асабістую ўласнасць, прычым на адным участку, на ***хутары***. Такім чынам знішчалася сялянская абшчына і абшчыннае землеўладанне, разбураліся населеныя пункты (вёскі), а разам з імі

традыцыйны лад жыцця сельскіх жыхароў і калектывісцкая традыцыя ўсходнеславянскай вёскі.

Замацаваўшы былую абшчынную зямлю ў прыватную ўласнасць, селянін мог атрымаць яе ў адным месцы, на адным полі ў выглядзе ***водруба***. У гэтым выпадку сядзібныя і гаспадарчыя пабудовы неабавязкова было пераносіць у поле, на месца знаходжання водруба. Можна было працягваць жыць у вёсцы. Але тут узнікалі цяжкасці, звязаныя з якасцю зямлі водруба, яго аддаленасцю ад вёскі, адсутнасцю дарогі для пад’езду да водруба і інш.

Матэрыяльнай і фінансавай падтрымкі з боку дзяржавы пры перасяленні на хутары і пры карыстанні зямлёй у выглядзе адрубоў сялянства не атрымлівала. Нязначныя сродкі, выдзеленыя на гэтыя мэты, былі раскрадзены чыноўніцтвам. Хутарызацыя ажыццяўлялася за кошт саміх збяднелых сялян.

У сувязі з гэтым вялікай актыўнасці ў перасяленні на хутары сялянства Беларусі не праяўляла. У 1907 – 1914 гг. у пяці заходніх губернях толькі 12 % ад усіх сялянскіх двароў стварылі хутарскія і адрубныя гаспадаркі. Астатнія сялянскія двары праігнаравалі сталыпінскую хутарызацыю.

Ахвотна выходзілі з абшчыны сяляне-беднякі, якія з-за немагчымасці весці гаспадарку прадавалі свой надзел і пераходзілі ў стан батракоў ці перасяляліся ў гарады. З 1907 да 1914 г. у беларускіх губернях прадалі зямлю 35,8 % усіх хутарскіх і адрубных двароў. Сяляне-беднякі ператвараліся ў сельскагаспадарчых рабочых, пралетарыяў.

З другога боку, ахвотна высяляліся на хутары заможныя сяляне. Яны куплялі за бясцэнак зямлю беднякоў, а таксама землі памешчыкаў, чыноўнікаў і афіцэраў, павялічвалі памеры сваіх гаспадарак і ператвараліся ў сельскую буржуазію. Калі да рэформы сяляне, у валоданні якіх было ад 15 да 25 дзесяцін зямлі, складалі толькі 8,1 %, то ў выніку рэформы іх колькасць павялічылася да 37,3 %.

Сталыпінская аграрная рэформа ўключала ў сябе таксама ***перасяленне сялян з еўрапейскай часткі Расіі***, дзе зямлі не хапала, у Сібір і на Далёкі Усход, Паўночны Каўказ і Сярэднюю Азію. З 1907 па 1914 г. з Беларусі перасяліліся 335 тыс. бедных сялян. Але дапамога ўрада перасяленцам была нязначнай, і многія з іх (каля 11 %) вярнуліся канчаткова збяднелымі.

Адначасова ў заходніх губернях стымулявалася ***пашырэнне рускага землеўладання***. За кошт казённых зямель быў створаны спецыяльны фонд для рускіх пасяленцаў. Важным сродкам ажыццяўлення новай аграрнай палітыкі па стварэнні хутароў і адрубоў стала дзейнасць Сялянскага банка, які выдаваў крэдыты для куплі зямлі.

Такім чынам, сталыпінская аграрная рэформа садзейнічала ***капіталізацыі аграрнага сектару расійскай эканомікі***, колькаснаму росту сельскай буржуазіі і сельскага пралетарыяту, канцэнтрацыі вялікіх зямельных масіваў у руках заможнага сялянства, якое станавілася галоўнай сацыяльнай апорай самадзяржаўя ў вёсцы. У 1914 г. заможных сялян у Беларусі стала 12 %, а

беднякоў – 68 %. Сталыпінская хутарызацыя – шлях умацавання капіталістычных адносін у вёсцы.

Разам з тым спроба разбурыць абшчыну і выселіць сялян на хутары, знішчыць традыцыйны лад жыцця і калектывісцкую традыцыю ўсходнеславянскай вёскі пры захаванні памешчыцкага землеўладання поспеху не мелі. У лістападзе 1915 г. расійскі ўрад прыняў закон аб спыненні на час вайны землеўпарадкавальных работ, звязаных з хутарызацыяй, якія заўсёды выклікалі супраціўленне з боку сялян.

**Земская рэформа ў Беларусі.** У дадатак да аграрных пераўтварэнняў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях ***14 сакавіка 1911 г.*** ствараліся ***земскія ўстановы***. Уводзячы земствы, П.А. Сталыпін імкнуўся прыцягнуць заможнае сялянства да правядзення зямельнай рэформы, абаперціся на сельскую буржуазію і ўзняць яе палітычную ролю ў сістэме мясцовага кіравання. Выбары ў земскія ўстановы ажыццяўляліся па “рускай” і “польскай” курыях з дастаткова невысокім маёмасным цэнзам, прычым праваслаўных сялян залічвалі ў “рускую”, а католікаў – у “польскую”. Адначасова гэта павінна было аслабіць у краі палітычны ўплыў памешчыкаў польскага паходжання або каталіцкага веравызнання, якія эканамічна былі значна мацней за рускіх памешчыкаў і праваслаўных сялян.

Увядзенне земскіх установ садзейнічала развіццю мясцовай гаспадаркі, стварэнню кааператыўных таварыстваў, сельскагаспадарчых гурткоў, дзейнасць якіх скіроўвалася на павышэнне культуры земляробства і жывёлагадоўлі. Земствы арганізоўвалі заатэхнічныя і ветэрынарныя службы, садзейнічалі продажу і пракату сельскагаспадарчай тэхнікі. Земствы шмат зрабілі для развіцця адукацыі і аховы здароўя насельніцтва. Аднак у Беларусі земствы не адыгралі настолькі значнай ролі, як у цэнтральных губернях Расіі.

## ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУСІ

### § 1. Паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі

**Прычыны паўстання. Палітычныя плыні ў паўстанні 1863 – 1864 гг.** У шматнацыянальных заходніх губернях Расійскай імперыі амаль што самым вострым было “польскае пытанне”. З часоў падзелу Рэчы Паспалітай польскі патрыятычны рух не даваў спакою расійскім уладам, якія намагаліся ўтаймаваць яго сілай або саступкамі. Польскі патрыятычны лагер падзяляўся на ***дэмакратаў***, якія выступалі за паўстанне, і ***лібералаў*** – прыхільнікаў мірных сродкаў барацьбы.

Тыя, хто быў за паўстанне, атрымалі назву ***“чырвоныя”***. Фактычна яны ўяўлялі сабой шырокі і разнастайны дэмакратычны блок, у які ўваходзілі дробная і беззямельная шляхта, афіцэры, дробная гарадская буржуазія, інтэлігенцыя, студэнцтва. Сярод “чырвоных” не было адзінства наконт метадаў дасягнення сваіх мэтаў. Яны падзяляліся на ***правых*** – памяркоўных і ***левых*** – прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных колаў. Першыя рабілі стаўку на

шляхту і асцерагаліся шырокага сялянскага руху. Яны прызнавалі роўнасць нацыянальных правоў беларусаў, літоўцаў, украінцаў з палякамі, але выступалі за адзіную незалежную Польшчу ў межах 1772 г. Правыя прадугледжвалі надзяленне сялян зямлёй за кошт яе частковай канфіскацыя ў памешчыкаў пры абавязковай грашовай кампенсацыі. Левыя разлічвалі на сялянскую рэвалюцыю. Поспех паўстання, на іх думку, быў гарантаваны толькі ў саюзе і адзінстве дзеянняў з расійскімі рэвалюцыянерамі. Яны прызнавалі права на нацыянальнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў. Аграрнае пытанне планавалася вырашыць шляхам ліквідацыі памешчыцкага землеўладання.

Праціўнікаў паўстання называлі *“белымі”*. Гэта былі пераважна памешчыкі, сярэдняя буржуазія, частка інтэлігенцыі. “Белыя” не жадалі ніякіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, катэгарычна адмаўлялі права на нацыянальна-палітычнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў. Дабіцца аднаўлення Польшчы ў межах 1772 г. яны хацелі, выкарыстоўваючы націск заходнееўрапейскіх краін на расійскія ўлады.

Падобныя палітычныя плыні сфарміраваліся і існавалі не толькі ў Польшчы, але і на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

***Восенню 1861 г.*** у Варшаве з разнастайных рэвалюцыйных груповак быў арганізаваны паўстанцкі Гарадскі камітэт, перайменаваны ў ***1862 г.*** у ***Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК)***. Камітэт здолеў наладзіць шырока разгалінаваную агульнапольскую арганізацыю. Рэвалюцыйныя сілы Варшавы ўзначаліў прадстаўнік левага крыла “чырвоных” Яраслаў Дамброўскі. З мэтай падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве ***улетку 1862 г.*** у Вільні быў створаны ***Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК)***, які падначальваўся ЦНК. У яго ўвайшлі спачатку “чырвоныя”, а потым і “белыя”.

**К. Каліноўскі і яго дзейнасць. “Мужыцкая праўда”.** Левых у Беларусі ўзначальваў Канстанцін Каліноўскі (1838 – 1864 гг.). Ён паходзіў з сям’і збяднелага шляхціца Гродзенскай губерні, скончыў Пецярбургскі універсітэт, быў удзельнікам тайнага гуртка польскага рэвалюцыянера З. Серакоўскага. Вярнуўшыся ў 1861 г. на радзіму, К. Каліноўскі разам з В. Урублеўскім стварыў у Гродне нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю з разначыннай інтэлігенцыі, якая мела сувязі з арганізацыямі Вільні, Масквы, Пецярбурга. У ***1862 – 1863 гг.*** ён разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім выдаваў падпольную рэвалюцыйную газету на беларускай мове ***“Мужыцкая праўда”*** (друкавалася лацінкай). Газета прапагандавала рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі, выкрывала прыгонніцкі характар рэформы 1861 г., заклікала беларускі народ да ўзброенай барацьбы супраць самадзяржаўя і паноў, ідэалізавала мінулае беларускага народа, паказвала агульнае ў жыцці і марах беларускага і польскага сялянства, клікала беларускіх сялян падтрымаць польскі нацыянальна-вызваленчы рух. “Мужыцкая праўда” брала пад абарону уніяцкую царкву і заклікала да супрацьстаяння праваслаўю.

Пачынаючы выданне “Мужыцкай праўды”, К. Каліноўскі і яго сябры мелі на мэце перш за ўсё прыцягненне да паўстання сялян, якіх яны лічылі галоўнай рэвалюцыйнай сілай. Каб сяляне лепш зразумелі іх, была выкарыстана беларуская мова. Аднак за год выйшла ўсяго 7 нумароў газеты (апошні ўжо ў час паўстання), тыраж якіх быў недастатковы, каб ахапіць значную колькасць беларускага сялянства.

**Пачатак паўстання.** Падрыхтоўка да паўстання яшчэ не была завершана, калі ў канцы 1862 г. стала вядома аб намеры расійскага ўрада правесці ў Польшчы масавы рэкруцкі набор. Набору падлягалі якраз тыя групы насельніцтва, з якіх вербаваліся члены будучых паўстанцкіх атрадаў. Гэта паведамленне прымусіла ЦНК прызначыць паўстанне на студзень 1863 г.

***22 студзеня 1863 г.*** ЦНК абвясціў сябе ***Часовым нацыянальным урадам*** і заклікаў паўстанцкія атрады да нападу на рускія войскі ў правінцыяльных гарнізонах. У маніфесце і двух аграрных дэкрэтах Часовага нацыянальнага ўрада была выкладзена праграма паўстання: Польшча абвяшчалася незалежнай краінай з роўнымі правамі ўсіх яе грамадзян перад законам; дазвалялася уніяцкае веравызнанне; планавалася перадаць сялянам іх зямельныя надзелы ў поўнае ўладанне, а памешчыкам выплаціць кампенсацыю з дзяржаўнай казны; пасля перамогі было паабяцана надзяліць зямлёй беззямельных удзельнікаў паўстання. Спецыяльны зварот да насельніцтва Беларусі і Літвы заклікаў падтрымаць паўстанне ў Польшчы, але не ўздымаў пытання аб нацыянальна-палітычным самавызначэнні гэтых тэрыторый.

ЛПК не быў папярэджаны аб пачатку паўстання, але вырашыў падтрымаць польскіх патрыётаў. Перайменаваны ў ***Часовы ўрад Літвы і Беларусі*** на чале з К. Каліноўскім, ён ***1 лютага 1863 г.*** звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з маніфестам, у якім заклікаў падтрымаць паўстанне ў Польшчы. Каб не парушаць адзінства дзеянняў, ЛПК вымушаны быў ухваліць у сваім маніфесце і праграму паўстання, прынятую ў Варшаве.

**Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі.** У студзені – лютым 1863 г. у Беларусі з’явіліся першыя паўстанцкія атрады, якія прыйшлі з Польшчы. Мясцовыя атрады пачалі дзейнічаць у сакавіку – красавіку і былі падначалены Вільні. Яны складаліся з дробнай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, гімназістаў старэйшых класаў, сялян. Адзінага плана баявых дзеянняў у паўстанцаў не было. Асобныя спробы ўзаемадзеяння паўстанцкіх атрадаў поспеху не мелі. Многія з атрадаў былі разбіты ў самым пачатку фарміравання. Паўстанцам не ўдалося авалодаць якімі-небудзь, значнымі стратэгічнымі пунктамі. Толькі атрад Л. Звяждоўскага пры падтрымцы студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў красавіку 1863 г. на кароткі тэрмін здолеў захапіць павятовы г. Горкі (Магілёўская губерня). Найбольш актыўна паўстанцы дзейнічалі ў Гродзенскай губерні, дзе ваяводскім камісарам быў К. Каліноўскі.

Паўстанцам спачувалі і дапамагалі рэвалюцыянеры многіх краін. Так, іх абарону выступіў “Колокол” А. Герцэна. М. Бакунін апублікаваў адозву

“Да рускага, польскага і да ўсіх славянскіх народаў”, дзе заклікаў падтрымаць польскіх патрыётаў. У Заходняй Еўропе збіралася і накіроўвалася ў Польшчу зброя, вербаваліся добраахвотнікі з эмігрантаў. З дапамогай цэнтра “Маладая Еўропа” і асабіста Д. Гарыбальдзі рыхтаваліся палітычныя і ваенныя кіраўнікі паўстанцаў. Пры непасрэдным удзеле К. Маркса і Ф. Энгельса, якія лічылі польскае пытанне важнай састаўной часткай еўрапейскай рэвалюцыі, арганізоўваліся акцыі салідарнасці заходнееўрапейскіх рабочых з польскім народам.

Паўстанне 1863 – 1864 гг. адбывалася ва ўмовах правядзення аграрнай рэформы ў Расіі. Самыя радыкальныя з кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў – В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі, М. Чарняк, З. Серакоўскі, А. Мацкявічус, А. Трусаў, Л. Звяждоўскі – спадзяваліся на незадаволенасць сялян умовамі рэформы і імкнуліся прыцягнуць да ўдзелу ў паўстанні як мага больш сялян. Левыя “чырвоныя” ў ЛПК, асабліва К. Каліноўскі, планавалі пашырыць паўстанне на прыбалтыйскія і рускія губерні. Але планы рэвалюцыянераў не ажыццявіліся. Сялян сярод паўстанцаў было няшмат, асабліва ва ўсходніх губернях Беларусі: у Віцебскай – 7 %, Магілёўскай – 13 %, Мінскай – 20 %. Толькі ў Віленскай і Гродзенскай губернях сяляне складалі больш за чвэрць паўстанцаў – адпаведна 27 % і 33 %. Для сялян Беларусі былі непрывабныя лозунгі Варшаўскага ЦНК аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Не магла іх задаволіць і вельмі абмежаваная аграрная праграма паўстанцаў.

**Тактыка “белых”.** Значнай перашкодай пашырэнню паўстання з’явілася далучэнне да паўстанцаў “белых”. Паступова яны нават узначалілі паўстанне. Спадзеючыся на англа-французскае выступленне супраць Расіі, “белыя” жадалі толькі пратрымацца некаторы час і ўсяляк перашкаджалі перарастанню баявых дзеянняў асобных паўстанцкіх атрадаў у народную сялянскую вайну. У сакавіку 1863 г. паводле загаду Часовага нацыянальнага ўрада ў Варшаве Віленскі часовы ўрад Літвы і Беларусі быў распушчаны і створаны ***Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы***, у які ўвайшлі “белыя”. Аддзел узначаліў ковенскі памешчык Якуб Гейштар. К. Каліноўскі спрабаваў супраціўляцца, але, каб не ўносіць раскол у шэрагі паўстанцаў, мусіў падпарадкавацца.

Спадзяванні “белых” на падтрымку Англіі і Францыі не спраўдзіліся. Гэтыя дзяржавы не жадалі і не мелі неабходных сіл, каб ваяваць з Расіяй з-за Польшчы, а іх дыпламатычныя захады Пецярбург рашуча адхіліў. Ужо ў маі 1863 г. паўстанне ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях было падаўлена, а летам рускае камандаванне накіравала буйныя вайсковыя сілы ў Польшчу.

**Меры ўрадавай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. М. Мураўёў.** Поспеху ў барацьбе з паўстаннем расійскія ўлады дасягнулі не толькі вайсковай сілай. У ***маі 1863 г.*** віленскім генерал-губернатарам быў прызначаны ***М.М. Мураўёў***. У Вільню ён прыехаў з планам дзеянняў і з неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Губернатар паставіў мэтай знайсці тыя мясцовыя пласты грамадства, на якія рускія ўлады маглі б абаперціся. Перш за ўсё гэта было

беларускае сялянства. М.М. Мураўёў дабіўся не толькі выканання ў краі норм "Палажэнняў" 1861 г., але і значнага іх паслаблення: было ліквідавана часоваабавязанае становішча сялян і ўведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў, цалкам вярталася зямля, адабраная з 1857 г. ("адрэзкі"), на 20 % зменшаны выкупныя плацяжы, беззямельныя сяляне надзяляліся трыма дзесяцінамі зямлі. Да таго ж сялянам перадавалася зямля ўдзельнікаў паўстання. М.М. Мураўёў абавязаў сельскія таварыствы наглядаць за мясцовай шляхтай, арганізаваў спецыяльныя сялянскія каравулы, якія павінны былі весці барацьбу з паўстанцамі; разгарнуў шырокую антыпаўстанцкую і антыпольскую агітацыю. Усе гэтыя меры звужалі раёны дзеянняў паўстанцаў і адварочвалі ад іх сялян.

М.М. Мураўёў таксама зрабіў захады для замены польскіх чыноўнікаў рускімі (праваслаўнымі), зачыняў каталіцкія кляштары і касцёлы, спрабаваў узмацніць значэнне праваслаўнага духавенства і падняць яго матэрыяльны дабрабыт. У навучальных і грамадскіх установах была ўведзена руская мова як абавязковая, забаронена выкладанне польскай мовы ў сельскіх школах, зачыняліся польскія бібліятэкі.

**Спад паўстанцкага руху. Падаўленне паўстання.** Прадчуваючы хуткае паражэнне паўстання, "белыя" пачалі пакідаць свае пасады ў кіраўніцтве. Кіраваць паўстаннем зноў сталі "чырвоныя". У ***чэрвені 1863 г.*** ў Вільню вярнуўся К. Каліноўскі, у ліпені ён стаў старшынёй Віленскага аддзела. Да канца лета К. Каліноўскі кантраляваў ўсё кіраўніцтва паўстанцкімі атрадамі на тэрыторыі Літвы і Беларусі. Аднак выратаваць паўстанне было ўжо немагчыма. Мясцовыя памешчыкі канчаткова адышлі ад паўстанцаў.

***28 жніўня 1863 г.*** Польскі нацыянальны ўрад загадаў спыніць ваенныя дзеянні. У верасні 1863 г. узброеныя паўстанцкія атрады ў заходніх губернях Беларусі і Літве былі разбіты, а летам 1864 г. ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце. У Польшчы некаторыя паўстанцкія атрады дзейнічалі аж да восені 1864 г. К. Каліноўскі быў арыштаваны ў студзені 1864 г. і ***22 сакавіка*** таго ж года павешаны ў Вільні. За ўдзел у паўстанні былі пакараны смерцю 128 чалавек, 853 сасланы на катаргу і каля 12,5 тыс. выселены, у тым ліку 504 – у Сібір.

**Характар і вынікі паўстання.** Паўстанне 1863 – 1864 гг. можна лічыць ***польскай шляхецкай нацыянальнай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй,*** скіраванай супраць самадзяржаўя, саслоўнай і нацыянальнай няроўнасці. Галоўнай задачай, якую ставіла перад сабой шляхта заходніх губерняў і якая ў ходзе паўстання не была рэалізавана, з'яўлялася аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Сялянства, гарадскія нізы, нізавая інтэлігенцыя Беларусі вышэйназваныя паўстанні не падтрымалі і не прасілі польскую шляхту вызваліць яе ад Расіі, бо разумелі, што смяротная пагроза беларускаму этнасу зыходзіла не ад Масквы, а ад рэакцыйнай антыбеларускай палітыкі Варшавы і Кракава. Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі было адзіным выратаваннем беларускай народнасці ад знішчэння яе палякамі, бо ў

выніку гвалтоўнай палітыкі паланізацыі і акаталічвання беларускі этнас канчаткова перастаў бы існаваць. Таму ніякага вызваленчага для Беларусі характару гэтыя паўстанні не мелі. У сваю чаргу расійскія ўлады пайшлі на значнае змякчэнне ўмоў сялянскай рэформы 1861 г. у беларускіх і літоўскіх губернях. Сяляне Беларусі апынуліся ў больш выгадным эканамічным і прававым становішчы, чым сяляне іншых губерняў Расіі.

Разам з тым паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі мела і адмоўныя вынікі. Так, у Беларусі не была своечасова праведзена земская рэформа, ажыццяўляліся са значным спазненнем і істотнымі адступленнямі ад агульнарасійскіх прынцыпаў судовая і гарадская рэформы. Да канца 1860-х гг. у краі захоўвалася ваеннае становішча.

## § 2. Сялянскі і рабочы рух. Народніцкія і сацыял-дэмакратычныя арганізацыі на Беларусі

**Сялянскі рух і народніцкія арганізацыі ў Беларусі.** Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. у Беларусі адзначаўся рэзкі спад сялянскіх выступленняў. На працягу наступных 40 гадоў сялянскі рух не дасягаў ўзроўню, які назіраўся ў час падрыхтоўкі і правядзення рэформы 1861 г. Калі ў 1861 г. было зарэгістравана 379 сялянскіх хваляванняў, то ў 1864 – 1880 гг. іх рэгістравалася ў сярэднім толькі 8 – 10 штогод. Выступленні сялян былі паасобныя і неарганізаваныя.

Арганізаваны рэвалюцыйны рух у Беларусі пачаў адраджацца толькі ў сярэдзіне 1870-х гг. У той час самым радыкальным кірункам апазіцыйнай грамадскай думкі ў Расіі было ***народніцтва***. Ідэалагічна яно грунтавалася на тэорыі ***сялянскага сацыялізму***, заснавальнікамі якой былі А. Герцэн і М. Чарнышэўскі. Народнікі лічылі, што Расія мае магчымасць пазбегнуць капіталістычнай стадыі развіцця і, абапіраючыся на сялянскую абшчыну, перайсці адразу да сацыялізму. Сваіх прыхільнікаў народніцтва знайшло перш за ўсё сярод разначыннай інтэлігенцыі.

З самага пачатку ў народніцтве існавалі дзве плыні – рэвалюцыйная і рэфарматарская. Прадстаўнікі першай асноўным сродкам дасягнення сваіх мэт лічылі сялянскую рэвалюцыю і рабілі ўсё магчымае, каб падштурхнуць сялян да рашучай барацьбы супраць самадзяржаўя і перажыткаў прыгонніцтва. Памяркоўныя народнікі хацелі перайсці да сацыялізму шляхам паступовага рэфармавання існуючага ладу Расіі.

Народніцкі рух у Беларусі быў ідэйна і арганізацыйна звязаны з агульнарасійскім. Сярод вядомых расійскіх народнікаў 1870-х гг. былі ўраджэнцы Беларусі ***М. Судзілоўскі***, ***С. Кавалік***, ***І. Грынявіцкі***, ***Р. Ісаеў***, ***К. Брэшка-Брэшкоўская***, ***А. Бонч-Асмалоўскі***. У другой палове 1870-х – пачатку 1880-х гг. у Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску, Пінску, Оршы, Слуцку і іншых гарадах Беларусі дзейнічалі народніцкія гурткі. Іх наведвалі ў першую чаргу навучэнцы, якія пад выглядам самаадукацыі вывучалі забароненую літаратуру; меліся спробы весці агітацыю сярод сялян.

Магчымасці гэтых гурткоў былі вельмі абмежаваныя. Іх удзельнікі не бачылі асаблівасцей гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і нацыянальнага развіцця краю.

Калі летам 1879 г. пецярбургская арганізацыя "Зямля і воля" раскалолася на "Народную волю" і "Чорны перадзел", большасць народнікаў у Беларусі падтрымала "Чорны перадзел", які кіраваўся старой прапагандысцкай тактыкай. У 1879 і 1880 гг. у Беларусь двойчы прыязджаў лідэр "Чорнага перадзелу" Г.В. Пляханаў. У Мінску была арганізавана падпольная друкарня "Чорнага перадзелу", якая ў пачатку 1881 г. выпусціла тры нумары цэнтральнага органа арганізацыі – газеты "Чёрный передел", столькі ж нумароў газеты для рабочых "Зерно" і дзве пракламацыі. Між тым "Чорны перадзел" праіснаваў нядоўга. У 1882 г. арганізацыя распалася, яе кіраўнікі, у тым ліку Пляханаў, выехалі за мяжу. Былыя прыхільнікі "Чорнага перадзелу", якія засталіся ў Расіі, пачалі пераходзіць на пазіцыі "Народнай волі".

У сваёй дзейнасці народавольцы рабілі стаўку на індывідуальны палітычны тэрор супраць прадстаўнікоў улады. ***1 сакавіка 1881 г.***, пасля некалькіх няўдалых спроб, яны забілі Аляксандра II. Бомбу ў цара кінуў ураджэнец Мінскай губерні І. Грынявіцкі. Кіраўнікі "Народнай волі" спадзяваліся, што забойства цара з'явіцца сігналам да народнага паўстання ў Расіі. Аднак паўстанне не адбылося, а рэпрэсіі супраць рэвалюцыянераў у хуткім часе прывялі да знішчэння цэнтральных і многіх правінцыяльных арганізацый "Народнай волі".

Народнікі ў Беларусі спрабавалі аб'яднацца ў адзіную арганізацыю. ***У пачатку 1882 г.*** у Вільні была створана ***Паўночна-заходняя арганізацыя "Народнай волі"***. Але ў канцы года паліцыі ўдалося раскрыць і арыштаваць членаў яе цэнтральнай групы. У Беларусі працягвалі дзейнічаць толькі асобныя гурткі.

У першай палове 1880-х гг. у Пецярбургу існавалі студэнцкія гурткі народавольніцкага і ліберальна-асветніцкага кірункаў, удзельнікамі якіх былі выхадцы з Беларусі. Падпольна яны выдалі некалькі публіцыстычных твораў, напісаных на рускай мове. У 1884 г. члены групы ***"Гоман"*** (А. Марчанка, Х. Ратнер і інш.) выступілі з ініцыятывай аб'яднання ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі. Яны выдалі два нумары гектаграфічнага часопіса "Гоман" (на рускай мове). Гоманаўцы аб'явілі сябе "Беларускай сацыяльна-рэвалюцыйнай групай". Іх ідэалам была вольная ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту Расія, пабудаваная на аснове федэрацыі самакіруемых абласцей. Яны мелі сувязі з народніцкімі гурткамі Мінска, Віцебска, Магілёва, але аб'яднаць усіх рэвалюцыйных народнікаў Беларусі ў той час не здолелі.

У другой палове 1880-х – 1890-я гг. пануючым накірункам у народніцтве з'яўляўся ліберальны. Ліберальныя народнікі адмовіліся ад рэвалюцыйных метадаў барацьбы і галоўную ўвагу звярнулі на рэфармаванне зямельнага заканадаўства з мэтай павялічыць сялянскае землеўладанне і захаваць абшчыну ў вёсцы. Гэтым яны спадзяваліся вырашыць аграрную праблему. Разам з тым

беларускія ліберальныя народнікі цікавіліся гісторыяй і культурай свайго краю, спрыялі развіццю нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

**Рабочы рух і стварэнне сацыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі.** Пасля рэформы 1861 г. у Беларусі значна паскорыўся працэс фарміравання класа наёмных рабочых. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх губерняў: адсутнасць буйных і перавага дробных рамесных прадпрыемстваў з невялікай колькасцю працуючых на іх рабочых, сялянскае малазямелле і мноства яўрэйскай беднаты ў горадзе – стваралі лішак рабочай сілы і пашыралі магчымасці эксплуатацыі пралетарыяту. Заработная плата беларускіх рабочых у параўнанні з агульнарасійскім паказчыкам у канцы XIX – пачатку XX ст. была амаль на 1/3 ніжэй. У першыя два дзесяцігоддзі пасля адмены прыгонніцтва ўмовы працы рабочых ніяк не рэгламентаваліся, адсутнічала іх сацыяльная абарона. Тым не менш выступленняў рабочых у Беларусі было няшмат. У 1870-я гг. іх зарэгістравана 7, у 1880-я – 10. Толькі ў 1890-я гг. пачаўся ўздым стачачнай барацьбы (адбылося 59 выступленняў, прычым 53 з іх – у другой палове дзесяцігоддзя). Паступова рабочы рух стаў больш арганізаваным і ў канцы XIX ст. вылучыўся ў самастойную плынь.

У гэты ж час ідэалогія народніцтва пачала саступаць месца ***марксізму***. Першае знаёмства з марксісцкай літаратурай адбылося яшчэ ў гуртках народнікаў. Узнікненне самастойнага ***сацыял-дэмакратычнага руху*** ў Беларусі звязана з дзейнасцю польскай партыі ***“Пралетарыят”*** (утварылася ў 1882 г.) і пляханаўскай групы ***“Вызваленне працы”*** (утворана ў 1883 г. у Швейцарыі). У другой палове 1880-х – пачатку 1890-х гг. у некаторых гарадах Беларусі былі арганізаваны гурткі, у якіх вывучалі працы К. Маркса, Ф. Энгельса і іх паслядоўнікаў. У Мінску такімі гурткамі кіравалі Э. Абрамовіч, І. Гурвіч і С. Трусевіч; у Гомелі – А. Поляк і І. Захарын; у Гродне – М. Дзем’яновіч і С. Галюн; у Віцебску – А. Амстэрдам, М. Заслаўскі, П. Дубінская і Х.Усышкін. Першыя марксісцкія гурткі ў Беларусі былі нешматлікія і амаль не звязаныя з масавым рабочым рухам.

Аднак ужо з сярэдзіны 1890-х гг. у сацыял-дэмакратычным руху Расіі адбыліся значныя змены. Пачаўся пераход ад вузкай гуртковай прапаганды марксізму да масавай эканамічнай і палітычнай агітацыі. У Беларусі гэтаму пераходу садзейнічала рукапісная брашура ***А. Крэмера “Аб агітацыі”*** (1893). У той час сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ўжо існавалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Пінску, Смаргоні, Брэст-Літоўску, Гродне, Ашмянах.

Прыблізна з сярэдзіны 1890-х гг. сацыял-дэмакраты пачалі наладжваць прапаганду ідэй сацыялізму ў рабочым асяроддзі. Так, у Мінску ў гэты час афарміліся дзве сацыял-дэмакратычныя групы. Адну ўзначальвалі Я. Гурвіч і П. Берман. Яны разгарнулі агітацыю сярод яўрэйскіх рабочых, занятых на дробнай вытворчасці. Другая група пад кіраўніцтвам С. Трусевіча вяла прапаганду на буйных прадпрыемствах Мінска. У красавіку 1896 г. С. Трусевіч удзельнічаў у рабоце ўстаноўчага з’езда ***Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі*** (ЛСДП) у Вільні, але не пагадзіўся з яе сепаратызмам і ў маі 1896 г.

стварыў ***Рабочы саюз Літвы*** (РСЛ), які аб'яднаў інтэрнацыянальныя рабочыя арганізацыі Вільні, Мінска і Смаргоні.

## § 3. Фарміраванне палітычных партый. Нацыянальнае адраджэнне. Першыя палітычныя арганізацыі

Канец XIX – пачатак XX ст. – час стварэння і станаўлення палітычных партый. Асаблівасцю палітычнага развіцця было тое, што ў сувязі з параўнальна нядоўгім існаваннем капіталістычных адносін працэс класавай дыферэнцыяцыі і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці на Беларусі не скончыўся. На практыцы гэта паўплывала на разнастайнасць палітычных партый і рухаў (у тым ліку агульнарасійскіх), тэрмін іх фарміравання і асаблівасці дзейнасці.

У другой палове 1890-х гг. сярод сацыял-дэмакратаў шматнацыянальных заходніх губерняў пераважала тэндэнцыя да стварэння рабочых арганізацый па нацыянальнай прыкмеце. Такую пазіцыю заняла ЛСДП. Узаемадзеянне з расійскім пралетарыятам адмаўляла ***Польская сацыялістычная партыя*** (ППС). У верасні 1897 г. на з'ездзе яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у Вільні ўтварыўся ***Бунд – Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі***. Яго лідэрам стаў ***А. Крэмер***. Бунд лічыў, што абараніць інтарэсы яўрэйскіх рабочых можа толькі іх нацыянальная арганізацыя. Але з пазіцыяй Бунда пагадзіліся не ўсе яўрэйскія рабочыя арганізацыі. Праціўнікі Бунда стварылі ў Мінску ***Рабочую партыю палітычнага вызвалення Расіі*** (РППВР). Яе кіраўнікамі сталі ***Л. Радзівонава-Клячко***, ***Р. Гершуні***, ***К. Брэшка-Брэшкоўская***, ***А. Бонч-Асмалоўскі***. Гэтая група стаяла на інтэрнацыянальных пазіцыях і схілялася да тэрарыстычных метадаў барацьбы з самадзяржаўем.

На аснове масавай сацыялістычнай агітацыі ў другой палове 1890-х гг. назіраўся значны ўздым стачачнай барацьбы рабочых, у Расіі ўзніклі буйныя гарадскія і рэгіянальныя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Усё гэта выклікала неабходнасць аб'яднання сацыял-дэмакратаў у адзіную партыю. Ініцыятарам аб'яднаўчага працэсу стаў створаны ***У.І. Леніным у 1895 г.*** пецярбургскі **"*Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа*"**.

***1 – 3 сакавіка 1898 г.*** у Мінску прайшоў з'езд прадстаўнікоў пецярбургскага, маскоўскага, кіеўскага і екацярынаслаўскага "Саюзаў барацьбы", кіеўскай "Рабочай газеты" і Бунда. З'езд прыняў рашэнне аб аб'яднанні прадстаўленых на ім арганізацый у ***Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю*** (РСДРП) і выбраў ЦК партыі. Бунд увайшоў у РСДРП на правах аўтаноміі ў вырашэнні мясцовых спраў.

Хутка пасля першага з'езда РСДРП яе ЦК быў арыштаваны. Сярод сацыял-дэмакратаў абвастрылася барацьба паміж прыхільнікамі рэвалюцыйнага і рэфармісцкага кірункаў. Цэнтрам згуртавання рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў стала газета ***"Искра"***, якая пачала ідэйную барацьбу з ***эканамізмам***.

Прыхільнікі эканамізму адмаўлялі палітычную барацьбу пралетарыяту і лічылі, што змагацца трэба толькі за паляпшэнне эканамічных умоў жыцця працоўных.

На тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. дзейнічалі невялікія групы ***Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы*** (СДКПіЛ), створанай у 1900 г. на з'ездзе прадстаўнікоў РСЛ і сацыял-дэмакратаў Польшчы. Яе кіраўнікамі былі Ф. Дзяржынскі і С. Трусевіч. СДКПіЛ падзяляла ідэі рэвалюцыйнай палітычнай барацьбы пралетарыяту і імкнулася да аб'яднання з РСДРП. У 1902 г. была ўтворана ППС у Літве. Яна склалася з груп ППС, якія дзейнічалі на тэрыторыі Літвы і Заходняй Беларусі. Гэтая партыя грунтавалася на леванародніцкіх ідэалах сацыялізму, выступала за незалежнасць Беларусі і Літвы.

Эканамічны крызіс 1900 – 1903 гг. і руска-японская вайна 1904 – 1905 гг. садзейнічалі абвастрэнню ўсіх супярэчнасцей расійскага грамадства і росту рэвалюцыйнай барацьбы ў краіне. Гэта паскорыла працэс утварэння сацыялістычных і нацыянальна-дэмакратычных партый.

Летам 1903 г. у Брусэлі (потым у Лондане) адбыўся ***II з'езд РСДРП (Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі)***. Ён прыняў праграму РСДРП, распрацаваную прыхільнікамі газеты "Іскра". Бліжэйшай палітычнай задачай партыя ставіла звяржэнне самадзяржаўя і ўстанаўленне дэмакратычнай рэспублікі, а сваёй канчатковай мэтай – пралетарскую рэвалюцыю, дыктатуру пралетарыяту і пабудову сацыялізму. Пры абмеркаванні статута РСДРП і выбарах у кіруючыя органы партыі адбыўся раскол. З гэтага часу рэвалюцыйна настроеных расійскіх сацыял-дэмакратаў пачалі называць ***бальшавікамі*** (лідэр – У.І. Ленін), а прыхільнікаў рэфармісцкага накірунку – ***меншавікамі*** (лідэр – Л. Мартаў).

У 1902 г. прыхільнікі ідэй народніцтва стварылі ***Партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў)***. Эсэры выступалі за пабудову сацыялізму, заснаванага на аснове сацыялізацыі зямлі, ураўняльнага землекарыстання і кааперацыі. Яны мелі на мэце звяржэнне самадзяржаўя, знішчэнне памешчыцкага землеўладання і ўстанаўленне ў Расіі федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. Галоўным сродкам барацьбы эсэры лічылі індывідуальны палітычны тэрор. Лідэрам эсэраў быў Р.А. Гершуні.

На рубяжы XIX – XX стст. з агульнадэмакратычнага руху вылучылася беларуская нацыянальная плынь. У канцы 1902 – пачатку 1903 гг. з нацыянальна-культурных гурткоў Мінска, Вільні і Пецярбурга аформілася ***Беларуская рэвалюцыйная грамада (БРГ)***. Сярод яе стваральнікаў і кіраўнікоў былі браты Іван і Антон Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка), К. Кастравіцкі, А. Бурбіс, В. Іваноўскі, Ф. Умястоўскі. Усе яны паходзілі з дробнамаянтковай апалячанай беларускай шляхты.

На І з'ездзе БРГ ў 1903 г. была прынята праграма, у якой грамада называла сябе сацыяльна-палітычнай арганізацыяй беларускага працоўнага народа. Партыя выступала за звяржэнне самадзяржаўя, знішчэнне капіталізму і ўсталяванне дэмакратычнага ладу, прызнавала правы народаў Расіі на

аўтаномію. Аграрная праграма БРГ прадугледжвала знішчэнне прыватнай зямельнай уласнасці і ўвядзенне ўраўняльнага землекарыстання без эксплуатацыі чужой працы. Шлях да сацыялізму яна бачыла праз усебаковую кааперацыю працоўных. Пазней БРГ была перайменавана ў ***Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ)***. Сваю агітацыю БСГ праводзіла ў асноўным сярод сялянства, у рабочым асяроддзі яе ўплыў быў нязначным.

Такім чынам, у канцы XIX – пачатку XX ст. былі закладзены ідэйныя і арганізацыйныя асновы далейшай барацьбы розных апазіцыйных самадзяржаўю сіл, якія пачалі афармляцца ў палітычныя партыі.

## § 4. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. Палітычнае становішча ў паслярэвалюцыйныя гады. “Нашаніўскі перыяд” беларускага нацыянальнага руху

**Расійская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. і рэвалюцыйны рух у Беларусі.** У пачатку XX ст. у Расіі склалася ***рэвалюцыйная сітуацыя***. Да гэтага часу былі канчаткова вычэрпаны магчымасці адносна мірнага развіцця капіталізму ва ўмовах захавання перажыткаў феадалізму. Эканамічны крызіс 1900–1903 гг. і руска-японская вайна 1904–1905 гг. садзейнічалі абвастрэнню ўсіх супярэчнасцей. Рэвалюцыйны выбух у Расіі стаў непазбежным. Рэвалюцыйная сітуацыя – абставіны ў грамадстве, якія служаць паказчыкам спеласці сацыяльна-палітычных умоў для сацыяльнай рэвалюцыі. У.І. Ленін называў тры галоўныя прыкметы рэвалюцыйнай сітуацыі: «1) …Для надыходу рэвалюцыі звычайна бывае недастаткова, каб “нізы не хацелі”, а патрабуецца яшчэ, каб “вярхі не маглі” жыць па-старому. 2) Абвастрэнне, болей за звычайнае, галечы і няшчасцяў прыгнечаных класаў. 3) Значнае павышэнне, у сілу згаданых прычын, актыўнасці мас…».

Расійская імперыя ішла даволі хуткімі тэмпамі па буржуазнаму шляху развіцця. Разам з тым адной з асаблівасцей гэтага развіцця з’яўлялася наяўнасць феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах. Сярод іх – самадзяржаўе, памешчыцкае землеўладанне, сялянская абшчына і абшчыннае землеўладанне, напаўпрыгонніцкія формы эксплуатацыі сялян (адпрацоўкі, натуральная аплата працы часткай ураджаю і г. д.), саслоўнае дзяленне грамадства і саслоўная няроўнасць, адсутнасць у грамадзян дэмакратычных правоў і свабод: свабоды слова, друку, сходаў, саюзаў, права выбіраць і быць выбраным, права на правядзенне мітынгаў, шэсцяў і дэманстрацый.

Феадальна-прыгонніцкія перажыткі ў палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах стрымлівалі развіццё Расіі па буржуазным шляху. Таму галоўнымі мэтамі і задачамі расійскай рэвалюцыі з’яўляліся знішчэнне гэтых перажыткаў і стварэнне ўмоў для больш хуткага, свабоднага і беспярашкоднага развіцця капіталізму ў Расіі. Мэты і задачы, якія стаялі перад рэвалюцыяй, вызначылі яе ***буржуазны характар***.

Аднак у параўнанні з англійскай (сярэдзіна XVII ст.) ці французскай (канец XVIII ст.) буржуазнымі рэвалюцыямі расійская рэвалюцыя адбывалася ў новых умовах, калі рабочы клас і буржуазія ўжо сфарміраваліся як асноўныя класы капіталістычнага грамадства. Сацыяльная база расійскай рэвалюцыі была больш шырокай: у ёй прынялі ўдзел не толькі сацыяльныя пласты феадальнага грамадства (сяляне, рамеснікі, гандляры), як гэта было ў Англіі і Францыі, але і рабочы клас, і буржуазія, дэмакратычныя пласты ўсяго расійскага грамадства. Асноўны ўдар рэвалюцыя скіроўвала супраць дваранства, памешчыкаў, вышэйшых прадстаўнікоў чыноўніцтва і арміі, буйной манархічна настроенай буржуазіі. Звяржэнне самадзяржаўя і правядзенне новых буржуазных рэформ мусіла забяспечыць больш хуткае і бесперашкоднае развіццё капіталізму ў Расіі.

Па сацыяльнай базе (дэмакратычныя пласты расійскага грамадства) і па формах барацьбы (палітычная стачка, узброенае паўстанне) расійская рэвалюцыя была ***дэмакратычнай***. Таму рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у гістарыяграфіі называецца ***буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй***.

Напярэдадні і ў ходзе рэвалюцыі сфарміраваліся тры грамадска-палітычныя лагеры: ***урадавы, ліберальна-буржуазны*** і ***дэмакратычны***. Кожны з іх меў сваю сацыяльную базу, мэты і задачы. Урадавы лагер абапіраўся на дваранства, вышэйшыя пласты чыноўніцтва і арміі, яго падтрымлівала буйная манархічна настроеная буржуазія. Усе яны імкнуліся захаваць самадзяржаўе і не дапусціць карэнных змен у дзяржаўна-палітычным ладзе Расіі. У ліберальна-буржуазны лагер уваходзілі буйная і сярэдняя буржуазія, некаторыя прагрэсіўныя памешчыкі, буржуазная інтэлігенцыя. Лібералы марылі аб палітычных свабодах, жадалі ліквідаваць перажыткі феадалізму, але баяліся рэвалюцыі і абмяжоўваліся толькі мірнымі сродкамі ўздзеяння на самадзяржаўе. Дэмакратычны лагер складалі пралетарыят, сялянства, радыкальна настроеная інтэлігенцыя, шырокія непралетарскія дэмакратычныя пласты горада і вёскі. Іх агульнай найбліжэйшай мэтай было знішчэнне ўсіх рэшткаў феадалізму, у тым ліку і памешчыцкага землеўладання, звяржэнне самадзяржаўя і ўсталяванне дэмакратычнай рэспублікі.

***9 студзеня 1905 г.*** у Пецярбургу было расстраляна мірнае шэсце рабочых, якія накіроўваліся да цара з просьбай палепшыць становішча народа. Гэтая падзея (***“Крывавая нядзеля”***) выклікала магутную хвалю пратэсту. Стачкі, дэманстрацыі і мітынгі рабочых пракаціліся па ўсей краіне. Іх размах сведчыў аб тым, што ў Расіі пачалася буржуазна-дэмакратычнвая рэвалюцыя.

У студзеньскія дні 1905 г. ў 30 гарадах і мястэчках Беларусі адбыліся забастоўкі салідарнасці, у якіх удзельнічала 34 тыс. чалавек. Ініцыятарамі і кіраўнікамі рэвалюцыйных выступленняў рабочых былі найперш Бунд і РСДРП, у некаторых месцах – эсэры і БСГ. У студзені забастоўкі рабочых мелі выразна палітычны характар.

У лютым – сакавіку агульная колькасць палітычных выступленняў рэзка зменшылася, але адбылося значнае павелічэнне эканамічных забастовак. Новая

хваля палітычных выступленняў узнялася ў сувязі са святкаваннем 1 Мая. У чэрвені ў Беларусі адбыліся мітынгі салідарнасці з рабочымі Лодзі, Варшавы, Адэсы, Іванава-Вазнясенска, з рэвалюцыйнымі матросамі Чарнаморскага флоту, якія ішлі ў авангардзе рэвалюцыйнага руху. Увогуле ў красавіку – чэрвені 1905 г. палітычныя выступленні ахапілі 56 гарадоў і мястэчак Беларусі, у іх удзельнічала каля 100 тыс. чалавек. У гэты ж час узмацнілася і эканамічная барацьба рабочых.

Вясною 1905 г., як вынік ўздзеяння рабочага руху, у Беларусі разгарнуўся масавы рэвалюцыйны рух сялянства. Колькасць сялянскіх выступленняў у красавіку – чэрвені ўзрасла да 237 супраць 53 у студзені – сакавіку. Галоўным патрабаваннем сялян было знішчэнне памешчыцкага землеўладання. Найбольшым уплывам сярод сялян карысталіся эсэры і Беларуская сацыялістычная грамада.

6 жніўня 1905 г. Мікалай II падпісаў Маніфест аб скліканні “законадарадчай” Дзяржаўнай думы. Паводле праекта, распрацаванага міністрам унутраных спраў А. Булыгіным, ад выбараў у Думу адхіляліся працоўныя масы горада і вёскі. Практычна ўсе рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі выступілі супраць булыгінскай Думы і выставілі лозунг яе байкоту. У жніўні–верасні 1905 г. рух пратэсту супраць булыгінскай Думы ахапіў многія гарады і мястэчкі Беларусі. Выбары ў булыгінскую Думу былі сарваны.

Восенню 1905 г. рэвалюцыйны рух працягваў нарастаць і ахапіў усю краіну. Шматлікія агульнагарадскія стачкі зліліся ва ***Усерасійскую палітычную стачку***. Ва ўсёй Расіі баставала звыш 2 млн. чалавек. У Беларусі Кастрычніцкая палітычная стачка ахапіла 32 населеныя пункты, а колькасць стачачнікаў толькі ў прамысловасці дасягнула 66 тыс. чалавек. У ходзе Усерасійскай палітычнай стачкі ў многіх гарадах Расіі ўзнікалі агульнагарадскія выбарныя стачачныя камітэты і камісіі, якія атрымалі назву ***Саветаў рабочых дэпутатаў***. У Беларусі стачачныя камітэты і кааліцыйныя саветы дзейнічалі ў Мінску, Віцебску, Гродне, Брэсце, іншых прамысловых цэнтрах і буйных чыгуначных вузлах.

***17 кастрычніка 1905 г.*** Мікалай II падпісаў ***Маніфест*** аб палітычных свабодах і надзяленні Дзяржаўнай думы заканадаўчымі паўнамоцтвамі. 18 кастрычніка ў дзень абвяшчэння Маніфеста ў Мінску на плошчы каля Віленскага чыгуначнага вакзалу адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі каля 20 тыс. чалавек. Каб разагнаць мітынгуючых, губернатар Курлаў загадаў прымяніць зброю. У выніку чаго было забіта каля 100 чалавек і да 300 чалавек паранена. У гэты ж дзень крывавыя сутычкі адбыліся ў Смаргоні і Полацку. Увогуле кастрычніцкая палітычная стачка ахапіла 32 населеныя пункты Беларусі, а колькасць стачачнікаў толькі ў прамысловасці дасягнула 66 тыс. чалавек.

У снежні 1905 г. палітычная барацьба пралетарыяту Расіі працягвалася. У Маскве яна перарасла ва ўзброенае паўстанне. У снежаньскія дні палітычныя забастоўкі адбыліся ў Мінску, Гомелі, Мазыры, Пінску і іншых гарадах.

Забастоўкі ахапілі большасць чыгуначных вузлоў Беларусі. У апошнія месяцы 1905 г. зноў адбыўся ўздым сялянскага руху. У Беларусі ў кастрычніку было 54 выступленні сялян, у лістападзе – 154, а ў снежні – 286. Усерасійская палітычная стачка выклікала больш моцныя, чым раней, выступленні ў арміі. У лістападзе хваляванні салдат адбыліся ў Гродне, у Бабруйскай і Брэсцкай крэпасцях. Іх удзельнікі выказвалі салідарнасць з паўстаннямі матросаў Кранштата і Севастопаля.

Аднак самадзяржаўе здолела збіць рэвалюцыйную хвалю. Гэтаму спрыяў царскі Маніфест ***17 кастрычніка 1905 г.***. У партыях дэмакратычнага лагера, якія дагэтуль дзейнічалі нелегальна, а зараз атрымалі магчымасць свабодна весці прапаганду сваіх ідэй, пачалі праяўляцца розныя погляды наконт далейшых дзеянняў і сродкаў барацьбы. Увядзенне палітычных свабод з задавальненнем сустрэла буржуазія. Яна лічыла, што рэвалюцыя дасягнула сваіх мэт і павінна скончыцца. Хутка пачынаюць узнікаць буржуазныя палітычныя партыі і арганізацыі.

Першымі з іх сталі ***Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя*** (кадэты) і ***Саюз 17 кастрычніка*** (акцябрысты). Кадэты заявілі аб сваёй апазіцыі самадзяржаўю. Яны выступалі за канстытуцыйную манархію, за знішчэнне саслоўных прывілеяў і іншых перажыткаў феадалізму, за палітычныя свабоды і поўнае раўнапраўе. Але яны не лічылі неабходным канчаткова ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне. Для нацый яны прызнавалі толькі права на культурнае самавызначэнне. Акцябрысты занялі больш "правую" пазіцыю. Яны былі поўнасцю задаволены Маніфестам 17 кастрычніка, выступалі за падтрымку манархічнай улады і захаванне адзінай і непадзельнай Расіі.

У Беларусі больш спрыяльнымі аказаліся ўмовы для дзейнасці партыі акцябрыстаў. Тут яе падтрымлівалі рускія чыноўнікі-манархісты, памешчыкі, праваслаўнае духавенства. Кадэты з-за адсутнасці на Беларусі земстваў і вышэйшых навучальных устаноў не мелі тут неабходнай сацыяльнай глебы для сваёй дзейнасці. Яны знайшлі падтрымку толькі з боку яўрэйскай буржуазіі. Па агульнапалітычных і нацыянальных пытаннях кадэтаў на Беларусі падтрымалі польскія памешчыкі і каталіцкі касцёл. Кадэцкую праграму, дапоўніўшы яе прынцыпамі каталіцкай веры, падтрымала створаная ў канцы 1905 – пачатку 1906 гг. ***Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы***, якая стала саюзніцай кадэтаў на Беларусі.

Да буржуазных партый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі трэба аднесці сіяністаў. Пасля стварэння ў 1897 г. ***Сусветнай арганізацыі сіяністаў*** на Беларусі хутка пачалі ўзнікаць сіянісцкія гурткі. Аднак сіяністы адмаўлялі ўдзел яўрэяў у рэвалюцыйным руху краін дыяспары і мелі на мэце стварэнне самастойнай яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне, якая аб'яднала б ўсіх яўрэяў свету. У час рэвалюцыі 1905–1907 гг. сіяністы падтрымлівалі кадэтаў.

Правы ўрадавы палітычны лагер, каб абараняць інтарэсы самадзяржаўя ва ўмовах адкрытай палітычнай барацьбы, таксама пачаў фарміраваць свае палітычныя партыі. Самай уплывовай з іх быў "***Саюз рускага народа***". Яго

членаў рэвалюцыянеры называлі чарнасоценцамі. У канцы 1905 – пачатку 1906 г. арганізацыі “Саюза рускага народу” былі створаны ў Мінску, Гомелі, Віцебску і іншых гарадах Беларусі. Да партый правага кансерватыўнага накірунку адносіліся таксама “***Партыя рускага сходу***”, “***Партыя народнага цэнтра***” і шэраг іншых. Усе яны займалі крайне манархічныя пазіцыі, абаранялі інтарэсы памешчыкаў і праваслаўнай царквы, выступалі за непарушнасць самадзяржаўнай улады, захаванне памешчыцкага землеўладання, за тэрытарыяльнае адзінства Расіі.

Пасля снежаньскіх падзей 1905 г. рэвалюцыйны рух паступова ідзе на спад. Усплёскі палітычных выступленняў у 1906 г. назіраліся ў студзені – у сувязі з гадавінай “Крывавай нядзелі” і ў красавіку, калі адзначалася свята 1 Мая. Адначасова ўзмацнялася эканамічная барацьба. Рабочых актыўна падтрымлівалі сяляне і вайскоўцы. У ліпені – снежні 1906 г. даволі актыўна працягвалася толькі эканамічная барацьба. Вясной 1907 г. рэвалюцыйны ўздым быў найслабейшым за ўвесь перыяд рэвалюцыі.

***3 чэрвеня 1907 г.*** Мікалай II выдаў загад аб роспуску II Дзяржаўнай думы і аб змяненні выбарчага закону. Паколькі па Маніфесту 17 кастрычніка 1905 г. новы закон не мог дзейнічаць без ухвалення яго Дзяржаўнай думай, гэты крок урада з’яўляўся, па сутнасці, дзяржаўным пераваротам. Падзеі 3 чэрвеня 1907 г. сведчылі аб заканчэнні першай расійскай рэвалюцыі.

Паражэнне рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. не азначала вяртання да мінулага. У Расіі, хоць і ва ўрэзаным выглядзе, існавалі палітычныя свабоды, былі створаны і атрымалі магчымасць легальнай дзейнасці розныя палітычныя партыі, засталася Дзяржаўная дума, працоўныя дабіліся значнага паляпшэння эканамічных умоў свайго жыцця. Рэвалюцыя аказала моцны ўплыў на рабочы і нацыянальна-вызваленчы рух не толькі ў Расіі, але і ў свеце. Аднак галоўная мэта рэвалюцыі – звяржэнне самадзяржаўя і знішчэнне памешчыцкага землеўладання – не была дасягнута.

**Грамадска-палітычная барацьба пасля рэвалюцыі. Беларускі нацыянальна-культурны рух.** Наступленне рэакцыі пасля трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту выявілася ў дзейнасці атрадаў жандармерыі, арышце кіраўнікоў і актыўных удзельнікаў рэвалюцыйных выступленняў, закрыцці рэвалюцыйных газет, забароне прафесійных саюзаў. Ад гэтага найбольш пацярпелі левыя партыі і арганізацыі, якія мусілі значна скараціць ці ўвогуле прыпыніць сваю дзейнасць. Былі вельмі аслаблены і партыі ліберальна-буржуазнага цэнтра. Распаліся некаторыя правінцыяльныя арганізацыі кадэтаў, у тым ліку і ў Беларусі, скарацілася колькасць іх друкаваных органаў.

У той жа час актывізавалася дзейнасць правых манархічных арганізацый. Яны разгарнулі шырокую агітацыю супраць яўрэяў, палякаў, каталіцкага касцёла, а таксама супраць беларускага нацыянальнага руху. У гэты час адбылося арганізацыйнае афармленне ***“западноруссов”***. Як ідэалогія “западнорусизм” узнік яшчэ пасля паўстання 1863 – 1864 гг. “Западноруссы”

прызнавалі беларусаў народнасцю, але разглядалі іх як складовую частку рускага народа, у які ўключалі яшчэ вялікарусаў і ўкраінцаў.

Галоўнай сваёй мэтай "западнорусизм" лічыў барацьбу супраць польскага і каталіцкага ўплыву на беларусаў. Актыўным дзеячам і ідэолагам "западнорусизма" быў Л. Саланевіч. Ён з'яўляўся адным з арганізатараў "Белорусского общества", выдаваў газеты "Белорусская жизнь" (1909 – 1911 гг.) і "Северо-западная жизнь" (1911 – 1915 гг.). Л. Саланевіча актыўна падтрымліваў П.А. Сталыпін.

Беларускі нацыянальны рух пасля рэвалюцыі апынуўся ў цяжкім становішчы. Беларуская сацыялістычная грамада як палітычная партыя перастала існаваць. Яе кіраўнікі сканцэнтравалі сваю ўвагу на легальнай дзейнасці. У гэты час даводзілася весці барацьбу на два фронты – супраць рускіх і польскіх нацыяналістаў, якія не жадалі прызнаваць самастойнасць беларускага народа.

У паслярэвалюцыйны перыяд цэнтрам беларускага нацыянальна-культурнага руху стала газета ***"Наша ніва"***. Яна выдавалася з лістапада 1906 г. па жнівень 1915 г. у Вільні. У склад рэдакцыі ўваходзілі браты Іван і Антон Луцкевічы, В. Ластоўскі, В. Іваноўскі, А. Уласаў. Газета друкавалася кірыліцай (для праваслаўных беларусаў) і лацінкай (для беларусаў-католікаў). "Наша ніва" займала ліберальныя асветніцкія пазіцыі. Галоўным у сваёй дзейнасці "нашаніўцы" лічылі барацьбу за захаванне адзінства беларускага народа, пераадоленне яго рэлігійнага расколу.

Значную ўвагу рэдакцыя "Нашай нівы" надавала прапагандзе беларускай нацыянальнай культуры, развіццю беларускай мовы. Пры газеце ствараўся беларускі нацыянальны музей. З 1910 г. "Наша ніва" выдавала адрасаваны сялянам "Беларускі каляндар", з 1912 г. сельскагаспадарчы аддзел газеты быў пераўтвораны ў самастойны часопіс "Саха", а для моладзі пачаў выдавацца літаратурны месячнік "Лучынка".

"Наша ніва" разам з другім буйным беларускім выдавецтвам "Загляне сонца і ў наша ваконца" забяспечвала выхад мастацкай і навукова-папулярнай кніжнай прадукцыі. "Наша ніва" выхавала шэраг беларускіх пісьменнікаў, грамадска-палітычных дзеячаў, навукоўцаў, сярод якіх былі Я. Колас і Я. Купала, А. Пашкевіч (Цётка) і М. Багдановіч, А. Гарун і М. Гарэцкі, З. Бядуля і Ц. Гартны.

# ГЛАВА 3. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. ЛЮТАЎСКАЯ БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ

## § 1. Пачатак і прычыны Першай сусветнай вайны. Адносіны да вайны розных класаў і партый

Першая сусветная вайна працягвалася 4 гады і 4 месяцы. У вайне ўдзельнічалі 38 краін з насельніцтвам звыш 1,5 млрд. чалавек – 75 % усяго ўсіх

жыхароў Зямлі. У ёй, паводле няпоўных звестак, было забіта, паранена і скалечана каля 30 млн. чалавек.

Галоўнай прычынай Першай сусветнай вайны стала барацьба паміж буйнейшымі імперыялістычнымі краінамі за перадзел ужо падзеленага свету, за новыя сферы ўплыву, крыніцы сыравіны і рынкі збыту прадукцыі. ***19 ліпеня 1914 г.*** Германія аб’явіла вайну Расіі, а 21 ліпеня – Францыі, захапіла Бельгію і Люксембург. 22 ліпеня Англія аб’явіла вайну Германіі. Разам з Англіяй у вайну ўступілі яе дамініёны Аўстралія, Канада, Новая Зеландыя і калонія Індыя. На баку Антанты выступіла Японія, на баку Германіі – Турцыя. Пачалася Першая сусветная вайна.

Вайна не вырашала задач нацыянальнага развіцця ніводнай дзяржавы (сваю незалежнасць адстойвала толькі Сербія), не адпавядала інтарэсам працоўных, была з усіх бакоў захопніцкай. Урады краін-удзельніц вайны стараліся пераканаць свае народы ў тым, што яна вядзецца ў мэтах абароны радзімы.

Пануючыя класы і вярхі гандлёва-прамысловай буржуазіі Расіі падтрымалі вайну, таму што чакалі для сябе вялікіх выгод ад будучага падзелу турэцкай і аўстрыйскай маёмасці.

Шырокія пласты гарадской сярэдняй буржуазіі і буржуазнай інтэлігенцыі пад уплывам друку, пропаведзяў духавенства таксама лічылі вайну справядлівай з боку Расіі.

У самым пачатку вайны ў Мінску, Магілёве, Віцебску і іншых гарадах Беларусі мясцовыя органы ўлады правялі “патрыятычныя” сходы, на якіх выказвалася перакананне, што вайна вядзецца ў мэтах абароны Айчыны. Асаблівы патрыятычны ўздым назіраўся ў Магілёве. Летам 1914 г. тут адбыліся сходы прадвадзіцеляў дваранства, членаў земства, ганаровых грамадзян, духавенства і настаўнікаў, удзельнікі якіх запэўнівалі, што насельніцтва губерні аднадушна ўхваляе ўрадавую палітыку і гатова на любыя ахвяры дзеля Айчыны.

Пазіцыі сацыяльных слаёў насельніцтва як у люстэрку адбіваліся на дзейнасці палітычных партый. Ужо ў самым пачатку вайны партыі акцябрыстаў і кадэтаў заявілі аб сваёй поўнай падтрымцы знешняй палітыкі ўрада Расіі. Лідэр кадэтаў П. Мілюкоў выказаў думку аб далучэнні Галіцыі, Угорскай Русі, Букавіны да Расіі з той мэтай, каб дапамагчы нацыянальнаму ўз’яднанню ўкраінскага народа. П. Мілюкоў прапанаваў далучыць да Расіі і землі, якія да славян ніякіх адносін не мелі: Басфор і Дарданелы, прыбярэжную тэрыторыю Турцыі з г. Стамбулам. Справа была не толькі ў абароне славян. Будаўніцтва Германіяй Багдадскай чыгункі праз Балканы і Турцыю закранала эканамічныя інтарэсы Расіі, якая вывозіла праз пралівы Басфор і Дарданелы 37 % сваіх тавараў, у тым ліку 80 % хлеба, прызначанага на экспарт. З будаўніцтвам дарогі Германія ўстанавіла кантроль над пралівамі і стала галоўнай перашкодай пранікненню Расіі ў Турцыю. Пад германскі ўплыў трапіла і Балгарыя, што

таксама супярэчыла пазіцыі Расіі, якая лічыла сябе абаронцай усіх славянскіх народаў.

Сярод дробнабуржуазных партый панавалі абаронніцкія погляды. Большасць эсэраў і меншавікоў прытрымліваліся лозунга “абароны радзімы ад прускіх варвараў”. Невялікая група меншавікоў-інтэрнацыяналістаў на чале з Ю. Мартавым выступіла з асуджэннем урадаў ваюючых краін. Сярод меншавікоў меў месца і правасацыялістычны напрамак. Яго ўзначальваў Г.В. Пляханаў. Ён лічыў, што Расія вядзе праўдзівую вайну, што адказнасць за яе павінен несці той, хто яе распачаў.

У партыі эсэраў таксама вызначылася тры напрамкі ў адносінах да вайны: сацыял-шавіністычны, які падтрымліваў ўрад, цэнтрысцкі, які прапагандаваў лозунг “без пераможцаў і без паражэнцаў”, і левы, які выступаў супраць вайны, за мір, зямлю і волю.

Найбольш радыкальнае стаўленне да вайны заняла партыя бальшавікоў. У жніўні 1914 г. У.І. Ленін напісаў тэзісы аб вайне “Задачы рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі ў еўрапейскай вайне”. Тэзісы з’явіліся асновай маніфеста ЦК РСДРП “Вайна і расійская сацыял-дэмакратыя”. Гэта была праграма партыі бальшавікоў, у якой вызналася палітычная лінія ў адносінах да вайны. Сутнасць яе заключалася ў трох лозунгах. Першым і галоўным з іх быў лозунг “ператварыць імперыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую”. Другім лозунгам бальшавікоў стаў лозунг “паражэння “сваіх” урадаў у імперыялістычнай вайне”. Трэцім – заклік да “поўнага разрыву з II Інтэрнацыяналам, стварэння III, Камуністычнага Інтэрнацыянала”. Трэба адзначыць, што апошні лозунг не падтрымала ніводная з еўрапейскіх сацыял-дэмакратычных партый.

## § 2. Беларусь у гады першай сусветнай вайны

Згодна з распрацаванымі планамі ваенных дзеянняў Германія разлічвала спачатку разбіць Францыю, а затым Расію. Уварваўшыся праз тэрыторыю нейтральнай Бельгіі ў межы Францыі, немцы стварылі рэальную пагрозу для Парыжа.

Расія планавала нанесці галоўны ўдар па Аўстра-Венгрыі ў напрамку Галіцыі, што давала магчымасць пранікнуць на Балканы і да праліваў Басфор і Дарданелы.

З пачатку 1915 г. асноўныя сілы Германіі знаходзіліся на Усходнім фронце. У выніку нямецкага наступлення расійскія войскі ў чэрвені 1915 г. пакінулі Галіцыю, страціўшы каля 600 тыс. палоннымі, забітымі, параненымі. Захапіўшы Галіцыю, Германія сканцэнтравала галоўныя сілы на польскім тэатры ваенных дзеянняў. Расійскія войскі, церпячы паражэнне за паражэннем у Польшчы, у ліпені 1915 г. здалі Варшаву. Пры наступленні на Варшаву германскае камандаванне ўпершыню выкарыстала газавую атаку, у выніку якой загінула 9 тыс. расійскіх салдат.

**Акупацыя немцамі Заходняй Беларусі.** Фронт імкліва набліжаўся да Беларусі. У ***жніўні 1915 г.*** пачалося нямецкае наступленне ў напрамку Коўна –

Вільня – Мінск. Пасля няўдалай спробы ўзяць Вільню нямецкія войскі пачалі новае наступленне і 9 верасня 1915 г. прарвалі фронт у ваколіцах Свянцян. Пранікнуўшы ў тыл расійскіх войск, немцы захапілі Вілейку і наблізіліся да Маладзечна. Асобныя нямецкія злучэнні дайшлі аж да Смалявіч і Барысава. Стаўка расійскага Вярхоўнага галоўнакамандуючага была пераведзена з Баранавіч у Магілёў.

У сярэдзіне верасня 1915 г. наступленне нямецкіх войск было спынена. У ваколіцах Маладзечна, Вілейкі і Смаргоні вораг быў разбіты. Немцы адступілі ў раён азёр Нарач – Свір. 810 дзён і начэй ішлі ўпартыя баі за г. Смаргонь, які быў цалкам разбураны і ўвайшоў у гісторыю як “мёртвы горад” і “месца жорсткіх газавых атак немцаў”. Нездарма тады салдаты гаварылі: “Кто под Сморгонью не бывал, тот войны не видал”.

У ***кастрычніку 1915 г.*** фронт стабілізаваўся па лініі ***Дзвінск – Смаргонь – Баранавічы – Пінск***. Чацвёртая частка тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам звыш 2 млн. чалавек апынулася пад германскай ***акупацыяй***.

**Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.** Напярэдадні і ў першыя дні вайны заходнія, у тым ліку беларускія губерні, былі аб’яўлены на ваенным становішчы. Забараняліся забастоўкі, сходы, шэсці, маніфестацыі, уводзілася ваенная цэнзура. У сувязі з наступленнем германскіх войск рушыў на ўсход вялікі паток бежанцаў з Польшчы, Літвы і заходніх паветаў Беларусі (больш за 1,3 млн. чалавек).

На абаронныя работы (капанне акопаў, будаўніцтва мастоў, рамонт дарог, ахову вайсковых аб’ектаў і інш.) прыцягвалася ўсё насельніцтва прыфрантавой паласы. Пачаліся масавыя ***рэквізіцыі*** жывёлы, прадуктаў харчавання і фуражу. Рэквізіцыі і прымусовыя работы на патрэбу фронту праводзілі і германскія ўлады. Акупанты сілай забіралі ў сялян коней, кароў, іншую жывёлу, прадукты, фураж, адзенне, абутак, прымушалі выконваць розныя павіннасці.

Асабліва цяжка адбівалася вайна на гаспадарцы. На неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1914 – 1917 гг. з-за адсутнасці сыравіны і паліва колькасць буйных прадпрыемстваў скарацілася з 829 да 297, а рабочых з – 37,7 тыс. да 25,1 тыс. Разам з тым асобныя галіны (швейная, абутковая, металаапрацоўчая і інш.), што выконвалі ваенныя заказы, значна павялічылі выпуск прадукцыі. Былі перабудаваны многія фабрыкі і заводы, а таксама створана шмат часовых прадпрыемстваў і майстэрань, якія абслугоўвалі армію. На вытворчасць боепрыпасаў, транспартных сродкаў і іншага вайсковага рыштунку былі пераключаны ўсе прадпрыемствы металаапрацоўчай прамысловасці. Снарады і гранаты выраблялі 5 заводаў у Мінску і тры ў Гомелі. Бомбы выраблялі Рэчыцкі і Аршанскі драцяна-цвіковыя заводы. У Гомелі, Оршы, Віцебску, Мінску і іншых пунктах былі створаны майстэрні для вырабу і рамонту зброі і транспартных сродкаў.

У некалькі разоў павялічылі аб’ём вытворчасці прадпрыемствы хлебапякарна-сухарнай прамысловасці. Вялікія заказы ваеннага ведамства па забеспячэнні арміі вопраткай і абуткам выконваліся на Віцебскай

ільнопрадзільнай фабрыцы "Дзвіна", Дубровенскай бавоўна-прадзільнай фабрыцы, Магілёўскай панчошнай фабрыцы, іншых прадпрыемствах, а таксама ў дробных майстэрнях і асобнымі саматужнікамі.

У выключна цяжкім становішчы апынулася сельская гаспадарка Беларусі. Больш за палову ўсіх працаздольных мужчын беларускай вёскі было мабілізавана і адпраўлена на фронт. Толькі з Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў было прызвана ў армію 634 400 чалавек. За гады вайны скараціліся пасяўныя плошчы Беларусі: жыта – на 18,7 %, пшаніцы – на 22,1 %, бульбы – на 34,2 %.

З-за моцнага заняпаду сельскай гаспадаркі амаль перасталі паступаць на рынак прадметы першай неабходнасці, што выклікала рост цэн, зніжэнне жыццёвага ўзроўню народа. Цэны на прадукты харчавання і адзенне ў Беларусі да 1917 г. павялічыліся ў 5 – 8 разоў у параўнанні з 1913 г. Ва ўмовах надзвычайнай галечы, вялікай скучанасці насельніцтва і голаду ў прыфрантавых губернях шырока распаўсюдзіліся розныя эпідэмічныя хваробы – тыф, халера і інш.

Пачынаючы з 1915 г., у Беларусі нарастаў рабочы рух. У красавіку 1915 г. адбылося выступленне рабочых і служачых Гомельскага чыгуначнага вузла. Летам таго ж года баставалі рабочыя дэпо Лібава-Роменскай чыгункі ў Гомелі. У 1916 г. стачачны рух ахапіў 11 населеных пунктаў Беларусі, у ім удзельнічала 1 800 чалавек. Асноўным патрабаваннем стачачнікаў з'яўлялася павышэнне заработнай платы.

Аднак стачкі ў Беларусі адбываліся разрознена, у іх удзельнічала толькі частка рабочых. Масавага рабочага руху не назіралася. Гэта было абумоўлена прыфрантавым становішчам Беларусі, перанасычанасцю яе тэрыторыі войскамі, паліцыяй, жандармерыяй. Арганізатараў стачак арыштоўвалі і накіроўвалі на фронт.

Сялянскі рух у Беларусі ў гады вайны набыў своеасаблівую форму – разгром памешчыцкіх маёнткаў, харчовых магазінаў і лавак. У пачатку вайны падобныя выпадкі адбыліся ў 20 з 35 паветаў Беларусі. Па сутнасці, гэта былі стыхійныя пагромы, якія суправаджаліся рабаваннем маёмасці памешчыкаў і гандляроў. Значна пашырыліся сялянскія хваляванні ў 1915 г. у сувязі з перанясеннем баявых дзеянняў на тэрыторыю Беларусі і ростам рэквізіцый. На працягу 1915 г. адбылося 99 сялянскіх выступленняў. У 1916 г. іх колькасць зменшылася да 60, у студзені – лютым 1917 г. – да 7.

Ваенныя паражэнні расійскай арміі, велізарныя людскія страты выклікалі незадаволенасць салдат. У войсках успыхнулі хваляванні, звязаныя з дрэнным забеспячэннем прадуктамі харчавання і абмундзіраваннем, недахопам зброі і боепрыпасаў. Усяго ў Беларусі ў перыяд вайны адбыліся 62 значныя хваляванні салдат. Павялічвалася дэзерцірства. Цэлыя вайсковыя часці і злучэнні адмаўляліся ісці ў наступленне. Узмацнілася антыўрадавая агітацыя сярод салдат.

22 кастрычніка 1916 г. адбылося паўстанне салдат, казакоў і матросаў на размеркавальным пункце ў Гомелі. Паўстанне ўспыхнула ў сувязі з арыштам

аднаго з казакоў. На яго абарону выступілі каля 4 тыс. салдат і матросаў, якія абяззброілі каравул гаўптвахты і вызвалілі з-пад арышту больш за 800 чалавек. 26 кастрычніка салдаты-паўстанцы разагналі паліцэйскі атрад, які займаўся вобыскамі. Паустанцы былі жорстка пакараны. Да суда было прыцягнута 16 чалавек. З іх 9 было расстраляна, а астатнія адпраўлены на катаргу і ў арыштанцкія роты. Але спыніць працэс разлажэння арміі ўжо было нельга, яна паступова станавілася небаяздольнай.

## § 3. Беларускі нацыянальны рух

У гады вайны адбыліся значныя змены ў беларускім нацыянальным руху. Усе даваенныя беларускія нацыянальна-культурныя арганізацыі распаліся. Была закрыта газета "Наша ніва". Ва ўсходняй, неакупіраванай частцы Беларусі нацыянальны рух быў спынены. На захопленай Германіяй тэрыторыі вядомыя беларускія дзеячы, браты Іван і Антон Луцкевічы, В. Ластоўскі і іншыя выступілі з ідэяй стварэння канфедэрацыі Літвы і Заходняй Беларусі ў форме Вялікага княства Літоўскага з сеймам у Вільні. У лютым 1916 г. была распаўсюджана адозва "Грамадзяне!", у якой намячалася стварэнне самастойнай дзяржавы з соймам у Вільні.

Аднак утварыць канфедэрацыю не ўдалося. Германскі ўрад не быў зацікаўлены ў такой дзяржаве. Акупіраваўшы Вільню, германскае камандаванне абвясціла аб тым, што беларускія землі будуць падпарадкоўвацца "Польскай Кароне". У сувязі з гэтым польскія памешчыкі і ксяндзы, карыстаючыся падтрымкай акупантаў, пачалі настойліва ажыццяўляць паланізацыю беларускага насельніцтва. На акупіраванай беларускай тэрыторыі была створана шырокая сетка польскіх школ, розных згуртаванняў польскай "злучнасці". Прымусовая ***паланізацыя*** выклікала абурэнне мясцовага насельніцтва. Пачаліся спрэчкі паміж палякамі і беларусамі. Гэта прывяло да адмаўлення ідэі ўтварэння канфедэратыўнай дзяржавы Польшчы і Беларусі. Больш таго, у самім беларускім нацыянальным руху адбыўся раскол. Група беларускіх дзеячаў на чале з ***В. Ластоўскім*** заснавала тайную арганізацыю ***"Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі"***, якая ставіла сваёй мэтай утварыць незалежную Беларусь у яе этнаграфічных межах.

Германія, намагаючыся ўмацаваць сваю ўладу на акупіраванай тэрыторыі, ажыццявіла адпаведныя захады, каб, з аднаго боку, не даць магчымасці стварыць тут самастойную дзяржаву, а з другога – прадухіліць польскае засілле на гэтых землях. У пачатку 1916 г. у германскім загадзе аб школах акупіраванага краю беларуская мова абвяшчалася раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай мовамі. Беларускі нацыянальны рух значна ажывіўся.

На акупіраванай тэрыторыі былі адчынены беларускія школы, створаны выдавецтвы. Пачалося выданне на беларускай мове газет, часопісаў. Стала выходзіць газета ***"Гоман"***. У Вільні былі створаны ***"Беларускі клуб"***, згуртаванне ***"Золак"***, ***"Навуковае таварыства"***, ***"Беларускі вучыцельскі саюз"*** і інш. Кіраваў усёй гэтай работай створаны ў 1915 г. у Вільні ***Беларускі

***народны камітэт***, які ўзначальваў А. Луцкевіч. Прадстаўнікі камітэта прынялі ўдзел у рабоце канферэнцый прыгнечаных народаў Расіі, якія былі арганізаваны немцамі ў Стакгольме і Лазане ў красавіку і чэрвені 1916 г. Там яны прасілі дапамогі ў народаў Еўропы ў вызваленні беларускага народа “з-пад расійскай акупацыі”.

У канцы 1916 г. Беларускі народны камітэт спрабаваў дамовіцца з ***Літоўскім нацыянальным камітэтам*** аб утварэнні агульнай літоўска-беларускай дзяржавы. Аднак Літоўскі нацыянальны камітэт адмовіўся ад перагавораў, канчаткова разарваў сувязь не толькі з Беларускім народным камітэтам, але і з польскім і яўрэйскім нацыянальнымі камітэтамі і ўтварыў у Вільні Літоўскую дзяржаўную раду (Тарыбу) як вярхоўны дзяржаўны орган Літвы. У склад гэтай літоўскай дзяржавы былі ўключаны і акупіраваныя Германіяй беларускія землі. Беларусь атрымала ў Тарыбе два месцы.

Паступова галоўнымі цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху па-за межамі краю сталі Петраград, Масква і іншыя расійскія гарады, дзе бежанцы-беларусы ўтварылі свае суполкі. У кастрычніку 1916 г. Міністэрства ўнутраных спраў Расіі дазволіла выданне ў Петраградзе беларускіх газет ***“Дзянніца”*** і ***“Светач”***.

Газета “Светач” прапагандавала ідэі адзінства беларусаў незалежна ад іх класавай прыналежнасці, заклікала ўсе грамадскія сілы да ажыццяўлення “беларускага нацыянальнага ідэалу”. Аднак газета не мела вялікага ўплыву на развіццё беларускага нацыянальнага руху. У пачатку 1917 г. яе выданне спынілася.

Газету “Дзянніца” выдаваў на свае сродкі З. Жылуновіч. Яна ўздымала вострыя сацыяльныя праблемы, пытанні развіцця беларускай культуры, асуджала палітыку нямецкіх акупацыйных улад, прапагандавала думку, што свабоднае развіццё беларускага народа магчыма толькі ў саюзе з рускім народам. У газеце друкаваліся творы З. Жылуновіча, К. Буйло, К. Чарнушэвіча, Ф. Шантыра і іншых дзеячаў, якія стаялі на рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцыях. Рэвалюцыйна-нацыянальны кірунак газеты выклікаў падазронасць у цэнзуры. Цэнзары выкідалі з газеты ўсе матэрыялы аб становішчы ў Беларусі, абвінавачвалі газету ў тым, што яна нібыта служыла Германіі. У снежні 1916 г. “Дзянніца” перастала выходзіць.

Далейшай актывізацыі беларускага нацыянальнага руху спрыяла Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.

### § 4. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. Перамога рэвалюцыі на Беларусі

Лютаўская рэвалюцыя – з’ява сусветна-гістарычнага значэння. З аднаго боку, яна падвяла рысу пад шматвяковай гісторыяй расійскай манархіі, а з другога – адкрыла шлях да дэмакратычнага развіцця Расіі. Пачатак ёй паклалі масавыя забастоўкі, мітынгі і дэманстрацыі ў Петраградзе, праведзеныя ***23 лютага 1917 г.*** у сувязі з Міжнародным жаночым днём. 25 лютага забастоўка

стала ўсеагульнай. На бок рабочых сталі пераходзіць салдаты. ***27 лютага*** рабочыя і салдаты захапілі Галоўны арсенал, тэлеграф, вакзалы, вызвалілі з турмаў палітычных зняволеных. Рэвалюцыя ў Петраградзе перамагла. ***2 сакавіка 1917 г.*** імператар Мікалай II быў вымушаны адмовіцца ад улады.

Па свайму характару рэвалюцыя была буржуазна-дэмакратычнай. Але ў адрозненне ад рэвалюцыі 1905–1907 гг. яна перамагла. Галоўная яе задача – зваржэнне самадзяржаўя – была выканана. Рухаючай сілай рэвалюцыі з'яўляўся народ. Асаблівасцю рэвалюцыі было тое, што яна непаслядоўна вырашыла пытанне аб уладзе. У выніку ў краіне ўстанавілася ***двоеўладдзе***.

Пасля перамогі паўстання па ўсёй краіне пачалі ствараццa ***Саветы***, якія і сталі органамі ўлады. Большасць у Саветах склалі меншавікі і эсэры. У той жа час быў створаны з дэпутатаў IV Дзяржаўнай думы ***Часовы камітэт*** на чале з адным з кіраўнікоў акцябрыстаў М. Радзянкам. Мэта – "навесці парадак у краіне", што азначала ўзяць усю ўладу ў свае рукі. Але зрабіць гэта было цяжка, таму што Петраградскі Савет выдаў ***1 сакавіка 1917 г.*** загад, па якому ўсе вайсковыя злучэнні пераходзілі ў яго падпарадкаванне. ***2 сакавіка*** на аснове згоды паміж Часовым камітэтам Думы і меншавіцка-эсэраўскім кіраўніцтвам Петраградскага Савета быў створаны ***Часовы ўрад на чале з князем Г. Львовым.*** Пасаду міністра замежных спраў заняў лідэр кадэтаў П. Мілюкоў, вайсковых спраў – лідэр акцябрыстаў А. Гучкоў. Іншыя члены ўрада таксама былі з ліку вядомых дзеячаў партый кадэтаў і акцябрыстаў. Выключэнне склаў сацыяліст А. Керанскі, які заняў пасаду міністра юстыцыі і адначасова з'яўляўся намеснікам старшыні Петраградскага Савета.

Так у краіне ўстанавілася двоеўладдзе: улада буржуазіі, якую ўвасабляў Часовы ўрад, і рэвалюцыйна-дэмакратычная ўлада пралетарыяту і сялянства – Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Звесткі аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе прыйшлі ў Беларусь ***1–4 сакавіка 1917 г.*** Рабочыя, сяляне, салдаты віталі пралетарыят Петраграда і выказалі намер падтрымаць рэвалюцыю. Па прыкладу Петраграда ў гарадах і мястэчках Беларусі пачалі ствараццa ўзброеныя атрады. Баявыя дружыны мінскіх рабочых 2 сакавіка вызвалілі з турмы 400 палітычных зняволеных. Былі арыштаваны камандуючы мінскай ваеннай акругі, начальнік штаба, камендант горада. Створаная ***4 сакавіка міліцыя***, якую ўзначаліў ***М.В. Фрунзе***, узяла пад ахову ўрадавыя ўстановы, пошту і тэлеграф.

Асаблівая ўвага была звернута на ўтварэнне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У Мінску ўжо 4 сакавіка адбылося першае пасяджэнне выбраных дэпутатаў, дзе быў створаны Мінскі Савет рабочых дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт. Каб аб'яднаць сілы пралетарыяту і салдат, 8 сакавіка быў створаны адзіны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і адзіны выканаўчы камітэт.

Саветы былі створаны і ў іншых гарадах Беларусі. На працягу сакавіка – красавіка 1917 г. арганізацыйна аформілася 37 Саветаў. Сваю асноўную задачу Саветы бачылі ў арганізацыі рабочых і салдат, у абароне іх эканамічных інтарэсаў і палітычных правоў. Саветы актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні

народнай міліцыі, фабрычна-заводскіх камітэтаў і прафсаюзаў рабочых і служачых, салдацкіх камітэтаў у войску, сялянскіх у вёсцы. Саветы ў Беларусі прызнавалі кіруючую ролю Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Разам з тым яны прызнавалі і Часовы ўрад. Больш таго, яны дапамагалі Часоваму ўраду ствараць яго мясцовыя органы ўлады. Амаль ва ўсіх гарадах Беларусі былі створаны буржуазныя “***грамадскія камітэты парадку***”. Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў не толькі прызналі іх, але нават накіравалі сваіх прадстаўнікоў у гэтыя камітэты, фактычна падпарадкоўваючыся ім. Праваднікамі такой палітыкі ў Саветах былі эсэры, меншавікі і бундаўцы, якія складалі пераважную большасць дэпутатаў. ***4 сакавіка 1917 г.*** ў Мінску быў створаны “***Часовы грамадскі камітэт парадку***”, у склад якога ўвайшлі і прадстаўнікі Мінскага Савета.

6 сакавіка 1917 г. Часовы ўрад перадаў уладу ў губернях і паветах сваім камісарам, якія выконвалі функцыі губернатараў. Ім падпарадкоўваліся ўсе мясцовыя органы ўлады.

У першыя дні рэвалюцыі пачалі стварацца прафсаюзы, якія павялі барацьбу за паляпшэнне эканамічнага становішча працоўных, скарачэнне рабочага дня, павелічэнне зарплаты і інш.

Рэвалюцыя паклала пачатак дэмакратызацыі войска. Сталі стварацца выбарныя салдацкія камітэты, якія павінны былі забяспечыць магчымасць для салдат удзельнічаць у палітычным жыцці краіны, садзейнічаць росту іх культурнага ўзроўню і палітычнай свядомасці.

***7–17 красавіка 1917 г.*** у Мінску адбыўся ***I з’езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту***. Адным з галоуных арганізатараў з’езда быў Мінскі Савет рабочых і салдатскіх дэпутатау. З’езд прызнаў неабходным для Расіі працягваць вайну з мэтай абароны рэвалюцыі.

***20 красавіка 1917 г.*** у Мінску адкрыўся з’езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і неакупіраваных Германіяй паветаў Віленскай губерні. Старшынёй з’езда быу абраны М. Фрунзе. Дэлегаты з’езда выступілі за пераход усёй зямлі ў агульнанародную ўласнасць і ўраўняльнае землекарыстанне па працоўнай норме, за адмену прыватнай уласнасці на зямлю, забарону яе куплі-продажу. Канчатковае заканадаўчае вырашэнне аграрнага пытання з’ездам адкладвалася да ***Устаноўчага сходу***. Як бачым, у вырашэнні аграрнага пытання з’езд стаяў на эсэраўскіх пазіцыях. За эсэрамі пайшлі сялянскія з’езды Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

Такім чынам, Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя з’явілася пачаткам дэмакратычнага развіцця Расіі, у тым ліку і Беларусі, адкрыла шлях да эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу краіны.

# ГЛАВА 4. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

## § 1. Фарміраванне беларускай нацыі

**Умовы ўтварэння беларускай нацыі.** ***Нацыя*** (ад лац. *natio* – племя, народ) – гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца ўстойлівымі эканамічнымі і тэрытарыяльнымі сувязямі, агульнасцю мовы, культуры, характару, побыту, традыцый, звычаяў, самасвядомасці. Нацыі ўзнікаюць на базе феадальных народнасцей у перыяд станаўлення капіталістычнага спосабу вытворчасці. Вырашальную ролю ў пераўтварэнні народнасцей у нацыі адыгрывалі капіталістычныя эканамічныя сувязі, фарміраванне ўнутранага рынку. Рэформа 1861 г., вызваліўшы сялян ад прыгоннай залежнасці, стварыла ўмовы для капіталістычнай перабудовы памешчыцкай і сялянскай гаспадарак. Рабочая сіла стала таварам, пашырыліся магчымасці яе міграцыі.

У працэсе станаўлення рыначнай эканомікі адбывалася разлажэнне саслоўяў феадальнага грамадства – дваран, сялян, рамеснікаў, гандляроў, купцоў і фарміраванне асноўных класаў капіталістычнага грамадства – пралетарыяту і буржуазіі. Сацыяльнай базай для фарміравання пралетарыяту з'явілася сялянская бедната, якой у Беларусі ў канцы XIX ст. налічвалася 2,8 млн. чалавек, дробныя рамеснікі і гандляры, збяднелыя мяшчане і шляхта. На рубяжы XIX – XX стст. у прамысловасці Беларусі працавала 237 тыс. рабочых, на чыгунцы – каля 25 тыс., у іншых сферах гаспадаркі (рачны і гужавы транспарт, будаўніцтва, гандаль, сельская і лясная гаспадарка і інш.) – каля 200 тыс., усяго налічвалася звыш 460 тыс. наёмных рабочых. Прамысловы пралетарыят Беларусі характарызаваўся шматнацыянальнасцю і адносна невысокай канцэнтрацыяй.

Гандлёва-прамысловая буржуазія Беларусі была таксама шматнацыянальнай, прычым большую яе частку складалі прадстаўнікі небеларускага этнічнага насельніцтва (яўрэйскія, польскія і рускія прамыслоўцы і купцы). Паводле перапісу насельніцтва 1897 г., 84,5 % купцоў пяці заходніх губерняў складалі яўрэі, 10,7 % – рускія і толькі 1,7 % былі беларусамі. Больш за палову фабрык і заводаў (51 %) з'яўлялася ўласнасцю яўрэйскай буржуазіі.

Беларуская нацыянальная буржуазія амаль цалкам складалася з заможных сялян і выхадцаў з дробнай шляхты. Яна была нешматлікай (у канцы XIX ст. у беларускай вёсцы налічвалася толькі каля 50 тыс. заможных гаспадароў), асноўныя капіталы краю – прамысловы, зямельны, гандлёвы, банкаўскі – знаходзіліся не ў яе руках, а ва ўласнасці яўрэйскіх, польскіх і рускіх прамыслоўцаў, памешчыкаў і купцоў. Раскіданая па вёсках, расколатая паводле канфесійнай прыналежнасці (праваслаўныя і католікі), беларуская нацыянальная буржуазія не ўсведамляла сваёй ролі ў нацыянальна-культурным адраджэнні і абыякава, іншы раз варожа ставілася да яго.

Слабасць нацыянальнай буржуазіі ў пэўнай ступені замаруджвала працэс кансалідацыі беларускай нацыі. Адмоўнае ўздзеянне на гэты працэс аказвала і

тое, што ў шматгранным жыцці беларускага горада ў XIX ст. не выкарыстоўвалася, за нязначнымі выключэннямі, беларуская мова.

**Этнічная тэрыторыя беларусаў.** У канцы XIX ст. паступова стабілізавалася этнічная тэрыторыя беларусаў. Асновай яе ўтварэння стала наладжванне і развіццё гаспадарчых сувязей, якія пераадолелі эканамічную замкнёнасць асобных раёнаў і звязалі іх у адно кампактнае цэлае. Этнічная тэрыторыя беларусаў уваходзіла ў межы пяці заходніх губерняў Расійскай імперыі. Яна ўключала поўнасцю Магілёўскую і Мінскую губерні; Ашмянскі, Вілейскі, Дзісенскі, Лідскі і паўднёвую частку Свянцянскага павета Віленскай губерні; Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі і Полацкі паветы Віцебскай губерні; Брэсцкі, Ваўкавыскі, Пружанскі, Гродзенскі, Кобрынскі і Слонімскі паветы Гродзенскай губерні.

Галоўным арэалам кансалідацыі беларускай нацыі былі цэнтральная і паўночна-заходняя часткі Беларусі, найбольш развітыя ў эканамічных, сацыяльных, палітычных і культурных адносінах. Тут пражывала амаль палова пісьменных беларусаў, адсюль выйшла большасць дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і культуры таго перыяду. Сярэднебеларускія гаворкі склалі аснову беларускай літаратурнай мовы.

Працэс фарміравання беларускай нацыі закрануў і насельніцтва Палесся, якое, аднак, захоўвала моўныя і культурныя асаблівасці. На тэрыторыі ўсходняй часткі Беларусі працэсы нацыянальнай кансалідацыі ішлі больш запаволена, тут адчуваўся больш моцны расійскі ўплыў.

**Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі.** Паводле перапісу 1897 г., на тэрыторыі пяці заходніх губерняў пражывала 5 млн. 408 тыс. беларусаў, 3,1 млн. рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў. Польскае і літоўскае насельніцтва канцэнтравалася ў асноўным у заходніх паветах Гродзенскай і Віленскай губерняў, рускае і латышскае – у паўночных паветах Віцебскай губерні, украінскае – у Кобрынскім і Брэсцкім паветах Гродзенскай губерні. Яўрэйскае насельніцтва пражывала на ўсёй тэрыторыі Беларусі, у гарадах і мястэчках. Сярод гараджан пяці заходніх губерняў яўрэі складалі 53,5 %, а ва ўсім насельніцтве – 13,8 %.

Абсалютная большасць беларусаў жыла ў сельскай мясцовасці (больш за 90 %). Доля тых беларусаў-гараджан, якія гаварылі на роднай мове, складала ў сярэднім толькі 14,5 %. Асаблівасцю беларусаў як этнасу быў падзел паводле канфесійнай прыналежнасці на праваслаўных і католікаў. Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл не прызнавалі існавання беларускага этнасу, лічачы, што праваслаўныя беларусы ёсць рускія, а беларусы-католікі – палякі. У 1897 г. праваслаўныя сярод беларусаў складалі 81,2 %.

За 40 паслярэформенных гадоў колькасць жыхароў Беларусі падвоілася. У пачатку XX ст. прырост насельніцтва некалькі паменшыўся. Гэта было звязана з развіццём міграцыйных працэсаў у выніку класавай дыферэнцыяцыі і аграрнай перанаселенасці беларускай вёскі.

**Станаўленне беларускай літаратурнай мовы.** У другой палове XIX – пачатку XX ст. працягваўся працэс фарміравання мовы беларускай нацыі. Значныя змены адбыліся ў гутарковай мове. Ішло паступовае змешванне мясцовых дыялектаў, з'яўляліся новыя словы і тэрміны, паланізмы замяняліся русізмамі. Асабліва моцны ўплыў рускай мовы адчуваўся ў фанетычным складзе паўночна-ўсходніх беларускіх гаворак.

На аснове жывой гутарковай народнай мовы фарміравалася новая беларуская літаратурная мова. Яна не магла развівацца на базе старабеларускай мовы, якая з XVIII ст. фактычна стала мёртвай. Таму ў новых гістарычных абставінах крыніцай развіцця беларускай літаратурнай мовы з'явілася вусная народная творчасць. Беларускія пісьменнікі і паэты ў сваіх літаратурных творах шырока выкарыстоўвалі народныя песні, казкі, прыказкі, прымаўкі, загадкі.

Беларуская літаратурная мова развівалася галоўным чынам як мова мастацкай літаратуры і часткова публіцыстыкі. У ёй пераважала пабытавая лексіка, была слаба прадстаўлена вытворчая, юрыдычная, адміністрацыйна-канцылярская тэрміналогія. Істотнай перашкодай развіццю беларускай пісьмовай мовы з'яўлялася адсутнасць яе нарматыўнай граматыкі. Але паступова ішоў працэс складвання графічнай сістэмы, правапісных і граматычных норм, узбагачэння лексікі беларускай літаратурнай мовы.

**Беларускае нацыянальнае мастацтва.** У сувязі са слабым развіццём прафесійнага мастацтва галоўную сферу духоўнай культуры беларускай нацыі перыяду фарміравання капіталізму складалі народныя формы мастацтва, традыцыйныя абрады і звычаі. Працягвалі існаваць такія віды фальклору, як абрадавая паэзія каляндарна-вытворчага і сямейна-абрадавага цыклаў, апавядальны жанр, лірычная паэзія. Фальклор адлюстроўваў сацыяльнае палажэнне простага народа, надаючы сацыяльную вастрыню прыпеўкам, песням, казкам і апавяданням. Узнікаў так званы рабочы рэвалюцыйны фальклор. Развівалася народнае тэатральнае мастацтва з захаваннем традыцыі батлейкі. Працоўная дзейнасць народа знайшла сваё адлюстраванне ў танцах "Лянок", "Бульба", "Бычок", "Крыжачок" і інш. У тэатралізаваных прадстаўленнях і на абрадавых святах народныя музыкі на дудках, свірэлях, дудах, гуслях, цымбалах, скрыпках, бубнах выконвалі шматлікія песні і прыпеўкі.

Адметнасць беларускага этнасу адлюстроўвалася ў своеасаблівым народным выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Па-мастацку аздобленыя рэчы з глыбокай даўніны ўкараніліся ў побыце народа. Мелі распаўсюджанне ўзорыстае ткацтва, вышыўка, вязанне, пляценне з лазы, саломкі і карэнняў. Своеасаблівай рысай беларускіх тканін было выкарыстанне ў арнаменце пераважна геаметрычных форм – чатырохвугольніка, ромба, квадрата і іх частак. Выдатныя ўзоры беларускага мастацкага ткацтва ўяўлялі паясы. У афармленні жылых памяшканняў таксама выкарыстоўвалася мастацкае аздабленне: набылі распаўсюджанне разныя і размаляваныя ліштвы, фрызы, франтоны, канькі.

**Этнічная і нацыянальная самасвядомасць.** Кансалідацыя беларускага этнасу ў нацыю суправаджалася ростам нацыянальнай самасвядомасці. З другой паловы XIX ст. сталі ўсё больш актыўна ўжывацца назва "Беларусь" і этнонім "беларусы". Паводле перапісу 1897 г., беларускую мову лічылі роднай 74 % насельніцтва Беларусі. Этнонім "беларусы" паступова выцясняў лакальныя тэрміны "ліцвіны", "чарнарусы". Аднак ён не меў яшчэ агульнаэтнічнага зместу. Існавалі рэгіянальныя назвы (палешукі), канфесіянізмы (рускія і палякі). Фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці садзейнічалі публікацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. фундаментальных навуковых прац, прысвечаных беларускаму народу, яго мове, культуры і гістарычнаму мінуламу. Працы І.І. Насовіча, М.А. Дзмітрыева, Ю.Ф. Крачкоўскага, А.М. Семянтоўскага, М.Я. Нікіфароўскага, Я.Ф. Карскага, Е.Р. Раманава і іншых аўтараў аб'ектыўна засведчылі факт існавання самастойнага беларускага этнасу. Важнае значэнне на шляху абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў адыгралі працы В.Ю. Ластоўскага, асабліва яго "Кароткая гісторыя Беларусі", дзе ўпершыню беларускі этнас разглядаўся як суб'ект гістарычнага працэсу.

Такім чынам, у другой палове XIX – пачатку XX ст. працягваўся і ў асноўным завяршыўся працэс фарміравання беларускай нацыі як сялянскай па сваёй прыродзе. Адмоўнае ўздзеянне на гэты працэс аказвалі слабасць нацыянальнай буржуазіі, беднасць і непісьменнасць большасці беларусаў, рэлігійны раскол і антыбеларуская скіраванасць праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла, школы, друку, дзяржаўных устаноў, якія адмаўлялі існаванне беларускага этнасу і ўсіх беларусаў лічылі альбо рускімі, альбо палякамі. Да пачатку XX ст. цалкам не завяршыліся складванне нацыянальнай літаратурнай мовы і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Гэтыя працэсы працягваліся ў наступныя дзесяцігоддзі XX ст.

## § 2. Развіццё адукацыі, навукі, друку

**Сістэма адукацыі.** Капіталістычнае развіццё Расіі пасля адмены прыгоннага права патрабавала ўдасканалення сістэмы народнай адукацыі. Таму разам з іншымі буржуазнымі рэформамі ў 60–70-я гг. XIX ст. быў праведзены шэраг рэформ у галіне адукацыі Расійскай імперыі, якія закранулі і Беларусь.

Да 60-х гг. XIX ст. сістэма адукацыі характарызавалася featурознатыповасцю навучальных устаноў. У мэтах уніфікацыі іх дзейнасці большасць навучальных устаноў перайшла ў падпарадкаванне Міністэрства народнай асветы. Былі закрыты дваранскія павятовыя вучылішчы, якія існавалі ў заходніх губернях. Пачатковымі школамі ў вёсках сталі народныя вучылішчы, у гарадах – гарадскія вучылішчы. Асноўнымі тыпамі сярэдніх навучальных устаноў сталі класічныя гімназіі і рэальныя вучылішчы, прызначаныя для мужчын, а таксама жаночыя гімназіі. Школьныя рэформы рэгламентавалі дзейнасць не толькі дзяржаўных навучальных устаноў, але і дазвалялі адкрыццё школ на сродкі

грамадскіх арганізацый ці прыватных асоб. Гэта садзейнічала дынамічнаму развіццю прыватнай адукацыі.

Ажыццяўленне школьных рэформ супала з правядзеннем палітычнага курсу на далейшае пашырэнне рускага ўплыву на беларускіх землях пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. За ўдзел выкладчыкаў, студэнтаў і навучэнцаў у паўстанні былі закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут, Навагрудская гімназія, Свіслацкая і Маладзечанская прагімназіі. Былі ліквідаваны польскія школы, у навучальных установах забаранялася выкладанне польскай мовы. Усім выкладчыкам загадвалася клапаціцца, каб у сценах школ гутарковай мовай была руская.

Змены ў сістэме адукацыі Беларусі прывялі да ўстойлівага росту колькасці навучальных устаноў на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. Калі ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. ва ўсіх навучальных установах Беларусі навучалася прыкладна 16,5 тыс. чалавек (0,5 % усяго насельніцтва), то ў 1900 г. у Віленскай навучальнай акрузе было 248 тыс. навучэнцаў, а ў 1914 г. іх лічба дасягнула 490 тыс. чалавек.

Аднак, нягледзячы на станоўчыя дасягненні народнай асветы, як Расійская імперыя ў цэлым, так і Беларусь адставалі ад краін Заходняй Еўропы па асноўных паказчыках развіцця адукацыі. Так, па перапісу 1897 г. агульная колькасць пісьменных у Беларусі складала толькі 25,7 %. Працэнт навучэнцаў сярод дзяцей школьнага ўзросту быў невысокі.

У галіне ***пачатковай адукацыі*** ўрадавая палітыка была накіравана на тое, каб значную частку затрат на ўтрыманне народных вучылішч перакласці на сялян. Шырока практыкаваўся збор сельскай грамадой грашовых сродкаў на будаўніцтва і ўтрыманне народных вучылішч. У выніку большая частка школ знаходзілася ў непрыстасаваных для заняткаў сялянскіх хатах, адчуваўся недахоп вучэбных дапаможнікаў, а таксама кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў. Акрамя гэтага, featнатыповасць пачатковых школ, розныя навучальныя праграмы і тэрміны навучання зніжалі якасць падрыхтоўкі, ставячы вучняў у нераўнапраўнае становішча. Толькі выпускнікам гарадскіх чатырохкласных вучылішч дазвалялася паступаць у сярэднія навучальныя ўстановы, але пры ўмове дадатковай падрыхтоўкі па замежных мовах. Выхаванцы астатніх пачатковых школ такога права не мелі.

***Сярэдняя адукацыя*** заставалася прывілеяй пануючых класаў. Навучанне ў сярэдніх навучальных установах з'яўлялася платным. Плата за навучанне ў прыватных школах была значна вышэйшай, чым у дзяржаўных навучальных установах. Сацыяльны склад навучэнцаў сярэдніх школ быў абумоўлены абмежаванасцю колькасці асоб з неабходнай адукацыяй, даволі высокай платай за навучанне, некаторымі пастановамі ўрада. Напрыклад, цыркуляр ад 1887 г., празваны ў народзе "цыркулярам пра кухарчыных дзяцей", прадпісваў не прымаць у гімназіі і прагімназіі дзяцей кучараў, лакеяў, павароў, прачак, дробных крамнікаў.

***Класічныя мужчынскія гімназіі*** давалі грунтоўную гуманітарную падрыхтоўку, асаблівая ўвага надавалася выкладанню так званых класічных моў – грэчаскай і лацінскай. Толькі выпускнікі гімназій мелі выключнае права паступлення ва універсітэты. У ***рэальных вучылішчах*** галоўнае месца адводзілася дысцыплінам прыродазнаўча-матэматычнага цыкла. Выпускнікі рэальных вучылішч маглі паступаць у тэхнічныя, гандлёвыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Выхаванкі ***жаночых гімназій*** атрымлівалі атэстат на званне настаўніцы пачатковай школы. Выпускніцам восьмага педагагічнага класа жаночых гімназій давалася права працаваць у якасці дамашніх настаўніц.

У пачатку XX ст. у Расійскай імперыі ў цэлым, а таксама і на тэрыторыі Беларусі адбываецца імклівы рост колькасці пачатковых (народных вучылішч і царкоўна-прыходскіх школ) і сярэдніх (гімназій і рэальных вучылішч) агульнаадукацыйных школ. Пры гэтым разам з дзяржаўнымі навучальнымі ўстановамі адкрываюцца прыватныя школы і вучылішчы.

У гэты перыяд склалася сістэма прафесійнай адукацыі. Колькасны рост агульнаадукацыйных школ вылучаў на першы план праблему падрыхтоўкі настаўнікаў. Калі да 1900 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 4 ***настаўніцкія семінарыі***, то ў 1916 г. іх было ўжо 12. Для падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў былі адкрыты тры ***настаўніцкія інстытуты*** – у Віцебску, Мінску, Магілёве. Акрамя таго, падрыхтоўка спецыялістаў у галіне народнай гаспадаркі і культуры ажыццяўлялася ***ў рамесных***, ***сельскагаспадарчых***, ***камерцыйных***, ***медыцынскіх***, ***музыкальных і мастацкіх*** навучальных установах. Вышэйшых навучальных устаноў у Беларусі не было. Расійскія ўлады неаднаразова адхілялі хадайніцтвы грамадскасці Беларусі аб адкрыцці універсітэта ці політэхнічнага інстытута.

Пачатак XX ст. звязаны з пашырэннем грамадска-педагагічнага руху за стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі засноўвалі тайныя школы, дзе навучанне вялося на беларускай мове. Там выкарыстоўваліся падручнікі Каруся Каганца “Першая навука чытання”, Цёткі “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, Якуба Коласа “Другое чытанне для дзетак-беларусаў”.

**Гістарычныя, этнаграфічныя, мовазнаўчыя і краязнаўчыя даследаванні.** З другой паловы XIX ст. пачалося свядомае вывучэнне Беларусі. Расійскі ўрад пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. ахвяруе значныя сродкі для дасягнення гэтай мэты, каб не дапусціць у далейшым праяў польскага руху на Беларусі і абгрунтаваць непарыўную гістарычную сувязь гэтай тэрыторыі з Расіяй. Значную ролю ў вывучэнні Беларусі адыграў Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. Былі арганізаваны навуковыя экспедыцыі ў розныя рэгіёны Беларусі, падчас якіх збіраліся разнастайныя матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклору. Навуковы аналіз гэтых матэрыялаў аб’ектыўна сведчыў аб самабытнасці Беларусі.

У 1855 г. на аснове ўласнай археалагічнай калекцыі ***Яўстафій Тышкевіч*** з дапамогай свайго братка ***Канстанціна Тышкевіча*** стварыў Віленскі музей старажытнасцей. Браты таксама працавалі ў Віленскай археалагічнай камісіі.

Плённа працаваў на ніве збірання і публікацыі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў ***Павел Шэйн***. Ён распрацаваў падрабязную праграму па збіранню фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў і стварыў шырокую сетку карэспандэнтаў з ліку настаўнікаў, вучняў і іншых асоб, якія іх дасылалі. З карэспандэнтамі Шэйн падтрымліваў пастаянную сувязь, зрабіў некалькі паездак па Беларусі. Вынікі гэтай працы даследчык апублікаваў у трохтомніку “Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю”, дзе змешчаны каштоўныя звесткі па духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў другой паловы XIX ст.

***Іван Іванавіч Насовіч*** – беларускі мовазнавец, этнограф, фальклярыст з’яўляецца складальнікам “Слоўніка беларускай мовы” (1870). У слоўнік ўключана больш за 30 тыс. слоў, запісаных у Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, выбраных з вуснай народнай творчасці, старабеларускіх пісьмовых крыніц.Былы настаўнік змясціў у гэтым выданні больш за 30 тыс. слоў з грунтоўнымі тлумачэннямі.

Значнай постаццю сярод этнографаў з’яўляецца ***Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі***. Ураджэнец Віцебшчыны, ён працаваў настаўнікам народных вучылішчаў, гімназій, Свіслацкай і Маладзечанскай настаўніцкіх семінарый. З 60-х гг. вывучаў побыт і культуру Беларусі. М.Я. Нікіфароўскаму належаць шматлікія працы, дзе ўтрымліваюцца апісанні паўсядзённага жыцця, звычаяў, абрадаў, прыкмет і павер’яў беларускіх сялян. Звыш 20 гадоў ён працаваў у якасці актыўнага карэспандэнта Шэйна. Нарэшце ён стварыў і самастойныя працы, выдадзеныя пераважна ў 90-я гг.: “Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку”, “Нарысы Віцебскай Беларусі” і інш.

Навуковая дзейнасць гісторыка і этнографа ***Мітрафана Доўнар-Запольскага*** пачынаецца даволі рана. Шэраг артыкулаў па этнаграфіі ён змяшчае ў мясцовых перыядычных выданнях, а таксама ў часопісах Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі і Рускага геаграфічнага таварыства. Галоўную ўвагу даследчык канцэнтруе на вывучэнні беларускага вяселля і некаторых іншых бакоў сямейнага быту.

Каштоўныя этнаграфічныя даследаванні стварыў ***Адам Багдановіч***. Яшчэ ў перыяд вучобы ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ён прымыкае да народніцкага руху і падчас сваіх хаджэнняў па вёсках пачынае запісваць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Яго заслугай з’яўляецца вывучэнне старажытных вераванняў беларускага народа. У сваіх працах этнограф змяшчаў матэрыялы, якія паказвалі сацыяльны і духоўны прыгнёт селяніна, неабходнасць уздыму яго асветы, культуры і дабрабыту.

У пачатку XX ст. узрастае актыўнасць навукоўцаў у вывучэнні гісторыі, этнаграфіі і культуры Беларусі. Важнае значэнне мелі этнаграфічныя

даследаванні, якія высвятлялі нацыянальныя асаблівасці быту і культуры беларускага народа, пытанні яго этнагенэзу і этнічнай тэрыторыі. У галіне этнаграфіі плённа працавалі ***Еўдакім Раманаў***, ***Мікалай Нікіфароўскі***, ***Аляксандр Сержпутоўскі*** і іншыя даследчыкі. Навуковы аналіз назапашаных этнаграфічнай навукай матэрыялаў даў магчымасць стварэння грунтоўных абагульняючых прац. Асабліва заметнае значэнне ў гэтым плане адыгралі працы заснавальніка беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнографа, фальклярыста ***Яўхіма Фёдаравіча Карскага.*** Вучоны нарадзіўся ў в. Лаша Гродзенскага павета. Вынікі шматгадовай працы ён апублікаваў у трохтомніку “Беларусы”, які і сёння не страціў сваёй навуковай каштоўнасці. Карскі даследаваў паходжанне беларускага народа, акрэсліў яго этнічныя межы, асвятліў важнейшыя этапы гісторыі беларускай мовы і яе спецыфічныя асаблівасці. Тым самым ён пераканаўча даказаў, што беларусы з’яўляюцца асобным этнасам са сваёй мовай і культурай**.**

Былі створаны і грунтоўныя даследаванні, прысвечаныя беларускай гісторыі. Навуковыя працы ***Мітрафана Доўнар-Запольскага*** ўнеслі вялікі ўклад у вывучэнне гістарычнага мінулага Беларусі. Дзеяч беларускага нацыянальнага руху ***Вацлаў Ластоўскі*** ў 1910 г. выдаў на беларускай мове “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі”, дзе імкнуўся паказаць адметнасць гістарычнага лёсу беларускага народа.

Усё больш шырокія колы інтэлігенцыі сталі захапляцца краязнаўствам. Дзякуючы грамадскай актыўнасці, быў утвораны шэраг музеяў і культурна-асветных устаноў.

**Перыядычны і кніжны друк.** Перыядычны і кніжны друк у Беларусі развіваўся ва ўмовах даволі жорсткай цэнзуры. У мясцовых выдавецтвах выходзіла пераважна рэлігійная і багаслоўская літаратура, граматыкі і азбукі, даведнікі, невялікія зборнікі вершаў. Кнігі выдаваліся галоўным чынам на рускай, яўрэйскай і польскай мовах, некалькі кніг у год выходзіла на літоўскай мове.

Перыядычны друк Беларусі быў прадстаўлены афіцыйнымі выданнямі. Сярод іх вылучаліся “Губернские ведомости”, “Епархиальные ведомости”. “Губернские ведомости” складаліся з 2 частак: афіцыйнай і неафіцыйнай. У афіцыйнай частцы публікаваліся розныя ўрадавыя паведамленні. У неафіцыйнай частцы маглі змяшчацца паведамленні аб кірмашах, рынавчных цэнах, здарэннях, аб стане сельскай гаспадаркі, фабрык і заводаў, аб некаторых падзеях у міжнародным жыцці. Існавала магчымасць публікаваць асобныя матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі і фальклору. Але катэгарычна забаранялася змяшчаць тут крытычныя меркаванні аб фактах грамадскага жыцця, крытычныя заўвагі аб дзейнасці мясцовых улад.

У **1886 г.** пачалося выданне першай у Беларусі незалежнай ад урада газеты ***“Минский листок”***. У газеце змяшчаліся матэрыялы беларускіх літаратараў, гісторыкаў, фалькларыстаў. Тут друкавалася паэма “Тарас на Парнасе”, змяшчаліся творы Янкі Лучыны, Каруся Каганца, публікаваліся артыкулы

беларускага этнографа М. Янчука, работы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі М. Доўнар-Запольскага. У якасці літаратурна-краязнаўчага дадатка да “Минского листка” публікаваўся “Северо-Западный календарь”, які змяшчаў шмат этнаграфічных матэрыялаў. З 1902 г. газета пачала выходзіць пад назвай “***Северо-Западный край***”. Менавіта на яе старонках з’явіўся першы друкаваны верш Янкі Купалы.

У мясцовых выдавецтвах выходзіла пераважна рэлігійная і багаслоўская літаратура, граматыкі і азбукі, даведнікі, невялікія зборнікі вершаў. Кнігі выдаваліся галоўным чынам на рускай, яўрэйскай і польскай мовах, некалькі кніг у год выходзіла на літоўскай мове.

У канцы XIX – пачатку XX ст. пачынаюць больш шырока друкавацца беларускамоўныя творы. Некалькі асобных выданняў вытрымала паэма “Тарас на Парнасе”, у Пецярбурку выйшаў з друку зборнік вершаў Янкі Лучыны “Вязанка” і некаторыя іншыя творы. У 1906 г. у першым легальным беларускім выдавецтве “Загляне сонца і ў наша ваконца” у Пецярбургу былі выпушчаны “Беларускі лемантар, або Першая навука чытання” Каруся Каганца і “Першае чытанне для дзетак беларусаў” Цёткі. За выданне зборнікаў вершаў “Дудка беларуская”, “Смык беларускі” Багушэвіча і “Жалейка” Купалы. Пецярбургскі камітэт па справах друку распачаў крымінальнае праследаванне выдавецтва.

У перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. з’явілася шмат новых газет і часопісаў розных палітычных напрамкаў, зарадзіўся легальны перыядычны друк на беларускай мове. Выключную ролю ў развіцці культуры беларускай нацыі адыгралі газеты “Наша доля” і “Наша ніва”.

## § 3. Мастацтва і архітэктура

**Беларуская літаратура.** У другой палове XIX ст. пачынаецца новы этап у развіцці беларускай літаратуры. Пісьменнікі паступова пераадольвалі вузкае фальклорнае апісальніцтва сваіх папярэднікаў, станавіліся на шлях стварэння развітой літаратуры. Ішоў працэс жанравага ўзбагачэння літаратуры, удасканальвалася вершаскладанне. У гэты час закладваліся асновы сучаснай беларускай літаратуры.

Асноўным жанрам творчасці ***Янкі Лучыны*** (І. Неслухоўскага) з’яўляецца лірычны верш. Аўтар пісаў на беларускай мове. Вершы паэта былі сабраны ў зборніку “Вязанка”, які быў выдадзены пасля яго смерці ў 1903 г.

Літаратурных твораў ***Адама Гурыновіча*** захавалася вельмі мала. У сваіх вершах ён асноўную ўвагу надае паказу жыцця беларускага сялянства. Творы А. Гурыновіча былі выдадзены толькі пасмяротна.

Вяршыняй развіцця беларускай літаратуры другой паловы XIX ст. стала творчасць ***Францішка Багушэвіча***. Да сваіх зборнікаў “Дудка беларуская”, “Смык беларускі” Ф. Багушэвіч складаў прадмовы, праз якія імкнуўся абудзіць нацыянальную свядомасць беларускага народа. У іх ён абвясціў існаванне беларускага этнасу і адзначыў самастойнасць беларускай мовы. Цэнтральная

тэма твораў Ф. Багушэвіча – жыццё сялянства, яго пошукі справядлівасці і выйсця з сацыяльнага бяспраўя.

На лепшыя дасягненні літаратуры другой паловы XIX ст. абапіралася беларуская літаратура пачатку XX ст. Новыя тэмы, матывы і вобразы прынесла ў беларускую літаратуру ***Цётка*** (А. Пашкевіч*)*. Яе кнігі “Скрыпка беларуская” і “Хрэст на свабоду” сталі першымі арыгінальнымі зборнікамі беларускай паэзіі XX ст. Цётка з’явілася адной з пачынальнікаў апавядальнага жанру. Як таленавіты паэт-наватар, адзін з пачынальнікаў беларускай драматургіі і заснавальнікаў нацыянальнай школы перакладу ўвайшоў у гісторыю беларускай літаратуры ***Янка Купала*** (І. Луцэвіч). Ён узняў беларускую літаратуру на якасна новы ўзровень, садзейнічаў фарміраванню і развіццю беларускай літаратурнай мовы. Разам з Янкам Купалам заснавальнікам новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы стаў ***Якуб Колас*** (К. Міцкевіч). Адзіны паэтычны зборнік “Вянок” належыць *Максіму Багдановічу*, аднак ён дазволіў паэту заняць пачэснае месца сярод класікаў беларускай літаратуры. У пачатку XX ст. раскрыліся творчыя здольнасці ***Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Каруся Каганца*** і інш. Беларуская літаратура пачала знаходзіць прызнанне ў суседніх, перш за ўсё славянскіх, народаў, паступова ўключацца ў сусветны гісторыка-літаратурны працэс.

**Станаўленне нацыянальнага прафесійнага тэатра.** У фарміраванні беларускага прафесійнага нацыянальнага тэатра вялікую ролю адыграла тэатральная культура рускага, украінскага і польскага народаў. У беларускіх гарадах дзейнічалі мясцовыя рускія драматычныя трупы, а таксама гастралявалі акцёры сталічных тэатраў. Паспяхова выступалі артысты ўкраінскіх тэатраў, прыязджалі польскія тэатральныя калектывы.

Пад уздзеяннем прафесійнага тэатра ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі наспявала ідэя неабходнасці стварэння беларускага нацыянальнага тэатра прафесійнага тыпу. У пачатку XX ст. арганізоўваюцца шматлікія музычна-драматычныя гурткі і так званыя “беларускія вечарынкі”. Там звычайна выступалі хары, чыталіся беларускія літаратурныя творы, ставіліся п’есы.

На традыцыях “беларускіх вечарынак” у **1907 г.** узнікла ***“Першая беларуская трупа” Ігната Буйніцкага***. Землямер па прафесіі, сапраўдны патрыёт Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі на ўласныя сродкі стварыў тэатральную трупу ў асабістым фальварку Палевачы Дзісенскага павета. У 1907 г. замацаваўся пастаянны склад удзельнікаў гэтага калектыву, а ў 1910 г. пасля ўдзелу ў “Першай беларускай вечарынцы” у Вільні тэатр І. Буйніцкага пераўтварыўся ў прафесійны. У рэпертуары “Першай беларускай трупы” былі песні, танцы, пастаноўкі п’ес, дэкламацыя твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. І. Буйніцкі і яго акцёры займаліся актыўнай гастрольнай дзейнасцю. У час гастроляў па Беларусі І. Буйніцкі дапамагаў мясцовым гурткам, што спрыяла пашырэнню тэатральнага аматарства. У 1911 і 1912 гг. трупа І. Буйніцкага выступіла ў Пецярбургу, у 1913 г. калектыў наведаў Варшаву. Такім чынам І. Буйніцкі знаёміў гледачоў з мастацкай культурай

беларускага народа, звяртаў увагу на яе своеасаблівасці і непаўторны нацыянальны каларыт. Энтузіязм І. Буйніцкага, удалы падбор акцёраў і рэпертуара склалі трывалы падмурак поспеху гэтага калектыва. Аднак матэрыяльныя цяжкасці прымусілі І. Буйніцкага ў 1913 г. закрыць тэатр.

Пераемнікам "Першай беларускай трупы" ў працэсе фарміравання нацыянальнага тэатра стала ***"Першае таварыства беларускай драмы і камедыі"***, якое ўзнікла ў Мінску пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Арганізаваў Таварыства вядомы беларускі акцёр і рэжысёр ***Фларыян Ждановіч.*** Нягледзячы на цяжкасці, калектыў ужо ў першыя тыдні свайго існавання ажыццявіў гастрольную паездку па Беларусі.

**Выяўленчае мастацтва.** У выяўленчым мастацтве з другой паловы XIX ст. паступова ўсталёўваецца стыль ***рэалізм***, які прыходзіць на змену класіцызму з яго біблейскай і міфалагічнай тэматыкай.

Вядомай постаццю ў беларускім ***пейзажным жывапісе*** з'яўляецца фігура ***Апалінара Гараўскага***. Мастак нарадзіўся ў Мінскай губерні, адукацыю атрымаў у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, дзе яго здольнасці прыцягнулі ўвагу выкладчыкаў. Пасля заканчэння акадэміі быў узнагароджаны залатым медалём Пейзажы А. Гараўскага вылучаюцца жыццёвай праўдай і высокім тэхнічным майстэрствам ("Вечар у Мінскай губерні", "Пінскія балоты" і інш.). Мастак быў вядомы не толькі ў Расіі, але і за мяжой, ён атрымаў званне акадэміка жывапісу. Асабісты сябра рускага мецэната П. Траццякова, А. Гараўскі дапамагаў у збіранні яго славутай калекцыі. Некаторыя работы беларускага мастака зараз знаходзяцца сярод экспанатаў Траццякоўскай галерэі.

Майстрам ***бытавога жывапісу*** быў ***Нікадзім Сілівановіч***. Мастак нарадзіўся ў вёсцы Цынцавічы Вілейскага павета Мінскай губерні ў сям'і дзяржаўных сялян. Атрымаўшы адукацыю ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, ён стварае шэраг кампазіцый у бытавым жанры. У рэалістычнай манеры мастак выканаў карціну "Пастух са Свянцяншчыны". Творы Н. Сілівановіча прынеслі яму высокі аўтарытэт сярод пецярбургскіх мастакоў, аб чым сведчыць запрашэнне да ўдзелу ў афармленні Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. За мазаічнае пано "Тайная вячэра" Н. Сілівановічу прысвоілі ганаровае званне акадэміка.

Адным з вядомых прадстаўнікоў ***гістарычнага жанру*** ў беларускім жывапісе другой паловы XIX ст. быў ***Казімір Альхімовіч***. Мастак прымаў удзел у паўстанні 1863 – 1864 гг., за што быў сасланы ў Сібір. Пасля ссылкі ён жыў за межамі Беларусі, аднак сюжэтамі сваіх палотнаў нязменна выбіраў гістарычны лёс роднага народа. Сусветную вядомасць набыла яго карціна "Пахаванне Гедыміна". К. Альхімовіч стварыў цэлы шэраг гістарычных палотнаў, якія з поспехам выстаўляліся ў Мюнхене і Парыжы.

З канца XIX ст. ў выяўленчым мастацтве Беларусі з'яўляюцца новыя імёны. Вельмі заметна быў прадстаўлены пейзажны жывапіс.

У творчасці таленавітага беларускага мастака ***Вітольда Бялыніцкага-Бірулі*** развіваюцца традыцыі рускага лірычнага пейзажу. Ён набыў адукацыю ў Кіеўскай рысавальнай школе і Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. З 1904 г. ён з'яўляўся членам Таварыства перасоўных выставак. У сваёй творчасці развіваў традыцыі рускага лірычнага пейзажу. Эмацыянальныя і змястоўныя творы мастака вылучаюцца мяккім каларытам. У ранні перыяд былі напісаны пейзажы "З ваколіц Пяцігорска", якую набыў П. Траццякоў для сваёй калекцыі, "Вясна ідзе", што прынесла аўтару першую прэмію Маскоўскага таварыства аматараў мастацтваў. Шчырыя сяброўскія адносіны звязвалі мастака з І. Рэпіным.

Віды беларускай прыроды натхнялі ўраджэнца Ашмянскага павета ***Фердынанда Рушчыца***. У яго лепшых работах "Зямля", "Стары млын", "Эмігранты" спалучаюцца пейзажны і бытавы жанры. У работах ***Сяргея Жукоўскага*** пейзажны жывапіс цесна звязаны з інтэр'ерам і нацюрмортам. Вядомасць набылі пейзажныя палотны ***Генрыха Вейсенгофа*** "Снег", "Могілкі ў Русаковічах", на якіх мастак адлюстраваў віды мястэчка Русаковічы Мінскай губерні, дзе ён жыў працяглы час.

Партрэтны і бытавы жанры былі прадстаўлены ў творчасці ***Юдаля Пэна***. Яго палотны "Аўтапартрэт у саламяным капелюшы", "Гадзіншчык", "Стары кравец" выкананы ў рэалістычнай манеры і адлюстроўваюць яўрэйскі побыт і традыцыі. Творчая спадчына мастака вельмі вялікая і разнастайная. Пэн набыў вядомасць і ў якасці педагога. Яго намаганнямі ў Віцебску была адкрыта прыватная мастацкая школа. Самым вядомым вучнем Пэна стаў ***Марк Шагал***. Вялікае месца ў яго творчасці займаў родны Віцебск з яго яўрэйскім местачковым побытам, які мастак адлюстроўваў у сімвалічна-містычным духу.

Тэмы і матывы беларускай гісторыі выкарыстоўваў таленавіты мастак ***Я. Драздовіч***, стварыўшы серыю графічных работ і скульптурных партрэтаў дзеячаў гісторыі Беларусі.

**Музычнае мастацтва.** Даволі разнастайным і багатым было музычнае жыццё. З вялікім поспехам гастралявалі рускія і ўкраінскія музычна-драматычныя і харавыя калектывы, якія знаёмілі беларускую публіку з лепшымі творамі айчынных і замежных кампазітараў. У гэты перыяд узрасла цікавасць музыкантаў да беларускай народнай песеннай творчасці. Рускія кампазітары М. Рымскі-Корсакаў, А. Грачанінаў, С. Танееў апрацоўвалі беларускія песні і выкарыстоўвалі беларускую тэматыку ў сваіх творах. Выступленні хору В. Тэраўскага садзейнічалі папулярызацыі беларускіх народных песень.

Патрэба ў нацыянальнай музычнай літаратуры часткова была задаволена выданнем "Беларускіх песень з нотамі" ***Антона Грыневіча***, "Беларускага песенніка з нотамі для народных і школьных хораў" ***Людаміра Рагоўскага***, публікацыяй апрацоўкі беларускіх песень для фартэпіяна ***Мікалая Чуркіна***.

**Архітэктура.** Пасля адмены прыгоннага права і ўступлення Беларусі на капіталістычны шлях развіцця змяніўся характар горадабудаўніцтва.

Рашаючым фактарам тут становіцца прамысловасць, размяшчэнне і развіццё якой фарміруюць жыллёвае і архітэктурнае асяроддзе. Новымі стымуламі развіцця архітэктуры становяцца мода і рэклама. Фірмы і асобныя прадпрымальнікі былі зацікаўлены ў прэзентабельным выглядзе сваіх будынкаў, якія маглі дэманстраваць іх фінансавыя магчымасці, ступень канкурэнтаздольнасці і эканамічнай перспектывы. У цэлым горадабудаўніцтва развівалася вельмі хутка.

З сярэдзіны XIX ст. узмацняецца працэс паступовага заняпаду класічнай архітэктуры і адбываецца стылёвая пераарыентацыя дойлідства Беларусі. На змену класіцызму прыходзіць ***эклектыка (змяшэнне стыляў),*** якая атрымала яшчэ адну назву – ***“архітэктура гістарызму”***. Яна вызначалася выкарыстаннем форм розных стыляў (готыкі, барока, ракако, класіцызму, раманскага і інш.).

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. шырокае распаўсюджанне набыў ***рэтраспектыўна-рускі стыль*** у праваслаўным культавым дойлідстве. Рускія архітэктары распрацавалі тыпавыя варыянты праваслаўных цэркваў, скапіраваныя з візантыйскіх храмаў і рускіх бажніц XIV і XVII стст., каб паказаць пераемнасць рускага дойлідства ад візантыйскай архітэктуры. Ініцыятарам будаўніцтва падобных храмаў быў граф Мураўёў, таму ў народзе яны набылі назву ***“мураўёвак”***. Цэрквы, пабудаваныя ў рэтраспектыўна-рускім стылі, можна сустрэць у многіх гарадах і мястэчках Беларусі.

У другой палове XIX ст. развіваюцца таксама ***рэтраспектыўна-гатычны стыль, неакласіцызм, неабарока, неарэнесанс*** і іншыя напрамкі разнастайнай архітэктуры эклектыкі.

У пачатку XX ст. у архітэктуры Беларусі працягваў існаваць стыль гістарызм. Архітэктары па-ранейшаму займаліся стылізатарствам, выкарыстоўваючы прыёмы і формы, уласцівыя дойлідству папярэдніх перыядаў.

У каталіцкай культавай архітэктуры назіраецца росквіт ***неагатычнага стылю***. Неагатычныя пабудовы ўзводзіліся з чырвонай добра абпаленай цэглы, прычым фасады не атынкоўваліся. Найбольш багатыя храмы мелі вітражы, падлогу з паліраваных керамічных плітак, фрэскавы роспіс. Праваслаўная культавая архітэктура, як і ў папярэдні перыяд, знаходзілася пад уплывам візантыйскага і старажытнарускага дойлідства. Мемарыяльная капліца ў в. Лясная. Мемарыяльная капліца ў в. Лясная (цяпер Слаўгарадскі раён) была ўзведзена архітэктарам А. Гогенам у гонар 200-годдзя перамогі рускіх войскаў над шведамі ў бітве, якая адбылася ў 1708 г. Лаканічнасць і манументальнасць помніка надаюць яму асаблівую велічнасць.

У архітэктуры Беларусі склаўся ***неараманскі стыль***. Найбольш вядомы помнік, які спалучае матывы раманскай і гатычнай архітэктуры, – Чырвоны касцёл у Мінску (касцёл Сымона і Алены). Пабудова вытрымана ў раманскім стылі з дабаўленнем некаторых элементаў готыкі і мадэрна. Кампазіцыя касцёла складаецца з некалькіх злучаных паміж сабой аб’ёмаў і трох вежаў

(дзвюх маленькіх і адной вялікай). Касцёл быў пабудаваны з чырвонай цэглы, якая шырока выкарыстоўвалася ў архітэктуры неаготыкі і мадэрна. Фундатарамі пабудовы Мінскага касцёла выступілі памешчык Эдвард Вайніловіч і яго жонка, якія вырашылі ўзвесці касцёл у памяць аб сваіх памершых дзецях.

Побач з ***“архітэктурай гістарызму”*** з канца XIX ст. адбываецца станаўленне новага стылю – ***мадэрна***. Для помнікаў мадэрна характэрны пераплеценыя лініі, асіметрычныя кампазіцыі, багаты ляпны дэкор. Мадэрн прынёс новыя тыпы пабудоў (чыгуначныя вакзалы, масты, прамысловыя збудаванні), новыя будаўнічыя матэрыялы і канструкцыі (цэмент, металічная арматура, фабрычная дахоўка). У стылі мадэрн у Беларусі ўзводзіліся вакзалы, банкі, навучальныя ўстановы, даходныя дамы, сядзібы, некаторыя культавыя пабудовы. Прыкладамі архітэктуры мадэрна з’яўляюцца гасцініца “Еўропа” у Мінску, будынак Лужаснянскага сельскагаспадарчага вучылішча і інш. Гасцініца “Еўропа” была пабудавана ў 1906 – 1907 гг. Яе шасціпавярховы будынак з’яўляўся адным з найбольш значных дасягненняў архітэктуры мадэрна ў Мінску. На жаль, будынак быў знішчаны ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Мадэрн праіснаваў на тэрыторыі Беларусі да Першай сусветнай вайны, аднак шырокага распаўсюджання не набыў.

# РАЗДЗЕЛ VI. АД ЛЮТАГА ДА КАСТРЫЧНІКА 1917 г. КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ. НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ БУДАЎНІЦТВА. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА І ІНШАЗЕМНАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ (1917–1920)

## ГЛАВА 1. БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. УСТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА БЕЛАРУСІ

### § 1. Ад лютага да кастрычніка 1917 г. Альтэрнатывы грамадска-палітычнага развіцця. Уздым беларускага нацыянальнага руху

Пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі адбыліся значныя змены ў палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Расія стала адной з самых дэмакратычных краін свету. Яна стаяла перад выбарам шляху далейшага развіцця. Абвастрылася пытанне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва Расіі. Розныя класы, палітычныя плыні і партыі па-рознаму ўяўлялі далейшае развіццё краіны.

Беларусь пасля Лютаўскай рэвалюцыі знаходзілася на ваенным становішчы, была тэатрам ваенных дзеянняў, прыфрантавой зонай. У расстаноўцы палітычных сіл адыгрывала сваю ролю і сацыяльна-класавая структура насельніцтва. Ажывілася дзейнасць кадэтаў, эсэраў, меншавікоў, актывізавалі сваю дзейнасць бальшавікі, узнікалі новыя палітычныя партыі.

Значна ўзмацніўся беларускі нацыянальны рух. Вясной 1917 г. узнавіла сваю дзейнасць Беларуская сацыялістычная Грамада (БСГ). У канцы сакавіка ў Мінску адбыўся першы з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім прысутнічала каля 150 дэлегатаў. Мэта з’езда – выпрацоўка ў новых умовах праграмы беларускага нацыянальнага руху. Быў выбраны Беларускі нацыянальны камітэт.

8–12 ліпеня 1917 г. у Мінску адбыўся другі з’езд беларускіх партый і арганізацый. На з’ездзе замест скасаванага Беларускага нацыянальнага камітэта была створана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (з кастрычніка 1917 г. яна стала называцца Вялікай беларускай радай). Рада была абвешчана адзіным кіруючым органам усяго беларускага нацыянальнага руху. Асноўнымі праграмнымі патрабаваннямі Рады з’яўляліся прызнанне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі, развіццё нацыянальнай культуры і мовы, арганізацыя беларускага войска.

На сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый і партый (15 кастрычніка 1917 г.) прадстаўнікі левага крыла БСГ у знак пратэсту супраць палітыкі правых адмовіліся ад удзелу ў сесіі. БСГ раскалолася на дзве часткі.

Такім чынам, напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі адбыўся раскол у беларускім нацыянальным руху на правую і левую плыні. Калі правыя былі задаволены вынікамі Лютаўскай рэвалюцыі, прасілі ў Часовага ўрада аўтаноміі для Беларусі, то левыя патрабавалі ажыццяўлення ў краіне радыкальных пераўтварэнняў.

На чале барацьбы за развіццё рэвалюцыі стаяў рабочы клас. Ён прымаў удзел у арганізацыі Саветаў, народнай міліцыі, узброеных дружын. Рабочыя працягвалі ствараць свае прафесійныя саюзы. Паспяхова працавалі прафсаюзы чыгуначнікаў, друкароў, пекараў, краўцоў. У маі 1917 г. у Мінску было арганізавана 20 прафсаюзаў, якія аб'ядналі каля 10 тыс. рабочых. Прафесійныя саюзы былі створаны ў Гомелі, Віцебску, Оршы, Полацку, Рагачове і іншых гарадах Беларусі.

Складаным было палітычнае становішча на Заходнім фронце, дзе салдаты выказвалі незадавальненне вайной. Сярод салдат расла рэвалюцыйная актыўнасць і свядомасць. Яны сталі ствараць свае салдацкія камітэты. Да верасня 1917 г. у арміях Заходняга фронту дзейнічалі 7284 такія камітэты ўсіх ступеняў – ротных, батальённых, палкавых, армейскіх, якія аб'ядноўвалі больш за 55 тыс. салдат. Першапачаткова камітэты складваліся ў асноўным з меншавікоў і эсэраў. Гэта абумоўлена тым, што рэвалюцыя выклікала да актыўнай палітычнай дзейнасці вялікую колькасць салдат, пераважна з сялян.

Падзеі 3–4 ліпеня 1917 г. (правал наступлення на фронце, расстрэл мірнай дэманстрацыі ў Петраградзе) змянілі сітуацыю ў краіне.

Двоеўладдзе скончылася поўнай перамогай буржуазіі. Перыяд мірнага развіцця рэвалюцыі (27 лютага – 4 ліпеня 1917 г.) быў завершаны.

Важную ролю ў згуртаванні і арганізацыі рэвалюцыйных сіл, выпрацоўцы новай тактыкі адыграў VI з'езд РСДРП(б), які праходзіў паў-легальна з 26 ліпеня па 3 жніўня ў Петраградзе. Ён вылучыў лозунг поўнай ліквідацыі дыктатуры контррэвалюцыйнай буржуазіі і прыняў курс партыі на падрыхтоўку ўзброенага паўстання.

Кіруючыся рашэннямі VI з'езда партыі, бальшавікі Беларусі актывізавалі сваю палітычную і арганізацыйную работу ў масах. Асабліва актыўна дзейнічалі яны ў Мінску, які стаў усебеларускім палітычным цэнтрам. Бальшавікі мелі свае фракцыі ў Саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў, гарадской думе, галіновых праўленнях, цэнтральным гарадскім бюро прафсаюзаў. Вераснёўскія перавыбары Саветаў таксама сведчылі аб узрастанні ролі бальшавікоў. У мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў было абрана 184 бальшавікі, што склала 54,6 %. Гэта дало ім магчымасць атрымаць 23 месцы (63,9 %) у выканкоме.

У выніку перавыбараў бальшавікі пачалі праводзіць праз Мінскі Савет свае рэзалюцыі і рашэнні. Такі ж працэс праходзіў і ў іншых Саветах Беларусі.

Спробай астанавіць рэвалюцыю з'явіўся карнілаўскі мяцеж, накіраваны на ўсталяванне ваеннай дыктатуры (канец жніўня 1917 г.). Разгром карнілаўскага мяцяжу з'явіўся моцным штуршком у далейшым развіцці рэвалюцыі. У краіне вызначыліся новыя суадносіны класавых і палітычных сіл. З кожным днём узрастаў уплыў бальшавікоў на насельніцтва. Нежаданне меншавікоў і эсэраў выйсці з блока з кадэтамі паставіла перад бальшавікамі пытанне аб неабходнасці замацаваць пагадненне з левымі плынямі дробнабуржуазнай

дэмакратыі. Гэта тактыка паспяхова ажыццяўлялася бальшавікамі Беларусі. Яны рашуча падтрымлівалі левых эсэраў.

У кастрычніку 1917 г. у Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі эсэраў склалася даволі буйная фракцыя левых эсэраў, ці, як яны сябе называлі, эсэраў-інтэрнацыяналістаў. Да іх перайшла значная і даволі актыўная частка эсэраўскай арганізацыі.

Ва ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму ў Мінску 5–7 кастрычніка адбылася II Надзвычайная Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя РСДРП(б). Прыбыўшыя дэлегаты прадстаўлялі 28 591 члена партыі. За кароткі тэрмін пасля I Паўночна-Заходняй абласной партыйнай канферэнцыі (прайшло толькі 20 дзён) колькасць бальшавікоў павялічылася больш чым у тры разы. Гэта з'явілася яскравым сведчаннем няўхільнага росту ўплыву бальшавікоў, іх аўтарытэту сярод працоўных мас і салдат Заходняга фронту. Уся работа канферэнцыі праходзіла пад лозунгам непасрэднай падрыхтоўкі да сацыялістычнай рэвалюцыі.

Ва ўмовах далейшага паглыблення агульнанацыянальнага крызісу барацьба народных мас супраць буржуазіі дасягнула небывалага размаху. У цэнтры яе стаяў пралетарыят – авангард рэвалюцыі. Пераважна палітычны характар яго выступленняў суправаджаўся прымяненнем магутных і эфектыўных сродкаў пралетарскай барацьбы – устанаўленнем рабочага кантролю над вытворчасцю, правядзеннем забастовак. Рабочыя арыштоўвалі і адхілялі ад кіравання заводскую адміністрацыю.

Агульнанацыянальнае палітычнае значэнне восенню 1917 г. набыла барацьба сялянства за зямлю, якая прымала ўсё больш масавы і востры характар. Сяляне захоплівалі памешчыцкія землі, палілі маёнткі. Калі ў жніўні было разгромлена 38 памешчыцкіх двароў, то ў верасні ўжо 67. У кастрычніку сялянскі рух ахапіў 40 паветаў Беларусі.

Да агульнай плыні рэвалюцыйнага руху Беларусі далучаліся выступленні салдат Заходняга фронту. Салдацкія масы рашуча выступалі супраць працягвання вайны, павялічылася колькасць дэзерціраў з фронту, узмацнілася братанне сярод рускіх і нямецкіх салдат.

Такім чынам, пасля Лютаўскай рэвалюцыі на Беларусі, як і па ўсёй краіне, значна ўзмацнілася палярызацыя сіл.

## § 2. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі. Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні

24 – 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе перамагла сацыялістычная рэвалюцыя. Часовы ўрад быў скінуты. II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў стварыў новы ўрад – Савет Народных Камісараў на чале з У. Леніным.

25 кастрычніка аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе стала вядома ў Мінску. Улада ў горадзе перайшла ў рукі Савета. Выканкам Мінскага савета выдаў загад №1, у якім абвяшчалася аб пераходзе ўлады ў Мінску да

Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З былых вязняў турмы – рэвалюцыйных салдат (якія былі ў свой час арыштаваны Часовым урадам) быў сфарміраваны 1-шы імя Мінскага Савета рэвалюцыйны полк. Быў арганізаваны кантроль над поштай, тэлеграфам, чыгункай, штабам Заходняга фронту.

27 кастрычніка 1917 г. у Мінску быў створаны “Камітэт выратавання рэвалюцыі” на чале з эсэрам Т. Калатухіным. У яго склад увайшлі прадстаўнікі франтавога камітэта, пераважна меншавікі і эсэры, а таксама прадстаўнікі, якія не прызналі ўлады Саветаў. Камітэт увёў у Мінск часці Каўказскай дывізіі і запатрабаваў ад Савета перадаць яму ўсю ўладу ў горадзе і Заходнім фронце. Сітуацыя абвастрылася.

1 лістапада 1917 г. у Мінск прыбылі атрады рэвалюцыйных салдат 2-й арміі, а таксама браняпоезд на чале з бальшавіком У. Пралыгіным, членам ВРК 2-й арміі. У Мінск былі накіраваны зводны атрад салдат 2-й Сібірскай дывізіі і 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета. Хутка да Мінска падышлі і іншыя вайсковыя часці з фронту. Іх прыбыццё змяніла суадносіны сіл на карысць бальшавікоў.

2 лістапада прайшоў пашыраны сход Мінскага Савета з удзелам вайсковых і фабрычна-заводскіх камітэтаў. Сход прыняў рэзалюцыю аб устанаўленні савецкай улады ў Мінску. ВРК Заходняга фронту дапоўнены прадстаўнікамі ад рэвалюцыйных арганізацый, узяў усю ўладу ў свае рукі і стаў найвышэйшым паўнамоцным органам улады на ўсёй свабоднай ад немцаў тэрыторыі Заходняга краю. “Камітэт выратавання рэвалюцыі” быў распушчаны, а яго старшыня Т. Калатухін і камісар Заходняга фронту У. Жданаў арыштаваны.

Такім чынам, барацьба з контррэвалюцыяй у Мінску завяршылася перамогай рэвалюцыйных сіл. Тут, у цэнтры палітычнага жыцця Беларусі і Заходняга фронту, устанавілася савецкая ўлада.

Значна пазней перамагла савецкая ўлада ў Магілёве. Гэта тлумачыцца тым, што вакол Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага былі сканцэнтраваны контррэвалюцыйныя арганізацыі, кіруючыя органы буржуазных і дробнабуржуазных партый, іх лідэры. Контррэвалюцыйныя намеры Стаўкі падтрымлівала эсэра-меншавіцкая большасць Магілёўскага Савета. 28 кастрычніка 1917 г. адбылася нарада палітычных і грамадскіх арганізацый горада. Меншавікі і эсэры асудзілі ўзброенае паўстанне ў Петраградзе і патрабавалі стварэння “дэмакратычнага міністэрства”. Бальшавікі, якія таксама прынялі ўдзел у рабоце нарады, заявілі, што яна контррэвалюцыйная, і пакінулі яе. Кадэты пры актыўнай падтрымцы дробнабуржуазных партый на гэтай нарадзе арганізавалі “Грамадскі камітэт выратавання рэвалюцыі” і сталі цэнтрам усіх контррэвалюцыйных сіл Магілёва.

Для ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі савецкі ўрад прыняў шэраг рашучых мер: назначыў новага галоўнакамандуючага бальшавіка М. Крыленку, накіраваў з Петраграда салдат Літоўскага палка, матросаў Балтыйскага флоту. ВРК Заходняга фронту сфарміраваў атрад з салдат 1-га палка імя Мінскага

Савета. Для барацьбы са Стаўкай былі сфарміраваны рэвалюцыйныя атрады ў Віцебску, Гомелі, Оршы, Полацку і іншых гарадах Беларусі.

Усе спробы Стаўкі аказаць супраціўленне заканчваліся правалам. Салдаты Магілёўскага гарнізона адмовіліся змагацца з бальшавікамі. Гэта змяніла суадносіны сіл у горадзе. 18 лістапада выканком Магілёўскага Савета прыняў рашэнне аб прызнанні савецкай улады, тут жа быў створаны і ВРК, які ўстанавіў кантроль над Стаўкай. 19 лістапада рэвалюцыйныя атрады рабочых, салдат і матросаў уступілі ў горад. З імі ўвайшоў і новы галоўнакамандуючы М. Крыленка, 20 лістапада ў Магілёве пачала дзейнічаць савецкая ўлада.

На працягу кастрычніка – лістапада 1917 г. савецкая ўлада была ўстаноўлена на ўсёй свабоднай ад ворагаў тэрыторыі Беларусі. З'езды Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якія адбыліся ў лістападзе 1917 г., сваімі рашэннямі замацавалі перамогу савецкай улады на Беларусі.

27 лістапада 1917 г. выканаўчыя камітэты, абраныя з'ездамі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, Заходняга фронту, аб'ядналіся і ўтварылі выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкомзах). Яго старшынёй быў абраны бальшавік М. Рагазінскі. Для кіравання вобласцю і фронтам быў створаны абласны Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з бальшавіком К. Ландарам. Трэба адзначыць, што ў склад гэтых органаў увайшлі ў асноўным людзі не мясцовыя, далёкія ад разумення нацыянальных патрэб краю. Таму з боку гэтых органаў адразу ж выявіліся абыякавыя адносіны да пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа, яго нацыянальна-культурнага адраджэння.

Разам з утварэннем на Беларусі новых савецкіх органаў улады былі ліквідаваны органы, створаныя Часовым урадам.

Аднак фарміраванне новых органаў улады ў Заходняй вобласці не было завершана. Справа ў тым, што ў стварэнні Аблвыканкомзаха і СНК вобласці і фронту Саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў не ўдзельнічалі. З'езды Саветаў указаных губерняў адбыліся ў снежні 1917 г. – студзені 1918 г. і не прымалі рашэнняў аб злучэнні выбраных імі выканаўчых органаў з Аблвыканкомзахам, не выбіралі сваіх прадстаўнікоў у выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і ў склад абласнога СНК. Завяршальным этапам гэтай працы павінен быў стаць Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Аднак з'езд не быў скліканы.

Першым крокам на шляху зацвярджэння савецкай улады было ўвядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем. Галоўная задача гэтага органа заключалася ў тым, каб забяспечыць бесперабойную работу прамысловасці як асноўнай эканамічнай базы дыктатуры пралетарыяту.

Напрыканцы 1917 г. на Беларусі былі сфарміраваны мясцовыя органы рабочага кантролю. Яны прымалі актыўны ўдзел у вырашэнні пытанняў найму і звальнення рабочых, уводзілі новыя расцэнкі, змагаліся з сабатажам, патрабавалі ўстанаўлення 8-гадзіннага рабочага дня і інш. Органы рабочага

кантролю вырашалі складаную і цяжкую задачу па арганізацыі фінансавай дзейнасці. На тэрыторыі Заходняй вобласці кантроль праводзіў банкаўска-крэдытны аддзел Аблвыканкомзаха. Ён кантраляваў сродкі бягучых рахункаў прадпрыемстваў, банкаўскія пазыкі, выдачу грошай з казначэйства.

На Беларусі нацыяналізацыя буйных прамысловых прадпрыемстваў ажыццяўлялася, як і па ўсёй краіне, у адпаведнасці з дэкрэтам УЦВК, прынятым у снежні 1917 г. Усе нацыяналізаваныя Саветамі заводы і фабрыкі пераходзілі ва ўласнасць дзяржавы і паступалі ў падпарадкаванне савецкіх дзяржаўных органаў.

Ужо ў снежні 1917 г. былі нацыяналізаваны фабрыка “Везувій” у Навабеліцы Магілёўскай губерні, суконная фабрыка ў маёнтку Якаўлевічы, друкарня Кагана ў Магілёве, лесапільныя заводы ў Полацкім, Аршанскім, Быхаўскім паветах і інш. Былі нацыяналізаваны і буйныя майстэрні Лібава-Роменскай, Маскоўска-Брэсцкай і Паўночна-Заходняй чыгунак.

Пачалі праводзіцца рэвалюцыйныя пераўтварэнні і ў вёсцы. На Беларусі, дзе сялянства складала пераважную большасць насельніцтва, гэта было адным з найвастрэйшых пытанняў. Першым крокам у гэтым напрамку былі канфіскацыя ўсёй зямлі. Была разгорнута вялікая агітацыйная работа сярод сялянства. ВРК Заходняй вобласці распрацаваў спецыяльную інструкцыю для ўпаўнаважаных, у якой рэкамендаваў ім надаваць асабістую ўвагу рабоце па ўліку памешчыцкіх маёнткаў, інвентару, збожжа, арганізацыі аховы маёмасці.

У сярэдзіне лютага 1918 г. на Беларусі былі ў асноўным завершаны канфіскацыя прыватных гаспадарак і ўлік маёмасці ў памешчыцкіх маёнтках. Паводле няпоўных звестак, было канфіскавана 13 тыс. прыватных гаспадарак. Сяляне Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай губерняў атрымалі 1645,8 тыс. дзесяцін зямлі і амаль на 33 % павялічылі сваё землеўладанне. Была анулявана штогадовая арэндная плата памешчыкам у памеры 50 млн рублёў золатам. У снежні 1917 г. – лютым 1918 г. на тэрыторыі Беларусі з’явіліся першыя калектыўныя гаспадаркі сялян. У асноўным яны ствараліся на базе канфіскаваных памешчыцкіх маёнткаў. Адной з першых на Беларусі была камуна “Бярэзна” Вышацкай воласці Гарадоцкага павета. У гэты час з’явіліся камуны і ў маёнтках Мінскага, Віцебскага, Аршанскага, Лепельскага і іншых паветаў.

У канцы кастрычніка 1917 г. былі ажыццёўлены меры, накіраваныя на паляпшэнне становішча працоўных Беларусі. Была прынята пастанова аб устанаўленні 8-гадзіннага рабочага дня. Уводзілася страхаванне, паляпшаліся бытавыя і жыллёвыя ўмовы рабочых, забаранялася дзіцячая праца. Вялікая ўвага надавалася барацьбе з беспрацоўем. Ствараліся спецыяльныя фонды беспрацоўных, праводзілася арганізацыя грамадскіх работ, бірж працы. Нямалую дапамогу аказвалі касы беспрацоўных і арганізацыя грамадскага харчавання. Была ўстаноўлена бясплатная медыцынская дапамога. Вялікую ўвагу савецкая дзяржава надавала пытанням культурнага будаўніцтва, арганізацыі школьнай справы, падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

Аблвыканкомзах нацыяналізаваў тэатры, а пры аддзелах асветы губвыканкомаў стварыў тэатральныя камісіі. Асаблівай папулярнасцю карысталася Першае беларускае таварыства драмы і камедыі.

Такім чынам, перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўстанаўленне савецкай улады паклалі пачатак рэвалюцыйным пераўтварэнням ва ўсіх сферах грамадскага жыцця беларускага народа. Аднак ужо першыя крокі савецкай улады на Беларусі паказалі, што нават для правядзення ў жыццё задач агульнадэмакратычнага характару не хапала кваліфікаваных кадраў. Рабочыя, сяляне, салдаты былі не падрыхтаваны да кіравання дзяржавай. Сярод іх пераважная большасць з'яўлялася непісьменнай. Для ажыццяўлення самых простых сацыялістычных мерапрыемстваў яшчэ не былі створаны ў дастатковай ступені ні матэрыяльныя, ні культурныя перадумовы. Таму не ўсе гэтыя мерапрыемствы былі зразумелыя для рабочых і сялян, не ўсе працоўныя станоўча іх успрымалі.

На развіццё рэвалюцыйных пераўтварэнняў на Беларусі адмоўна ўплывалі спецыфічныя фактары: акупацыя значнай часткі яе тэрыторыі нямецкімі захопнікамі; створаныя на Беларусі органы савецкай улады паводле свайго складу былі ў асноўным салдацкімі; Беларусь лічылася калідорам для праходу галоўных рэвалюцыйных сіл на Захад для ажыццяўлення сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Адзначаныя фактары стрымлівалі развіццё рэвалюцыйных пераўтварэнняў, ускладнялі і без таго цяжкае эканамічнае становішча на Беларусі, садзейнічалі размежаванню палітычных сіл.

### § 3. Размежаванне палітычных сіл на Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. I Усебеларускі з'езд (снежань 1917 г.). Мяцеж польскага корпуса пад камандаваннем генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага

Пад уплывам Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі нацыянальны рух падзяліўся на дзве асноўныя часткі. Адна падтрымлівала рэвалюцыю, другая выступала супраць Кастрычніка. Розныя пазіцыі беларускага нацыянальнага руху ў адносінах да Кастрычніцкай рэвалюцыі былі абумоўлены яго сацыяльнай неаднароднасцю, вострымі супярэчнасцямі паміж рознымі сацыяльнымі пластамі гэтага руху. Вядучай палітычнай сілай у грамадстве стала партыя бальшавікоў. На Беларусі і на Заходнім фронце гэта выявілася ў тым, што больш за палову (51,4 %) усіх выбаршчыкаў ва Устаноўчы сход (лістапад 1917 г.) аддалі галасы кандыдатам партыі бальшавікоў, 43 % дэпутацкіх месц было аддадзена эсэрам. У іх ліку значную ўдзельную вагу складалі левыя эсэры, якія ўступілі потым у блок з бальшавікамі. За кадэтаў і іншыя буржуазныя партыі галасавала каля 5 % выбаршчыкаў. І гэта пры тых умовах, што выбары рыхтаваліся пры Часовым буржуазным урадзе.

Найбольш уплывовай нацыянальнай партыяй заставалася Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі раскол гэтай партыі на памяркоўных, прыхільнікаў рэфармісцкага шляху, і левых радыкалаў, прыхільнікаў бальшавіцкага кірунку, паглыбіўся. Акрамя таго, многія дзеячы

БСГ схіляліся да ідэі дзяржаўнага адасаблення Беларусі ад Расіі, што, на іх думку, магло засцерагчы бацькаўшчыну ад знішчэння. Гэтыя настроі выразна выявіліся на III з’ездзе БСГ (кастрычнік 1917 г.). З’езд прыняў новую праграму і абраў ЦК на чале з Я. Дылам. У склад ЦК увайшлі вядомыя беларускія дзеячы А. Прушынскі (А. Гарун), А. Смоліч, В. Адамовіч, П. Бадунова, Я. Варонка, З. Жылуновіч, Я. Мамонька, С. Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч і інш. З-за адсутнасці адзінства БСГ не выпрацавала агульнапартыйнай лініі ў адносінах да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Памяркоўныя лідэры Грамады ўспрынялі рэвалюцыю як “праяву анархіі, у віхуры якой загінуць справа вольнасці і нацыянальных правоў беларускага народа”. Петраградская арганізацыя БСГ, ухіліўшыся ад прамой ацэнкі рэвалюцыі, выказалася за фарміраванне “аднароднага сацыялістычнага ўрада”.

Асноўныя нацыянальныя партыі ў гэты час гуртаваліся вакол Цэнтральнай беларускай рады, якая з кастрычніка 1917 г. стала называцца Вялікай беларускай радай (ВБР).

27 кастрычніка 1917 г. Вялікая беларуская рада звярнулася да беларускага народа з “Граматай”. Гэты дакумент падпісалі акрамя Вялікай рады Беларускі выканаўчы камітэт Заходняга фронту, Беларуская сацыялістычная грамада, Беларуская народная партыя сацыялістаў і інш.

Палітычная праграма ВБР прадугледжвала: абвяшчэнне Беларускай дэмакратычнай рэспублікі, “спаянай з Велікаросіяй і іншымі суседнімі рэспублікамі Расіі на аснове федэрацыі”; наданне ўсёй улады на Беларусі краявой радзе, выбранай усеагульным, роўным, тайным галасаваннем; уключэнне ў кампетэнцыю вышэйшага заканадаўчага органа Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі пытанняў уседзяржаўнага будаўніцтва, міжнародных зносін і гандлёвых дагавораў з іншаземнымі дзяржавамі; выданне мясцовых законаў; развіццё, распрацоўка і прымяненне да мясцовых умоў законаў, выдадзеных вышэйшым заканадаўчым органам Расійскай дэмакратычнай рэспублікі; вышэйшае распараджэнне зямельным, водным і лясным багаццем Беларусі; аднясенне пытанняў народнай адукацыі і культурнага будаўніцтва і іншых да кампетэнцыі краявой рады.

Са змяненнем палітычных умоў паступова праходзіла пераарыентацыя ў беларускім нацыянальным руху. Калі пасля Лютаўскай рэвалюцыі ўсе беларускія нацыянальныя партыі, і ў першую чаргу Цэнтральная беларуская рада, патрабавалі краявой аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі, то ўжо пасля Кастрычніка іх барацьба разгортвалася пад лозунгам “поўнага нацыянальнага самавызначэння”.

Для ўстанаўлення ўлады, “выбранай самім народам беларускім”, ВБР абвясціла аб скліканні ў Мінску з’езда прадстаўнікоў усяго беларускага народа.

З’езд адкрыўся 15 снежня 1917 г. Для яго работы быў выбраны кіруючы орган – Савет старэйшын з’езда. На з’ездзе прысутнічалі 1872 дэлегаты (з іх 1167 мелі рашаючы голас, 705 – дарадчы). Большасць з іх прадстаўлялі валасныя, павятовыя і губернскія земствы, зямельныя камітэты, настаўніцкія

арганізацыі і інш. У палітычных адносінах гэта былі галоўным чынам эсэры і члены БСГ. У сацыяльным плане сярод дэлегатаў пераважалі прадстаўнікі заможнага і сярэдняга сялянства, сярэдніх і ніжэйшых пластоў інтэлігенцыі, чыноўнікі.

Па сваёй палітычнай накіраванасці дэлегаты падзяляліся на тры групоўкі: правых, левых і цэнтрыстаў. Цэнтрысцкі накірунак прадстаўлялі дэлегаты БСГ. У ходзе работы з’езда да іх далучылася значная частка правых эсэраў і т. зв. група “беспартыйных”. Левы накірунак аб’яднаў у асноўным левых эсэраў і быў нешматлікім. Правае крыло ўключала прадстаўнікоў розных буржуазных нацыяналістычных, а таксама клерыкальных і памешчыцкіх арганізацый.

Дэлегаты з’езда паспелі прыняць толькі першы пункт рэзалюцыі, які быў вырашальным у лёсе з’езда і яго дэлегатаў. У ім гаварылася: “Усебеларускі з’езд пастанаўляе: тэрмінова ўтварыць са свайго складу орган краявой улады – Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў афіцыйныя адносіны з цэнтральнай уладай, адказнай перад Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў”.

Гэта рашэнне з’езда СНК Заходняй вобласці і фронту расцаніў як контррэвалюцыйную спробу звяржэння ўстаноўленага ў выніку перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі грамадскага і дзяржаўнага ладу. Таму ноччу 18 снежня 1917 г. з’езд быў разагнаны, прэзідыум і шэраг дэлегатаў арыштаваны (усяго 27 чалавек). Пасля разгону з’езда Савет старэйшын аб’явіў сябе Саветам з’езда. На сваім першым закрытым пасяджэнні 18 снежня 1917 г. Савет з’езда пастанавіў: 1) лічыць I Усебеларускі з’езд гвалтоўна разагнаным; 2) Савет з’езда прызнаць выканаўчым органам з’езда, абавязаць яго праводзіць у жыццё ўсе яго рашэнні і пастановы; 3) папоўніць Савет з’езда дэлегатамі ад зямляцтваў і іншых груп, якія дэлегавалі сваіх прадстаўнікоў са з’езда ў Савет, і даць ім права адклікання і кааптацыі. Савет з’езда прыняў пастанову спыніць дзейнасць усіх нацыянальных фарміраванняў і перадаць іх справы і маёмасць Савету, а таксама склікаць II Усебеларускі з’езд. Быў створаны выканкам Савета.

СНК Заходняй вобласці і фронту ў паведамленні “Аб роспуску нацыяналістычнага беларускага з’езда” 20 снежня 1917 г. адзначаў, што з’езд выказаўся за савецкую ўладу і прызнаў яе ў Расіі, але не прызнаў гэтай улады ў Заходняй вобласці і на фронце. У звароце да беларускага народа 30 студзеня 1918 г. СНК Заходняй вобласці і фронту заявіў, што беларускі з’езд быў скліканы беларускімі кадэтамі, прадстаўнікамі буржуазіі і тых палітычных партый, якія жадалі выкарыстаць цемру і невуцтва народных мас для звяржэння народнай савецкай улады.

Абласное кіраўніцтва ўспрымала патрабаванне аб самавызначэнні Беларусі як антысавецкае, контррэвалюцыйнае.

У гісторыі беларускага народа Усебеларускі з’езд стаў важнай гістарычнай падзеяй. У той жа час з’езд выявіў і рознагалоссе, якое існавала ў беларускім нацыянальным руху пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У снежні 1917 г. – студзені 1918 г. на тэрыторыі Беларусі адбылася яшчэ адна падзея – мяцеж польскага корпуса пад камандаваннем генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага.

Корпус польскіх легіянераў быў сфарміраваны яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Улічваючы класавы склад польскай дывізіі, асабісты настрой камандавання, моцную дысцыпліну, Часовы ўрад вырашыў выкарыстаць яго для барацьбы з рэвалюцыйнымі выступленнямі працоўных. Польскія часці былі размешчаны ў раёне Віцебска–Мінска–Жлобіна і разгорнуты ў корпус. Вярхоўны галоўнакамандуючы Л. Карнілаў назначыў генерал-лейтэнанта Ю. Доўбар-Мусніцкага камандуючым польскім корпусам.

12 студзеня 1918 г. польскія легіянеры пачалі ваеныя дзеянні супраць савецкай улады. Былі захоплены Рагачоў, Бабруйск і шэраг іншых населеных пунктаў. Часці Ю. Доўбар-Мусніцкага вялі наступленне ў двух напрамках: на Мінск і Магілёў. Перад польскай дывізіяй была пастаўлена задача захапіць Магілёў і ліквідаваць рэвалюцыйную Стаўку, 2-я кавалерыйская дывізія павінна была захапіць Мінск, а 3-я – Жлобін. Тым самым контррэвалюцыя разлічвала нанесці ўдар па стратэгічных цэнтрах на Беларусі і адрэзаць іх ад Расіі.

У пачатку лютага савецкія войскі перайшлі ў наступленне ў раёне Жлобіна. Не вытрымаўшы націску, польская дывізія пачала адступаць на Бабруйск да цэнтра контррэвалюцыйнага мяцяжу, дзе была акружана і разбіта.

Такім чынам, першы пасля Кастрычніка 1917 г. пажар вайны на Беларусі быў патушаны.

## ГЛАВА 2. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ І ПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ГЕРМАНСКАЙ АКУПАЦЫІ. НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ БУДАЎНІЦТВА

### § 1. Беларусь пасля падпісання Брэсцкага мірнага дагавора. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні і культурнае будаўніцтва на свабоднай ад нямецкіх акупантаў тэрыторыі Беларусі

Становішча Савецкай Расіі ўскладнялася тым, што яна знаходзілася ў стане вайны з Германіяй. У сувязі з тым, што краіны Антанты адмовіліся ад мірных перагавораў, савецкі ўрад рашыў пачаць сепаратныя перагаворы з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй. 2 снежня 1917 г. было падпісана пагадненне аб перамір'і, а 9 – у Брэст-Літоўску пачаліся мірныя перагаворы.

3 сакавіка 1918 г. быў падпісаны мірны Дагавор на вельмі цяжкіх умовах, навязаных Германіяй. Паводле гэтага дагавора, пад нямецкай акупацыяй апынулася большая частка тэрыторыі Беларусі.

Брэсцкі мірны дагавор быў несправядлівы і грабежніцкі. Асабліва цяжкімі былі яго вынікі для працоўных Беларусі. Германіі Беларусь уяўлялася толькі як частка тэрыторыі Расіі, як залог пад ваенную кантрыбуцыю, выплаціць якую павінна была Савецкая Расія.

Такім чынам, у выніку нямецкай акупацыі Беларусь была падзелена на дзве часткі. Разгледзім перш-наперш становішча, якое склалася ў 1918 г. на свабоднай ад нямецкіх акупантаў частцы тэрыторыі Беларусі.

На неакупіраванай тэрыторыі Беларусі важнейшай задачай партыйных і савецкіх органаў стала дапамога Чырвонай Арміі, павышэнне баяздольнасці чырвонаармейскіх і іншых рэвалюцыйных атрадаў.

У адпаведнасці з дэкрэтам СНК ад 8 красавіка 1918 г. быў створаны новы ваенна-адміністрацыйны апарат: акруговыя, губернскія, павятовыя і валасныя камісарыяты па ваенных справах.

У адпаведнасці з рашэннем II з’езда Саветаў Заходняй вобласці ў красавіку 1918 г. быў створаны Савет народнай гаспадаркі Заходняй вобласці, а ў маі–снежні – губернскія і павятовыя саўнаргасы. Яны працягвалі распачатую ў канцы 1917 г. работу па ўстанаўленні рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем, за дзейнасцю чыгунак, фінансавых, харчовых і іншых устаноў, ажыццяўлялі нацыяналізацыю фабрык і заводаў. Толькі з сакавіка да верасня 1918 г. у 12 паветах было нацыяналізавана 31 прамысловае прадпрыемства. На іншых заводах і фабрыках устанаўліваўся рабочы кантроль. Саўнаргасы арганізоўвалі рамонт старых прадпрыемстваў, адкрывалі новыя. У Віцебску да лета 1918 г. была наладжана работа гарбарнай, сталярнай, швейнай, шапачнай, шавецкай, шорнай і іншых майстэрань, на якіх працавала больш за 1 тыс. чалавек. Дзесяткі прамысловых прадпрыемстваў, якія выпускалі прадукцыю для Чырвонай Арміі і прадметы шырокага ўжытку, былі адкрыты ў Мсціславе, Сянно і іншых гарадах.

Аднак, нягледзячы на прынятыя меры па барацьбе з разрухай, становішча гаспадаркі Беларусі было цяжкае. У канцы 1918 г. на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў дзейнічалі толькі 92 прадпрыемствы, або 23,6 % ад іх колькасці ў 1913 г. На іх было занята 18 тыс. рабочых – 52,6 % да 1913 г.

У Магілёўскай і Віцебскай губернях у адпаведнасці з дэкрэтам УЦВК ад 11 чэрвеня 1918 г. была створана густая сетка камітэтаў вясковай беднаты.

На свабоднай ад ворага тэрыторыі органы савецкай улады правялі значную работу па культурнаму будаўніцтву. Асаблівая ўвага надавалася арганізацыі народнай адукацыі.

Такім чынам, гаспадарчая і культурна-асветная дзейнасць, якая праводзілася на свабоднай ад нямецкіх акупантаў тэрыторыі Беларусі ў 1918 г., была накіравана на аказанне дапамогі Чырвонай Арміі, умацаванне новай, савецкай улады, павышэнне агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню працоўных.

## § 2. Барацьба беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР)

На тэрыторыі Беларусі, захопленай нямецкімі акупантамі, быў устаноўлены каланіяльны рэжым. Уся ўлада перайшла ў рукі ваеннага

камандавання. Разам з акупантамі сюды вярнуліся капіталісты і памешчыкі. Па распараджэнні нямецкага камандавання ім вярталася раней нацыяналізаваная ў іх маёмасць. Капіталісты і памешчыкі жорстка помсцілі працоўным. Яны арганізоўвалі лакауты, закрывалі прадпрыемствы. Падчас акупацыі ў Мінску не працавалі лесапільныя, гарбарны і дражджавы заводы, тытунёвая фабрыка, майстэрні. Аналагічнае становішча стварылася і ў іншых гарадах. На прадпрыемствах рабочы дзень працягваўся 12–14 гадзін. Рабочыя мітынгі, сходы былі забаронены.

Памешчыкі з дапамогай нямецкіх карных атрадаў забіралі ў сялян зямлю, жывёлу, сельскагаспадарчы інвентар, спаганялі розныя падаткі. Акупанты вывозілі ў Германію матэрыяльныя каштоўнасці, прымусова адпраўлялі на цяжкія работы найбольш фізічна здаровых людзей. Толькі вясной 1918 г. з Мінска было вывезена ў Германію 15 тыс. чалавек. Кошт нарабаваных на Беларусі немцамі матэрыяльных каштоўнасцей у 1918 г. перавышаў 5 млрд марак. У выніку прамысловасць і сельская гаспадарка Беларусі, якія і без таго былі разбураны вайной, усё больш прыходзілі ў заняпад. Архіўныя дакументы сведчаць аб тым, што на захопленай тэрыторыі немцы ўстанавілі жорсткі грабежніцкі каланіяльны рэжым.

На барацьбу з акупантамі ўзняліся працоўныя Беларусі. Пад кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга абласнога камітэта партыі бальшавікоў на захопленай ворагам тэрыторыі была створана сетка падпольных партыйных арганізацый. Работу іх узначальвалі тры падпольныя раённыя камітэты РКП(б) – Мінскі, Палескі і Бабруйскі.

У цяжкіх умовах барацьбы з акупантамі рабочы клас асобных гарадоў Беларусі змог захаваць свае органы ўлады – Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Актыўна працавалі ў падполлі Мінскі і Гомельскі Саветы. Яны прымалі дзейсны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні рабочых забастовак, дэманстрацый.

Разам з рабочымі супраць акупантаў актыўна змагалася беларускае сялянства. У чэрвені 1918 . у Слуцкім павеце сялянамі быў знішчаны атрад нямецкіх салдат. У Сенненскім павеце сяляне паўсталі, у Лепельскім – забілі нямецкага каменданта і знішчылі гарнізон.

На захопленай ворагам тэрыторыі разгарнуўся партызанскі рух. Паводле няпоўных звестак, толькі на тэрыторыі Мінскага, Магілёўскага, Бабруйскага, Гомельскага, Рэчыцкага, Слуцкага і Быхаўскага паветаў да восені 1918 . налічвалася каля 100 партызанскіх атрадаў. Партызанскія атрады дзейнічалі ў Полацкім, Мазырскім, Пінскім, Навагрудскім і іншых паветах. Многія з іх з’ядналіся буйнымі баявымі адзінкамі.

Вялікая роля ў барацьбе беларускага народа супраць нямецкіх захопнікаў належала ЦК РКП(б), які ажыццяўляў пастаяннае кіраўніцтва бальшавіцкімі падпольнымі партыйнымі арганізацыямі як праз Паўночна-Заходні абласны камітэт, так і праз сваіх прадстаўнікоў.

На захопленай нямецкімі акупантамі тэрыторыі Беларусі значна актывізаваўся беларускі нацыянальны рух. 19 лютага 1918 г., яшчэ да захопу нямецкімі войскамі Мінска, выканком Савета Усебеларускага з'езда выдаў загад № 1 па гарнізону аб тым, што нямецкая армія павінна ўбачыць спакойнае мірнае жыццё насельніцтва, якое не жадае бязглуздай вайны. У другім параграфе загада гаварылася аб увядзенні ваеннага становішча. 21 лютага выканком звярнуўся з Устаўной граматай да народаў Беларусі.

Выканком утварыў урад – Народны сакратарыят. Старшынёй урада стаў адзін з кіраўнікоў Беларускай сацыялістычнай грамады. Я. Варонка. У склад урада ўвайшло 15 народных сакратароў. Былі ўтвораны сакратарыяты: унутраных спраў, асветы, юстыцыі, народнай гаспадаркі, шляхоў зносін, фінансаў, велікарускіх спраў, пошты і тэлеграфа, кантролю, сельскай гаспадаркі і інш.

9 сакавіка 1918 . адбылося пашыранае пасяджэнне выканкома Савета Усебеларускага з'езда (тады ў яго складзе быў 71 чалавек). На пасяджэнні была прынята 2-я Устаўная грамата да народа Беларусі. У гэтым дакуменце Беларусь абвяшчалася Народнай Рэспублікай. Прэзідыум выканкома ўзначаліў І. Серада, які, як і Я. Варонка, прадстаўляў правае крыло БСГ. Апрача агульнапалітычнага ўступу, грамата змяшчала 8 пунктаў, у якіх вызначаліся асноўныя задачы абвешчанай рэспублікі.

1-я і 2-я Устаўныя граматы да народа Беларусі вызначалі асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ладу рэспублікі, яе тэрыторыю, правы і свабоды грамадзян, а таксама формы ўласнасці. Аднак трэба адзначыць, што ў граматах не былі дастаткова выразна акрэслены сацыяльна-палітычныя задачы.

Устаўныя граматы падтрымалі эсэры і меншавікі, якія да гэтага часу адмаўлялі саму ідэю беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Таму выпрацоўваецца агульная тактыка ў нацыянальным пытанні. На яе аснове стаў умацоўвацца саюз беларускіх палітычных партый з расійскімі сацыялістычнымі партыямі. Агульным для іх было тое, што яны выступалі за ідэю склікання Устаноўчага схода, парламенцкую рэспубліку, супраць курсу бальшавікоў на сусветную рэвалюцыю, класавую барацьбу. Па ініцыятыве ЦК БСГ 19 сакавіка 1918 г. выканком быў перайменаваны ў Раду БНР.

25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады была абмеркавана і прынята 3-я Устаўная грамата. Грамата павінна была завяршыць працэс самавызначэння і канчаткова канстытуіраваць утварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Галоўным у грамаце было абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Ад каго? У першую чаргу ад Расіі. "Незалежнікі" выступалі за разрыў усякіх адносін з Расіяй.

Якія адносіны да БНР і яе кіруючых органаў былі з боку кайзераўсай Германіі? Перш-наперш трэба адзначыць, што германская акупацыйная адміністрацыя спакойна рэагавала на акт абвяшчэння БНР. Яна добра разумела, што ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці ва ўмовах грамадзянскай вайны і супрацьстаяння розных палітычных і сацыяльных сіл ніякіх поспехаў мець не будзе. Таму галоўнай лініяй у нямецкай акупацыйнай палітыцы ў адносінах да

БНР было непрызнанне яе афіцыйным Берлінам. Гэта палітыка грунтавалася на ўзятым Германіяй абавязацельстве не падтрымліваць ніякіх сепаратысцкіх тэндэнцый у расійскіх межах, зафіксаваным Брэсцкім мірным дагаворам.

Аднак найбольшую самастойнасць Рада БНР атрымала ў галіне культуры і адукацыі. На працягу ўсяго 1918 г. у Мінску і Вільні на старонках перыядычнага друку ішла распрацоўка беларускай літаратурнай мовы. Пэўны ўклад у гэта ўнеслі Я. Станкевіч, А. Луцкевіч, Я. Лёсік і інш. Вынікам дадзенай працы з'явілася абвяшчэнне ў пачатку красавіка 1918 г. на адным з пасяджэнняў Рады БНР беларускай мовы дзяржаўнай. З пачатку красавіка 1918 г. пры Народным сакратарыяце асветы БНР сталі працаваць курсы беларусазнаўства, дзе чыталіся лекцыі па беларускай гісторыі, геаграфіі, мове, літаратуры. За месяц на іх паступіла каля 200 чалавек. Важнай галіной дзейнасці Сакратарыята асветы было адраджэнне нацыянальнай школы. Калі на пачатку 1918 г. у Мінску налічвалася толькі 4 нацыянальныя школы, то ужо ў чэрвені іх колькасць вырасла да 20. Шырока ажыццяўлялася выдавецкая справа. У 1918 г. працавала 11 выдавецтваў. У Мінску адкрыліся Беларускі педагагічны інстытут, рэктарам якога стаў прафесар В. Іваноўскі, выкладчыкамі – Я. Карскі, Б. Тарашкевіч, У. Ігнатоўскі і інш. Працавалі беларускі тэатр і іншыя ўстановы культуры. Выдаваліся беларускамоўныя газеты і часопісы.

Народны сакратарыят БНР атрымаў ад нямецкага камандавання некаторыя правы і ў галіне міжнароднай палітыкі. БНР мела сваіх прадстаўнікоў на Украіне, у Літве, працавалі дыпламатычныя місіі ў Варшаве і Берліне. Увогуле ж міжнародныя справы БНР складваліся вельмі дрэнна. Ва ўмовах вайны з Германіяй і грамадзянскай вайны ў Расіі ўрады краін Антанты і ЗША не праявілі зацікаўленасці да БНР, каб не пазбавіць сябе адчыненых дзвярэй для інтэрвенцыі ў Савецкую Расію. Безвыніковым быў зварот урада БНР да ўрада Германіі з просьбай аб прызнанні самастойнасці Беларусі і ўстанаўленні з мясцовымі нямецкімі ўладамі такіх адносін, якія дазволілі б БНР мець войска для ўмацавання сваёй улады. На пасланыя ў Берлін тры граматы рэйхсканцлер паведаміў Народнаму сакратарыяту, што Берлін лічыць Беларусь часткай Савецкай Расіі і што без урада Леніна вырашыць гэта пытанне не можа.

Вось у такіх складаных умовах Рада БНР пайшла на рашучы крок, пакінуўшы ў гісторыі вельмі сумнае ўражанне. 25 красавіка 1918 г. на закрытым пасяджэнні Рады быў прыняты тэкст тэлеграмы германскаму імператару Вільгельму, у якой выказвалася падзяка за вызваленне Беларусі ад бальшавіцкага прыгнёту і анархіі.

Пасылка Радай тэлеграмы выклікала востры палітычны кразіс у самой Радзе, яе пакінулі эсэры, меншавікі, яўрэйскія сацыялісты. Стаў распадацца Народны сакратарыят. Адзін з лідэраў БСГ, народны сакратар па справах земляробства Т. Грыб, заявіў: "Я пратэстую супраць такой тэлеграмы… і лічу здрадай рэвалюцыйнаму сацыялізму ўваходзіць у саюз з манархам і аддаваць пад апеку імперыялістычнай буржуазіі Германіі наш шматмільённы працоўны сялянскі народ…".

Крызіс прывёў да расколу БСГ. З яе прыхільнікаў утварыліся новыя партыі: сацыялістаў-рэвалюцыянераў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-федэралістаў. Тэлеграма выклікала новую хвалю пратэсту амаль усяго грамадства.

У выніку складаных абставін у Радзе сталі замацоўвацца кансерватыўныя сілы. Вымушаны быў скласці свае паўнамоцтвы Народны сакратарыят. Па прапанове акупацыйнай адміністрацыі фарміраванне новага складу сакратарыята ўзяў на сябе Р. Скірмунт.

Між тым летам 1918 г. рэзка змянілася міжнароднае становішча. Поспехі Чырвонай Арміі на франтах грамадзянскай вайны, барацьба працоўных у тыле акупантаў, узмацненне рэвалюцыйных настрояў сярод нямецкіх салдат вымусілі ўрад Германіі пайсці на тое, каб вывесці войскі з часткі захопленай тэрыторыі.

Заканчэнне першай сусветнай вайны і Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі далі магчымасць савецкаму ўраду 13 лістапада 1918 г. скасаваць Брэсцкі мірны дагавор. Паводле дэкрэта УЦВК, усе абавязацельствы савецкай улады наконт тэрытарыяльных уступак і выплаты кантрыбуцыі аб’яўляліся несапраўднымі. Германскае камандаванне, баючыся канчатковага развалу акупацыйнай арміі, 16 лістапада 1918 г. аддало загад вывесці яе з Расіі. З гэтага моманту пачаўся новы этап у вызваленні беларускай зямлі ад акупантаў. Прасоўваючыся за нямецкімі войскамі, Заходняя армія хутка ачышчала ад праціўніка тэрыторыю Беларусі. 21 лістапада 1918 г. былі вызвалены Полацк, Жлобін, 28 лістапада – Бабруйск, 2 снежня – Барысаў, 5 снежня – Асіповічы і Калінкавічы, 8 снежня – Слуцк, 10 снежня Чырвоная Армія вызваліла большую частку Украіны, Эстоніі і Літвы. На вызваленай тэрыторыі Беларусі была аднаўлена савецкая ўлада. Ствараліся яе органы: ваенныя саветы, рэвалюцыйныя камітэты, выканкомы Саветаў. Праводзіліся рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў народнай гаспадарцы.

Такім чынам, абвяшчэнне БНР з’явілася першай спробай рэалізацыі на практыцы беларускай ідэі, што ўзнікла яшчэ на пачатку XIX ст., сукупнасці ўсіх трох яе асноватворных элементаў – нацыянальнай свядомасці, нацыянальна-культурнага адраджэння і нацыянальнай дзяржаўнасці.

У такіх умовах жорсткага акупацыйнага рэжыму Рада БНР не магла аказаць сваім грамадзянам дзейснай дапамогі, выратаваць іх ад знішчэння, вывазу ў Германію, прадухіліць разбурэнне нацыянальнага багацця.

БНР не магла здзяйсняць свае функцыі і таму, што яе Рада аб’явіла аб разрыве сувязей з Расіяй, не ўлічваючы настрою беларускага народа. Гэта рашэнне было прынята палітычнай нацыянальнай элітай без актыўнага ўдзелу народа.

Нельга адмаўляць, што Рада БНР і яе Народны сакратарыят утварылі пэўную палітычную структуру з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі. Аднак у прамым сэнсе БНР дзяржавай не была. Дзяржаўнасць патрабуе не толькі абвяшчэння дэкларацый, якімі б добрымі яны ні былі, але галоўнае –

функцыяніравання сапраўднай сістэмы органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады на канкрэтнай тэрыторыі, распрацоўкі і прыняцця законаў і іх выканання, г. зн. праватворчай дзейнасці, забеспячэння правоў і свабод сваіх грамадзян. Нічога такога фактычна не было. Хоць рэспубліка і абвяшчалася ў этнаграфічных межах пражывання беларусаў, юрысдыкцыю на гэтай тэрыторыі яна не здзяйсняла. Не было войска, адсутнічала фінансавая сістэма, не складаліся мясцовыя органы ўлады. Функцыі ўрада БНР абмяжоўваліся паўнамоцтвамі нацыянальнага прадстаўніцтва пры германскай акупацыйнай адміністрацыі і рашэннем некаторых задач у культурна-асветнай галіне.

Аднак гэта быў першы крок барацьбы за беларускую дзяржаўнасць. Незалежнасць і свабода, аб'яўленыя 25 сакавіка 1918 г., так і засталіся жаданнем і надзеяй.

## § 3. Утварэнне Беларускай ССР. Аб'яднанне Беларускай ССР з Літоўскай ССР

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў і аднаўлення савецкай улады зноў паўстала пытанне аб утварэнні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Але па гэтым пытанні не было адзінай думкі. Існавала некалькі пазіцый:

1. Пазіцыя кіраўніцтва Паўночна-Заходняга абкома РКП(б), Аблвыканкомзаха і Абласнога Савета Народных Камісараў. Узначальвалі гэтыя органы не беларусы (А. Мяснікоў, К. Ландар, В. Кнорын, М. Калмановіч, У. Алібегаў, С. Берсан і інш.). Ім цяжка было зразумець нацыянальныя інтарэсы беларускага народа. Яны лічылі, што Беларусь павінна быць тэрытарыяльнай адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкай РСФСР. Іх погляды складваліся пад уздзеяннем многіх фактараў, у тым ліку і ідэі сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, а самавызначэнне народаў, утварэнне нацыянальных дзяржаў, іх межы – перашкода на гэтым шляху.

2. Іншую пазіцыю па пытанні аб нацыянальным лёсе Беларусі адстойваў Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацком), утвораны 31 студзеня 1918 г. пры камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР. Кіраўнікі Белнацкома А. Чарвякоў, З. Жылуновіч і іншыя лічылі неабходным стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і ўстанаўленне цесных сувязей з РСФСР (на прынцыпах аўтаноміі). Гэту пазіцыю падтрымлівала Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б), арганізаваных з бежанцаў-беларусаў у розных гарадах Расіі – Маскве, Петраградзе, Саратаве, Тамбове, Казані і інш. Усяго ў Расіі знаходзілася 1,5 млн беларусаў-бежанцаў.

Белнацком і кіраўнікі беларускіх секцый зрабілі шмат намаганняў, каб здзейсніць свае планы.

Пытанне аб неабходнасці стварэння беларускага савецкага ўрада разглядалася і на канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый, якая адбылася ў Маскве 21–23 снежня 1918 г. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі прадстаўнікі ад маскоўскай, петраградскай, саратаўскай, тамбоўскай і мінскай

секцый. У прывітальных тэлеграмах ЦК партыі, УЦВК, Саўнаркому, Наркомнацу канферэнцыя выказала надзею, што ідэя беларускай савецкай дзяржаўнасці сустрэне падтрымку вышэйшага кіраўніцтва. Сярод прынятых канферэнцыяй рашэнняў важнейшай была рэзалюцыя аб утварэнні беларускага савецкага ўрада. Дэлегацыя канферэнцыі на чале з З. Жылуновічам звярнулася з дадзенай прапановай да І. Сталіна. Але І. Сталін, які падтрымліваў пазіцыю Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыканкомзаха, зноў не адрэагаваў на гэту ініцыятыву.

Пытанне аб лёсе Беларусі стала прадметам тэрміновага разгляду ў ЦК РКП(б). Ёсць падставы сцвярджаць, што гэта адбылося па ініцыятыве У. Леніна. 24 снежня 1918 г. Пленум ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР). Пленум абавязаў Паўночна-Заходні абком РКП(б) правесці партыйна-арганізацыйную работу па нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву на Беларусі.

Такім чынам, пад уздзеяннем ЦК РКП(б) Наркомнац, а затым і Паўночна-Заходні абком РКП(б), Аблвыканкомзах, СНК Заходняй вобласці памянялі свае адносіны да лёсу Беларусі. Яны нават пайшлі далей у вызначэнні юрыдычнага статусу Беарусі, як Белнацком і беларускія камуністычныя секцыі, якія прытрымліваліся прынцыпу аўтаноміі Беларусі ў складзе РСФСР.

30 снежня 1918 г. адкрылася VI Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя. Дэлегаты канферэнцыі аднагалосна выказаліся за абвяшчэнне БССР. Канферэнцыя вызначыла межы рэспублікі і па дакладу камісіі, утворанай для вывучэння гэтага пытання, прыйшла да высновы, што ў склад рэспублікі павінны ўвайсці Мінская, Магілёўская, Гродзенская губерні поўнасцю, Віцебская губерня без Дзвінскага, Рэжыцкага і Люцынскага паветаў, а таксама частка тэрыторыі прымежных губерняў, населеных пераважна беларусамі. Гэта частка Гжацкага, Сычэўскага, Вяземскага і Юхноўскага паветаў Смаленскай губерні, частка Нова-Аляксандраўскага павета Ковенскай губерні, увесь Вілейскі павет, частка Свянцянскага і Ашмянскага паветаў Віленскай губерні, а таксама Аўгустоўскі павет Сувалкаўскай губерні. У склад БССР камісія ўключыла чатыры паўночныя паветы Чарнігаўскай губерні: Суражскі, Мглінскі, Старадубскі і Навазыбкаўскі.

Такім чынам, былі ў асноўным вызначаны этнаграфічныя межы беларускай нацыі, эканамічныя, гістарычныя і нацыянальныя асаблівасці асобных губерняў, паветаў і валасцей. Пазней пры больш дасканалым уліку нацыянальнага складу насельніцтва гэтыя межы ўдакладняліся. У адміністрацыйна-гаспадарчых адносінах было вырашана падзяліць тэрыторыю рэспублікі на 7 раёнаў – Мінскі, Смаленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі, Гродзенскі, Баранавіцкі і 54 падраёны. Намечаны адміністрацыйны падзел БССР не быў ажыццёўлены ў сувязі з польска-савецкай вайной, якая пачалася вясной 1919 г. Канферэнцыя абвясціла сябе І з’ездам Кампартыі бальшавікоў Беларусі. Быў створаны кіруючы орган КП(б)Б – Цэнтральнае бюро КП(б)Б. На першым яго пасяджэнні быў выбраны прэзідыум ЦБ КП(б)Б у

складзе А. Мяснікова, М. Калмановіча і В. Кнорына. Старшынёй прэзідыума стаў А. Мяснікоў.

31 снежня 1918 г. ЦБ КП(б)Б абмеркавала пытанне аб складзе Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада БССР. Было вырашана, што ва ўрад увойдуць прадстаўнікі ад Белнацкома і Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП(б), ад Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) і Аблвыканкомзаха. Старшынёй урада быў зацверджаны З. Жылуновіч, членамі – А. Мяснікоў, А. Чарвякоў і іншыя, усяго 17 чалавек. У складзе ўрада было створана 16 аддзелаў (наркаматаў) і 2 калегіі – надзвычайная і па справах палонных і бежанцаў.

1 студзеня 1919 г. Часовы ўрад Беларусі абнародаваў маніфест у сувязі з утварэннем БССР. "З сённяшняга дня Беларусь, – гаварылася ў ім, – Савецкая рэспубліка, становіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты і чырвонаармейцаў". З гэтага дня ўся ўлада на Беларусі, адзначалася ў маніфесце, належыць Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Зямля з жывым і мёртвым інвентаром, лясы, воды і нетры зямлі, чыгункі, фабрыкі і заводы, банкі становяцца ўласнасцю народа. Маніфест абвясціў раўнапраўе працоўных усіх нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі, адмяніў усе загады і распараджэнні акупацыйных улад, аб'явіў па-за законам Беларускую раду.

У сувязі з абвяшчэннем БССР вышэйшая ўлада на тэрыторыі рэспублікі перайшла да Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці склаў свае паўнамоцтвы. Толькі губвыканкам Віцебскай і Магілёўскай губерняў, якія ў перыяд утварэння БССР знаходзіліся ў складзе РСФСР, па-ранейшаму кіравалі народнай гаспадаркай гэтых губерняў. Заходняя вобласць была скасавана.

5 студзеня 1919 г. Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад БССР, ЦБ КП(б)Б пераехалі ў Мінск, які з гэтага часу стаў сталіцай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

2–3 лютага 1919 г. у Мінску адбыўся І Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. З'езд абмеркаваў наступныя пытанні: аб бягучым моманце, справаздачу Часовага ўрада Беларусі, аб адносінах да савецкіх рэспублік, аб Канстытуцыі БССР, выбары ЦВК БССР. Старшыня УЦВК Я. Свярдлоў, які прысутнічаў на з'ездзе, абвясціў пастанову прэзідыума УЦВК "Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі". У адказ з'езд прыняў "Дэкларацыю аб устанаўленні федэратыўнай сувязі паміж Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай і РСФСР".

І Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў Канстытуцыю БССР – Асноўны закон рэспублікі на пачатковым этапе яе развіцця. У адпаведнасці з канстытуцыяй найвышэйшая ўлада ў рэспубліцы належала з'езду Саветаў. У перыяд паміж з'ездамі яе здзяйсняў Цэнтральны выканаўчы камітэт. У склад выбранага на з'ездзе ЦВК БССР увайшло 50 чалавек – 45 камуністаў, 2 бундаўцы, 2 члены партыі Паалей-Цыён, адзін меншавік.

І Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб аб'яднанні Беларускай ССР і Літоўскай ССР у адну дзяржаву – Літоўска-Беларускую ССР (Літбел). Гэта рашэнне зноў жа было праведзена паводле ўказання ЦК РКП(б). 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) патрабаваў прыняць на з'ездзе Саветаў Беларусі пастанову аб аб'яднанні Беларусі з Літвой. Літоўцам таксама прапанавалася як мага хутчэй склікаць свой з'езд і прыняць такое ж рашэнне.

27 лютага 1919 г. стварающца ЦВК Літоўска-Беларускай ССР і яго прэзідыум на чале з К. Цыхоўскім, урад аб'яднанай рэспублікі – Савет Народных Камісараў на чале з В. Міцкявічусам-Капсукасам. Для кіраўніцтва народнай гаспадаркай быў створаны Вышэйшы Савет народнай гаспадаркі. У склад Літбела ўвайшла тэрыторыя Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з больш як 4-мільённым насельніцтвам. У сувязі з утварэннем Літоўска-Беларускай ССР узнікла неабходнасць зліць і камуністычныя партыі Літвы і Беларусі. На аб'яднальным з'ездзе (4–6 сакавіка 1919 г.) быў абраны ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі (ЦК КП(б) ЛіБ). 6 сакавіка 1919 г. Пленум ЦК КП(б) ЛіБ стварыў прэзідыум ЦК КП(б) ЛіБ. Старшынёй прэзідыума быў выбраны В. Міцкявічус-Капсукас, сакратаром В. Кнорын. Сталіцай аб'яднанай дзяржавы стаў г. Вільня.

Так Беларуская Савецкая Рэспубліка праз месяц пасля абвяшчэння незалежнасці і ўтварэння сваёй дзяржаўнасці стала часткай аб'яднанай дзяржавы – Літбела.

## ГЛАВА 3. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ПОЛЬСКАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ (1919–1920)

### § 1. Захоп тэрыторыі Беларусі войскамі Польшчы. Савецка-польская вайна

У першай палове лютага 1919 г. Польшча з дапамогай Антанты пачала ваенныя дзеянні супраць Савецкай Расіі. І першай ахвярай на шляху польскіх войск была Беларусь. Сутнасць палітыкі Польшчы ў адносінах да Беларусі была выкладзена ў памятнай запісцы кіраўніцтва "Стражы крэсавай" – арганізацыі, якая ў 1919–1920 гг. абараняла інтарэсы польскіх памешчыкаў, вяла барацьбу за далучэнне да Польшчы т. зв. "крэсаў", г. зн. беларускіх, літоўскіх, украінскіх зямель. Ужо да сярэдзіны сакавіка 1919 г. былі захоплены Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Скідаль, Шчучын, Пінск, Баранавічы. Урад РСФСР заявіў пратэст ураду Польшчы і прапанаваў мірным шляхам урэгуляваць усе спрэчныя пытанні. Адначасова быў арганізаваны адпор ворагу, створаны Заходні фронт, а Літоўска-Беларуская Савецкая рэспубліка аб'яўлена на ваенным становішчы. Быў сфарміраваны Савет абароны, праведзены ўсе неабходныя мерапрыемствы.

Вялікае значэнне для арганізацыі адпору інтэрвентам мелі пастановы ЦВК Украіны, Літвы і Беларусі, прынятыя ў маі 1919 г. аб неабходнасці ваенна-палітычнага саюза. На аснове гэтых пастаноў ЦВК Расіі прыняў 1 чэрвеня 1919 г. пастанову аб аб'яднанні ваенных сіл савецкіх рэспублік.

Аднак становішча на фронце не палепшылася. У канцы ліпеня польскім войскам удалося прарваць лінію абароны і захапіць Заслаўе, Сёмкаў Гарадок. 8 жніўня 1919 г. праціўнік уварваўся ў Мінск. Працягваючы наступленне, інтэрвенты ў жніўні–верасні 1919 г. захапілі Ігумен, Нова-Барысаў, Бабруйск, Жлобін, Рагачоў.

Не прыняўшы неаднаразовых савецкіх прапаноў аб мірных перагаворах, кіруючыя колы Польшчы пайшлі на разгортванне ваенных дзеянняў. 5 сакавіка 1920 г. яны распачалі наступальную аперацыю ў раёне Рэчыцы, Мазыра і Калінкавіч. У выніку гэтыя гарады былі захоплены праціўнікам.

25 красавіка 1920 г. войскі Польшчы перайшлі ў наступленне на Украіне. Войскі Паўднёва-Заходняга фронту гераічна абараняліся, але, несучы вялікія страты, былі вымушаны адступіць. Адчувалася перавага сіл праціўніка.

У перыяд польскага наступлення ЦК РКП(б), савецкі ўрад шмат увагі ўдзялялі пытанням тактыкі барацьбы з польскімі інтэрвентамі. 28 красавіка 1920 г. Палітбюро ЦК РКП(б) зацвердзіла распрацаваны галоўным камандаваннем план баявых дзеянняў. Асноўны ўдар павінны былі нанесці войскі Заходняга фронту на Беларусі. Дапаможны ўдар планаваўся на Паўднёва-Заходнім фронце ў напрамку на Брэст 29 красавіка 1920 г. галоўнакамандуючым Заходнім фронтам быў прызначаны М. Тухачэўскі. 14 мая 1920 г. войскі Заходняга фронту пачалі наступленне. У выніку жорсткіх баёў польскія войскі захапілі ініцыятыву.

Майскае наступленне Заходняга фронту не змагло забяспечыць выкананне пастаўленых перад ім задач. Пачалася інтэнсіўная работа па далейшым умацаванні абароны краіны.

4 ліпеня 1920 г. пачалося агульнае наступленне войск Заходняга фронту, якое ў цэлым развівалася паспяхова. Войскі імкліва рухаліся наперад, праходзячы па 30–40 км за суткі.

Польскія войскі адступалі на захад. 11 ліпеня 1920 г. быў вызвалены Мінск. У выніку наступлення войск Заходняга фронту ў ліпені 1920 г. уся тэрыторыя Беларусі была ачышчана ад акупантаў.

На вызваленай тэрыторыі Беларусі пачалося аднаўленне савецкай улады. Часова ўзяўшы ўсю ўладу, Мінскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з А. Чарвяковым адмяніў пастановы і загады акупантаў і абвясціў пра ўступленне ў сілу законаў савецкай улады.

Тым часам Чырвоная Армія працягвала свой паход на захад. У канцы ліпеня 1920 г. яна ўступіла на тэрыторыю Польшчы. Пад яе ўздзеяннем значна ўзмацніўся рэвалюцыйны рух польскага пралетарыяту. У населеных пунктах, занятых Чырвонай Арміяй, ствараліся рэвалюцыйныя камітэты. 30 ліпеня 1920 г. у Беластоку польскімі рэвалюцыянерамі быў створаны Часовы рэвалюцыйны камітэт Польшчы (Польрэўком).

У гэтых умовах ЦК РКП(б), савецкі ўрад далі ўказанне прадоўжыць наступленне Чырвонай Арміі. Аднак, плануючы далейшыя баявыя дзеянні, савецкае камандаванне ў сваіх разліках недаацаніла здольнасць польскай арміі

абараняцца і перабольшыла наступальныя магчымасці Чырвонай Арміі. Сілы Заходняга фронту значна аслаблі. 13 жніўня 1920 г. Чырвоная Армія аднавіла наступленне, але няўдала. 16 жніўня польскія войскі перайшлі ў контрнаступленне і авалодалі ініцыятывай. 17 жніўня Чырвоная Армія пачала адступаць. Пры адыходзе войскі фронту неслі значныя страты.

18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай. Згодна з дагаворам, заходнія землі Беларусі, тэрыторыі сучасных Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, частка Мінскай вобласці (без Мінска) і Віцебскай адышлі да Польшчы. Тэрыторыя склала больш за 100 тыс. км$^2$, на ёй жыло звыш 4 млн чалавек. Акупацыя гэтых тэрыторый Польшчай працягвалася да 17 верасня 1939 г.

## § 2. Барацьба беларускага народа супраць польскіх інтэрвентаў. Беларускі нацыянальны рух

На захопленай тэрыторыі польскія інтэрвенты ліквідавалі савецкую ўладу і аднавілі ўладу памешчыкаў і капіталістаў. Была адноўлена і прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, былым гаспадарам вернуты нацыяналізаваныя савецкай уладай прамысловыя прадпрыемствы і зямля. Для кіраўніцтва захопленымі раёнамі ўрад Польшчы яшчэ ў лютым 1919 г. стварыў генеральны камісарыят, які загадам ад 25 жніўня 1919 г. адмяніў у гэтых раёнах дэкрэты савецкай улады, забараніў дзейнасць савецкіх устаноў.

Акупанты ўстанавілі на захопленай тэрыторыі дэспатычны рэжым. Толькі ў Мінску імі было арыштавана больш за 1000 жыхароў, з якіх 100 чалавек расстралялі па прыгаворах ваенна-палявых судоў. Тысячы сумленных грамадзян, якія не жадалі падпарадкавацца акупантам, былі кінуты ў канцэнтрацыйныя лагеры.

Беларускі народ не схіліў галавы перад інтэрвентамі. Амаль ва ўсіх гарадах рэспублікі былі створаны падпольныя партыйныя арганізацыі, якія ўзначалілі барацьбу працоўных за сваё вызваленне. У тыле ворага ўзнікла разгалінаваная сетка партызанскіх атрадаў. Партызаны разбуралі камунікацыі, узрывалі вайсковыя эшалоны, грамілі гарнізоны, праводзілі вялікую разведвальную работу ў тыле ворага. Партызанскія атрады ўзаемадзейнічалі з чырвонаармейскімі часцямі Заходняга фронту. Штаб фронту каардынаваў іх дзеянні, дапамагаў ім набываць узбраенне, распрацоўваць планы баявых аперацый.

28 студзеня 1920 г. у в. Гатава Мінскага павета адбыўся першы з’езд партызан. З’езд звярнуў увагу на неабходнасць паляпшаць баявое ўзаемадзеянне партызан, іх аб’яднанне для правядзення буйных аперацый. 5 красавіка 1920 г. у в. Міханавічы (каля Мінска) адбыўся другі з’езд партызан. На з’ездзе адзначалася, што барацьба ў тыле акупантаў набыла шырокі размах, што блізкі час прыходу Чырвонай Арміі.

У гады польскай акупацыі тэрыторыі Беларусі вызначалася сутнасць кожнай партыі, арганізацыі і іх кіраўнікоў. Суровая рэчаіснасць прымушала іх

выявіць свае адносіны да акупацыйных улад, распрацаваць сваю стратэгію і тактыку ў гэтых складаных умовах.

Партыя бальшавікоў, якая з 5 сакавіка 1919 г. да 5 верасня 1920 г. дзейнічала як аб'яднаная з літоўскай партыяй бальшавікоў, ужо ў пачатку акупацыі тэрыторыі Беларусі польскімі войскамі ўзначаліла барацьбу працоўных супраць акупантаў.

19 мая 1919 г. аб'яднаны ЦК КП(б) ЛіБ абмеркаваў пытанні аб становішчы за дэмакрацыйнай лініяй, звярнуўся да салдат польскай арміі з адозвай аб спыненні братазабойчай вайны.

Лідэры нацыянальна-дэмакратычных партый у пачатку вайны паверылі абяцанням Ю. Пілсудскага, разлічвалі, што ён дапаможа здзейсніць ідэю незалежнасці Беларусі. Беларускія сацыял-дэмакраты, сацыялісты-федэралісты, эсэры спачатку пагадзіліся супрацоўнічаць з ім. Перагаворы з Пілсудскім аб перадачы грамадзянскай улады Радзе БНР вялі кіраўнікі беларускіх сацыялістаў-федэралістаў. Таго ж праз Польскую сацыялістычную партыю дабіваліся і дэлегацыя беларускіх эсэраў у Варшаве.

Але ўсе гэтыя намаганні былі дарэмныя. Адначасова закрываліся на захопленай тэрыторыі беларускія школы, культурна-асветныя ўстановы, газеты. У Гродне былі раззброены 1-ы і 2-і беларускія пяхотныя палкі і кавалерыйскі эскадрон, падпарадкаваныя Радзе БНР.

Жорсткі акупацыйны рэжым і ўзброеная барацьба працоўных Беларусі супраць польскіх акупантаў аказалі значны ўплыў на тактыку беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый. Яны арыентаваліся на Раду БНР, а яе дзейнасць была поўнасцю паралізавана. Таму накірунак гэтых партый рэзка змяніўся. Беларускія эсэры і сацыялісты-федэралісты выказаліся за ўтварэнне літоўска-беларускай дзяржавы ў межах былога Вялікага княства Літоўскага.

Адмаўляючы савецкую ўладу, як непрыдатную форму для дзяржавы працоўных, беларускія эсэры меркавалі, што найбольш адпаведнай інтарэсам усяго беларускага народа формай улады будзе беларуская працоўная рэспубліка (дыктатура ўсіх працоўных, а не толькі пралетарыяту).

Галоўнымі напрамкамі палітыкі Рады БНР і яе ўрада ва ўмовах польскай акупацыі былі: 1) па-ранейшаму дамагацца ад сусветнай дзяржаўнасці (і ад Польшчы) афіцыйнага прызнання незалежнасці БНР; 2) устанаўленне федэратыўных адносін з Польшчай; 3) перадача ўсёй грамадзянскай улады на Беларусі Радзе БНР.

Перагаворы з польскай уладай завяршыліся тым, што Рада БНР была распушчана. Аднак потым яна згадзіліся на скліканне Рады БНР і стварэнне беларускага войска за абяцанне А. Луцкевіча, што гэта Рада правядзе рашэнні на карысць Польшчы (Ю. Пілсудскі спадзяваўся, што яна прыме рашэнне аб уніі з Польшчай).

Пайсці такім шляхам не згадзіліся сацыялісты-федэралісты і сацыялісты-рэвалюцыянеры. 13 снежня 1919 г. яны ўтварылі новую Народную Раду, якая пацвердзіла акт 25 сакавіка 1918 г. аб незалежнасці Беларусі. У адказ польскія

ўлады арыштавалі найбольш актыўных дзеячаў партыі эсэраў і ўтварылі Найвышэйшую Раду, па-сутнасці, марыянетку польскай улады.

Напярэдадні вызвалення Беларусі ад польскай акупацыі беларускія эсэры вялі перагаворы з кіраўніцтвам Савецкай Расіі аб прызнанні створанага Радай урада Беларусі, аднак ЦК РКП(б) не збіраўся дзяліць уладу з нацыянальнымі партыямі.

Такім чынам, беларускі нацыянальны рух у перыяд польскай акупацыі быў накіраваны на аб'яднанне ўсіх працоўных у іх барацьбе супраць інтэрвентаў і вызваленне Беларусі ад іншаземных захопнікаў.

## § 3. Аднаўленне Беларускай ССР

Пасля паспяховага ліпеньскага (1920) наступлення Чырвонай Арміі, калі ўся тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад польскіх захопнікаў, практычна пыўстала пытанне пра аднаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Але сярод кіраўніцтва Літбела па-ранейшаму не было адзінай думкі па гэтым пытанні. Члены ЦК КП(б) ЛіБ В. Кнорын, М. Калмановіч, Р. Пікель, І. Рэйнгольд і іншыя, якія ў 1918 г. падзялялі пазіцыю А. Мяснікова, і цяпер не лічылі неабходным ствараць суверэнную Беларускую Савецкую Рэспубліку. Яны абмяжоўваліся наданнем беларусам культурна-нацыянальнай аўтаноміі ў межах Мінскай губерні, якая павінна была ўвайсці ў склад РСФСР як адміністрацыйная адзінка. Яны не ўлічвалі настрою беларускага народа, які хацеў аднавіць сваю дзяржаўнасць. Па-ранейшаму рашэнне "беларускага пытання" яны ставілі ў залежнасць ад вынікаў сусветнай рэвалюцыі. Гэтай ідэяй кіраваліся тады многія партыйныя дзеячы.

Другая частка членаў ЦК КП(б) ЛіБ на чале з А. Чарвяковым настойліва патрабавала ад ЦК РКП(б) тэрмінова разгледзець беларускае пытанне. У маі 1920 г. па ініцыятыве А. Чарвякова, які ўзначальваў савецкі аддзел Рэўваенсавета Заходняга фронту, праходзілі нарады камуністаў-беларусаў з абмеркаваннем аднаго і таго ж пытання: "Аб аднаўленні савецкай улады і самавызначэнні Беларусі".

Нарэшце, улічваючы настрой працоўных мас, ЦК КП(б) ЛіБ 6 ліпеня 1920 г., калі Чырвоная Армія перайшла ў наступленне, выказаўся за аднаўленне беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Тым часам Чырвоная Армія працягвала наступленне.

12 ліпеня 1920 г. у Маскве быў падпісаны дагавор паміж Літвой (сталіца – г. Коўна) і РСФСР. Разлічваючы на перамогу савецкай улады ў Літве і яе магчымыя сутыкненні з Польшчай, урад РСФСР пайшоў на тое, каб уключыць частку тэрыторый з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў у межы Літвы. Віленскі край з Вільняй таксама быў прызнаны часткай Літвы. У сувязі з падпісаннем гэтага дагавора юрыдычна перастала існаваць Літоўска-Беларуская ССР. Пачалася практычная работа па аднаўленні беларускай дзяржаўнасці. 30 ліпеня 1920 г. замест Мінскага губрэўкома быў створаны Ваенрэўком Беларускай Рэспублікі. У яго ўвайшлі А. Чарвякоў – старшыня,

В. Кнорын – намеснік старшыні, І. Адамовіч – намеснік старшыні па ваенных справах. Членамі рэўкома таксама з’яўляліся У. Ігнатоўскі, А. Вайнштэйн і інш. Белваенрэўком з’яўляўся часовым органам улады на вызваленай ад інтэрвентаў тэрыторыі Беларусі.

Вельмі складаным было тэрытарыяльнае пытанне аднаўленай рэспублікі. Канкрэтна яе межы не былі вызначаны. І зрабіць гэта было вельмі цяжка.

У ліпені 1920 г., калі Чырвоная Армія паступова прасоўвалася на захад, з’явілася рэальная магчымасць аднавіць рэспубліку ў тых межах, якія былі вызначаны камісіяй І з’езда КП(б)Б. Але і ў дадзеным выпадку зрабіць гэта было немагчыма. У выніку вельмі цяжкіх унутраных і знешнепалітычных абставін, паражэння Чырвонай Арміі на Заходнім фронце Беларуская Рэспубліка аднаўлялася ў межах адной Мінскай губерні, а дакладней, толькі 6 яе паветаў. На іх тэрыторыі налічвалася 1 млн 635 тыс. жыхароў. Беларускія эсэры адмовіліся падпісаць “Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь”, хоць спачатку выказаліся ў яе падтрымку. Яны прапанавалі пашырыць тэрыторыю рэспублікі да яе этнаграфічных межаў. Акрамя таго, яны патрабавалі склікаць Усебеларускі працоўны кангрэс для вырашэння пытання аб дзяржаўным будаўніцтве Беларусі, сфарміраваць кааліцыйны ўрад з прадстаўнікоў усіх партый нацыянальнай дэмакратыі, утварыць беларускае войска, забяспечыць поўную незалежнасць Беларусі ад Расіі, абвясціць беларускую мову дзяржаўнай. ЦК КП(б) ЛіБ адхіліў гэтыя патрабаванні. Тады ЦК БПС-Р вывеў сваіх прадстаўнікоў з Белваенрэўкома і заявіў, што партыя эсэраў абараняе інтарэсы сялянства і працоўнай беларускай інтэлігенцыі і не падзяляе бальшавіцкую пазіцыю па праблеме дзяржаўнай улады на Беларусі.

У лістападзе–снежні 1920 г. на Беларусі прайшлі выбары ў сельскія, валасныя, павятовыя і гарадскія Саветы. Рэўкомы былі скасаваны. У склад Саветаў увайшлі ў асноўным бальшавікі. Пры Саветах утварыліся камісіі, якія пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый праводзілі чыстку савецкіх устаноў ад “класава-варожых элементаў”. 13–17 снежня 1920 г. адбыўся ІІ Усебеларускі з’езд Саветаў. З’езд абраў ЦВК БССР і звярнуўся да працоўных Беларусі з заклікам накіраваць усе сілы на аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі.

## § 4. Гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў 1919–1920 гг.

У гады іншаземнай інтэрвенцыі на Беларусі панавалі разруха і голад. Не працавалі многія прамысловыя прадпрыемствы. Быў разбураны транспарт. Надзвычай цяжка было з харчаваннем, асабліва ў гарадах. Усё гэта патрабавала ўзмацнення работы па мабілізацыі працоўных на барацьбу з гаспадарчай разрухай. 12 лютага 1919 г. Савет народнай гаспадаркі Беларусі (СНГБ) прыняў пастанову аб нацыяналізацыі ўсіх фабрык і заводаў і іншых прамысловых прадпрыемстваў. Да ліпеня 1919 г. на Беларусі было нацыяналізавана 182 прадпрыемствы – гэта больш палавіны ўсіх дзейнічаючых фабрык і заводаў.

Ва ўмовах вайны і гаспадарчай разрухі галоўным было харчовае пытанне. Каб выратаваць рабочых ад голаду, забяспечыць харчовымі прадуктамі Чырвоную Армію, савецкая ўлада была вымушана пайсці на надзвычайную меру – увядзенне харчовай развёрсткі. Яна з'явілася галоўным элементам эканамічнай палітыкі, якая атрымала назву "ваенны камунізм".

Аднак становішча на Беларусі ў гэты час заставалася вельмі цяжкім. Польскія інтэрвенты нанеслі гаспадарцы Беларусі велізарныя страты. Паводле звестак камісіі па вызначэнні страт, нанесеных войскамі Польшчы беларускаму народу, агульныя страты дасягнулі 52 029 281 рубля ў даваеннай залатой валюце (9 034 208 319 савецкіх рублёў паводле курсу 1940 г.). Ад тэрору, грабяжоў і гвалтаў акупантаў Беларусь страціла звыш 158 тыс. мірных жыхароў.

Аднаўленне народнай гаспадаркі пачалося з нацыяналізацыі прамысловасці. Да канца 1920 г. на Беларусі (у межах да 1939 г.) удзельная вага дзяржаўнага сектара ў буйной прамысловасці складала 94,2 % (345 прадпрыемстваў), у дробнай прамысловасці – 47,4 % (828 прадпрыемстваў), у дробных і рамесніцкіх майстэрнях – 2,5 % (10837 майстэрань). Такім чынам, камандныя пазіцыі ў прамысловасці Беларусі былі поўнасцю сканцэнтраваны ў руках дзяржавы. Да канца 1920 г. у Мінскай губерні пачалі даваць прадукцыю некалькі рамонтных майстэрань, дрожджа-вінакурных і смалакурных заводаў, тры канатныя фабрыкі і г.д. Пачалі будавацца новыя прадпрыемствы – панчошна-трыкатажная фабрыка ў Віцебску, лесапільны завод у Гомелі і інш. Але гэта былі толькі першыя і пакуль невялікія дасягненні.

У цяжкім становішчы апынулася сельская гаспадарка. Значна скараціліся зямельныя плошчы, пагалоўе жывёлы.

Найбольш перспектыўнай формай калектыўнага земляробства лічылася сельскагаспадарчая арцель. 19 мая 1919 г. Наркамзем РСФСР зацвердзіў "Прыкладны статут працоўнай земляробчай арцелі", у якім вызначыў прынцыпы яе арганізацыі. Статут прадугледжваў абавязковую здачу зямлі ў агульнае карыстанне і разам з тым дапускаў вядзенне членамі арцелі сваёй індывідуальнай гаспадаркі. Меркавалася, што такое спалучэнне грамадскіх і асабістых інтарэсаў будзе з'яўляцца важнай умовай росту прадукцыйнасці працы і развіцця грамадскай гаспадаркі. Аднак першыя сельскагаспадарчыя арцелі, утвораныя на Беларусі, паказалі, што спалучыць асабістыя і грамадскія інтарэсы сялян у тых умовах было вельмі складана.

Вельмі цяжкім было матэрыяльнае становішча працоўных Беларусі. Ва ўмовах грамадзянскай вайны савецкім урадам былі праведзены тэрміновыя мерапрыемствы, каб выратаваць рабочых ад голаду. З мэтай павелічэння харчовых пайкаў рабочым і служачым з ліку мясцовых рэсурсаў ствараліся новыя і пашыраліся падсобныя гаспадаркі прадпрыемстваў. У гарадах і мястэчках былі адкрыты рабочыя сталовыя. Абеды выдаваліся бясплатна. Размеркаванне пайкоў, работу сталовых кантралявалі рабочыя камісіі. Толькі ў Мінску ў кастрычніку 1920 г. была адкрыта 21 такая сталовая на 6 тыс. абедаў, большую частку якіх атрымлівалі беспрацоўныя. Акрамя таго, працавалі

22 дзіцячыя і 18 школьных сталовых. У Гомельскай губерні грамадскім харчаваннем карысталася каля 100 тыс. чалавек, у тым ліку каля 30 тыс. дзяцей, у Віцебскай губерні – 93,3 тыс. чалавек. Такія сталовыя былі адкрыты таксама ў Магілёве, Барысаве, Оршы, Слуцку і іншых гарадах і мястэчках Беларусі.

Ва ўмовах іншаземнай інтэрвенцыі, гаспадарчай разрухі вельмі складанае становішча было ў галіне культуры, народнай адукацыі. На захопленай Польшчай тэрыторыі Беларусі праводзіўся курс на апалячванне беларускага народа. Акупацыйныя ўлады прымушалі насельніцтва размаўляць толькі на польскай мове. Ужыванне рускай і беларускай моў было забаронена. Рабочыя і служачыя, якія не валодалі польскай мовай, пазбаўляліся працы. Толькі ў Мінску з гэтай прычыны было звольнена 8 тыс. рабочых і служачых.

Большасць насельніцтва была непісьменнай. У пачатку 1919 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях быў праведзены перапіс дзяцей школьнага ўзросту, які паказаў, што многія дзеці, асабліва ў вёсцы, не наведвалі школы. У Віцебскай губерні, напрыклад, у ліпені 1919 г. было зарэгістравана 13 668 дзяцей 8–13 гадоў, наведвалі школу толькі 8423 вучні. У Клімавіцкім павеце Гомельскай губерні восенню 1919 г. змаглі пайсці ў школу толькі 20 505 з 42 000 узятых на ўлік дзяцей школьнага ўзросту.

У 1919–1920 гг. былі зроблены адпаведныя захады, каб палепшыць школьную справу.

Важнейшай справай культурнага будаўніцтва на Беларусі ў 1919–1920 гг. з’явілася стварэнне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы. Першай вышэйшай навучальнай установай на Беларусі быў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, адноўлены 7 красавіка 1919 г. У жніўні 1920 г. Наркамасветы РСФСР прызнаў неабходным адкрыць на Беларусі універсітэт, і пачалася падрыхтоўка да яго ўтварэння. У снежні 1920 г. пачаў працаваць Беларускі дзяржаўны палітэхнікум.

Часткай культурнага будаўніцтва было мастацкае выхаванне працоўных. У 1919–1920 гг. у многіх гарадах, мястэчках, вёсках Беларусі былі адкрыты клубы, бібліятэкі, музеі, музычныя школы, мастацкія майстэрні.

Плённа працавалі ў гэты час такія таленавітыя дзеячы беларускай літаратуры, як Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, М. Чарот, А. Гурло і інш.

У верасні 1920 г. у Мінску адкрыўся Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр (БДТ), які адыграў вялікую ролю ў развіцці беларускага нацыянальнага тэатра. У яго склад уваходзіла значная частка артыстаў Першага Беларускага аб’яднання драмы і камедыі, якая была арганізавана яшчэ ў красавіку 1917 г. у Мінску, а таксама таленавітая моладзь з самадзейнасці і некаторыя артысты рускай сцэны.

# РАЗДЗЕЛ VII. САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ І ПАБУДОВЫ САЦЫЯЛІЗМУ. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ (1921–1939)

## ГЛАВА 1. АДНАЎЛЕННЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ. ПРАВЯДЗЕННЕ ПАЛІТЫКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НА БЕЛАРУСІ

### § 1. Пачатак мірнага будаўніцтва. Новая эканамічная палітыка, яе сутнасць і вынікі

Пераход ад вайны да мірнага будаўніцтва паставіў перад беларускім народам шмат цяжкіх і складаных для вырашэння задач. Небходна было як мага хутчэй аднавіць разбураную гаспадарку, вызначыць шляхі будаўніцтва сацыялістычнага грамадства. З'яўляючыся на працягу 7 гадоў арэнай ваенных дзейнняў, Беларусь панесла велізарныя страты. Больш за палову фабрык і заводаў былі знішчаны, колькасць рабочых зменшылася ўдвая. З 715 прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці ўсходніх раёнаў рэспублікі не працавала 480. Агульны аб'ём валавай вытворчасці усёй прамысловасці складаў каля 15–20 % ад узроўню 1913 г., а сельскай гаспадаркі менш палавіны даваеннай. Амаль поўнасцю быў разбураны транспарт, не хапала сыравінна-паліўных сродкаў, колькасць рабочых зменшылася ўдвая. Сістэма харчразвёрсткі не стымулявала развіцця сялянскай гаспадаркі. Сяляне мелі вялікую патрэбу ў прамысловых таварах і прыладах працы, а прамысловасць не магла задаволіць нават мінімальныя іх запатрабаванні. Тавараабмен паміж горадам і вёскай амаль спыніўся. З заканчэннем грамадзянскай вайны, аслабленнем міжнароднай напружанасці, знікненнем пагрозы "белай" рэстаўрацыі сяляне сталі патрабаваць права распараджацца зямлёй і атрыманай прадукцыяй, адмены палітыкі "ваеннага камунізму".

Катастрафічнае становішча было і ў сацыяльнай сферы. Адбыліся значныя змены ў складзе насельніцтва. У грамадзянскай вайне толькі Чырвоная Армія, па афіцыйных даных, згубіла каля 800 тыс. чалавек. Незлічоная колькасць людзей загінула ад голаду, хвароб і эпідэмій. Усяго страты насельніцтва Расіі, пачынаючы з 1914 г., набліжаліся, па ацэнках статыстыкаў, да 20 млн. чалавек.

"Дэкласаваліся" рабочы клас, іншыя групы і пласты насельніцтва. Колькасць "люмпенаў" расла вельмі хутка. Злачынныя групоўкі тэрарызавалі насельніцтва, нягледзячы на жорсткія меры з боку ЧК і міліцыі. Мараль у грамадстве зводзілася на нішто. Гібель бацькоў, распад сям'і і сваяцкіх сувязей былі прычынай шырокага распаўсюджання дзіцячай беспрытульнасці, што стала яшчэ адной крыніцай росту злачыннасці, беднасці і ў прамым сэнсе – адзічання і азвярэння людзей.

Сацыяльна-эканамічны крызіс дапаўняўся палітычным. Палітыка "ваеннага камунізму", заснаваная на прымусовых, ваенна-камуністычных метадах работы, не адпавядала новым умовам мірнага будаўніцтва. Яна

выклікала незадаволенасць народа, што неўзабаве вылілася у шматлікія мітынгі, забастоўкі і нават узброеныя выступленні супраць савецкай улады. Кульмінацыяй незадаволенасці стаў Кранштацкі мяцеж у лютым-сакавіку 1921 г.

Прычынай цяжкага эканамічнага і палітычнага крызісу на рубяжы 1920–1921 гг. было разбалансаванне палітычных і эканамічных інтарэсаў, захаванне ранейшых “ваенна-камуністычных” метадаў дзяржаўнага кіравання пры новых палітычных і эканамічных абставінах. Тэрміновы перагляд метадаў кіраўніцтва грамадствам стаў неабходным. Даводзілася вырашаць, якой павінна быць эканоміка не ў надзвычайных, а ў звычайных умовах.

Адказам на гэтыя пытанні з’явілася новая эканамічная палітыка (нэп), распрацаваная У. Леніным і прынятая X з’ездам РКП(б) у сакавіку 1921 г. Пераход да нэпа быў спробай сумясціць сацыялістычныя прынцыпы кіравання адзяржаўленай эканомікай, у першую чаргу прамысловасцю і транспартам, з эканамічнымі законамі капіталізма, выкарыстаць прыватны капітал у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва. Сутнасць нэпа зводзілася да максімальнага пад’ёму вытворчых сіл і паляпшэння становішча рабочых і сялян дзеля захавання савецкай улады. Новая эканамічная палітыка адкрывала перспектыву паступовага рэфарміравання грамадства на сацыялістычнай аснове.

Нэп – гэта ў першую чаргу пераход ад харчразвёрсткі да харчпадатку, памер якога быў на 30–50 % ніжэйшым. Памер харчпадатку вылічваўся з плошчы пасеваў і аб’яўляўся сялянам яшчэ да пачатку сельскагаспадарчых работ. Акрамя збожжавых, натуральным падаткам абкладалася прадукцыя жывёлагадоўлі: мяса, масла, воўна і г.д. Усіх падаткаў у 1921 г. было ўстаноўлена 13. Пазней яны былі заменены адзіным грашовым падаткам. З 1 студзеня 1924 г. браўся толькі чырвонцамі ў памеры каля 5 % прыбытку з гаспадаркі. Падатак дыферэнцыраваўся з улікам наяўнасці жывёлы, урадлівасці зямлі. Для гаспадарак, якія павялічвалі пасевы найбольш важных культур, прадугледжваліся некаторыя льготы. Ільготы мелі таксама сем’і чырвонаармейцаў, інвалідаў грамадзянскай вайны і інш.

Селянін атрымаў свабоду выбару формы арганізацыі апрацоўкі зямлі і гарантыю землеўладання. Аднолькава законнымі прызнаваліся сялянскія арцель, абшчына, аднаасобныя ўладанні ў выглядзе адрубоў або хутароў і інш.

Дазвалялася здаваць зямлю ў арэнду і выкарыстоўваць наёмную працу пры ўмове, што члены сям’і наймальніка таксама працуюць. Тэрмін арэнды абмяжоўваўся, заахвочвалася развіццё кааперацыі. Усё гэта стварала матэрыяльную зацікаўленасць у развіцці дробнатаварнай сялянскай гаспадаркі, расшырэнні і пад’ёме вытворчасці. Усе лішкі, якія заставаліся ў селяніна пасля выплаты падаткаў, ён мог свабодна абменьваць і прадаваць на рынку. Гэтым самым вярнуўся прыватны гандаль.

Спачатку лішкі дазвалялася толькі абменьваць на прадукты фабрычна-заводскай і саматужнай прамысловасці цераз кааператыўныя арганізацыі, на рынках або кірмашах. Аднак спроба абмежаваць прыватны абмен мясцовымі

рынкамі, натуральным абменам не дала патрэбных вынікаў, а таму з мая 1921 г. грамадзяне і кааператывы атрымалі права абменьваць, купляць і прадаваць сельгаспрадукты, якія засталіся ў іх пасля выплаты падаткаў.

У гады нэпа ажыццяўляліся тры віды гандлю: прыватны, кааператыўны і дзяржаўны. Паміж імі існавала адкрытая канкурэнцыя. У рознічным гандлі найбольш актыўным быў прыватны прадавец, дзяржаўны гандаль лідзіраваў у аптовай сферы, кааператывы ж займаліся і аптовым і рознічным гандлем.

У галіне фінансаў вялікае значэнне надавалася стабілізацыі рубля, які амаль абясцэніўся. З гэтай мэтай была праведзена грашовая рэформа. Першым практычным крокам з'явілася ажыццяўленне дзвюх дэнамінацый (змяненне намінавальнай вартасці грашовых знакаў з абменам у вызначаных суадносінах старых знакаў на новыя) грашовых знакаў. У 1922 г. выпушчаны новыя дзяржаўныя знакі, т. зв. саўзнакі. Адзін новы рубель адпавядаў 10 тысячам дарэформенных. Другая дэнамінацыя адбылася ў наступным годзе. Адзін рубель узору 1923 г. раўняўся 1 млн дарэформенных рублёў, або 100 рублям узору 1922 г. Аднак і такія меры не змаглі стрымаць падзення агульнага курсу грошай.

Улічваючы гэта, Дзяржбанк ужо ў канцы 1922 г. выпусціў новыя грашовыя знакі – чырвонцы, якія абменьваліся на золата (1 чырвонец раўняўся 10 дарэвалюцыйным залатым рублям, або 7,74 г чыстага золата) Такім чынам, у краіне ўтварыліся дзве грашовыя сістэмы: абясцэненыя саўзнакі выпуску 1922–1923 гг. і "цвёрды" чырвонец, які абменьваўся на золата.

У лютым 1924 г. грашовая рэформа завяршылася. Былі выпушчаны новыя казначэйскія білеты вартасцю 1, 3, 5 рублёў, забяспечаныя золатам, разменныя сярэбраная і медная манеты. Быў праведзены абавязковы абмен старых грошай – саўзнакаў на новыя.

Быў збалансаваны бюджэт і забаронена грашовая эмісія для пакрыцця расходаў дзяржавы. У 1921 г. адноўлены Дзяржбанк, а таксама створаны спецыялізаваныя банкі (акцыянерныя, камерцыйныя і інш.).

Былі адменены ўсе абмежаванні на сумы ўкладаў, якія маглі захоўваць грамадзяне і арганізацыі ў ашчадных банках. Уклады ў ашчадных касах не маглі быць канфіскаваны і павінны былі выплачвацца трымальнікам па іх патрабаванні. Гарантавалася тайна ўкладаў.

У прамысловасці таксама адбыліся карэнныя змены. Дзяржава стала падтрымліваць дробныя і сярэднія прыватныя і кааператыўныя прадпрыемствы, адмяніла дэкрэты, што абмяжоўвалі іх свабоду дзеянняў і паўнамоцтвы. Прамысловыя кааператывы атрымалі правы юрыдычных асоб, маглі выкарыстоўваць наёмную працу, атрымліваць крэдыты. Здаваліся ў арэнду нацыяналізаваныя прамысловыя прадпрыемствы, якія ў дзяржаўным сектары аказаліся нерэнтабельнымі. Перавага пры перадачы ў арэнду аддавалася кааператывам, хоць не выключалася здача і прыватным асобам. Тэрмін арэнды звычайна складаў ад 2 да 5 гадоў, а арэндная плата бралася натурай у выглядзе

працэнта (долі) вырабляемай прадукцыі. У гады нэпа прыватны сектар даваў ад 1/5 да 1/4 прамысловай прадукцыі.

Дазвалялася арэнда прамысловых прадпрыемстваў іншаземнымі фірмамі ў форме канцэсій.

Радыкальныя змены адбыліся ў кіраванні дзяржаўнай прамысловасцю. Главкі былі ліквідаваны, замест іх створаны трэсты – аб'яднанні аднародных або ўзаемазвязаных паміж сабой прадпрыемстваў. Прадпрыемствы атрымлівалі поўны гаспадарчы разлік і фінансавую незалежнасць, нават права выпуску каштоўных папер па доўгатэрміновых аблігацыйных пазыках. Ні Усесаюзны савет народнай гаспадаркі (УСНГ), ні СНГ Беларусі не мелі права ўмешвацца ў бягучую дзейнасць трэстаў. СНГ Беларусі ператварыўся ў каардынацыйны цэнтр. Ён ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва 16 гаспадарчаразліковымі групавымі ўпраўленнямі і 15 заводаўпраўленнямі.

Сталі ствараццa сіндыкаты – аб'яднанні трэстаў на пачатках кааперацыі. Сіндыкаты займаліся збытам, забеспячэннем, крэдытаваннем, знешнегандлёвымі аперацыямі. Такім чынам яны манапалізавалі ўвесь гандлёвы аппарат кожнай асобна ўзятай галіны прамысловасці, сканцэнтравалі ў сваіх руках асноўную частку аптовага гандлю.

Узнаўлялася грашовая аплата працы. У той жа час ажыццяўляўся пераход да новай тарыфнай палітыкі, якая грунтавалася на прынцыпе здзельнай аплаты працы, здымаліся абмежаванні на павышэнне заробкаў пры росце выпрацоўкі. Былі ліквідаваны абавязковая працоўная павіннасць і некаторыя абмежаванні на перамену месца работы. Такім чынам, арганізацыя працы будавалася на прынцыпах матэрыяльнага стымулявання.

Пераход да нэпа азначаў пераход ад "адміністрацыйнага" да "гасразліковага" сацыялізму, выкарыстанне таварна-грашовых, рыначных адносін для будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Заняпаўшая ў гады вайны і рэвалюцыйных пераўтварэнняў эканоміка Беларусі з пераходам да нэпа пачала адраджацца. Ужо ў 1926 г. адноўлены дарэвалюцыйны аб'ём вытворчасці. Адбылася карэнная перабудова сацыяльнай сферы, адмова ад ваенна-камуністычных прынцыпаў размеркавання. Адмяняліся ўсеагульная працоўная павіннасць, працоўныя мабілізацыі, працоўныя арміі і ўраўняльная аплата працы. Камплектаванне прадпрыемстваў рабочай сілай рабілася праз біржы працы, а заработная плата вызначалася ў залежнасці ад зробленай работы. Аднаўлялася плата за транспарт, камунальныя і іншыя паслугі.

Асаблівасцю перыяду новай эканамічнай палітыкі ў Беларусі было тое, што ў выніку існаваўшай тут у дарэвалюцыйныя часы яўрэйскай "мяжы аседласці" нэпманамі з'яўляліся пераважна яўрэі. Гэта служыла асновай для ўзмацнення, з аднаго боку, шавіністычнай ідэалогіі яўрэйскай буржуазіі – сіянізму, а з другога боку, зняважлівых і нават варожых адносін да яўрэяў, іх заняткаў, быту і культуры – антысемітызму.

Новая эканамічная палітыка не азначала адмовы бальшавікоў ад прынцыпаў сацыялізму і камунізму, нэп быў часовым адступленнем у эканамічнай сферы з тым, каб, выкарыстаўшы капітал буржуазіі і вопыт прыватных асоб, стварыць умовы для будаўніцтва сацыялізму. Гэта быў тактычны манеўр, а не змена стратэгічнага курсу бальшавікоў.

Тэмпы развіцця прамысловасці рэспублікі былі намнога вышэйшымі, чым, напрыклад, у РСФСР. Хутчэй за іншыя галіны дасягнулі даваеннага ўзроўню дрэваапрацоўчая, металаапрацоўчая і гарбарная прамысловасці. Аднак адставанне некаторых галін (будматэрыялаў, тэкстыльнай, хімічнай) прывяло да таго, што ў цэлым даваенны ўзровень у прамысловасці быў дасягнуты толькі ў 1927 г. Да таго ж даваенны ўзровень, на які выйшла наша эканоміка, з’яўляўся паказчыкам адсталасці краіны. Вядучыя галіны прамысловасці (харчовая, дрэваапрацоўчая, папяровая, гарбарна-абутковая і інш.) спецыялізаваліся ў асноўным на перапрацоўцы лясной сыравіны і прадукцыі сельскай гаспадаркі.

У 1921/22 гаспадарчым годзе ўведзены ў строй мінскія заводы “Метал”, “Вулкан”, запалкавая фабрыка “Бярэзіна” ў Барысаве і інш. У 1922 г. у Беларусі ўжо дзейнічала 277 прамысловых прадпрыемстваў.

Перанаселенасць вёскі, нізкая землезабяспечанасць сялянскай гаспадаркі, беспрацоўе ў мястэчках і гарадах спрыялі развіццю саматужнага рамесніцтва, дробнай прамысловасці і гандлю. Дзяржава ў адпаведнасці з дэкрэтам СНК РСФСР ад 17 мая 1921 г. падтрымлівала прыватніка. У выніку ў рэспубліцы паявілася мноства швейных, слясарных, дрэваапрацоўчых майстэрняў, пякарняў, лавак і інш.

Аднаўленне прамысловасці Беларусі адбывалася пры дапамозе іншых савецкіх рэспублік. Асаблівае значэнне мелі эканамічныя сувязі з РСФСР. Беларусь атрымлівала абсталяванне, станкі, электраматоры, металічныя вырабы, з Украіны – сыравіну, метал, паліва, кокс і інш. Ажыццяўленню новай эканамічнай палітыкі садзейнічала ўмацаванне і пашырэнне сувязей паміж савецкімі рэспублікамі. 16 студзеня 1921 г. быў заключаны дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР. У выніку ўсебаковага супрацоўніцтва да сярэдзіны 1922 г. усе савецкія рэспублікі прыйшлі да ідэі дзяржаўнага саюза паміж імі. 14–18 снежня 1922 г. адбыўся IV Усебеларускі з’езд Саветаў. Ён прыняў рашэнне аб неабходнасці ўтварэння Саюза ССР і далучэння БССР да яго.

I з’езд Саветаў СССР адкрыўся ў Маскве 30 снежня 1922 г. Ён вырашыў утварыць Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Дагавор аб утварэнні СССР заключылі незалежныя савецкія рэспублікі: БССР, РСФСР, УССР і ЗСФСР. СССР утвараўся як добраахвотнае аб’яднанне раўнапраўных рэспублік, як адзіная саюзная дзяржава.

Аднак поспехі першых гадоў нэпа прынеслі і вялікія эканамічныя праблемы. Яны былі выкліканы крызісам збыту, які ўзнік у выніку няправільнай цэнавай палітыкі дзяржавы, вялікай розніцы паміж коштам прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў. У 1923 г. цэны на прамысловыя

тавары ў Беларусі выраслі ў параўнанні з сельскагаспадарчымі больш чым у 5 разоў. Такімі мерамі дзяржава разлічвала атрымаць за кошт сялянства неабходныя сродкі для аднаўлення буйной прамысловасці.

Разыходжанне ў цэнах прывяло да таго, што селянін за прададзеную прадукцыю мог набыць прамтавараў у параўнанні з даваенным часам у 7 разоў менш. З прычыны такой дарагавізны сяляне амаль перасталі купляць вырабы фабрычна-заводскай вытворчасці.

Крызіс збыту абвастрыў фінансавую праблему. Перажываючы вострыя недахоп грошай, прадпрыемствы не маглі нарыхтоўваць сыравіну і паліва, своечасова выплачваць заработную плату, што нярэдка прыводзіла да канфліктаў і забастовак. Многія прадпрыемствы вымушаны былі скарачаць вытворчасць і нават зачыняцца. У выніку расла армія беспрацоўных. У БССР у 1923 г. іх колькасць вагалася ад 5 да 9 тыс.

У ходзе пераадолення крызісу прымаліся меры па зніжэнні сабекошту прамысловай прадукцыі, цэн на тавары, скарачэнні накладных расходаў, удасканальвалася дзейнасць кіруючага апарату і інш.

У выніку павысілася рэнтабельнасць прадпрыемстваў, узніклі ўмовы для зніжэння цэн на прамысловыя тавары. 29 лютага 1924 г. Савет Працы і Абароны СССР зацвердзіў пастанову “Аб зніжэнні цэн”. Каб павялічыць таварнасць сялянскай гаспадаркі, у 1923/24 гаспадарчым годзе дзяржава перайшла ад натуральнага да грашовага падатку, пашыраліся арэнда зямлі і наём рабочай сілы, аднавіўся вываз збожжа за мяжу.

1923/24 гаспадарчы год стаў пераломным у рабоце прамысловасці Беларусі. У паляпшэнні яе дзейнасці важнейшае значэнне мелі захады, накіраваныя на паскарэнне тэмпаў росту прадукцыйнасці працы і рэгуляванне заработнай платы.

Усяго за гады аднаўлення было пабудавана 106 новых прадпрыемстваў. У выніку колькасць прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці павялічылася да 347, а іх валавая прадукцыя вырасла амаль у 5 разоў.

Аднак пераважную большасць, як і раней, складалі дробныя прадпрыемствы. Па даных перапісу 1926 г., у рэспубліцы налічвалася 60 178 дробных прадпрыемстваў (занята больш за 100 тыс. чалавек), з іх прыватных – 58 034 (10 295 наёмных работнікаў).

Хуткаму аднаўленню прамысловай вытворчасці садзейнічала не толькі новая эканамічная палітыка, але і творчая ініцыятыва рабочых, укараненне прагрэсіўных метадаў працы. Узнік рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў.

Для развіцця працоўнага энтузіязму адначасова з матэрыяльнай зацікаўленасцю пашыралася маральнае заахвочванне.

Па меры аднаўлення прамысловасці і сельскай гаспадаркі павышаўся матэрыяльны дабрабыт працоўных Беларусі. У канцы 1921 г. у рэспубліцы была адменена картачная сістэма забеспячэння. Паляпшаліся жыллёвыя ўмовы працоўных. У Мінскуу ў маі – жніўні 1921 г. забяспечаны жыллём 4650 чалавек. Рабочыя і служачыя пачалі атрымліваць чарговыя адпачынкі. Былі

забаронены звышурочныя і начныя работы без папярэдняга дазволу на тое аддзела аховы працы.

Да канца аднаўленчага перыяду павялічылася колькасць установ аховы здароўя, палепшылася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. У студзені 1926 г. у рэспубліцы налічвалася 216 урачэбных участкаў, 163 фельчарскіх і акушэрскіх пункты, 148 бальніц.

Дзякуючы павышэнню матэрыяльнага дабрабыту, паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання, умоў працы вырасла нараджальнасць і зменшылася смяротнасць.

Правядзенне ў жыццё новай эканамічнай палітыкі дазволіла ў кароткі тэрмін аднавіць прамысловасць, стабілізаваць эканоміку, узняць матэрыяльнае становішча насельніцтва. Гэта стварыла добрыя ўмовы для здзяйснення новых, больш важных крокаў у развіцці прамысловасці, ажыццяўленні індустрыялізацыі рэспублікі.

Пераломным для дзейнасці прыватнага сектара стаў 1926/27 гаспадарчы год. 8 верасня 1926 г. СНК СССР пастанавіў “максімальна ўзмацніць абкладанне прыватнага капіталу”, перайсці да адзяржаўлення дробнай вытворчасці і гандлю, што фактычна азначала адмаўленне ад нэпа. У сувязі з гэтым рашэннем рэзка скарачалася крэдытаванне прыватніка, скасоўваліся арэндныя дагаворы, павялічваліся падаткі і г.д.

Такая палітыка прывяла да згортвання дзейнасці прыватных прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў. Доля прыватніка ў валавой прамысловай прадукцыі з 1925 да 1927 г. у БССР зменшылася з 49,2 да 28,6 %. Удзельная вага прыватніцкай вытворчасці ў агульным аб’ёме тавараабароту скарацілася за гэты час з 40,2 да 29,6 %.

У тых умовах, умовах таварнага голаду, адсутнасці адладжанага таваразмеркавання, вострай нястачы фінансавых сродкаў, выцясненне прыватніка было адной з памылак у справе кіраўніцтва эканомікай краіны.

## § 2. Курс на сацыялістычную індустрыялізацыю. Асаблівасці яе правядзення ў рэспубліцы

Лічыцца, што аднаўлене народнай гаспадаркі да пачатку 1926 г. у асноўным завяршылася. Аднак дасягнуты даваенны ўзровень вытворчасці не мог задаволіць патрэбы дзяржавы. СССР па аб’ёму прамысловай прадукцыі на душу насельніцтва ў 5–6 разоў адставаў ад развітых капіталістычных краін. Яшчэ горшым было становішча ў Беларусі. Яна па-ранейшаму заставалася слабаразвітай у прамысловых адносінах рэспублікай. Займаючы 0,6 % тэрыторыі (3,4 % насельніцтва) СССР, Беларусь давала ўсяго 1,6 % прамысловай прадукцыі краіны. Доля прамысловай прадукцыі ва ўсёй народнай гаспадарцы рэспублікі складала толькі 23,5 % (у СССР – 39,1 %). Не адбылося значных змен і ў структуры прамысловасці. Аснову яе складалі харчовая, дрэваапрацоўчая, папяровая, гарбарная галіны, на долю якіх прыпадала

асноўная частка агульнага аб'ёму валавой прадукцыі. Прамысловасць Беларусі па-ранейшаму заставалася дробнай і кустарнай.

Вельмі востра стаяла ў рэспубліцы праблема інжынерна-тэхнічных кадраў, кваліфікаваных рабочых. У 1927 г. удзельная вага інжынераў і тэхнікаў складала 2 % ад агульнай колькасці работнікаў, занятых у прамысловасці. Большасць спецыялістаў складалі практыкі. У той жа час і культурны ўзровень асноўнай масы насельніцтва заставаўся яшчэ нізкім.

Усё гэта, разам узятае, перашкаджала развіццю народнай гаспадаркі рэспублікі. У той жа час магчымасці далейшага значнага павелічэння вытворчасці на старой базе аказаліся вычарпанымі. Пераадолець тэхніка-эканамічную адсталасць магчыма было толькі на базе шырокага разгортвання рэканструкцыі старых прадпрыемстваў і новага капітальнага будаўніцтва. Краіне трэба было перш за ўсё вырашыць задачу індустрыялізацыі.

**Сацыялістычная індустрыялізацыя** – гэта палітыка Камуністычнай партыі і савецкага ўрада, якая мела галоўнай мэтай стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму, пераўтварэнне СССР у эканамічна незалежную дзяржаву з магутным эканоміка-вытворчым, навукова-тэхнічным і абаронным патэнцыялам, забеспячэнне росту прадукцыйнасці працы і на гэтай аснове няўхільнае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных.

Сутнасць індустрыялізацыі, як адзначалася ў рашэннях XIV з'езда ВКП(б), заключалася ў наступным: "весці эканамічнае будаўніцтва пад такім вуглом гледжання, каб СССР з краіны, якая ўвозіць машыны і абсталяванне, ператварыць у краіну, якая выпускае машыны і абсталяванне". Дзеля таго, каб забяспечыць пераўзбраенне народнай гаспадаркі, падняцце яе на новы тэхнічны ўзровень, аб'яўлялася пераважным развіццё цяжкай індустрыі, асабліва тых яе галін, што выраблялі сродкі вытворчасці. З'езд заклікаў развіваць "сацыялістычную прамысловасць на аснове павышанага тэхнічнага ўзроўню, аднак у строгай адпаведнасці як з ёмістасцю рынку, так і фінансавымі магчымасцямі дзяржавы". Пры гэтым падкрэслівалася, што поспех індустрыялізацыі будзе залежаць ад умацавання "змычкі" рабочага класа і сялянства, г. зн. удзелу вёскі ў фінансаванні прамысловасці цераз збалансаваную палітыку ў вобласці падаткаў і цэн як на сельскагаспадарчую, так і на прамысловую прадукцыю.

Гэтыя палажэнні з'езда не адпавядалі поглядам Р. Зіноўева, Л. Каменева, Л. Троцкага. Яны настойвалі на звышіндустрыялізацыі за кошт сродкаў сялянскіх гаспадарак. "Новая апазіцыя" на чале з Р. Зіноўевым і Л. Каменевым дамагалася пашырэння вывазу збожжа за мяжу за кошт наступлення на "заможныя элементы" на сяле. Такіх жа поглядаў прытрымліваўся і Л. Троцкі, які настойваў на ўзмацненні падатковага абкладання сялянства і павышэнні цэн на прамысловыя тавары.

Погляды “новай апазіцыі” і трацікістаў на метады правядзення індустрыялізацыі атрымалі неабходны адпор з боку з’ездаў і ўсёй партыі. Катэгарычна па гэтым пытанні выказаўся XV з’езд партыі (снежань 1927 г.).

Па сваёй прыродзе індустрыялізацыя ў СССР не магла абмежавацца ні маштабамі асобных галін, ні тэрыторыяй асобных рэспублік ці раёнаў. Эканоміка Савецкай Беларусі была неад’емнай, арганічнай часткай эканомікі Савецкага Саюза, і індустрыялізацыя рэспублікі праходзіла як састаўная частка адзінага працэсу індустрыялізацыі ўсёй краіны.

Індустрыялізацыя ў БССР з’яўлялася часткай адзінага працэсу індустрыялізацыі СССР. Разам з тым яна мела і свае асаблівасці правядзення. Па-першае, улічваючы дастатковыя запасы мясцовай сыравіны, патрэбу ў таварах народнага спажывання, зручныя шляхі зносін і вытворчыя традыцыі, асноўная ўвага ў БССР аддавалася паліўнай, дрэваапрацоўчай, папяровай, гарбарнай, швейнай, абутковай і харчовай прамысловасці. У рэспубліцы былі пабудаваны торфапрадпрыемства “Асінторф” каля Оршы, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацрўчыя камбінаты, Аршанскі льнокамбінат, гарбарны завод “Бальшавік” у Мінску, фабрыка штучнага валакна ў Магілёве, швейная фабрыка “Знамя індустрыялізацыі” і панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ у Віцебску.

Па-другое, прыгранічнае становішча БССР, неразведанасць яе прыродных багаццяў, недахоп сыравіны, інжынерна-тэхнічных і рабочых кадраў не дазвалялі разгарнуць буйнамаштабнае будаўніцтва аб’ектаў цяжкай прамысловасці, як гэта рабілася ў іншых рэгіёнах СССР. Тым не менш частка капіталаўкладанняў накіроўвалася на развіццё энергетыкі, машынабудавання і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. У гады першай (1928–1932 гг.), другой (1933–1937 гг.) і трэцяй (1938 – чэрвень 1941 гг.) пяцігодак уступілі ў строй Беларуская дзяржаўная раённая электрастанцыя (БелДРЭС), Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання (“Гомсельмаш”), Мінскі радыёзавод, магілёўскія трубаліцейны і аўтарамонтны заводы, Гомельскі шкляны і Крычаўскі цэментны заводы. Былі створаны таксама станкабудаўнічыя заводы імя К.Е. Варашылава і імя С.М. Кірава ў Мінску і станкабудаўнічыя заводы ў Віцебску і Гомелі.

Па-трэцяе, з-за недахопу ў рэспубліцы ўласных фінансавых рэсурсаў частку сродкаў на патрэбы індустрыялізацыі выдзяляў урад СССР. З 338 млн. руб., укладзеных у прамысловасць БССР за гады першай пяцігодкі, каля 1/3 паступіла з саюзнага бюджэту. З рэспублік Савецкага Саюза ў Беларусь завозілася прамысловае абсталяванне, чорныя і каляровыя металы, каменны вугаль, нафтапрадукты. На новабудоўлях рэспублікі працавалі спецыялісты і рабочыя з Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, прамысловых цэнтраў Урала. У той жа час тэхнічнае абсталяванне, станкі, зробленыя ў БССР, паступалі на фабрыкі і заводы Масквы, Украіны, Урала.

Па-чацвёртае, у БССР былі створаны новыя галіны прамысловасці – паліўная, машынабудаўнічая, радыётэхнічная, хімічная, наладзілася вытворчасць

штучнага валакна і трыкатажу. Сфарміраваліся інжынерна-тэхнічныя кадры, выраслі кадры рабочага класа. Мноства спецыялістаў і кваліфікаваных рабочых было падрыхтавана ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах, а таксама на фабрыках і заводах.

Шляхі і метады ажыццяўлення індустрыялізацыі, з улікам асаблівасцей Беларусі, намеціў Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 27–29 красавіка 1926 г. Плануючы стварэнне прамысловасці па вырабу сродкаў вытворчасці, пленум прызнаў неабходным і хуткае развіццё галін, якія базіраваліся на перапрацоўцы мясцовай сыравіны: керамічнай, шкляной, запалкавай, дрэваапрацоўчай, ільнопрадзільнай, папяровай, гарбарнай, харчовай і інш. Курс на развіццё гэтых галін адпавядаў структуры прамысловасці рэспублікі, што склалася гістарычна, яе эканамічным і фінансавым магчымасцям, сыравінным і працоўным рэсурсам. Як і ў даваенны час, перапрацоўка прадукцыі сельскай гаспадаркі займала вядучае месца ў прамысловасці БССР. У 1927/28 гаспадарчым годзе на яе долю прыпадала 56,6 % агульнай прамысловай вытворчасці.

Правядзенне індустрыялізацыі патрабавала вялікіх сродкаў. На дапамогу ці крэдыты іншых дзяржаў разлічваць не даводзілася, усе надзеі ўскладаліся толькі на ўнутраныя крыніцы.

Асноўнай крыніцай накаплення з’яўлялася сама прамысловасць. Мэта была дасягнута шляхам пастаяннага скарачэння накладных расходаў, зніжэння сабекошту прадукцыі, паскарэння абарачальнасці сродкаў, шырокай рацыяналізацыі прамысловасці, укаранення найноўшых дасягненняў навукі і тэхнікі, павышэння прадукцыйнасці працы, умацавання працоўнай дысцыпліны. Дадатковыя сродкі на індустрыялізацыю атрымліваліся за кошт эканоміі і павышэння рэнтабельнасці вытворчасці.

У прамысловасць накіроўвалася частка сродкаў, атрыманых ад сельскай гаспадаркі. Значную колькасць станкоў і абсталявання куплялі ў замежных краінах за валюту, атрыманую ад экспарту сельгаспрадуктаў, які толькі ў 1926/27 гаспадарчым годзе склаў каля 5,5 млн рублёў.

Важнай крыніцай атрымання сродкаў для індустрыялізацыі з’явіліся зберажэнні працоўных. Масавы характар атрымала падпіска на дзяржаўныя пазыкі.

Сродкі, неабходныя для індустрыялізацыі, дзяржава атрымлівала і за кошт удасканальвання структуры дзяржапарату.

Значныя асігнаванні выдзяляліся народнай гаспадарцы Беларусі з агульнасаюзнага бюджэту. За тры гады, пачынаючы з 1926/27 гаспадарчага года, яны склалі больш за 19 млн рублёў. Усяго за 1925–1927 гг. у прамысловасць Беларусі было ўкладзена 40 млн рублёў. Асноўныя капіталаўкладанні накіроўваліся ў паліўную, дрэваапрацоўчую, папяровую, гарбарную, харчовую галіны прамысловасці.

Важныя змены адбываліся ў структуры капітальнага будаўніцтва. Калі ў гады аднаўлення большая частка капіталаўкладанняў накіроўвалася на рамонтныя работы, то ў сувязі з індустрыялізацыяй павялічыўся аб’ём сродкаў

на новае будаўніцтва і рэканструкцыю прадпрыемстваў. У 1925/26 гаспадарчым годзе на ўзвядзенне новых фабрык і заводаў было выдаткавана 12,1 % усёй сумы капіталаўкладанняў у прамысловасць, у 1927/28 гаспадарчым годзе – 50 %. За тры гады індустрыялізацыі ў рэспубліцы было пабудавана 150 прамысловых прадпрыемстваў.

Вынікі, дасягнутыя прамысловасцю БССР у першыя гады індустрыялізацыі, стварылі неабходныя перадумовы для далейшага развіцця прамысловых галін. Першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР (1928–1932) быў зацверджаны IX з’ездам Саветаў рэспублікі ў маі 1929 г. Асноўная задача плана фарміравалася як “фарсіраваны тэмп індустрыялізацыі Беларускай ССР, павышэнне ўдзельнай вагі прамысловасці ў народнай гаспадарцы”. Асаблівая ўвага звярталася на развіццё такіх галін прамысловасці, як дрэваапрацоўчая, харчовая, гарбарная, ільняная, швейная. Адначасова планавалася развіццё машынабудавання для патрэб сельскай гаспадаркі і прамысловасці будматэрыялаў.

Аднак Беларуская ССР уласнымі сродкамі не магла забяспечыць неабходнае фінансаванне капітальнага будаўніцтва. Таму ў стварэнні буйной прамысловасці рэспубліка абапіралася на дапамогу СССР.

У выніку ў рэспубліцы штогод уводзіліся ў строй новыя фабрыкі і заводы. За гады першай пяцігодкі пабудавана 78 буйных і 460 дробных і сярэдніх прадпрыемстваў. Сярод іх швейныя фабрыкі “Сцяг індустрыялізацыі” ў Віцебску, імя Камінтэрна – у Гомелі, імя Валадарскага – у Магілёве, імя Дзяржынскага – у Бабруйску, панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ у Віцебску, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Гомсельмаш, буйнейшая ў рэспубліцы БелДРЭС паблізу Оршы і інш.

Увядзенне ў строй новых прадпрыемстваў значна знізіла ўдзельную вагу дробнай прамысловасці, якая ў канцы пяцігодкі дала ўсяго 17,3 % прамысловай прадукцыі БССР.

Дасягненні ў правядзенні індустрыялізацыі краіны нараджалі ілюзію небывалых магчымасцей. З гэтым было звязана абвяшчэнне Сталіным лозунга “Пяцігодку – за чатыры гады”, спроба ажыццявіць звышіндустрыялізацыю, “вялікі скачок” у развіцці СССР. Ужо ў другой палове 1929 г. план першай пяцігодкі быў перагледжаны і навязаны новыя, павышаныя заданні. Гэта прывяло да цяжкасцей у фінансавым і матэрыяльным забеспячэнні вытворчасці, зніжэння тэмпаў росту прадукцыі. Адмоўныя вынікі выявіліся хутка. У 1931 г. планавыя паказчыкі прамысловасцю БССР не былі дасягнуты.

Фактараў, якія стрымлівалі выкананне заданняў, было шмат. Адзін з іх – зрыў паставак многіх відаў сыравіны і матэрыялаў з іншых рэспублік. Эканамічныя рэсурсы Беларусі не маглі забяспечыць па-валюнтарысцку завышаныя праграмы індустрыялізацыі.

Калі ў працэсе фарміравання плана ўпор рабіўся на эканамічныя стымулы і гаспадарчаразліковыя метады, то ў ходзе яго рэалізацыі вядучымі сталі метады каманднай эканомікі. У 1932 г. XVII партканферэнцыя ВКП(б) канчаткова

адмовілася ад новай эканамічнай палітыкі, адзначыўшы яе “поўную несумяшчальнасць з палітыкай партыі і інтарэсамі рабочага класа, з буржуазна-нэпманскімі скажэннямі прынцыпу гаспадарчага разліку, якія праявіліся ў разбазарванні агульнанародных дзяржаўных рэсурсаў і, значыць, у зрыве ўстаноўленых гаспадарчых планаў”. Такім чынам, на змену гаспадарчаму разліку ў эканоміцы прыйшла камандна-адміністрацыйная сістэма.

На падставе рашэння ЦВК СССР ад 5 студзеня 1932 г. саўнаргас Беларусі быў пераўтвораны ў Наркамат лёгкай прамысловасці БССР, а прадпрыемствы цяжкай і лясной прамысловасці БССР, якія яму падпарадкоўваліся, перададзены адпаведным саюзным наркаматам. Фактычна ўсталёўвалася жорсткая цэнтралізаваная сістэма кіравання прамысловасцю часоў “ваеннага камунізму”.

Тым не менш у выніку прымянення камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання індустрыялізацыя ішла хутка, прамысловасць рэспублікі як у першай, так у другой і трэцяй пяцігодках развівалася дастаткова высокімі тэмпамі. Да канца другой пяцігодкі рэспубліка давала ўжо 2,2 % усёй валавой прадукцыі прамысловасці СССР.

Паспяховае ажыццяўленне індустрыялізацыі, эфектыўнае функцыяніраванне прадпрыемстваў патрабавалі кваліфікаваных інжынерна-тэхнічных і рабочых кадраў, якія добра ведалі б вытворчасць, маглі кіраваць навейшай тэхнікай, рацыянальна яе выкарыстоўваць.

Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў ажыццяўлялася перш за ўсё праз сетку прафесійных навучальных устаноў: вучэбна-практычныя майстэрні, школы фабрычна-заводскага навучання і прафесійна-тэхнічныя. У 1930 г. у сістэме прафтэхадукацыі рэспублікі было 96 навучальных устаноў.

Рабочыя кадры для прамысловасці рыхтаваліся таксама шляхам брыгаднага і індывідуальнага вучнёўства.

Рабочы клас Беларусі разгарнуў спаборніцтва за авалоданне новай тэхнікай, уздым тэхнічнай пісьменнасці.

Нягледзячы на працоўны ўздым і высокія тэмпы індустрыялізацыі, заданні другой і першых гадоў трэцяй пяцігодак таксама не былі выкананы. Па тэмпах развіцця БССР адставала ад СССР у цэлым. Для індустрыялізацыі Беларусі, як адзначалася ў дакументах XII з’езда КП(б)Б, было характэрна пашырэнне “прамысловай вытворчасці, заснаванай галоўным чынам на мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіне, а таксама шляхам размяшчэня ў Беларусі прамысловых прадпрыемстваў, заснаваных на транспартабельнай прывазной сыравіне, паўфабрыкатах”. Паколькі прамысловасць Беларусі развівалася ў асноўным на базе мясцовых рэсурсаў, яна ўсё больш выходзіла за рамкі старых гарадоў, набліжалася да крыніц сыравіны. У індустрыяльную працу ўцягвалася сельскае насельніцтва. Больш рацыянальна сталі выкарыстоўвацца працоўныя рэсурсы.

Паслядоўнае ажыццяўленне лініі на развіццё вытворчасці сродкаў вытворчасці змяніла галіновую структуру прамысловасці. За гады даваенных

пяцігодак у рэспубліцы створаны новыя галіны буйной прамысловасці: торфаздабыўная, машынабудаванне, станкабудаванне, вытворчасць штучнага валакна, цэментная, трыкатажная, ільноапрацоўчая, тлушчавая і інш. Была створана новая энергетычная і паліўная база.

У агульным комплексе эканамічнага развіцця Беларусі важная роля належала развіццю і рэканструкцыі транспарту. Было пракладзена 70 км чыгунак.

Важнае значэнне ў гаспадарчым жыцці набываў новы від транспарту – аўтамабільны. Аўтамабільная гаспадарка рэспублікі да канца другой пяцігодкі мела прыкладна 8 тыс. аўтамашын. Пачаў уводзіцца аўтобусны рух для перавозкі пасажыраў.

У 1935 г. адкрыта першая ў рэспубліцы авіялінія Мінск–Масква. У Мінску быў пабудаваны аэрапорт. Пачата перавозка пошты і пасажыраў у аддалёныя раёны БССР.

У рэспубліцы ўсё больш укаранялася тэлефонная і тэлеграфная сувязь.

У выніку ажыццяўлення індустрыялізацыі СССР стаў адной з трох – чатырох краін свету, якія былі здольны вырабляць любы від прамысловай прадукцыі, даступнай тады чалавецтву. Беларуская ССР з аграрнай акраіны былой Расійскай імперыіператварылася ў рэспубліку з развітай прамысловасцю. З’явіліся новыя галіны прамысловасці. БССР стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай Савецкага Саюза. Было ліквідавана беспрацоўе, адменена картачная сістэма на прамысловыя і харчовыя тавары.

Адным са станоўчых вынікаў індустрыялізацыі з’явілася істотнае змяненне сацыяльнай структуры грамадства. Гэта ў першую чаргу было звязана з колькасным ростам рабочага класа. Як сведчаць даныя Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1939 г., яго доля ў складзе насельніцтва БССР дасягнула 21,9 %.

Індустрыялізацыя абумовіла развіццё адукацыі, сістэмы вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, навукі і культуры народа. Доля інтэлігенцыі, паводле вынікаў гэтага ж перапісу, узрасла да 14,5 %.

Адбыліся некаторыя станоўчыя змены і ў матэрыяльным становішчы насельніцтва. Амаль удвая павысіўся сярэдні заробак рабочых і служачых. Неаднаразова зніжаліся цэны на харчовыя і прамысловыя тавары. З 1 студзеня 1936 г. адмяняліся карткі на непрадуктовыя тавары і інш.

Узровень жыцця людзей хаця і павышаўся, але ўсё яшчэ заставаўся нізкім, як у іншых рэспубліках СССР. Нягледзячы на гэта, XVIII з’езд партыі (сакавік 1939 г.) заявіў, што “пастаўленая другім пяцігадовым планам задача павышэння ўзроўню народнага спажывання ў два разы і болей… выканана”. Скажэнне рэчаіснасці, замоўчванне цаны і сродкаў дасягненняў садзейнічалі ўмацаванню дырэктыўнага механізма кіравання і гаспадарання, развіццю культу асобы Сталіна.

## § 3. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі

**На шляхах перабудовы: кааператыўнае сельскай гаспадаркі.** Велізарнае значэнне ў жыцці нашага грамадства, 4/5 насельніцтва якога ў 20–30-я гады складала сялянства, мела радыкальнае пераўтварэнне сельскай гаспадаркі. Цяжкія ўмовы працы і быту сялян, раздробленасць зямельных участкаў, прымітыўныя прылады працы і, як вынік, нізкая эфектыўнасць вытворчасці харчовых прадуктаў, што стрымлівала агульнае эканамічнае развіццё краіны, – усё гэта пераканаўча сведчыла аб існаванні аб'ектыўнай неабходнасці карэннага пераўладкавання сельскай гаспадаркі, уздыму агульнай культуры вёскі.

Дадзеная гістарычная неабходнасць пачала рэалізоўвацца ў 20-я гады шляхам развіцця розных форм кааперацыі, паступовага пераходу дробных сялянскіх гаспадарак да калектыўнай апрацоўкі зямлі ва ўмовах нэпа. Асаблівасцю Беларусі было тое, што ўвядзенне нэпа супадала з перадачай зямлі сялянам. Прыняты ІІ з'ездам Саветаў Дэкрэт аб зямлі, паводле якога ўся зямля перадавалася бязвыплатна сялянам у карыстанне, тут быў здзейснены толькі ў 1921 г. У выніку сялянства ўсходніх абласцей Беларусі павялічыла аб'ём землекарыстання да 5,4 млн дзесяцін. Але забеспячэнне сялян зямлёй тут было амаль напалову (на 41 %) менш, чым у сярэднім па краіне. Патрэбна ўлічваць, што ў Беларусі пад балотамі знаходзілася 16 % усёй зямлі, пад лясамі – 25 %.

Перанаселенасць беларускай вёскі і хранічнае малазямелле сялян патрабавалі пошукаў больш інтэнсіўнага выкарыстання зямельных угоддзяў. Беларускі ўрад ставіў задачу пашырэння апрацоўваемай зямельнай плошчы шляхам ліквідацыі няўдобіц, меліярацыі, пераразмеркавання ўчасткаў. Аднак важна адзначыць, што тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі ўсё больш замаруджваліся, а агульная таварнасць яе была нізкая. Дробная гаспадарка мела тэндэнцыю да падзення таварнасці.

У пачатку нэпа савецкая ўлада падтрымлівала гаспадарчыя памкненні сялян, заахвочвала пошук форм калектыўнага гаспадарання на зямлі, прадастаўляла права на зямлю як калектыўным, так і аднаасобным гаспадаркам. Абвешчаная ў Зямельным кодэксе БССР свабода выбару форм землекарыстання захоўвалася ў Беларусі аж да 1927 г. І трэба адзначыць, што да таго часу ў Беларусі свабодна развіваліся гаспадаркі як калектыўнага землекарыстання (у формах вытворчай кааперацыі – сельгасарцелей, камун, таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі; у разнастайных прасцейшых формах кааперацыі – крэдытных, забеспячэнскіх, збытавых; у спецыялізаваных відах кааператыўных аб'яднанняў – машынных і конна-машынных, масларобных і сыраварных, жывёлагадоўчых і насенняводчых і г.д.), так і аднаасобнага землекарыстання (двары, хутары і адрубы).

Народным камісарыятам земляробства, які ўзначальваў з 1921 г. да 1929 г. Дз. Ф. Прышчэпаў, быў складзены "Пяцігадовы перспектыўны план развіцця лясной і сельскай гаспадарак БССР на 1925–1929 гады". План прадугледжваў стварэнне хутароў і дробных пасёлкаў тыпу адрубоў. У адпаведнасці з гэтым

планам было пераселена на хутары і ў дробныя пасёлкі 130 тыс. сялянскіх гаспадарак. У выніку да канца 20-х гадоў хутарская сістэма на Беларусі складала больш за 25 % сялянскага землекарыстання.

З першых гадоў савецкай улады ствараліся і вытворчыя кааператывы, калектыўныя гаспадаркі. Да пачатку 1927 г. у Беларусі налічвалася каля 400 сельскагаспадарчых арцелей, камун і таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі, а таксама 213 саўгасаў. Аднак ва ўмовах Беларусі, пры адсутнасці вялікіх масіваў ворнай зямлі, прыдатнай да апрацоўкі складанай тэхнікай, нізкім узроўні механізацыі, недахопе агранамічных кадраў, стварэнне буйных калгасаў было нерэнтабельным і нязначным.

Калгасы разглядаліся ў асноўным як форма арганізацыі бяднейшых пластоў насельніцтва. Ствараліся яны, як правіла, на землях дзяржаўнага фонду. Да кастрычніка 1928 г. у БССР было арганізавана 994 калгасы, у тым ліку 243 нацыянальныя (227 яўрэйскіх, 12 польскіх, 2 латышскія, цыганскі і нават кітайскі – 2 апошніх у Віцебскай вобласці). На 1 калгас у сярэднім прыходзілася 40–75 дзесяцін зямлі, па 3–5 коней, 3–4 плугі, 4 бараны; на 100 га мелася па 20 галоў буйной рагатай жывёлы; сярэдняя ўраджайнасць зерневых з 1 га складала 8 ц.

Нягледзячы на актыўную падтрымку дзяржавай калгаснай формы гаспадарання (вызваленне ад арэнднай платы за зямельныя ўгоддзі, прадастаўленне розных падатковых ільгот, забеспячэнне інвентаром, рабочай і прадукцыйнай жывёлай), асноўная маса сялянства – серадзнякі – аддавалі перавагу прасцейшым формам кааперацыі, а не калгасам.

Развіццё сельскагаспадарчай кааперацыі ішло галоўным чынам у дзвюх формах: крэдытнай і забеспячэнска-збытавой. Разнастайнымі формамі сельскагаспадарчай кааперацыі ў Беларусі ўжо да пачатку 1926 г. было аб'яднана 20,9 % сялянскіх гаспадарак. Дзякуючы кааперацыі валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі Беларусі да пачатку 1927 г. перавысіла даваенны ўзровень больш чым на 12 %.

У 20-я гады, як бачна, быў сапраўды значны ўздым сялянскай гаспадаркі, які сведчыць аб дабратворных выніках нэпа, эфектыўнасці развіцця розных форм кааперацыі. Менавіта кааператыўны рух дапамог пераадолець голад і разбурэнне пасля грамадзянскай вайны, садзейнічаў аздараўленню фінансавай і эканамічнай сістэмы.

Абапіраючыся на калектывісцкую традыцыю ўсходнеславянскай вёскі (сельская абшчына, талака і г.д.), зыходзячы з навуковых абгрунтаванняў неабходнасці кааперавання сельскагаспадарчай вытворчасці і практычнага вопыту першых гадоў калектыўнага гаспадарання, Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава распрацавалі палітыку калектывізацыі сельскай гаспадаркі. XV з'езд ВКП(б) у снежні 1927 г. прыняў курс на правядзенне ў жыццё гэтай палітыкі.

***Калектывізацыя сельскай гаспадаркі*** – палітыка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, якая была накіравана на аб'яднанне дробных сялянскіх

гаспадарак у буйныя сельскагаспадарчыя прыдпрыемствы, выкарыстанне на вёсцы дасягненняў навукі і тэхнікі, павышэнне прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці аграрнага сектара эканомікі, забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасці – сельскагаспадарчай сыравінай.

Першым пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі СССР прадугледжвалася да 1933 г. ахапіць усімі формамі кааперацыі каля 85 % сялянскіх гаспадарак, і толькі 18–20 % з іх меркавалася арганізаваць у калгасы. Гэта быў напружаны, але разам з тым рэальны, збалансаваны план.

Аднак да таго часу пачаў фарміравацца, а затым атрымаў імклівае развіццё другі варыянт стратэгіі сацыялістычнага будаўніцтва. І. Сталін і яго акружэнне ленінскі прынцып гарманічнага развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі замянілі патрабаваннем хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі на аснове перакачкі сродкаў для яе развіцця з сельскай гаспадаркі. Быў узяты курс на паскораную калектывізацыю ў яе вышэйшых формах. Гэтым імкнуліся вырашыць адразу дзве задачы: у кароткія тэрміны правесці калектывізацыю вёскі і ўзяць у яе сродкі для патрэб індустрыялізацыі і абароны краіны.

Пачатак рэалізацыі такога курсу паклаў хлебанарыхтоўчы крызіс, які ўзнік у краіне зімой 1927–1928 гг. У сувязі з недаборам збожжавых, скарачэннем дзяржаўных нарыхтовак хлеба стварылася пагроза невыканання планаў індустрыяльнага будаўніцтва, бо пастаўкі прамысловага абсталявання ў краіну залежалі ад экспарту хлеба. Акрамя таго, у гарадах пачаліся перабоі ў забеспячэнні прадуктамі, давялося ўвесці картачную сістэму. Узмацнілася сацыяльная напружанасць у грамадстве.

Закрываліся рынкі, уводзілася абкладанне сялянскіх гаспадарак дадатковымі падаткамі, скарачалася крэдытаванне і забеспячэнне заможных гаспадарак, праводзіліся арышты ў адміністрацыйным парадку і прыцягненне да суда за захаванне лішкаў збожжа. У выніку ў краіне пачалося скарачэнне пасяўных плошчаў, памяншэнне памераў гаспадарак.

Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва краіны мела разыходжанні ў пытаннях выхаду з крызісу і перспектыву сацыялістычнага будаўніцтва. І. Сталін разлічваў на злом супраціўлення сялянства шляхам самага бязлітаснага знішчэння яго заможнай часткі – кулацтва. М. Бухарын, А. Рыкаў, М. Томскі бачылі выхад з крызісу ў адмове ад надзвычайных мер, павышэнні закупачных цэн на хлеб, развіцці гандлёва-крэдытных форм кааперацыі. Бухарынская альтэрнатыва была накіравана на захаванне і ўдасканаленне эканамічнага механізма, які склаўся ў гады нэпа. У лістападзе 1929 г. М. Бухарын і яго аднадумцы былі адхілены ад палітычнага кіраўніцтва, іх погляды кваліфікаваліся як праява “правага ўхілу” у партыі, як уступка кулацтву.

У Беларусі ў падтрыманні палітыкі “правага ўхілу” быў абвінавачаны нарком земляробства Дз. Прышчэпаў, старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў і інш.

Барацьба з “правым ухілам” суправаджалася фарсіраванем калектывізацыі. 7 лістапада 1929 г. у газеце “Правда” з’явіўся артыкул Сталіна “Год вялікага пералому”. У артыкуле сцвярджалася, што ў калгасы быццам ужо пайшлі

асноўныя, серадняцкія масы насельніцтва, што ў сацыялістычнай перабудове гаспадаркі ўжо атрымана "рашаючая перамога", хаця на самой справе ў калгасах тады налічвалася 6–7 % сялянскіх гаспадарак.

Перамагла палітычная лінія на суцэльную калектывізацыю.

**Ажыццяўленне палітыкі калектывізацыі: здабыткі і пралікі.** У канцы 20 – пачатку 30-х гадоў перабудова вёскі згубіла сувязь з паступовым кааператаваннем на аснове добраахвотнага аб'яднання гаспадарак і ператварылася ў прымусовую калектывізацыю. Пачалася гонка за "тэмпамі". Масавая калектывізацыя выклікала супраціўленне кулацтва. У гэтых умовах партыя перайшла ад палітыкі абмежавання і выцяснення кулацтва да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа на аснове суцэльнай калектывізацыі.

5 студзеня 1930 г. ЦК ВКП(б) прыняў пастанову "Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву", у якой тэрміны завяршэння калектывізацыі былі рэзка скарочаны, умацавана новая палітыка ў адносінах да кулака. На Беларусі меркавалася завяршыць калектывізацыю да 1933 г. Аднак першы сакратар ЦК КП(б)Б К. Гей патрабаваў завяршыць суцэльную калектывізацыю сельскай гаспадаркі рэспублікі да 1931 г. У хуткім часе і гэтыя тэрміны былі перагледжаны: у лютым 1930 г. прынята рашэнне абагуліць 70–80 % сялянскіх гаспадарак, г. зн. завяршыць поўную калектывізацыю за паўгода.

Разгарнулася кампанія па суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа, якая праходзіла ў абставінах нястрымнага фарсіравання тэмпаў і грубага адміністрацыйнага націску, адшукання і выкрыцця "ворагаў", прымусу і раскулачвання серадняка, закрыцця цэркваў, рынкаў. Для паскарэння тэмпаў арганізацыі калгасаў у вёску былі накіраваны ўпаўнаважаныя камуністы і рабочыя-дваццаціпяцітысячнікі, у тым ліку прысланыя з прамысловых цэнтраў РСФСР. Частка з іх, не ведаючы вёскі і патрэб сялян, чыніла самавольствы.

Растлумачальная і арганізацыйная работа ў масах падмянялася націскам, пагрозамі, дэмагагічнымі абяцаннямі. Нярэдка сялян прымусова запісвалі ў калгасы. У арцелях дабіваліся максімальнага абагулення маёмасці, уключаючы адзіную карову, дробную жывёлу, птушку. Таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі ў адміністрацыйным парадку пераводзіліся на статуты арцелей і камун.

Раскулачваць пачалі не толькі кулакоў, але і сераднякоў, якія не хацелі ўступаць у калгасы. Усё нажытае селянінам, уключаючы жыллёвыя пабудовы, пры раскулачванні пераходзіла ва ўласнасць калгасаў.

Прымусовыя меры давалі свае вынікі. Калі ў студзені 1930 г. у калгасы ўступіла 20,9 % сялянскіх двароў, то да сакавіка таго ж года – 58 %. Галоўным вынікам насілля пры стварэнні калгасаў стала масавая незадаволенасць палітыкай партыі, адкрыты пратэст сялян, аж да ўзброеных выступленняў. Толькі ў Беларусі, паводле няпоўных даных, у 1930 г. адбылося больш за 500 сялянскіх выступленняў. У краіне склалася надзвычай вострая палітычная сітуацыя.

Рэзкае абвастрэнне барацьбы ў вёсцы прымусіла кіраўніцтва краіны і рэспублікі прыняць меры па выпраўленні становішча, адступіць ад грубых метадаў абагулення сялянскіх гаспадарак. У сакавіку 1930 г. ЦК ВКП(б) прыняў спецыяльную пастанову "Аб барацьбе са скрыўленнямі партыйнай лініі ў калгасным руху". Перагібы і скажэнні былі асуджаны.

Адступленне ў сакавіку 1930 г. было выммушаным ходам, які аслабіў напружанасць у вёсцы і даў магчымасць весці калгаснае будаўніцтва толькі на добраахвотнай аснове, засяродзіць увагу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў. Аднак увосень пачалася новая хваля калектывізацыі.

Нягледзячы на відавочнасць дапушчаных пралікаў і памылак, XIII з'езд Кампартыі Беларусі (30 мая – 12 чэрвеня 1930 г.) прызнаў палітычную і арганізацыйна-практычную работу ЦК КП(б)Б правільнай і даў установку на аднаўленне і фарсіраванае развіццё калгасаў. У верасні 1931 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне аб завяршэнні да вясны 1932 г. суцэльнай калектывізацыі ў рэспубліцы.

Ізноў аднавіліся "штурм", пагоня за "тэмпамі", прымусовае абагуленне, ганебная практыка раскулачвання.

Метады, якімі ажыццяўлялася калектывізацыя вёскі, абагуленне сялянскіх гаспадарак, прывялі да таго, што вясной 1932 г. замест суцэльнай калектывізацыі адбыўся чарговы масавы выхад сялян з калгасаў. Толькі за 2 – 3 месяцы распаліся 1002 калгасы, з якіх выйшла больш за 55 тыс. сялянскіх гаспадарак.

У канцы першай пяцігодкі ў рэспубліцы налічвалася прыкладна 9 тыс. калгасаў, якія аб'ядноўвалі 43 % сялянскіх гаспадарак. Па краіне была ў асноўным завершана калектывізацыя: 200 тыс. калгасаў ахапілі 60 % сялянскіх гаспадарак.

Фарсіраваная, прымусовая калектывізацыя, раскулачванне часткі сялянства адмоўна адбіліся на вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1932 г. агульны аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў рэспубліцы знізіўся ў параўнанні з 1928 г. на 26 %, а вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі ў цэлым па краіне ўпала да 65 % ад узроўню 1913 г. Разам з тым у краіне рэзка ўзраслі дзяржаўныя нарыхтоўкі прадукцыі.

У выніку дапушчаных памылак у эканамічнай палітыцы ў 1932–1933 гг. краіну ахапіў масавы голад, які забраў жыцці многіх людзей.

Знаходзячыся ў безвыходным становішчы, людзі, асабліва жанчыны, спрабавалі зразаць на калгасных палетках каласкі, вынесці зерне ў кішэнях, за пазухай. Аднак 7 жніўня 1932 г. быў выдадзены Закон аб ахове сацыялістычнай уласнасці ("закон аб пяці каласках", як называлі яго ў народзе), паводле якога за такія крадзяжы ўводзілася вышэйшая мера пакарання – расстрэл. Пры змякчаючых абставінах ён замяняўся пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй за дзесяць гадоў з канфіскацыяй усёй маёмасці.

Да канца 30-х гадоў калектывізацыя ў Беларусі была звершана, кулацтва як клас ліквідавана. У 1937 г. калгасы аб'ядноўвалі 680 тыс. сялянскіх двароў, ці

87,5 % іх агульнай колькасці. Абагуленыя палеткі склалі 96 % усёй пасяўной плошчы рэспублікі. Пасля завяршэння калектывізацыі і прыняцця Канстытуцыі СССР 1936 г. былым кулакам ствараліся магчымасці стаць раўнапраўнымі працаўнікамі грамадства, давалася права ўдзельнічаць у грамадскім і палітычным жыцці краіны.

У другой палове 30-х гадоў кіраўніцтва краіны прымала захады лдя ўмацавання калгасаў у арганізацыйна-гаспадарчых адносінах.

Наладжвалася кіраванне калгасна-саўгаснай вытворчасцю, умацоўвалася дысцыпліна працы, фарміраваліся брыгады і звенні. Амаль у кожным калгасе былі створаны жывёлагадоўчыя фермы.

Буйная калгасна-саўгасная вытворчасць давала магчымасці выкарыстання трактароў, камбайнаў, іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Калі ў 1930 гг. на Беларусі дзейнічала адна (Койданаўская) МТС, то ў 1937 г. – 200. Агульная колькасць трактароў дасягнула 8,2 тыс. штук.

Да канца 30-х гадоў адбылося некаторае ажыўленне сельскагаспадарчай вытворчасці. Аб’ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі узрос у параўнанні з 1913 г. на 1,7 %. Павялічыліся ўраджаі. Аднавілася пагалоўе жывёлы, якое за гады першай пяцігодкі скарацілася больш чым удвая.

Аднак далейшае ўмацаванне калгасаў суправаджалася адступленнямі ад законнасці, парушэннямі калгаснай дэмакратыі. З 1933 г. палітаддзелы пры МТС “выкрылі” і выключылі з калгасаў 2700 “кулякоў-шкоднікаў”. У жніўні – верасні 1934 г. пачалося наступленне на аднаасобнікаў. Для іх у параўнанні з калгасамі былі значна павялічаны нормы абавязковых паставак прадукцыі і ўведзены аднаразовы падатак. У 1938–1939 гг. праведзена ліквідацыя хутароў. Ліквідацыя хутароў працягвалася і пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР, да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

У ходзе суцэльнай калектывізацыі былі распушчаны зямельныя таварыствы, сялянскія кааператыўныя аб’яднанні.

Складвалася сістэма дырэктыўнага планавання і адміністрацыйна-бюракратычнага кіравання калгасамі з боку партыйна-дзяржаўнага апарату. Нормай стала частая змена кіраўнікоў гаспадарак.

Пачынаючы з 1933 г. калгасы выконвалі абавязковыя пастаўкі дзяржаве прадукцыі па цэнах, якія былі ў шмат разоў ніжэйшыя за рыначныя.

Бюракратычна-камандная сістэма кіравання калгасамі, якая склалася ў 20–30-я гады, нягледзячы на істотныя змены 50–80-х гадоў, у многім захавалася да нашых дзён. Разам з тым наўрад ці правільна на аснове пралікаў і памылак, дапушчаных пры калектывізацыі ў 20–30-я гады, адмаўляць неабходнасць сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі, рабіць выснову аб неэфектыўнасці калгаснага ладу ўвогуле.

Стварэнне эфектыўнага аграрнага сектара эканомікі немагчыма без дапамогі і падтрымкі дзяржавы. Гістарычны вопыт паказвае, што нізкая эканамічная эфектыўнасць калгасна-саўгаснай вытворчасці ў СССР і БССР у 20–30-я гады паміж іншым была звязана з недастатковымі фінансавымі і

матэрыяльнымі рэсурсамі краіны, немагчымасцю аказаць дзейсную дзяржаўную дапамогу аграрнаму сектару эканомікі. Большая частка фінансавых сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў, лепшыя кадры спецыялістаў дзяржава накіроўвала ў той час для правядзення індустрыялізацыі краіны і ўмацавання абараназдольнасці ў сувязі з ваеннай пагрозай фашызму. Сельская гаспадарка фінансавалася па рэшткавым прынцыпе. Іншая справа – 70–80-я гады, калі дзяржава атрымала магчымасць фінансаваць аграрны сектар эканомікі на ўзроўні сучасных патрабаванняў. Сельская гаспадарка Беларусі ў гэтыя гады па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва стала ў шэраг з сельскай гаспадаркай развітых дзяржаў свету. Гэта яшчэ адзін аргумент на карысць калектыўных форм гаспадарання, буйных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў – калгасаў і саўгасаў.

## ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

### § 1. Асноўныя рысы беларускага савецкага грамадства

У міжваенны перыяд (20–30-я гады) грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі, як і ў Савецкай краіне ў цэлым, было поўным супярэчнасцей, цесна звязаным з сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, што адбываліся ў гэтыя гады. У сваю чаргу грамадска-палітычнае жыццё ў значнай ступені вызначала стан усяго грамадства, бо ва ўмовах пабудовы сацыялізму перавага аддавалася ідэалагічным, палітычным падыходам да кіраўніцтва як эканамічным, так і сацыяльным бокам жыцця.

Існаванне розных форм уласнасці ў народнай гаспадарцы патрабавала адпаведнай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця. Гэта праявілася ў пашырэнні ролі Саветаў як органаў улады, іх дэмакратызацыі. Узніклі местачковыя саветы. Былі прыняты новыя палажэнні аб з’ездах мясцовых Саветаў і выканкомаў гэтых Саветаў. Пашыраліся правы мясцовых органаў улады ў пытаннях фарміравання і размеркавання мясцовага бюджэту, развіцця гаспадаркі і культуры, умацавання правапарадку і законнасці. У красавіку 1927 г. была прынята Канстытуцыя БССР. На яе падставе ў снежні гэтага ж года Прэзідыум ЦВК і СНК БССР пастановай “Аб рэарганізацыі і скарачэнні савецкага апарату і аб пашырэнні правоў мясцовай улады” перадалі некаторыя паўнамоцтвы цэнтральнага апарату аддзелам і інспекцыям акруговых выканаўчых камітэтаў. У сваю чаргу, ад акруговых выканкамаў асобныя функцыі кіравання перайшлі ў кампетэнцыю сельскіх, местачковых, раённых і гарадскіх Саветаў. У 1927 г. у Беларусі было 8 акруговых, 101 раённы, 1470 сельскіх, 52 местачковыя і 29 гарадскіх Саветаў, у тым ліку 48 нацыянальных Саветаў. Дэпутатамі мясцовых Саветаў БССР былі больш за 30 тыс. чалавек. Кампартыя бальшавікоў Беларусі (КП(б)Б) хоць і аказвала значны ўплыў на дзейнасць Саветаў, але не мела яшчэ пераважнай большасці ў іх складзе, асабліва ў вёсцы.

У беларускім грамадстве ў першай палове 20-х гадоў магчыма вызначыць існаванне і барацьбу двух тэндэнцый. Адна з іх была накіравана на пэўную дэмакратызацыю ў палітычных адносінах, што адпавядала мэтам і ўмовам нэпа, другая – на працяг палітыкі ваеннага камунізму, падтрыманне тэндэнцыі да манапалізацыі ўсяго палітычнага жыцця КП(б)Б, непрымірымых адносін партыі камуністаў да іншых палітычных партый, сілавых метадаў вырашэння супярэчнасцей.

Уплывовай палітычнай партыяй, якая выступала ў абарону інтарэсаў сялянства, з'ўлялася беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў або БПС-Р). Адмовіўшыся падпісаць "Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь", якая не адпавядала яе палітычным поглядам, БПС-Р аб'явіла сябе палітычнай апазіцыяй. Адрозненне пазіцыі беларускіх эсэраў ад пазіцыі КП(б)Б заключалася ў пытаннях, звязаных з характарам улады, суверэнітэтам БССР і пашырэннем тэрыторыі рэспублікі да этнаграфічных межаў. БПС-Р лічыла недапушчальнай дыктатуру рабочага класа на Беларусі і патрабавала ўсталяваць "дыктатуру працоўнага народа".

З гэтага моманту пачалося адкрытае процістаянне дзвюх палітычных партый, якое скончылася не на карысць БПС-Р. У 1921 г. карныя органы арыштавалі 860 актыўных яе членаў. Усе яны былі інтэрніраваны – перапраўлены ў Заходнюю Беларусь, якая знаходзілася пад уладай Польшчы.

На пачатку 20-х гадоў на Беларусі дзейнічалі арганізацыі моладзі "Труд і свет" (папярэдніка камсамола), Яўкамол (яўрэйскі камсамол), "Юнацкі сіндыкалізм", "Саюз сялянскай моладзі" і інш. У верасні 1920 г. адбыўся першы Усебеларускі з'езд камсамола Беларусі. Ён супрацьстаўляў сябе іншым маладзёжным арганізацыям, імкнуўся да манапольнага ўплыву на моладзь.

У канцы 1922 г. паскорыўся працэс аб'яднання савецкіх рэспублік, у якім актыўны ўдзел брала БССР. IV Усебеларускі з'езд Саветаў у снежні 1922 г. адобрыў ідэю стварэння Саюза ССР., абраў паўнамоцную дэлегацыю для паездкі ў Маскву.

На I Усесаюзным з'ездзе Саветаў 30 снежня 1922 г. 25 прадстаўнікоў БССР разам з дэлегацыямі РСФСР, УССР і ЗСФСР падпісалі дэкларацыю і дагавор аб стварэнні СССР. За кожнай рэспублікай захоўваліся права свабоднага выхаду, роўныя правы і ўмовы развіцця, самастойнасць у ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі. У склад ЦВК СССР былі абраны і прадстаўнікі Беларусі. А Р. Чарвякоў стаў адным з чатырох старшынь ЦВК СССР.

Стварэнне СССР дало магчымасць аб'яднаць намаганні гістарычна звязаных паміж сабой народаў, спрыяць іх хуткаму эканамічнаму, сацыяльнаму і культурнаму развіццю. Аднак з канца 20-х гадоў у СССР перавага стала ўсё больш надавацца цэнтралізму, скараціліся правы і магчымасці рэспублік. Пэўным крокам у накірунку да дэмакратызацыі з'явілася амністыя ў сувязі з трэцяй гадавінай вызвалення Мінска ад польскіх інтэрвентаў. 11 ліпеня 1923 г. яна была абвешчана ўсім членам беларускіх нацыянальных арганізацый, палітычным і культурным дзеячам, удзельнікам антысавецкіх беларускіх

фарміраванняў, членам партыі беларускіх эсэраў, беларускім сялянам і выхадцам з працоўнага асяроддзя, якія ў свой час далучыліся да контррэвалюцыйных арганізацый, а затым абвясцілі аб лаяльных адносінах да савецкай улады. Амністыя мела значны ўплыў на палітычнае жыццё, спрыяла росту аўтарытэту Кампартыі Беларусі і даверу да яе. У чэрвені 1924 г. у Мінску правяла свой надзвычайны з'езд партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, на якім яна заявіла аб самароспуску і заклікала ўсіх сваіх членаў да спынення ўсякай варожай дзейнасці супраць савецкай улады на Беларусі. Самароспуск БПС-Р, як і іншых нацыянальна-дэмакратычных партый, прывёў фактычна да ліквідацыі на Беларусі арганізаванай палітычнай апазіцыі.

У сярэдзіне 20-х гадоў грамадска-палітычнае жыццё было зведзена да дзейнасці давольна вузкага кола арганізацый. Кампартыя (бальшавікоў) Беларусі імкнулася ўсталяваць і ўмацаваць свой поўны і бясспрэчны кантроль як над складам іх кіруючых органаў, так і над усёй практычнай дзейнасцю гэтых арганізацый. КП(б)Б стаалася ўцягнуць як мага больш насельніцтва ў дзеючыя пад яе кантролем арганізацыі. У камсамоле ў 1925 г. было ўжо 37,7 тыс. чалавек, у складзе прафсаюзаў у 1926 г. – 149 тыс., у 1928 г. – 388 тыс., на пачатку 1937 г. – больш за 510 тыс. чалавек.

З другой паловы 20-х гадоў узмацнілася дырэктыўная сістэма кіравання не толькі эканомікай, але і іншымі сферамі грамадскага жыцця, узрасла роля партыйна-дзяржаўнага апарату. Гэта адмоўна адбілася перш за ўсё на вытворчай дэмакратыі. Пытанні арганізацыі вотворчасці, якія раней ставіліся на сходах рабочых або вытворчых нарадах, цяпер станавіліся справай вузкага кола асоб.

Разам з пераходам да дырэктыўнай эканомікі, згортваннем, а затым і адмовай ад нэпа, наступам сацыялізму па ўсяму фронту разгарнуўся працэс пераўтварэння палітычнага рэжыму дэмакратычнага цэнтралізму, які пераважаў у пачатку 20-х гадоў (але, заўважым, ужо і тады з ухілам да цэнтралізму), у рэжым аўтарытарнага цэнтралізму. У пачатку 30-х гадоў у беларускім савецкім грамадстве былі ўсе рысы таталітарнага палітычнага рэжыму.

Пераход да таталітарызму праяўляўся ў далейшым паніжэнні ролі і ўдзелу ў справах грамадства дэмакратычных, прадстаўнічых органаў, поўным іх падпарадкаванні партыйнаму апарату. Дзяржава дыктатуры пралетарыяту пераўтваралася ў дзяржаву дыктатуры адной партыі, а дакладней – дыктатуры партыйнага кіраўніцтва і партапарату ВКП(б).

Вышэйшым органам заканадаўчай улады ў БССР, у адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1937 г., стаў Вярхоўны Савет БССР (раней – Усебеларускі з'езд Саветаў). Вышэйшым органам выканаўчай улады з'яўляўся Савет народных камісараў БССР, а ў абласцях, гарадах, раёнах і сельсаветах – выканаўчыя камітэты адпаведных Саветаў. Была пабудавана вертыкаль судовай улады, пачынаючы ад Вярхоўных судоў СССР і БССР і да гарадскіх і раённых судоў уключна. Разам з тым пры Народных камісарыятах унутраных спраў СССР і БССР, створаных у 1934 г. на базе адпаведных АДПУ (Асобнае

Дзяржаўнае Палітычнае Упрўленне) дзейнічалі пазасудовыя органы – Асобныя нарады. Існавала яшчэ адна пазасудовая ўстанова – “тройкі”, якія мелі права выносіць судовыя рашэнні аж да пакарання смерцю.

У 1932 – 1933 гг. у СССР і БССР быў устаноўлены пашпартны рэжым. Пашпарты ўводзіліся для жыхароў гарадоў, рабочых пасёлкаў, раённых цэнтраў, новабудоўляў, саўгасаў, МТС, прыгранічных зон, абаронных аб’ектаў і інш. Сельскае насельніцтва (калгаснікі) пашпартаў не атрымлівалі і ўлічваліся па спісах, якія вялі сельсаветы. Калгаснікі маглі прымацца на работу на прадпрыемствы ў гарадах толькі пры наяўнасці ў іх праўкі ад праўлення калгаса аб яго згодзе на адыход калгасніка. Па сутнасці, правы калгаснікаў былі абмежаваны. Яны прымацоўваліся да калгаса, які вызначаў іх лёс, іх будучае.

Рэальная палітычная ўлада канцэнтравалася ў партыйных органах. Саветы ў 30-я гг. ХХ ст. толькі фармальна лічыліся палітычнай асновай грамадства. Іх дзейнасць абмяжоўвалася ў асноўным рашэннем гаспадарчых і культурна-асветных задач. Узмацнялася цэнтралізацыя ў кіраўніцтве краінай і яе эканомікай, фарміраваўся магутны рэпрэсіўны апарат. Насаджаліся адміністрацыйна-дырэктыўныя метады ўпраўлення, што абмяжоўвала ініцыятыву і прадпрымальнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўзмацняла бюракратызм дзяржаўных структур. Павышалася роля партыйна-дзяржаўнага апарату і затухала актыўнасць грамадскіх арганізацый, якая была характэрнай для іх дзейнасці ў 20-я гг. ХХ ст.

Усталяванне таталітарнага рэжыму, асабістай улады Сталіна праходзіла ва ўмовах жорсткай унутрыпартыйнай барацьбы у ВКП(б), праявы якой мелі месца і ў КП(б) Беларусі. У працэсе гэтай барацьбы сама КП(б)Б пацярпела ад усялякіх “чыстак”, “выкрыванняў”, страціла значную частку сумленных камуністаў, якія спрабавалі супрацьстаяць усталяванню сталінізму. У выніку “чысткі” партыі і абмену партыйных білетаў (1933–1936) колькасць членаў КП(б)Б скарацілася з 42 да 20 тыс. чалавек. У ходзе “чыстак” выключаліся перш-наперш іншадумцы і тыя, хто дапускаў ваганні.

Так у 30-я гады канчаткова сфарміраваліся палітычныя інстытуты беларускага грамадства, характэрнымі рысамі якога з’яўляюцца:

- аднапартыйная сістэма, усеўладдзе партыйна-дзяржаўнай наменклатуры і абмежаванне дэмакратычных пачаткаў у жыцці грамадства;
- дзяржаўнае дырэктыўнае планаванне развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы і культуры, панаванне агульнанароднай (дзяржаўнай) уласнасці на сродкі вытворчасці;
- адсутнасць эксплуататарскіх класаў і капіталістычнай эксплуатацыі чалавека чалавекам;
- моцная сацыяльная палітыка ў інтарэсах большасці народа – права на працу і абавязак працаваць (адсутнасць беспрацоўя), бясплатнасць адукацыі і аховы здароўя, гарантаванасць пенсійнага забеспячэння, таннасць жылля і камунальных паслуг, пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку;

- рост агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню народа і даступнасць дасягненняў культуры і сусветнай цывілізацыі для чалавека працы;
- рашучая і бескампрамісная барацьба са злачыннасцю і негатыўнымі з’явамі ў грамадстве (п’янствам, наркаманіяй, прастытуцыяй, спекуляцыяй і інш.), што нярэдка прыводзіла да грубых парушэнняў сацыялістычнай законнасці;
- панаванне ў свядомасці большай часткі насельніцтва марксісцка-ленінскай ідэалогіі.

Разам з тым для створанага ўпершыню ў СССР і БССР сацыялістычнага грамадства былі характэрны дэфармацыі, якія сведчылі аб парушэнні стваральнікамі новага грамадства прынцыпаў класічнага марксізму. Да ліку дэфармацый можна аднесці забарону прыватнай ініцыятывы і прадпрымальніцкай дзейнасці, абмежаванне дэмакратычных пачаткаў у жыцці грамадства, парушэнне сацыялістычнай законнасці і правоў чалавека, нізкі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту людзей і інш. Аднак, трэба разумець, што дэфармацыі сацыялізму былі абумоўлены не толькі памылкамі партыйнага і савецкага кіраўніцтва. Яны мелі і аб’ектыўную прыроду. Дэфармацыі сацыялізму абумоўліваліся як складанасцю і маштабнасцю ўпершыню вырашаемых задач, так і наяўнасцю варожага СССР капіталістычнага акружэння, яго жаданнем знішчыць першую ў свеце краіну сацыялізму.

Нягледзячы на дэфармацыі сацыялізму, жорсткасць палітычнага рэжыму і рэпрэсіі, грамадская атмасфера 30-х гадоў была прасякнута пафасам стваральнай працы. Мелі месца сапраўдны працоўны гераізм і добрасумленнае служэнне Айчыне. У працоўнае асяроддзе ўкараняліся каштоўнасці чалавечай дабрыні, салідарнасці і справядлівасці. Змяняліся светапогляд і псіхалогія савецкіх людзей. Ідэяй, якая мела векавыя традыцыі і магутную аб’яднальную сілу, стала ідэя патрыятызму. У інтарэсах патрыятычнага выхавання ў школах было адноўлена выкладанне айчыннай гісторыі. У сродках масавай інфармацыі вышэйшай доблесцю савецкіх людзей абвяшчаўся патрыятызм. Прапагандаваліся таксама ідэі моцнай дзяржаўнасці і перавагі грамадскіх інтарэсаў над асабістымі, матывы шчаслівага жыцця і паўнацэннай сям’і.

Савецкі, у тым ліку і беларускі народ, ганарыўся дасягненнямі ў галіне навукі, адукацыі і культуры. Для мільёнаў людзей адкрыліся перспектывы атрымаць адукацыю, у тым ліку і вышэйшую, падняцца з самых “нізоў” да высокіх пасад у дзяржаве, увайсці ў навуковую эліту, раскрыць і рэалізаваць свае творчыя здольнасці.

## § 2. Нацыянальная палітыка. Беларусізацыя

Значнай з’явай у нацыянальных адносінах у 20–30-я гады была палітыка беларусізацыі. Многія здабыткі гэтай палітыкі, яе станоўчы вопыт і трагічны лёс маюць і сёння вялікае значэнне для нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі. Патрэбна адзначыць, што амаль да сярэдзіны 80-х гадоў афіцыйная

гістарычная літаратура амаль нічога не гаварыла аб гэтай з’яве ў нацыянальным развіцці беларускага народа альбо трактавала адмоўна тэндэнцыі нацыянальнага адраджэння на Беларусі ў 20-я гады.

Разглядаючы перадумовы палітыкі беларусізацыі, неабходна мець на ўвазе асаблівасці нацыянальных адносін на Беларусі на пачатку 20-х гадоў і праблемы, якія існавалі ў гэтым пытанні.

***Па-першае***, ішоў працэс тэрытарыяльнага самавызначэння беларускага народа, беларускай нацыі. У 1920–1923 гг. тэрыторыя БССР уключала толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі (з 1924 г. – Чэрвеньскі), Мазырскі, Мінскі, Слуцкі (усяго 52 402 км$^2$, каля 1,5 млн чалавек насельніцтва). Ужо ў верасні – лістападзе 1921 г. кіруючыя органы Беларусі ўзнімалі пытанне аб вяртанні БССР паветаў, у якіх большасць насельніцтва складалі беларусы.

3 сакавіка 1924 г. было заключана пагадненне паміж ЦВК РСФСР і ЦВК БССР аб перадачы (а лепш гаварыць – аб вяртанні) БССР 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў. У снежні 1926 г. Беларускай ССР былі вернуты яшчэ 2 паветы: Гомельскі і Рэчыцкі. У выніку тэрыторыя БССР склала 152 854 км$^2$, а колькасць насельніцтва – 5 млн чалавек.

***Па-другое***, важна ўявіць асаблівасці нацыянальнага складу тагачаснага насельніцтва Беларусі. Паводле перапісу 1926 г., беларусы складалі 80,6 %, яўрэі – 8,2, рускія – 7,7, палякі – 2, украінцы – 0,7, латышы – 0,3, літоўцы, немцы і татары – па 0,1 %. Такім чынам, можна гаварыць аб нацыянальна-беларускім характары асноўнай масы насельніцтва Беларусі з улікам наяўнасці шматнацыянальнай меншасці, якая складала амаль пятую частку насельніцтва.

Трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што беларусы ў асноўнай масе жылі ў вёсцы. Гарады былі населены значнай часткай рускіх, яўрэяў, якія складалі ў некаторых гарадах і мястэчках да 40–60 % жыхароў. Іншыя нацыянальныя меншасці жылі як у гарадах, так і ў вёсках даволі кампактнымі этнічнымі групамі. Такое рассяленне стварала пэўнае размежаванне паміж рускамоўным горадам і беларускамоўнай вёскай, што ўносіла спецыфіку ў моўную сітуацыю і патрабавала ўлічваць гэта ў нацыянальнай палітыцы.

***Па-трэцяе***, палітыка беларускага адраджэння ва ўмовах савецкай улады пачала ажыццяўляцца раней афіцыйна абвешчанай беларусізацыі перш за ўсё намаганнямі дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнага руху. У снежні 1920 г. загадчык беларускага аддзела Наркамата асветы П. Ільючонак звярнуўся да кіраўніцтва Кампартыі Беларусі з запіскай, у якой абгрунтаваў неабходнасць пераводу навучання ў школах на беларускую мову, а таксама арганізацыі школ для нацыянальных меншасцей. Гэта ініцыятыва была падтрымана.

У пачатку 1921 г. у Камісарыяце земляробства, які ўзначальваў У. Ігнатоўскі, для супрацоўнікаў былі арганізаваны курсы па вывучэнні беларускай мовы і ўсё справаводства пераведзена на беларускую мову. Па ініцыятыве А. Бурбіса ажыццяўлялася беларусізацыя ў Наркамаце замежных спраў.

Такім чынам, намаганнямі вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння закладваліся асновы нацыянальнай палітыкі, якая пазней была аформлена як дзяржаўная палітыка беларусізацыі.

Варта зазначыць, што на пачатку 20-х гадоў савецкія органы і Кампартыя рэспублікі як кіруючая сіла палітычнай сістэмы даволі рэалістычна вызначалі праблемы нацыянальнага адраджэння беларускай нацыі. У распрацоўцы палітычнай лініі па гэтым пытанні прыкметнае месца належыць VII з'езду КП(б) Беларусі (красавік 1923 г.), на якім з дакладам "Нацыянальныя моманты ў дзяржаўным і партыйным будаўніцтве" выступіў старшыня ЦВК і СНК БССР А. Чарвякоў. У чэрвені 1923 г. прынята пастанова Пленума ЦБ КП(б) Беларусі, у якой даволі дакладна быў намечаны комплекс практычных мерапрыемстваў па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі: гаспадарчае адраджэнне краю, тэрытарыяльнае самавызначэнне беларускага народа, развіццё беларускай мовы і пашырэнне сферы яе ўжывання, развіццё нацыянальнай культуры і павышэнне культурнага ўзроўню насельніцтва, вылучэнне і выхаванне кадраў партыйнага, дзяржаўнага і іншага апарату з карэннага насельніцтва, прыцягненне да актыўнага ўдзелу ў нацыянальным адраджэнні дэмакратычных элементаў.

Аб'ектыўны падыход да гісторыі патрабуе прызнаць, што КП(б) Беларусі на працягу 1923–1925 гг. надавала значную ўвагу нацыянальнай палітыцы. На Пленуме ЦБ КП(б)Б у чэрвені 1924 г. разглядалася пытанне аб праграме правядзення нацыянальнай палітыкі ў Беларусі; у 1925 г. пытанні нацыянальнай палітыкі разглядаліся на пленумах ЦК КП(б)Б у студзені, маі, кастрычніку; у рэзалюцыі апошняга быў вызначаны раздзел "Беларусізацыя". У кастрычніку 1926 г. абмеркавана пытанне "Аб ходзе ажыццяўлення ў рэспубліцы нацыянальнай палітыкі". Аднак сярод кіраўніцтва рэспублікі былі і праціўнікі беларусізацыі, што стварала цяжкасці.

Пачатак палітыкі беларусізацыі варта аднесці да чэрвеня 1924 г., калі сесія ЦВК БССР прыняла пастанову аб утварэнні спецыяльнай камісіі на чале з А. Хацкевічам па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Такія ж камісіі ўтвараліся і пры акруговых выканаўчых камітэтах.

З сярэдзіны 1923 г. і да сярэдзіны 1924 г. працэс беларусізацыі прайшоў першую фазу, на працягу якой вялася ў асноўным яе палітычная і ідэалагічная падрыхтоўка. Была разгорнута тлумачальная работа сярод насельніцтва аб неабходнасці і сэнсе беларусізацыі, распрацаваны погляды на змест гэтай палітыкі, прымаліся дырэктыўныя дакументы, пастановы. Лета 1924 г. і прыкладна да 1928 г. – час актыўнай практычнай рэалізацыі вызначаных напрамкаў дзейнасці ў палітыцы беларусізацыі.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа праведзена ў 1926–1929 гг. пасля таго, як адбылося вяртанне БССР значнай часткі этнічна беларускіх зямель. У складзе БССР губерні, паветы, воласці былі ліквідаваны і замест іх утвораны акругі, раёны і сельсаветы, прычым значна змяняліся межы адміністрацыйных адзінак. У аснову новаўтварэнняў пакладзены нацыянальны

прынцып. З улікам інтарэсаў і патрабаванняў нацыянальных меншасцей (карыстанне роднай мовай, захаванне здабыткаў нацыянальнай культуры, звычаяў і г.д.) у месцах іх кампактнага пражывання ўтвараліся нацыянальныя Саветы. У 1928 г. налічвалася 23 яўрэйскія, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскія і 2 нямецкія Саветы. У 1932 г. быў утвораны нацыянальны (польскі) раён з цэнтрам у Дзяржынску. Палітыка беларусізацыі не азначала прыніжэння ці ўшчамлення правоў і інтарэсаў нацыянальных меншасцей.

Адным з напрамкаў нацыянальнай палітыкі з’яўлялася беларусізацыя дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый, якая мела на мэце вывучэнне супрацоўнікамі беларускай мовы і перавод на яе справаводства. Усім дзяржаўным і грамадскім установам, а таксама прадпрыемствам і кааператыўным аб’яднанням былі ўстаноўлены канкрэтныя тэрміны перавода іх працы на беларускую мову. У 1927 г. беларускай мовай валодалі ў цэнтральных дзяржаўных установах 80 % служачых, у акруговых і раённых установах – каля 70 %. Асноўныя рэспубліканскія дакументы выдаваліся на беларускай мове, а таксама на адной з трох іншых моў: рускай, польскай і яўрэйскай.

У ходзе беларусізацыі вырашалася задача больш актыўнага вылучэння на кіруючыя пасады прадстаўнікоў карэннага (не толькі беларускага) насельніцтва. У выніку за 1926–1927 гг. сярод кіраўнікоў акруговага і раённага ўзроўню ўдзельная вага беларусаў павялічылася з 30,3 да 46 %, гарсаветаў – з 43,8 да 45 %. У складзе сельскіх Саветаў колькасць беларусаў была 90 %.

Палітыка беларусізацыі закранула і войска. У 1923–1925 гг. праводзілася ваенная рэформа. Камплектаванне войск Чырвонай Арміі пачало базіравацца на тэрытарыяльным прынцыпе ў спалучэнні з кадравым. Ваенная рэформа прадугледжвала аднаўленне нацыянальных тэрытарыяльных часцей і злучэнняў.

Для падрыхтоўкі сярэдняга каманднага саставу была ўтворана Аб’яднаная беларуская вайсковая школа імя ЦВК БССР.

Палітыка беларусізацыі закранула і ўнутранае жыццё войска. Усе асноўныя навучальныя дапаможнікі (статуты, падручнікі) былі выданы на беларускай мове.

Тэрытарыяльныя фарміраванні БВА існавалі да 1935–1938 гг., пасля былі скасаваны.

Важным напрамкам беларусізацыі з’яўлялася нацыянальна-культурнае будаўніцтва. Калі ў 1921 г. беларускія школы складалі 1,5 % ад агульнага ліку школ на Беларусі, то ў 1931 г. – 83,5 %. У 1930 г. 76,6 % студэнтаў вышэйшай школы рэспублікі былі беларусамі, выкладанне больш за 80 % вучэбных дысцыплін вялося на беларускай мове.

У Беларускай акадэміі навук працавалі нацыянальныя сектары – яўрэйскі, польскі, латышскі, а таксама Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі, сектар масавай работы і краязнаўства. Сярод навуковых супрацоўнікаў акадэміі ў пачатку 30-х гадоў колькасць беларусаў складала 45 %.

Шмат што было зроблена ў напрамку беларусізацыі ў выдавецкай справе. У 1924 г. заснавана Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Апрача таго, працавалі выдавецтвы тэхнічнай літаратуры, вайсковай літаратуры і інш. У 1931 г. было выдадзена на беларускай мове 1069 назваў кніг. У перыядычным друку выходзіла 13 рэспубліканскіх газет, з іх 6 – на мовах нацыянальных меншасцей, 64 – раённыя і гарадскія газеты, 30 часопісаў.

Значных поспехаў у гады правядзення палітыкі беларусізацыі дасягнулі беларуская літаратура, нацыянальны беларускі тэатр, музыка, жывапіс.

Разглядаючы палітыку беларусізацыі ў 20-я гады, важна адзначыць, што яе ход меў пэўныя супярэчнасці і цяжкасці. З аднаго боку, гэта недаацэнка нацыянальных асаблівасцей Беларусі ў першую чаргу рускімі чыноўнікамі, якіх нямала было ў гаспадарчым і дзяржаўным апараце. Яны разглядалі беларусізацыю як гвалтоўнае насаджэнне беларушчыны, усялякім чынам перашкаджалі яе ажыццяўленню. Такую ж пазіцыю займалі і некаторыя прадстаўнікі іншых нацыянальных меншасцей, асабліва яўрэйства, у асяроддзі якога назіраліся праявы сіянізму.

З другога боку, мелі месца спробы фарсіраваць тэмпы беларусізацыі без уліку аб’ектыўных умоў. Нярэдка ва ўстановах складаліся спісы супрацоўнікаў, якія былі абавязаны ў кароткі тэрмін вывучыць беларускую мову, да таго ж заахвочваліся “сустрэчныя планы”, калі гэтыя тэрміны яшчэ больш скарачаліся. Не заўсёды існавалі ўмовы для вывучэння беларускай мовы – не хапала выкладчыкаў, падручнікаў. Здараліся выпадкі звальнення з пасады за невалоданне беларускай мовай. Усё гэта выклікала незадаволенасць пэўнай часткі насельніцтва, садзейнічала ажыўленню антыбеларускіх настрояў, кампраметавала сутнасць палітыкі беларусізацыі.

Але, нягледзячы на супярэчнасці, цяжкасці і недахопы, палітыка беларусізацыі з’явілася практычнай спробай ва ўмовах савецкай улады ажыццявіць беларускае нацыянальнае адраджэнне. Да яе істотных станоўчых вынікаў у 20-я гады можна аднесці пэўную дэмакратызацыю грамадскага жыцця, калі нацыянальны момант, нацыянальныя пытанні прывялі да аб’яднання даволі разнастайных палітычных сіл. Кампартыя (бальшавікоў) Беларусі рабіла пэўныя крокі да супрацоўніцтва з больш шырокімі нацыянальнымі коламі. Аб прычынах згортвання палітыкі беларусізацыі ў канцы 20 – пачатку 30-х гадоў будзе сказана ў параграфе, прысвечаным палітычным рэпрэсіям.

## § 3. Беларускае замежжа

Неад’емнай састаўной часткай беларускага народа неабходна разглядаць беларусаў, што апынуліся ў выніку палітычнай, ідэалагічнай і ваеннай барацьбы за межамі Беларусі. У ходзе і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. з Беларусі эмігрыравала каля 122 тыс. чалавек (усяго з былой Расійскай імперыі – каля 2 млн чал.). Частка гэтай хвалі эмігрантаў рушыла на Усход –

у Маньчжурыю і ў Кітай, але асноўная маса накіравалася на Захад – у Фінляндыю, Прыбалтыку, Германію, Францыю, Чэхаславакію, ЗША.

Да заканчэння вайны з Польшчай і грамадзянскай вайны на Беларусі ў Еўропе дзейнічалі дыпламатычныя прадстаўніцтвы, місіі і консульствы БНР, у прыватнасці ў Латвіі, Эстоніі, Літве, Фінляндыі, Турцыі, Балгарыі, Германіі і іншых месцах. У Прыбалтыцы знаходзіліся і некаторыя вайсковыя фарміраванні БНР. Пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора яны апынуліся ў эміграцыі. Эмігрыравалі таксама кіраўнікі дзяржаўных устаноў БНР – члены прэзідыума Рады, урада БНР і дзеячы некаторых партыйных цэнтраў. Галоўнай палітычнай сілай эміграцыі з’яўлялася партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Дзейнасць гэтай хвалі эміграцыі была найбольш актыўнай да 1923–1924 гг.

У першыя гады эміграцыі ўстановы БНР і большасць нацыянальных беларускіх партый адмоўна ставіліся да савецкай улады, што ўсталявалася на Беларусі. Не выключалі яны і падрыхтоўку ўзброенага паўстання, якое павінна было, на іх думку, адбыцца як на тэрыторыі БССР, так і ў Заходняй Беларусі з мэтай аб’яднання пад эгідай БНР абедзвюх частак Беларусі. Гэта ідэя вылілася ў палітычны лозунг: “У барацьбе за нацыянальную дзяржаўнасць і свабоду – ні з Масквою, ні з Варшаваю!”, што адлюстроўвала эсэраўскую ідэю аб “трэцім шляху” Беларусі.

З Літвы ўрадам БНР рыхтавалася спроба ўзняць паўстанне ў Заходняй Беларусі і ў БССР. Улетку 1921 г. з гэтай мэтай быў утвораны Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт (ЦБПК). Аднак да паўстання справа не дайшла. ЦБПК арганізаваў партызанскі рух. Супраць яго барацьбу вялі часці асобага прызначэння (ЧАП).

У верасні 1921 г. у Празе ўрад БНР склікаў Беларускую нацыянальна-палітычную карферэнцыю. Яна прыняла заяву аб салідарнасці са Слуцкім паўстаннем, супраць падзелу Беларусі паводле Рыжскага дагавора, пацвердзіла паўнамоцтвы органаў БНР, заклікала аб’яднаць вакол іх усе цэнтры беларускай эміграцыі.

Знаходзячыся на чужбіне, беларуская эміграцыя стварала свае эмігранцкія цэнтры і культурныя арганізацыі. У Латвіі былі створаны беларускае культурна-асветніцкае таварыства “Бацькаўшчына”, беларускі клуб, курсы беларусазнаўства, выдаваўся часопіс “На чужыне” і г.д. З 1934 г. амаль усе арганізацыі беларускіх эмігрантаў у Латвіі былі забаронены.

У Празе, Берліне, Рыме, Бруселі, Варшаве і іншых месцах дзейнічала аб’яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый, выдаваўся свой “Бюллетень”. У ЗША узніклі два цэнтры беларускай эміграцыі – у Нью-Йорку і Чыкага. У Нью-Йорку з 1921 г. дзейнічалі Беларускі нацыянальны камітэт і Камітэт дапамогі рабочым і сялянам Заходняй Беларусі, у Чыкага – Беларуска-амерыканскі нацыянальны саюз і Беларуска-амерыканскі клуб.

Беларускі эмігранцкі рух быў неаднародны, уплыў на яго аказвалі з’явы грамадска-палітычнага жыцця, якія адбываліся ў БССР. Вядомыя грамадскія

дзеячы БССР А. Чарвякоў, У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч і іншыя ў пачатку 20-х гадоў падтрымлівалі сувязі з левымі плынямі беларускай эміграцыі, мелі кантакты з вядучымі яе дзеячамі. Урад БССР зыходзіў з таго, што магчыма аб’яднаць усе дэмакратычныя элементы беларускай палітычнай эміграцыі на падставе адраджэння беларускай нацыі ва ўмовах савецкай улады.

Значнай з’явай у жыцці беларускага замежжа з’явілася II Беларуская нацыянальная нарада, скліканая ўрадам БНР у Берліне ў кастрычніку 1925 г. Яна прыняла рашэнне спыніць барацьбу супраць савецкай улады, прызнаць, што БССР як палітычная рэчаіснасць стала цэнтрам кансалідацыі беларускага народа і адраджэння яго самабытнай культуры. Пасля нарады амаль увесь эмігранцкі ўрад БНР вярнуўся ў БССР. Многія з былых праціўнікаў савецкай улады атрымалі адпаведную іх адукацыі працу, галоўным чынам у галіне культуры, адукацыі, навукі. З іх імёнамі былі звязаны значныя поспехі палітыкі беларусіхацыі.

Пасля 1925 г. палітычная дзейнасць беларускага замежжа прыкметна згортвалася, заставалася ў асноўным культурна-асветная работа. Тлумачылася гэта шматлікімі прычынамі, у тым ліку стабілізацыяй міжнароднага становішча, цяжкім маральным і матэрыяльным становішчам эмігрантаў і інш.

Тыя, хто застаўся ў Празе, утварылі эмігранцкі цэнтр – Раду БНР, якую ўзначальваў П. Крачэўскі, пасля яго смерці, у 1928–1943 гг., – В. Захарка. Да 1970 г. Раду БНР узначальваў М. Абрамчык, да 1982 г. – В. Жук-Грышкевіч. Цяпер на чале Рады – доктар Я. Сажыч, у яе складзе каля 120 чалавек. Урад БНР пасля 1925 г. узначальвае прэзідэнт Рады.

## § 4. Палітычныя рэрпрэсіі: прычыны, памеры, вынікі

Пачатак палітычных рэпрэсій у Беларусі, на наш погляд, звязаны з поспехамі і дасягненнямі палітыкі беларусізацыі. Ужо ў другой палове 20-х гадоў узнікаюць спрэчкі паміж прадстаўнікамі розных падыходаў да нацыянальнай палітыкі. Найбольш актыўных прыхільнікаў палітыкі беларусізацыі сталі абвінавачваць у т. зв. нацыянал-дэмакратызме, тэндэнцыі “ставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй за класавыя”.

З 1930 г. крытыка робіцца больш жорсткай. Нацыянал-дэмакратызм вызначаецца як варожая савецкай ўладзе ідэалогія і практыка контррэвалюцыйнай плыні, якая ставаліла сваёй мэтай “аднаўленне капіталізму на Беларусі”. Рэзалюцыя XIII з’езда КП(б)Б ацэньвала гэтую з’яву як галоўную небяспеку для нацыянальнай палітыкі рэспублікі. Пры гэтым рэзка змяняліся ўсе ацэнкі мінулага: увесь беларускі нацыянальна-вызваленчы рух аднолькава пачаў абвяшчацца рэакцыйным.

У маі – чэрвені 1929 г. камісія ЦК ВКП(б) абследавала практыку нацыянальнай работы ў БССР. Яна адзначыла, што “Асноўныя памылкі партыйнага кіраўніцтва КПБ маюць месца ў вобласці тактыкі і вынікаюць з няправільнай ацэнкі суадносін класавых сіл”. Менавіта на класавую барацьбу рабілі ўпор члены камісіі, яе праявы шукалі і знаходзілі ўсюды – у дзейнасці

навукоўцаў, у галіне мовазнаўства, у выдавецтвах, у палітыцы Наркамасветы па беларусізацыі, Наркамзема – па хутарызацыі і г.д.

З восені 1929 г. негатыўны вобраз нацдэмаўшчыны замацоўваецца ў партыйнай палітыцы, у сродках масавай інфармацыі, грамадскай свядомасці. У 1930 г. барацьба з нацдэмамі стала практычнай дзейнасцю органаў АДПУ БССР. Імі была "выкрыта" (на самой справе сфабрыкавана) "нацдэмаўская, контррэвалюцыйная і антысавецкая арганізацыя", якая атрымала назву "Саюз вызвалення Беларусі" (СВБ). Было арыштавана 108 чалавек. Сярод іх акадэмікі БАН В. Ластоўскі, Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, кіраўнік наркамата земляробства Дз. Прышчэпаў, асветы А.Баліцкі і інш. У 1931 г. яны былі асуджаны на розныя тэрміны зняволення, а ў 1937–1940 гг. многія з іх расстраляны.

Актыўная кампанія выкрыцця "ворагаў народа" мела, акрамя фізічнага знішчэння, яшчэ адзін, не менш жудасны вынік. Атмасфера падазронасці, ідэалагічнага ўціску, маральнага прымусу ламала людзей як асоб, прымушала адракацца ад сваіх поглядаў і прынцыпаў, гаварыць няпраўду, хлусіць, каб захаваць жыццё сваё і сваіх родных.

"Справа СВБ" была пачаткам сістэматычных рэпрэсій у Беларусі. Адначасова з СВБ у 1930 г. былі "раскрыты" і іншыя "контррэвалюцыйныя, шкодніцкія і дыверсійна-шпіёнскія арганізацыі", у прыватнасці беларускі філіял "Працоўнай сялянскай партыі", па гэтай "справе" было асуджана 59 чалавек); беларускі філіял "Прампартыі" – асуджана 30 чалавек; беларускі філіял "Саюзнага бюро РСДРП (меншавікоў)" – асуджана 30 чалавек.

Гэтыя вынікі дзейнасці АДПУ адразу адчуліся – нехапала работнікаў навучальных устаноў, органаў кіравання, устаноў культуры і г.д. Аднак пошук "ворагаў народа" працягваўся. У снежні 1933 г. былі арыштаваны 84 працаўнікі сістэмы Наркамзема БССР і Белтрактарацэнтра. Ім ставілася ў віну імкненне сарваць развіццё цяжкай прамысловасці, падарваць эканамічную магутнасць Савецкай дзяржавы, аслабіць яе ў барацьбе з капіталістычным асяроддзем, а потым звергнуць савецкую ўладу, захапіць кіраўніцтва ў свае рукі.

Акрамя гэтага, "контррэвалюцыйныя арганізацыі" шкоднікаў і нацдэмаў у гэты час былі "выкрыты" ў Белдзяржснабе, Дзяржплане, у Беларускім нацыянальным цэнтры і г.д. У першым квартале 1933 г. у БССР да вышэйшай меры пакарання і да 10 гадоў пазбаўлення волі было асуджана больш за 5,5 тыс. чалавек. Толькі "тройкай" НКУС БССР у 1935 г. было асуджана 8074 чалавекі, а ў 1936 – 12 371 чалавек. Агентаў "варожых разведак" знаходзілі і выкрывалі сярод самых розных сацыяльных груп насельніцтва – ад высокапастаўленых дзяржаўных, партыйных і ваенных дзеячаў да простых рабочых і сялян.

У чэрвені 1937 г. адбыўся XVI з'езд КП(б) Беларусі, якому належыць асобнае месца ў нагнятанні атмасферы страху і беззаконня. Тэма выкрыцця ворагаў народа была галоўнай у справаздачным дакладзе першага сакратара В. Шаранговіча і ў прамовах фактычна ўсіх выступаўшых.

29 ліпеня 1937 г. адбыўся III Пленум ЦК КП(б)Б, рашэнні якога адыгралі ролю своеасаблівага дэтанатара, выклікалі абвальны працэс агульнага

выкрыцця, масавага псіхозу ў пошуках “ворагаў народа”. Выступаючыя на пленуме прадстаўнікі партыйных органаў прызналі наяўнасць у іх арганізацыях і раёнах “актыўна дзеючых контррэвалюцыянераў, польскіх шпіёнаў і дыверсантаў”.

Выкананне рашэнняў III Пленума ЦК КП(б)Б прывяло да таго, што з сярэдзіны 1937 г. да ліпеня 1938 г. было арыштавана 2570 удзельнікаў т. зв. “аб’яднанага антысавецкага падполля”. Месцамі іх канцэнтрацыі, як адзначаецца ў даведцы УДБ НКУС, былі ЦВК, СНК БССР, ЦК КП(б)Б, Дзяржплан, наркаматы і іншыя ўстановы. Было арыштавана: 40 наркомаў і іх намеснікаў, 179 кіруючых работнікаў савецкага і гаспадарчага апарату, 1 акадэмік, 25 навукоўцаў, 41 выкладчык ВНУ, 23 супрацоўнікі ЦК КП(б)Б, 16 супрацоўнікаў Саўнаркома.

Следчымі органамі арыштаваныя былі падзелены на наступныя групы: нацыянал-фашысцкае падполле (яго кіраўнікамі вызначаны Чарвякоў, Шаранговіч, Жылуновіч і інш.); антысавецкае эсэраўскае падполле (Чарнушэвіч, Бадунова, Панкевіч); антысавецкае бундаўска-сіяніцкае падполле (Волт, Гурэвіч); царкоўна-сектанцкае падполле (кіраўнік, “японска-польскі шпіён”, мітрапаліт Бліноў). Кіраўнікамі “трацкісцкай арганізацыі” на Беларусі былі названы М. Гікала, М. Галадзед, Д. Валковіч і іншыя кіраўнікі рэспублікі. Сярод абвінавачванняў, якія прад’яўляліся арыштаваным, былі і наступныя: “Антысавецкая арганізацыя на Беларусі па заданні цэнтра правых у Маскве сумесна з трацкістамі рыхтавала здзяйсненне тэрарыстычных актаў над тт. Сталіным, Варашылавым і Калініным. Па заданні Галадзеда Хацкевічам у Маскве была створана група, якая рыхтавала тэрарыстычны акт супраць т. Сталіна”.

Новы ўздым хвалі рэпрэсій назіраўся з восені 1939 г., пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР. Былі рэпрэсіраваны (у асноўным высланы ва ўсходнія раёны СССР) цэлыя групы насельніцтва – служачыя былога дзяржапарату, судовых органаў, пракуратуры, паліцыі, арміі, гандляры, леснікі, рамеснікі з сем’ямі, усяго каля 125 тыс. чалавек.

Пытанне аб тым, колькі жыхароў Беларусі пацярпела ад палітычных рэпрэсій, не высветлена і да сённяшняга дня. Як вынікае з падлікаў, судовымі і несудовымі органамі ў рэспубліцы па палітычных матывах было прыцягнута да адказнасці больш за 250 тыс. грамадзян. Акрамя таго, у адміністрацыйным парадку (раскулачванне, высяленне, барацьба з сабатажам, выкананне закона “Аб ахове сацыялістычнай маёмасці” і г.д.) прыцягнуты да адказнасці яшчэ амаль 350 тыс. чалавек, жыццё і лёс якіх былі парушаны сталінскім рэжымам. Агульная лічба ахвяр сталінізму, на думку некаторых даследчыкаў, складае на Беларусі 600–700 тыс. чалавек. З пачатку 50-х гадоў да 1994 г. у Рэспубліцы Беларусь рэабілітавана больш за 160 тыс. грамадзян.

## ГЛАВА 3. КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА

### § 1. Ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. Развіццё асветы і навукі

У комплексе праблем культурнага будаўніцтва важнае месца займала ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. Гэта была адначасова і палітычная задача, бо непісьменны чалавек стаіць па-за палітыкай.

Пачатак паходу супраць непісьменнасці пакладзены дэкрэтам Саўнаркома РСФСР ад 26 снежня 1919 г. "Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР", які падпісаў У. Ленін. У Беларусі гэта работа ў поўную сілу пачалася з канца 1920 г., калі тэрыторыя рэспублікі была вызвалена ад польскіх акупантаў.

У гэты час 52,6 % насельніцтва ва ўзросце ад 9 да 49 гдоў з'яўлялася непісьменным. Была створана Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці. Да вырашэння гэтай задачы прыцягваліся грамадскія арганізацыі. У 1926 г. афармілася таварыства "Прэч непісьменнасць", якое ўзначаліў старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў. Калі ў 1929 г. у рэспубліцы дзейнічала 951 ячэйка гэтага таварыства з 59 тыс. чалавек, дык у 1932 г. ужо налічвалася 10 тыс. ячэек і ў іх працавала 156 тыс. чалавек.

У ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці прымалі ўдзел калектывы фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, настаўнікі, студэнты, школьнікі, камсамольцы і інш.

Інтарэсы індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі патрабавалі значнага паляпшэння агульнаадукацыйнай і культурна-тэхнічнай падрыхтоўкі насельніцтва. Уменне чытаць, пісаць, лічыць цяпер было недастаткова. У жніўні 1932 г. Саўнарком БССР прыняў пастанову "Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання для малапісьменных". Пастановай урада рэспублікі ад 25 ліпеня 1932 г. была зацверджана новая сістэма навучання дарослых. Яе пачатковым звяном сталі ўводныя курсы ў вытворчасць, якія знаёмілі рабочага з тэхніка-эканамічнай і грамадска-палітычнай дзейнасцю прадпрыемства. Наступная ступень – пачатковая політэхнічная вытворчая школа (тэрмін навучання – 1,5 года), якая будавалася на базе лікпункта, забяспечвала не толькі ліквідацыю малапісьменнасці, але і падрыхтоўку кадраў масавых прафесій (3–4-ы разрад) і іх перакваліфікацыю. З 1934/35 навучальнага года ўстанаўлівалася адзіная пачатковая вячэрняя школа з трохгадовым тэрмінам навучання. Яе асаблівасцю было тое, што агульнаадукацыйная падрыхтоўка навучэнцаў сумяшчалася з тэхнічнай падрыхтоўкай, або агразаалагічнай вучобай.

Яшчэ больш увагі навучанню дарослых сталі ўдзяляць пасля апублікавання 27 лютага 1936 г. пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) "Аб рабоце па навучанні непісьменных і малапісьменных". Толькі за гады другой пяцігодкі ў Беларусі амаль 249 тыс. чалавек ліквідавалі непісьменнасць і больш за 1 млн – малапісьменнасць. Паводле звестак Усесаюзнага перапісу 1939 г. пісьменнасць

насельніцтва БССР ва ўзросце 9 гадоў і старэй (без заходніх абласцей) павялічылася з 53,1 % у 1926 г. да 78,9 % у 1939 г. Масавая непісьменнасць у БССР была ліквідавана. Гэта вялікае дасягненне беларускага народа. Яно і сёння не згубіла сваёй значнасці, калі мець на ўвазе, што сёння амаль кожны пяты жыхар планеты не ўмее чытаць і пісаць.

Але ў канцы 30-х гадоў частка дарослага насельніцтва рэспублікі, асабліва на вёсцы і сярод жанчын, яшчэ заставалася неахопленай навучаннем.

У красавіку 1939 г. Саўнарком БССР прыняў пастанову "Аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў БССР". Ставілася задача канчатковай ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў рэспубліцы. Гэта работа працягвалася да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Разам з ліквідацыяй непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва праводзілася вялікая работа па стварэнні сістэмы народнай адукацыі, якая забяспечыла б кожнаму рэальную магчымасць закончыць агульнаадукацыйную школу і атрымаць патрэбную прафесію. Падрыхтоўка кадраў спецыялістаў ажжыццяўлялася ў вышэйшых навучальных установах. 30 кастрычніка 1921 г. адбылося адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта. яго першым рэктарам быў прызначаны вядомы вучоны-гісторык, прафесар У.І. Пічэта.

У 1925 г. у выніку зліцця Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і Мінскага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі была створана ў Горках Беларуская дзяржаўная акадэмія сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Усяго ў канцы другой пяцігодкі ў 23 вышэйшых навучальных установах БССР вучылася каля 15 тыс. студэнтаў.

За гады сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР было падрыхтавана больш за 40 тыс. спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Сярод іх – настаўнікі, урачы, інжынеры, эканамісты, аграномы, юрысты, прадстаўнікі іншых прафесій.

Значнае развіццё атрымала сярэдняя спецыяльная адукацыя. Былі створаны новыя сельскагаспадарчыя, індустрыяльныя, педагагічныя, медыцынскія і іншыя навучальныя ўстановы. У 1939/40 навучальным годзе ў БССР працавалі 102 тэхнікумы, у якіх налічвалася каля 34 тыс. навучэнцаў.

Кадры кваліфікаваных рабочых рыхтавалі прафесійныя школы і школы фабрычна-заводскага вучнёўства. Ажыццяўлялася таксама вытворча-тэхнічнае навучанне на фабрыках і заводах без адрыву ад вытворчасці.

Да сярэдзіны 20-х гадоў сістэма адукацыі была створана і складалася з наступных частак: 1) дашкольных устаноў; 2) масавых чатырохгадовых працоўных школ; 3) сямігадовых працоўных політэхнічных школ у складзе двух канцэнтраў (першы ўключаў у сябе I–IV групы (вучэбныя класы), другі – V–VII групы; 4) школ сялянскай моладзі (ШСМ), школ фабрычна-заводскага навучання (ФЗН), прафшкол, прафесійных і агульнаадукацыйных курсаў; 5) рабфакаў; 6) тэхнікумаў; 7) вышэйшых навучальных устаноў.

Пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 15 мая 1934 г. "Аб структуры пачатковай і сярэдняй школы ў СССР" былі ўстаноўлены адзіныя для ўсёй

краіны тыпы агульнаадукацыйнай школы – пачатковая, няпоўная сярэдняя і сярэдняя. Вучэбныя групы сталі называцца класамі.

Асаблівая ўвага надавалася ўвядзенню ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей. З гэтай мэтай будаваліся школы, ажыццяўляўся паўсюдны перапіс дзяцей школьнага ўзросту, ім аказвалася дапамога ў забеспячэнні адзеннем, абуткам, школьна-пісьмовымі прыладамі, падвозілі ў школы і г.д. Ужо ў 1929/30 навучальным годзе са 129 тыс. 8-гадовых дзяцей у школах БССР навучалася 117 758 чалавек, ці 91 % іх агульнай колькасці. БССР першай з саюзных рэспублік ажыццявіла ў асноўным усеагульнае абавязковае навучанне дзяцей 8-гадовага ўзросту.

У 1930/31 навучальным годзе было ў асноўным уведзена ўсеагульнае абавязковае навучанне дзяцей 8–10-гадовага ўзросту, а таксама пераростка ў 11–15 гадоў і пачалася работа па ажыццяўленні ўсенавуча ў аб’ёме сямігадовай школы. У 1931/32 навучальным годзе ў БССР было завершана ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання і працягвалася паступовае ўвядзенне ўсенавуча на базе сямігадовай школы. У другой пяцігодцы значна вырас кантынгент вучняў у старэйшых класах няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школы і скарацілася колькасць сямігадовых школ у сувязі з пераўтварэннем часткі іх у сярэднія. Быў зроблены буйны крок у ажыццяўленні ўсеагульнага сямігадовага навучання і ў развіцці сярэдняй адукацыі.

У 20–30-я гады была створана вышэйшая школа Беларусі, дзверы якой расчыніліся для дзяцей з працоўнага асяроддзя. У 1918 г. у вышэйшыя навучальныя ўстановы – педагагічныя інстытуты былі пераўтвораны Віцебскі і Магілёўскі настаўніцкія інстытуты, а ў пачатку 1919 г. – Мінскі. У 1919 г. пачалася новая рэарганізацыя: педагагічныя інстытуты пераўтвараліся ў інстытуты народнай адукацыі з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Яны рыхтавалі работнікаў для школьных, дашкольных і пазашкольных устаноў. У 1920 г. быў створаны Беларускі політэхнічны інстытут, 1921 г. Беларускі дзяржаўны універсітэт, 1924 г. Віцебскі ветэрынарны інстытут і інш.

У 1930–1931 гг. у рэспубліцы была створана новая сістэма і сетка навучальных устаноў па падрыхтоўцы інжынерна-тэхнічных, сельскагаспадарчых кадраў і эканамістаў. У мэтах стварэння новых вышэйшых навучальных устаноў адбылася рэарганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Аднак стварэнне “карлікавых” ВНУ прывяло да нерацыянальнага выкарыстання сродкаў, пагаршэння якаснага ўзроўню прафесарска-выкладчыцкага саставу, змены вучэбных планаў і інш. Трэба было тэрмінова выпраўляць памылкі, рабіць новую рэарганізацыю навучальных устаноў, іх узбуйненне. У выніку рэарганізацыі ў Беларусі склалася новая сістэма вышэйшай адукацыі. Калі ў 1925 г. працавала 4 ВНУ з 4342 студэнтамі, дык у 1932 г. – 31 ВНУ з 10574 студэнтамі. Гэта станоўча ўплывала на фарміраванне кадраў нацыянальнай інтэлігенцыі рэспублікі.

У сувязі з ажыццяўленнем усенавуча на базе сямігадовай школы і недахопам настаўнікаў для 5–7 класаў сямігадовых і сярэдніх школ рашэннем СНК БССР у 1935–1937 гг. былі створаны двухгадовыя настаўніцкія інстытуты ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Оршы і Рагачове. У 1937 г. у Мінску пачаў працаваць Інстытут фізічнай культуры.

Цяпер колькасць ВНУ ў Беларусі амаль такая ж, як у 30-я гады, і дзейнічаюць большасць створаных тады навучальных устаноў.

Значнае развіццё атрымала сярэдняя спецыяльная адукацыя. Былі адкрыты новыя сельскагаспадарчыя, індустрыяльныя, педагагічныя і іншыя навучальныя ўстановы, павялічыўся кантынгент навучэнцаў. Толькі ў другой пяцігодцы ў БССР тэхнікумы выпусцілі 19678 спецыялістаў, а ў 1938–39 гг. – 17488.

Кадры кваліфікаваных рабочых рыхтаваліся ў прафесійных школах. У 1930 г. яны былі ліквідаваны і на іх базе створаны школы фабрычна-заводскага навучання (ФЗН). У другой пяцігодцы вытворча-тэхнічнае навучанне моладзі ажыццяўлялася таксама на фабрыках і заводах без адрыву ад вытворчасці. Кадры масавых прафесій для сельскай гаспадаркі рыхтавалі сельскагаспадарчыя школы і вучэбна-практычныя майстэрні. З 1924 г. пачалося стварэнне школ сельскагаспадарчага навучання, якія давалі спецыяльныя веды па паляводству, жывёлагадоўлі і садаводству. У перадваенныя гады ствараліся школы механізацыі сельскай гаспадаркі. Так у 20–30-я гады была створага адна з самых лепшых у свеце сістэма народнай адукацыі з яе прынцыпамі гуманнасці, пераемнасці, агульнадаступнасці, бясплатнасці.

20-я гады сталі часам нараджэння беларускай савецкай навукі. У студзені 1922 г. заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Яго задачай з’яўлялася вывучэнне мовы, літаратуры, гісторыі, этнаграфіі, эканомікі, прыродных багаццяў Беларусі. 1 студзеня 1929 г. Інстытут беларускай культуры быў рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук (з 1936 г. – АН БССР). У 1932 г. у яе складзе налічвалася 14 навукова-даследчых інстытутаў. Усяго ў рэспубліцы было 40 навукова-даследчых устаноў, у якіх налічвалася каля 1,5 тыс. навуковых супрацоўнікаў, у аспірантуры навучалася 432 чалавекі.

Вучоныя займаліся даследаваннем рэсурсаў, праблемы прыкладнога характару. Былі адкрыты новыя паклады карысных выкапняў для прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Плённа працавалі вучоныя Інстытута хіміі АН БССР. Навуковыя даследаванні акадэміка АН БССР У.В. Шкатэлава (заснавальніка лесахіміі) знайшлі практычнае прымяненне: ў 1929–1930 гг. былі пабудаваны першыя айчынныя каніфольна-шкіпідарныя заводы ў Барысаве і Бабруйску. Значныя поспехі мелі беларускія вучоныя ў галіне даследавання праблем сельскай гаспадаркі, лесаводства, флоры і фаўны. Пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР Я.М. Афанасьева была складзена першая глебавая карта рэспублікі, атрымаўшая высокую ацэнку беларускіх земляробаў.

Праводзіліся даследаванні і ў галіне гуманітарных навук. Поспехі беларускай навукі, яе матэрыяльная база і кадры супрацоўнікаў закладвалі асновы для далейшага развіцця навуковых даследаванняў у рэспубліцы.

## § 2. Беларуская літаратура, тэатральнае і музычнае мастацтва: асноўныя напрамкі развіцця

Развіццё літаратуры і мастацтва адбывалася ў складаных умовах, час узнікнення і ідэйнай барацьбы розных плыняў і груповак, абумоўленай сацыяльнай неаднароднасцю грамадства і абвастрэннем супярэчнасцей паміж сіламі новага і старога свету.

Асаблівасцю з'яўлялася тое, што ў асяроддзе пісьменнікаў улілася вялікая група маладых талентаў з вёскі, прыхільнікаў сацыялістычнай рэвалюцыі.

У 20-я гады дзейнічалі некалькі літаратурных аб'яднанняў, сярод іх "Маладняк", "Узвышша", "Полымя" і інш. У 1921–1925 гг. на ўсю моц загучалі галасы пісьменнікаў старэйшага пакалення – Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі і інш. Чалавек працы, змагар, будаўнік заставаўся галоўным героем літаратурна-мастацкіх твораў. У 1922 г. выйшаў зборнік вершаў Я. Купалы "Спадчына", а ў 1925 г. – паэма "Безназоўнае". У 1923–1925 гг. Я. Колас апублікаваў паэмы "Новая зямля" і "Сымон музыка". Беларуская паэзія вітала рэвалюцыю. Для яе характэрны былі аптымізм, дух змагання за новае жыццё. Гэта быў час агульнага духоўнага ўздыму, час надзей, веры і мар.

У другой палове 20-х гадоў развіццё беларускай савецкай літаратуры адбывалася ў вострай барацьбе ідэйна-эстэтычных тэндэнцый, розных літаратурных груповак.

У канцы 1927 г. афармілася літаратурнае аб'яднанне "Полымя". У ім працавалі Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны і інш. У лістападзе 1928 г. Усебеларускі з'езд "Маладняку" вырашыў утварыць Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП). З гэтага часу "Маладняк" спыніў сваё існаванне.

20–30-я гады з'явіліся перыядам далейшага ўмацавання сувязей беларускай літаратуры з літаратурамі іншых народаў нашай краіны, усталявання больш цесных кантактаў пісьменнікаў Беларусі з пісьменнікамі братніх рэспублік. Беларускія пісьменнікі часта наведвалі культурныя цэнтры Расійскай Федэрацыі, Украіны, Грузіі. У сваю чаргу прадстаўнікі братніх народаў былі жаданымі гасцямі на беларускай зямлі. Летам 1940 г. праходзіла першая дэкада беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве, якая знаёміла з дасягненнямі беларускага народа ў самых разнастайных галінах творчасці.

У 30-я гады завяршыўся працэс стварэння адзінай пісьменніцкай арганізацыі Беларусі. У сувязі з ростам колькасці пісьменнікаў, а таксама для ўзмацнення партыйнага ўплыву на літаратурны працэс ЦК ВКП(б) вырашыў ліквідаваць шматлікія пісьменніцкія арганізацыі і аб'яднаць усіх пісьменнікаў, якія падтрымліваюць платформу савецкай улады, у адзіны саюз савецкіх пісьменнікаў. 23 красавіка 1932 г. была прынята пастанова ЦК ВКП(б) "Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый". Аналагічную пастанову неўзабаве прыняў ЦК КП(б) Беларусі.

У чэрвені 1934 г. у Мінску адбыўся І з'езд пісьменнікаў Беларусі, на якім прысутнічала больш за 100 дэлегатаў. З'езд арганізацыйна аформіў стварэнне Саюза пісьменнікаў БССР.

У змрочную пару рэпрэсій 30-х гадоў, паводле няпоўных звестак, было арыштавана каля 90 пісьменнікаў. Большасць з іх загінула ў лагерах. Сярод іх М. Гарэцкі, У. Галубок, М. Чарот, М. Зарэцкі і інш.

У вострай барацьбе розных мастацкіх школ і плыняў стваралася беларускае савецкае тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва. У верасні 1920 г. быў адкрыты Першы Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-1), у 1926 г. – БДТ-2 і Беларускі вандроўны тэатр, які ў 1932 г. быў рэарганізаваны ў Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр (з базай у Гомелі). У 30-я гады былі створаны Рускі драматычны і Тэатр юнага гледача, тэатры рабочай моладзі ў Мінску, Гомелі і Віцебску, калгасна-саўгасныя тэатры ў Мінску, Барысаве, Мазыры, Слуцку, Бабруйску, Рэчыцы і Дзяржынску. Усяго ў рэспубліцы працавала 14 тэатраў. На іх сцэнах ішлі такія п'есы, як "Паўлінка", "Раскіданае гняздо", "Сон на кургане" Я.Купалы, "На дне" М. Горкага, "Партызаны" К. Крапівы і інш. У 1923 г. Першы беларускі дзяржаўны тэатр дэманстраваў сваё майстэрства ў Маскве ў Крамлі і быў узнагароджаны ЦВК СССР Ганаровай граматай.

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы творчых работнікаў аказваў Беларусі рускі народ. Паездкі ў Маскву, вучоба ў лепшых майстроў сцэны садзейнічалі хуткаму творчаму росту калектываў тэатраў. Беларускаму гледачу былі добра вядомы такія славутыя дзеячы сцэны, як І. Буйніцкі, Е. Міровіч, У. Галубок, Г. Глебаў, Б. Платонаў, П. Малчанаў і інш.

У сярэдзіне 20-х гадоў першыя поспехі былі дасягнуты ў развіцці беларускага музычнага мастацтва, у якім усё яшчэ пераважала самадзейная творчасць музычных, харавых і танцавальных калектываў. У пачатку 20-х гадоў у Мінску, Віцебску, Гомелі былі створаны музычныя тэхнікумы, якія сталі цэнтрамі музычнага жыцця. У 1924 г. у Гомелі, а затым у Магілёве былі арганізаваны невялікія сімфанічныя аркестры.

Значны крок наперад зрабіла музычнае мастацтва ў 30-я гады. У 1932 г. адкрылася Беларуская дзяржаўная кансерваторыя, у 1933 г. – Беларускі тэатр оперы і балета, а ў 1937 г. – Беларуская дзяржаўная філармонія. У яе склад увайшлі сімфанічны аркестр і аркестр народных інструментаў, ансамбль народнай песні і танца, харавая капэла. У гэты час сталі добра вядомы імёны такіх кампазітараў, як М. Аладава, А. Багатырова, В. Залатарова, І. Любана, А. Туранкова, М. Чуркіна і інш.

Паспяхова развівалася кінамастацтва. Ствараліся дакументальныя і мастацкія фільмы, кінахроніка. Сярод іх "Залатыя агні" У. Корш-Сабліна, "Балтыйцы" А. Файнцымера. Да ліку лепшых належалі таксама фільмы І. Бахара і Л. Малчанава "Палескія рабінзоны" (1935) і "Канцэрт Бетховена" (1937).

Дасягненні ў сферы культурнай дзейнасці сведчаць аб сапраўдным ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі ў рэспубліцы.

## § 3. Жывапіс, скульптура і архітэктура

У 20–30-я гады паспяхова развіваліся жывапіс, скульптура, архітэктура. У Мінску былі адкрыты мастацка-вытворчыя майстэрні "Выяўленчае мастацтва". У гістарычным музеі ў Мінску існавалі аддзелы старажытнага і сучаснага мастацтва. У 1925 г. пры Інбелкульце дзейнічала мастацкая секцыя, якая мела тры падсекцыі: тэатра, выяўленчага мастацтва, музыкі. Важную ролю ў кансалідацыі мастацкіх сіл рэспублікі адыгрывалі мастацкія выстаўкі. Першая з іх адбылася пасля вайны ў Мінску ў верасні 1921 г. Асобую старонку ў гісторыю станаўлення і развіцця жывапісу Савецкай Беларусі ўнесла дзейнасць Віцебскага мастацкага тэхнікума, які з'яўляўся галоўным цэнтрам падрыхтоўкі мастацкіх кадраў і галоўным асяродкам кансалідацыі мастацкіх сіл рэспублікі. Тут працавалі такія таленавітыя мастакі, як Ю. Пэн, М. Дабужынскі, М. Шагал, К. Малевіч і інш.

Акрамя традыцыйных майстэрняў (аддзяленняў) жывапісу і графікі, у вучылішчы існавалі майстэрні прыкладных мастацтваў – рукадзелля, цацак, пераплётная. Пры іх жа працавалі "Другая свабодная майстэрня" і "Першая раённая школа", у якіх бясплатна вучыліся малюнку і жывапісу ўсе жадаючыя незалежна ад узросту і характару заняткаў.

Па сутнасці пачынаўся новы якасна адрозны ад дарэвалюцыйнага этап развіцця нацыянальнага беларускага мастацтва. Героем твораў стаў савецкі чалавек з яго справамі, марамі. Дамінуючае месца ў жывапісу 20-х гадоў займалі ў асноўным дзве тэмы – рэвалюцыі і грамадзянскай вайны і будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Пачынальнікам беларускага гістарычнага жывапісу стаў В.В. Волкаў (1881–1964). Рэвалюцыйная тэматыка знайшла выяўленне ў яго карціне "Барыкады" (1923). Наступнае шматфігурнае палатно "Партызаны" (1928), прысвечанае партызанскай барацьбе на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны.

Новыя з'явы ў жыцці беларускай вёскі выразна адлюстраваў у карціне "Старое і новае" (1927) Г.С. Віер (1890–1964). Добра вядомыя яго карціны "Суботнік" (1932), "Уборка бульбы" (1935) і інш.

Надзвычай прадукцыйнай ва ўсіх жанрах выяўленчага мастацтва была творчасць М.М. Філіповіча (1896–1947). У 20-я гады ён стварыў шэраг работ, прысвечаных гісторыі дарэвалюцыйнага мінулага беларускага народа – палотны "Бітва на Нямізе" (1922), "Ад веку мы спалі", "З часоў прыгнёту", "Барыкада" (1928–1929) і інш.

Творы М.П. Станюты (1881–1974) 20-х гадоў прысвечаны працоўнаму жыццю рабочага класа г. Мінска. Ён не здраджваў гэтай тэме ўсё сваё жыццё. "Шклозавод" (1924), "Бетоншчыкі" (1927), "Будаўніцтва Універсітэцкага гарадка" (1928), "Ліцейны цэх" (1931) – творы, народжаныя ў выніку непасрэднага назірання мастаком жыцця і працы мінчан.

Крыху слабей развіваўся жанр пейзажу. У ім вылучаліся работы У.М. Кудрэвіча (1884–1957). Вобраз роднай прыроды адлюстраваны ім у

работах “Раніца вясны”, “Вечар”, “Акорд”. Цікавыя рэалістычныя пейзажы экспанаваў В. Волкаў у карцінах “Від Віцебска” (1920), “Дзвіна” (1925) і інш.

Такім чынам, 20-я гады ў гісторыі беларускага жывапісу былі часам збірання творчых сіл, першых спроб засваення новай тэматыкі, актыўнага ўкаранення мастацтва ў жыццё шырокіх пластоў народа.

У 30-я гады мастацтва Беларусі ўзбагачалася новымі тэмамі і вобразамі. Героіка грамадзянскай вайны, сацыялістычныя пераўтварэнні ў краіне, духоўнае ўзвышэнне новага чалавека, услаўленне стваральнай працы – вось кола тэм, якое вызначала далейшае развіццё мастацтва. У гэтыя гады закладваліся трывалыя асновы станковага жывапісу.

У 1932 г. праходзіла 5-я Усебеларуская мастацкая выстаўка. На ёй былі прадстаўлены карціны І.В. Ахрэмчыка, А.М. Шаўчэнкі, Ф.А. Фогта, М.І. Гусева, М.І. Манасзона, Х.М. Ліўшыца і інш.

І.В. Ахрэмчык (1903–1971) – пастаянны ўдзельнік беларускіх выставак. Яко карціны “Падпісанне маніфеста аб утварэнні БССР” (1929), “Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск” (1935) і іншыя былі добра вядомы жыхарам рэспублікі.

А.М. Шаўчэнка (1902–1980) у творах праяўляў цікавасць да працоўнага жыцця людзей свайго краю. Гэта асабліва ўласціва карціне “Уборка сена”.

Ф.А. Фогт (1889–1939) як мастак звяртаўся да самых разнастайных сфер жыццядзейнасці чалавека, важнейшых падзей у палітычным і мастацкім жыцці замежных краін. Аб гэтым сведчаць яго карціны “Галоўны паход”, “Інквізіцыя” і інш.

Карціна “Сустрэча савецкіх танкістаў Заходняй Беларусі. 1939 год” (1939) зрабіла папулярным імя яе аўтара – М.І. Манасзона (1907–1980).

Пачуццём гістарызму вылучаецца творчасць Х.М. Ліўшыца (нар. 23.10.1912).

Буйной падзеяй у культурным жыцці стаў Першы з’езд мастакоў Беларусі, які адбыўся 6 снежня 1938 г. у Мінску. На з’ездзе абмяркоўваліся праблемы мастацкага жыцця рэспублікі, росту прафесійнага майстэрства. З’езд арганізацыйна аформіў стварэнне Саюза мастакоў БССР, прыняў статут саюза і намеціў шляхі развіцця гэтай творчай арганізацыі.

Багатыя і цікавыя традыцыі мае беларуская графіка. Толькі пры савецкай уладзе графіка стала мастацтвам па-сапраўднаму масавым, перадавым, даступным самай шырокай аўдыторыі. У грамадзянскую вайну найбольшае распаўсюджванне атрымалі публіцыстычныя віды графікі: плакат і карыкатура. У многіх гарадах Беларусі (Мінск, Гомель, Віцебск і інш.) існавалі мясцовыя бюро РОСТА.

Як і ў іншых відах мастацтва, у беларускай графіцы 20-х гадоў адбываўся працэс станаўлення нацыянальнай мастацкай школы. Вялікае месца заняла станковая графіка на 1-й (1925), 2-й (1927), 3-й (1929) і наступных усебеларускіх мастацкіх выстаўках.

Важнейшай падзеяй у гісторыі беларускай графікі 30-х гадоў з’явілася арганізацыя графічнага аддзялення ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме.

Беларуская графіка 30-х гадоў эвалюцыяніравала па шляху большай змястоўнасці ў адлюстраванні савецкай рэчаіснасці. Важным быў удзел беларускіх мастакоў у “Выстаўцы новых твораў савецкай графікі” у 1941 г. у Маскве.

У 20–30-я гады шэраг манументальных помнікаў стварылі беларускія скульптары. Глыбокі след у беларускай скульптуры пакінулі А. Грубэ, А. Бразер, З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, А. Арлоў.

Адным з першых мастакоў, чыя творчасць была накіравана на вырашэнне новых задач беларускага мастацтва, быў А. Грубэ. Ён імкнуўся даць сканцэнтраваны вобраз новага героя – чалавека працы, паказаць рамантыку працоўных будняў, героіку Кастрычніка. Гэтаму прысвечаны яго работы “Пяцігодку за чатыры гады” (1931), “Будаўніцтва” і інш.

У другой палове 20-х гадоў пачаў творчы шлях З. Азгур. Раннія яго работы – “Галава рабочага”, “Галава шляхціца”, “Галава ліцейшчыка” (усе 1927 г.).

Афармленне Дома ўрада ў Мінску (выканана ў 1933–1937 гг.), у якім прынялі ўдзел амаль усе беларускія скульптары (М. Керзін, А. Бембель, З. Азгур, А. Глебаў, І. Ізмайлаў пад кіраўніцтвам М. Манізера), з’явілася значным творчым дасягненнем, якое справядліва называюць “экзаменам на сталасць” усёй беларускай скульптуры. Адсюль пачыналася яе новая старонка.

Да значных твораў гэтых гадоў належыць помнік У.І. Леніну ў Мінску (1933, М. Манізер), помнік Ф.Э. Дзяржынскаму ў г. Дзяржынску (1933, А. Грубэ).

З. Азгур стварыў серыю бюстаў выдатных рэвалюцыянераў, а таксама вобразы прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі 30-х гадоў (настаўнікаў, пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, урачоў).

Неад’емнай часткай нацыянальнай беларускай культуры з’яўляецца архітэктура – своеасаблівы “мураваны летапіс” гісторыі і культуры нашай краіны. Сярод іншых відаў мастацтваў яна вызначаецца тым, што арганічна спалучае эстэтычныя ідэалы і дасягненні тэхнічнага прагрэсу ў будаўнічай справе канкрэтнай эпохі.

Першымі ўзорамі прамысловай архітэктуры былі карпусы папяровай фабрыкі “Папірус” і хрусталёвага завода ў Барысаве, металаапрацоўчага завода “Энергія” у Мінску і іншых прадпрыемстваў.

У цэлым для прамысловай архітэктуры 20-х гадоў характэрна выкарыстанне жалезабетонных і металічных канструкцый. Фасады будынкаў не ўпрыгожвалі дэкаратыўнай муроўкай, пілястрамі, складанымі карнізамі. Уладкаванне металічных пераплётаў у светлавых праёмах і ліхтарах дало магчымасць значна павялічыць асветленасць вытворчых памяшканняў. Архітэктурнае аблічча прамысловых будынкаў з кожным годам станавілася ўсё больш выразным і лаканічным.

З сярэдзіны 20-х гадоў у рэспубліцы прыняты меры да рэгулявання забудовы гарадоў. У 1925 г. па даручэнні ўрада БССР вядомы савецкі горадабудаўнік У. Сямёнаў прапанаваў праект развіцця Мінска і Оршы. Сярод невялікіх па плошчы ансамбляў забудовы гарадоў (1,5–2 га) прадугледжваліся зялёныя ўчасткі, скверы ці бульвары.

Для архітэктурна-мастацкага аблічча жылых дамоў таго часу характэрна лаканічнасць вырашэння аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі. У пластыцы фасадаў пераважалі спрошчаныя формы з перавагай гарызантальных чляненняў.

У канцы 20-х гадоў рабіліся спробы распрацаваць тып дома з агульнымі бытавымі элементамі. Такія будынкі атрымалі назву дамоў-камун.

Адной з першачарговых задач было пашырэнне школьнай сеткі, будаўніцтва школ. Узводзіліся ў асноўным невялікія па аб'ёму, разлічаныя на 240–280 вучняў двухпавярховыя будынкі, прамавугольныя ў плане, з размяшчэннем па абодва бакі калідора вучэбных памяшканняў.

Развіццё навукі і вышэйшай адукацыі прадвызначыла будаўніцтва ў рэспубліцы шэрага ВНУ і комплексаў навуковых устаноў. У аснову кампазіцыі Універсітэцкага гарадка ў Мінску лягла распаўсюджаная ў тыя гады павільённая сістэма, пры якой асобныя карпусы прызначаліся для падрыхтоўкі спецыялістаў па адпаведных прафесіях.

У другой палове 20-х гадоў рэканструяваліся і расшыраліся гарадскія бальніцы ў Гомелі, Віцебску, Оршы. У гады першай пяцігодкі ў буйных гарадах Беларусі разгарнулася будаўніцтва бальнічных комплексаў на 600–1000 ложкаў. Сярод іх найбольш значнай была 1-я клінічная бальніца ў Мінску (1928–1931, архітэктар Г. Лаўроў).

У першыя гады савецкай улады значнае пашырэнне атрымала арганізацыя культурна-асветных устаноў, рабочых клубаў, дамоў культуры, хат-чытальняў, чырвоных куткоў, бібліятэк. З сярэдзіны 20-х гадоў пачалося будаўніцтва клубаў пры буйных прамысловых прадпрыемствах, прафесійных саюзах, а ў малых гарадах і раённых цэнтрах яны прызначаліся для абслугоўвання ўсіх жыхароў. У большасці сваёй гэта былі невялікія па ўмяшчальнасці будынкі, дзе галоўнае месца адводзілася відовішчнай групе памяшканняў.

Значнай падзеяй у жыцці рэспублікі было стварэнне ў 1934 г. Саюза архітэктараў БССР. На з'ездах саюза (1935, 1937, 1941) абмяркоўваліся пытанні накіраванасці архітэктурнай творчасці, рэканструкцыі і развіцця гарадоў.

Галоўнымі задачамі архітэктуры Беларусі ў перадваенныя пяцігодкі (1933–1941) сталі рэканструкцыя і развіццё гарадоў, абумоўленыя шэрагам аб'ектыўных прычын. ***Па-першае***, гарады ў існуючым тады стане стрымлівалі развіццё народнай гаспадаркі і культуры. ***Па-другое***, эканамічна ўзмацнелая дзяржава атрымала з пачатку 30-х гадоў магчымасць прыступіць да пераўладкавання гарадоў, карэннага паляпшэння камунальнай гаспадаркі.

У сувязі з вырашэннем гэтых задач пачалася распрацоўка генеральных планаў беларускіх гарадоў. Генеральны план г. Мінска распрацоўваўся ў

Ленінградзе архітэктарам Ю. Кілеватавым пад кіраўніцтвам прафесара У. Вітмана.

У канцы 20 – пачатку 30-х гадоў у краіне былі праведзены конкурсы і распачата будаўніцтва шэрага буйных адміністрацыйных будынкаў. Сярод іх – Дом урада ў Мінску (1929–1933, архітэктар І. Лангбард). Гэта і на сённяшні дзень буйнейшае грамадскае збудаванне ў рэспубліцы, па сваіх мастацкіх і горадабудаўнічых якасцях адзін з лепшых узораў савецкай архітэктуры, адзін з першых вопытаў стварэння адміністрацыйнага збудавання.

Будаўніцтва дзіцячых садкоў і ясляў ішло па двух напрамках. Яны размяшчаліся на першых паверхах жылых дамоў або ў асобных будынках, узведзеных па тыпавых праектах. У Мінску ў 1936 г. на базе незавершанага на той час клуба будаўнікоў быў створаны рэспубліканскі Палац піянераў (архітэктары А. Воінаў, У. Вараксін).

Развіццё вышэйшай адукацыі і навукі абумовіла ўзвядзенне значнай колькасці разнастайных будынкаў навучальных і навуковых установ. Створаны галоўны корпус АН БССР (1934–1939, архітэктар І. Лангбард), будынак партыйных курсаў (1933–1938, архітэктар А. Воінаў).

У даваенныя гады былі пабудаваны дамы Чырвонай Арміі ў гарадах Мінску, Бабруйску, Слуцку, Полацку.

Кожны твор архітэктуры ўяўляе сабой спалучэнне трох прынцыпаў: функцыянальнасці, трываласці і прыгажосці. Многія з помнікаў архітэктуры Беларусі 20–30-х гадоў цалкам адпавядаюць гэтым прынцыпам. Ацалеўшы падчас Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., яны служаць людзям і сёння.

## ГЛАВА 4. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ

### § 1. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель

У выніку савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., больш за 100 тыс. км$^2$ тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам звыш 4 млн чалавек перайшло ва ўладанне польскай дзяржавы. Анексіраваную тэрыторыю Заходняй Беларусі польскія ўлады расчлянілі на чатыры ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Віленскае і Беластоцкае. Была створана польская адміністрацыя, падмацаваная густой сеткай паліцэйскіх устаноў – пастарункаў. Яна падтрымлівала рэжым, спецыяльна распрацаваны для “усходніх крэсаў”.

Заходняя Беларусь і яе насельніцтва апынуліся ў вельмі цяжкім становішчы. Разбураная першай імперыялістычнай і затым грамадзянскай вайной гаспадарка амаль не адбудоўвалася, і беларускія землі ператвараліся ў сыравінны прыдатак Польшчы. Да 1935 г. колькасць прамысловых рабочых скарацілася на 40 % у параўнанні з 1913 г. Прамысловасць Заходняй Беларусі ў 1938 г. давала ў 9 разоў менш прадукцыі, чым БССР. Толькі за 1929–1939 гг. у трох ваяводствах – Палескім, Навагрудскім і Віленскім – было закрыта больш за 300 фабрык і заводаў.

На заводах і фабрыках працоўны дзень працягваўся 10–11 гадзін, а на саматужных прадпрыемствах быў значна большым. За тую ж самую працу ў прамысловасці польскаму рабочаму плацілі больш, чым беларусу. Асабліва пакутлівай з'явай было беспрацоўе. У сярэднім на аднаго працуючага прыходзілася два беспрацоўныя. Людзі згаджаліся на любую работу і любую аплату.

Вельмі цяжка жылося ў вёсцы (85 % насельніцтва). Больш паловы зямельнага фонду належала памешчыкам ці буйным уладальнікам, якія мелі ў сярэднім па 500 га. Такіх уладальнікаў было каля 1 % ад усіх жыхароў сельскай мясцовасці. На сялянскі двор прыходзілася каля 7 га зямлі, а 55 тыс. гаспадарак мелі надзел меншы за 1 га. Каля 90 тыс. парабкаў зусім не мелі зямлі. У гэтых умовах польскія ўлады раздавалі буйныя ўчасткі зямлі асаднікам – былым афіцэрам і чыноўнікам, якія мелі заслугі ў савецка-польскай вайне 1919–1920 гг. Па сутнасці, гэта былі новыя кулакі ці нават памешчыкі, якія з'яўляліся сацыяльнай апорай уладам. Яны былі добра арганізаваны, узброены і выконвалі паліцэйскія функцыі ў адносінах да мясцовага насельніцтва. Да вызвалення на тэрыторыі Заходняй Беларусі было расселена каля 10 тыс. асаднікаў.

Пад выглядам ліквідацыі цераспалосіцы польскі ўрад шырока праводзіў хутарызацыю ("камасацыю"), у выніку якой сяляне ўзамен раздробленых на вузкія палоскі зямель павінны былі атрымаць такую самую колькасць зямлі, але адзіным участкам. Да 1939 г. на хутары было пераведзена 43 % усіх гаспадарак, якія карысталіся 45 % усёй зямлі.

Рэформа ліквідавала сервітуты – агульныя абшчынныя ўчасткі зямлі, у выніку чаго сяляне пазбавіліся пашы для жывёлы, вадаёмаў і сенакосаў. Аграрныя пераўтварэнні вялі да ўзрастання дыферэнцыяцыі сялян, колькасць бедных жыхароў вёскі пачала няўхільна павялічвацца.

Сяляне павінны былі пастаянна выконваць дарожныя павіннасці – шарваркі, задарма працаваць на пабудове ці рамонце мастоў, дарог, грэбляў. Медыцынскае абслугоўванне з-за недахопу ўрачоў, дарагавізны медыкаментаў і лячэння было недаступна для большасці насельніцтва. Адзін доктар прыходзіўся на 5–6 тыс. чалавек.

У пошуках заробкаў, даведзеныя голадам і ўціскам да адчаю, сяляне шукалі выйсця ў эміграцыі. У 1925–1938 гг. з трох ваяводстваў Заходняй Беларусі выехалі на пастаяннае жыхарства ў іншыя краіны 78,1 тыс. чалавек.

Кіраўнікі буржуазнай Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзілі вялікадзяржаўную, шавіністычную палітыку. Яны не прызнавалі беларусаў за нацыю і мелі на мэце паланізаваць цэлы народ. Беларуская нацыянальная культура праследавалася, закрываліся беларускія газеты, школы, бібліятэкі. У дзяржаўных установах забаранялася ўжываць беларускую мову. Да захопу Польшчай у Заходняй Беларусі працавалі каля 400 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі, 5 гімназій. Да 1939 г. усе беларускія навучальныя ўстановы былі ліквідаваны.

Вядучую ролю ў паланізацыі беларускага насельніцтва адыгрывала каталіцкая царква. Даволі было беларусу памяняць веру з праваслаўнай на каталіцкую, як польскія ўлады аўтаматычна адносілі яго да польскай нацыянальнасці.

Пасля аднаўлення ў 1918 г. Польшчы як дзяржавы яе тэрыторыя была аб'яўлена Ватыканам місіянерскай тэрыторыяй, на якой павінна была праводзіцца работы па распаўсюджанню новай уніі – неауніі (новай у параўнанні з Брэсцкай царкоўнай уніяй 1596 г.). У адпаведнасці з неауніяй працягваўся працэс аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў і стварэння на базе гэтага уніяцкай царквы. У суды прад'яўляліся неабгрунтаваныя іскі аб вяртанні католікам праваслаўных храмаў, манастыроў і царкоўнай маёмасці. З 500 існаваўшых у краі праваслаўных цэркваў да 1924 г. больш за 300 былі ператвораны ў каталіцкія і ўніяцкія храмы. Уніяцкаму духавенству гарантавалася аплата працы пры ўмове, калі яно прынясе прысягу на вернасць Польшчы.

Разам з тым уніяты пазбаўляліся права праводзіць місіянерскую дзейнасць. Уніяцкіх місіянераў рыхтавалі ў Любліне (Польшча) і Дубне (Валынь). У Альберціне (каля Слоніма) езуіты заснавалі уніяцкі манастыр, а таксама школу місіянераў. Для распаўсюджання уніі сярод беларусаў альберцінскія езуіты выдавалі на беларускай мове часопіс “Да Злучэньня”. У 1932 г. польскі ўрад пад націскам Ватыкана прыняў тайнае рашэнне аб тым, што “задача схілення Усходу ў каталіцтва, гэтак жа, як і ў прошлыя стагоддзі, застаецца і надалей “гістарычнай місіяй” польскай дзяржавы”.

Узмацняецца прымусовае схіленне праваслаўных у каталіцтва і уніяцтва. У 1935 г. у Пінскай епархіі налічвалася 12 святароў і каля 6 тыс. прыхаджан-уніятаў, у Альберціне – 50 місіянераў і каля 300 прыхаджан-уніятаў з навакольных вёсак.

Пад ціскам польскіх улад епіскапат праваслаўнай царквы ў Польшчы станавіўся на шлях разрыву кананічнай сувязі з Маскоўскім патрыярхатам. У гэтых умовах Канстанцінопальскі патрыярх Грыгорый VII дараваў праваслаўнай царкве Польшчы аўтакефалію. У 1925 г. Сінод праваслаўнай царквы ў Польшчы афіцыйна абвясціў праваслаўную царкву аўтакефальнай у складзе Канстанцінопальскага патрыярхату, што садзейнічала захаванню праваслаўя на заходнебеларускіх землях.

Каб зусім не згас агеньчык нацыянальнай культуры, лепшыя прадстаўнікі заходнебеларускай інтэлігенцыі самаахвярна працавалі ў гэтым напрамку. Яны абаранялі беларускую культуру ад нападкаў беларусафобаў, імкнуліся пашыраць асвету сярод свайго гаротнага, паднявольнага народа. Дзякуючы гэтаму пэўнае развіццё атрымала беларуская літаратура. Пісьменнікі і паэты ў сваёй творчасці абапіраліся на дасягненні беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры, на здабыткі працэсу беларусізацыі ў БССР, на прагрэсіўную плынь у польскай культуры. Да такіх літаратараў належаць Максім Танк (Я. Скурко), М. Васілёк, М. Машара, В. Таўлай. У сваіх творах яны праслаўлялі чалавека

працы, будзілі чалавечую і нацыянальную годнасць, заклікалі на барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

У дапаўненне да сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту ў Заходняй Беларусі панаваў жорсткі палітычны рэжым і паліцэйскі тэрор. Рэпрэсіравалі ў першую чаргу камуністаў або спачуваючых камуністычнаму руху. Паводле крымінальнага кодэкса ад 11 ліпеня 1932 г., за прыналежнасць да камуністычнай партыі прадугледжвалася пакаранне аж да пажыццёвага турэмнага зняволення. За садзейнічанне камуністам было ўстаноўлена пакаранне да пяці гадоў турмы.

Па ўсёй тэрыторыі "усходніх крэсаў" лютавалі карныя экспедыцыі, якія называліся "пацыфікацыяй". У час пацыфікацый паліцэйскія разбуралі жыллё сялян, знішчалі маёмасць і харч, учынялі масавыя экзекуцыі. Пасля такога разбою жыхарам гэтых вёсак забаранялася запальваць агні вечарамі, збірацца разам некалькім чалавекам, хадзіць у суседнія вёскі. Вядучая роля ў правядзенні тэрору належала тайнай палітычнай паліцыі – дэфензіве. Яна шырока карысталася метадамі правакацый, паклёпу, запужвання і фізічных катаванняў.

Такім чынам, сацыяльнае, нацыянальнае і палітычнае становішча працоўных мас на тэрыторыі Заходняй Беларусі штурхала іх на актыўныя антыўрадавыя дзеянні. На працягу 20 гадоў тут прайшлі 4 хвалі рэвалюцыйнага руху – у 1923 г., у 1926 – пачатку 1927 г., у 1931–1933 гг., у 1936–1937 гг., г. зн. праз кожныя 2–3 гады.

## § 2. Нацыянальна-вызваленчая барацьба насельніцтва Заходняй Беларусі. Роля і значэнне дзейнасці палітычных партый і арганізацый камуністычнага і нацыянальна-дэмакратычнага напрамку

У пачатку і сярэдзіне 20-х гадоў сацыяльная і нацыянальная барацьба характарызавалася не толькі эканамічнымі забастоўкамі і антыўрадавымі дэманстрацыямі, але і праявамі ўзброеных выступленняў у форме партызанскага руху. У барацьбе прымалі ўдзел працоўныя гарадоў і вёсак, сельская інтэлігенцыя. Гэта былі людзі розных палітычных поглядаў – ад камуністаў да нацыянал-дэмакратаў. Там, дзе кіравалі партызанскімі атрадамі камуністы, рух насіў ярка акрэслены антыпамешчыцкі, класавы характар. А там, дзе задавалі тон людзі з нацыяналістычнымі настроямі, партызанская барацьба насіла антыпольскі напрамак. Такоеназіралася на Гродзеншчыне і Беласточчыне. На Віленшчыне, Палессі, Навагрудчыне дзякуючы кіраўніцтву такіх камуністаў, як К.П. Арлоўскі, С.А. Ваўпшасаў, В.З. Корж і іншыя, партызанская барацьба набыла шырокі размах. Агульная колькасць партызан налічвала 5–6 тыс. У 1924–1925 гг. было праведзена каля 300 баявых аперацый. Польскія ўлады вымушаны былі ўвесці надзвычайнае становішча ў краі, каб рэпрэсіямі і тэрорам ліквідаваць гэты рух.

Ва ўзмацненні сацыяльнага і нацыянальна-вызваленчага руху значную ролю адыгралі партыі і арганізацыі камуністычнага і нацыянальна-

дэмакратычнага напрамку. Сярод іх галоўнае месца займала Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Яна была створана ў кастрычніку 1923 г. Нягледзячы на нелегальны характар работы, рады партыі пашыраліся. У 1923 г. яна налічвала 523 камуністы, у 1928 г. – 3 тыс., у 1934 г. – 4 тыс. Акрамя таго, каля 3 тыс. членаў партыі знаходзілася пастаянна ў турмах. Друкаванымі органамі ЦК КПЗБ былі газета "Чырвоны сцяг" і часопіс "Бальшавік". У розныя гады ЦК КПЗБ выдаваў на беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай мовах газеты "Партработнік", "Да барацьбы", "Весткі з СССР", "Куйце зброю", "Голас салдата", "Чырвоны сцяг" і інш.

КПЗБ была часткай Кампартыі Польшчы на правах тэрытарыяльнай нацыянальнай арганізацыі, таму яна не мела сваёй праграмы і статута, а кіравалася дакументамі КПП. Такая ж сітуацыя была і ў Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), які з'яўляўся аўтаномнай арганізацыяй камсамола Польшчы. Створаны КСМЗБ у студзені 1924 г. ўвесь час заставаўся верным і надзейным памочнікам КПЗБ, яе рэзервам. Да 4 тыс. чалавек аб'ядноўваў камсамол Заходняй Беларусі, пераважна сялянскую моладзь.

КПЗБ і КСМЗБ аказвалі моцны ўплыў на розныя масавыя арганізацыі дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага напрамку. Асабліва значным поспехам было кіраўніцтва масавай легальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй Беларуская сялянска-рабочая грамада (БСРГ), створанай у 1925 г. Яе праграма мела наступныя патрабаванні: самавызначэнне Заходняй Беларусі, аб'яднанне яе з БССР, стварэнне сялянска-рабочага ўрада, канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных зямель, пераход іх ва ўласнасць дзяржавы, падзел зямель без выкупу паміж малазямельнымі сялянамі і парабкамі, ліквідацыя асадніцтва, 8-гадзінны працоўны дзень, нацыянальная роўнасць і навучанне на роднай мове, свабода сумлення, аддзяленне царквы ад дзяржавы і іншыя патрабаванні. Галоўным сродкам вызвалення працоўных была абвешчана адкрытая барацьба з эксплуататарамі на аснове саюзу рабочых і сялян. БСРГ праводзіла мітынгі, дэманстрацыі, выступленні сялян супраць абшарнікаў, кулакоў і асаднікаў, падатковага ўціску і аграрнай палітыкі польскіх улад, за вызваленне палітычных вязняў, за стварэнне беларускіх школ і інш.

ЦК Грамады выдаваў газеты, якія па прычыне праследавання ўладамі часта закрываліся, таму выходзілі пад новымі назвамі: "Жыццё беларуса", "Беларуская ніва", "Беларуская справа", "Народная справа", "Наша справа", "Наш голас", "Наша воля", "Народны звон". Выходзіў таксама сатырычны часопіс "Маланка".

У студзені 1927 г. Грамада аб'ядноўвала больш за 2 тыс. суполак, у якіх налічвалася каля 120 тыс. чалавек, дзейнічала 18 павятовых камітэтаў БСРГ. Бурны рост Грамады, яе поспехі ў кіраўніцтве барацьбой працоўных супраць эканамічнага, нацыянальнага і палітычнага прыгнёту непакоілі памешчыкаў, асаднікаў і акупацыйныя ўлады. Паліцыя і дэфензіва нават дазволеныя вышэйшымі ўладамі з'езды, мітынгі і нарады разганяла, а іх удзельнікаў збівала і арыштоўвала.

У студзені 1927 г. улады пачалі ліквідацыю гурткоў і камітэтаў БСРГ. Па ўсім краі прайшлі масавыя арышты яе актывістаў. Грамада была забаронена афіцыйна, больш за 400 яе кіраўнікоў і актывістаў прыцягнуты да судовай адказнасці. У 1927–1929 гг. адбываліся судовыя працэсы над членамі БСРГ.

Пасля разгрому Грамады яе традыцыі былі прадоўжаны сфарміраванай пры ўдзеле КПЗБ новай арганізацыяй – “Змаганне за інтарэсы сялян і рабочых”.

Палітычная платформа “Змагання” вылучала ў першую чаргу дэмакратычныя патрабаванні: спыненне нацыянальнага прыгнёту, паланізацыі, палітыкі мілітарызацыі, фашызацыі грамадскага жыцця, палітычнага тэрору, падпісанне Польшчай Дагавора з СССР аб ненападзенні, увядзенне 8-гадзіннага працоўнага дня і інш. Праграмныя мэты ўключалі і рэвалюцыйныя патрабаванні: нацыяналізацыю фабрык і заводаў, аб’яднанне беларускіх зямель у рэспубліку рабочых і сялян, г. зн. уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

Польскія ўлады чынілі розныя перашкоды для стварэння сеткі гурткоў на месцах, а таксама ажыццяўлялі жорсткі ўціск на перыядычныя выданні “Змагання”. 30 студзеня 1930 г. паліцыя правяла масавыя арышты актывістаў “Змагання”, ліквідавала цэнтральны і павятовыя сакратарыяты. Гродзенскі акруговы суд восенню 1930 г. асудзіў лідэраў гэтай арганізацыі да 8 гадоў турмы.

Важную ролю ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі адыграла культурна-асветная арганізацыя – Таварыства беларускай школы (ТБШ), створаная ў 1921 г. з адзінай мэтай: “распаўсюджваць і дапамагаць асвеце сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы і беларускую асвету наогул”. Так сказана ў статуце ТБШ.

За перыяд свайго існавання (да 1937 г.) ТБШ заваявала вялікую любоў насельніцтва Заходняй Беларусі. Аб гэтым сведчыць тое, што да пачатку 30-х гадоў яна стала масавай прагрэсіўнай культурна-асветнай арганізацыяй і налічвала каля 500 гурткоў і 30 тыс. актывістаў. ТБШ змагалася за пісьменнасць насельніцтва, за беларускія школы, стварала бібліятэкі, хаты-чытальні, арганізоўвала мастацкую самадзейнасць, выдавала падручнікі, песеннікі. Мясцовыя аддзелы ТБШ стваралі драматычныя гурткі, якія актыўна працавалі сярод насельніцтва.

Заслуга ТБШ была не толькі ў асветніцкай ролі, але і ў тым, што яна падрыхтавала і выхавала ў вельмі цяжкіх умовах нацыянальнага прыгнёту значную колькасць беларускай творчай інтэлігенцыі. Гэта – грамадскі дзеяч Браніслаў Тарашкевіч, музыкант і кіраўнік народнага хору Рыгор Шырма, паэты Яўген Скурко (Максім Танк) і Валянцін Таўлай, пісьменнік Піліп Пестрак і многія іншыя.

У канцы 20 – пачатку 30-х гадоў адбыліся значныя палітычныя і эканамічныя змены на тэрыторыі Заходняй Беларусі. ***Па-першае***, набіраў сілу прафашысцкі рэжым “санацыі”, альбо санацыйны рэжым (ад лацінскага слова “аздараўленне”), устаноўлены Ю. Пілсудскім у маі 1926 г. пасля дзяржаўнага перавароту. ***Па-другое***, слабая эканоміка Польшчы цяжка пераносіла

ўсеагульны эканамічны крызіс 1929–1933 гг., вынікі якога ляглі на плечы працоўных. Толькі на тэрыторыі Заходняй Беларусі прадукцыя прамысловасці скарацілася на 30–40 %, што зрабіла часткова ці поўнасцю беспрацоўнымі амаль палову рабочых. ***Па-трэцяе***, нямала шкоды нацыянальна-вызваленчаму руху нанесла сектанцкая дагматычная палітыка КПЗБ.

## § 3. Праблема адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту ў Заходняй Беларусі. Міжпартыйныя адносіны

Эканамічны крызіс 1929–1933 гг. надзвычай абвастрыў міждзяржаўныя і ўнутрыкласавыя супярэчнасці ў большасці краін свету. Гэта штурхала кіруючыя колы краін да пераходу на антыдэмакратычныя метады і формы дзяржаўнага кіравання, спрыяла прыходу да ўлады найбольш жорсткіх альбо фашысцкіх рэжымаў.

Знешнепалітычная арыентацыя на гітлераўскую Германію выкрышталізавала і ўнутрыпалітычны курс санацыйнага рэжыму Ю. Пілсудскага ў Польшчы. Пасля заключэння ў студзені 1934 г. германска-польскага дагавора ў краіне хутчэй пайшла фашызацыя грамадскага жыцця. У гэтым жа годзе на тэрыторыі Заходняй Беларусі каля мястэчка Бяроза-Картузская быў створаны канцлагер, куды без суда і следства змяшчалі актывістаў нацыянальна-вызваленчай барацьбы, у першую чаргу камуністаў і камсамольцаў. У красавіку 1935 г. былі прыняты новая канстытуцыя Польшчы і новы выбарчы закон. Яны фактычна ліквідавалі тыя абмежаваныя дэмакратычныя правы, якія існавалі ў краіне ў 20-я гады. Новая канстытуцыя ўзаконіла санацыйны рэжым. Такія перамены дыктавалі неабходнасць мяняць тактыку ўсяго сацыяльнага і нацыянальна-вызваленчага руху. Камуністычная партыя Польшчы і яе састаўная частка – Кампартыя Заходняй Беларусі – аказаліся негатовымі адразу да барацьбы ў новых умовах. Узброеная партызанская барацьба была больш лагічнай і зразумелай для заходнебеларускіх камуністаў. Другой, асабліва небяспечнай палітычнай лініяй было тое, што ў дзейнасці кампартый мэтанакіравана ўсталёўваліся максімалізм патрабаванняў, нецярпімасць да іншай думкі і інш. На гэтай падставе праводзілася палітыка варожасці да сацыял-дэмакратыі. На практыцы адбывалася наадварот: у краінах, дзе камуністы аб’ядноўвалі свае намаганні ў барацьбе з сацыял-дэмакратамі і дамагаліся ў адзінстве з дэмакратычнымі партыямі і арганізацыямі, дасягнута была перамога.

Рашаючую ролю ў перабудове ўсяго рэвалюцыйнага руху адыграў VII кангрэс Камінтэрна (1935), які распрацаваў тактыку барацьбы супраць фашызму і вайны. Трэба было стварыць адзіны рабочы фронт, што азначала аб’яднаць усіх рабочых у барацьбе за свае правы. Планавалася стварыць адзіны народны антыфашысцкі фронт. Гэта азначала, што важна аб’яднаць усе пласты грамадства, усіх грамадзян, якія не хочуць фашызму, імкнуцца не дапусціць новай вайны.

Працэс рэалізацыі задачы па стварэнні адзінага фронту барацьбы ўсіх дэмакратычных сіл супраць фашысцкага наступу праходзіў вельмі цяжка і з

пераменным поспехам. Камуністы не маглі хутка зжыць сектанцкія адносіны да дэмакратычных партый і арганізацый, вельмі вялікі недавер склаўся ў членаў гэтых партый да камуністаў. У выніку агульная справа цярпела няўдачу.

Што ўяўлялі сабой партыі і арганізацыі Польшчы і Заходняй Беларусі, якія сумеснымі намаганнямі маглі стварыць антыфашысцкі фронт і не дапусціць перамогі фашызму?

Польская сацыялістычная партыя (ППС), створаная ў 1892 г., стаяла на антысавецкіх і антыкамуністычных пазіцыях, падтрымлівала ўрадавую палітыку паланізацыі насельніцтва "ўсходніх крэсаў". Нязгодныя з гэтай палітыкай у 1926 г. адкалоліся і стварылі ППС-лявіцу. У 1931 г. яна была забаронена. У 30-я гады, у правай ППС зноў сталі ўзнікаць левыя плыні, што давала магчымасць для сумеснай барацьбы.

Значны ўплыў на працоўных гарадоў і мястэчак Заходняй Беларусі мелі яўрэйскія дэмакратычныя арганізацыі. Вядучую ролю адыгрываў Бунд – Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі. Створаны ў 1897 г., ён выяўляў галоўным чынам інтарэсы яўрэйскай беднаты і паўпралетарскіх элементаў.

Значным уплывам на сялянскія масы карысталася партыя "Стронніцтва людове", якая ўтварылася ў выніку аб'яднання ў 1931 г. некалькіх партый: "Вызволене", "Стронніцтва хлопске" і "Пяст" (польская сялянская партыя, што існавала ў 1912–1931 гг.). "Стронніцтва людове" знаходзілася ў апазіцыі да рэжыму Пілсудскага. Асобнае месца займалі беларускія нацыянальныя партыі. Сярод іх Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), пераіменаваная ў 1936 г. у Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА). Канкурэнтам БХД–БНА ў барацьбе за ўплыў на насельніцтва выступала палітычная групоўка беларускіх буржуазных суполак Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюз), якая лічыла магчымым кампраміс з "санацыйным" рэжымам Ю. Пілсудскага.

КПЗБ паступова пачала адыходзіць ад сектанцкіх пазіцый, вяла работу па аб'яднанні ўсіх рабочых арганізацый на аснове дэмакратычных патрабаванняў: 8-гадзіннага працоўнага дня, павышэння зарплаты і інш. Камуністы ўзмацнілі работу сярод членаў нізавых арганізацый "Стронніцтва людовага". Паспяхова праводзілі адзінафрантавыя кампаніі сумесна з БХД–БНА за школу на беларускай мове і інш. У пачатку 1937 г. рэвалюцыйная і антыфашысцкая барацьба ў Заходняй Беларусі, безумоўна, мела значны поспех. Нягледзячы на рэпрэсіі, у забастовачнай барацьбе прымала ўдзел каля 30 тыс. чалавек толькі рабочых. Дакладныя лічбы бастуючых сялян невядомы, але аб маштабах гэтай барацьбы можна меркаваць па тым, што ва ўсёй Польшчы толькі 15 жніўня 1937 г. баставала 10 млн чалавек.

Ва ўмовах нарастання барацьбы працоўных і значных поспехаў па стварэнні адзінага народнага фронту ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне Кампартыя Польшчы і яе састаўныя часткі – КПЗБ і КПЗУ – у сакавіку

1938 г. былі распушчаны і перасталі існаваць. Пазней, у 1956 г., роспуск кампартый быў прызнаны як неабгрунтаваны.

Нягледзячы на такі ўдар па сацыяльным і нацыянальна-вызваленчым руху ў Польшчы, барацьба працоўных, хоць і не так інтэнсіўна, як раней, усё ж працягвалася аж да 17 верасня 1939 г.

У 1921–1939 гг. заходнебеларускія землі з’яўляліся аграрна-сыравінным прыдаткам Польшчы. Гэты перыяд стаў цяжкім і трагічным выпрабаваннем для беларускага народа. Яго заходняя частка апынулася фактычна ў каланіяльным становішчы, што абумовіла заняпад эканомікі і культуры. Беларускі народ не мірыўся з прыгнечаным становішчам і змагаўся за сацыяльную і нацыянальную незалежнасць, за ўз’яднанне з БССР. У гэтай барацьбе вызначыліся К. Арлоўскі, С. Ваўпшасаў, В. Корж, С. Прытыцкі, В. Харужая і інш. У 1939 г. здзейснілася мара беларускага народа. Заходняя Беларусь уз’ядналася з БССР.

## РАЗДЗЕЛ VIII. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (верасень 1939 г. – верасень 1945 г.)

У другую сусветную вайну было ўцягнута 61 дзяржава, больш за 80% насельніцтва зямнога шара. Вайна пазбавіла жыцця звыш 50 млн чалавек, з іх больш за 2,2 млн жыхароў Беларусі. У руіны былі ператвораны тысячы гарадоў і вёсак, значны ўрон прычынены духоўнай культуры народаў. Жудасна нават уявіць сабе, якім бы стала жыццё на нашай планеце, калі б фашысцкім агрэсарам не перагарадзілі шлях народы Савецкага Саюза, іншых дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.

У гісторыі другой сусветнай вайны можна ўмоўна вылучыць 5 асноўных перыядаў:

1) пачатак вайны, уварванне германскіх войск у Польшчу, іншыя краіны Заходняй Еўропы (верасень 1939 г. – чэрвень 1941 г.);

2) нападзенне фашысцкай Германіі на СССР, пашырэнне маштабаў вайны, крах гітлераўскай дактрыны "бліцкрыга" і міфа аб непераможнасці нямецкай арміі (чэрвень 1941 г. – лістапад 1942 г.);

3) карэнны пералом у ходзе вайны, крушэнне наступальнай стратэгіі фашысцкага блока (лістапад 1942 г. – снежань 1943 г.);

4) выгнанне варожых войск за межы СССР, вызваленне ад акупацыі краін Еўропы. Разгром фашысцкага блока, крах фашысцкай Германіі і яе безагаворачная капітуляцыя (студзень 1944 г. – май 1945 г.);

5) разгром імперыялістычнай Японіі, вызваленне народаў Азіі ад японскай акупацыі і заканчэнне другой сусветнай вайны (май – верасень 1945 г.).

### ГЛАВА 1. ПЕРАДВАЕННЫ КРЫЗІС І ПАЧАТАК ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР. ДАЛУЧЭННЕ ВІЛЕНШЧЫНЫ ДА ЛІТВЫ

Другая сусветная вайна, якая пачалася 1 верасня 1939 г., усё далей адыходзіць у глыбіню гісторыі. Ужо сёння 2/3 насельніцтва зямнога шара складаюць людзі, якія нарадзіліся і выраслі ў пасляваенныя гады. Таму надзвычай важна, каб падрастаючыя пакаленні ведалі праўду аб тым, як і чаму ўзнікла вайна, якія сілы вінаватыя ў яе развязванні.

Выяўленне сапраўднай карціны другой сусветнай вайны, прычын яе ўзнікнення дыктуецца яшчэ і тым, што за апошнія гады ў свет выйшла шмат кінафільмаў, кніг, у якіх некаторыя публіцысты, палітыкі, вучоныя Захаду, а таксама іх прыхільнікі ў краінах СНД многія падзеі вайны падаюць павярхоўна, тэндэнцыйна. Усялякімі намаганнямі яны імкнуцца "украсці" у савецкага народа, у тым ліку і беларускага, яго Вялікую Перамогу, прынізіць ролю і значэнне усходняга фронту, укладу Савецкага Саюза ў перамогу над гітлерызмам. У той жа час пераацэньваецца уклад антыгітлераўскай кааліцыі. Дамаўляюцца нават таго, што прыпісваюць адказнасць за развязванне Другой сусветнай вайны кіраўніцтву Савецкага Саюза.

Аналіз гістарычных падзей, дакументаў, міждзяржаўных і сацыяльна-класавых адносін пераконваюць, што другая сусветная вайна ўзнікла невыпадкова, не ў сілу нейкіх непрадбачаных абставін ці памылак асобных дзяржаўных дзеячаў. Яе вытокі – у тых глыбокіх супярэчнасцях, якія існавалі паміж тагачаснымі вядучымі дзяржавамі. Складанае перапляценне многіх фактараў – палітычных, эканамічных, ідэалагічных – вызначыла прычыны і характар вайны.

Галоўная віна за падрыхтоўку і развязванне вайны ляжыць на дзяржавах фашысцка-мілітарысцкага блока (і перш за ўсё Германіі і Японіі). Прыход фашызму да ўлады ў Германіі і пачатак рэалізацыі яго агрэсіўнай праграмы стварылі небяспечны ачаг вайны ў Цэнтральнай Еўропе і непасрэдную пагрозу развязвання сусветнай вайны. Адводзячы ў сваіх глабальных планах важнейшае месца барацьбе супраць “фарпоста міжнароднага камунізму”, г.зн. супраць СССР, фашызм меў на мэце заняволенне і іншых краін, устанаўленне сусветнага панавання.

У такіх умовах паўстала задача арганізацыі сумесных дзеянняў розных палітычных сіл для адпору гэтай агрэсіўнай, гегеманісцкай палітыцы. Здавалася, у сярэдзіне 30-х гадоў такія перадумовы намячаліся: ідэя Савецкага Саюза аб арганізацыі сістэмы калектыўнай бяспекі знайшла падтрымку Францыі, Югаславіі, Румыніі і іншых краін. У 1934 г. СССР уступіў у Лігу Нацый і стаў пастаянным членам яе Савета. У 1935 г. былі падпісаны савецка-французскі і савецка-чэхаславацкі дагаворы.

Аднак далей падзеі пайшлі па іншаму шляху. Кіруючыя колы заходніх дзяржаў узялі курс на “прымірэнне” з агрэсарам. Галоўны сэнс гэтага курсу заключаўся ў тым, каб цаной уступак аслабіць германскі націск на Захадзе і накіраваць яго экспансію на Усход.

Палітыка “прымірэння” рэалізоўвалася на розных напрамках. Заходнія дзяржавы нічога не зрабілі, калі Германія яшчэ вясной 1935 г. афіцыйна адмовілася ад выканання ўсіх ваенных артыкулаў Версальскага дагавора і ўвяла забароненую ёй усеагульную ваенную павіннасць. У наступным годзе Германія, натхнёная беспакаранасцю, акупіравала Рэйнскую дэмілітарызаваную зону. Ад Германіі старалася не адставаць фашысцкая Італія, якая напала на Эфіопію. У 1936 г. Германія і Японія заключылі паміж сабой антыкамінтэрнаўскі пакт, да якога ў 1937 г. далучылася Італія.

Чарговай ахвярай агрэсіі стала Аўстрыя, якая ў сакавіку 1938 г. была ўключана ў склад рэйха. Пагроза навісла над Чэхаславакіяй. 30 верасня 1938 г. на канферэнцыі кіраўнікоў урадаў Англіі, Францыі, Германіі і Італіі ў Мюнхене было падпісана пагадненне аб расчляненні Чэхаславакіі і перадачы часткі яе (Судэцкай вобласці) Германіі. У сакавіку 1939 г. Чэхаславакія была акупіравана Германіяй. Такім чынам, да 1939 г. Версальска-Вашынгтонская сістэма дагавораў, створаная пасля першай сусветнай вайны, была канчаткова скасавана.

Становішча ў свеце рабілася выбухованебяспечным. У новых умовах Савецкі Саюз даў згоду на кантакты з Германіяй. Адбыліся эканамічныя перагаворы, якія з асаблівай інтэнсіўнасцю разгарнуліся ў маі – жніўні 1939 г. Затым яны перайшлі ў палітычную сферу.

Кіруючыя колы Англіі і Францыі пасля акупацыі немцамі Чэхаславакіі, баючыся непрадказальнай палітыкі Германіі, зноў пайшлі на кантакты з СССР. Вясной і летам 1939 г. праходзілі траістыя перагаворы СССР, Англіі і Францыі па палітычных, а потым і ваенных пытаннях. Адначасова брытанскія палітычныя колы не пакінулі спроб дамовіцца з Германіяй, вынікам чаго ў гэты перыяд з'явіліся англа-нямецкія перагаворы.

На палітычных і ваенных перагаворах з СССР прадстаўнікі Англіі і Францыі займалі неканструктыўную пазіцыю. Да 20 жніўня 1939 г. стала відавочна, што перагаворы паміж СССР, Англіяй і Францыяй зайшлі ў тупік. Сітуацыя станавілася крытычнай. Ні для каго не было сакрэтам, што падрыхтоўка Германіі да нападу на Польшчу ідзе поўным ходам.

Ва ўмовах узрастаючай напружанасці міжнароднага становішча, поўнай палітычнай ізаляцыі і магчымай вайны на два фронты СССР прыняў прапанову Германіі заключыць пакт аб ненападзенні. 23 жніўня 1939 г. быў падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў.

Савецка-германскі дагавор, з аднаго боку, з'явіўся вымушаным крокам, лагічным вынікам развіцця міжнародных адносін у 1938–1939 гг. Савецкі Саюз пазбегнуў вайны на два фронты, нанёс рашучы ўдар па планах стварэння адзінага антысавецкага фронту, атрымаў амаль два гады для ўмацавання сваёй абароназдольнасці. З другога ж боку, гэты дагавор нанёс урон міжнароднаму прэстыжу СССР, які ўспрымаўся раней як флагман барацьбы з фашызмам. Быў дэзарыентаваны і савецкі народ, які бачыў у фашызме лютага ворага.

Да дагавора быў прыкладзены "Сакрэтны дадатковы пратакол", якім размяжоўваліся "сферы інтарэсаў" абодвух бакоў. Германія атрымала Францыю, Брытанію і іх афрыканскія калоніі, СССР – Фінляндыю, Эстонію, Латвію, Бесарабію і "права" пашырацца на поўдзень у бок Персідскага заліва праз Іран, Афганістан і Турцыю.

Сам факт размежавання інтарэсаў сацыялістычнай і фашысцкай дзяржаў сакрэтным пратаколам, прынятым у абход законаў СССР і ў парушэнне дагаворных абавязацельстваў перад трэцімі краінамі, адлюстроўваў грэбаванне нормамі права і маралі.

Кульмінацыяй гэтага працэсу стаў Дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй ад 28 верасня 1939 г. Быў таксама падпісаны сакрэтны дадатковы пратакол, паводле якога Літва ўключалася ў сферу інтарэсаў СССР, а Германія ўзамен атрымлівала частку Польшчы, якая па ранейшай дамоўленасці ўваходзіла ў сферу інтарэсаў СССР.

Германія лічыла, што пакт ад 23 жніўня 1939 г. развязаў ёй рукі на Усходзе, і 1 верасня яна напала на Польшчу. Англія і Францыя, звязаныя з Польшчай саюзнымі дагаворамі, 3 верасня 1939 г. аб'явілі вайну Германіі. У

той жа дзень у вайну ўступілі Аўстралія, Новая Зеландыя і Індыя. Пачалася другая сусветная вайна.

Маючы велізарную эканамічную і ваенную перавагу, фашысцкія войскі імкліва рухаліся па тэрыторыі Польшчы да граніцы СССР. Урады Англіі і Францыі, аб'явіўшы вайну Германіі, не пачыналі актыўных ваенных дзеянняў на Захадзе. У выніку Германія хутка акупіравала ўсю тэрыторыю Польшчы, яе войскі падступілі да межаў Заходняй Беларусі, занялі некаторыя яе населеныя пункты, у тым ліку Брэст. Больш чым над 4 млн жыхароў Заходняй Беларусі навісла рэальная небяспека фашысцкага зняволення.

17 верасня 1939 г. па распараджэнні савецкага ўрада войскі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую граніцу і ўзялі пад абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Працоўныя Заходняй Беларусі з радасцю і надзеяй сустракалі Чырвоную Армію.

Яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі ў шэрагу гарадоў і паветаў Заходняй Беларусі людзі раззбройвалі паліцыю і асаднікаў, разгортвалі шырокую кампанію ў падтрымку парадку, стваралі рэвалюцыйныя камітэты.

Да 25 верасня 1939 г. Чырвоная Армія цалкам вызваліла Заходнюю Беларусь. Нямецкім войскам давялося адысці на ўзгодненую на вышэйшым узроўні мяжу, якая і была замацавана адпаведным дагаворам ад 28 верасня 1939 г. паміж СССР і Германіяй. На вызваленай тэрыторыі ва ўсіх гарадах і паветах ствараліся часовыя ўправы, у вёсках і гмінах (валасцях) – сялянскія камітэты. Часовыя ўправы і сялянскія камітэты разгарнулі актыўную работу па выбарах у Народны сход, які павінен быў у заканадаўчым парадку вырашыць пытанне аб уладзе.

28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі. Ён аднагалосна прыняў па дакладу С.В. Прытыцкага дэкларацыю аб устанаўленні савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі. Аднадушна дэлегаты выказаліся і за ўваходжанне ў БССР. 2 лістапада 1939 г. Нечарговая V сесія Вярхоўнага Савета СССР і 12 лістапада Нечарговая ІІІ сесія Вярхоўнага Савета БССР адпаведна прынялі законы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася са 125,6 тыс. км$^2$ да 225,6 тыс., насельніцтва рэспублікі – з 5 млн 562 тыс. чалавек да 10 млн 239 тыс. На тэрыторыі былой Заходняй Беларусі было ліквідавана ранейшае адміністрацыйнае дзяленне і створана 5 абласцей (Баранавіцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская і Беластоцкая).

Улады заходніх абласцей прыступілі да гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва. Былі нацыяналізаваны 1700 прадпрыемстваў, пачаліся тэхнічная рэканструкцыя старых і будаўніцтва новых фабрык і заводаў. Паступова ліквідавалася беспрацоўе. Да канца 1940 г. аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці ў параўнанні з 1938 г. павялічыўся больш чым у 2 разы.

У вёсцы беззямельным і малазямельным сялянам было раздадзена звыш 1 млн га зямлі, якая належала польскім памешчыкам, асаднікам і членам

вартаўнічай аховы. Вялася работа па арганізацыі розных форм кааперацыі, калгасаў і саўгасаў. Да сярэдзіны 1940 г. у заходніх абласцях рэспублікі дзейнічала 430 калгасаў, якія аб'ядноўвалі звыш 23 тыс. сялянскіх гаспадарак.

Істотныя зрухі адбываліся ў духоўна-культурнай сферы. У 1940/41 навучальным годзе тут дзейнічалі 5958 агульнаадукацыйных школ, 12 тэхнікумаў, 5 інстытутаў. Да пачатку 1941 г. было адкрыта 100 кінатэатраў, 92 дамы культуры, 220 бібліятэк.

Насельніцтва аб'яднанай Беларусі самаадданa працавала ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, умацоўвала абароназдольнасць краіны. Дзякуючы працоўнаму гераізму рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі работнікаў, Беларусь ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку, у якой да 1940 г. 80 % прадукцыі народнай гаспадаркі прыходзілася на долю прамысловасці, на палях звыш 10 тыс. калгасаў працавалі 10 413 трактароў, 1675 камбайнаў, дзесяткі тысяч іншых сельскагаспадарчых машын.

Адначасова з вызваленнем Заходняй Беларусі і далучэннем яе да БССР была вызвалена Віленшчына. На вызваленых землях наладжвалася новае жыццё. Узмацніліся эканамічныя і культурныя сувязі з БССР, былі адкрыты беларускія школы, аднавіла работу беларуская гімназія, сталі выходзіць на беларускай мове часопісы і газеты, была створана беларуская тэатральная трупа і іншыя культурныя таварыствы.

У пачатку кастрычніка 1939 г. Віленская ўправа прыняла рашэнне ўдзельнічаць у выбарах Народнага схода Заходняй Беларусі. Аднак насельніцтву Вільні і Віленшчыны ўдзельнічаць у іх не давялося. Справа ў тым, што 3 кастрычніка 1939 г. у Маскве пачаліся перагаворы паміж урадамі СССР і Ковенскай Літвы (сталіцай Літвы ў той час быў г. Коўна) адносна лёсу Віленшчыны, а 10 кастрычніка 1939 г. быў падпісаны Дагавор аб далучэнні Вільні і Віленшчыны да Літвы.

15 кастрычніка 1939 г. прадстаўнікі ўрада Літвы выехалі ў Вільню для прыняцця спраў ад савецкага камандавання і адміністрацыі, а 27 кастрычніка літоўскае войска ўступіла на тэрыторыю Віленскай вобласці. 29 кастрычніка 1939 г. у Вільні адбылася ўрачыстая цырымонія ўзняцця літоўскага флага на гары Гедыміна.

Супраць далучэння Вільні і Віленшчыны да Літвы выступіў урад Польшчы. Не падтрымалі дагавор буйныя еўрапейскія дзяржавы, у тым ліку Англія і Францыя.

Менш чым праз год пасля далучэння Віленшчыны да Літвы адбыліся новыя тэрытарыяльныя змены. 1 жніўня 1940 г. працавала VII сесія Вярхоўнага Савета СССР, на якой вырашалася пытанне аб уваходжанні Прыбалтыйскіх рэспублік у склад СССР. У выніку ад Беларусі на карысць Літвы ў лістападзе 1940 г. былі адлучаны Свянцяны (зараз Швянчоніс), Салечнікі (зараз Шальчынінкай) і курорт са стогадовай гісторыяй Друскенікі (зараз Друскенінкай), якія спрадвеку знаходзіўся ў Гродзенскай губерні. Гэта тэрыторыя складала 2600 км$^2$ з насельніцтвам 65 тыс. чалавек.

Гісторыкі выказваюць розныя меркаванні адносна тэрытарыяльных змен, праведзеных у 1939–1940 гг. Аднак большасць з іх аднадушны ў тым, што гэтыя змены праводзіліся ў палітычных мэтах.

А тым часам міжнароднае становічша працягвала ўскладняцца. Фашысцкая Германія, абараніўшы сябе дагаворам з СССР з Усходу, умацоўвала пазіцыі на Захадзе. Вясной 1940 г. яна захапіла Бельгію, Данію, Галандыю, Нарвегію, а летам пачала наступленне на Францыю і прымусіла яе капітуляваць, паставіла Англію на край нацыянальнай катастрофы, вяла паспяховыя баявыя дзеянні ў Афрыцы.

З лета 1940 г. германскае ваенна-палітычнае кіраўніцтва пачало падрыхтоўку да вайны супраць СССР. 22 чэрвеня 1940 г., у дзень падпісання акта аб капітуляцыі Францыі, Гітлер аддаў загад аб распрацоўцы плана нападзення на СССР. Гэты план “Барбароса” – маланкавай вайны і разгрому за 3–4 месяцы Савецкага Саюза – быў зацверджаны ў снежні 1940 г. У маі 1941 г. быў прыняты план “Ост” – разгорнутая праграма знішчэння і каланізацыі народаў Савецкага Саюза.

Нарастанне ваеннай пагрозы бачыла вышэйшае кіраўніцтва СССР. І хаця з боку Сталіна і яго акружэння быў дапушчаны пралік у вызначэнні тэрміну пачатку вайны, тым не менш шэраг мер па ўмацаванні абароназдольнасці СССР, яго заходніх рубяжоў, у тым ліку Беларусі, быў прыняты. Іншая справа, што некаторыя з гэтых мер былі запозненымі і частковымі.

Фарсіравана развіваліся абаронныя галіны гаспадаркі. Беларускае кіраўніцтва асаблівую ўвагу ўдзяляла ў гады апошняй перадваеннай пяцігодкі будаўніцтву ў Мінску і Магілёве авіяцыйных прадпрыемстваў, у Віцебску і Баранавічах – танкарамонтных заводаў. Войскі і тылавыя часці забяспечваліся сродкамі сувязі, павялічвалася прапускная здольнасць магістральных чыгунак, якія ішлі па тэрыторыі Заходняй асобай ваеннай акругі (ЗахАВА) да граніцы. На тэрыторыі Беларусі напярэдадні вайны былі размешчаны часці ЗахАВА і 11-й арміі Прыбалтыйскай асобай ваеннай акругі (ПрыбАВА), якія складаліся з 48 дывізій агульнай колькасцю 715 тыс. чалавек. На ўзбраенні гэтых часцей было 10,8 тыс. гармат і мінамётаў, 3,4 тыс. танкаў, 1,9 тыс. самалётаў. Але будаўніцтва прымежавых умацаванняў палявога тыпу, пераўзбраенне і перабудова ўсіх відаў войск толькі разгортваліся.

Праціўнік жа меў колькасную і якасную перавагу. У паласе ЗахАВА немцы сканцэнтравалі 51 дывізію агульнай колькасцю 1,6 млн чалавек, звыш 14,5 тыс. гармат і мінамётаў, 2 тыс. танкаў, 1,6 тыс. самалётаў.

Такім было сацыяльна-эканамічнае і ваенна-палітычнае становішча Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

## ГЛАВА 2. НАПАДЗЕННЕ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ НА СССР. АДПОР ВОРАГУ Ў ПАЧАТКОВЫ ПЕРЫЯД ВАЙНЫ

На досвітку 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія вераломна, без абяўлення вайны напала на Савецкі Саюз. Беларусь у ліку першых савецкіх рэспублік была падвергнута ўдарам ворага. Пачалася Вялікая Айчынная вайна савецкага народа супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў за свабоду сваёй Радзімы.

На вялікі жаль, сёння ёсць некаторыя так званыя "дэмакратычныя" публіцысты і гісторыкі, у іх ліку і беларускія, якія па ідэалагічных і іншых матывах беспадстаўна, без навуковых аргументаў называюць вялікую Айчынную вайну савецка-германскай, і нават германа-савецкай. Іншы раз тэрмін Вялікая Айчынная вайна не ужываецца, альбо замяняецца тэрмінам Другая сусветная вайна. Чаму?

Па-першае, канкрэтна-гістарычныя матэрыялы сведчаць аб тым, што гэта была вайна савецкага народа за свабоду і незалежнасць сваёй Айчыны. Па маштабах баявых дзеянняў, жорсткасці барацьбы, ваенна-палітычных і міжнародных выніках яна з'яўлялася сапраўды Вялікай.

Па-другое, з Савецкім Саюзам ваявала не толькі Германія, але і іншыя краіны Еўропы, далучыўшыяся да фашысцкага блоку. Таму, калі быць шчырым і прытрымлівацца навуковых падыходаў да аналізу гістарычных падзей, ніяк не назавеш гэту вайну савецка-германскай ці германа-савецкай.

Па-трэцяе, сёння ніхто не мае ні маральнага, ні юрыдычнага права называць гэты тэрмін інакш. Вайну "Вялікай Айчыннай" назвалі тыя людзі, якія ўступілі ў смяротную схватку з фашызмам, хто за кошт вялікіх ахвяр і пакут задушыў яго ва ўласным логавішчы. Таму вельмі неабходна, каб новае, маладое пакаленне нашчадкаў-пераможцаў паважала ветэранаў вайны, ушаноўвала памяць тых, хто цаной уласнага жыцця абараніў Радзіму. Трэба не ганьбіць, а ганарыцца сваёй краінай-пераможцай і рабіць усё небходнае дзеля яе далейшага росквіту.

Міжнародны імперыялізм разам з прыхільнікамі капіталістычнай рэстаўрацыі ўнутры СССР зрабіў другую спробу (першая была зроблена пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1917–1920 гг.) знішчыць савецкі дзяржаўны і грамадскі лад і аднавіць буржуазнае грамадства ў краіне.

Германія марыла авалодаць нацыянальнымі багаццямі народаў СССР і выкарыстаць іх у сваіх інтарэсах. Яна ставіла сваёй задачай фізічна знішчыць частку славянства – насельніцтва "ніжэйшай" расы, астатніх славян анямечыць і ператварыць у сваіх рабоў. У адпаведнасці з планам "Ост" 75 % насельніцтва Беларусі меркавалася знішчыць ці выселіць за Урал, 25 % анямечыць і заставіць працаваць на немцаў-каланістаў. У Мінску, напрыклад, планаваласяаставіць 100 тыс. чалавек мясцовага насельніцтва і пасяліць 50 тыс. нямецкіх каланістаў, у Гомелі – адпаведна 50 і 30 тыс., Магілёве і Бабруйску – па 50 і 20 тыс.,

у Барысаве, Лідзе і Навагрудку – па 15 тыс. мясцовага насельніцтва і 5 тыс. нямецкіх каланістаў і г.д.

Гітлер і яго кліка паабяцалі немцам “тысячагадовае квітненне рэйха”, “райскае жыццё” пасля перамогі над СССР: кожнаму – аўтамабіль (“фольксваген”), вызваленне ад падаткаў, магчымасць атрымаць на Усходзе зямлю, маёмасць і рабоў-славян.

Вялікая Айчынная вайна была састаўной і рашаючай часткай другой сусветнай вайны. Захапіўшы амаль усю Еўропу, Германія планавала, як потым абгрунтавана будзе запісана ў дакументах Нюрнбергскага працэсу, “знішчыць СССР як палітычную і ваенную дзяржаву для таго, каб расчысціць шлях для экспансіі Германіі на Усход…”.

На тэрыторыі Беларусі наступала самая моцная з трох фашысцкіх груповак вермахта – група армій “Цэнтр”, меўшая сваёй канчатковай мэтай захоп Масквы. Падтрымліваў яе 2-і паветраны флот, які налічваў 1680 самалётаў (50 % сіл усёй авіяцыі рэйха).

У першыя ж гадзіны вайны варожая авіяцыя нанесла ўдары па ваенных аб’ектах у заходняй прыгранічнай паласе на глыбіню да 400 км. Дыверсійныя групы палка “Брандэнбург”, скінутыя на парашутах у момант нападзення, павінны былі вывесці са строю сувязь і ўпраўленне войскамі. Адразу ж была знішчана большая частка савецкіх бамбардыроўшчыкаў і знішчальнікаў, якія базіраваліся на аэрадромах прыгранічных ваенных акругоў. Масавым бамбардыроўкам былі падвергнуты чыгуначныя вузлы, гарады Беласток, Брэст, Гродна, Баранавічы і інш.

У крайне неспрыяльных умовах, несучы цяжкія страты, савецкія пагранічнікі, чырвонаармейцы аказвалі рашучае, самаахвярнае супраціўленне. Гераічна трымаўся гарнізон Брэсцкай крэпасці, у які ўваходзілі прадстаўнікі больш за 30 нацый і народнасцей. Узначальвалі яго маёр П.М. Гаўрылаў і палкавы камісар Я.М. Фамін. Не маючы сувязі, вады, харчу, медыкаментаў, абаронцы крэпасці не здаваліся, пастаянна контратакавалі праціўніка, наносілі яму страты. Апошнія групы змагаліся да канца ліпеня 1941 г.

Усімі сіламі войскі Чырвонай Арміі спрабавалі стрымаць наступленне агрэсара. У першы дзень вайны ў небе Беларусі было збіта больш за 100 нямецкіх самалётаў. Пры гэтым лётчыкі Д.В. Кокараў (у раёне Замораў Беластоцкай вобл.), С.М. Гудзімаў (у раёне Пружан), П.С. Рабцаў (над Брэстам), А.С. Данілаў (каля Ліды) і іншыя таранілі варожыя самалёты ў паветры, а некалькі пазней камандзір эскадрыллі М.Ф. Гастэла і члены яго экіпажа А.А. Бурдзянюк, Р.М. Скарабагаты, А.А. Калінін здзейснілі (пад Мінскам, каля Радашковіч) наземны таран, накіраваўшы свой самалёт на скапленне варожых танкаў, аўтамашын і бензацыстэрн.

Нягледзячы на катастрафічнае становішча, савецкія воіны ўпарта супраціўляліся, хаця былі выпадкі, і аб гэтым нельга замоўчваць, панікі, разгубленасці, бязладнага адыходу.

Цяжкія бai вялі палявыя войскі Чырвонай Арміі – пехацінцы і артылерысты ў раёне Беластока, Гродна, Жабінкі, Маларыты, іншых населеных пунктаў рэспублікі, на подступах да яе сталіцы, якую абаранялі воіны двух стралковых карпусоў. Мужна трымалі абарону часці 64, 100 і 108-й стралковых дывізій пад камандаваннем адпаведна С.І. Іаўлева, І.М. Русіянава і А.І. Маўрычава. Але гераізм воінаў не мог кампенсаваць адсутнасць рэзерваў і прадуманай сістэмы абароны. Сілы былі няроўныя, і 28 чэрвеня нямецкія танкі прарвалі абарону, уварваліся ў Мінск.

На захад ад Мінска апынуліся ў акружэнні каля 350 тыс. савецкіх салдат і афіцэраў (гэта так званая "катастрофа заходней Мінска"). Такія буйнейшыя злучэнні Заходняй асобай ваеннай акругі, як 3, 4 і 10-я арміі, былі знішчаны і фактычна перасталі існаваць, што пазбавіла магчымасці стрымліваць праціўніка ў Цэнтральнай Беларусі. Частка салдат і афіцэраў, якія засталіся жывымі, трапілі ў палон, будучы цяжкапараненымі. Да канца чэрвеня 1941 г. стала відавочна, што Чырвоная Армія ў прыгранічных бітвах на тэрыторыі Беларусі аказалася не ў стане стрымаць, а тым больш разграміць атакуючыя групоўкі праціўніка. Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання як вышэйшы орган кіраўніцтва ваеннымі дзеяннямі Савецкіх Узброеных Сіл вымушана была перайсці да стратэгічнай абароны.

У гэты час хаця і са спазненнем, але быў прыняты шэраг надзвычайных мер па мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў краіны на адпор ворагу. Толькі 29 чэрвеня 1941 г. была абвешчана дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) з заклікам да партыйных і савецкіх арганізацый, усяго народа перабудаваць жыццё на ваенны лад, падпарадкаваўшы яго інтарэсам фронту. 30 чэрвеня быў утвораны Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА) на чале з І.В. Сталіным. Важную ролю адыграла выступленне І.В. Сталіна па радыё 3 ліпеня 1941 г.

У адпаведнасці з дырэктывай пачалася дадатковая мабілізацыя ваеннаабавязаных у Чырвоную Армію і перадача ёй матэрыяльных каштоўнасцей. На тэрыторыі Беларусі ў чэрвені – жніўні ў Чырвоную Армію было мабілізавана звыш 500 тыс. чалавек. Акрамя таго, часцям дзеючай арміі на працягу гэтага часу было перададзена 2,5 тыс. аўтамабіляў, 35 тыс. коней, 23 тыс. павозак, 36 тыс. галоў жывёлы, 20 тыс. т харчавання. Для барацьбы з дыверсантамі праціўніка да сярэдзіны ліпеня 1941 г. было створана 78 знішчальных батальёнаў, якія налічвалі больш за 13 тыс. чалавек. У дапамогу Чырвонай Арміі ў Віцебску, Гомелі, Магілёве, іншых гарадах і населеных пунктах былі сфарміраваны атрады і палкі народнага апалчэння ў складзе больш за 33 тыс. байцоў. Каля 2 млн чалавек было мабілізавана на будаўніцтва абарончых збудаванняў: процітанкавых равоў, дзотаў, аэрадромаў і г.д.

Важнае значэнне надавалася эвакуацыі ў глыбокі савецкі тыл мірнага насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей. У першую чаргу эвакуацыі падлягалі дзеці. У чэрвені – жніўні было вывезена 16 435 дзяцей са 191 дзіцячай установы. У тыл адпраўляліся прамысловае абсталяванне, энергетычныя ўстаноўкі, рухомы чыгуначны састаў, сыравінныя рэсурсы, маёмасць многіх

установ, грашовы фонд. Былі эвакуіраваны 60 навукова-даследчых інстытутаў, 20 вышэйшых і сярэдніх навучальных установ. Усяго на ўсход краіны было вывезена абсталяванне 224 буйных прадпрыемстваў. Да вясны 1942 г. усе перабазіраваныя на ўсход прадпрыемствы Беларусі ўвайшлі ў строй і пачалі выпускаць прадукцыю для фронту.

У краіне разгарнуўся ўсенародны рух “двухсотнікаў”, дэвізам якога было “працаваць за сябе і за таварыша, які пайшоў на фронт”. Так рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя рэспублікі разам з усімі працаўнікамі савецкага тылу кавалі зброю будучай перамогі, шлях да якой заставаўся яшчэ вельмі цяжкім і доўгім.

У ліпені – жніўні 1941 г. часці Чырвонай Арміі, ведучы цяжкія абарончыя баі, працягвалі адступаць. На пачатку ліпеня савецкае камандаванне паставіла задачу стварыць лінію абароны ўздоўж Заходняй Дзвіны і Дняпра з мэтай не дапусціць прарыву гітлераўцаў на Маскоўскім напрамку і перш за ўсё як мага больш утрымаць праціўніка на р. Бярэзіне.

Тры дні ішлі цяжкія абарончыя баі на Бярэзіне, паблізу Барысава і ў самім горадзе на шашы Мінск–Масква, дзе войскі вермахта адчулі ўсю моц нашых танкаў Т-34. Значны ўдар быў нанесены гітлераўцам пад Оршай, дзе 14 ліпеня супраць іх былі прыменены “кацюшы” (рэактыўныя мінамёты батарэі капітана І.А. Флёрава). Сур’ёзны контрудар нанеслі нашы войскі ў адной з буйнейшых танкавых бітваў пад Сянно і Лепелем. Каля тыдня цягнуліся баі за Віцебск.

23 дні (з 4 па 27 ліпеня) савецкія войскі стрымлівалі націск танкавай групы Гудэрыяна на дняпроўскіх рубяжах, у раёне Магілёва. Больш месяца ішлі баі за Гомель.

Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі, нягледзячы на гераічнае супраціўленне часцей Чырвонай Арміі, была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У чым жа прычыны паражэння савецкіх войск у пачатку вайны, у тым ліку ў Беларусі? Яны абумоўлены агульным станам Чырвонай Арміі, і ў тым ліку Заходняй асобай ваеннай акругі (у чэрвені 1941 г. ператворана ў Заходні фронт), да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

***Па-першае***, выявілася перавага эканамічнага патэнцыялу Германіі. У 1940 г. Савецкая краіна мела 18,3 млн т сталі, Германія разам з саюзнікамі і захопленымі краінамі – 46,3 млн т, па чыгуну гэтыя суадносіны складалі адпаведна 15 і 25 млн т, па вугалю 165 і 348 млн т, па электраэнергіі – 49 і 110 млрд кВт·гадз.

***Па-другое***, гітлераўцы выкарысталі такія часовыя перавагі, як мілітарызацыя эканомікі, працяглая падрыхтоўка да захопніцкай вайны, якасць узброенасці войск, загадзя сканцэнтраваных у пагранічнай паласе. Мы мелі большую колькасць танкаў і самалётаў, але яны былі ў сваёй масе ўстарэлыя. Новыя тыпы ваеннай тэхнікі толькі пачалі паступаць на ўзбраенне Чырвонай Арміі, асабовы склад недастаткова іх асвоіў.

***Па-трэцяе***, цяжка адбіліся на баяздольнасці Чырвонай Арміі масавыя парушэнні законнасці ў канцы 30-х гадоў. Толькі з мая 1937 г. па верасень 1938 г. былі рэпрэсіраваны 39761 камандзір і палітработнік. Арыштавана і пакарана амаль палова персаналу Генштаба, усе камандуючыя ваенных акругоў, 80 % кіруючага складу карпусоў і дывізій, 91 % камандзіраў палкоў, іх намеснікаў і начальнікаў штабоў. Гэту акалічнасць ведалі гітлераўскія вярхі, калі прымалі рашэнне аб паскарэнні пачатку вайны супраць СССР. “Без трыццаць сёмага года, – сцвярджаў маршал А.М. Васілеўскі, – магчыма, і не было б увогуле вайны”.

***Па-чацвёртае***, крайне негатыўную ролю адыгралі пралікі Сталіна і яго бліжэйшага акружэння ў ацэнцы ваенна-стратэгічнай абстаноўкі і вызначэнні магчымага тэрміну нападзення Германіі на СССР. Сталін ведаў, што да вялікай вайны мы не гатовы, і ўсяляк імкнуўся не даць Гітлеру падставы для нападзення, разлічваў, што Германія не адважыцца на вайну без разгрому Англіі і без захопу запасаў паліва на Блізкім і Далёкім Усходзе. Ён недаацэньваў шматлікія папярэджанні савецкай разведкі аб фашысцкай пагрозе, не даў дазволу на прывядзенне войск прыгранічных акругоў у баявую гатоўнасць.

Нягледзячы на паражэнні Чырвонай Арміі летам 1941 г., фашысцкі стратэгічны план “маланкавай вайны” быў сарваны. Цяжкія, кровапралітныя абарончыя баі савецкіх войск на Беларусі далі магчымасць сканцэнтраваць рэзервы для абароны Масквы і разгрому там гітлераўскіх войск.

## ГЛАВА 3. АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ КАЛАБАРАЦЫЯНІСТАЎ

Тэрыторыя Беларусі, цалкам ці часткова, знаходзілася пад акупацыяй з чэрвеня 1941 г. да ліпеня 1944 г.

Акупацыйны рэжым у Беларусі – гэта сістэма палітычных, эканамічных, ваенных і ідэалагічных мер, накіраваных на ліквідацыю савецкага грамадска-дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, зняволенне і знішчэнне беларускага народа. Акупацыйная палітыка была вынікам дзяржаўнага курса фашысцкай Германіі, распрацаванага ў дырэктыўных дакументах і праграмных выступленнях нацысцкіх кіраўнікоў.

Ідэалагічнай асновай акупацыйнай палітыкі былі чалавеканенавісніцкія тэорыі нацыстаў: аб “расавай перавазе” нямецкай нацыі над усімі іншымі; аб “гістарычнай неабходнасці” пашырэння “жыццёвай прасторы” для немцаў і іх “неад’емным праве” на сусветнае панаванне.

У адпаведнасці з планам “Барбароса” акупанты знішчылі дзяржаўнасць беларускага народа і тэрытарыяльную цэласнасць рэспублікі. Беларусь была падзелена на асобныя часткі:

- паўночна-заходнія раёны Брэсцкай і Беластоцкай абласцей з гарадамі Гродна і Ваўкавыск былі перададзены Усходняй Прусіі;

- паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей былі ўключаны ў склад рэйхскамісарыята “Украіна”;
- паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі далучаны да генеральнай акругі Літвы;
- тэрыторыя Віцебскай і Магілёўскай абласцей, большая частка Гомельскай і ўсходнія раёны Мінскай вобласці былі ўключаны ў зону армейскага тылу групы армій “Цэнтр”, дзе ўсе адміністрацыйныя функцыі выконвала ваеннае камандаванне;
- Баранавіцкая, Вілейская (без паўночна-заходніх раёнаў), Мінская (без усходніх раёнаў) вобласці, паўночныя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай абласцей склалі “генеральбецырк Беларутэнія” – генеральную акругу Беларусі.

Тэрыторыя генеральнай акругі Беларусі, якая складала прыкладна 1/3 тэрыторыі БССР, была ўключана ў рэйхскамісарыят “Остланд” з рэзідэнцыяй у Рызе і падзелена на 10 “гебітаў” (акругоў). Для кіраўніцтва генеральнай акругай, акругамі і раёнамі ствараўся жорстка цэнтралізаваны адміністрацыйны апарат гітлераўцаў.

На чале генеральнай акругі Беларусі стаяў генеральны камісарыят, які ўзначальваў адзін з паплечнікаў Гітлера гаўляйтар Вільгельм Кубэ. Ён праводзіў чалавеканенавісніцкую палітыку нацызму. Пасля знішчэння Кубэ мінскімі падпольшчыкамі 22 верасня 1943 г. яго месца заняў групенфюрэр войск СС Курт фон Готберг.

Фашысты зацвердзілі бела-чырвона-белы сцяг і герб “Пагоня” – сімвалы эміgranцкага ўрада БНР, якія супрацоўнічаў з немцамі. Зрабіў гэта гаўляйтар Беларусі Кубэ: “Колеры бела-чырвона-бела павінны быць у будучым прыкметай Беларутэніі”.

Кіраванне акругамі ажыццяўлялі гебітскамісары, гарадамі – штатскамісары, раёнамі – ортскамісары. Для стварэння ўяўнага выгляду самакіравання і ўзмацнення ўплыву на насельніцтва з мясцовых жыхароў арганізоўваліся гарадскія, раённыя і павятовыя ўправы, а ў вёсках прызначаліся старасты, солтысы, войты.

Пры стварэнні фашысцкай акупацыйнай адміністрацыі і паліцэйскіх фарміраванняў немцы выкарыстоўвалі беларускіх нацыяналістаў. З розных краін Еўропы гітлераўцы прывозілі да нас сваіх прыслужнікаў беларускага паходжання, якія пачыналі кар’еру яшчэ ў перыяд Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918–1920 гг.

Уся паўната ўлады належала фашысцкай ваеннай і цывільнай акупацыйнай адміністрацыі. Галоўным сродкам падтрымання “новага парадку” былі войскі і розныя службы: СС (ахоўныя атрады); СА (штурмавыя групы); СД (служба бяспекі, галоўны орган разведкі і контрразведкі); гестапа (палітычная паліцыя); жандармерыя і інш.

Генеральны план “Ост” вызначаў праграму каланізацыі захопленых тэрыторый, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы.

Галоўным сродкам ажыццяўлення генеральнага плана "Ост" з'яўлялася палітыка генацыду – планамернага знішчэння цэлых груп насельніцтва па тых ці іншых матывах: з-за прыналежнасці да савецкіх актывістаў, камуністаў, яўрэяў і г.д. Для рэалізацыі гэтага плана гітлераўцы выкарыстоўвалі цэлую сістэму мер: заложніцтва, аблавы, пагромы, турмы, карныя аперацыі, лагеры смерці і інш.

У межах рэспублікі было арганізавана 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў, з якіх мала хто вярнуўся жывым. Вязняў трымалі пад адкрытым небам, марылі голадам, заражалі інфекцыйнымі хваробамі, катавалі. У Мінску і яго ваколіцах было размешчана 5 такіх лагераў, адзін з якіх – Трасцянецкі – па колькасці знішчаных людзей стаяў на трэцім месцы пасля Асвенціма і Майданака. Напярэдадні наступлення савецкіх войск гітлераўцы практыкавалі стварэнне на пярэднім краі сваёй абароны спецыяльных лагераў смерці, у якіх размяшчалі інфекцыйных хворых з мэтай масавага распаўсюджвання цяжкіх захворванняў сярод насельніцтва і часцей Чырвонай Арміі.

На тэрыторыі Беларусі было больш за 100 гета, у якія гітлераўцы сагналі сотні тысяч яўрэяў, як жыхароў рэспублікі, так і яўрэяў з Польшчы, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Францыі, Галандыі, Венгрыі, Германіі і іншых краін. 21–23 кастрычніка 1943 г. было здзейснена адно з самых крывавых злачынстваў фашызму – масавае знішчэнне яўрэяў у мінскім гета і ў Трасцянецкім лагеры смерці, дзе загінула амаль што 100 тыс. яўрэяў.

Канцлагеры, турмы, гета дзейнічалі практычна ў кожным раёне Беларусі. Паступова працэс знішчэння сваіх ахвяр гітлераўцы механізавалі: атручвалі ў спецыяльна прыстасаваных для гэтага памяшканнях – "gaswagen" (душагубках). Жорсткай расправе падлягалі ваеннаслужачыя, да якіх гітлераўцы адносілі практыччна ўсіх мужчын ва ўзросце 16–55 гадоў, што знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад раёнаў ваенных дзеянняў.

Нечуваныя зверствы чынілі акупанты над партызанамі і мірным насельніцтвам. Пад выглядам барацьбы з партызанамі яны правялі больш за 140 карных экспедыцый, у ходзе якіх цэлыя раёны Беларусі ператвараліся ў зоны пустыні. 22 сакавіка 1943 г. былі спалены 149 жыхароў, у тым ліку 76 дзяцей, в. Хатынь Лагойскага раёна Мінскай вобласці. За гады акупацыі ў Беларусі разам з жыхарамі спалена 628 вёсак, 186 з якіх так і не адноўлены пасля вайны.

Палітыка каланізацыі і генацыду ўключала і гвалтоўны вываз савецкіх людзей на катаржныя работы ў Германію. Угон беларускага насельніцтва насіў масавы, планамерны характар і меў пэўныя мэты. На Нюрнбергскім судовым працэсе над нямецкімі ваеннымі злачынцамі быў прадстаўлены гітлераўскі сакрэтны мемарандум ад 12 мая 1944 г., у якім прама адзначалася, што намечаная адпраўка з Беларусі ў Германію 40–50 тыс. падлеткаў ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў "мае мэту не толькі прадухіліць умацаванне ваеннай сілы ворага, але таксама скараціць яго біялагічны патэнцыял у будучым". За час акупацыі з Беларусі было вывезена 380 тыс. чалавек, у тым ліку больш за 24 тыс. дзяцей. Вярнулася ж дамоў пасля перамогі каля 120 тыс. чалавек.

Ахвярамі нямецка-фашысцкай “палітыкі генацыду і выпаленай зямлі” стала чвэрць насельніцтва Беларусі. Усяго ў рэспубліцы, як ужо гаварылася, было знішчана больш за 2 млн 200 тыс. чалавек.

У галіне эканомікі акупацыйны рэжым прынёс працоўным Беларусі страшэнную галечу, звышэксплуатацыю, адкрытае рабаванне матэрыяльных каштоўнасцей. Эканамічная палітыка на захопленай тэрыторыі Беларусі насіла каланіяльны характар. Для грабяжу і падрыву гаспадарчага патэнцыялу рэспублікі быў створаны спецыяльны штаб “Ольдэнбург” з вялікім штатам інспекцый, атрадаў для збору прадукцыі вытворчасці і сыравіны. Гітлераўцы вывозілі ў Германію найбольш каштоўнае абсталяванне фабрык, заводаў, электрастанцый, сельгастэхніку, прадукты харчавання, лясныя і тарфяныя багацці. Сістэматычна яны грабілі і асабістую ўласнасць насельніцтва.

За гады акупацыі Беларусі ў Германію было вывезена 90 % станочнага і тэхнічнага абсталявання, 96 % энергетычных магутнасцей, 18,5 тыс. аўтамашын, больш за 9 тыс. трактароў і цягачоў, 1100 камбайнаў.

Акупацыйныя ўлады і штаб “Ольдэнбург” у інтарэсах Германіі, вермахта арганізоўвалі работу часткі прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, гандлю. Усяго ж у гады вайны на тэрыторыі нашай рэспублікі дзейнічала каля 60 прадпрыемстваў пераважна металаапрацоўчай, мясцовай, лёгкай і харчовай прамысловасці.

На гэтых прадпрыемствах рабочыя працавалі ў прымусовым парадку, праз абавязковую рэгістрацыю на біржах працы. Працоўны дзень доўжыўся 10–12 гадзін. За розныя правіннасці, за сабатаж білі, саджалі у карцэр, адпраўлялі у канцлагер. Рацыён харчавання працоўнага ўключаў 200 г хлеба на дзень і 10 г солі.

На ўсім працягу акупацыі гітлераўцы бязлітасна рабавалі беларускае сялянства. Яны разрабавалі 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасы, 316 МТС. У Германію было вывезена, паводле няпоўных даных, больш за 1,6 млн т збожжа, 426 тыс. т мукі, 3 млн т бульбы і гародніны. Працаўнікі вёскі, як і жыхары гарадоў, плацілі шматлікія падаткі. Усё насельніцтва ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў у абавязковым парадку прыцягвалася да прымусовых работ на будаўніцтва абарончых аб’ектаў, мастоў, дарог і г.д.

Імкнучыся духоўна заняволіць народ, гітлераўцы разрабавалі ўсе ВНУ, НДІ, АН БССР, Беларускі дзяржаўны гістарычны музей, Дзяржаўную карцінную галерэю, знішчылі тысячы помнікаў старажытнасці, гісторыі, культуры, архітэктуры Беларусі, разбурылі музеі, тэатры, клубы, больш за 7 тыс. школьных будынкаў і г.д.

З дапамогай спецыяльна створаных школ, газет, часопісаў, радыё, кіно і іншых сродкаў агітацыі і прапаганды гітлераўцы імкнуліся прывіць насельніцтву Беларусі дух пакорнасці, паслушэнства, развіць нацыянальную варожасць, зламаць іх волю да барацьбы за незалежнасць, супраць фашысцкай Германіі.

Каб раскалоць адзінства беларускага народа, знайсці ў яго апору, гітлераўцы спрабавалі ствараць нацыяналістычныя арганізацыі. Так, 22 кастрычніка 1941 г. была створана Беларуская народная самапомач (БНС). Яе статут быў зацверджаны Кубэ. БНС дамагалася прызнання за сабой права на самакіраванне і рабіла спробы стварыць сваё ваенізаванае фарміраванне – Беларускі корпус самааховы (БКС).

З дазволу акупантаў у чэрвені 1943 г. быў створаны Саюз беларускай моладзі (СБМ), які аб'ядноўваў каля 8 тыс. юнакоў і дзяўчат. Кіраўнікі трэцяга рэйха імкнуліся рыхтаваць юнакоў да службы ў вермахце, былі сфарміраваны нават роты СС для барацьбы з партызанамі. Саюз беларускай моладзі ў многім нагадваў нямецкі "Гітлерюгенд".

У снежні 1943 г. была створана Беларуская цэнтральная рада (БЦР). Рада ставіла мэтай мабілізацыю ўсіх сіл беларускага народа для знішчэння бальшавізму і працавала па зацверджанаму Генеральным камісарам Беларусі Готбергам статуту.

Падпарадкаваныя Радзе ці створаныя ёю мясцовыя арганізацыі і саюзы – Беларуская самапомач, Саюз беларускай моладзі, Беларускае культурнае аб'яднанне, Беларуская краёвая абарона (БКА) і іншыя садзейнічалі ажыццяўленню нацысцкай акупацыйнай палітыкі.

У сакавіку 1944 г., калі войскі Германіі апынуліся ў катастрафічным становішчы, акупанты дазволілі стварыць у Беларусі большыя, чым раней, узброеныя нацыянальныя фарміраванні. Было арганізавана 55 батальёнаў Беларускай краёвай абароны. Але шырока разгарнуць сваю дзейнасць БЦР, БКА ўжо не ўдалося. Чырвоная армія пачынала падрыхтоўку аперацыі па вызваленні Беларусі.

У гэтых умовах у акупіраваным Мінску 27 чэрвеня 1944 г., за шэсць дзён да вызвалення горада савецкімі войскамі, быў скліканы II Усебеларускі кангрэс (I з'езд (кангрэс) адбыўся ў снежні 1917 г.). Кангрэс абвясціў сябе "паўнапраўным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа" і выказаўся за аддзяленне Беларусі ад СССР.

Спроба стварэння беларускай дзяржаўнасці з дапамогай акупантаў не мела рэальнасці. Калі ў час работы кангрэса стала вядома, што Чырвоная Армія зрабіла прарыў нямецкіх войск і імкліва рухаецца на Мінск, СС выдзелілі спецыяльны цягнік для эвакуацыі сваіх памагатых і членаў іх сем'яў.

Такім чынам, у час вайны гітлераўцы імкнуліся шырока выкарыстоўваць у сваіх мэтах мясцовае насельніцтва, прымушаючы яго супрацоўнічаць з імі. Гэта з'ява ў 1953 г. атрымала назву калабарацыя (ад французскага ccolloboration – супрацоўніцтва). Савецкі ваенна-гістарычны слоўнік тлумачыць калабарацыю як здраду сваёй радзіме і пераход на шлях супрацоўніцтва з ворагам.

У склад беларускіх калабарацыяністаў уваходзілі палітычныя сілы, якія знаходзіліся ў апазіцыі да камуністычнай партыі і савецкай улады, а таксама тыя асобы, якія свядома пайшлі на службу да фашыстаў. У склад калабарацыяністаў уваходзілі і тыя, хто абставінамі лёсу, часцей за ўсё

метадамі гвалту і запалохвання, былі прымушаны пайсці на службу да акупантаў і такім чынам пазбаўлены іншага выбару. Калабарацыяністы разлічвалі “тварыць самастойную Беларусь” пад эгідай гітлераўскага рэйха. Да моманту вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на яе тэрыторыі дзейнічалі больш за 35 тыс. актыўных членаў розных калабарацыянісцкіх арганізацый. Уся іх дзейнасць кантралявалася гітлераўцамі.

## ГЛАВА 4. БАРАЦЬБА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

З першых дзён вайны асноўная частка насельніцтва Беларусі стала на шлях барацьбы супраць акупантаў. Гэта была барацьба за свабоду і незалежнасць савецкай Радзімы. Жорсткасць акупацыйнага рэжыму толькі ўзмацняла нянавісць да нямецка-фашысцкіх захопнікаў, супраціўленне станавілася ўсё больш упартым і непрымірымым. Арганізатарамі яго ў пачатковы перыяд вайны былі не толькі дзяржаўныя і партыйныя органы, кіруючыя партработнікі, але і радавыя грамадзяне рэспублікі. Партызанскія атрады і групы часта ўзнікалі на базе народнага апалчэння, знішчальных батальёнаў, аснову многіх партызанскіх падраздзяленняў складалі камандзіры і байцы Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў тыле гітлераўскіх войск.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны быў сфарміраваны і ўступіў у барацьбу з ворагам Пінскі партызанскі атрад, які ўзначаліў В.З. Корж. У гэты ж час пачаў дзейнічаць атрад пад кіраўніцтвам Ц.П. Бумажкова і Ф.І. Паўлоўскага ў Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці. У ліпені 1941 г. рабочыя кардоннай фабрыкі ў пасёлку Пудаць Суражскага раёна Віцебскай вобласці стварылі атрад, які ўзначаліў дырэктар фабрыкі М.П. Шмыроў (бацька Мінай).

На захопленай ворагам тэрыторыі стваралася сетка падпольных цэнтраў, арганізацый і груп. Важную ролю ў станаўленні і ўмацаванні падполля і партызанскага руху адыгралі першыя падпольныя партыйныя камітэты: Пінскі, Гомельскі і Мінскі абкомы, Мінскі і Гомельскі гаркомы, Багушэўскі, Барысаўскі, Ельскі, Лоеўскі, Петрыкаўскі, Рагачоўскі, Расонскі, Рудзянскі, Чэрыкаўскі, Чырвонаслабодскі і іншыя райкомы.

Гераічнай і трагічнай старонкай ў гісторыю барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў увайшло Мінскае падполле, арганізатарамі якога былі І.К. Кавалёў, І.П. Казінец, У.С. Амельянюк, І.І. Матусевіч і інш. З першых дзён акупацыі Мінска, які гітлераўцы ахрысцілі “страляючым горадам”, падпольшчыкі ажыццяўлялі дыверсіі на чыгуначным вузле, прадпрыемствах і ў фашысцкіх установах, збіралі і перадавалі цераз сувязных у партызанскія атрады зброю, медыкаменты, звесткі аб руху нямецкіх ваенных эшалонаў, планы размяшчэння ваенных аб’ектаў у горадзе і г.д. Самаахвярна змагаліся з ворагам падпольшчыкі Магілёва, Віцебска, Оршы, Жлобіна, Брэста, Гродна і іншых гарадоў і пасёлкаў рэспублікі.

Да канца 1941 г. у Беларусі, паводле няпоўных даных, былі арганізаваны і дзейнічалі 247 партызанскіх атрадаў і падпольных груп. Аднак у першыя месяцы вайны партызаны не мелі патрэбнай падрыхтоўкі, матэрыяльнага забеспячэння, узаемадзеяння з вайсковым камандаваннем і г.д.

Вялікі ўплыў на ўздым народнага руху супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў аказала бітва пад Масквой. Контрнаступленне савецкіх войск пад Масквой перайшло ў агульнае наступленне па ўсяму фронту і працягвалася да красавіка 1942 г. У канцы 1941 г. – пачатку 1942 г. савецкія войскі выйшлі да граніцы Беларусі, і з імі на Віцебскім напрамку ў непасрэднае ўзаемадзеянне ўступілі партызанскія атрады Я.З. Захарава, Д.Ф. Райцава, М.П. Шмырова і інш. У выніку сумесных дзеянняў часцей Чырвонай Арміі Калінінскага фронту і партызанскіх атрадаў быў вызвалены тракт Усвяты–Сураж і ўтвораны 40-кіламетровы праход у лініі нямецкага фронту (“Суражскія”, альбо “Віцебскія”, вароты). Цераз іх на акупіраваную ворагам тэрыторыю з Вялікай зямлі накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, узбраенне, боепрыпасы і інш.

Расла колькасць і актыўнасць народных мсціўцаў. Гэта дало магчымасць на базе асобных атрадаў стварыць буйныя партызанскія фарміраванні – брыгады і злучэнні, баявыя дзеянні якіх каардынаваліся з войскамі Чырвонай Арміі. Для кіраўніцтва ўсімі партызанскімі сіламі краіны пастановай Дзяржаўнага Камітэта Абароны ад 30 мая 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, які ўзначаліў сакратар ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка. Некалькі пазней былі арганізаваны Беларускі, Украінскі і іншыя штабы партызанскага руху.

Удасканальвалася і аператыўнае кіраўніцтва падпольнымі арганізацыямі і партызанскімі фарміраваннямі. У савецкім тыле была створана спецыяльная школа (Асобы беларускі збор) для падрыхтоўкі падпольшчыкаў і партызан. Важную ролю ва ўмацаванні шэрагаў партызан адыграла “Партызанская прысяга”, тэкст якой быў зацверджаны ЦК КП(б)Б у маі 1942 г.

У рабоце сярод насельніцтва вялікае значэнне надавалася сродкам масавай інфармацыі і распаўсюджванню цэнтральных газет, зводак Саўінфармбюро, выданню падпольных газет і лістовак. У маі 1942 г. мінскія падпольшчыкі выпусцілі першы нумар газеты “Звязда”. У пачатку 1943 г. было адноўлена выданне “Звязды” як цэнтральнага органа КП(б)Б. Усяго ў акупіраванай Беларусі выдавалася больш за 170 падпольных часопісаў і газет.

Асабліва прыкметна актывізаваўся партызанскі рух у сувязі з умацаваннем дзеючых падпольных камітэтаў і пашырэннем іх сеткі. Узначальвалі барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі акупіраванай Беларусі 203 абкомы, міжрайкомы, міжрайпартцэнтры, гаркомы і райкомы Кампартыі Беларусі, больш за 1200 пярвічных партарганізацый. Значны ўклад у барацьбу ўносіла камсамольскае падполле, узначальваемае М.В. Зімяніным, К.Т. Мазуравым, С.В. Прытыцкім. Яно ўключала 224 абласныя, міжраённыя, гарадскія і раённыя камітэты камсамола і больш за 5,5 тыс. пярвічных

камсамольскіх арганізацый, у якіх было аб’яднана звыш 100 тыс. юнакоў і дзяўчат.

У заходніх абласцях Беларусі барацьбу з акупантамі вялі антыфашысцкія камітэты, арганізацыі, групы, якія аб’ядноўвалі больш за 12 тыс. чалавек. Яны распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі для партызан зброю, боепрыпасы, прадукты харчавання.

Такім чынам, нарастала ўсенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, загартоўваўся партызанскі рух, узмацнілася баявая дзейнасць партызан. Калі ў снежні 1941 г. у Беларусі змагаліся 50 партызанскіх атрадаў, то ў лістападзе 1942 г. – 352, а ў час бітвы на Курскай дузе ў ліпені 1943 г. – 658 атрадаў.

Партызанскі рух на Беларусі з’яўляўся сапраўды ўсенародным: 1255 партызанскіх атрадаў аб’ядноўваліся ў 213 брыгад з колькасцю звыш 370 тыс. чалавек. У гарадах і вёсках барацьбу з акупантамі вялі патрыёты-падпольшчыкі. У мінскім падполлі змагалася звыш 9 тыс. патрыётаў. Толькі ў другой палове 1943 г. яны правялі больш за 50 дыверсій, у тым ліку дыверсійную акцыю, у выніку якой быў знішчаны генеральны камісар Беларусі В. Кубэ. Прысуд над ім выканалі беларускія патрыёты А. Мазанік і М. Осіпава.

У ноч на 30 ліпеня 1943 г. на Асіповіцкім чыгуначным вузле Ф. Крыловіч узарваў дзвюма магнітнымі мінамі эшалон з гаручым, у выніку чаго ўзнік пажар, які знішчыў 4 эшалоны, у тым ліку 1 з танкамі “Тыгр”, 63 вагоны са снарадамі, авіябомбамі, мінамі, 31 цыстэрну з гаручым. Былі таксама пашкоджаны вугальны склад, блокпост, дэпо. Гэта – адна з найбуйнейшых дыверсійных аперацый другой сусветнай вайны.

Яшчэ ў часы вайны стаў шырока вядомым подзвіг К.С. Заслонава – падпольшчыка з Оршы, В.З. Харужай з Віцебска, патрыётаў з Обаля, Скідзеля, іншых населеных пунктаў. Усяго ў Беларусі дзейнічала пад кіраўніцтвам падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый 70 тыс. падпольшчыкаў.

Магутны партызанскі рух і гераічная барацьба падпольшчыкаў умацоўвалі веру насельніцтва ў перамогу, падрывалі і разладжвалі тыл гітлераўскай арміі, трымалі акупантаў у страху і напружанні.

Галоўныя ўдары беларускія партызаны і падпольшчыкі наносілі па варожых камунікацыях. З 1942 г. партызаны ўстанавілі кантроль за рухам на магістралях Брэст–Гомель, Мінск–Орша і інш.

Грандыёзнай па маштабах і эфектыўнай па выніках была “рэйкавая вайна” – масавы падрыў чыгунак з мэтай дэзарганізацыі ваенных перавозак для гітлераўскай арміі. Першы этап яе пачаўся ў час контрнаступлення савецкіх войск пад Курскам і працягваўся з 3 жніўня да сярэдзіны верасня 1943 г. У другой палове верасня – кастрычніку 1943 г., калі Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі, прайшоў другі этап “рэйкавай вайны”. У выніку двух этапаў перавозкі для групы армій “Цэнтр” значна скараціліся, да таго ж праціўнік вымушаны быў павялічыць колькасць дывізій для аховы сваіх камунікацый. Трэці этап “рэйкавай вайны”, які праводзіўся напярэдадні і ў

ходзе вызвалення Беларусі, таксама меў важнае аператыўна-стратэгічнае значэнне.

Партызаны кантралявалі многія шашэйныя і амаль усе грунтавыя дарогі, грамілі штабы, склады і гарнізоны захопнікаў. Толькі ў 1943 г. было знішчана больш за 300 варожых гарнізонаў, 217 паліцэйскіх участкаў і валасных упраў.

Значны ўрон акупантам наносілі партызанскія рэйды, якія не толькі дэзарганізоўвалі тыл праціўніка, але і садзейнічалі развіццю партызанскага руху.

Рэйды партызанскіх фарміраванняў займалі важнае месца ў разгортванні партызанскага руху ў заходніх абласцях Беларусі. Да зімы 1943/44 г. баявымі рэйдамі выйшлі ў заходнія вобласці рэспублікі 12 брыгад, 14 асобных атрадаў, больш за 7 тыс. партызан. Партызанскія фарміраванні замацаваліся ў Баранавіцкай, Брэсцкай, Вілейскай, Беластоцкай абласцях і разам з мясцовымі партызанамі ўтварылі ўздоўж заходніх граніц Беларусі амаль суцэльны партызанскі фронт.

У ходзе барацьбы з ворагам партызанскія атрады і брыгады вызвалілі тысячы населеных пунктаў, у тым ліку шэраг райцэнтраў. На вызваленай тэрыторыі ўтварыліся партызанскія зоны. Першыя з іх на Беларусі ўзніклі ўвосень 1941 г. У канцы 1943 г. партызаны кантралявалі ўжо каля 58 % тэрыторыі рэспублікі. Існавала больш за 20 партызанскіх зон: Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Клічаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская, Івянецка-Налібоцкая, Сенненска-Аршанская, Суражская і інш.

Аб’яднанымі сіламі беларускіх, рускіх, украінскіх, латышскіх і літоўскіх партызан былі створаны партызанскія зоны ў раёнах Беларусі, сумежных з суседнімі рэспублікамі. У выніку аб’яднання некаторых з іх утварыліся партызанскія краі. Адзін з такіх краёў дзейнічаў на стыку БССР, РСФСР і Латвіі і ахопліваў 14 раёнаў на плошчы 10 тыс. км$^2$ з насельніцтвам больш за 200 тыс. чалавек. Вялікі партызанскі край існаваў таксама ў міжрэччы Дняпра, Прыпяці і Дзясны.

Кіраўніцтва ўсёй дзейнасцю насельніцтва і партызан на тэрыторыі партызанскіх зон ажыццяўлялі падпольныя абкомы і райкомы партыі. Яны абапіраліся на ўзброеныя сілы партызанскіх злучэнняў і насельніцтва, аднаўлялі ў вызваленых раёнах савецкую ўладу. У многіх раёнах былі адноўлены, створаны і дзейнічалі выканкомы Саветаў дэпутатаў працоўных. Ролю і функцыі органаў савецкай улады выконвалі найчасцей партызанскія атрады, спецыяльна створаныя народнымі мсціўцамі камендатуры, якія вырашалі гаспадарчыя і іншыя пытанні.

Партызанскія зоны станавіліся сапраўднымі баявымі фарпостамі ўсенароднага супраціўлення ворагу, базай і своеасаблівым тылам, дзе партызаны прымалі самалёты з Вялікай зямлі, рыхтавалі рэзервы. Партызаны праводзілі сярод насельніцтва масава-палітычную работу, распаўсюджвалі газеты, лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро. У некаторых партызанскіх зонах

працавалі школы, медыцынскія пункты, якія абслугоўвалі партызан і насельніцтва. Сам факт існавання ў глыбокім тыле ворага партызанскіх зон меў важнае палітычнае значэнне, садзейнічаў росту ўсенароднага супраціўлення гітлераўцам.

Партызаны, падпольшчыкі не здолелі б адны весці паспяховую барацьбу, калі б не дапамога большасці насельніцтва Беларусі, якое ўсімі сродкамі і сіламі супраціўлялася ваенным, эканамічным і палітычным мерапрыемствам акупантаў, падтрымлівала народных мсціўцаў. Мірныя жыхары забяспечвалі партызан харчаваннем, адзеннем, абуткам, збіралі зброю і боепрыпасы, выконвалі абавязкі сувязных і разведчыкаў, а нярэдка прымалі непасрэдны ўдзел у баявых аперацыях супраць акупантаў.

За тры гады гераічнай барацьбы ў тыле ворага, з чэрвеня 1941 г. да ліпеня 1944 г., патрыёты Беларусі нанеслі вялікі ўрон акупантам у тэхніцы і жывой сіле. Яны знішчылі амаль паўмільёна гітлераўцаў і паліцэйскіх. Было пушчана пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронепаязды, разгромлена 29 чыгуначных станцый, 948 гарнізонаў і штабоў, падарвана і спалена 18 700 аўтамашын, 939 ваенных складоў, 819 чыгуначных і 4710 іншых мастоў, збіта 305 самалётаў, падбіта 1355 танкаў і бронемашын, захоплена вялікая колькасць трафеяў. Нездарма гітлераўскі намеснік у Беларусі В. Кубэ дакладваў у Берлін, што ў тыле арміі “Цэнтр” фактычна існуе другі фронт – партызанскі.

За мужнасць і адвагу больш як 140 тыс. беларускіх партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, а 88 з іх, у тым ліку Ц.П. Бумажкову, Ф.І. Паўлоўскаму (першым з савецкіх партызан), М.П. Шмырову, І.П. Казінцу, К.С. Заслонаву, В.І. Казлову, У.Е. Лабанку, П.М. Машэраву, Ефрасінні Зяньковай, Марату Казею, прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Аднак беларусы добра ведаюць, што адным ім, без дапамогі і падтрымкі ўсіх народаў Савецкага Саюза і іншых краін, не ўдалося б выжыць у той страшэннай вайне. З савецкага тылу партызаны атрымлівалі сродкі сувязі, медыкаменты, узбраенне і г.д. Толькі з лета 1942 г. па сакавік 1944 г. з-за лініі фронту было перапраўлена 80 тыс. вінтовак, аўтаматаў, кулямётаў, 100 млн патронаў да іх, 400 т узрыўчаткі. Савецкія ваенныя лётчыкі вывезлі з варожага тылу больш за 11 тыс. беларускіх дзяцей і раненых партызан. У злучэннях беларускіх партызан ваявалі 100 тыс. рускіх, дзесяткі тысяч украінцаў, тысячы латышоў, эстонцаў, грузін, армян, азербайджанцаў – прадстаўнікоў амаль усіх нацыянальнасцей Савецкага Саюза.

На тэрыторыі Беларусі змагаліся і прадстаўнікі народаў іншых краін – палякі, чэхі, славакі, венгры, бельгійцы, аўстрыйцы, галандцы, італьянцы, немцы і інш. Усяго на тэрыторыі Беларусі змагаліся каля 4 тыс. замежных антыфашыстаў.

Аналіз сацыяльнага і нацыянальнага складу партызан Беларусі паказвае, што іх касцяк складалі сяляне і рабочыя – 56,1 %, служачых было 20,5 %, навучэнцаў – 12,2, вайскоўцаў – 11,2 %. Пры гэтым моладзь да 25 гадоў уключна складала 54 %. Беларусаў сярод партызан было 71,1 %.

# ГЛАВА 5. ДЗЕЙНАСЦЬ ВАЕННЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ І АРГАНІЗАЦЫІ ЎКРАІНСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ. РУСКАЯ ВЫЗВАЛЕНЧАЯ АРМІЯ

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 14 тыс. чалавек польскай Арміі Краёвай (АК – акаўцаў) і 12 тыс. чалавек Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН – аўнаўцаў). Хто ж такія акаўцы і аўнаўцы?

Кіраўніцтва Польшчы ў эміграцыі ў Лондане, а таксама польскія буржуазныя партыі, якія дзейнічалі ў падполлі, афіцэрства і каталіцкае духавенства расцэньвалі дзеянні СССР і Германіі як несправядлівыя і агрэсіўныя. Яны ставілі сваёй мэтай падняць народ на ўсеагульнае паўстанне, аднавіць Польскую дзяржаву і вярнуць ёй тэрыторыі ў межах да 1 верасня 1939 г., у тым ліку тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Літвы (Віленскага краю). Ужо з восені 1939 г. на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі дзейнічалі польскія антысавецкія падпольныя арганізацыі, якія накоплівалі зброю, распаўсюджвалі антысавецкую літаратуру, выступалі за аднаўленне “Другой Рэчы Паспалітай” (1918–1939) і разлічвалі на дапамогу ўрадаў Англіі і ЗША.

У лістападзе 1939 г. быў створаны нелегальны “Саюз узброенай барацьбы”, дзейнасць яго распаўсюджвалася і на тэрыторыі былых “усходніх крэсаў”.

Пасля нападу Германіі на СССР “Саюзу узброенай барацьбы” прадпісвалася не ўступаць у актыўныя баявыя дзеянні, а засяроджваць намаганні на падрыхтоўцы ўзброенага паўстання, на разведцы, сабатажы і дыверсіях. 30 ліпеня 1941 г. у Лондане было падпісана пагадненне аб нармалізацыі адносін паміж урадамі СССР і Польшчы. У 1941–1942 гг. эміграцкі польскі ўрад у Лондане пашырае супрацоўніцтва з СССР. Быў падпісаны шэраг пагадненняў, у тым ліку аб фарміраванні на тэрыторыі СССР польскай арміі. У Маскве былі створаны Саюз польскіх патрыётаў і польскія ўзброеныя сілы на чале з З. Берлінгам.

У лютым 1942 г. на базе “Саюза ўзброенай барацьбы” і іншых сіл па загаду польскага кіраўніцтва ў Лондане была створана Армія Краёва – падпольнае ваеннае фарміраванне знішчанай Польскай дзяржавы, якое дзейнічала як на тэрыторыі ўласнай Польшчы, так і ў Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне і Літве. Галоўнай задачай фарміравання з’яўлялася барацьба за аднаўленне Польскай дзяржавы ў межах 1 верасня 1939 г. з уключэннем у яе склад Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Віленскага краю Літвы.

Цэнтр камандавання Арміяй Краёвай знаходзіўся ў Варшаве, падпарадкоўваўся ўраду У. Сікорскага ў Лондане. Мясцовае насельніцтва заходніх абласцей Беларусі савецкіх партызан называла “чырвонымі”, удзельнікаў Арміі Краёвай – “белымі” альбо легіянерамі, польскіх партызан, якія падпарадкоўваліся камандаванню Войска Польскага і Чырвонай Арміі, –

“зялёнымі” партызанамі. Акрамя шматлікіх сутычак, адкрытай барацьбы з савецкімі партызанамі ў 1941 г. – пачатку 1943 г. польскія ваенныя фарміраванні не вялі, іншы раз нават сябравалі з беларускімі партызанамі, ратавалі палонных, раненых.

Пасля разрыву адносін паміж СССР і Польшчай у красавіку 1943 г. становішча змянілася. Армія Краёва прытрымлівалася лозунга “двух ворагаў” і вяла барацьбу на два фронты – супраць немцаў і супраць бальшавікоў. Армія Краёва адкрыта ставіцца на пазіцыі антысаветызму, антысемітызму, савецкіх партызан называе жыдоўска-бальшавіцкімі бандытамі і грабежнікамі, ваюе з імі. З восені 1943 г. і да лета 1944 г. толькі ў Навагрудскай акрузе фарміраванні акаўцаў правялі 81 аперацыю супраць беларускіх партызан. Толькі легіянеры стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай забілі 6000 партызан і мірных жыхароў Беларусі.

Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй тэрыторыі Беларусі фарміраванні Арміі Краёвай спрабавалі процістаяць аднаўленню савецкай улады ў яе заходніх абласцях.

З мэтай спынення супраціўлення Арміі Краёвай у верасні 1944 г. паміж урадам Беларусі і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення было заключана пагадненне аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з Польшчы ў Беларусь і польскага насельніцтва з Беларусі ў Польшчу. Да 1 мая 1945 г. з Польшчы ў Беларусь прыбылі 25 123 чалавекі, а з Беларусі ў Польшчу – 35 704.

У студзені 1945 г. Армія Краёва была афіцыйна распушчана. Бандытызм акаўцаў у Беларусі працягваўся аж да пачатку 50-х гадоў, пакуль яны не былі вылаўлены савецкімі сілавымі структурамі і аддадзены пад суд.

Такім чынам, у пасляваенны час адзіным спосабам існавання акаўцаў быў прымітыўны бандытызм, густа афарбаваны нянавісцю да савецкай улады. Армія Краёва была створана кіруючымі коламі Польшчы для абароны палітычных інтарэсаў гэтай дзяржавы.

На тэрыторыі Беларусі ў Брэсцкай і Пінскай абласцях, частка якіх была ўключана гітлераўцамі ў склад рэйхскамісарыята “Украіна”, дзейнічалі ваенныя фарміраванні Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў – аўнаўцы (1929 г. – пачатак 50-х гадоў). Арганізацыя гэта ўзнікла як палітычная рэакцыя на прыгнёт украінскага насельніцтва Польшчай.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны гітлераўская ваенная разведка (абвер) заключыла з АУН палітычнае пагадненне аб сумесных дзеяннях супраць СССР. З перадавымі часцямі вермахта 22 чэрвеня 1941 г. дзяржаўную мяжу СССР перайшлі два легіёны аўнаўцаў, якія налічвалі крыху больш за 400 чалавек. 30 чэрвеня 1941 г. у Львове АУН абвясціла незалежную Саборную Украіну, стварыла яе ўрад. Гітлер загадаў распусціць урад. Стваральнікі самастойнай Украіны былі арыштаваны і пасаджаны ў канцлагер.

У гады вайны ў рэгіёне Пінск–Мазыр–Корасцень дзейнічала адно з крылаў АУН – узброенае злучэнне “Палеская Сеч”, яго прыхільнікаў называлі бульбаўцамі ад імя кіраўніка, які меў клічку Бульба. Бандэраўцы і бульбаўцы

знаходзіліся паміж сабой у стане лютай варожасці, бо кожны з іх прэтэндаваў на ролю “першага” барацьбіта за самастойную Украіну.

Да сярэдзіны 1943 г. узброеныя фарміраванні бандэраўцаў і бульбаўцаў актыўных баявых дзеянняў супраць савецкіх партызан не вялі, а ў асобных выпадках дапамагалі ім. Аднак летам 1943 г. яны змянілі сваю пазіцыю, распрацавалі новую тактыку ў адносінах да гітлераўцаў – пасіўная самаабарона, да партызан – барацьба.

У 1944 г. па заданні абвера АУН стварыла шэраг новых узброеных фарміраванняў, аб’яднаных ва Украінскую паўстанцкую армію (УПА) для дзеянняў на тэрыторыі Украіны і ў тыле Чырвонай Арміі. У 1944–1946 гг. АУН–УПА здзейсніла на Беларусі 2384 дыверсіі і тэрарыстычныя акты, у выніку якіх загінула 1012 чалавек. Сярод іх партыйныя і савецкія работнікі, афіцэры і салдаты Савецкай Арміі.

На тэрыторыі прылеглых да Літвы раёнаў Беларусі ў пасляваенныя гады дзейнічала літоўскае антысавецкае падполле (каля 1 тыс. чалавек), якое, як і бандыцкія фарміраванні АУН–УПА, было ліквідавана ў пачатку 50-х гадоў.

У 1941 г. гітлераўцы для выканання паліцэйскіх, карных і ахоўных задач робяць спробу стварыць пад сваім камандаваннем на акупіраванай тэрыторыі фарміраванні “усходніх войск” (называліся таксама “туземнымі” ці “добраахвотніцкімі” войскамі). У канцы 1941 г. пачалося стварэнне рускіх, украінскіх, казацкіх, каўказскіх, туркестанскіх і іншых батальёнаў і часцей. Усяго за час вайны было створана 90 палявых батальёнаў, у іх ліку каля 20 рускіх, казацкая карная дывізія СС. На тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 1-ы рускі полк СС, батальёны “Днепр”, “Бярэзіна”, “Прыпяць”, якія актыўна дапамагалі немцам у правядзенні карных экспедыцый. Беларусаў у войсках СС служыла каля 10 тыс. чалавек.

Пазней на базе батальёнаў і часцей былі створаны ўкраінская дывізія СС “Галічына”, беларуская дывізія СС “Беларутэнія”, мусульманская дывізія “Хантар”, 29-я і 30-я рускія дывізіі СС, 599-я руская брыгада. У сувязі з нізкай баяздольнасцю “туземныя (добраахвотніцкія) часці” былі зняты з Усходняга фронту і перакінуты ў якасці паліцэйскіх сіл і будаўнічых падраздзяленняў у акупіраваныя фашыстамі краіны Еўропы.

У маі 1945 г. закончыла свой шлях руская вызваленчая армія (РВА) на чале з генералам-здраднікам Уласавым. У 1942 г. генерал-лейтэнант Уласаў камандаваў 2-й Ударнай арміяй Волхаўскага фронту, якая ў маі–чэрвені была разбіта фашыстамі. У ліпені 1942 г. Уласаў здаўся ў палон. Ні армія, ні яе штаб у палон не здаваліся. Стаўшы на шлях здрады, Уласаў прасіў у немцаў дазволу на стварэнне рускай арміі, якая б ваявала ад імя “другога рускага ўрада”. Але доўгі час ён заставаўся ў стане генерала без войска. 27 снежня 1942 г. створаны гітлераўцамі “рускі камітэт” (старшыня Уласаў) надрукаваў у выглядзе лістовак адозву да байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, да ўсяго рускага народа і іншых народаў СССР. У лістоўках сцвярджалася, што перад РВА стаяць задачы “звяржэння Сталіна і яго кагала (жыдоў)”; стварэнне ў садружнасці з

германскім і іншымі народамі Еўропы новай, сапраўды свабоднай Расіі, без калгасаў і г.д. Вясной 1943 г. пад Берлінам былі створаны школы добраахвотнікаў для РВА. Быў арганізаваны выпуск газет "Доброволец" і "Заря". Выпускнікоў у якасці дыверсантаў закідвалі на акупіраваную тэрыторыю і ў часці Чырвонай Арміі. Толькі ў 1944 г. пасля сустрэчы з рэйхсфюрэрам СС Гімлерам Уласаў атрымаў званне генерал-палкоўніка, права на стварэнне дзвюх дывізій РВА і "Камітэта вызвалення народаў Расіі" (КВНР) – "расійскага ўрада". У канцы снежня 1944 г. у асноўным з ліку добраахвотнікаў і рэшткаў "усходніх часцей" была створана першая дывізія РВА, у студзені 1945 г. – другая дывізія. У канцы вайны за кошт аб'яднання ўсіх "усходніх часцей" у РВА налічвалася да 100 тыс. чалавек. Безпадстаўнымі з'яўляюцца сцвярджэнні аб тым, быццам на баку Гітлера змагалася ад 600 тыс. да 1 млн былых савецкіх грамадзян.

Па загаду германскага камандавання 13 красавіка 1945 г. першая дывізія РВА пачала атаку супраць Чырвонай Арміі, але хутка прыпыніла яе і пайшла на поўдзень на сустрэчу з англа-амерыканскімі войскамі. У адпаведнасці з дамоўленасцю "вялікай тройкі" ў Ялце ў лютым 1945 г. англійскія і амерыканскія войскі абяззбройвалі ўласаўцаў, змяшчалі іх у лагеры, а затым перадавалі савецкаму боку. Уласава ўзялі ў палон савецкія войскі. Былі сярод уласаўцаў і запалоханыя і падманутыя людзі, якія не змаглі разабрацца ў сутнасці тагачаснай ваеннай і палітычнай барацьбы і якія папаліся на вудачку антысавецкай прапаганды.

2 жніўня 1946 г. ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР прыгаварыла да смяротнай кары праз павешанне Уласава і 11 яго супольнікаў. Такі лагічны фінал прадажніцтва і здрады Радзіме.

## ГЛАВА 6. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ. ЗАКАНЧЭННЕ ВАЙНЫ

Восенню 1943 г., пасля разгрому фашысцкіх войск пад Курскам, пачалося выгнанне ворага з акупіраванай тэрыторыі Беларусі. 23 верасня савецкія войскі вызвалілі першы раённы цэнтр Беларусі – г. Камарын, а да канца верасня выйшлі на подступы да Віцебска, Рагачова, Магілёва.

У лістападзе 1943 г. вызвалены буйны прамысловы і культурны цэнтр рэспублікі – г. Гомель, які да выгнання немцаў з Мінска стаў месцам знаходжання ўрада БССР. Усяго ў Беларусі ў выніку асенне-зімовага (1943–1944) наступлення савецкіх войск было вызвалена 40 раёнаў Магілёўскай, Віцебскай, Гомельскай і Палескай абласцей.

У 1944 г. пачаўся завяршальны этап Вялікай Айчыннай вайны, які характарызаваўся поўным выгнаннем акупантаў з савецкай зямлі і пачаткам вызвалення народаў Еўропы ад фашысцкай няволі. Адной з буйнейшых падзей гэтага этапа з'явілася Беларуская наступальная аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю пад кодавай назвай "Баграціён".

Да пачатку бітвы гітлераўцы сканцэнтравалі на лініі фронту найбольш буйную групоўку сваіх войск (група армій “Цэнтр” і на флангах часці груп “Поўнач”, “Паўночная Украіна”) колькасцю 1,3 млн чалавек, 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 самалётаў. Створаную ў Беларусі глыбокаэшаланіраваную сістэму абароны, якая прыкрывала галоўныя стратэгічныя напрамкі (усходне-прускі і варшаўска-берлінскі), гітлераўцы называлі “Фатэрлянд” (Айчына), паказваючы, што тут іх армія адстойвае рубяжы самой Германіі.

Савецкае камандаванне, улічваючы важнасць і складанасць задачы, прыняло ўсе неабходныя меры для забеспячэння поспеху аперацыі па вызваленні Беларусі: на працягу красавіка – мая 1944 г. быў дэталёва распрацаваны план аперацыі “Баграціён”; праведзена ўсебаковая падрыхтоўка да наступлення – савецкія войскі былі аб’яднаныя ў чатыры фронты, забяспечаны ў дастатковай ступені тэхнікай, боепрыпасамі, гаручым, харчаваннем. Раніцай 23 чэрвеня 1944 г. пачалася бітва за поўнае вызваленне Беларусі. У наступленне перайшлі войскі 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы І.Х. Баграмян), 2-га Беларускага (Г.Ф. Захараў) і 3-га Беларускага (І.Д. Чарняхоўскі) франтоў. На другі дзень да іх далучыліся войскі 1-га Беларускага фронту (камандуючы К.К. Ракасоўскі). У аперацыі ўдзельнічалі таксама Дняпроўская ваенная флатылія, авіяцыя далёкага дзеяння і процівапаветранай абароны, першы асобны французскі добраахвотніцкі знішчальны авіяполк “Нармандыя-Нёман”. Актыўны ўдзел прымалі партызанскія злучэнні. Каардынавалі дзеянні франтоў маршалы А.М. Васілеўскі і Г.К. Жукаў.

З першых жа дзён наступлення ў Беларусі, як сведчыць у сваіх успамінах маршал Г.К. Жукаў, на ўсіх напрамках разгарнуліся бязлітасныя баі на зямлі і ў паветры. 24 чэрвеня лінія абароны праціўніка была прарвана. На трэці дзень баёў войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў акружылі і знішчылі Віцебскую групоўку праціўніка (Віцебскі кацёл), вызвалілі Віцебск. Войскі 2-га Беларускага фронту, фарсіраваўшы водныя перашкоды, 28 чэрвеня штурмам авалодалі Магілёвам. Тады ж была завершана ліквідацыя варожых войск, акружаных пад Бабруйскам (Бабруйскі кацёл). Гітлераўцы, пацярпеўшы паражэнні на галоўнай абароннай паласе, спрабавалі замацавацца на рубяжы Бярэзіны. Аднак іх спроба была сарвана войскамі 3-га Беларускага фронту, якія фарсіравалі Бярэзіну і 1 ліпеня вызвалілі Барысаў.

Разгарнуліся баі за сталіцу Беларусі – Мінск. Баі за вызваленне Мінска пачаліся на досвітку 3 ліпеня і паспяхова завяршыліся да канца таго ж дня. Першым уварваўся ў Мінск танк камандзіра ўзвода Д.Г. Фролікава. У баях за горад вызначыліся многія байцы 2-га Тацынскага гвардзейскага танкавага корпуса генерала А.С. Бурдзейнага, 1-га гвардзейскага танкавага корпуса генерала М.Ф. Панова, 5-й гвардзейскай танкавай арміі маршала бранятанкавых войск П.А. Ротмістрава, 3-й арміі генерала А.В. Гарбатава, 31-й арміі генерала В.В. Глаголева і інш.

Каля Мінска ў акружэнні апынулася больш чым 100-тысячная групоўка ворага (“Мінскі кацёл”). Гітлер звярнуўся да камандавання групоўкі з загадам, у якім патрабаваў зрабіць усё, каб выйсці з акружэння. Цэлы тыдзень, да 11 ліпеня, кіпеў “Мінскі кацёл”. Аднак фашысцкім войскам не ўдалося вырвацца з акружэння: 70 тыс. было забіта, 30 тыс. узята ў палон.

У той час як частка савецкіх войск разам з партызанамі заканчвалі ліквідацыю акружанай групоўкі праціўніка пад Мінскам, галоўныя сілы трох беларускіх франтоў рухаліся на захад. Былі вызвалены 4 ліпеня – Полацк, 5 – Маладзечна, 16 – Гродна, 28 – Брэст. Такім чынам, да канца ліпеня 1944 г. нямецка-фашысцкія захопнікі былі поўнасцю выгнаны з беларускай зямлі.

Разгром нямецка-фашысцкіх войск у Беларусі ўвайшоў у гісторыю як адна з важнейшых бітваў Вялікай Айчыннай і другой сусветнай вайны. Паражэнне гітлераўцаў на Беларусі ў 1944 г. многія гісторыкі ацэньваюць як катастрофу вермахта, а некаторыя і як канчатковае паражэнне Германіі. Сапраўды, бітва за Беларусь у 1944 г. стала адной з буйнейшых ваенных катастроф Германіі. У ходзе аперацыі “Баграціён” савецкія войскі разбілі 28 дывізій групы “Цэнтр” з 38. Агульныя страты гітлераўцаў у Беларусі летам 1944 г. перавысілі тыя, якія панеслі яны ў бітве на Волзе: было забіта звыш 381 тыс. і ўзята ў палон 158 тыс. салдат, афіцэраў і генералаў. За месяц наступлення савецкія войскі ачысцілі ад ворага тэрыторыю працягласцю з поўначы на поўдзень больш як на 400 км і з усходу на захад больш як на 500 км. У выніку беларускай аперацыі была вызвалена не толькі ўся Беларусь, але і большая частка Літвы, частка Латвіі, усходнія раёны Польшчы. Савецкія войскі падышлі да граніц Усходняй Прусіі, што стварыла спрыяльныя ўмовы для вызвалення шэрага краін Еўропы і разгрому фашысцкай Германіі.

Яшчэ дзевяць месяцаў пасля вызвалення Беларусі працягвалася вайна супраць фашысцкай Германіі. Беларускі народ увесь гэты час аказваў усямерную дапамогу Чырвонай Арміі і адначасова адраджаў жыццё на амаль цалкам спапялёнай, разбуранай зямлі Беларусі.

Пасля вызвалення рэспублікі 147 тыс. партызан уліліся ў шэрагі Чырвонай Арміі, а ўсяго ў ходзе і пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ў Чырвоную Армію было мабілізавана 755 тыс. яе жыхароў. Усё насельніцтва вызваленай Беларусі ўключылася ў самаадданую працу пад дэвізам “Усё для фронта, усё для перамогі!”. Чырвонай Арміі аказвалася дапамога ў рабоце палявых шпіталяў, рамонце баявой тэхнікі, падвозе боепрыпасаў і інш. Важнае значэнне надавалася ўзнаўленню чыгунак, забеспячэнню рэгулярнай і своечасовай дастаўкі грузаў на фронт. Да лютага 1945 г. на Беларусі было ўзноўлена больш за 10 тыс. км чыгуначных дарог. У 1944 г. узровень прамысловай вытворчасці рэспублікі быў у 10 разоў ніжэйшы, чым у 1940 г., а да лета 1945 г. ужо дзейнічала звыш 8 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, майстэрань і арцеляў, ці 25 % іх даваеннай колькасці. Пасля вызвалення Беларусі Чырвоная армія з неаслабнай сілай грамiла нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У выніку наступных ударaў вораг быў поўнасцю выгнаны з савецкай зямлі, дзяржаўная граніца

СССР аднаўлена. Чырвоная Армія, выконваючы вызваленчую місію, дапамагала народам Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Румыніі, Балгарыі і іншым вызваліцца ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Савецкія войскі разам з амерыканскімі, англійскімі, французскімі, польскімі, чэхаславацкімі і югаслаўскімі, а таксама з войскамі румынскай і балгарскай армій, якія далучыліся пазней, наносілі гітлераўскім полчышчам знішчальныя ўдары. Супраць фашызму, за свабоду і незалежнасць сваіх краін змагаліся патрыёты Італіі, Грэцыі, Венгрыі, Албаніі, Нарвегіі і іншых краін. У выніку гітлераўская Германія апынулася пад пагрозай немінучага разгрому.

Многія народы і дзяржавы ўнеслі ўклад у перамогу над фашызмам, у тым ліку ЗША, Англія, Францыя і іншыя саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі. Важнай падзеяй у барацьбе супраць фашызму з'явілася адкрыццё ў чэрвені 1944 г. другога фронту ў Еўропе, дамоўленасць аб чым была дасягнута яшчэ ў пачатку 1942 г. У канцы студзеня – пачатку лютага 1945 г. савецкія войскі ў ходзе Вісла-Одэрскай аперацыі фарсіравалі Одэр, наблізіліся на 70–80 км да Берліна. У той жа час, калі Савецкія Узброеныя Сілы ажыццяўлялі наступленне супраць фашысцкай Германіі з усходу, англа-амерыканскія войскі разгарнулі наступальныя дзеянні на захадзе. Рашаючае значэнне для разгрому фашысцкай Германіі мела Берлінская аперацыя (16 красавіка – 8 мая). Яе ажыццявілі войскі 1-га, 2-га Беларускіх і 1-га Украінскага франтоў з выкарыстаннем сіл балтыйскага флоту, дняпроўскай ваеннай флатыліі, авіяцыі дальняга дзеяння, а таксама 1-й і 2-й армій Войска Польскага. 2 мая савецкія войскі завяршылі разгром берлінскай групоўкі ворага і поўнасцю авалодалі Берлінам.

8 мая ў прадмесці Берліна Карлсхорсце ў прысутнасці прадстаўнікоў камандаванняў армій СССР, ЗША, Англіі і Францыі прадстаўнікі павергнутай Германіі падпісалі акт аб безагаворачнай капітуляцыі сваіх узброеных сіл. Кровапралітная вайна ў Еўропе закончылася. У азнаменаванне перамаганоснага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 9 мая 1945 г. было аб'яўлена днём усенародных урачыстасцей – святам Перамогі.

У Еўропе наступіў мір. Але ў краінах Паўднёва-Усходняй Азіі, на Далёкім Усходзе і ў басейне Ціхага акіяна ўсё яшчэ палыхала полымя вайны, развязанай Японіяй. Верны саюзніцкаму абавязку, СССР далучыўся да дэкларацыі ЗША, Англіі і Кітая ад 26 ліпеня 1945 г., у якой патрабавалася безагаворачная капітуляцыя Японіі, і 8 жніўня аб'явіў вайну мілітарысцкай Японіі.

Баявыя дзеянні Чырвонай Арміі і Флоту супраць Японіі пачаліся 9 жніўня 1945 г. Нягледзячы на моцнае супраціўленне, савецкія войскі хутка зламалі абарону праціўніка. На працягу 11 дзён яны разграмілі галоўную ўдарную сілу японскіх мілітарыстаў – Квантунскую армію і ачысцілі ад японцаў паўночна-ўсходнія правінцыі Кітая (Маньчжурыю), гарады Дальні і Порт-Артур, Паўднёвы Сахалін, Курыльскія астравы, вызвалілі Паўночную Карэю.

Ужо пасля разгрому савецкімі войскамі Квантунскай арміі ЗША, якія 6 і 9 жніўня 1945 г. падверглі атамнай бамбардыроўцы Хірасіму і Нагасакі,

28 жніўня пачалі высадку сваіх акупацыйных сіл на Японскія астравы. Страціўшы лепшую сухапутную армію, а таксама флот, Японія вымушана была капітуляваць.

2 верасня 1945 г. Японія падпісала акт аб безагаворачнай капітуляцыі. Ад імя дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі яго падпісалі прадстаўнікі ЗША, Англіі, СССР, Кітая, Францыі, Аўстраліі, Канады, Новай Зеландыі і Нідэрландаў. Так закончылася другая сусветная вайна.

## ГЛАВА 7. УКЛАД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ

Разгром фашысцкай Германіі, а затым мілітарысцкай Японіі ў вайне 1939–1945 гг. мае сусветна-гістарычнае значэнне. Вялікая перамога над дзяржавамі агрэсіўнага блока была атрымана ў імя міру і жыцця на Зямлі. Яна аказала велізарнае ўздзеянне на ўвесь ход сусветнага развіцця ўжо тым, што аб'ектыўна з'явілася гістарычным прысудам фашызму і мілітарызму, пераканаўчым пацвярджэннем важнасці аб'яднання самых розных палітычных, сацыяльных, ідэалагічных сіл супраць ваеннай пагрозы, усякага роду рэваншызму, фашызму і неафашызму.

Важнейшым фактарам дасягнення Вялікай Перамогі быў удзел многіх дзяржаў і народаў у агульнай барацьбе супраць фашысцкага блока. Значэнне і роля баявых дзеянняў узброеных сіл ЗША, Англіі, Францыі, Кітая, намаганні і стойкасць народаў іншых краін, якія змагаліся з гітлераўскай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй, несумненны і відавочны. Аб'ектыўныя гістарычныя матэрыялы і факты сведчаць: рашаючы ўклад у вызваленне народаў Еўропы і Азіі ад фашысцкага рабства, у выратаванне сусветнай цывілізацыі ўнеслі народы Савецкага Саюза і Савецкія Узброеныя Сілы. На савецка-германскім фронце з пачатку вайны і да сярэдзіны 1944 г. адначасова дзейнічала ад 190 да 270 нямецка-фашысцкіх дывізій, у той час калі англійскай і амерыканскай арміям супрацьстаялі ў Паўночнай Афрыцы ад 9 да 20, у Італіі – ад 7 да 26 дывізій. І пасля адкрыцця другога фронту (чэрвень 1944 г.) у Еўропе на савецка-нямецкім фронце ў 2–2,5 раза больш знаходзілася гітлераўскага войска, чым на заходнім і італьянскім франтах. Даўжыня савецка-германскага фронту на розных этапах вайны вагалася ад 3 да 6 тыс. км. З 1418 сутак існавання фронту 93 % часу прыпадае на актыўныя баявыя дзеянні. Працягласць жа фронту ў Паўночнай Афрыцы і Італіі не перавышала 300–350 км, а ў Заходняй Еўропе – 800 км.

Разам з усімі народамі Савецкага Саюза з гонарам выканаў свой абавязак перад Радзімай і чалавецтвам беларускі народ. На алтар Вялікай Перамогі Беларусь прынесла мільёны жыццяў сваіх грамадзян.

Крыніцамі перамогі над агрэсарам з'явіліся дзейнасць Камуністычнай партыі і савецкага ўрада, Савецкіх Узброеных Сіл, дружба народаў СССР, савецкі патрыятызм. У свеце не знайшлося такой сілы, якая б змагла спыніць фашысцкіх агрэсараў. Толькі 16 дзён супраціўляўся ім народ Польшчы, за 42

дні была акупіравана Францыя, 1418 дзён змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў савецкія людзі і іх узброеныя сілы і дасягнулі перамогі.

Вялікая Айчынная вайна была ўсенароднай. Ужо за першыя 8 дзён у Савецкія Узброеныя Сілы ўлілося больш за 5 млн чалавек. Толькі за чэрвень – жнівень 1941 г. больш за паўмільёна мужчын Беларусі, здольных насіць зброю, уступілі ў шэрагі Чырвонай Арміі. Усяго на франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся 1 млн 300 тыс. беларусаў і ўраджэнцаў рэспублікі.

Чырвоная Армія разбіла галоўныя сілы ваеннай машыны агрэсараў. З 13,6 млн чалавек, якіх страціла гітлераўская Германія за час другой сусветнай вайны, 10 млн знайшлі сабе магілу на ўсходнім фронце. Страты нямецка-фашысцкіх войск на савецка-германскім фронце былі ў 4 разы большыя, чым на заходнееўрапейскім і міжземнаморскім тэатрах ваенных дзеянняў.

За час вайны за мужнасць і гераізм ордэнамі і медалямі было ўзнагароджана звыш 7 млн ваеннаслужачых, больш за 11 тыс. чалавек удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Звыш 300 тыс. салдат і афіцэраў – ураджэнцаў Беларусі – атрымалі ордэны і медалі, 441 воін удастоены звання Героя Савецкага Саюза, а чацвярым (лётчык П.Я. Галавачоў, камандзіры танкавых злучэнняў І.І. Гусакоўскі, С.Ф. Шутаў, І.І. Якубоўскі) гэта званне прысвоена двойчы, 65 ураджэнцаў Беларусі сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы.

Ураджэнцамі Беларусі былі выдатныя военачальнікі, якія затым сталі маршаламі: В.Д. Сакалоўскі, І.І. Якубоўскі, С.А. Красоўскі; генераламі арміі: А.І. Антонаў, І.І. Гусакоўскі; генерал-палкоўнікамі А.Р. Бацюня, І.П. Камера, Ф.І. Кузняцоў; віцэ-адміралам В.П. Дрозд; контр-адміралам В.Е. Ананіч – усяго 217 генералаў і адміралаў. У складзе ваенна-паветраных сіл з ворагам змагаліся 5305, у бранятанкавых і механізаваных часцях 2490 афіцэраў з Беларусі.

Свой ўклад у разгром фашысцкіх захопнікаў унеслі партызаны і падпольшчыкі Беларусі, якую ў гады акупацыі па праву называлі “Рэспублікай-партызанкай”.

Нямала беларусаў у ліку савецкіх грамадзян удзельнічала ў еўрапейскім руху Супраціўлення. Агульная колькасць савецкіх партызан, якія дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы, складала 12 тыс. чалавек, Чэхаславакіі – больш за 17 тыс. чалавек.

Рух Супраціўлення, які па свайму характару і мэтах быў антыфашысцкім, агульнадэмакратычным, меў важнае гістарычнае значэнне. Змагары Супраціўлення наносілі адчувальныя ўдары па варожых камунікацыях і гарнізонах, зганялі фашысцкіх акупантаў з населеных пунктаў, а ў некаторых краінах (Югаславія, Грэцыя, Албанія, Францыя) узброеныя фарміраванні антыфашыстаў вызвалілі ўсю тэрыторыю альбо большую яе частку.

Перамога над фашыстскім блокам была не толькі палітычнай і ваеннай, але і эканамічнай. У дасягненні яе адыгралі сваю ролю эканамічныя рэсурсы СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, іншых дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.

Значны ўклад у забеспячэнне Вялікай Перамогі над ворагам унёс савецкі тыл, у тым ліку эвакуіраваныя з Беларусі на ўсход краіны, прадпрыемствы і ўстановы. Да лета 1942 г. на абарону працавалі больш за 60 беларускіх прадпрыемстваў. Усяго ва ўсходніх раёнах СССР працавала прыкладна 1,5 млн эвакуіраваных жыхароў Беларусі.

Адзінства фронту і тылу, працоўны гераізм жыхароў горада і вёскі былі магутным фундаментам Вялікай Перамогі. Ужо ў канцы 1942 г. суадносіны па асноўных відах ваеннай тэхнікі на савецка-германскім фронце змяніліся на карысць Чырвонай Арміі, а з лета 1943 г. яны працягвалі няўхільна павялічвацца. Па сярэднегадавому выпуску гармат палявой артылерыі СССР пераўзыходзіў Германію больш чым у 2 разы, супрацьтанкавых гармат – у 2,6, мінамётаў – у 5 разоў.

Працаўнікі калгасаў і саўгасаў забяспечвалі армію харчаваннем і фуражом.

Дзякуючы намаганням працаўнікоў тылу Савецкія Узброеныя Сілы атрымалі за гады вайны больш за 10 млн. т. боепрыпасаў, 16 млн. т. паліва, 40 млн т харчавання і фуражу, а таксама вялікую колькасць іншых матэрыяльных сродкаў. Увесь цяжар земляробчай працы ў час вайны вынеслі на сваіх плячах жанчыны, а таксама старыя і падлеткі.

Неацэнны ўклад у Вялікую Перамогу ўнеслі інтэлігенцыя, работнікі народнай адукацыі і навукі, культуры, літаратуры і мастацтва Беларусі. Вучоныя Белдзяржуніверсітэта і Акадэміі навук БССР вырашалі задачы, якія мелі абароннае і народнагаспадарчае значэнне.

Цесную сувязь з савецкай арміяй, народам прадэманстравалі работнікі мастацтва. З першых дзён вайны былі створаны творчыя (франтавыя) брыгады Беларускага тэатра оперы і балета. Калектывы ўсіх беларускіх тэатраў давалі шэфскія канцэрты і спецыяльныя пастаноўкі для стварэння фонду абароны.

Інтарэсы фронту займалі галоўнае месца і ў творчасці беларускіх кампазітараў і мастакоў. Сярод іх Я. Цікоцкі, М. Аладаў, З. Азгур і інш.

Беларускія кінааператары на базе Маскоўскай студыі-хронікі штомесячна выпускалі кіначасопіс “Савецкая Беларусь”. Пры Усесаюзным радыёкамітэце бала створана беларуская рэдакцыя радыёвяшчання, якая штодзённа выпускала радыёперадачы. Не спынялі работы беларускі друк, Дзяржаўнае выдавецтва БССР.

Работнікі народнай адукацыі, навукі, культуры, літаратуры, мастацтва, сродкаў масавай інфармацыі ў гады вайны працавалі для народа, выхоўвалі пачуццё патрыятызму, мужнасці, нянавісці да захопнікаў, натхнялі на непрымірымую барацьбу з ворагам.

Уклад беларускага народа ў Вялікую Перамогу, у справу разгрому фашызму атрымаў прызнанне ва ўсім свеце. Улічваючы гэта, 27 красавіка 1945 г. міжнародная канферэнцыя, скліканая для ўтварэння ААН, прыняла рашэнне аб уключэнні БССР у лік краін-заснавальніц гэтай новай і самай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі, якая і сёння ахоўвае мір і бяспеку народаў.

# РАЗДЗЕЛ IX. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ. БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ (1946–1985)

## ГЛАВА 1. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ

### § 1. Аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі пасля Вялікай Айчыннай вайны

Вялікая Айчынная вайна і фашысцкая акупацыя прынеслі беларускаму народу велізарныя бедствы: загінула больш за 2 млн. 200 тыс. чалавек, толькі прамыя страты склалі 75 млрд. руб. (у цэнах 1942 г.). Аднаўленне эканомікі пачыналася адразу пасля вызвалення – у канцы 1943 – пачатку 1944 г. Аднак галоўнае было зроблена пасля заканчэння Айчыннай вайны, у ходзе рэалізацыі чацвёртага пяцігадовага плана аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі 1946–1950 гг. Яго асноўныя задачы былі выкладзены ў прынятым Вярхоўным Саветам БССР у верасні 1946 г. “Законе аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946–1950 гг.”. Ён з’явіўся часткай чацвёртага пяцігадовага плана развіцця СССР.

Аб’ём капіталаўкладанняў на пяцігодку вызначыўся ў суме 742 млн. руб., што перавышала памер капіталаўкладанняў па рэспубліцы за тры даваенныя пяцігодкі разам узятыя. Гэта павінна было забяспечыць высокія тэмпы аднаўлення і развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі.

У галіне прамысловасці ў чацвёртай пяцігодцы планавалася аднавіць даваенны ўзровень, а потым перавысіць яго. Характэрная рыса чацвёртай пяцігодкі – гэта не толькі аднаўленне разбуранага, развіццё старых галін, але – і гэта галоўнае – стварэнне новых і вельмі працаёмкіх галін, што ў той час аргументавалася неабходнасцю выкарыстання працоўных рэсурсаў і патрэбамі рэспублікі і краіны. У выніку пасляваеннае развіццё вызначыла ў значнай ступені далейшую спецыялізацыю Беларусі ў грамадскім падзеле працы і яе ролю ў стварэнні адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР.

Галоўнымі напрамкамі прамысловага развіцця пасляваеннай Беларусі з’явіўся паскораны рост машынабудавання, металаапрацоўкі, электраэнергетыкі, паліўнай прамысловасці, будаўнічых матэрыялаў.

Пасляваеннае машынабудаванне характарызуецца не толькі адраджэннем старых, але і стварэннем шэрагу новых яе галін: аўтамабільнай, трактарнай, дарожных машын і будаўнічых механізмаў. Аўтамабільны і трактарны заводы ў Мінску былі буйнейшымі новабудоўлямі Беларусі. У будаўніцтве гэтых гігантаў прымала ўдзел уся краіна. У 1950 г. яны ўступілі ў строй і выдалі першую прадукцыю.

Машынабудаванне і металаапрацоўка пераўтварыліся ў вядучую галіну эканомікі рэспублікі. Ужо ў 1950 г., апошнім годзе чацвёртай пяцігодкі, яе валавая прадукцыя перавысіла ўзровень 1940 г. у 2,4 разы. Упершыню быў

асвоены выпуск аўтамабіляў, аўтапрычэпаў, трактароў, веласіпедаў, цэглавырабляючых прэсаў, ліцейнага абсталявання і шмат іншага.

Вялікія поспехі мелі месца ў стварэнні энергетычнай і паліўнай базы народнай гаспадаркі. Былі адноўлены і зноў пабудаваны БелГРЭС, электрастанцыі ў Гомелі, Маладзечна, Гродна, Бабруйску, Брэсце і іншых гарадах і раённых цэнтрах, падрыхтавана да пуску першая чарга Смілавіцкай ГРЭС і Заводская ТЭЦ у Мінску. К 1950 г. выраб электраэнергіі па БССР перавысіў даваенны ўзровень на 47%. Прычым 80% электраэнергіі было выраблена на мясцовым тарфяным паліве. Развіваліся і традыцыйныя галіны беларускай эканомікі. Так, за пяцігодку вытворчасць будаўнічых матэрыялаў павялічылася ў 10 разоў і значна перавысіла даваенны ўзровень. Напрыклад, на вытворчасці цэменту – у 1,7 раза, цэглы – у 1,8 раза.

У ходзе пасляваеннага аднаўлення і развіцця прамысловасці рэспубліка павінна была рашыць вялікую задачу падрыхтоўкі кадраў для вытворчасці. У 1946–1950 гг. непасрэдна ў вытворчасці шляхам індывідуальнага, брыгаднага навучання праз курсавую сетку атрымалі масавыя прафесіі 47 тыс. і павысілі кваліфікацыю на вытворчасці, у школах і на курсах 42,5 тыс. чалавек.

Аднаўленне і развіццё галін цяжкай прамысловасці падрыхтавала базу для развіцця вытворчасці прадметаў спажывання. Выкананне гэтай задачы ўскладалася на прадпрыемствы лёгкай, харчовай, мясцовай прамысловасці, прамысловую кааперацыю. Да канца пяцігодкі на іх долю прыпадала больш за 70% ад усёй вытворчасці тавараў народнага спажывання. Пры гэтым мясцовая прамысловасць у пасляваенныя гады адыграла асабліва важную ролю. Яна працавала на мясцовай сыравіне і патрабавала менш сродкаў, чым на аднаўленне буйных фабрык і заводаў. Прадпрыемствы мясцовай прамысловасці хутка наладжвалі вытворчасць тавараў народнага спажывання: абутку, адзення, вырабаў са скуры, будаўнічых матэрыялаў і інш. За 1946–1950 гг. мясцовая прамысловасць і прамысловая кааперацыя асвоілі выпуск значнай колькасці новых відаў вырабаў, у тым ліку швейных машын, жалезнага і чыгуначнага, эмаліраванага, фаянсавага посуду, бытавых электрапрыбораў, прымусаў, гумавага абутку, прадметаў хатняга ўжытку. Тым самым змяншаўся востры дэфіцыт гэтых тавараў, рэгуляваліся працэсы занятасці працоўнай сілы.

Далейшае развіццё атрымала лёгкая прамысловасць: былі пабудаваны Мінскі і Гродзенскі тонкасуконныя камбінаты, што прывяло да вырабу ў рэспубліцы тонкасуконных і шарсцяных тканін, створана дыванова-плюшавая вытворчасць. Былі рэканструяваны гарбарна-абутковыя прадпрыемствы, ільназаводы, хутка развіваліся швейная, скураная і іншыя галіны лёгкай прамысловасці. Фактычна ізноў была створана магутная па таму часу трыкатажная прамысловасць. У выніку больш, чым да вайны, пачало выраблацца шарсцяных і ільняных тканін, гумавага абутку.

Вялікая праца вялася ва ўсіх абласцях рэспублікі па аднаўленню харчовых, мясамалочных і іншых прадпрыемстваў, якія выраблялі прадукты харчавання. Створаны нанава цукровая, макаронная, кансервавая прамысловасці. Разам з

тым развіццё харчовай прамысловасці стрымлівалася абмежаванымі рэсурсамі сельскагаспадарчай сыравіны, не поўнасцю выкарыстоўваліся магчымасці па расшырэнні вытворчасці гародніны і садавіны.

Неабходна падкрэсліць, што ва ўсіх галінах у значных маштабах рабілася тэхнічная рэканструкцыя, уводзілася больш дасканалае абсталяванне, выкарыстоўваліся новыя метады вытворчасці, павялічвалася ступень механізацыі, электрыфікацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў. Але ў асноўным гэта адбывалася ў галінах цяжкай прамысловасці, у першую чаргу – у машынабудаванні.

Такім чынам, працэс аднаўлення ў прамысловасці ажыццяўляўся ў асноўным на новай тэхнічнай аснове. Пры гэтым ён ішоў адначасова з новым будаўніцтвам – узводзіліся карпусы аўтамабільнага, трактарнага, мотавеласіпеднага, інструментальнага, падшыпнікавага, гіпсавага і іншых заводаў. Усяго за пяцігодку было адноўлена, пабудавана і ўведзена ў дзеянне каля 6 тыс. прадпрыемстваў, у тым ліку 180 буйных.

**Тэмпы росту валавай прадукцыі прамысловасці**
**ў 1945–1950 гг. (у % да 1940 г.)**

| Прамысловасць і яе галіны | 1945 г. | 1950 г. |
|---|---|---|
| паліўная | 19 | 91 |
| вытворчасць электраэнергіі і цеплаэнергіі | 20 | 153 |
| хімічная і гумава-азбеставая | 5 | 198 |
| машынабудаванне і металаапрацоўка | 45 | 237 |
| лясная, папяровая і дрэваапрацоўчая | 23 | 89 |
| лёгкая | 10 | 74 |
| харчовая | 19 | 85 |
| Усяго: | 20 | 115 |

Прыведзеная табліца дае дакладнае ўяўленне аб прыярытэтах эканомікі пасляваеннага перыяду. Пры гэтым нельга не заўважыць, што ў пасляваенныя гады ішоў працэс змянення структуры прамысловай вытворчасці. Падала ўдзельная вага галін, дамінаваўшых да вайны (лёгкай, харчовай, лясной і дрэваапрацоўчай), і павялічвалася доля электраэнергетыкі, машынабудавання і металаапрацоўкі.

Высокімі тэмпамі ішло аднаўленне і развіццё прамысловасці ў заходніх раёнах Беларусі. Былі пабудаваны першая і другая чэргі завода халадзільнікаў і мэблевая фабрыка ў Брэсце, кансервавы завод у Кобрыне, Гродзенскі тонкасуконны камбінат, цукровы завод у Скідзелі, электрастанцыя ў Баранавічах і іншыя. Высокімі тэмпамі тут развіваліся вытворчасць электраэнергіі, будматэрыялаў, аконнага шкла, абутку, швейных вырабаў, хлебапякарная вытворчасць. Аб'ём прамысловай прадукцыі ў заходніх абласцях рэспублікі ў 1950 г. перасягнуў даваенны ўзровень амаль удвая, а магутнасць электрастанцый – у 2,2 разы.

Складаным было становішча ў сельскай гаспадарцы. Пасяўныя плошчы да пачатку пяцігодкі ў калгасах складалі толькі 59% даваеннага ўзроўню, у саўгасах – 70%.

Былі прыняты меры па матэрыяльна-тэхнічнаму ўмацаванню сельскай гаспадаркі. За тры пасляваенныя гады калгасы БССР атрымалі 160 тыс. т харчовага збожжа і насення, 122 тыс. коней, 113 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы і інш. У 1948 г. Савет Міністраў СССР прыняў рашэнне аб мерах дапамогі сельскай гаспадарцы Беларусі, на падставе якога рэспубліка атрымала 3 тыс. трактараў, 200 збожжакамбайнаў, 2 тыс. трактарных плугоў, 1,2 тыс. трактарных збожжавых сеялак і іншую тэхніку.

У калгасах і саўгасах аднаўляліся пасяўныя плошчы, павялічваліся ўраджайнасць, пагалоўе жывёлы, паляпшалася арганізацыя працы. Сярэднегадавыя тэмпы прыросту вытворчасці збожжа ў чацвёртай пяцігодцы склалі 12%, бульбы – 15%, ільноваланка – 36%, малака – 22%.

Асноўны цяжар пасляваеннага аднаўлення вёскі вынеслі на сваіх плячах жанчыны, старыя і падлеткі. У 1947 г. працаздольнае насельніцтва вёскі складала 46% (гэта людзі ад 12 да 60 гадоў, у тым ліку жанчыны ад 16 да 60 гадоў – 25%).

У цэлым жа сялянства рэспублікі змагло, нягледзячы на цяжкія ўмовы, дасягнуць пэўных поспехаў. У канцы чацвёртай пяцігодкі агульная пасяўная плошча дасягнула 91,4% даваеннай, а пасевы збожжавых – 97,1%. Многія калгасы і саўгасы не толькі дасягнулі, але і перавысілі даваенны ўзровень па колькасці пагалоўя жывёлы і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Аднак большасць калгасаў былі нерэнтабельнымі і стратнымі.

Хуткае аднаўленне і развіццё прамысловасці, некаторыя поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі далі магчымасць некалькі палепшыць становішча насельніцтва, хаця жыццё большасці людзей было вельмі цяжкім. Гэтаму спрыялі адмена картачнай сістэмы ў снежні 1947 г., некаторае павелічэнне даходаў працаўнікоў. Вельмі марудна, але паляпшалася матэрыяльнае становішча насельніцтва, асабліва гараджан. Ішло будаўніцтва жылля. За гады чацвёртай пяцігодкі ў гарадах і рабочых пасёлках рэспублікі былі ўведзены ў дзеянне 4,2 млн. кв. м жылля, а ў сельскай мясцовасці – 290,3 тыс. дамоў. Але жылля востра не хапала. Аднаўлялася сістэма аховы здароўя. Паступова наладжвалася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. У першыя пасляваенныя гады былі ліквідаваны эпідэміі інфекцыйных захворванняў, праведзена масавае санітарнае абследаванне насельніцтва. Ужо да 1949 г. поўнасцю аднавілася сетка медыцынскіх устаноў, яны забяспечваліся неабходным медыцынскім абсталяваннем.

Можна адзначыць шэраг асаблівасцей, аказаўшых уплыў на далейшае развіццё рэспублікі. Гэта перш за ўсё ўзмоцненыя тэмпы індустрыялізацыі, не толькі адраджэнне старых, але і стварэнне новых галін, у будучым вызначыўшых асноўныя рысы эканомікі рэспублікі. Яны заложылі асновы для стварэння складанага народнагаспадарчага комплексу, забяспечылі дастаткова

высокія тэмпы аднаўлення і развіцця прамысловасці ў заходніх абласцях Беларусі, паскорылі працэс фарміравання рабочага класу, прыток кадраў спецыялістаў з іншых рэгіёнаў краіны і адток насельніцтва з беларускай вёскі.

У цэлым жа складалася эканоміка, дазволіўшая БССР заняць у далейшым значнае месца ў сістэме агульнасаюзнага падзелу працы, стварыліся ўмовы для ўсебаковага развіцця рэспублікі.

## § 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 50-я – першай палове 80-х гг.

Прамысловасць Беларусі ў пачатку 50-х гадоў дасягнула грунтоўных зрухаў у сваім развіцці. Было пабудавана каля 150 новых буйных прадпрыемстваў, у тым ліку Мінскі падшыпнікавы і гадзіннікавы заводы, Мінскі завод абагравальнага абсталявання, Аршанскі завод швейных машын, Віцебская шоўкаткацкая фабрыка, Мінскі камвольны камбінат. За пятую пяцігодку прадукцыя машынабудавання павялічылася ў 5,4 разы, склаўшы амаль 1/4 усёй валавай прадукцыі прамысловасці. Вытворчасць электраэнергіі і цеплаэнергіі павялічылася амаль у 3 разы, выпуск хімічнай і гума-азбеставай прамысловасці – у 3,7 разы.

У такіх абставінах і была зроблена першая спроба рэфармавання эканомікі ў краіне, пачатак якой паклалі рашэнні КПСС і ўрада СССР 1953–1955 гг. Яны вызначылі пераход да пашырэння тэхнічнага прагрэсу ў вытворчасці. У гэтыя працэсы была ўключана і эканоміка Беларусі.

Прамысловае будаўніцтва ў 50-я гады вялося ва ўмовах паскоранай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. На падставе пастановы ліпеньскага Пленума ЦК КПСС (1955 г.) у рэспубліцы абнаўляліся і мадэрнізаваліся асноўныя вытворчыя фонды, удасканальвалася тэхнічнае аснашчэнне, старая тэхніка замянялася новай. За 1955–58 гг. на прадпрыемствах рэспублікі было ўстаноўлена каля 200 паточных ліній, больш за 1000 адзінак новага і мадэрнізаванага абсталявання. Да 1961 г. было мадэрнізавана 3544 металарэзных станкоў і кузнечна-прэсавых агрэгатаў, устаноўлена звыш 500 аўтаматычных, паўаўтаматычных, механізаваных паточных канвеерных ліній, тысячы аўтаматаў і паўаўтаматаў.

Быў узяты курс на актыўнае супрацоўніцтва навукі з вытворчасцю – вучоныя АН БССР, ВНУ і іншых навукова-даследчых устаноў аказвалі прадпрыемствам канкрэтную дапамогу па пытаннях укаранення навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі. Напрыклад, супрацоўнікі фізіка-тэхнічнага інстытута АН БССР на аўтамабільным заводзе ўкаранялі новую тэхналогію і тэрмахімічны рэжым апрацоўкі дэталяў аўтамабіляў, якія толькі ў 1950–1954 гг. далі эканомію каля 10 млн. руб.

У сваім развіцці прамысловасць Беларусі абапіралася на індустрыяльную магутнасць усёй краіны. З Масквы, Ленінграда, прамысловых цэнтраў Паволжа, Урала рэспубліка атрымлівала розныя віды прамысловага абсталявання і

машын, а таксама сталь, чыгун, вугаль, нафту, рэйкі, трубы, прадукцыю горнай металургіі і шмат іншага.

Паспяховае прамысловае будаўніцтва ў 50-я гады дазволіла асвоіць выпуск новых відаў прамысловай прадукцыі. Мінскі аўтамабільны завод пачаў выпуск 25-тонных самазвалаў МАЗ-525, 7-тонных аўтамабіляў МАЗ-200, лесавозаў МАЗ-501 і аўтапрычэпаў. У 1957 г. аўтазаводцы стварылі першы ўзор 40-тоннага самазвала, які на Сусветнай выставе ў Бруселі ў 1958 г. атрымаў вышэйшы прыз. На Магілёўскім металургічным заводзе імя А.Ф. Мяснікова ў 1957 г. быў выпушчаны першы беларускі пракат. Новая прадукцыя з’явілася на многіх іншых прадпрыемствах.

Паколькі магчымасці экстэнсіўнага росту прамысловасці рэспублікі на аснове пераважнага паглыблення індустрыялізацыі да пачатку 60-х гг. не былі вычарпаны, тэмпы яе развіцця на наступным этапе заставаліся дастаткова высокімі. У першай палове 60-х гадоў у БССР увайшлі ў строй 300 буйных прамысловых прадпрыемстваў.

Разам з тым перавод прамысловасці і іншых галін народнай гаспадаркі на новы тэхнічны ўзровень ажыццяўляўся марудна. У сувязі з гэтым ва ўсіх галінах пераважным заставалася экстэнсіўнае развіццё. У асобных галінах былі заніжаны тэмпы тэхнічнага пераўзбраення, марудна асвойвалася новая тэхніка і перадавая тэхналогія. На шматлікіх прадпрыемствах вялікае месца займала ручная праца. Гэта вяло да таго, што шэраг заводаў і фабрык не выконвалі ў тэрмін планавыя заданні, выпускалі ўстарэлую прадукцыю.

Больш выразна спроба рэфармаваць кіраванне эканомікай праявілася ў 50-я гады ў сельскай гаспадарцы. Тут сітуацыя заставалася складанай, таму што асноўныя сродкі і рэсурсы накіроўваліся на аднаўленне цяжкай прамысловасці, іншых галін народнай гаспадаркі.

Прычынай адставання сельскай гаспадаркі перш за ўсё была эканамічная палітыка, якую праводзіла савецкае кіраўніцтва, сур’ёзныя недахопы ў кіраўніцтве калгасамі і саўгасамі. Жнівеньская сесія Вярхоўнага Савета СССР і вераснёўскі (1953 г.) пленум ЦК КПСС прынялі рашэнне, накіраванае на ўздым сельскай гаспадаркі. Упершыню былі здзейснены меры па эканамічнаму ўмацаванню сельскагаспадарчай вытворчасці, пашырэнню самастойнасці калгасаў і саўгасаў, матэрыяльнай зацікаўленасці сялян. Значна ўзмацнілася матэрыяльна-тэхнічная база сельскай гаспадаркі.

Прынятыя меры садзейнічалі таму, што вытворчыя сілы сельскай гаспадаркі за наступныя гады значна ўзраслі. Гэта дазволіла спыніць спад прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы і перайсці да паступовага нарошчвання аб’ёмаў вытворчасці. Некалькі павысілася ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. Высокія і ўстойлівыя ўраджаі атрымлівалі калгасы: “Рассвет” Кіраўскага раёна, імя М. Гастэлы Мінскага, “Камінтэрн” Магілёўскага, “Шлях да камунізму” і “Бальшавік” Сенненскага, “Перамога” Талочынскага раёнаў і іншыя. У 1955 г. у параўнанні з 1953 г. нарыхтоўкі мяса павялічыліся на 50 тыс. т, малака – на 123 тыс. т, яек – на 41,3 млн. шт.

Да 1960 г. вытворчасць мяса і малака ў рэспубліцы ў параўнанні з 1953 г. павялічылася на 70%, валавы збор збожжа – на 36%. Але гэты ўзровень быў ніжэй таго, які вызначаўся, і не забяспечваў патрэб рэспублікі. Разам з тым з канца 50-х гадоў у практыцы кіравання сельскай гаспадаркай краіны ўсё больш пачалі браць верх адміністрацыйныя меры, да таго ж валявога, суб’ектыўнага характару, што адбівалася, хаця мякчэй, як у краіне, на развіцці аграрнага сектару рэспублікі.

У 50-я гады ў краіне ўзнікла новая эканамічная сітуацыя. Сутнасць яе ў наступным: значна павялічыліся маштабы савецкай эканомікі, змянілася якасць эканомікі ў сувязі з навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй, якая мела месца ва ўсім свеце, адбыліся пэўныя зрухі ў кадравым патэнцыяле (іх колькасць, расстаноўка). Гэта прывяло да таго, што стары гаспадарчы механізм усё мацней стрымліваў тэхнічную пераўзброенасць, тэхнічны прагрэс. У выніку склалася сур’ёзная супярэчнасць між дасягнутым узроўнем развіцця вытворчасці і магчымасцямі НТР, з аднаго боку, і формамі і метадамі кіравання, старым гаспадарчым механізмам, з другога. Усё мацней выяўлялася празмерная цэнтралізацыя кіравання, камандна-адміністрацыйныя метады ахапілі ўсе звёны эканомікі, спрыялі бюракратызму, скоўвалі ініцыятыву мас. Усё гэта мела месца і ў БССР.

Акрамя таго, да гэтага часу шлях экстэнсіўнага развіцця нашай эканомікі вычарпаў у асноўным свае магчымасці, усё мацней нарастала неабходнасць інтэнсіфікацыі. Меры, прынятыя ў 50-я гады, не знялі гэтых супярэчнасцей.

Пагоршылі справу і неабгрунтаваныя, неабдуманыя перабудовы ў кіраванні. У 1957 г. была ўведзена па сутнасці тэрытарыяльная сістэма кіравання эканомікай – саўнаргасы. У БССР, у прыватнасці, быў утвораны адзін эканамічны раён і ліквідаваны 9 міністэрстваў. Для кіравання саюзна-рэспубліканскай прамысловасцю і будаўніцтвам быў утвораны Савет народнай гаспадаркі БССР, падпарадкаваны Савету Міністраў рэспублікі.

Усё гэта рабілася, каб наблізіць кіраўніцтва да вытворчасці. На справе ж адбыўся разрыў гаспадарчых сувязей і адносін, а парадак планавання і матэрыяльнага стымулявання застаўся ранейшым.

У такіх умовах разгарнулася другая спроба рэфармавання кіравання эканомікай. У сакавіку 1965 г. на Пленуме ЦК КПСС было разгледжана пытанне “Аб неадкладных мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі СССР”, у верасні – “Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці”. Меры, якія ажыццяўлялі на іх аснове, назвалі эканамічнай рэформай. Яна забяспечыла сабою несумненны прагрэс, таму што павялічыла значнасць дзяржразліковых стымулаў і некалькі пашырыла правы прадпрыемстваў, іх самастойнасць. Разам з тым прагрэс гэты быў абмежаваны, перш-наперш таму, што не змяніліся эканамічныя адносіны – удасканаленні ішлі галоўным чынам па лініі больш дакладнага складання планаў, больш

дакладнай адзнакі яго выканання. Ужо гэтыя абставіны, не кажучы аб менш важных, пусцілі рэформу пад адкос.

Перавод прадпрыемстваў на новыя ўмовы ў масавым парадку ажыццяўляўся ў другой палове 60-х гг. Спачатку дасягненні былі больш значнымі, чым у далейшым. Гэта тлумачыцца тым, што першыя поспехі былі дасягнуты ў асноўным за кошт выкарыстання павярхоўных рэзерваў – больш рацыянальнага спажывання рэсурсаў, памяншэння безгаспадарчасці, некаторага павелічэння ўзроўню адзінай тэхнічнай і арганізацыйнай палітыкі ў галінах народнай гаспадаркі.

Некатораму ўздыму сельскай гаспадаркі спрыяла правядзенне ў адпаведнасці з рашэннямі сакавіцкага (1965) Пленума ЦК КПСС такіх мер, як давядзенне цвёрдых планаў дзяржаўных закупак прадуктаў, павелічэнне закупачных цэн на іх, спісанне запазычанасці з калгасаў, правядзенне меліярацыі зямлі за кошт дзяржавы, дазвол ствараць у калгасах і саўгасах падсобныя промыслы; устанаўленне гарантаванай аплаты працы калгаснікаў, увядзенне іх пенсійнага забеспячэння, удакладненне аплаты некаторых найбольш кваліфікаваных катэгорый работнікаў, умацаванне падсобных гаспадарак і інш.

Спробы выкарыстаць эканамічныя стымулы і павялічыць матэрыяльную зацікаўленасць працаўнікоў вёскі, пашырыць эканамічную самастойнасць калгасаў і саўгасаў мелі прагрэсіўны характар. Але і тут прынятыя меры не вызначаліся паслядоўнасцю.

Спачатку рэформы далі дастаткова высокія вынікі. Аб гэтым сведчаць звесткі аб выкананні восьмай пяцігодкі. І ў БССР становішча складалася такім жа чынам. Тут рэформа прывяла да некаторага паляпшэння працы прамысловасці і ўсёй гаспадарчай дзейнасці. Аб’ём прадукцыі прамысловасці за гады восьмай пяцігодкі (1966–1970) павялічыўся на 79% замест 70% па плану. На 39% павялічылася прадукцыйнасць працы.

Рост прамысловай вытворчасці суправаджаўся павелічэннем яго тэхнічнага ўзроўню – за пяць гадоў колькасць паточных і аўтаматычных ліній павялічылася больш чым у два разы, значна павялічылася колькасць комплекснамеханізаваных і аўтаматызаваных вытворчасцей.

Між тым, рэформа як бы прыпынілася пасярэдзіне, на ўзроўні прадпрыемства: яна не дайшла да кожнага рабочага месца, але не закранула і верхні эшалон кіравання. Рэформа не суправаджалася рэфармаваннем палітычнай сістэмы, дэмакратызацыяй, развіццём галоснасці. Гэта звузіла яе рамкі, намечаныя пераўтварэнні не сталі неабарачальнымі. Больш таго, з сярэдзіны 60-х гадоў працэс дэмакратызацыі грамадскага жыцця стаў паступова згортвацца, пачалі ўзмацняцца сілы бюракратычнага кансерватызму.

У 50–80-я гады адбылося станаўленне буйной хімічнай, горнахімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці ў Беларусі (стварэнне вытворчасці калійнай солі ў Салігорску, азотнатукавай вытворчасці ў Гродна, хімічнай вытворчасці ў Гомелі і Новаполацку, нафтаперапрацоўчай вытворчасці ў

Мазыры), радыётэхнічнай і радыёэлектроннай прамысловасці, прадпрыемстваў абарончага комплексу аптычнага прыборабудавання. У гады восьмай (1966–1970 гг.), дзевятай (1971–1975 гг.) і дзесятай (1976–1980 гг.) пяцігодак былі пабудаваны новыя буйныя прадпрыемствы іншых галін вытворчасці. Многія прадпрыемствы пераходзілі на выпуск новай прадукцыі, палепшылася якасць прадукцыі старэйшых заводаў рэспублікі.

У мэтах максімальнага развіцця энтузіязму працоўных выкарыстоўваліся сацыялістычнае спаборніцтва, розныя працоўныя пачыны. І хоць па афіцыйных звестках колькасць удзельнікаў спаборніцтва пастаянна расла (напрыклад, у 1979 г. у рэспубліцы ў асабістых і калектыўных формах спаборніцтва прымалі ўдзел каля 4 млн чалавек, ці 93% агульнай колькасці працоўных, а больш за 2,3 млн чалавек былі ўдзельнікамі руху за камуністычныя адносіны да працы), яно ўсё больш і больш вызначалася фармалізмам, а часта наогул вялося на паперы. Некаторыя "пачыны" ствараліся штучна і хутка паміралі.

Неабходна сказаць, што сярод удзельнікаў спаборніцтва было шмат сапраўдных працаўнікоў – майстроў сваёй справы, якія добрасумленнай і творчай працай стваралі грамадскае багацце. У свой час былі добра вядомы імёны рабочых машынабудаўнічых прадпрыемстваў А. Віташкевіча, Ф. Алексяевіча, У. Прыходчанкі, ткачыхі Мінскага тонкасуконнага камбіната А. Лазарэнкі (60-я гады), ткачыхі Аршанскага льнокамбіната В. Федуковіч, слесара ВА "Інтэграл" А. Камаша, сталявара МТЗ Г. Шышко, снавальніцы магілёўскага ВА "Хімвалакно" В. Харкевіч, аператара Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода Л. Сцяпанава (70-я гады) і шмат іншых.

Нягледзячы на высокія паказчыкі росту прамысловай вытворчасці, з першай паловы 70-х гадоў паралельна існавалі і ўзмацняліся негатыўныя з'явы – адставанне тэмпаў паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу і ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі. І хаця галоўная ўвага ўдзялялася таму, каб забяспечыць паскораны рост найбольш прагрэсіўных галін, асабліва радыётэхнічнай, электроннай, станкабудаўнічай, у поўнай меры навукова-тэхнічны прагрэс закрануў толькі асобныя галіны вытворчасці, перш-наперш тыя, што былі звязаны з патрэбамі абароны. Павялічвалася спажыванне сыравіны і паліва. Зніжаўся рост прадукцыйнасці працы, захоўвалася высокая доля ручной працы, узмацнялася незбалансаванасць у планаванні. У выніку штогод у рэспубліцы 10–15% прамысловых прадпрыемстваў не выконвалі планаў па выпрабу прадукцыі і росту прадукцыйнасці працы.

Павелічэнне дзяржаўных асігнаванняў на патрэбы сельскай гаспадаркі, а таксама выкарыстанне ўласных сродкаў дазволілі калгасам і саўгасам ажыццявіць шырокую праграму будаўніцтва вытворчых памяшканняў, малочна-таварных ферм, жывёлагадоўчых комплексаў. У 70–80-я гады буйныя комплексы па вытворчасці мяса і малака дзейнічалі ў калгасах імя С.М. Кірава і імя Чырвонай Арміі Віцебскага, "Рассвет" Кіраўскага раёнаў, у саўгасах "Днепр" Аршанскага, "Парахонскі" Пінскага, "Новае Палессе" Салігорскага раёнаў і многіх іншых гаспадарках рэспублікі. Па сучасных праектах

забудоўваліся вёскі і мястэчкі, ствараліся будынкі новых школ, бальніц, культурна-асветных устаноў.

У маштабах СССР развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі выглядала нядрэнна: пры 1,7% агульнай па СССР плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў і 2,7% ворнай зямлі ў рэспубліцы ў першай палове 80-х гадоў выраблялася 5,7–5,8% аб'ёму мяса, 15–16% бульбы, 1/4 ільнопрадукцыі ад аб'ёмаў іх вытворчасці ў СССР. Доля паставак у агульнасаюзны фонд мяса складала 12%, малака – 14%.

Рост прамысловасці і сельскай гаспадаркі пазітыўна паўплываў на развіццё сацыяльнай сферы. Рэальныя даходы насельніцтва ў 1970 г. у параўнанні з 1960 г. павялічыліся ў 1,8 разы. За 1960–1985 гг. затраты на сацыяльнае забеспячэнне і сацыяльнае страхаванне выраслі ў 8 разоў, на адукацыю і культуру – у 5 разоў, на медыцынскае абслугоўванне і фізічную культуру – у 4 разы. У сярэдзіне 80-х гадоў грамадскія фонды спажывання склалі каля 5 млрд руб.

Аднак нельга не адзначыць і негатыўныя з'явы. Упарадкаванне аплаты працы слаба ўвязвалася з вынікамі працы і яе якасцю, не ў поўнай меры аплачвалася праца высокакваліфікаваных кадраў. Асартымент і якасць многіх тавараў і паслуг не задавальнялі спажыўцоў, да таго ж прамысловасць недастаткова забяспечвала насельніцтва таварамі. Многія тавары, асабліва высокаякасныя, станавіліся дэфіцытам. Заставалася невырашанай у поўнай ступені жыллёвая праблема.

За два дзесяцігоддзі (з 1960 па 1980 гг.) колькасць насельніцтва БССР павялічылася на 1,4 млн. чалавек. Да 1974 г. быў дасягнуты даваенны ўзровень насельніцтва – звыш 9 млн. чалавек. У сярэдзіне 80-х насельніцтва Беларусі перавысіла 10 млн. чалавек.

У выніку росту гарадоў значна змяніліся суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва, удзельная вага гарадскіх жыхароў у рэспубліцы з 1961 па 1981 г. павялічылася з 33 да 57%, а сельскіх – паменшылася з 67 да 43%.

Эканоміка Беларусі была часткай агульнагаспадарчага комплексу СССР. Беларусь пастаўляла ў саюзныя рэспублікі магутныя аўтасамазвалы, трактары, ЭВМ, тэлевізары, звыш 75–90% металарэзных станкоў, магутных трансфарматараў, мінеральных угнаенняў, хімічных валокнаў, падшыпнікаў (цікава, што ў рэспубліцы выраблялася 1/2 агульнасаюзных аб'ёмаў калійных угнаенняў, 1/6 трактароў, 1/7 металарэзных станкоў). Адпаведна, сыравіна і камплектуючыя дэталі паступалі з усіх рэгіёнаў СССР, што сведчыць аб высокай ступені інтэграванасці эканомікі Беларусі ў эканоміку СССР. Акрамя таго, многія галіны прамысловасці былі звязаны з ваенна-прамысловым комплексам, працавалі на абарону. Пасля развалу СССР і атрымання рэспублікай суверэнітэту гэтыя фактары адмоўна адбіліся на становішчы эканомікі.

Вынікам развіцця эканомікі БССР да сярэдзіны 80-х гадоў з'явілася стварэнне буйнога тэрытарыяльна-галіновага прамысловага комплексу, у якім у 1986 г. налічвалася 1490 прадпрыемстваў, больш паловы з якіх уваходзіла ў

склад вытворчых і навукова-вытворчых аб’яднанняў. Індустрыяльны абрыс рэспублікі пачалі вызначаць магутныя энергетыка, машынабудаванне і прыборабудаванне, хімія і нафтахімія, электроніка і радыёэлектроніка, вытворчасць мінеральных угнаенняў, сінтэтычных валокнаў і іншыя галіны.

Мы бачым, што ўвесь пасляваенны перыяд, у тым ліку і ў 70-я – першай палове 80-х гг., у рэспубліцы вялося інтэнсіўнае капітальнае будаўніцтва, нарошчваліся вытворчыя магутнасці, эканоміка – прамысловасць і сельская гаспадарка – у асноўным працавалі з нядрэннымі вынікамі (асабліва ў параўнанні з агульнасаюзнымі).

Аднак нельга не лічыцца з тым фактам, што ў эканамічным развіцці краіны і нашай рэспублікі ў першай палове 80-х гг. сталі відавочнымі негатыўныя з’явы. Гэта перш-наперш зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, аб чым гаварылася вышэй. Не ўдалося забяспечыць у поўнай меры выхад народнай гаспадаркі БССР, як і СССР у цэлым, на якасна новы навукова-тэхнічны і арганізацыйна-эканамічны ўзровень. Рэспубліка не дабілася рашучага зруху ў інтэнсіфікацыі вытворчасці. За кошт навукова-тэхнічных мерапрыемстваў забяспечвалася толькі 50% прыросту прадукцыйнасці працы. Не адбылося значнага паляпшэння якасці выробленай прадукцыі. Сродкі, укладзеныя ў развіццё эканомікі (асабліва сельскай гаспадаркі), часта давалі нізкую аддачу. У выніку гэтага недастаткова рашаліся сацыяльныя задачы, дабрабыт людзей адставаў ад узроўню развітых краін Захаду. Значна ўскладнілася экалагічная сітуацыя ў выніку бурнага індустрыяльнага развіцця і недаацэнкі прыродаахоўных мер, недахопаў у ахове здароўя і г.д. Усё гэта выклікала сур’ёзную заклапочанасць у грамадстве. Мацней і мацней раздаваліся галасы аб неабходнасці перамен.

## ГЛАВА 2. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ І ДУХОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

### § 1. Асноўныя рысы грамадска-палітычнага развіцця Беларусі

У пасляваенныя гады ў СССР і БССР захоўвалася палітычная сістэма, якая склалася ў 20–30-я гады і была замацавана ў Канстытуцыі СССР 1936 г. і Канстытуцыі БССР 1937 г. Дэкларуючы на словах дэмакратычныя свабоды, палітычны рэжым па сутнасці сваёй заставаўся таталітарным.

Першым крокам у вяртанні да мірнага жыцця (да даваеннай палітычнай арганізацыі) былі выбары ў Вярхоўны Савет СССР (1946), у Вярхоўны Савет БССР (1947) і мясцовыя Саветы рэспублікі (1948). Яны прайшлі пры высокай актыўнасці выбаршчыкаў, у святочнай атмасферы. Савецкія людзі галасавалі за прадстаўнікоў “непарушнага блока камуністаў і беспартыйных”, успрымалі гэтыя выбары як своеасаблівы паказчык вяртання да мірнага жыцця і звязвалі з імі надзеі на будучыню. Пачуццё гонару за сваю зямлю, якая адраджалася з попелу намаганнямі тысяч людзей, павялічвала пачуццё ўласнай годнасці народа, жаданне зрабіць новае пасляваеннае жыццё лепшым, святлейшым.

Але ў пасляваенныя гады новая хваля рэпрэсій прыйшла на Беларусь – чарговыя арышты, дэпартацыі людзей на спецпасяленні і ссылку, абмежаванні на некаторыя віды дзейнасці і г.д. Рэпрэсіі праводзіліся з часу вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў па 1952 год. Асабліва яскрава гэта праявілася ў дзейнасці Л. Цанавы, які ўзначаліў органы дзяржаўнай бяспекі рэспублікі ў 1938–1951 гг., справе Севіча 1951 г. – Наркама асветы рэспублікі, кампаній, накіраваных супраць дзеячоў культуры і г.д.

Вострай была палітычная сітуацыя ў заходніх абласцях Беларусі. Тут прадоўжылі ўзброеную барацьбу супраць савецкай улады групы асоб, якія супрацоўнічалі ў час акупацыі з фашыстамі, атрады Арміі Краёвай і іншыя. Становішча ўскладняла тое, што іх у пэўнай меры падтрымлівалі незадаволеныя сяляне, людзі, якія незаслужана пакутавалі ад рэпрэсій і проста з цяжкім, неадназначным лёсам. Гэта стварала ў некаторым сэнсе сацыяльную базу для антысавецкай барацьбы. Ахвярамі яе станавіліся не толькі партыйныя і камсамольскія актывісты, урачы, настаўнікі, ваеннаслужачыя, але і звычайныя сяляне.

Так, у лютым 1946 г. бандыты ўчынілі 120 забойстваў, 190 грабяжоў і 18 разбояў. Увосень гэтага ж года імі было здзейснена яшчэ 838 вылазак, у тым ліку 43 дыверсіі, 120 падпалаў. Трэба адзначыць, што дзейнасць большасці з гэтых груп і фарміраванняў мела не столькі палітычны, колькі крымінальны характар.

Аднак складаная сітуацыя была не толькі ў заходніх раёнах. Зладзейска-грабежніцкія банды і групы дзейнічалі на ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Яны не ставілі ніякіх палітычных мэтаў, проста рабавалі і забівалі. Так, толькі ў 1947 г. ў Мінскай вобласці органы міліцыі ліквідавалі 34 такія банды агульнай колькасцю 155 чалавек.

Ліквідацыя крымінальных банд была завершана ў 1948 г.

Смерць Сталіна 5 сакавіка 1953 г. падштурхнула даўно наспеўшы працэс аднаўлення грамадства. Ён закрануў усе сферы жыцця грамадства – палітычную, эканамічную, сацыяльную, духоўную. “Хрушчоўская адліга”, ХХ з’езд КПСС (1956 г.) з яго выкрываннямі культу асобы выклікалі глыбокія змены ў грамадска-палітычнай свядомасці. Гэта стала спрыяльнай глебай для ажыўлення навукі, літаратуры, мастацтва.

Былі зроблены некаторыя намаганні па ўдасканаленню палітычнай сістэмы. Ужо ў 1953–1956 гг. было пачата правядзенне лініі на пашырэнне правоў саюзных рэспублік у дзяржаўным, эканамічным і культурным будаўніцтве.

У першай палове 60-х гг. мела месца перабудова дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па вытворчаму прынцыпу (прамысловыя і сельскія), але праз два гады быў адноўлены тэрытарыяльна-вытворчы прынцып іх пабудовы.

Працэс аднаўлення грамадства, які разгарнуўся ў 50-я гады, востра паставіў задачу выпрацоўкі стратэгічнага курсу. Ім стала “разгорнутае будаўніцтва камунізму”, абгрунтаванае ў Праграме КПСС, якая была прынята

на XXII з'ездзе партыі (1961). Значныя паказчыкі эканамічнага росту, дасягнутыя да пачатку 60-х гадоў, высокія тэмпы сярэднегадовага прыросту нацыянальнага даходу, вялікія поспехі ў некаторых галінах (напрыклад, у асваенні космасу) прывялі да памылковых вывадаў праграмы аб стане эканомікі, грамадства наогул і аб іх магчымасцях у бліжэйшай будучыні. Былі дапушчаны пралікі ў выяўленні перспектыў як унутранага развіцця краіны (стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму да 1980 г.), так і міжнародных абставін (вывад аб паглыбленні агульнага крызісу капіталізму).

З другой паловы 70-х гадоў канцэпцыя пабудовы камунізму атрымала лагічны працяг у канцэпцыі развітога сацыялістычнага грамадства. Апошняя стала крыніцай дагматызму ў тэарэтычнай думцы.

Эканамічныя рэформы 60-х гг. таксама патрабавалі дэмакратычных змен у жыцці грамадства. Толькі яны не наступілі. Дэмакратычныя працэсы былі заблакіраваны сіламі бюракратычнага кансерватызму. Грамадскі ўздым паступова змяніўся расчараваннем, і тэзіс аб пабудове развітога сацыялізму не толькі не змяніў грамадска-палітычную атмасферу, настрой людзей, але нават выклікаў іронію.

З сярэдзіны 50-х гадоў неаднаразова рабіліся спробы павялічыць ролю Саветаў у кіраванні дзяржавай і грамадствам. Для таго каб зрабіць дэпутацкую дзейнасць больш выніковай, ствараліся пастаянныя камісіі на розных напрамках дзейнасійці. Так, у 1977 г. мясцовыя Саветы рэспублікі стварылі 10360 пастаяных камісій, у якія ўвайшлі 67093 дэпутатаў – 87% ад агульнай іх колькасці.

Аднак рэальная ўлада знаходзілася ў руках партыйных камітэтаў. І наогул ўсё грамадска-палітычнае жыццё было строга рэгламентавана і цэнтралізавана.

Кіруючай сілай беларускага грамадства з'яўлялася Кампартыя Беларусі. Яе колькасць павялічылася з 48,2 тыс. камуністаў у 1946 г. да 688 тыс. у 1985 г.

Важную ролю ў палітычнай структуры і жыцці грамадства ігралі грамадскія арганізацыі – гэта перш-наперш прафсаюзы (яны павялічыліся з пасляваеннага часу з 350 тыс. да 5 млн. чалавек у сярэдзіне 80-х гг.), якія ўключалі ў сябе амаль ўсіх працуючых, і Ленінскі камуністычны Саюз моладзі (колькасць яго членаў пасля вайны была ледзь больш за 200000, к сярэдзіне 80-х – каля 1,5 млн. чалавек), які ахопліваў амаль усю моладзь. Аднак дзейнасць грамадскіх арганізацый была заарганізавана, цвёрда цэнтралізавана і паступова пачала пакідаць усё менш месца для ініцыятывы асобнага чалавека, актыўнасць іх членаў усё больш фармалізавалася.

Трэба адзначыць, што сярод кіраўнікоў рэспублікі, нягледзячы на вельмі негатыўныя адносіны да былога партыйнага кіраўніцтва ў нашы дні, былі і даволі аўтарытэтныя, кампетэнтныя людзі. І сёння з павагай ўспамінаюць К.Т. Мазурава – першага сакратара ЦК КПБ з 1956 па 1965 гг., С.В. Прытыцкага – Старшыню Вярхоўнага Савета БССР з 1968 па 1971 гг., П.М. Машэрава – Першага Сакратара ЦК КПБ з 1965 па 1980 гг. і інш. Асабліва

яскравай з'яўляецца асоба П.М. Машэрава, а перыяд яго кіраўніцтва – гэта перыяд развіцця эканомікі высокімі тэмпамі.

Усплеск грамадскай актыўнасці быў звязаны з абмеркаваннем і прыняццем Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г. Іх вартасцю была арыентаванасць на абарону сацыяльных гарантый людзей.

## § 2. Адукацыя і навука

Важнай прадумовай развіцця культуры з'яўляецца неабходны адукацыйны ўзровень насельніцтва. У пасляваенны перыяд адбылося аднаўленне і далейшае развіццё сістэмы адукацыі. Павялічваліся асігнаванні на яе патрэбы. За 1946–1950 гг. на аднаўленне і развіццё агульнаадукацыйнай школы было адпушчана 3598,7 млн. рублёў. Гэта дазволіла толькі за кошт дзяржаўных сродкаў пабудаваць 205 школ на 62,4 тысячы вучнёўскіх месц. У канцы 1950 г. у БССР у асноўным была адноўлена даваенная сетка агульнаадукацыйных школ. У 1951–1955 гг. адбылося далейшае пашырэнне сярэдняй адукацыі, якое ішло шляхам арганізацыі новых і пераўтварэння сямігодак у сярэднія школы. Іх колькасць за гэтыя гады вырасла амаль у 2 разы. Палепшыўся і склад настаўніцкіх кадраў: калі ў 1944/45 навучальным годзе працавала 19,7% настаўнікаў з вышэйшай і няпоўнай вышэйшай адукацыяй, то ў 1950/51 – 30,2%, а ў 1955/56 – каля 50%.

У снежні 1958 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР". Адпаведны Закон у БССР быў прыняты ў 1959 г. Ён прадугледжваў увядзенне ўсеагульнага 8-гадовага навучання.

У 70-я гады была ўведзена ўсеагульная сярэдняя адукацыя моладзі. Была пабудавана дастаткова дэмакратычная сістэма народнай адукацыі, якая давала рэальную магчымасць моладзі атрымаць сярэднюю адукацыю. Ужо ў 1977 г. 98% закончыўшых восем класаў працягвалі вучобу ў школе з мэтай атрымання сярэдняй адукацыі. Усё гэта патрабавала адпаведнай перабудовы адукацыі, яе змест (праграмы, вучэбныя планы, падручнікі) прыводзіліся ў адпаведнасць з дасягненнямі навукі і культуры, навукова-тэхнічнага прагрэсу. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі з'явілася адным з буйных дасягненняў сацыялістычнага ладу. Колькасць асоб, атрымаўшых сярэднюю (агульную і спецыяльную) адукацыю, узрасла з 70 тыс. чалавек у 1946–1950 гг. да 779 тыс. у 1971–1975 гг.

Новай спробай рэформы школы было прыняцце ў 1984 г. дакумента "Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы". У сярэдзіне 80-х гадоў сістэма адукацыі ў БССР налічвала 6223 агульнаадукацыйныя школы з 1468 тыс. вучняў; 139 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, звыш 160 тыс. навучэнцаў.

Перабудоўвалася сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Шматлікія навучальныя ўстановы сістэмы працоўных рэзерваў у канцы 50-х і пачатку 60-х гадоў былі пераўтвораны ў адзіны тып навучальных устаноў – гарадскія і

вясковыя прафесійна-тэхнічныя вучылішчы. Іх колькасць у БССР вырасла з 103 у 1961 г. да 233 у 1985 г.

Паспяхова развівалася вышэйшая адукацыя. У 1944/45 навучальным годзе працавалі 22 вышэйшыя навучальныя установы (з 25 існаваўшых да вайны). У 1945 г. у Мінску аднавіў работу Беларускі лесатэхнічны інстытут, які з 1930 г. працаваў у Гомелі. У 1961 г. ён быў пераўтвораны ў Беларускі тэхналагічны інстытут. Адкрыліся новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы: у 1945 г. Беларускі тэатральны інстытут (з 1953 г. – тэатральна-мастацкі), у 1948 г. – Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, у 1950 г. – Брэсцкі педагагічны інстытут (створаны на базе настаўніцкага інстытута).

У 1959 г. было створана Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

За пасляваенныя гады колькасць сярэдніх спецыяльных навучальных установ павялічылася з 94 у 1946 г. да 139 у 1985 г., вышэйшых навучальных установ – з 24 да 33 (колькасць студэнтаў адпаведна з 13 тыс. да 182 тыс.).

Некаторыя поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі дазволілі паступова павялічыць узровень задавальнення духоўных патрабаванняў насельніцтва. Высокімі тэмпамі развівалася сетка культурных установ – бібліятэк, клубаў, музеяў, тэатраў і кінатэатраў. Аб гэтай сферы жыцця грамадства можна меркаваць па даных табліцы:

**Установы культуры Беларускай ССР**

| Культурныя ўстановы | Год | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1940 | 1960 | 1970 | 1975 | 1980 | 1985 |
| Бібліятэкі: | 4173 | 7301 | 7277 | 7154 | 6957 | 6891 |
| Кнігі, часопісы, млн экз. | 6,6 | 31,5 | 60,2 | 76,9 | 87,1 | 100,9 |
| Клубы | 3919 | 5333 | 6091 | 6358 | 6311 | 6374 |
| Тэатры | 20 | 11 | 14 | 14 | 16 | 17 |
| Музеі | 26 | 38 | 48 | 56 | 68 | 90 |

Лічбы ў асноўным унушальныя, калі ўлічваць, з чаго пачыналі ў 1944/45 гг. Між тым, нельга не звярнуць увагу на некаторыя негатыўныя тэндэнцыі – змяншэнне колькасці тэатраў або падзенне тыражоў беларускамоўных кніг.

Паспяхова развівалася навука. У 1944 г. у Мінску зноў пачала сваю дзейнасць Акадэмія навук БССР. У першыя пасляваенныя гады яе калектыў працаваў у цяжкіх умовах. Не хапала памяшканняў, лабараторнага абсталявання, кваліфікаваных кадраў.

Аднаўляліся навукова-даследчыя інстытуты меліярацыі, будаўнічых матэрыялаў, харчовай прамысловасці, лясной гаспадаркі. К канцу 1950 г. у БССР дзейнічала 77 навуковых устаноў, а ў 1958 г. гэтая лічба ўзрасла да 83.

Цэнтрам навуковай працы ў рэспубліцы становіцца Акадэмія навук БССР. У пасляваенныя гады тут праводзіліся работы па стварэнні новых сплаваў, вывучэнні фэрамагнетызму, тэхналогіі апрацоўкі металаў. Паспяхова

распрацоўваліся пытанні калоіднай хіміі, рацыянальнага выкарыстання торфу, праводзіліся даследаванні, накіраваныя на павышэнне ўрадлівасці глебы, культуры земляробства, жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах рэспублікі.

У 1955 г. у сістэме АН БССР быў створаны Інстытут фізікі і матэматыкі, у якім пачалі развівацца новыя навуковыя напрамкі – спектраскапія, люмінесцэнцыя, тэорыя дыферэнцыяльных ураўненняў і вылічальная матэматыка. У 1955 г. ствараецца Інстытут матэматыкі з вылічальным цэнтрам, адкрываецца Аддзел фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, які хутка рэарганізуецца ў Інстытут таго ж профілю. На базе энергетычнага сектара ў 1952 г. ствараецца Інстытут энергетыкі, пераўтвораны ў 1963 г. у Інстытут цяпла – і масаабмену. Арганізаваны ў 1957 г. Інстытут машыназнаўства і аўтаматызацыі перайменаваны пазней у Інстытут праблем надзейнасці і даўгавечнасці машын.

Вучоныя ВНУ прымалі ўдзел у распрацоўцы актуальных тэарэтычных і прыкладных праблем. Так, значныя навуковыя даследаванні праводзіліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Выконваліся навуковыя даследаванні ў політэхнічным і лесатэхнічным інстытутах. Аднаўлялася навуковая дзейнасць сельскагаспадарчых ВНУ. Напрыклад, у Беларускім політэхнічным інстытуце ў 1957 г. арганізаваны дзве навукова-даследчыя праблемныя лабараторыі – аўтамабіляў, сілікатаў і шкла.

Беларускія вучоныя праводзілі таксама даследаванні ў галіне біялогіі, хіміі, генетыкі і інш.

Пашыралася сетка навуковых устаноў, умацавалася іх матэрыяльная і даследча-эксперыментальная база. Толькі за гады IX, X, XI пяцігодак у рэспубліцы створана звыш 30 навуковых устаноў. У 1985 г. навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў шмат якіх галінах ведаў у БССР праводзілі каля двухсот акадэмічных і галіновых інстытутаў, ВНУ і праектна-канструктарскіх арганізацый.

Калі ў 1960 г. у Беларусі было 6840 навуковых работнікаў (уключаючы навукова-педагагічныя кадры ВНУ), у 1970 г. – 21863, то ў 1985 – 42452.

Па шэрагу напрамкаў у БССР узніклі навуковыя школы, вынікі даследаванняў якіх былі прызнаны як у краіне, так і за мяжой. Вядома беларуская школа акадэміка М.П. Яругіна ў галіне звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў; навуковая школа ў галіне алгебры, алгебраічнай геаметрыі і тэорыі лічбаў, якую ўзначальваў акадэмік У.П. Платонаў; буйная школа фізікаў-лазершчыкаў акадэміка Б.І. Сцяпанава. Вялікі аўтарытэт у колах навуковай грамадскасці маюць школы акадэмікаў М.А. Барысевіча, Ф.І. Фёдарава, В.І. Крылова, В.А. Белага, М.С. Казлова, А.С. Махнача, М.А. Дарожкіна. Значны ўклад унеслі беларускія вучоныя ў распрацоўку фізікі элементарных часціц, атамнага ядра, квантавай электронікі, радыёфізікі, фізікі плазмы, паўправаднікоў і дыэлектрыкаў.

Паспяхова распрацоўвалі праблемы хіміі І.Н. Ярмоленка, Н.Ф. Ярмоленка, Б.В. Ерафеева, П.І. Бялькевіч, І.І. Ліштван і інш.; спектраскапіі – В.У. Грузінскі

і С.Н. Талкачоў. Былі вырашаны важныя задачы ў матэрыялазнаўстве, прыборабудаванні, фізіялогіі. Высокага ўзроўню дасягнулі геалагічная, біялагічная, сельскагаспадарчая, геаграфічная галіны навукі.

Дасягненні сусветнага ўзроўню навука Беларусі мае ў матэматыцы, оптыцы і спектраскапіі.

Беларускія вучоныя ўдзельнічалі ў навуковых распрацоўках, звязаных з развіццём абароннага комплексу і асваеннем космасу. І, безумоўна, гонарам рэспублікі з’яўляюцца нашы землякі, касманаўты Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак, якія неаднаразова пабывалі ў космасе.

Дасягненні беларускіх вучоных высока ацэньваліся ў былым СССР. 9 вучоных Беларусі сталі лаўрэатамі Ленінскай прэміі; вучоныя рэспублікі атрымалі 26 Дзяржаўных прэмій СССР і 57 Дзяржаўных прэмій БССР. У мовазнаўстве была падрыхтавана вялікая праца “Граматыка беларускай мовы” (1962, 1966), выдадзены “Русско-белорусский словарь” (1953) і “Беларуска-рускі слоўнік” (1962). У беларускім літаратуразнаўстве вывучаўся вопыт беларускай літаратуры, выдадзены працы “Гісторыя дакастрычніцкай літаратуры” (Т.1., 1968–1969), “Гісторыя беларускай савецкай літаратуры” (Т.1–2, 1964–1966). У гістарычнай навуцы – у 50–60-я гады была выдадзена першая абагульняючая праца “История Белорусской ССР” у 4-х тамах (1984–1987), трохтомнік “Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны” (1967–1982). Друкаваліся працы па філасофіі, эканамічных і іншых навуках. Былі падрыхтаваны і выдадзены “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя” у 12-ці тамах (1969–1975), “Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі” (1984–1987) і інш.

Аднак гуманітарныя навукі ў найбольшай ступені залежалі ад грамадска-палітычнага жыцця, былі вельмі палітызаваны і ідэалагізаваны. Асабліва яскрава гэта праявілася ў грамадскіх навуках, у тым ліку ў гістарычнай. Пад лозунгамі барацьбы супраць “праяўленняў безыдэйнасці і апалітычнасці”, “за чысціню марксісцка-ленінскага светапогляду”, за няўхільнае кіраванне “ленінскімі прынцыпамі класавасці і партыйнасці” знішчаліся навуковыя галіны і школы, укараняўся дагматызм, падаўляліся праяўленні іншадумства. У канцы 40-х – пачатку 50-х гадоў партыйна-дзяржаўнымі органамі была створана і падтрымлівалася атмасфера, паставіўшая гістарычную і іншыя грамадскія навукі ў абмежаваныя рамкі.

### § 3. Літаратура і мастацтва

Духоўны стан грамадства ў значнай ступені знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры. Для беларускай пасляваеннай літаратуры характэрна тое, што ў ёй адбываецца прыкметны рост прозы малых і асабліва буйных жанравых форм. Гераічная эпапея барацьбы народа з фашызмам прыцягвала пільную ўвагу беларускіх пісьменнікаў. Ідэйна-эстэтычнае асэнсаванне ваенных падзей проза пачала па гарачых слядах. У першых творах аб мірным жыцці пісьменнікі

імкнуліся па магчымасці ярчэй перадаць аптымістычны настрой свайго сучасніка.

Прыкладна з 1953 г. у беларускай літаратуры, як і ва ўсесаюзнай, намеціліся новыя тэндэнцыі, звязаныя з актывізацыяй грамадскага жыцця. Пачаўся працэс пераадолення апісальнасці, заглыблення ва ўнутраны свет герояў, у сутнасць канфліктаў пасляваеннай эпохі. У пісьменніцкім асяроддзі разгарнулася дыскусія аб месцы пісьменніка ў жыцці грамадства, аб неабходнасці перагляду ўсталяваных у літаратуры канцэпцый бесканфліктнасці. На першы план паступова вылучаюцца агульначалавечыя маральна-этычныя каштоўнасці, барацьба за маральную чысціню і светлае ў чалавеку. Яскрава гэта праявілася ў аповесці Я. Брыля "На Быстранцы" і асабліва ў рамане І. Шамякіна "Крыніцы".

У першай палове 60-х гг. у выніку ўнутранага ідэйна-мастацкага ўзбагачэння беларуская проза прыйшла да значных здабыткаў. З'яўляюцца раманы: "Людзі на балоце" І. Мележа, "Птушкі і гнёзды" Я. Брыля, "Сэрца на далоні" І. Шамякіна, "Сасна пры дарозе" І. Навуменкі, "На парозе будучыні" М. Лобана, "Засценак Малінаўка" А. Чарнышэвіча. У. Караткевіч адкрыў чытачу паэзію і філасофію гісторыі ("Каласы пад сярпом тваім", "Чорны замак Альшанскі"), а В. Быкаў – з пазіцый гуманізму і антымілітарызму аналізуе і асэнсоўвае чалавека на вайне ("Жураўліны крык", "Сотнікаў", "Воўчая зграя" і іншыя аповесці).

Пільная ўвага да маральна-этычных праблем сучаснасці, да вобраза сучасніка, да ўзаемаадносін навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і лёсу чалавека асабліва характэрна для І. Шамякіна – яго раманы "Атланты і карыятыды" (1974), "Вазьму твой боль" (1978), І. Пташнікава – "Мсціжы" (1972), В. Адамчыка "Чужая бацькаўшчына", "Год нулявы" (1983).

Вельмі плённымі для беларускай драматургіі былі канец 60-х – 70-я гады, калі быў створаны шэраг п'ес, якім было суджана стаць літаратурнай класікай. Менавіта ў гэты час тэатральная грамадскасць нашай рэспублікі і іншых рэспублік былога СССР пазнаёмілася з арыгінальнымі п'есамі "Брама неўміручасці" К. Крапівы, "Трыбунал", "Зацюканы апостал", "Таблетку пад язык", "Кашмар" ("Святая прастата") А. Макаёнка, "Вечар", "Парог" А. Дударава", "Соль", "Трывога" А. Петрашкевіча, з новымі творамі М. Матукоўскага, К. Губарэвіча, У. Караткевіча, А. Дзялендзіка і многіх іншых.

Вялікі ўклад у развіццё беларускага тэатра зрабілі рэжысёры Б. Луцэнка, В. Мазынскі, В. Раеўскі, акцёры З. Браварская, А. Клімава, Г. Макарава, С. Станюта, З. Стома, В. Тарасаў, Ф. Шмакаў, Г. Глебаў, Р. Ржэцкая, У. Дзядзюшка, Н. Радзялоўская, Р. Янкоўскі, М. Яроменка. Кадры акцёраў, рэжысёраў, сцэнографаў, тэатразнаўцаў рыхтаваў усе гэтыя гады Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

З існаваўшых да 1985 г. 17 тэатраў 9 былі драматычных, 6 лялечных, 2 музычныя. Велізарную ролю ў культурным жыцці рэспублікі іграў Вялікі тэатр оперы і балету. Тут працавалі таленавітыя артысты Л. Александроўская,

З. Бабій, І. Сарокін, Н. Ткачэнка, Т. Ніжнікава, Т. Шымко, В. Чарнабаеў, А. Карзянкова, Н. Давідзенка, Р. Красоўская, Л. Бржазоўская, Ю. Траян, В. Саркісьян і іншыя.

У музычнай культуры ў пасляваенныя гады інтэнсіўна развіваюцца жанры сімфоніі і інструментальнай музчыкі. Аб гэтым сведчаць творчасць М. Аладава, Я. Цікоцкага, А. Багатырова, У. Алоўнікава, П. Падкавырава. Напісана значная колькасць музычна-сцэнічных твораў пераважна геаічнай і геаічна-легендарнай тэматыкі (оперы "Машэка" і "Марынка" Р. Пукста, "Андрэй Касценя" М. Аладава, "Кастусь Каліноўскі" Дз. Лукаса і інш., балет "Князь-возера" В. Залатарова).

З другой паловы 1950-х гадоў у развіцці беларускай музыкі пачаўся новы этап, характэрны больш глыбокім засваеннем рэчаіснасці і адыходам ад ілюстрацыйнасці. У сімфанічным жанры паспяхова працуюць М. Аладаў, Л. Абеліёвіч, Р. Бутвілоўскі, Я. Глебаў, А. Мдывані, Дз. Смольскі, Г. Вагнер, у творах канцэртнага жанру – С. Картэс, Г. Вагнер, Дз. Смольскі, В. Раінчык. З'явамі культурнага жыцця сталі балеты "Выбранніца", "Курган", "Альпійская балада", "Тыль Уленшпігель", "Маленькі прынц" Я. Глебава (апошні быў пастаўлены ў Вялікім тэатры СССР у 1983 г.), "Пасля балю" Г. Вагнера, оперы "Новая зямля" Ю. Семянякі, "Сцежкаю жыцця" Г. Вагнера, "Сівая легенда" Дз. Смольскага, "Матухна Кураж" С. Картэса.

Развівалася выяўленчае мастацтва. У першыя пасляваенныя гады мастакі знаходзіліся пад яркім уражаннем геаічных падзей Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху.

У 50-я гады гістарычны жанр як бы зліваўся ў адзіны акорд з тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху. Аднак мастакі працавалі і над беларускай гісторыяй (А. Гугель, Я. Кудрэвіч "Кастусь Каліноўскі", 1958; П. Сергіевіч "Скарына ў друкарні", 1957; А. Кроль "Я. Купала і Цётка ў Пецярбургу ў 1913 годзе", 1954; Я. Ціхановіч, І. Давідовіч "Янка Купала з калгаснікамі", 1961).

У 60-я гады пачала сваю творчую дзейнасць плеяда таленавітых беларускіх мастакоў – Л. Шчамялёў, У. Стэльмашонак, А. Кішчанка, М. Данцыг, Г. Вашчанка, М. Савіцкі. Асабліва яскрава беларускае мастацтва заявіла пра сябе ў 1967 г., у час Усесаюзнай выстаўкі ў Маскве.

Сярод тых, чый творчы лёс адбыўся – выдатны беларускі жывапісец М. Савіцкі. Яго творчасць – шматпланавая. Пачуццём гісторыі, роздумам пра лёс роднай зямлі прасякнута большасць яго палотнаў. Але карціны М. Савіцкага пра партызан Беларусі – значная з'ява ў беларускім нацыянальным жывапісе. Гэта – "Партызанская мадонна", "Партызаны. Блакада", "Аршанскія партызаны", "Клятва" і іншыя творы.

Цэнтральнай фігурай у беларускай пасляваеннай пластыцы, безумоўна, з'ўляецца З. Азгур. Працуючы многа і плённа, ён працягвае пачатую яшчэ ў гады вайны серыю партрэтаў рускіх палкаводцаў, пачынае новыя цыклы: на гісторыка-рэвалюцыйную тэму (партрэты У. Леніна, Ф. Дзяржынскага, Я.

Свярдлова, М. Калініна), цыкл партрэтаў Герояў Сацыялістычнай працы, потым – партрэтаў кіраўнікоў камуністычных і рабочых партый, галерэю партрэтаў вядомых герояў (маршала К.К. Ракасоўскага, К. Заслонава і інш.). Ён працуе і над адной з самых вялікіх серый, якая налічвае дзесяткі партрэтаў прадстаўнікоў культуры мінулага і дзеячаў культуры і мастацтва савецкай Беларусі (Ф. Скарыны (1947), А. Пашкевіч (1947), Я. Колас (1949).

Ярка і важка праявілася творчасць А. Бембеля, А. Глебава, С. Селіханава і іншых скульптараў.

У манументальным мастацтве важнейшай тэмай сталі бяспрыкладны гераізм і ўздым народнага духу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта помнікі, курганы Славы, якія стаяць амаль ва ўсіх населеных пунктах. А самым значным дасягненнем беларускіх архітэктараў і скульптараў гэтага перыяду стаў ансамбль Плошчы Перамогі ў Мінску з абеліскам-помнікам воінам Савецкай Арміі і партызанам, загінуўшым у баях з фашызмам (1954, скульптары – З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, С. Селіханаў, архітэктары У. Кароль, Г. Заборскі).

Паступова манументальнае мастацтва пачынае адыгрываць усё больш важную ролю ў стварэнні горадабудаўнічых структур. Найбольш удалымі прыкладамі кампазіцыйнай сувязі з прасторавым асяроддзем могуць служыць помнікі Я. Купалу (1972, скульптары А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Заспіцкі), комплекс "Мінск – горад-герой", Курган Славы Савецкай Арміі – вызваліцельніцы Беларусі, помнікі Я. Коласу ў Мінску (1972, скульптар З. Азгур), Ф. Скарыне ў Полацку (1974, скульптары А. і І. Глебавы), мемарыяльныя комплексы "Хатынь" (скульптар С. Селіханаў, архітэктары Ю. Градаў, В. Занковіч, Л. Левін), "Брэсцкая крэпасць-герой" (скульптары А. Кібальнікаў, А. Бембель, У. Бабыль, архітэктары У. Кароль, В. Волчак, В. Занковіч, Ю. Казакоў, А. Стаховіч, Г. Сысоеў), Манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў Жодзіне (скульптары А. Заспіцкі, Г. Міско, М. Рыжанкоў, архітэктар А. Трафімчук).

Такім чынам, нават невялікі аналіз таго, што было створана ў сферы культуры, дае падставы гаварыць пра рознабаковае духоўнае жыццё беларускага народа. Беларуская культура мінулых дзесяцігоддзяў духоўная, глыбокая і таму атрымала прызнанне за межамі рэспублікі.

# ГЛАВА 3. БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ

## § 1. Удзел БССР у барацьбе міжнароднага супольніцтва за вырашэнне глабальных сацыяльна-палітычных праблем, за мір і бяспеку

1 лютага 1944 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон, па якому ўсе саюзныя рэспублікі атрымалі права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца консульскімі і дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі.

У сакавіку 1944 г. быў створаны Народны камісарыят (з 1946 г. – Міністэрства) замежных спраў Беларусі. Першым міністрам стаў К. Кісялёў.

Беларусь увайшла ў лік першапачатковых членаў ААН. Уключэнне БССР у склад краін-стваральніц ААН было абумоўлена прызнаннем вялікага ўкладу яе ў разгром агульнага ворага – фашысцкай Германіі, а таксама вялікіх і цяжкіх людскіх і матэрыяльных страт у час вайны.

Палітычныя, эканамічныя, культурныя адносіны звязвалі Беларусь з краінамі свету. Ужо 9 верасня 1944 г. было заключана першае пагадненне паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларусі. Пазней, 25 лістапада 1945 г., быў падпісаны дадатковы пратакол гэтага пагаднення.

Прадстаўнікі беларускай грамадскасці прымалі ўдзел у стварэнні і дзейнасці такіх міжнародных дэмакратычных арганізацый як Сусветная арганізацыя прафсаюзаў (1945), Міжнародная дэмакратычная арганізацыя жанчын (1945), Сусветная арганізацыя дэмакратычнай моладзі (1945), Сусветны Савет Міру (1948) і інш.

БССР настойліва і паслядоўна выступала за пакаранне ваенных злачынцаў. Яе прапановы былі вынесены на разгляд першай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1946). У выніку 13 лютага 1946 г. ААН прыняла рэзалюцыю “Аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў”. Усе краіны міжнароднага супольніцтва павінны былі зрабіць захады па затрыманні ваенных злачынцаў і неадкладнай высылцы іх у тыя месцы, дзе імі былі ўчынены забойствы. Аднак гэта рашэнне ААН не было выканана поўнасцю. Шмат ваенных злачынцаў збеглі з Еўропы і знайшлі надзейны прытулак у ЗША, Канадзе, Лацінскай Амерыцы, Аўстраліі.

Беларуская дэлегацыя прыняла ўдзел у Парыжскай мірнай канферэнцыі, разам з СССР падтрымала ідэю стварэння дзяржавы Ізраіль.

З другой паловы 40-х гадоў пачалася т. зв. “халодная вайна”. І ў 50-я гады міжнароднае становішча заставалася напружаным.

У 1954 г. Беларусь стала пастаянным членам ЮНЭСКА і Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), а ў 1956 г. уступіла ў камітэт ААН па сельскай гаспадарцы і жыллёваму будаўніцтву. Рэспубліка ўдзельнічала ў вырашэнні markdown розных праблем жыцця міжнароднага супольніцтва. З 1951 па 1958 г. яе прадстаўнікі працавалі ў 8 чарговых і 3 надзвычайных Генеральных Асамблеях ААН, больш за 100 міжнародных канферэнцыях і нарадах.

Дзякуючы сумесным паслядоўным намаганням пастаянных членаў ААН, у іх ліку і Беларусі, у гэты перыяд адбывалася часовае аслабленне міжнароднай напружанасці.

У сакавіку 1958 г. было адкрыта пастаяннае прадстаўніцтва Беларусі пры ААН, што садзейнічала пашырэнню ўдзелу Беларусі ў вырашэнні складаных праблем. Прадстаўніцтва пачало ажыццяўляць каардынацыю дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый БССР з асноўнымі органамі ААН,

распаўсюджваць сярод насельніцтва краін свету інфармацыю аб палітычным, эканамічным і культурным жыцці беларускага народа.

Беларусь як член ААН аказвала дапамогу краінам, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, не толькі ў іх нацыянальным вызваленні, але і ў абароне іх дзяржаўнай незалежнасці, развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры. Так, у ліпені 1952 г. на ХІІІ сесіі Генеральнай Асамблеі ААН беларуская дэлегацыя ўнесла прапанову адносна выкарыстання ў развіваючыхся краінах замежнага прыватнага капіталу. Змест яе праследаваў мэту паказаць гэтым краінам тыя негатыўныя з’явы, якія чакаюць іх у будучым з выпадку грабежніцкага выкарыстання багатых прыродных рэсурсаў. Генеральнаму сакратару ААН даручалася забяспечыць вывучэнне ўмоў пагадненняў, якія рэгламентавалі б дзейнасць замежных прыватных кампаній. Аднак прапанова беларускай дэлегацыі не была падтрымана іншымі членамі ААН. Спатрэбіўся час, каб пазней, у 70-х гадах, яна прыняла рашэнні, якія прадугледжвалі атрыманне развіваючыміся краінамі сваёй часткі прыбытку замежнага капіталу ад скарыстання іх прыродных рэсурсаў.

Сусветнае супольніцтва хвалявала і вырашэнне такіх праблем, як барацьба супраць голаду, хвароб, за захаванне навакольнага асяроддзя. Так, Беларусь першай у 1959 г. на ХІХ сесіі Генеральнай Асамблеі ААН унесла прапанову аб заахвочванні навуковых пошукаў у галіне барацьбы з ракам. Прапанова атрымала падтрымку з боку ўсіх краін свету. У лістападзе 1959 г. Асамблея прыняла рашэнне, якое прызначала выданне грашовай прэміі агульнай сумай у 100 млн дол. за лепшыя навукова-даследчыя працы па вывучэнні прычын ракавых захворванняў, барацьбы з імі.

У канцы 50 – пачатку 60-х гадоў адбываюцца новыя змены ў міжнародным супольніцтве. Часова скарачаецца доля ЗША ў эканоміцы міравой сістэмы капіталізму.

Беларусь як член ААН разам з іншымі краінамі рашуча выступіла за спыненне баявых дзеянняў у Індакітаі.

Беларусь актыўна выступала за поўную ліквідацыю каланіялізму ў свеце. На XV сесіі Генеральнай Асамблеі (1960) яна разам з СССР і Украінай унесла прапанову прыняць Дэкларацыю аб прадастаўленні незалежнасці ўсім каланіяльным краінам і народам. Прапанова была падтрымана большасцю членаў ААН. Дэкларацыя з’явілася высновай для канчатковай ліквідацыі каланіялізму ў свеце.

БССР прымала ўдзел у распрацоўцы і прыняцці ў 1968 г. ХХІІ сесіяй ААН Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Па ўмовах гэтага дагавора ўсе неядзерныя дзяржавы абавязваліся не вырабляць, не размяшчаць, не выкарыстоўваць ядзернай зброі. Свае абавязацельствы рэспубліка выконвае паслядоўна. У 1990 г. яна абвясціла аб статусе бяз’ядзернай дзяржавы, а ў 1994 г. замацавала яго ў новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Улічваючы пагрозу выкарыстання ядзернай зброі, Беларусь далучылася да шэрага міжнародных дагавораў, у іх ліку: “Аб прынцыпах дзейнасці дзяржаў па

вывучэнні і выкарыстанні касмічнай прасторы, уключаючы Луну” (1967), “Аб забароне размяшчэння на дне мораў і акіянаў, у яго нетрах ядзернай зброі і іншых сродкаў масавага знішчэння людзей” (1971), “Канвенцыя аб забароне бактэрыялагічнай (біялагічнай) і таксічнай зброі” (1972), “Канвенцыя аб забароне ваеннага або ўсялякага іншага варожага выкарыстання сродкаў уздзеяння на прыроднае асяроддзе” (1977) і інш.

БССР з’яўлялася членам міжурадавай арганізацыі ЮНЭСКА – аднаго са спецыялізаваных органаў ААН. Галоўнай мэтай гэтай арганізацыі, акрамя развіцця адукацыі, навукі і культуры, было садзейнічанне ўмацаванню міру і бяспекі.

Прадстаўнікі Беларускага камітэта абароны міру ў 1973, 1979 гг. удзельнічалі ў рэйдах міру па краінах Паўночнай Еўропы.

Значным дасягненнем краін-удзельніц ААН, у тым ліку і Беларусі, з’явілася правядзенне ў 1975 г. нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, на якой прысутнічалі кіраўнікі 33 еўрапейскіх дзяржаў, ЗША і Канады.

Хельсінкская нарада сведчыла аб уступленні Еўропы ў новы гістарычны перыяд разрадкі міжнароднай напружанасці.

На мяжы 70–80-х гадоў разрадка міжнароднай напружанасці змянілася абвастрэннем адносін паміж ЗША і СССР.

Дэлегацыі Беларусі ў ААН даводзілася разам з іншымі весці барацьбу за спыненне выкарыстання касмічнай прасторы ў ваенных мэтах. Гэта было звязана з тым, што з прыходам да ўлады прэзідэнта Р. Рэйгана ЗША пачалі ажыццяўляць праграму “зоркавых войнаў” з выкарыстаннем ядзернай зброі. Таму ў 1981–1985 гг. беларуская дэлегацыя разам з украінскай і іншымі ў розных рэдакцыях выносіла на абмеркаванне ААН амаль адны і тыя ж прапановы аб забароне выкарыстання касмічнай прасторы ў ваенных мэтах. Аднак гэта праблема не вырашалася. Толькі ў 1993 г. ЗША прынялі рашэнне аб спыненні выкарыстання праграмы “зоркавых войнаў”.

Такім чынам, з’яўляючыся пастаянным членам ААН, БССР на працягу 1945–1985 гг. прымала актыўны ўдзел у распрацоўцы і ажыццяўленні рашэнняў гэтай арганізацыі па самых разнастайных праблемах жыцця міжнароднага супольніцтва.

## § 2. Развіццё гандлёва-эканамічных адносін БССР з замежнымі краінамі

Важнае месца ў міжнароднай дзейнасці БССР займала развіццё эканамічных сувязей з замежнымі краінамі. Гаворачы аб гэтым, неабходна ўлічваць геапалітычнае становішча Беларусі. Праз яе тэрыторыю праходзілі шляхі зносін з Усходу на Захад і з Поўначы на Поўдзень. Шырокая сетка аўтамабільных, чыгуначных, паветраных, водных шляхоў зносін давала магчымасць ёй весці рознабаковае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва як з былымі рэспублікамі СССР, так і з еўрапейскімі краінамі.

Беларусь, як і іншыя саюзныя рэспублікі былога СССР, не мела самастойнага выхаду за мяжу ў эканамічных адносінах. Рэалізацыяй тавараў,

выраблених на экспарт прадпрыемствамі рэспублікі, займаліся Міністэрства замежнага гандлю СССР і яго знешнегандлёвыя аб’яднанні. Беларусь выступала ў якасці пастаўшчыка тавараў па заказах гэтых ведамстваў.

Уступленне ў ААН, развіццё эканомікі ў пасляваенны перыяд дазволілі Беларусі выйсці на шлях шырокага эканамічнага супрацоўніцтва з сацыялістычнымі, капіталістычнымі і развіваючыміся краінамі.

У студзені 1949 г. быў створаны Савет Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ). У яго ўвайшлі СССР, Польшча, Балгарыя, Венгрыя і іншыя краіны Усходняй Еўропы. Пазней далучыліся ГДР, Куба, В’етнам. Галоўнай мэтай дзейнасці СЭУ з’яўлялася развіццё эканамічнага супрацоўніцтва, абмен вытворчым вопытам, перадача навукова-тэхнічнай інфармацыі, прамысловая кааперацыя, пашырэнне эканамічнай інтэграцыі ў розных галінах вытворчасці і г.д.

З гэтага моманту пачынаецца новы перыяд знешнеэканамічных адносін Беларусі з замежнымі краінамі. Эканоміка рэспублікі як састаўная частка адзінага гаспадарчага комплексу СССР была ўключана ў знешнеэканамічныя сувязі з рознымі краінамі свету.

У 1952 г. у Мінску было створана аддзяленне Усесаюзнай гандлёвай палаты, праз якое ажыццяўлялася мэтанакіраваная палітыка ў галіне знешнеэканамічных адносін.

Павялічыліся пастаўкі машын і прамысловага абсталявання з рэспублікі перш за ўсё сацыялістычным краінам Еўропы. Вялікім попытам карысталася прадукцыя такіх прадпрыемстваў, як МАЗ, МТЗ, Гомсельмаш, станкабудаўнічых заводаў Мінска, Віцебска і інш. На долю краін СЭУ прыпадала звыш 2/3 экспартных паставак з БССР.

У другой палове 50-х гадоў прадукцыя больш за 120 прадпрыемстваў рэспублікі пастаўлялася на экспарт. Значна пашыраліся пастаўкі аўтамабіляў, самазвалаў, трактароў, металарэзных станкоў, снегаачышчальнікаў, падшыпнікаў, электраабсталявання, радыётэхнікі, швейных вырабаў. Галоўнае месца ў структуры экспарту займалі вырабы машынабудавання і металаапрацоўкі, якія павялічыліся амаль у 3 разы.

Беларусь не толькі пастаўляла вырабы на экспарт, але і атрымлівала імпартную прадукцыю. Перш за ўсё гэта былі сельскагаспадарчая тэхніка, сродкі транспарту і сувязі, медыцынская абсталяванне, прамысловыя і харчовыя тавары, сыравіна для лёгкай і харчовай прамысловасці. У 50-х гадах Беларусь атрымлівала з Егіпта, Сірыі, Ірана, Афганістана, Пакістана баваўняную сыравіну, з Індыі, Марока, Аргенціны, Уругвая – воўну і шарсцяное прадзіва, з Інданезіі і Малайзіі – натуральны каўчук, з Ганы, Нігерыі, Бразіліі, Эквадора – сыравіну для кандытарскай прамысловасці і г.д.

У другой палове 60-х годоў павялічваецца аб’ём гандлёвых паставак беларускіх тавараў у капіталістычныя краіны, асабліва па доўгатэрміновых пагадненнях. Значным попытам карысталіся металаапрацоўчыя станкі, якія набывалі фірмы 14 капіталістычных краін, у тым ліку Англіі, ФРГ, Аўстрыі, Японіі, Даніі і інш. Экспарт трактароў павялічыўся больш чым утрая. Яны

пастаўляліся ў 11 капіталістычных краін. Сярод іх былі Канада, Фінляндыя, Швецыя і інш.

У 70-я гады эканоміка Беларусі ўсё больш і больш інтэгрыравалася не толькі ў агульнасаюзную, але і ў эканоміку сацыялістычных еўрапейскіх краін. Рэспубліка з'яўлялася актыўным удзельнікам стварэння адзінай энергетычнай сістэмы "Мір", будаўніцтва нафтаправода "Дружба", газаправода ў Заходнюю Еўропу. З Беларусі ў сацыялістычныя краіны пастаўляліся навейшае абсталяванне для будаўніцтва энергетычных аб'ектаў, прадпрыемстваў металургічнай і металаапрацоўчай галін прамысловасці, мінеральныя ўгнаенні, тавары народнага спажывання і г.д.

Вучоныя, канструктары, інжынеры і тэхнікі рэспублікі разам са спецыялістамі шэрагу сацыялістычных краін прынялі ўдзел у распрацоўцы і асваенні адзінай еўрапейскай сістэмы сродкаў вылічальнай тэхнікі. Асноўнымі ўдзельнікамі гэтай працы з'яўляліся калектывы Мінскага завода вылічальнай тэхнікі імя С. Арджанікідзе, інстытутаў электронна-вылічальнай тэхнікі і матэматыкі АН БССР, Мінскага радыётэхнічнага інстытута. Вынікам сумеснай працы з'явілася цэлае пакаленне электронна-вылічальных машын сямейства ЕС.

У пачатку 70-х гадоў на долю беларускага экспарту ў сацыялістычныя краіны прыпадала: электронна-вылічальных машын – 91%, матацыклаў – 88, металарэжучых станкоў – 70, грузавых аўтамабіляў – 56, трактароў – 54%. Усяго больш за 300 прадпрыемстваў Беларусі пастаўлялі сваю прадукцыю прыкладна ў 100 краін свету.

Больш за 80% экспарту ў развіваючыяся краіны прыпадала на стварэнне і развіццё іх нацыянальнай прамысловасці і звязаных з ёй галін вытворчасці. Таму ў беларускім экспарце значнае месца займалі пастаўкі тэхналагічнага абсталявання, прыбораў, вузлоў для будаўніцтва і аснашчэння новых прадпрыемстваў.

Беларусь з'яўлялася надзейным рынкам збыту тавараў з развіваючыхся краін. Толькі ў 1978 г. імпарт з краін Азіі і Афрыкі склаў больш за 9% ад агульнага імпартнага аб'ёму. У рэспубліку паступалі тавары з 23 развіваючыхся краін.

Для паскарэння тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці, іншых галінах гаспадаркі важнае значэнне мелі знешнегандлёвыя і тэхніка-эканамічныя сувязі з развітымі капіталістычнымі краінамі. У 1970–1980 гг. на іх долю прыпадала 22,5% усіх экспартных паставак рэспублікі. Пашырэнню такога супрацоўніцтва спрыяў даволі высокі ўзровень эканамічнага развіцця рэспублікі. Сярод іншых рэспублік былога Саюза ССР Беларусь займала 1-е месца па вытворчасці сіласаўборачных камбайнаў і калійных угнаенняў, 2-е – грузавых аўтамабіляў, хімічных валокнаў, матацыклаў, наручных гадзіннікаў, 3-е – мінеральных угнаенняў, металарэзных станкоў, трактароў, шкла, панчошна-трыкатажных вырабаў, тэлевізараў, мэблі і іншых тавараў. Таму невыпадкова, што прадметамі экспарту ў капіталістычныя краіны, у тым ліку і развітыя,

з'яўляліся перш за ўсё трактары, аўтамабілі, бульдозеры, скрэперы, халадзільнікі, станкі-паўаўтаматы, гадзіннікі, азотныя і калійныя ўгнаенні і г.д. Каля паловы экспарту прыпадала на долю машынабудавання – вядучай галіны прамысловасці рэспублікі.

У сваю чаргу, на Беларусі шырока выкарыстоўваліся тэхнічныя вырабы з развітых капіталістычных краін. Абсталяваннем, якое пастаўлялася з Англіі, Францыі, ФРГ, Італіі, іншых краін, забяспечваліся прадпрыемствы хімічнай, радыётэхнічнай, лёгкай, харчовай прамысловасці. Сярод іх былі Полацкі і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы; Гомельскі, Гродзенскі хімічныя камбінаты; Магілёўскі завод сінтэтычнага валакна, Мінскі завод халадзільнікаў, шэраг мясакамбінатаў і малочных заводаў. Увозіліся і тавары шырокага ўжытку.

Развіццю эканамічных адносін Беларусі з рознымі краінамі свету спрыяла тое, што яна актыўна ўдзельнічала ў рабоце шматлікіх міжнародных арганізацый – Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), Эканамічнай камісіі для Еўропы (ЭКЕ), яе камітэтаў па сельскай гаспадарцы, лесаматэрыялах, электраэнергіі, жыллёвым будаўніцтве, Міжнароднага саюза электрасувязі (МСЭ), Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) і інш.

У 1960 г. Беларусь далучылася да канвенцыі 1928 г. аб міжнародных выстаўках. З гэтага моманту яна прымала актыўны ўдзел у рабоце Міжнароднага бюро выставак, адказвала за арганізацыю іх на Беларусі. Толькі ў 60-х гадах у Мінску было праведзена звыш 30 самых разнастайных выставак.

У 70–80-х гадах Беларусь з'яўлялася месцам правядзення спецыялізаваных міжнародных выставак, што сведчыла аб прызнанні яе ўкладу ў тую або іншую галіну навукі і тэхнікі. У Мінску праходзілі выстаўкі: "Бульба-76", "Парашковая металургія-73, 77", "Холад-78", "Мяспроммаш-79" і інш.

## § 3. Культурныя, навуковыя, спартыўныя і турысцкія сувязі БССР

Важнае месца ў супрацоўніцтве з замежнымі краінамі займалі навуковыя, культурныя, спартыўныя і турысцкія сувязі. Іх няспыннае пашырэнне з'яўлялася неад'емнай часткай жыцця рэспублікі, неабходным сродкам умацавання і паглыблення дружалюбных адносін паміж беларускім і іншымі народамі свету. Яны садзейнічалі ўмацаванню даверу, паглыбленню навукова-тэхнічнага і гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і ў канчатковым выніку захаванню міру і бяспекі паміж народамі.

З 1958 г. пачало дзейнічаць Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі (БелТД). Галоўнай мэтай яго з'яўлялася пашырэнне міжнародных сувязей, распаўсюджванне за мяжой праўдзівай інфармацыі аб сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці беларускага народа.

У 70-х гадах на Беларусі дзейнічала каля 100 таварыстваў дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі. Яны мелі адносіны з 400 арганізацыямі амаль 70 краін свету.

Станоўчую ролю ў развіцці адносін Беларусі з іншымі дзяржавамі адыгрываў створаны ў 1958 г. Камітэт маладзёжных арганізацый рэспублікі (КМА БССР). Ён каардынаваў сувязі беларускай моладзі са сваімі паплечнікамі за мяжой.

У 1971–1980 гг. Беларусь наведала каля 100 прафсаюзных дэлегацый амаль з 20 краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Прадстаўнікі працоўных калектываў замежных краін знаёміліся з умовамі жыцця і працы розных катэгорый насельніцтва рэспублікі, формамі і метадамі дзейнасці прафсаюзных арганізацый, наведвалі музеі, тэатры, мясціны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі беларускага народа.

Дзейснай формай развіцця міжнародных культурных адносін з’яўлялася супрацоўніцтва ў галіне літаратуры. Лепшыя творы вядомых беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, А. Куляшова, І. Шамякіна, В. Быкава, Н. Гілевіча, П. Панчанкі, А. Макаёнка і іншых перакладаліся на польскую, чэшскую, венгерскую, румынскую і іншыя мовы народаў свету. У 1978 г. у Індыі выйшаў зборнік апавяданняў беларускіх пісьменнікаў пад назвай “Лясная песня”. У яго ўвайшлі творы К. Чорнага, І. Навуменкі, В. Быкава і іншых пісьменнікаў.

Адным з важных накірункаў пашырэння культурных сувязей рэспублікі з замежнымі краінамі з’яўлялася супрацоўніцтва ў галіне адукацыі. Яно ажыццяўлялася ў самых розных формах: узаемадзеяння паміж кіруючымі органамі адукацыі, абмену дэлегацыямі, падрыхтоўкі студэнтаў, вывучэння вопыту працы, перадачы падручнікаў, навуковай, грамадска-палітычнай, мастацкай літаратуры, абсталявання і г.д.

Пашырэнню культурных сувязей Беларусі з замежнымі краінамі садзейнічаў узаемны абмен перыядычнымі выданнямі. Асабліва добра было наладжана гэта супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі. Праз сістэму “Саюздруку” штодзённа паступалі насельніцтву Беларусі перыядычныя выданні і часопісы сацыялістычных краін. У сваю чаргу, беларускія газеты і часопісы высылаліся за мяжу. У Мінску выходзіла газета “Голас Радзімы”, якая інфармавала сваіх суайчыннікаў за мяжой аб жыцці беларускага народа.

На Беларусі існавала добрая традыцыя адзначаць знамянальныя святы, прысвечаныя жыццю і дзейнасці выдатных прадстаўнікоў сусветнай культуры. Такія святкаванні былі арганізаваны ў гонар заснавальнікаў славянскай пісьменнасці Кірыла і Мяфодзія, французскага пісьменніка і асветніка Жан-Жака Русо, іспанскага драматурга Лопэ дэ Вега, вынаходніка Галілео Галілея і інш. У гэтыя дні праводзіліся ўрачыстыя пасяджэнні, тэматычныя вечары, навуковыя канферэнцыі, юбілейныя чытанні, выстаўкі і г.д.

Пашыралася такая форма культурнага супрацоўніцтва як правядзенне дзён нацыянальнай культуры. У 70–80-х гадах Дні культуры БССР адбыліся ў Індыі, Іраку, Калумбіі, Мексіцы, Сірыі і іншых краінах. У сваю чаргу на Беларусі праходзілі Дні культуры Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Фінляндыі і іншых краін. У гэтыя дні праводзіліся тэматычныя кінафестывалі, выстаўкі

кніг, фотаздымкаў, творчыя вечары, сустрэчы з вучонымі, пісьменнікамі, мастакамі і іншымі дзеячамі навукі і культуры. Прыязджалі шматлікія дэлегацыі з прадстаўнікоў парламенцкіх і ўрадавых колаў, палітычных і грамадскіх арганізацый, навуковых і культурна-асветных устаноў. Праводзіліся экскурсіі ў музеі, па гістарычных мясцінах, на прадпрыемствы, у навучальныя ўстановы.

Цікавай формай культурных сувязей БССР з замежнымі краінамі з’яўляўся абмен выступленнямі калектываў тэатраў, філармоній, мастацкай самадзейнасці, канцэртных брыгад, асобных выканаўцаў. Перад насельніцтвам рэспублікі ў розныя гады выступалі артысты Сафійскай оперы, дзяржаўнай філармоніі Венгрыі, Дрэздэнскага джазавага аркестра, Славацкага народнага аркестра, зорак польскай эстрады, а таксама ансамблі венгерскай народнай музыкі і танца “Дунай” і “Чардаш”, ансамблі “Рытмы Кубы”, народнай песні і танца Манголіі, танца Гвінейскай Рэспублікі, калектывы з Аргенціны, Бразіліі, Мексікі, Канады, Японіі і іншых краін.

Важным сродкам сувязей паміж народамі з’яўляўся турызм. Колькасць турыстаў штогод павялічвалася. Калі ў 1960 г. ад прафсаюзных арганізацый выязджала за мяжу 535 чалавек, то ў 70-я гады ў сярэднім за год больш за 7 тыс. чалавек.

Значнае месца адводзіла рэспубліка супрацоўніцтву з замежнымі краінамі ў галіне спорту. З 1948 г. сістэмны характар набывае ўдзел беларускіх спартсменаў у разнастайных міжнародных спаборніцтвах. З 1952 па 1980 г. на XV–XXII Алімпійскіх гульнях у складзе зборных каманд СССР удзельнічалі 150 беларускіх спартсменаў, якія выступалі ў 16 відах спорту. Беларускія алімпійцы заваявалі каля 100 медалёў, у тым ліку 50 залатых. Усяму свету добра вядомы імёны пераможцаў Алімпійскіх гульняў А. Раманькова, А. Мядзведзя, В. Корбут і многіх іншых. Па прапанове мэра горада Чыкага дзень 26 сакавіка 1974 г. быў абвешчаны ў ЗША днём Вольгі Корбут. У гэтай краіне было створана больш за 500 спартыўных клубаў В. Корбут па гімнастыцы. ЮНЭСКА прысвоіла ёй ганаровае званне “Пасол міру”.

На тэрыторыі Беларусі праводзіліся шматлікія міжнародныя спартыўныя гульні (турніры фехтавальшчыкаў (1966), па сучаснаму пяцібор’ю (1972), скачках у ваду “Вясеннія ластаўкі” (1972–1980), па біятлону, стральбе з лука і інш.).

У пасляваенны перыяд атрымала распаўсюджванне такая форма міжнародных адносін, як супрацоўніцтва гарадоў-пабрацімаў.

Такім чынам, беларускі народ ажыццяўляў разнастайныя сувязі з народамі краін свету.

# РАЗДЗЕЛ X. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФОРМ: САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ. ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА (1985 – 2006 гг.)

## § 1. Палітыка перабудовы, яе змест і шляхі ажыццяўлення: розныя погляды і меркаванні

**Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця.** 10 сакавіка 1985 г. Генеральным сакратаром ЦК КПСС быў выбраны М.С. Гарбачоў. З яго палітычнай і дзяржаўнай дзейнасцю як першага кіраўніка краіны звязана правядзенне шматлікіх рэформ, якія ўрэшце-рэшт прывялі да змены сацыялістычнага дзяржаўнага і грамадскага ладу, да рэстаўрацыі капіталізму ў СССР.

У сярэдзіне 80-х гг. Савецкі Саюз апынуўся ў складаным становішчы. Запавольваліся тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця, не заўсёды дасягненні навукі і тэхнікі ўкараняліся ў вытворчасць, нізкай была якасць многіх відаў прадукцыі, не хапала высокаякасных тавараў на рынку, па некаторых паказчыках прыпыніўся рост жыццёвага ўзроўню народа. Патрабавалася рэфармаванне палітыка-эканамічнай сістэмы, якая ў аснове сваёй сфарміравалася ў СССР у 1920 – 1930-я гг.

***Пленум ЦК КПСС у красавіку 1985 г. прыняў курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР.*** Гэты палітычны курс меркавалася ажыццявіць за кошт трох асноўных фактараў: 1) навукова-тэхнічны прагрэс, прыярытэтнае развіццё машынабудаўнічага комплексу – базы гэтага прагрэсу; 2) структурная перабудова эканомікі – прыпыненне затратнага капітальнага будаўніцтва і выкарыстанне сродкаў, якія вызваляюцца пры гэтым, на тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыю прадпрыемстваў; 3) актывізацыя чалавечага фактару – павышэнне творчай, стваральнай актыўнасці людзей, умацаванне працоўнай дысцыпліны, павышэнне зацікаўленасці людзей у выніках працы, актывізацыя руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў.

Аднак тагачасная эканоміка СССР была недастаткова ўспрымальнай да новых ідэй, дасягненняў навукі і тэхнікі. У сувязі з ростам і вялікімі маштабамі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнікла напружанне ў забеспячэнні яе сыравінай і энергетычнымі рэсурсамі. Зніжэнне цэн на сусветным рынку на сырую нафту прывяло да таго, што ў 1985 – 1986 гг. даходы ад яе экспарту паменшыліся на 1/3 частку. Гэта вельмі ўскладніла закупку абсталявання за мяжой. Ва ўмовах старой сістэмы арганізацыі працы і яе аплаты сур'ёзнай матэрыяльнай зацікаўленасці работнікаў не атрымалася. На справе адбывалася не паскарэнне, а запавольванне сацыяльна-эканамічнага развіцця.

У мэтах паляпшэння якасці выпускаемых вырабаў на прадпрыемствах краіны была ўведзена ***дзяржаўная прыёмка прадукцыі***. Спроба вырашыць праблему якасці заменай ведамаснага кантролю на новую бюракратычную

структуру прывяло да разбухання адміністрацыйнага персаналу, парушэння рытмічнасці ў рабоце прадпрыемстваў. Якасць прадукцыі заставалася ранейшай, бо на рынку з-за дэфіцыту тавараў і паслуг быў даволі высокім спажывецкі попыт на любыя вырабы, у тым ліку і няякасныя.

Незадаволенасць і азлабленне ў большасці насельніцтва краіны выклікала ***антыалкагольная кампанія***, якая праводзілася па ініцыятыве ЦК КПСС у 1985 – 1988 гг. Благародная па сваіх мэтах (барацьба з “народнай бядой” – п’янствам і алкагалізмам) яна праводзілася выключна адміністрацыйна-забарончымі метадамі. У спешным парадку закрываліся магазіны, якія гандлявалі спіртным, а таксама гарэлачныя заводы, у Крыму, Малдавіі і на Доне пачалі высякаць вінаграднікі. Па ініцыятыве мясцовых партыйных і савецкіх органаў былі створаны “зоны цвярозасці”, у якіх гандль спіртнымі напоямі быў цалкам забаронены. Камсамол дапамагаў у арганізацыі “безалкагольных вяселляў”, а на памінкі, юбілеі і з нагоды іншых выпадкаў алкагольныя напоі адпускаліся па спецыяльных праўках. Масавы характар набыло самагонаварэнне. Антыалкагольная кампанія моцна пахіснула грашова-фінансавую сістэму краіны. Значная частка грошай ад продажу гарэлкі пайшла на ўзбагачэнне “ценявікоў” і карумпіраваных чыноўнікаў.

***26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай АЭС***, што на мяжы Беларусі і Украіны, узарваўся чацвёрты энергаблок. Загінулі і атрымалі вялікія дозы выпраменьвання дзесяткі тысяч людзей, значныя тэрыторыі Беларусі, Украіны і Расіі падвергліся радыёактыўнаму забруджванню. Тое, што кіраўніцтва СССР не паведаміла адразу аб сапраўдных маштабах трагедыі, з’явілася падставай для крытыкі савецкай сістэмы. Расходы дзяржавы на пераадоленне вынікаў аварыі складалі дзесяткі мільярдаў рублёў.

У 1986 г. курс на “паскарэнне” цалкам праваліўся. Чацвёртая частка прадпрыемстваў не выканала вытворчыя планы, 13 % з іх былі затратнымі. У студзені 1987 г. пачаўся спад вытворчасці, які не ўдалося прыпыніць і які стаў пачаткам глыбокага эканамічнага крызісу. Аднак большасць насельніцтва краіны негатыўныя эканамічныя наступствы закранаалі не мацней, чым у ранейшыя гады, а да розных кампаній людзі прывыклі і па вопыту ведалі, што трэба пачакаць і ўсё вярнецца ў ранейшае русла. Таму большасць народа верыла М.С. Гарбачову і працягвала падтрымліваць яго курс.

**Палітыка перабудовы, яе змест і шляхі ажыццяўлення.** ***XXVII з’езд КПСС (25 лютага – 6 сакавіка 1986 г.) і XIX Усесаюзная канферэнцыя КПСС (28 чэрвеня – 1 ліпеня 1988 г.) удакладнілі палітычны курс і вызначылі палітыку перабудовы, абнаўлення ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства.***

Перабудову прадугледжвалася праводзіць у рамках сацыялістычнага выбару, сацыялістычных ідэалаў і каштоўнасцей пад лозунгам: “Больш дэмакратыі, больш сацыялізму”. Яе мэтамі былі пераадоленне дэфармацый сацыялізму, больш поўнае раскрыццё яго патэнцыяльных магчымасцей, дэмакратызацыя ўсіх бакоў жыцця савецкага грамадства, рэфармаванне

палітычных інстытутаў дзяржавы. Прадугледжвалася правядзенне выбараў у Саветы ўсіх узроўняў з удзелам некалькіх кандыдатаў.

Для таго каб народ сапраўды паверыў ў безальтэрнатыўнасць перабудовы, яе ініцыятары стваралі міфы і праз сродкі масавай інфармацыі ўносілі ў грамадскую свядомасць. Сярод міфаў, створаных ініцыятарамі перабудовы, – міфы аб крызісных, застойных з’явах у савецкай эканоміцы, аб “цывілізаваным Захадзе” і “нецывілізаваным СССР”, “райскім жыцці” на Захадзе і “пякельным жыцці” у нас (хаця ўзровень жыцця вышэйшы чым у СССР быў толькі ў 15 % насельніцтва Зямлі, а ў 80 % насельніцтва ён быў ніжэйшы, чым у СССР), “сапраўднай дэмакратыі” ў іх і “тыраніі, таталітарызме” у нас і інш. Некаторыя паверылі ў гэтыя міфы і разам з апазіцыяй удзельнічалі ў разбурэнні савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу.

У ходзе ажыццяўлення палітыкі перабудовы значна пашырылася самастойнасць прадпрыемстваў і аб’яднанняў у выніку іх пераходу на поўны ***гаспадарчы разлік і самафінансаванне***. Працоўныя калектывы атрымалі права выбіраць кіраўнікоў, рэгуляваць заработную плату і адлічэнні на сацыяльныя патрэбы. Укараняліся прагрэсіўныя формы арганізацыі працы – ***арэндныя калектывы, гаспадарчыя разліковыя брыгады***.

Больш дэмакратычнай станавілася выбарчая сістэма, ***развіваліся галоснасць і плюралізм думкі***, ***фарміравалася шматпартыйная сістэма***. Больш магчымасцей стала для ажыццяўлення дэмакратычных правоў і свабод грамадзян, для творчай дзейнасці.

Разам з тым ў грамадстве з’явіліся капіталістычныя тэндэнцыі, прапагандавалася ўзбагачэнне любымі сродкамі. Многія дырэктары прадпрыемстваў здавалі ў арэнду з правам выкупу частку дзяржаўнай маёмасці, а затым за сімвалічную плату пераводзілі яе ў прыватную ўласнасць. Становішча яшчэ больш ускладнілася, калі ў 1988 г. быў апублікаваны ***Закон СССР аб кааперацыі***.

Пад назвай кааператываў былі ўзаконены тыповыя капіталістычныя прадпрыемствы з правам найму работнікаў, якія не з’яўляліся іх членамі, з правам купляць сыравіну і паўфабрыкаты па стабільных дзяржаўных цэнах, а прадаваць прадукцыю па свабодных рыначных цэнах. Кааператывы пачалі ствараццa ўсюды, у тым ліку і на базе дзяржаўных прадпрыемстваў. Рэсурсы і грошы з дзяржаўнай казны пачалі пераводзіцца ў прыватныя кішэні. Вытворчая дзейнасць кааператараў амаль не цікавіла. Яны працавалі пераважна ў гандлёва-пасрэдніцкай сферы, куплялі тавары па танных, а прадавалі па вельмі высокіх цэнах. Кааператыўная дзейнасць станавілася эфектыўным сродкам для “адмывання брудных грошай” і стварэння вялікіх капіталаў. Сацыяльнае напружанне ў грамадстве ўзмацнялася, маёмасная дыферэнцыяцыя павялічвалася.

***З адменай дзяржаўнай манаполіі на знешні гандаль*** і з дазволам прадпрыемствам і прыватным асобам прадаваць за рубеж тавары сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў краіне ў 1987 – 1990 гг. значна пагоршылася. Пусцелі

прылаўкі магазінаў, падскочылі рознічныя цэны, прадукты харчавання адпускаліся па "картачках спажыўцоў", якія выдаваліся па месцы жыхарства. Пачалася маштабная міжнародная спекуляцыя, якая прывяла да вывазу буйных капіталаў за граніцу і стварэння магутных крымінальных структур. Эканоміка СССР і яе грашова-фінансавая сістэма ляжалі ў руінах.

***Палітыка "галоснасці"***, абвешчаная М.С. Гарбачовым, пасеяла сумненні наконт сацыялізму як дасканалай сістэмы. Пачаўся працэс паступовай падмены сацыялізму іншымі ідэаламі і каштоўнасцямі. Ідэя сацыяльнай справядлівасці абвяшчалася шкоднай і недасягальнай, пепсі, снікерс і жвачка – сімваламі далучэння да заходняга ладу жыцця, эканоміка гандлёва-базарнага тыпу – вяршыняй эканамічнай практыкі. Пачалі прапагандавацца культ нажывы, асабістай выгады па прынцыпу "хочаш жыць – умей круціцца", а таксама тое (насілле, парнаграфія, прастытуцыя, аднаполыя шлюбы, бамжаванне і г. д.), што ў савецкі час лічылася зневажаючым чалавека і грамадства. Людзей заклікалі не працаваць, а піць, гуляць, весяліцца. Рэальныя праблемы, якія стаялі перад краінай, патанулі ў балбатні, кабінетным пражакцёрстве. Усё часцей і часцей у сродках масавай інфармацыі, на мітынгах і ў чыноўных кабінетах стала гучаць фраза вядомага літаратурнага героя Астапа Бэндара "Захад нам дапаможа". Быў зроблены антынавуковы і шкодны вывад аб тым, што савецкая сістэма не рэфарміруема, а таму павінна быць разбурана, знішчана.

Як бачна, антысаветызм стаў ідэалагічнай зброяй курсу М.С. Гарбачова, а галоснасць фактычна ператварылася ў ідэалагічную вайну, накіраваную на змену дзяржаўнага і грамадскага ладу СССР.

**Фарміраванне палітычнай апазіцыі ў Беларусі.** Працэс фарміравання палітычнай апазіцыі ў Беларусі пачынаўся з амаль непрыкметнай з'явы – значнага павелічэння ліку аматарскіх нефармальных аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах. У 1986 – 1987 гг. у рэспубліцы ўзнікла 7 тыс. такіх аматарскіх аб'яднанняў і клубаў, якія налічвалі каля 1 млн. чалавек. Спачатку палітычныя пытанні ў праграмы клубаў і аб'яднанняў не ўключаліся. Напрыклад, мінская "Талака" ў сваёй праграме заяўляла, што будзе займацца выключна праблемамі нацыянальнай самабытнасці, захоўваннем помнікаў гісторыі і культуры.

Аднак прыкладна з другой паловы 1987 г. у дзейнасці клубаў і арганізацый усё больш і больш пачынаюць праяўляцца цэнтралізацыя і палітызацыя. У выніку перагавораў з уладамі ў снежні 1987 г. было дазволена правесці пад Мінскам вальны сойм беларускіх суполак. Удзельнікі яго гаварылі аб дэфармацыях сацыялізму, неабходнасці пабудовы сапраўднага сацыялізму, адраджэння беларускай нацыянальнай культуры. Спасылаючыся на У.І. Леніна, яны рабілі спробы крытыкаваць кіраўніцтва Беларусі. Гэта быў ужо, безумоўна, не культурна-асветны, а палітычны рух. Ішла самая звычайная палітычная барацьба пад прыкрыццём лозунга адраджэння нацыянальнай культуры. Пачыналася канфрантацыя маладзёжных суполак з ЦК КПБ, партыйнымі і камсамольскімі органамі.

У 1989 г. у БССР ствараецца штаб палітычнай апазіцыі – Беларускі народны фронт “Адраджэнне”. Яго праграма, статут і іншыя дакументы мелі адкрыта антысавецкую і антыкамуністычную накіраванасць. На заклікі апазіцыі да знішчэння савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу адэкватнае прававое рэагаванне адсутнічала. Больш таго, узмацнілася яе канфрантацыя з праваахоўнымі органамі, партыйнымі і дзяржаўнымі структурамі. Не было і адпаведнага палітыка-арганізацыйнага рэагавання на дзеянні некаторых камуністаў і кіраўнікоў розных узроўняў, якія сталі на шлях неабгрунтаванай крытыкі савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу.

У 1988 – 1989 гг. у СССР была сфарміравана новая структура вышэйшых органаў улады – З’езд народных дэпутатаў СССР і Вярхоўны Савет СССР, які ствараўся на з’ездзе з ліку дэпутатаў і працаваў пастаянна. На Першым з’ездзе народных дэпутатаў СССР у маі – чэрвені 1989 г. старшынёй Вярхоўнага Савета СССР быў выбраны М.С. Гарбачоў.

У 1986 – 1990 гг. адбыліся крывавыя канфлікты на нацыянальнай глебе ў Якуцку, Алма-Аце, Нагорным Карабаху, Тбілісі, Фергане, Ошскай вобласці Кіргізіі, Сумгаіце, Баку, Душанбэ і іншых гарадах. Няўменне і нежаданне цэнтра знаходзіць рашэнне нацыянальных канфліктаў канчаткова дыскрэдытавалі ў вачах мясцовага насельніцтва КПСС і звязаныя з ёю ўладныя структуры. Палітычны прэстыж апазіцыі ў нацыянальных рэспубліках СССР, яе аўтарытэт і ўплыў узрасталі. Канчатковая палітычная развязка набліжалася.

## § 2. Дзяржаўны пераварот у Маскве ў жніўні 1991 г. Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Ліквідацыя СССР: розныя погляды і меркаванні

**Падзеі 1990 – 1991 гг. у СССР і БССР.** 1990 г. з’яўляецца пераломным, лёсавызначальным годам у гісторыі Савецкай дзяржавы. Далейшы ход падзей быў лагічным працягам і завяршэннем таго, што адбылося менавіта ў гэтым годзе. Што ж адбылося ў 1990 г.?

Вясной 1990 г. на альтэрнатыўнай аснове прайшлі ***выбары ў рэспубліканскія і мясцовыя органы ўлады***, у ходзе якіх патрабаванне адмены 6-га артыкула Канстытуцыі СССР стала ядром палітычных дыскусій, атрымала падтрымку на мітынгах. На выбарах вялікіх поспехаў дабіліся так званыя “дэмакраты” і нацыянал-сепаратысты.

На пленуме ЦК КПСС, які адбыўся ў пачатку 1990 г., М.С. Гарбачоў прапанаваў выступіць з заканадаўчай ініцыятывай аб выключэнні з Канстытуцыі СССР яе 6-га артыкула аб кіруючай ролі КПСС, замацаваць у новай платформе партыі палітычны плюралізм, змешаную эканоміку і шматпартыйнасць, увесці пасаду прэзідэнта краіны. Паслухмяныя ўдзельнікі пленума без супраціўлення капітулявалі і пагадзіліся з прапановай свайго генсека аб добраахвотнай перадачы ўлады ў краіне антысацыялістычным сілам. Нечарговы ***Трэці З’езд народных дэпутатаў СССР у сакавіку 1990 г. адмяніў***

***6-ы артыкул савецкай Канстытуцыі і ўвёў пасаду Прэзідэнта СССР***. З'езд на безальтэрнатыўнай аснове выбраў М.С. Гарбачова Прэзідэнтам СССР.

Падзеі сакавіка 1990 г. сталі сігналам для нацыянал-сепаратыстаў Эстоніі, Азербайджана, Арменіі, Латвіі, Літвы, Грузіі і іншых рэспублік. Яны аб'явілі аб суверэнітэце рэспублік. Па сутнасці былі здзейснены антыдзяржаўныя парламенцкія перавароты. Цэнтральная ўлада бяздзейнічала, злачынна патворнічала сепаратызму нацыяналістаў. Больш таго, быў прыняты Закон СССР "Аб парадку рашэння пытанняў, звязаных з выхадам саюзнай рэспублікі з СССР". Саюзныя рэспублікі фактычна запрашаліся пакінуць СССР, хоць гэты працэс абстаўляўся ўмовамі і тэрмінамі. Механізм арганізацыйнага распаду краіны быў запушчаны.

Аднак рашаючы ўдар па СССР быў нанесены ў маі – чэрвені 1990 г. на першым З'ездзе народных дэпутатаў Расіі ў Маскве. У выніку напружанай палітычнай барацьбы Б.М. Ельцын з нязначнай перавагай галасоў быў выбраны Старшынёй Вярхоўнага Савета РСФСР. 12 чэрвеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР.

Падзеі ў Маскве ў маі – чэрвені 1990 г. узмацнілі "парад суверэнітэтаў" і цэнтрабежныя тэндэнцыі ў краіне, ініцыіравалі прыняцце падобных дэкларацый у іншых рэспубліках. ***27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі ў складзе савецкай федэрацыі.*** Прынятае рашэнне не выражала волі большасці беларускага народа.

Кіраўніцтва СССР замест узмацнення цэнтралісцкіх пачаткаў з апорай на большасць насельніцтва стала на шлях заахвочвання дэцэнтралізацыі, перадачы рэспублікам часткі паўнамоцтваў цэнтра, перахода народнагаспадарчых комплексаў рэспублік на гаспадарчы разлік і ўстанаўленне прамых эканамічных сувязей паміж рэспублікамі, прыдання мовам тытульных нацый статуса дзяржаўных. Чым больш цэнтр саступаў саюзным рэспублікам, тым мацней гучалі патрабаванні ў яго адрас з боку нацыянальных эліт.

***Летам 1990 г. адбыўся апошні XXVIII з'езд КПСС.*** На з'ездзе М.С. Гарбачоў выступіў з новай ідэяй перабудовы, на гэты раз перабудовы КПСС на манер заходняй сацыял-дэмакратыі. Паслухмяныя дэлегаты з'езда адобрылі прапанову свайго генсека ў рэзалюцыі "Да гуманнага дэмакратычнага сацыялізму" і тым самым падпісалі сваёй партыі смяротны прыгавор. На з'ездзе з КПСС дэманстратыўна выйшаў Б.М. Ельцын. З восені 1990 г. пачынаецца працэс выхаду з партыі радавых камуністаў і самароспуску партарганізацый на прадпрыемствах і ўстановах.

Сітуацыя яшчэ больш ускладнілася, калі ўрад СССР на чале з М.І. Рыжковым у сярэдзіне 1990 г. прадставіў ***праграму выхаду эканомікі з крызісу і пераходу да рынкавых адносін***. Аналагічная праграма была распрацавана і адобрана ў Беларусі. Глыбокі эканамічны крызіс, "хваробу" савецкай эканомікі кіраўніцтва СССР вырашыла лячыць "лекавымі сродкамі" капіталізму. Гэта была незаўважаная народам афіцыйная змена палітычнага

курсу КПСС і Савецкай дзяржавы, бо рынак з усімі яго атрыбутамі – з’ява капіталістычнага, а не сацыялістычнага грамадства. Але тады рабіў сваю справу ідэалагічны камуфляж: рынак – гэта ўніверсальны сродак выхаду з крызісу і квітнення любой эканомікі.

Айчынная “дэмакратыя” з дапамогай Захаду ўзмацняла намаганні па развалу Саюза ССР, знішчэнні існуючага ладу. Каб пазбегнуць абвінавачвання ва ўмяшанні ва ўнутраныя справы СССР, былі створаны шматлікія “фонды”, “цэнтры”, “саветы”, “асацыяцыі”, якія афіцыйна лічыліся прыватнымі, недзяржаўнымі арганізацыямі, а фактычна знаходзіліся пад кантролем спецслужб. Апазіцыйныя “дэмакратычныя” арганізацыі СССР атрымлівалі з-за мяжы матэрыяльную і фінансавую дапамогу: факсы, ксераксы, камп’ютэры, друкарскія станкі, тэлексы, відэакамеры і іншую тэхніку, грошы на фінансаванне навуковых тэм, падрыхтоўку вучэбных дапаможнікаў, слоўнікаў, энцыклапедый і г. д.

Палітычнае і прававое супрацьстаянне паміж Масквой і саюзнымі рэспублікамі стала набываць бесперапынны характар. IV З’езд народных дэпутатаў СССР у снежні 1990 г. абмеркаваў ідэю Саюзнага дагавора і прыняў рашэнне аб правядзенні рэферэндума па пытанні захавання Саюза ССР. ***Рэферэндум адбыўся 17 сакавіка 1991 г.*** Ён не праводзіўся ў Літве, Латвіі, Эстоніі, Арменіі, Малдавіі і Грузіі. Гэты “бунт” нацыянальных эліт не знайшоў адпаведнага рэагавання з боку цэнтральных улад. У рэферэндуме прыняло ўдзел 148,6 млн. чалавек, ці каля 80 % грамадзян СССР, якія мелі права голасу. 113,5 млн. чалавек, ці 76,4 % выказаліся за захаванне СССР. У Беларусі за захаванне СССР прагаласавала 82,7 % агульнай колькасці выбаршчыкаў.

14 жніўня 1991 г. быў надрукаваны тэкст новага Саюзнага дагавора, які насіў супярэчлівы характар. Падпісанне дагавора павінна было адбыцца 20 жніўня 1991 г. Украіна пры гэтым заявіла, што яна не падпіша дагавор да таго часу, пакуль не будзе прынята свая канстытуцыя. Усе рэспублікі Сярэдняй Азіі, не ставячы ў вядомасць Маскву, заключылі паміж сабой сістэму двухбаковых пагадненняў.

**Дзяржаўны пераварот у Маскве ў 1991 г.** 4 жніўня 1991 г. М.С. Гарбачоў пакінуў Маскву і паехаў адпачываць на крымскую дачу ў Форасе. Перад ад’ездам ён даў свайму бліжэйшаму акружэнню даручэнне рыхтаваць увядзенне надзвычайнага становішча ў шэрагу рэгіёнаў СССР. 18 жніўня 1991 г. прадстаўнікі цэнтра прыехалі ў Форас, азнаёмілі М.С. Гарбачова са складам будучага Дзяржаўнага камітэта па Надзвычайнаму становішчу (ГКЧП) і прапанавалі падпісаць адпаведны ўказ. М.С. Гарбачоў адмовіўся гэта зрабіць, чым адразу ператварыў сваіх “гасцей” у загаворшчыкаў. Гэта вельмі нагадвала палітычную правакацыю.

Тады раніцай 19 жніўня 1991 г. усе сродкі масавай інфармацыі перадалі заяву ГКЧП аб тым, што М.С. Гарбачоў не можа выконваць свае абавязкі “па стану здароўя”, а яго паўнамоцтвы пераходзяць да віцэ-прэзідэнта Г.М.Янаева. Для недапушчэння хаосу і анархіі ў асобных мясцовасцях уводзілася

надзвычайнае становішча. Прыпынялася дзейнасць палітычных партый і арганізацый, уводзілася цэнзура, забараняліся мітынгі і дэманстрацыі.

У Маскве аб'яўлялася каменданцкая гадзіна. У сталіцу былі ўведзены войскі, якія ніякіх дзеянняў не прадпрымалі. Вакол "Белага дома", дзе знаходзіліся органы ўлады і кіравання Расіяй, збіраліся масквічы, у асноўным інтэлігенцыя і студэнты, будаваліся барыкады. Кіраўнікі Расіі ў звароце да грамадзян назвалі ГКЧП "рэакцыйным антыканстытуцыйным пераваротам" і запатрабавалі склікання Надзвычайнага з'езда народных дэпутатаў СССР. Выступленне Б.М. Ельцына, які залез на танк, дабаўляла яму папулярнасці. Сваім указам Прэзідэнт Расіі перападпарадкаваў сабе ўсе органы выканаўчай улады СССР, якія знаходзіліся на тэрыторыі Расіі, у тым ліку КДБ, МУС і міністэрства абароны. 21 жніўня 1991 г. прадстаўнікі ГКЧП вылецелі ў Форас для сустрэчы з М.С. Гарбачовым, але ён іх не прыняў. Лідэры ГКЧП былі арыштаваны і аддадзены пад суд. Вечарам 21 жніўня 1991 г. М.С. Гарбачоў вярнуўся ў Маскву, цалкам адмежаваўся ад сваіх саратнікаў.

Вучоныя і палітыкі неадназначна ацэньваюць падзеі 19 – 21 жніўня 1991 г. ***Адны з іх лічаць***, што гэтыя падзеі нельга кваліфікаваць як "дзяржаўны пераварот", "путч", "загавор", бо члены ГКЧП СССР не планавалі карэнных змен у дзяржаўным ладзе краіны. Яны, наадварот, стараліся захаваць існаваўшы канстытуцыйны парадак, адзіную дзяржаву, дзяржаўны і грамадскі лад перад пагрозай яго знішчэння. Яны не згаворваліся тайна супраць прэзідэнта СССР. ***Другія (былы прэм'ер-міністр В.С. Паўлаў і інш.) сцвярджаюць***, што падзеі 19 – 21 жніўня 1991 г. – гэта "сапраўдны дзяржаўны пераварот, добра падрыхтаваны і прафесійна праведзены Гарбачовым – Ельцыным па спецзаказу". Галоўным у "спецзаказе" было разбурэнне СССР і перавод краіны на капіталістычны шлях развіцця. ***Трэцяя група даследчыкаў лічыць***, што выступленне ГКЧП СССР у абарону краіны і яе Канстытуцыі было няўдалым, непрафесійным. Гэкачэпісты аказаліся пешкамі ў грандыёзнай правакацыі, якая была падрыхтавана і праведзена "сусветнай закулісай"[9]. Іх абманным шляхам

---

[9] Неўрадавыя палітычныя арганізацыі самых багатых і ўплывовых людзей свету, якія ставяць сваёй мэтай дасягненне поўнай планетарнай інтэграцыі, пераход ад мноства дзяржаў, народаў, нацый і культур да уніформнага свету на чале з сусветным урадам. Інакш іх называюць ***масонскімі*** ці ***мандзіялісцкімі*** (ад французскага *monde* – свет) арганізацыямі.

Першая мандзіялісцкая арганізацыя была створана ў 1921 г. амерыканскім банкірам Морганам. Большасць яе членаў складалі масоны. Арганізацыя называлася ***Саветам па міжнародных адносінах (CFR)***. Другая арганізацыя – ***Більдэрбергскі клуб*** – створана ў 1954 г. у галандскім горадзе Астэрбеку ў гасцініцы "Більдэрберг", адкуль і адпаведная назва. Гэта міжнародны працяг CFR. Членамі арганізацыі з'яўляюцца не толькі амерыканскія палітыкі, фінансісты, аналітыкі і інтэлектуалы, але і іх еўрапейскія калегі. Большасць членаў Більдэрбергскага клуба складаюць масоны. Трэцяя мандзіялісцкая арганізацыя – ***Трылатэраль***, ці ***Трохбаковая камісія***, – створана ў 1973 г. актывістамі Більдэрбергскага клуба, якія сабраліся на арганізацыйнае пасяджэнне ў доме Дэвіда Ракфелера. Яе штаб-кватэры знаходзяцца ў ЗША, Еўропе і Японіі.

Сучасныя масоны, мандзіялісты, глабалісты – "грамадзяне свету", "творцы новага суственага парадку і глабальнага грамадства" на чале з сусветным урадам. Яны

уцягнулі ў заведама правальнае мерапрыемства, якому прысвоілі катэгорыю “путчу” з тым, каб прыбегнуць да немагчымых у звычайнай сітуацыі надзвычайных мер па змене існуючага ладу. Гэкачэпісты, на іх думку, – ахвяры вялікага зману.

**Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі.** Падзеі 19 – 21 жніўня 1991 г. *паскорылі працэс распаду СССР.* ***25 – 26 жніўня 1991 г. нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”***, пастанову аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР. ***19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў закон аб назве Беларускай ССР, у адпаведнасці з якім яна пачала называцца “Рэспубліка Беларусь”, а ў скарочаных назвах “Беларусь”. Герб “Пагоня” і бела-чырвона-белы сцяг сталі дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь.***

23 жніўня 1991 г. некаторыя дэпутаты Вярхоўнага Савета РСФСР у рэзкай форме запатрабавалі ад М.С. Гарбачова распусціць КПСС. М.С. Гарбачоў добраахвотна капітуляваў, пакінуў пасаду Генеральнага сакратара ЦК КПСС і распусціў Цэнтральны Камітэт партыі. Указамі Б.М. Ельцына ў жніўні 1991 г. дзейнасць КПСС і КП РСФСР прыпынялася, а ў лістападзе гэтага года – наогул забаранялася, іх маёмасць падвяргалася канфіскацыі. У жніўні 1991 г. Вярхоўны Савет Беларусі часова прыпыніў дзейнасць КПБ на тэрыторыі рэспублікі. Яе маёмасць была перададзена ва ўласнасць дзяржавы. Была знішчана палітычная сіла, якая супрацьдзейнічала новым уладам у ажыццяўленні палітыкі капіталістычнай рэстаўрацыі і на адзінстве якой трымалася адзінства і непадзельнасць СССР.

**Ліквідацыя СССР.** ***8 снежня 1991 г.*** у Белавежскай пушчы (у Віскулях Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці) кіраўнікі Расіі, Беларусі і Украіны (Б. Ельцын, С. Шушкевіч, Л. Краўчук), ігнаруючы волю сваіх народаў, якая была выказана на агульнасаюзным рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г., дэнансавалі дагавор 1922 г. аб утварэнні СССР і тым самым канчаткова знішчылі вялікую і магутную дзяржаву. І гэты дзяржаўны пераварот быў здзейснены са згоды прэзідэнта СССР М. Гарбачова. Савецкі Саюз прыпыніў сваё існаванне. На руінах СССР была створана аморфная, нежыццяздольная Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Дакументы сустрэчы ў Віскулях былі адобраны Вярхоўнымі Саветамі Расіі, Беларусі і Украіны, большасць дэпутатаў якіх складалі былыя камуністы.

21 снежня 1991 г. на сустрэчы ў Алма-Аце кіраўнікі 11 рэспублік былога СССР падпісалі Дэкларацыю ў падтрымку Белавежскага пагаднення. Членамі СНД сталі ўсе былыя саюзныя рэспублікі, акрамя Літвы, Латвіі і Эстоніі.

---

прапаведуюць “агульначалавечыя каштоўнасці” і аддаюць перавагу “усяленскім інтарэсам” перад інтарэсамі нацыянальнымі. Для іх любая краіна – гэта толькі “месца пражывання”, а не Айчына. Яны – “героі” не столькі нацыянальнай, колькі сусветнай гісторыі.

Сцвярджэнні некаторых вучоных і палітыкаў аб тым, быццам Савецкі Саюз развальваўся сам, дажываў апошнія дні, а тыя, хто сабраўся ў Белавежскай пушчы, толькі зрабілі надпіс на магільнай пліце СССР, як і сцвярджэнне аб тым, быццам СССР быў імперыяй, з'яўляюцца міфамі, якія запушчаны ў народ для дыскрэдытацыі шматнацыянальнай краіны і апраўдання дзеянняў тагачасных кіраўнікоў Беларусі, Расіі і Украіны. На рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г. народ выказаўся за захаванне СССР, а воля народа – гэта самы важны аргумент на карысць існавання краіны, у якой былі, безумоўна, праблемы і цяжкасці. Больш таго, у 1922 г. абвяшчалі СССР не толькі БССР, РСФСР і УССР, але і Закаўказская Федэрацыя. Прадстаўнікоў Арменіі, Азербайджана і Грузіі, як і іншых саюзных рэспублік, у Белавежскую пушчу не запрасілі.

Большасць вучоных і палітыкаў ацэньваюць Белавежскія пагадненні аб канчатковым знішчэнні СССР і стварэнні СНД як дзяржаўны пераварот і параўноўваюць яго са жнівеньскім путчам 1991 г. На беларускай зямлі было здзейснена злачынства, акт здрады ў адносінах да СССР і яго народаў. Гэту калектыўную здраду ажыццявілі перш-наперш вышэйшыя кіраўнікі краін, работнікі партыйнага апарату, ідэалагічныя правадыры і прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты. А каб апраўдаць здраду, быў прыдуманы "ідэалагічны камуфляж", які прымусіў значную частку насельніцтва ўспрымаць яе як памылкі савецкага кіраўніцтва і асабіста М.С. Гарбачова.

Для захавання СССР як абноўленай федэрацыі раўнапраўных суверэнных рэспублік патрабавалася ў першую чаргу палітычная воля расійскага кіраўніцтва на чале з Б.М. Ельцыным. Аднак сваімі дзеяннямі кіраўніцтва Расіі наносіла моцныя ўдары па СССР, стымулюючы ўзмацненне цэнтрабежных сіл, распад і хаос. Таму, лічаць даследчыкі, адказнасць за развал СССР нясуць у аднолькавай ступені М.С. Гарбачоў і Б.М. Ельцын, а таксама іх паплечнікі. Кожны з іх з улікам абставін і часу рабіў адну і тую ж справу. Палітыка перабудовы аслабіла СССР да такой ступені, што далейшае яго існаванне станавілася праблематычным. Нова-агароўскія "пасядзелкі" як тактычны манёўр адцягвалі ўвагу і ўспакойвалі народ, прытуплялі ў ім адчуванне бяды, насустрач якой ішла краіна. У той жа час сепаратысцкія настроі нацыянальных эліт узмацняліся. Пасля жнівеньскага (1991 г.) путчу ініцыятыва ў развале СССР перайшла да Б.М. Ельцына, які завяршыў тое, што пачаў М.С. Гарбачоў.

У сувязі з прыпыненнем існавання СССР 25 снежня 1991 г. прэзідэнт СССР М.С. Гарбачоў склаў свае паўнамоцтвы. Над Крамлём чырвоны сцяг СССР быў заменены трохкаляровым расійскім. Перабудова, якую М.С. Гарбачоў і яго "каманда" пачыналі "за здравие социализма", закончылася "за упокой его души".

**Прычыны краху савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу.** Крах савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу быў абумоўлены, ***па-першае***, сур'ёзнымі памылкамі і пралікамі КПСС, якія былі дапушчаны ў распрацоўцы і правядзенні палітыкі перабудовы. Адсутнічала канкрэтная, навукова

абгрунтаваная праграма абнаўлення савецкага грамадства, не былі дакладна вызначаны мэты і задачы, канчатковыя вынікі. Гэта дазволіла на практыцы лозунг “Больш дэмакратыі, больш сацыялізму” незаўважна для народа падмяніць лозунгам “Больш капіталізму, больш разбуральнай дэмагогіі”. У грамадстве з’явіліся капіталістычныя тэндэнцыі – узбагачэнне любымі сродкамі. Бачачы гэтыя негатыўныя працэсы, значная частка народа стала абвінавачваць КПСС, партыйную эліту і ўсіх тых, па чыёй ініцыятыве пачалася перабудова. Сацыялістычныя ідэалы ў вачах мільёнаў абясцэньваліся, аўтарытэт КПСС катастрафічна падаў.

***Па-другое***, негатыўныя працэсы і з’явы ў грамадскім жыцці суправаджаліся моцнай прапагандысцкай кампаніяй па дыскрэдытацыі КПСС, Савецкай дзяржавы, савецкага ладу жыцця, дасягненняў краіны. Гэта кампанія ажыццяўлялася пры патуранні і дапамозе, а іншы раз і пры асабістым удзеле вышэйшых партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў краіны – М. Гарбачова, Б. Ельцына, А. Якаўлева, Э. Шэварднадзе, І. Сілаева, В. Бакаціна і інш.

***Па-трэцяе***, шмат папрацавала на карысць распальвання антысавецкай і антыкамуністычнай істэрыі частка навуковай, творчай і тэхнічнай інтэлігенцыі. Ідэолагам “амерыканізацыі” краіны ўдалося метадам сацыяльнай дэмагогіі раз’яднаць працоўных, выклікаць схільнасць да хістанняў і крайніх дзеянняў. Людзей прымусілі паверыць, што тыя, хто не здрадзіў сваім поглядам, – гэта рэакцыянеры, кансерватары, якія заслугоўваюць пагарды, а тыя, хто за адзін дзень змяніў погляды, перафарбаваўся, – гэта сапраўдныя героі, новыя барацьбіты за “светлую будучыню народа”. Прапагандысцкія намаганні апазіцыі і рэнегатаў-камуністаў давалі ім значныя палітычныя дывідэнды.

***Па-чацвёртае***, не садзейнічалі павышэнню аўтарытэту і ўзмацненню палітычнага ўплыву КПСС адарванасць яе вярхоў ад народа і шматмільённай арміі радавых камуністаў, пратэкцыянізм, хабарніцтва, карупцыя, замкнутасць партыйнай іерархіі, шырокае распаўсюджанне бюракратызму ў рабоце, недэмакратычнасць кадравай палітыкі, грубае падаўленне іншадумства. Памылкі ў кіраўніцтве выдаваліся за ўсеагульную некампетэнтнасць і бяздарнасць партакратаў, а недахопы ў развіцці сацыяльна-эканамічнай і духоўна-маральнай сфер – за трагедыю і катастрофу краіны. Часткай насельніцтва гэта ўспрымалася за праўду.

***І нарэшце***, патрэбна адзначыць, што ў час суровых выпрабаванняў генсек, Палітбюро і Сакратарыят ЦК КПСС здрадзілі сваёй партыі. Яны не звярнуліся да КПСС і народа, не зрабілі нават спробы склікаць з’езд партыі ці пленум ЦК КПСС, ніяк не супрацьдзейнічалі антыканстытуцыйным акцыям прэзідэнтаў СССР і Расіі і іх акружэння. Верхам ідэйнай і палітычнай здрады (наўмыснай ці ненаўмыснай), не маючай аналагаў у гісторыі, з’явіліся адказ у той трагічнай для КПСС сітуацыі М. Гарбачовым ад паўнамоцтваў Генеральнага сакратара ЦК КПСС і падпісанне супрацьпраўнага ўказа аб прыпыненні дзейнасці КПСС. Нічога не рабілі мясцовыя партыйныя камітэты і паслухмяныя члены партыі: капітуляцыя была масавай.

## § 3. Грамадска-палітычнае жыццё Рэспублікі Беларусь на мяжы XX – XXI стст.

**Рэспубліка Беларусь – прэзідэнцкая рэспубліка.** 1992 – 1994 гг. – гады жорсткай палітычнай барацьбы ў Вярхоўным Савеце рэспублікі па пытаннях эканамічнага жыцця, дзяржаўнага будаўніцтва, будучага саюза з Расіяй. Ішлі спрэчкі аб тым, якой рэспублікай павінна быць Беларусь: прэзідэнцкай ці парламенцкай. У гэтай дыскусіі ўзрастаў палітычны аўтарытэт старшыні парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй А.Р. Лукашэнкі.

***15 сакавіка 1994 г.*** Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Згодна з ёю, Беларусь з'яўляецца ***унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай***, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі. Канстытуцыяй уведзена ў рэспубліцы прэзідэнцкая форма кіравання.

***Першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 10 ліпеня 1994 г. выбраны А.Р. Лукашэнка.*** Для забеспячэння эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі была створана падпарадкаваная ўсенародна выбранаму прэзідэнту скразная вертыкальная структура, якая ўключае выканаўчыя і распарадчыя органы як у цэнтры, так і на месцах.

У мэтах вырашэння некаторых спрэчных пытанняў, якія ставіла палітычная апазіцыя і якія мелі прынцыповае значэнне для забеспячэння згоды ў грамадстве, па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ў адпаведнасці з яго перадвыбарнай платформай (забеспячэнне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, эканамічнай і палітычнай стабільнасці, барацьба з карупцыяй і злачыннасцю, паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту народа) ***14 мая 1995 г. быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум***. Беларускі народ падтрымаў прапановы кіраўніка дзяржавы аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай, развіцці эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. Герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг на рэферэндуме народам не былі прызнаны нацыянальнымі дзяржаўнымі сімваламі.

***Па-першае***, як сведчаць першакрыніцы, герб "Пагоня" быў вядомы як герб Вялікага княства Літоўскага ўжо ў XIII ст. Але гэта не дае падстаў сцвярджаць, што ён з'яўляецца беларускім нацыянальным і дзяржаўным сімвалам, бо Вялікае княства Літоўскае не было толькі беларускай дзяржавай, як пішуць некаторыя гісторыкі, а з'яўлялася поліэтнічнай дзяржавай чатырох асноўных народаў – беларускага, літоўскага, рускага і ўкраінскага, таму і герб "Пагоню" можна лічыць гістарычным сімвалам усіх гэтых чатырох народаў.

***Па-другое***, герб "Пагоня" – гэта рыцарскі сімвал воінскай славы, воінскай магутнасці, выява народнай традыцыі пагоні, якая была характэрнай не толькі для беларусаў ці літоўцаў, а для ўсіх тых, хто ваяваў, падвяргаўся нападу і рабіў пагоню за пераможаным ворагам ці ворагам, адступіўшым без бітвы. А калі ў той час (XII – XIV стст.) ваявалі амаль усе – і народы Захаду і народы Усходу

(а не толькі беларусы ці літоўцы), то і традыцыя народнай пагоні была традыцыяй і ўсходнеславянскіх народаў і заходнееўрапейцаў, і выява пагоні сустракаецца і на Усходзе і на Захадзе.

***Па-трэцяе***, герб "Пагоня" не меў усебеларускага распаўсюджання, аб чым сведчыць наступнае. Сярод 47 гербаў губерняў і гарадоў Беларусі, якія прыведзены ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, толькі 11 мелі выяву "Пагоні". У XVI – XVIII стст. з 70 гербаў гарадоў Беларусі знак "Пагоні" быў толькі ў 5 – Магілёва, Лепеля, Дрысы, Чэрыкава і Ліпнішак.

***Па-чацвёртае***, герб "Пагоня" ўзнік гістарычна, ён цалкам належыць сівой феадальнай даўніне. Як факт нашай гісторыі герб "Пагоня" можа выкарыстоўвацца ў прозе, вершах, кінастужках, тэатры, музыцы, архітэктуры, наогул, у жыцці беларускага народа, як і іншых народаў. Як культурна-гістарычны знак герб "Пагоня" – чысты, як дзяржаўна-палітычны сімвал – заплямлены, бо ў 1941 – 1944 гг. знаходзіўся ў руках здраднікаў, катаў і ворагаў беларускага народа. А што можа як дзяржаўны герб сімвалізаваць сёння гэты феадальны знак "Пагоня"? Агрэсіўнасць, ваяўнічасць, помслівасць, пагоню, тэакратычнасць дзяржавы? Не, гэта не ўваходзіць у менталітэт беларускага народа.

Яшчэ менш даследаванай з'яўляецца ***праблема паходжання бела-чырвона-белага сцяга***. Дакументаў амаль ніякіх няма. Ёсць толькі публікацыі тых, хто пад гэтым сцягам змагаўся за буржуазную будучыню Беларусі. Сярод іх прафесар-здраднік Р. Астроўскі (у гады Вялікай Айчыннай вайны служыў акупантам, узначальваў Беларускую цэнтральную раду). Ён у замежным часопісе "Беларуская думка" (1965, № 7) сцвярджаў, што "упершыню пытанне аб гербе і сцягу абмяркоўвалася на пасяджэнні Беларускага нацыянальнага камітэту ў Мінску ў сакавіку 1917 г. Менавіта ў гэты час вырашылі карыстацца "Пагоняй" і вядомым сцягам, узор якога быў прыняты тады ж. На сцягу зрабілі надпіс "Няхай жыве вольная Беларусь". Як сведчыць інфармацыя часопіса, бела-чырвона-белага сцяга да таго часу ў беларусаў не існавала.

***Яшчэ больш дакладная даведка маецца ў артыкуле Г. Альгердзіча (беларускі калабарацыяніст перыяду Вялікай Айчыннай вайны А. Адамовіч) у газеце "Раніца" (месца выдання Берлін) за 26 лістапада 1944 г.*** У ім напісана: "Паходжанне нашага сённяшняга бела-чырвона-белага сцягу параўнальна нядаўняе і звязана з часам рэвалюцыі 1917 г. таму, што пытанне аб агульна-нацыянальным ці дзяржаўным сцягу ў мінуўшчыне было недаследаваным. А нашым нацыянальным дзеячам 1917 г. і зусім невядомым. Давялося ім выступіць у гэтай галіне вольнымі тварцамі. У выніку гэтай творчасці адразу з'явіўся быў у якасці нацыянальнага сцягу аднаколерны белы штандар. Відаць, у прызнанні яго за нацыянальны сцяг кіраваліся расшыфраваннем самога назову "Беларусь". Аднак хутка выявілася неадпаведнасць такога аднаколернага белага сцягу: ён занадта біў у вочы на фоне рэвалюцыйнага разумення сымболікі колераў (чырвонае – колер рэвалюцыі, белае – колер контррэвалюцыі). Да таго ж, аддаўна меў

міжнароднае значэнне знаку паддачы, капітуляцыі на вайне. Таму неўзабаве пасярод белае палатніны сцягу была праведзена чырвоная, "рэвалюцыйная" паласа. Гэтак і з'явіўся наш сённяшні сцяг".

Артыкул А. Адамовіча быў надрукаваны ў 1944 г., калі яшчэ былі жывымі многія беларускія дзеячы 1917 – 1920 гг., дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі, якія б маглі не пагадзіцца, паправіць аўтара, калі б была надрукавана няпраўда.

Такім чынам, герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг з'яўляюцца не нацыянальнымі сімваламі, а сімваламі барацьбы за ўладу пэўных палітычных сіл, не падтрыманых большасцю беларускага народа. Герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг – сімвалы буржуазнай Беларусі, чырвона-зялёны сцяг з белым арнаментам і герб з серпам і молатам – сімвалы Савецкай Сацыялістычнай Беларусі.

Выбіраючы сімвалы новай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь, большасць народа зыходзіла з таго, што дзяржаўныя герб і сцяг павінны быць незаплямленымі, чыстымі, не звязанымі ў думках беларусаў са злачынствамі і генацыдам перыяду Вялікай Айчыннай вайны. На рэферэндуме 1995 г. большасць народа выказалася за новую сімволіку, якая ўяўляе сабой крыху змененую дзяржаўную сімволіку Савецкай Беларусі.

Палітычная апазіцыя, у тым ліку частка дэпутатаў Вярхоўнага Савета і членаў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, выступіла супраць курсу, абранага А.Р. Лукашэнкам і большасцю беларускага народа. Палітычная напружанасць у грамадстве ўзмацнілася.

***19 – 20 кастрычніка 1996 г. у Мінску адбыўся Усебеларускі народны сход***, на якім з дакладам "Толькі народ мае права рашаць своё лёс" выступіў А.Р. Лукашэнка. Дэлегаты схода, якія прадстаўлялі народ Беларусі, адобрылі ўнутраную і знешнюю палітыку, што праводзіла кіраўніцтва дзяржавы.

***24 лістапада 1996 г. адбыўся ініцыіраваны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам рэспубліканскі рэферэндум.*** Беларускі народ прагаласаваў за прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі А.Р. Лукашэнкам, выказаўся супраць свабоднай, без абмежаванняў куплі і продажу зямлі, супраць адмены смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь.

На рэспубліканскім рэферэндуме была падтрымана прапанова А.Р. Лукашэнкі ***аб перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня*** – дзень вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне. Дзень 27 ліпеня ў памяці людзей звязваецца з некаторымі змрочнымі падзеямі ў айчыннай гісторыі. 27 ліпеня 1942 г. кат беларускага народа, гаўляйтэр В. Кубэ, падтрымаў беларускіх здраднікаў і выдаў распараджэнне, якім дазволіў "пры розных урачыстасцях і для распазнавання нацыянальнасці беларускай побач з нямецкімі адзнакамі на дамах вывешваць і насіць "бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоню". Менавіта ў

гэты дзень (выпадкова ці наўмысна), 27 ліпеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. З гэтым днём і з гэтым дакументам большасць народа звязвае не толькі крок да незалежнасці Беларусі, але і да развалу вялікай і магутнай дзяржавы – Савецкага Саюза. Беларускі народ адмовіўся ад таго, каб дзень 27 ліпеня і далей лічыць сваім галоўным дзяржаўным святам – Днём незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Днём рэспублікі).

У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета быў сфарміраваны двухпалатны Нацыянальны сход. Ён складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Прэзідэнт з’яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Кіраўніком выканаўчай улады з’яўляецца прэм’ер-міністр урада, пашыраны правы і паўнамоцтвы Савета Міністраў.

***18 мая 2001 г. у Мінску адбыўся другі Усебеларускі народны сход.*** На ім з дакладам “За моцную, квітнеючую Беларусь” выступіў А.Р. Лукашэнка. Сход падвёў вынікі выканання “Асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 1996 – 2000 гг.”, прынятых першым Усебеларускім народным сходам у 1996 г. Была абмеркавана і адобрана Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001 – 2005 гг.

У 2000 г. адбыліся свабодныя дэмакратычныя выбары дэпутатаў двухпалатнага Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. ***9 верасня 2001 г.*** Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на новы 5-гадовы тэрмін выбраны А.Р. Лукашэнка.

У 2002 г. былі зацверджаны музыка і словы Гімна Рэспублікі Беларусь. Аўтарам музыкі з’яўляецца кампазітар Нестар Сакалоўскі, аўтарамі слоў – паэты Міхась Клімковіч і Уладзімір Карызна.

***17 кастрычніка 2004 г.*** адбыўся ініцыіраваны Прэзідэнтам рэспубліканскі рэферэндум і свабодныя дэмакратычныя выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Сфарміраваны таксама новы склад Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. На аснове галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме з артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь выключана яго другая частка: “Адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам не больш двух тэрмінаў”. Тым самым пераважная большасць беларускага народа пагадзілася з тым, каб А.Р. Лукашэнка нараўне з іншымі кандыдатамі мог балаціравацца ў час выбараў 2006 г. на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***2 – 3 сакавіка 2006 г. у Мінску адбыўся трэці Усебеларускі народны сход***, на якім з дакладам “Дзяржава для народа” выступіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. Сход падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2001 – 2005 гг. і зацвердзіў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2006 – 2010 гг.

## § 4. Канфесійная палітыка. Адраджэнне царкоўнага жыцця

У 80-я гады XX ст. у СССР і БССР пачынаюць змяняцца адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі канфесіямі. Традыцыйнае супрацьстаянне і канфрантацыя паступова саступаюць месца талерантнасці і ўзаемнай павазе, супрацоўніцтву і ўзаемаразуменню. Пачынаецца працэс адраджэння царкоўнага жыцця. З рэлігіяй вернікі звязваюць гарантыю палітычнай і этнаканфесійнай стабільнасці ў грамадстве, непарушнасць яго духоўнасці і маралі, аднаўленне нацыянальных звычаяў і традыцый народа.

На тэрыторыі Беларусі аднаўляюцца і будуюцца новыя храмы, адкрываюцца новыя прыходы, павялічваецца колькасць вернікаў. У 2004 г. у Рэспубліцы Беларусь было зарэгістравана 26 рэлігійных накірункаў. Каля 80 % вернікаў атаясамліваюць сябе з праваслаўем, каля 10 % – з каталіцызмам, каля 2 % – з пратэстантызмам, 0,3 % – з іудаізмам.

***Спецыфіка рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі*** вызначаецца перш-наперш яе геапалітычным становішчам на мяжы паміж заходняй і ўсходняй цывілізацыямі, суіснаваннем і пачарговым дамінаваннем праваслаўя і каталіцызму. Дзяржавы, у склад якіх у розныя гістарычныя перыяды ўваходзіла тэрыторыя Беларусі, заўсёды характарызаваліся поліканфесійнасцю. У Заходняй Беларусі захоўваецца традыцыйна больш высокі ўзровень рэлігійнасці (каля 70 – 80 % насельніцтва вернікі) і адпаведна значна больш рэлігійных абшчын, чым ва ўсходніх абласцях. Затое ў 80 – 90-я гг. найбольш высокі колькасны рост рэлігійных абшчын адбываўся ў Цэнтральнай і Усходняй Беларусі.

Рэлігійныя арганізацыі Беларусі маюць значныя магчымасці для распаўсюджання сваіх веравучэнняў. У апошнія 10 гадоў на тэрыторыі Беларусі выдавалася больш за 100 найменняў перыядычных выданняў, з якіх 17 належаць праваслаўнай царкве, 8 – каталіцкай, 4 – іудзеям, 1 – мусульманам, 73 выданні выпускаюцца новымі рэлігійнымі рухамі. Акрамя таго, на тэрыторыю рэспублікі з-за мяжы завозілася 256 найменняў рэлігійнай літаратуры.

**Праваслаўная царква.** Па колькасці абшчын і вернікаў сярод іншых рэлігійных аб'яднанняў Беларуская праваслаўная царква займае першае месца. ***У 2004 г. яна аб'ядноўвала 1 245 абшчын, 10 епархій, 19 манастыроў.*** З канца 80 – пачатку 90-х гг. колькасць праваслаўных прыходаў у Беларусі павялічылася больш чым у 2 разы. У 1985 г. у Мінску быў здадзены ў эксплуатацыю будынак, у якім памясціўся архірэйскі дом з дамавой царквой у гонар Сабора беларускіх святых.

У 1989 г. праваслаўнай царкве былі перададзены жаночыя манастыры Спаса-Ефрасіннеўскі ў Полацку і Раждзяство-Багародзічны ў Гродне. 1 верасня 1989 г. аднавіліся заняткі ***ў Мінскай духоўнай семінарыі***, якая, як і раней, памясцілася ў жыровіцкім Успенскім манастыры. У гэтым жа годзе ў Мінску пачало работу духоўнае вучылішча для падрыхтоўкі псаломшчыкаў і рэгентаў царкоўных хораў.

У кастрычніку 1989 г. у межах БССР быў утвораны ***Беларускі Экзархат***. Мінска-Беларуская епархія, кіраўніком якой з 1978 г. быў ***мітрапаліт Філарэт (Вахрамееў)***, прыпыніла сваё існаванне. Мітрапаліт Філарэт стаў мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым Экзархам Усяе Беларусі. Беларуская праваслаўная царква арганізацыйна падпарадкавана Маскоўскаму патрыярхату. У 1992 г. у Мінску, Заслаўі і Полацку адбыліся ўрачыстасці з нагоды 1000-годдзя ўстанаўлення Полацкай кафедры, а ў 1993 г. святкавалася 200-годдзе Мінскай епархіі.

У 1993 г. Сінод Беларускага Экзархата прыняў рашэнне аб адкрыцці ***Мінскай духоўнай акадэміі***. Сістэму духоўных навучальных устаноў дапоўнілі створаныя на мяжы ХХ – ХХІ стст. духоўныя вучылішчы ў Віцебску і Слоніме, факультэт тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Мінску (пасля яго закрыцця – Беларускага дзяржаўнага універсітэта), школа катэхізатараў у Мінску, рэгенцкая школа пры Мінскім духоўным вучылішчы і школа царкоўных званароў пры Мінскім епархіяльным упраўленні. У 1996 г. на мінскім прадпрыемстве “Выдатнае ліццё” пачалі адліваць званы, якія паступаюць у прыходы і манастыры Беларускага Экзархату.

Сведчаннем непарыўнай сувязі Беларускага Экзархату з Рускай праваслаўнай царквой з’явіліся ***візіты ў Беларусь Патрыярха Маскоўскага і Усяе Русі Алексія ІІ***. У час першага візіту ў 1991 г. ён наведаў раёны, якія пацярпелі ад ядзернай катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Алексій ІІ наведаў Беларусь і ў сувязі са святкаваннем 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і ў сувязі з 60-годдзем яе пачатку. У час свайго візіту ў 2002 г. Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі прыняў удзел у святкаванні Жыровіцкай іконы Божай Маці ва Успенскім мужчынскім манастыры і ў цырымоніі адкрыцця будынка Дома міласэрнасці ў Мінску.

**Адраджэнне царкоўнага жыцця ў іншых канфесіях.** Да ліку традыцыйных рэлігій у Беларусі адносіцца другая па колькасці вернікаў ***каталіцкая царква***. Ва ўмовах дэмакратызацыі грамадства ёй дзяржава перадала больш за 25 раней закрытых касцёлаў. Цяпер у 4 каталіцкіх епархіях Беларусі, якія ўзначальвае мітрапаліт ***кардынал Казімір Свёнтак***, аб’яднаны ***427 абшчын***, дзейнічаюць ***359 каталіцкіх храмаў***. Падрыхтоўка каталіцкіх святароў ажыццяўляецца ў семінарыях у Гродне і Пінску.

З пачатку 90-х гг. у Беларусі рабіліся спробы ***адраджэння уніяцкай царквы***. Гэты працэс звязаны з пошукамі часткай беларускамоўнай інтэлігенцыі нацыянальнай царквы, у якой богаслужэнне і культ павінны быць звязаны з нацыянальнай сімволікай, мовай і традыцыямі. У 2004 г. на тэрыторыі Беларусі было зарэгістравана 13 уніяцкіх абшчын, у кожнай з якіх па 5 – 7 чалавек. Для падрыхтоўкі прафесійных святароў уніяцкія абшчыны накіроўваюць сваіх прадстаўнікоў у духоўныя навучальныя ўстановы Ватыкана і Польшчы. У 1996 г. беларускія уніяты ўрачыста адзначалі 400-гадовы юбілей Брэсцкай царкоўнай уніі. Сучасныя спробы адраджэння уніяцкай царквы ў Беларусі

большасцю насельніцтва ўспрымаюцца як спроба расколу беларускага грамадства, экспарту чужой культурнай традыцыі і арганізацыйнай структуры.

У 90-я гады XX ст. з 3 да 15 павялічылася колькасць ***пратэстанцкіх цячэнняў*** у Беларусі, а колькасць абшчын – з 288 да 862. Найбольш дынамічна развіваюцца хрысціяне веры евангельскай, евангельскія хрысціяне-бапцісты і адвенцісты. Усе пратэстанцкія цячэнні аб'ядноўваюць у Беларусі каля 70 тыс. актыўных веруючых. Прэсвітараў, прапаведнікаў і рэгентаў рыхтуюць у двух вышэйшых і двух сярэдніх навучальных установах евангельскіх хрысціян-бапцістаў і хрысціян веры евангельскай. Выдаецца некалькі часопісаў і газет, дзейнічаюць 307 малітвенных дамоў і 12 дабрачынных місій. Вядучыя пратэстанцкія арганізацыі карыстаюцца магутнай зарубежнай фінансавай падтрымкай.

З XIV ст. на беларускіх землях існуе этнаканфесійная група ***яўрэяў-іудзеяў***. У 90-я гады XX ст. пачало аднаўляцца рэлігійнае жыццё іудзеяў у Рэспубліцы Беларусь. Сёння тут зарэгістравана 27 іудзейскіх абшчын, якія ў 1993 г. арганізавалі Іудзейскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь. Дзейнічае ў Мінску духоўнае вучылішча (ешыбот), больш за 15 нядзельных школ, яўрэйскія класы ў сярэдніх школах. Пытанні рэлігійнага жыцця асвятляюцца ў 4 яўрэйскіх газетах. З-за адсутнасці мясцовых равінаў абшчыны запрашаюць прапаведнікаў з ЗША і Ізраіля. Значнай падзеяй ў жыцці беларускіх яўрэяў стала стварэнне ў 1998 г. Цэнтра яўрэйскай культуры, які ўспрымаецца як цэнтр адраджэння нацыянальнай культуры з адпаведнымі атрыбутамі (рэстаран нацыянальнай кухні, магазіны кашэрных прадуктаў і прадметаў рэлігійнага культа, курсы па вывучэнню іўрыта, гісторыі і традыцый яўрэйскага народа).

На тэрыторыі Беларусі этнаканфесійная група татар-мусульман існуе з XIV ст. ***У 2004 г. ў Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны 23 мусульманскія абшчыны.*** Яны ўваходзяць у склад створанага ў 1994 г. Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Рэспублікі Беларусь, кіруючым органам якога з'яўляецца муфціят на чале з муфціем. З 1991 г. дзейнічае культурна-асветнае беларускае аб'яднанне татар "Аль-Кітаб". Праводзяцца акцыі па культурна-рэлігійнай інтэграцыі татар Беларусі, Літвы, Польшчы і Крыма, захаванню іх этнічнай самабытнасці, адраджэнню ісламскай рэлігіі і культуры. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі засталася адна мячэць – у Іўі Гродзенскай вобласці. У 90-я гады XX ст. пачалося будаўніцтва і рэстаўрацыя мячэцей у Слоніме, Навагрудку, Відзах. Ствараецца комплекс мусульманскага культурна-рэлігійнага цэнтра ў Мінску. У 1997 г. былі праведзены ўрачыстасці з нагоды 600-годдзя з дня афіцыйнай даты з'яўлення на тэрыторыі Беларусі першых пасяленняў татар.

**Нетрадыцыйныя рэлігійныя накірункі і рухі.** Яны звязаны галоўным чынам з ***будызмам*** і ***індуізмам*** (хатха-ёга, дзэн-буддызм, агні-ёга, вайшнавы, крышнаіты, брахма кумарыс і інш.). Іх членамі з'яўляецца ў асноўным вучнёўская моладзь і інтэлігенцыя.

Дзейнасць экстрэмісцкіх і дэструктыўных рэлігійных сект у Рэспубліцы Беларусь забаронена.

**Закон Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях”.** Прававым выражэннем новай палітыкі дзяржавы стала прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях”, які дзейнічае з 1992 г. На працягу 90-х гадоў у яго ўносіліся змены і дапаўненні. 27 чэрвеня 2002 г. Палатай прадстаўнікоў была прынята і адобрана Саветам Рэспублікі новая рэдакцыя Закона “Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях”. Ён рэгулюе адносіны ў галіне правоў чалавека і грамадзяніна на свабоду веравызнання, а таксама вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, зыходзячы з:

- права кожнага на свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад адносін да рэлігіі;
- роўнасці рэлігій перад законам;
- прызнання вядучай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа;
- духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі;
- неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангеліцка-лютэранскай царквы, іудаізму і ісламу;
- неабходнасці садзеяння дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды веравызнання.

Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь з павагай і разуменнем адносіцца да ўсіх рэлігійных канфесій і перш-наперш да вядучай канфесіі – праваслаўнай. Пры гэтым умовамі добрых адносін да канфесій з’яўляецца любоў да Беларусі і беларускага народа, выкананне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і яе заканадаўства, падтрымка ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы.

Сістэматычна праходзяць сустрэчы Прэзідэнта краіны А.Р. Лукашэнкі з іерархамі праваслаўнай, каталіцкай і іншых канфесій, на якіх абмяркоўваюцца пытанні супрацоўніцтва ў духоўна-этычнай сферы, у выхаванні ў насельніцтва высокіх маральных якасцей, чалавекалюбства, патрыятызму, любві да Айчыны. Кіраўнікі Рэспублікі Беларусь прысутнічаюць на богаслужэннях, звяртаюцца да іерархаў царквы і вернікаў з прамовамі, аказваюць матэрыяльну і фінансаву падтрымку ў аднаўленні, будаўніцтве і рамонце храмавых і манастырскіх збудаванняў. Пастаянная і цесная сувязь паміж свецкай дзяржавай і царквой, якая афіцыйна аддзелена ад дзяржавы, садзейнічае ўсталяванню талерантнасці, міру і ўзаемаразумення паміж вернікамі розных канфесій, а таксама палітычнай і этнаканфесійнай стабільнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

## § 5. Рэспубліка Беларусь на шляху рыначных рэформ. Асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця

**Сутнасць рынку.** Навуковай тэорыі рынку, адзінага агульнапрынятага яго вызначэння ў літаратуры не існуе. Разглядаюцца найпрасцейшыя з’явы рыначнай эканомікі: роўнасць попыту і прапановы, залішняга попыту і недастатковай прапановы і г. д. Мала хто разумее, што нецывілізаваны, грабежніцкі, гангстэрска-мафіёзны рынак – гэта хаос і выпадковасць, вялікі базар, дзе ўсё прадаецца і купляецца (у гэтым сэнсе рынак заўсёды існаваў). Іншая справа – цывілізаваны, рэгуляваны дзяржавай, сацыяльна арыентаваны рынак. Каб такі рынак усталяваць, дзяржава і манаполіі павінны быць багатымі, мець вялікія таварныя запасы і грошы, што бывае рэдка. Не выпадкова, што найбольш пацярпеўшыя ў Другой сусветнай вайне краіны Заходняй Еўропы і Японія для аднаўлення сваіх эканомік ажыццяўлялі цэнтралізаваныя праграмы і толькі пасля дасягнення раўнавагі попыту і прапановы пераходзілі да ўвядзення рыначных механізмаў.

Рынак павінен быць рэгулятарам і стымулятарам вытворчасці і спажывання, сродкам дасягнення грамадскіх мэт – умацавання магутнасці Айчыны, павышэння ўзроўню жыцця народа. Ёсць іншая, палітыка-эканамічная матывацыя: рынак – сродак капіталізацыі эканомікі, стварэння буржуазіі, аднаўлення капіталізму ў краіне. Першы падыход да рынку можна лічыць агульнацывілізаваным, другі – класавым. Яны з’яўляюцца сродкам для сапраўднага разумення і прызнання рыначнай эканомікі, тут праходзіць водападзел паміж яе прыхільнікамі і праціўнікамі. Супраць агульнацывілізаванага разумення рынку ніхто не выступае, барацьба ідзе вакол капіталізацыі эканомікі і грамадства ў цэлым.

Рынак узнікае як вынік высокай цывілізаванасці, культуры, прадукцыйнасці працы, а не як іх перадумова. Вось чаму краінам Захаду спатрэбіліся стагоддзі, каб сфарміраваць сістэму больш ці менш цывілізаваных рыначных адносін на капіталістычнай аснове, вырасціць сучаснага прадпрымальніка, забяспечыць сацыяльную стабільнасць. Рыначная эканоміка функцыяніруе амаль ва ўсіх краінах, але штогод ад голаду ці звязаных з ім прычын у свеце памірае каля 20 млн. чалавек, а не менш 435 млн. чалавек на Зямлі пакутуюць ад розных стадый і форм голаду. Значыць, сама па сабе рыначная эканоміка не забяспечвае высокі ўзровень жыцця людзей.

Настаў час сказаць праўду і развеяць створаныя ў гады перабудовы міфы аб тым, быццам рынак па сваёй прыродзе з’яўляецца гуманным, садзейнічае росквіту эканомікі, забяспечвае людзям багацце і шчасце. Жыццё паказвае, што рынак як атрыбут ліберальна-буржуазнай мадэлі развіцця грамадства з’яўляецца агрэсіўным і амаральным па сваёй сутнасці. Яго галоўная задача – атрыманне прыбытку любымі сродкамі і перш-наперш шляхам зману, гвалту і грабяжу. Справа ў тым, што прыбытак ўзнікае тады, калі адзін з канкурэнтаў ведае аб становішчы на рынку больш за другога. Калі ж гэтае становішча вядомы аднолькава ўсім, рыначная эканоміка перастае функцыянаваць, бо няма

адкуль узяцца прыбытку. “Не абманеш – не прадасі выгадна, з прыбыткам”, – такі, на жаль, амаральны лозунг рынка. Мараль і рынак – паняцці не заўсёды сумяшчальныя. А грамадства, якое адмаўляе маральныя каштоўнасці, будучыні не мае.

Велічыня прыбытку ў многім залежыць ад магутнасці дзяржавы і яе месца ў сусветнай рыначнай сістэме. Напрыклад, расійскі капітал (на прыбытак яму ідзе столькі працэнтаў валавога ўнутранага прадукта, колькі на ўсю нацыянальную зарплату) “здымае” прыбытак толькі са свайго насельніцтва (жадае “здымаць” у перспектыве з насельніцтва дзяржаў СНД). Амерыканскі ж капітал “шчыпле” прыбытак з усіх краін і народаў свету, у тым ліку і з народаў постсацыялістычных краін. А тых, хто не жадае, каб іх “шчыпалі”, ЗША аб’яўляюць дзяржавамі-ізгоямі і прымяняюць супраць іх розныя санкцыі, у тым ліку і ваенныя (Югаславія, Ірак, Лівія, КНДР і інш.).

Сучасны рыначны капіталізм, львіную долю выгад якога спажываюць ЗША, не ў стане аднолькава задаволіць патрэбы ўсіх яго ўдзельнікаў. Рынак як усеахватная сістэма функцыянавання нацыянальных эканомік і сусветнай гаспадаркі вычэрпвае свае магчымасці. Праблематычным становіцца таксама ўпраўленне гаспадарчымі сувязямі. У такой сітуацыі моцная і разумная апора на дзяржаву ўяўляецца безальтэрнатыўнай.

**Рыначныя рэформы ў Рэспубліцы Беларусь у 1992 – 1994 гг.** З канчатковым знішчэннем СССР і стварэннем суверэнных дзяржаў рыначныя рэформы ўступілі ў новую фазу. Яны пачалі праводзіцца па заходніх рэцэптах, у першую чаргу па рэцэптах “шокавай тэрапіі” Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) для слабаразвітых краін. Іх праводзілі не вельмі аўтарытэтныя і прафесійныя людзі, каго ў народзе называлі малодшымі навуковымі супрацоўнікамі і загадчыкамі лабараторый. Унукі і праўнукі бальшавіцкіх камісараў часоў грамадзянскай вайны прадэманстравалі вывернуты знутры бальшавізм. Тое, на што Захаду спатрэбіліся стагоддзі, яны зрабілі спробу ўвесці зараз жа ці цераз 500 дзён. Асаблівасці савецкай мадэрнізацыі яны цалкам праігнаравалі. Таму разбуральны характар іх рэформ быў непазбежным.

Але ж Беларусь, як і Расія і Украіна, не слабаразвітая, а індустрыяльная дзяржава з многагаліновай прамысловасцю і магутным навукова-тэхнічным патэнцыялам. Мадэль МВФ, дзе вынікам лібералізацыі цэн з’яўляецца этап банкруцтваў і беспрацоўя, прыемлема для слабаразвітых краін, у якіх рабочыя складаюць 5 – 10 % насельніцтва. Пры такіх маштабах нават масавыя банкруцтвы прадпрыемстваў грамадства ў цэлым не кранаюць. А калі дзяржаўны сектар складае пераважную большасць эканомікі, а рабочыя – 70 % працоўных?

Больш таго, знешнія паступленні (пазыкі, крэдыты) у некалькі мільёнаў долараў аказвалі моцнае стымулюючае ўздзеянне на эканоміку малых краін. Маштабы ж краін СНД такія, што, каб уздзейнічаць на ход спраў у эканоміцы, патрэбны дзесяткі, а для Расіі – сотні мільярдаў долараў, што не пад сілу

ніякаму міжнароднаму банку. Таму надзеі на дапамогу Захаду не мелі пад сабой ніякай асновы. Гэтых абставін не ўлічвалі прыхільнікі “шокавай тэрапіі”.

Правядзенне рэформ у 1992 – 1994 гг. дазволіла стварыць у Беларусі неабходны мінімум асноўных рыначных інстытутаў, нарматыўна-прававых дакументаў, пераўтварыць сістэму дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай у новую сістэму, якая ў пэўнай ступені абапіраецца на рыначныя рэгулятары. Разам з тым беларускі рынак цярпеў значна большыя страты, чым меў здабыткаў: разбурэнне раней існаваўшых вытворча-эканамічных сувязей і “абвальны” спад вытворчасці на 50 % і больш у параўнанні з канцом 80-х гадоў, што пагражала дзяржаве стратай сваёй незалежнасці і пераўтварэннем у калонію; раскручванне інфляцыйнай спіралі і катастрафічнае падзенне курсу беларускіх грошай, крытычнае становішча з забеспячэннем гаспадаркі энергарэсурсамі; галапіруючы рост цэн (іх лібералізацыя не прывяла да ўстанаўлення раўнавагавых цэн, што з’ўляецца асаблівасцю рынку, заснаванага на механізме свабоднай канкурэнцыі); рэзкае падзенне жыццёвага ўзроўню большасці насельніцтва, рост беспрацоўя, нарастанне іншых сацыяльных праблем.

Мадэль рыначных рэформ метадам “шокавай тэрапіі”, пабудаваная па рэкамендацыях Міжнароднага валютнага фонду, пацярпела правал летам 1994 г. у час выбараў першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Мандат на правядзенне новага варыянта рэформ атрымаў першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка.

Для пераадолення крызісных з’яў і недахопаў, а таксама для вызначэння перспектыўных задач у правядзенні рыначных рэформ былі распрацаваны “Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996 – 2000 гады”. 20 кастрычніка 1996 г. удзельнікі Усебеларускага народнага сходу адобрылі гэты дакумент.

**Асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 1994 – 2005 гг.** ***Па-першае***, у цэнтры беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця знаходзіцца Чалавек з яго інтарэсамі, памкненнямі, жаданнем жыць у свабоднай, дэмакратычнай і квітнеючай краіне. Усё ў імя чалавека і для дабрабыту чалавека – такі глыбінны сэнс беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Дзяржава для народа клапоціцца і будзе клапаціцца аб росце заработнай платы, пенсій, стыпендый і іншых выплат насельніцтву, аб паляпшэнні жыллёвых умоў, умоў працы і адпачынку, каб чалавек адчуваў сябе камфортна, ганарыўся тым, што ён жыве і працуе ў краіне, імя якой Рэспубліка Беларусь.

***Па-другое***, новае кіраўніцтва дзяржавы адмовілася ад ***лібералнай мадэлі рынку*** і ўзяло на ўзбраенне ***сацыяльна арыентаваную мадэль рыначнай эканомікі***. Выкарыстоўваючы яе, дзяржава праводзіць моцную і эфектыўную эканамічную і сацыяльную палітыку, абараняе інтарэсы ўсіх класаў і пластоў насельніцтва, у тым ліку і тых, хто па розных прычынах зарабляе мала, ці зусім нічога не зарабляе (састарэлыя, інваліды, шматдзетныя сем’і, студэнты,

навучэнцы і г. д.). Гэта выключае сацыяльныя катаклізмы і забяспечвае сацыяльную стабільнасць у грамадстве.

***Па-трэцяе***, улічваючы вопыт краін з развітай рыначнай інфраструктурай, Рэспубліка Беларусь стала на шлях дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Правядзенне дзяржаўнай патэрналісцкай палітыкі забяспечвае павышэнне эфектыўнасці эканомікі, абарону інтарэсаў айчынных таваравытворцаў, недапушчэнне “праядання” крэдытаў, узмацнення інфляцыі, развіцця крымінальных і ценявых структур.

***Па-чацвёртае***, прыпынена дзікая “прыхватызацыя”, раскраданне кучкай дзялкоў агульнанароднага багацця і стварэнне буйных прыватных капіталаў, большасць з якіх маюць крымінальную прыроду. Прыватызацыя праводзіцца пры ўдзеле і пад кантролем дзяржавы, у інтарэсах умацавання яе магутнасці і павышэння дабрабыту народа.

***Па-пятае***, народ і дзяржава адмовіліся ад куплі-продажу зямель сельскагаспадарчага прызначэння, ад дэмантажу буйной калгасна-саўгаснай вытворчасці і замены яе сялянскай (фермерскай) гаспадаркай. Калгас, саўгас, сялянская (фермерская) гаспадарка маюць роўныя правы і магчымасці існавання, калі яны эфектыўна гаспадараць на зямлі.

***Па-шостае***, Рэспубліка Беларусь адкрыта для эканамічнага супрацоўніцтва з усімі краінамі свету. Яна прыцягвае ў народную гаспадарку капіталы айчынных і замежных інвестараў. Але трэба памятаць, што ў эканоміцы дарэвалюцыйнай Расіі, у тым ліку і Беларусі, уладарыў замежны капітал. Буйнейшыя прадпрыемствы знаходзіліся ў прыватнай уласнасці ці ў арэндзе ў замежных капіталістаў. А між тым краіна і яе народ былі надзвычай беднымі. Таму сёння, маючы велізарны вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны і інтэлектуальны патэнцыял, стаўка робіцца на ўласныя сілы і сродкі, прыцягваюцца іншаземныя інвестыцыі ў тым выпадку, калі яны даюць нам эканамічную выгаду і адпавядаюць нацыянальным інтарэсам.

Буржуазная прапаганда, стараючыся прынізіць беларускую мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, мусіруе ранейшы тэзіс аб больш нізкім узроўні жыцця ў нашай краіне ў параўнанні з краінамі Захаду. Пры гэтым не ўлічваецца ўзаемадзеянне розных умоў і прычын, якія аказваюць уздзеянне на ўзровень жыцця людзей. Напрыклад, у 1988 г. у СССР выпускалася ў 2 разы больш цэменту, але ў 8 разоў менш кардона і фанеры, чым у ЗША. У ЗША на душу насельніцтва прыходзілася 49 м2 жылля, а ў Савецкім Саюзе – толькі 15 м2. Але 3/4 насельніцтва ЗША жылі ў танных, немарозастойкіх жылых дамах з драўляных планак, фанеры і кардона. Паўночная граніца Злучаных Штатаў Амерыкі праходзіць на шыраце г. Валгаграда і там кардонна-фанерныя домікі прыгодныя для жылля, а ў Савецкім Саюзе з-за халадоў патрабаваліся капітальныя збудаванні з цэглы і цэменту ці з дабротных лесаматэрыялаў.

Розныя кліматычныя ўмовы і для гаспадарання на зямлі. Напрыклад, у Заходняй Еўропе кратнасць перыяду для пасеву і ўборкі ўраджаю складае 8 – 9 месяцаў, а ў былым Савецкім Саюзе – 4 – 6 месяцаў. Ападкі (ліўні) ў нас

звычайна выпадаць у другой палове лета, у перыяд уборкі ўраджаю, а засуха, адсутнасць ападкаў звычайна назіраюцца вясной і раннім летам. У Заходняй Еўропе дажджы выпадаюць раўнамерна. У Канадзе, напрыклад, большасць насельніцтва жыве ў паўднёвых раёнах, на шыраце Крыма, а на шыраце Курска і Варонежа ў гэтай краіне амаль няма сельскай гаспадаркі. Краіны Скандынавіі абмываюцца цёплым цячэннем Гольфстрым, зіма ў Паўднёвай Скандынавіі больш кароткая і цёплая, чым у размешчаным на 1 800 км на поўдзень Кубанскім стэпе.

Галоўным вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1994 – 2006 гг. з’яўлялася тое, што ў краіне была створана і дзейнічала аптымальная сацыяльна-эканамічная сістэма, заснаваная на паступовым, эвалюцыйным шляху эканамічных пераўтварэнняў, без абвальнай прыватызацыі і “шокавай тэрапіі”. Краіна захавала і прымножыла багацце, створанае працай усяго народа, не прадала за бясцэнак зямлю, заводы і фабрыкі, не залезла ў доўг да замежных крэдытораў. Забяспечаны высокія тэмпы эканамічнага росту: прырост валавога ўнутранага прадукта ў Рэспубліцы Беларусь штогод складаў у 2001 – 2005 гг. 7,5 % супраць 3,5 % сярэднесусветнага. Захаваны і паглыблены сацыяльныя гарантыі для людзей – жыллё, пенсіі, бясплатныя за кошт бюджэту адукацыя і лячэнне. Сёння Рэспубліка Беларусь – стабільная, паспяховая, цывілізаваная краіна з моцнай эканомікай, развітымі навукай і культурай, адной з лепшых у свеце сістэмай адукацыі. Моцная дзяржаўная ўлада, моцная сацыяльная палітыка і апора на народ – сакрэт поспехаў Рэспублікі Беларусь.

## § 6. Культура Беларусі на сучасным этапе

З сярэдзіны 80-х гг. пачынаюцца змены ў галіне культуры Беларусі. У перыяд перабудовы важнае месца набыло пытанне аб ролі і месцы беларускай мовы ў грамадстве. За пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы выступала інтэлігенцыя, а таксама нефармальныя аб’яднанні моладзі. Акрамя моўнага пытання, грамадскасць падымала праблему захавання гісторыка-культурнай спадчыны і ўсебаковага адраджэння беларускай культуры.

1991 г. паклаў пачатак новага этапу гісторыі беларускай культуры. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абавязвае паважаць нацыянальныя традыцыі, берагчы гісторыка-культурную спадчыну беларускага народа, гарантуе свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія жывуць у краіне. Разам з тым істотнай перашкодай для культурнага развіцця стаў эканамічны крызіс, які прывёў да скарачэння дзяржаўных расходаў на патрэбы культуры. Лібералізацыя грамадска-палітычнага жыцця прывяла да з’яўлення новых тэм у літаратуры і мастацтве.

**Развіццё адукацыі і навукі.** З сярэдзіны 80-х гг. у СССР пачалася рэформа агульнаадукацыйнай, прафесіянальнай і вышэйшай школы. Пры рэфармаванні сістэмы адукацыі забяспечваліся пераемнасць і свабодны доступ

да любой яе ступені, разнастайнасць зместу і форм навучання, пашырэнне магчымасцей для індывідуальнага развіцця асобы. Ажыццяўляліся больш цесныя сувязі навучання і вытворчай дзейнасці, уключэнне вучняў у сістэматычную, пасільную для іх здароўя і ўзросту грамадска-карысную працу. Нягледзячы на крызісныя з’явы ў сацыяльна-эканамічнай сферы, адукацыя Беларусі захавала свой патэнцыял.

У ***агульнаадукацыйных школах*** быў уведзены курс асноў інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, створаны спецыялізаваныя сярэднія навучальныя ўстановы – ліцэі і гімназіі. Яны павінны былі забяспечыць больш дасканалую падрыхтоўку вучняў па выбраных галінах ведаў (гуманітарнай, тэхнічнай ці прыродазнаўчай). На розных узроўнях праводзіліся прадметныя алімпіяды па фізіцы, матэматыцы і іншых дысцыплінах. Пераможцы рэспубліканскага этапу мелі права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы без іспытаў па дысцыпліне алімпіяды. Практыкавалася сумяшчэнне выпускнога экзамену за сярэднюю школу з уступным экзаменам у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

У 90-я гг. у Рэспубліцы Беларусь пачала праводзіцца рэформа агульнаадукацыйнай школы, звязаная з пераходам на 12-гадовы тэрмін навучання ў сярэдняй школе. Яна прадугледжвае пераход да абавязковай 10-гадовай базавай школы. Сярэднюю адукацыю можна атрымаць у апошніх 11 і 12 класах ці праз прафесійную адукацыю. Апошнія класы маюць на мэце спецыялізаваную падрыхтоўку вучняў па розных накірунках (прыродазнаўча-матэматычным, гуманітарным, тэхналагічным, агульнаадукацыйным). Рэформа павінна пазбавіць навучэнцаў вучэбнай перагрузкі.

У ***прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах*** разам з атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы праходзілі падрыхтоўку па 420 прафесіях. Больш за 10 прафесіянальна-тэхнічных вучылішч аб’явілі сябе такімі прафесіянальнымі вучылішчамі, якія даюць адначасова прафесіянальна-тэхнічную і сярэднюю спецыяльную падрыхтоўку.

***Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы*** забяспечваюць падрыхтоўку кадраў для гаспадаркі і культуры. Частка тэхнікумаў была пераўтворана ў каледжы, дзе адначасова ажыццяўлялася падрыхтоўка спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі і спецыялістаў павышанага ўзроўню. Апошнія мелі магчымасць паступіць адразу на III курс вышэйшай навучальнай установы.

У ***вышэйшых навучальных установах*** былі створаны новыя спецыяльнасці, звязаныя з навукова-тэхнічным прагрэсам – па рабататэхніцы, электроннаму прыборабудаванню, новых хімічных тэхналогіях, біятэхналогіях і інш. Пашыралася падрыхтоўка спецыялістаў у галіне эканомікі, права, сацыяльнай работы.

Асаблівасцю развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь у 90-я гг. стала дзейнасць ***недзяржаўных навучальных устаноў***, якія існуюць разам з дзяржаўнымі ўстановамі. Навучанне ў іх ажыццяўляецца на платнай аснове (за кошт асабістых сродкаў студэнтаў, навучэнцаў і іх бацькоў). Гэтыя

навучальныя ўстановы атрымліваюць ад дзяржавы ліцэнзію (права) на правядзенне вучэбнай дзейнасці. Каб забяспечыць існуючы ў краіне стандарт адукацыі сістэматычна праводзіцца атэстацыя ўсіх навучальных установ, у тым ліку і недзяржаўных.

Разбурэнне гаспадарчых і навуковых сувязей пасля распаду СССР негатыўна адбілася на стане беларускай навукі. Адбывалася скарачэнне яе фінансавання, старэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Вынікі навуковых даследаванняў былі нізказапатрабаванымі ў народнай гаспадарцы. У выніку скарацілася колькасць маладых спецыялістаў і адбылося так званае старэнне навукі. Аднак і ў гэтых умовах навуковыя даследаванні не спыніліся. У 1993 г. быў прыняты закон ***“Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі”,*** згодна з якім адказнасць за развіццё фундаментальных навуковых даследаванняў ускладзена на Акадэмію навук Беларусі.

Беларускія вучоныя ажыццяўляюць шэраг важных даследаванняў практычна ва ўсіх галінах ведаў. Пастунова аднаўляюцца страчаныя раней сувязі з вучонымі Расіі і краін былога СССР, ажыццяўляюцца кантакты з навуковай супольнасцю замежных краін. Развіццё навукі павінна забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь, павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

**Літаратура.** Змены ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі знайшлі адлюстраванне ў літаратуры.

Палітыка галоснасці і дэмакратызацыі жыцця спрыяла з’яўленню твораў, прысвечаных праблеме палітычных рэпрэсій. Былі апублікаваны аповесці-успаміны ***С. Грахоўскага***, ***Ф. Аляхновіча*** і інш. Тэму рэпрэсій узнімае ў сваіх творах ***В. Быкаў***. Беларусы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з творамі беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў, якія да гэтага не публікаваліся ў Беларусі.

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС і яе наступствы з’явіліся важнай тэмай мастацкай літаратуры. ***І. Шамякін*** стварыў раман “Злая зорка”, дзе спрабаваў асэнсаваць значэнне гэтай катастрофы. Шэраг пісьменнікаў развіваюць Чарнобыльскую тэму ў сваёй творчасці.

Другая палова 1980 – 1990-я гг. – перыяд узрастання інтарэса пісьменнікаў і паэтаў да гістарычнага мінулага. Невыпадкова ў гэты час узнікае шэраг мастацкіх твораў, прысвечаных розным падзеям і асобам з гісторыі Беларусі. Не абмінаюць сучасныя аўтары і тэму Вялікай Айчыннай вайны, хаця яна і не з’яўляецца дамініруючай, як у папярэднія дзесяцігоддзі.

Новыя творы з’явіліся ў беларускіх паэтаў ***Н. Гілевіча***, ***Г. Бураўкіна*** і інш.

**Тэатр, музыка**. У складаных эканамічных умовах сярэдзіны 1980 – 1990-х гг. развівалася тэатральнае мастацтва Беларусі. Колькасць прафесіянальных тэатраў у Беларусі нават павялічылася з 17 у 1985 г. да 21 у 1991 г. У 90-я гг. узніклі новыя прафесіянальныя і аматарскія драматычныя тэатры. Галоўную ролю ў тэатральным мастацтве адыгрывалі прафесійныя дзяржаўныя калектывы. На высокім узроўні працавалі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа ў

Віцебску, Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы, Нацыянальны акадэмічны тэатр балета, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, Дзяржаўны музычны тэатр, Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача, Беларускі дзяржаўны тэатр лялек, абласныя драматычныя і лялечныя тэатры.

Аснову рэпертуару беларускіх тэатраў складае драматургія беларускіх аўтараў, руская і замежная класіка. Сучасная беларуская драматургія адлюятравала цікавасць да гістарычнай тэматыкі, фальклорных сюжэтаў.

Далейшае развіццё атрымала музычнае мастацтва. Шмат зрабілі і робяць для развіцця музычнай культуры Беларусі такія вядомыя кампазітары, кіраўнікі музычных калектываў і выканаўцы, як ***В. Роўда***, ***М. Дрынеўскі***, ***М. Казінец***, ***С. Картэс***, ***Дз. Смольскі***, ***У. Солтан*** і інш.

У цэнтры канцэртнай дзейнасці сёння знаходзяцца Беларуская дзяржаўная філармонія і абласныя філармоніі. Рэспубліка Беларусь мае высокапрафесіянальныя калектывы: Акадэмічны хор Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, Дзяржаўны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу імя Р. Шырмы, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча, харэаграфічны ансамбль “Харошкі” і інш. Шырокую папулярнасць у Беларусі і за яе межамі набыў Дзяржаўны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам ***М. Фінберга***. У апошнія гады ўтварыліся Дзяржаўны камерны хор, Мінскі аркестр духавых інструментаў “Няміга” і іншыя творчыя калектывы. Значнае месца ў музычным жыцці краіны займаюць лепшыя ўзоры эстраднай песеннай творчасці.

Беларусь, Расія, і Украіна з 1992 г. у Віцебску штогод сумесна праводзяць свята песні ***“Славянскі базар”***. Уздыму ўзроўню майстэрства маладых выканаўцаў садзейнічае фестываль у Маладзечне, які з 1993 г. стаў традыцыйным. Шырокую вядомасць, роўную “Славянскаму базару”, у апошнія гады набыў фестываль песні ***“Залаты шлягер”*** у Магілёве.

**Выяўленчае мастацтва і архітэктура**. Важныя змены адбыліся і ў тэматыцы твораў выяўленчага мастацтва. Адной з асноўных тэм стала гістарычная, якая мае выразны нацыянальна-рамантычны ўхіл. Галоўнымі героямі твораў з’яўляюцца ідэалізаваныя персанажы з нацыянальнай гісторыі. Частка мастакоў звяртаецца да вельмі папулярнай сёння экалагічнай тэматыкі, перш за ўсё Чарнобыльскай катастрофы.

Для манументальнага мастацтва характэрна адмаўленне ад грандыёзных манументаў абстрактна-сімвалічнага сэнсу. У 90-я гг. створаны некаторыя помнікі ў розных гарадах Беларусі. Характэрнай прыметай часу сталі помнікі ў гонар воінаў-інтэрнацыяналістаў. У 1996 г. у Мінску адкрыты помнік воінам, якія загінулі ў Афганістане, вядомы як “Востраў слёз”. Помнікі і мемарыяльныя дошкі ў памяць воінаў-афганцаў устаноўлены ў Оршы, Рэчыцы, Баранавічах. Зварот да гістарычнай тэматыкі наглядаецца ў беларускай скульптуры. Так, былі ўстаноўлены помнікі Кірылу Тураўскаму ў Тураве, Францыску Скарыне ў Лідзе і ў Празе, Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, Ефрасінні Полацкай ў Мінску і ў

Рэчыцы. Шэраг помнікаў прысвечаны дзеячам беларускай навукі і культуры больш позніх часоў.

Сучасная беларуская архітэктура характарызуецца адраджэннем гістарычных і нацыянальных традыцый у спалучэнні з новымі матэрыяламі і будаўнічымі тэхналогіямі. Архітэктары актыўна выкарыстоўваюць элементы, уласцівыя беларускаму дойлідству папярэдніх эпох: зубчастыя ці крывалінейныя завяршэнні сцен, паўцыркульныя вокны, нішы, аркі, калоны і інш. Новыя тэндэнцыі выразна адчуваюцца ў спартыўных збудаваннях, вакзалах, банкаўскіх комплексах і нават у жыллёвай архітэктуры. Да найбольш цікавых пабудоў можна аднесці аўтавакзал "Маскоўскі", новы чыгуначны вакзал у Мінску, лядовыя палацы ў Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі. У апошнія гады ўзводзіцца шмат культавых пабудоў розных канфесій.

Адной з важных задач палітыкі дзяржавы ў галіне культуры з'яўляецца захаванне помнікаў айчыннай гісторыі і культуры. У апошнія гады ў рэспубліцы праводзіцца мэтанакіраваная работа не толькі па вяртанню гісторыка-культурнай спадчыны, але і па рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Вялікія рэстаўрацыйныя работы ў канцы 80-х – 90-я гг. праводзіліся ў Мірскім замку. Пастановай Савета Міністраў Нясвіжу быў нададзены статус Нацыянальнага запаведніка Рэспублікі Беларусь. Надзвычайную каштоўнасць для Беларусі мае Полацкі гісторыка-культурны запаведнік. Праводзілася рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры на Навагрудчыне, Лідскага замка, Барысаглебскай (Каложскай) царквы і Старога Замка ў Гродне, Благавешчанскай царквы ў Віцебску, гістарычнай забудовы старажытнабеларускіх гарадоў. У Мінску на плошчы Свабоды быў адноўлены будынак ратушы.

**Фізічная культура і спорт у Рэспубліцы Беларусь.** Заняткі моладзі і ўсяго насельніцтва фізічнай культурай і масавым спортам разглядаюцца ў Рэспубліцы Беларусь у якасці аднаго са сродкаў умацавання здароўя нацыі, фарміравання здаровага ладу жыцця. Міністэрствам спорту і турызму была распрацавана Дзяржаўная праграма па фарміраванні здаровага ладу жыцця на 2002 – 2006 гг., адобраная Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Забеспячэнню даступнасці для ўсіх катэгорый насельніцтва займацца фізічнай культурай і масавым спортам садзейнічае функцыянаванне ў краіне 226 стадыёнаў, 26 спартыўных манежаў, 231 плавальнага басейна, 4 778 спартыўных залаў, 715 міні-басейнаў у дзіцячых дашкольных установах. Да паслуг народа таксама базы алімпійскай падрыхтоўкі "Стайкі", "Раўбічы", "Ратамка", палацы спорту, тэніса, лядовыя палацы, больш за 9,6 тыс. адкрытых спартыўных пляцовак. У Рэспубліцы Беларусь працуюць больш за 23 тыс. спецыялістаў фізічнай культуры і спорту, у іх ліку каля 7,5 тыс. настаўнікаў фізічнай культуры.

Фізічнае выхаванне каля 3 млн. дашкольнікаў, навучэнцаў і студэнтаў ажыццяўляецца ў час правядзення вучэбных заняткаў па фізічнай культуры. У адпаведнасці з праграмай "Дзеці Беларусі", зацверджанай Прэзідэнтам

Рэспублікі Беларусь, праходзяць рэспубліканскія фестывалі “Спорт і мастацтва”, “Алімпійцы сярод нас”, злёты “Калядныя старты” дзяцей са школ-інтэрнатаў, дзяцей-сірот і дзяцей з раёнаў, што пацярпелі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Папулярнасць сярод дзяцей і падлеткаў набылі спаборніцтвы па футболе “Скураны мяч”, па хакеі “Залатая шайба” на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія зімовая і летняя спартакіяды па месцы жыхарства. Праводзяцца таксама зімовая і летняя спартакіяды дапрызыўнай моладзі па мнагаборствах комплексу “Абаронца Айчыны”.

На прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемствах, у арганізацыях створаны калектывы і клубы фізічнай культуры. Каля 1 млн. (амаль 10 % насельніцтва краіны) займаюцца фізічнай культурай па месцы вучобы, працы і жыхарства ў спартыўных секцыях, аздараўленчых групах, клубах і фізкультурна-аздараўленчых цэнтрах.

Фізічная культура і масавы спорт у Рэспубліцы Беларусь – гэта здаровы лад жыцця насельніцтва, здароўе нацыі, будучае незалежнай Беларусі.

## § 7. Рэспубліка Беларусь у міжнародным супольніцтве на мяжы XX – XXI стст.

**Развіццё знешніх сувязей.** У 1987 г. сацыялістычныя краіны-удзельніцы Варшаўскага Дагавора абвясцілі аб тым, што не пачнуць ваенных дзеянняў супраць іншай дзяржавы або саюза дзяржаў, калі самі не стануць аб’ектамі іх узброенага нападу. Яны ніколі не прыменяць першымі ядзернай зброі, не будуць мець тэрытарыяльных прэтэнзій ні да адной краіны свету і не будуць лічыць іх сваімі ворагамі.

У другой палове 80-х гадоў пашыраўся палітычны дыялог паміж СССР і ЗША. Савецка-амерыканскія перамовы на вышэйшым узроўні адбыліся ў Жэневе (1985), Рэйк’явіку (1986), Вашынгтоне (1987), на востраве Мальта (1989). У выніку гэтых сустрэч былі вызначаны асноўныя стратэгічныя накірункі знешняй палітыкі абедзвюх дзяржаў, якія ў далейшым прывялі да кардынальных перамен ва ўсім міжнародным супольніцтве.

У 1989 г. была завершана вайна ў Афганістане. Ажыццяўляўся вывад савецкіх войск з краін Усходняй Еўропы і Манголіі, сярод якіх было шмат ваеннаслужачых-беларусаў. Краіна прызнала прыярытэт міжнароднага права, і перш за ўсё Дэкларацыю правоў чалавека, абавязалася прывесці ўсё ўнутранае заканадаўства ў адпаведнасць з міжнародным правам.

У канцы 80-х гадоў у сацыялістычных краінах Усходняй Еўропы адбыліся так званыя “аксамітныя рэвалюцыі”, у выніку якіх улада перайшла ад камуністаў да іх палітычных праціўнікаў. Была ліквідавана Берлінская сцяна, адбылося аб’яднанне Германіі. Вясной 1991 г. былі распушчаны Савет Эканамічнай Узаемадапамогі і арганізацыя Варшаўскага Дагавора. Сацыялістычная сістэма спыніла сваё існаванне. Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан павіншаваў народ сваёй краіны з пераможным заканчэннем “халоднай вайны”.

ЗША сталі адзінай у свеце звышдзяржавай, уступілі на шлях усталявання ў ім “свайго новага парадку”.

Пасля ліквідацыі СССР пачалося прызнанне Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы. Былі падпісаны з сумежнымі дзяржавамі дагаворы аб граніцы і абвешчана аб тым, што ў Беларусі няма тэрытарыяльных прэтэнзій да іх.

26 лютага 1992 г. Рэспубліка Беларусь падпісала Хельсінкскі Заключны акт. З гэтага моманту яна не толькі стала раўнапраўным удзельнікам хельсінкскага працэсу, але і нясе разам з іншымі дзяржавамі адказнасць за захаванне міру і бяспекі ў Еўропе.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. вызначыла асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі суверэннай дзяржавы. У артыкуле 18 запісана: “Рэспубліка Беларусь у сваёй дзяржаўнай палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права”.

Рэспубліка Беларусь далучылася да Дагавора аб скарачэнні войск у Еўропе. Яна зменшыла колькасць агульных узбраенняў. У 1992 г. Беларусь вывела са сваёй тэрыторыі тактычную ядзерную зброю, нягледзячы на тое, што стратэгічныя і тактычныя ядзерныя ракеты ЗША і блока НАТА заставаліся нацэленымі на яе. Толькі ў чэрвені 1994 г. афіцыйныя колы ЗША інфармавалі аб перанацэленасці іх ракет. У 1996 г. ядзерная зброя была поўнасцю выведзена за межы краіны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 3 ліпеня 1996 г. прапанаваў стварыць у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе прастору, свабодную ад ядзернай зброі. ***Рэспубліка Беларусь – нейтральная бяз’дзерная дзяржава ў цэнтры Еўропы.***

У эканамічным супрацоўніцтве Рэспубліка Беларусь развівала сувязі з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, перш-наперш з Расіяй. ***2 красавіка 1996 г. быў падпісаны Дагавор аб Супольнасці суверэнных дзяржаў – Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.*** Гэты дагавор забяспечыў грамадзянам абедзвюх краін роўныя правы ў атрыманні адукацыі, ахове здароўя, працаўладкаванні, аплаце працы, заканадаўстве і іншых галінах.

Важным крокам у далейшым паглыбленні інтэграцыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі стала ***падпісанне 2 красавіка 1997 г. у Маскве Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі***. Яго неад’емнай часткай стаў Статут Саюза Беларусі і Расіі, якім прадугледжваецца забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі, іх бяспекі, абараназдольнасці, узаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі Еўропы і свету.

***8 снежня 1999 г. у Маскве быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.*** Беларуска-расійская інтэграцыя ўзнялася на якасна новую ступень. На долю Расіі прыходзіцца больш паловы агульнага аб’ёму знешняга гандлю Беларусі.

Рэспубліка Беларусь развівала гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва не толькі з краінамі СНД, але і з дзяржавамі далёкага замежжа. У яе знешняй

палітыцы выразна вызначыліся ўсходні і заходні вектары. Важнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі з'яўляюцца еўрапейскія краіны, у іх ліку Германія, Вялікабрытанія, Польшча, Нідэрланды, Літва, Латвія і інш. У 2002 г. аб'ём гандлю з імі склаў каля 5 млрд. дол. Рэспубліка Беларусь прыцягвала ў сваю эканоміку капіталы і вопыт замежных інвестараў і міжнародных валютна-фінансавых арганізацый, стварала сумесныя прадпрыемствы, дазваляла замежным фірмам займацца на сваёй тэрыторыі бізнесам і прадпрымальніцтвам.

Развівалася супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і замежных краін у галіне навукі, літаратуры і мастацтва. Гэта – сумесныя распрацоўкі беларускімі і замежнымі вучонымі навукова-даследчых тэм, пераклад і выданне за мяжой твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, гастролі майстроў беларускай сцэны і дэманстрацыя работ беларускіх мастакоў і скульптараў у іншых краінах і г. д.

Адным з напрамкаў міжнароднай дзейнасці Рэспублікі Беларусь з'яўлялася вырашэнне праблем, звязаных ***з ліквідацыяй вынікаў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі***. У атмасферу была выкінута вялікая колькасць радыеактыўнага рэчыва, 70 % якога прыйшлося на тэрыторыю Беларусі. Забруджанай аказалася трэцяя частка плошчы рэспублікі, на якой пражывала больш за 2,2 млн. чалавек. У крытычным стане апынуліся 20 % лясоў, 73 рэспубліканскія і 162 мясцовыя заказнікі, 336 помнікаў прыроды. Сярод іх – Белавежская і Налібоцкая пушчы, Бярэзінскі і Прыпяцкі запаведнікі, Асвейскае возера і інш.

Нягледзячы на вялікія намаганні, зробленыя кіраўніцтвам краіны па пераадоленню наступстваў чарнобыльскай катастрофы, а таксама на дапамогу ўрадавых арганізацый і грамадскасці замежных краін, праблема Чарнобыля па сённяшні дзень застаецца вострай. Патрабуюцца яшчэ нямалыя сродкі і пэўны час. Наогул, пераадолець вынікі такой буйной тэхнагеннай катастрофы, як чарнобыльская, Беларусі магчыма толькі з дапамогай міжнароднага супольніцтва.

**Удзел спартсменаў Беларусі ў Алімпійскіх гульнях.** Спартсмены Беларусі ўпершыню ўдзельнічалі на XV Алімпійскіх гульнях у Хельсінкі (Фінляндыя) у 1952 г. У складзе зборнай каманды СССР тады былі 4 беларускія лёгкаатлеты і 2 фехтавальшчыкі. ***Першы алімпійскі сярэбраны медаль*** сярод беларускіх спартсменаў заваяваў М. Крываносаў (кіданне молата) на XVI Алімпійскіх гульнях у 1956 г. у Мельбурне (Аўстралія).

На XXVI Алімпійскіх гульнях у 1996 г. у Атланце (ЗША) ***Рэспубліка Беларусь упершыню*** была прадстаўлена самастойнай нацыянальнай камандай. У яе складзе было 162 спартсмены. Залатыя медалі заваявала К. Хадатовіч (акадэмічнае веславанне, байдарка-адзіночка). Беларускія спартсмены на гэтых гульнях атрымалі яшчэ 6 сярэбраных і 8 бронзавых медалёў.

На XXVIII Алімпійскіх гульнях у Афінах (Грэцыя) у 2004 г. у камандзе Беларусі налічвалася 147 спартсменаў па 23 відах спорту. Заваявана 15 медалёў: 2 залатыя (Ю. Несцярэнка – бег на 100 м і І. Макараў – дзюдо), 6 сярэбраных і

7 бронзавых. У неафіцыйным камандным заліку Беларусь заняла 26-е месца сярод 202 краін-удзельніц, а па колькасці медалёў – 18-е месца.

У зімовых Алімпійскіх гульнях беларускія спартсмены ўдзельнічаюць з 1964 г. ***Першым з беларускіх спартсменаў, які атрымаў бронзавы медаль на XV зімовых Алімпійскіх гульнях у 1988 г. у Калгары (Канада), быў канькабежац І. Жалязоўскі*** на дыстанцыі 100 м. На XVII зімовых Алімпійскіх гульнях у 1994 г. у Лілехамеры (Нарвегія) ***Беларусь упершыню*** выступала асобнай нацыянальнай камандай. На XIX зімовых Алімпійскіх гульнях у 2002 г. у Солт-Лейк-Сіці (ЗША) каманда Беларусі ў складзе 62 спартсменаў у неафіцыйным камандным заліку заняла 19-е месца, а хакейная зборная каманда – 4-е месца.

**Беларуская дыяспара.** Слова "дыяспара" паходзіць ад грэчаскага "*diaspora*", што азначае рассяленне, пражыванне значнай часткі этнасу па-за межамі этнічнай тэрыторыі. Ва ўсе часы па розных прычынах насельніцтва беларускіх зямель перасялялася ў іншыя краіны. Першая хваля масавай эміграцыі з Беларусі адбылася на мяжы XIX і XX стст. Развіццё капіталізму, расслаенне і абеззямельванне сялянства, аграрная перанаселенасць, збядненне дробных вытворцаў абумовілі масавы выезд сялян за межы Беларусі. Першая сусветная вайна, Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі, нямецкая, а затым польская акупацыя Беларусі ў 1918 – 1920 гг. абумовілі новую хвалю эміграцыі. У міжваенны перыяд асабліва значнай была эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі як вынік цяжкага сацыяльна-эканамічнага становішча працоўных, нацыянальнага і рэлігійнага націску ў складзе Польшчы. Шмат жыхароў Беларусі апынулася па-за межамі рэспублікі ў гады Другой сусветнай вайны. Каля 1,5 млн. чалавек былі эвакуіраваны на ўсход СССР, далёка не ўсе яны вярнуліся ў рэспубліку. Амаль 380 тыс. жыхароў Беларусі былі прымусова вывезены на працу ў Германію. Многія тысячы беларусаў аказаліся за мяжой ў ліку савецкіх ваеннапалонных. Пакінулі Радзіму і члены многіх беларускіх палітычных арганізацый, устаноў і ваенных фарміраванняў, якія былі створаны фашыстамі на акупіраванай тэрыторыі. У пасляваенныя гады сотні тысяч грамадзян Беларусі апынуліся за мяжой Бацькаўшчыны пасля далучэння Беласточчыны да Польшчы (1945) і падчас узаемнай рэпатрыяцыі палякаў з Беларусі ў Польшчу і беларусаў з Польшчы ў Беларусь, у выніку прымусовых высяленняў, асабліва з Заходняй Беларусі ў іншыя рэгіёны СССР.

Характэрнай асаблівасцю пасляваеннай беларускай эміграцыі было тое, што яна заявіла аб сабе як аб самастойнай этнічнай супольнасці ў замежжы, стварыўшы свае нацыянальныя асяродкі, рэлігійныя, культурныя арганізацыі, навуковыя цэнтры, сродкі інфармацыі. У пасляваенны перыяд значна павялічыўся адток насельніцтва Беларусі ў іншыя рэгіёны Саюза. Гэта арганізаваная вярбоўка працоўных рэсурсаў на новабудоўлі, асваенне цалінных зямель у Казахстане і прыродных рэсурсаў Сібіры і Поўначы, планавае размеркаванне выпускнікоў навучальных устаноў, добраахвотныя індывідуальныя перасяленні.

Найбольшая колькасць беларусаў пражывае ў Расіі (1 млн. 200 тыс.), на Украіне – 460 тыс. беларусаў, у Латвіі – 120 тыс., у Літве – 63 тыс., у Польшчы – каля 300 тыс. беларусаў. У ЗША, па сцвярджэнні даследчыкаў, у розныя часы асела 600 – 650 тыс. беларусаў. Прыкладна 70 тыс. беларусаў пражывае ў Канадзе. Ёсць згуртаванні беларусаў і ў краінах Заходняй Еўропы – Англіі, Францыі, Італіі, Даніі, Бельгіі і інш. Беларускія згуртаванні існуюць таксама ў Аўстраліі і краінах Лацінскай Амерыкі – Аргенціне, Бразіліі, Парагваі, Уругваі і інш. Усяго за межамі Рэспублікі Беларусь пражывае прыкладна 3 – 3,5 млн. беларусаў.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Чаму вучыць гісторыя Беларусі? Аб чым сведчыць гістарычны вопыт?** Калектыўная памяць народа, гістарычны вопыт з’яўляюцца багаццем краіны, састаўной часткай яе інтэлектуальнага патэнцыялу і культурных здабыткаў, асновай нацыянальнай самасвядомасці. Без ведання гісторыі кожны народ у цэлым і кожны чалавек паасобку з’яўляюцца бяднейшымі, іх перспектывы руху наперад становяцца праблематычнымі.

1. Гістарычны вопыт сведчыць пра тое, што народы, якія не ведаюць сваёй гісторыі, не маюць будучыні. Колькі разоў іншаземцы-заваёўнікі знішчалі іх дзяржавы, рабавалі людзей, грабілі матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, зводзілі на нішто стваральную працу шматлікіх пакаленняў людзей, нашчадкам якіх прыходзілася пачынаць усё спачатку. Калі мы сочым за падзеямі, якія адбываюцца ў многіх дзяржавах былой сацыялістычнай садружнасці, на Балканскім паўвостраве, на Блізкім Усходзе, у Афрыцы, Амерыцы і іншых частках планеты, хочацца адзначыць, што і сёння гісторыя правучвае народы “за невуцтва і пагарджанне” ёю.

2. Гістарычны вопыт сведчыць аб тым, што павярнуць назад кола гісторыі нікому не ўдавалася: зварот да капіталізму ўзору 1917 г. немагчымы, як і немагчымы зварот да сацыялізму ўзору 1985 г. Але чалавецтва павінна ўзяць усё лепшае, што выпрацавалі капіталізм і сацыялізм, і пабудаваць новае грамадства.

3. Гістарычны вопыт сведчыць аб тым, што новае грамадства будуецца не на голым месцы, а на фундаменце, зробленым папярэднімі пакаленнямі людзей. Прыхільнікі ліберальна-буржуазнай мадэлі грамадскага развіцця свабодную дэмакратычную сацыяльную прававую дзяржаву павінны былі будаваць на фундаменце савецкага грамадства, узяўшы з яго гісторыі ўсё лепшае і паступова адмаўляючыся ад таго, што вычарпала свае магчымасці і ператварылася ў тормаз далейшага прагрэсу. Галоўная памылка рэфарматараў у тым, што яны сталі на шлях разбуральніцтва, знішчэння ўсяго савецкага, не прапанаваўшы нічога стваральнага, што магло б аб’яднаць народ і заручыцца яго падтрымкай. Эканоміцы, сацыяльнай і духоўнай сферам некаторых краін СНД нанесена такая шкода, якой яны не мелі нават у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ідэалогія ліберал-дэмакратызму, прымітыўная рыначная рыторыка, разбуральныя рыначныя рэформы не з’яўляюцца прывабнымі для народаў постсацыялістычных краін.

4. Як сведчыць гістарычны вопыт, сацыялізм і капіталізм як грамадска-палітычныя сістэмы ў вачах значнай часткі народаў планеты дыскрэдытаваны. Разам з тым і сацыялізм і капіталізм маюць шмат здабыткаў, шмат станоўчага. Пагэтаму Рэспубліка Беларусь, бадай адзіная з постсацыялістычных краін, узяла на ўзбраенне канцэпцыю пабудовы грамадства, якое ўключыла б усё лепшае і ад капіталізму (рыначна-буржуазнай сістэмы, але не з гангстэргска-мафіёзным, а з цывілізаваным рынкам) і ад сацыялізму (планава-

сацыялістычнай сістэмы, але не з дырэктыўным і ўсеахватным планаваннем, а з планаваннем індыкатыўным, кропкавым). Умоўна гэта грамадства мы называем ***грамадствам сацыяльнай справядлівасці***.

5. Рэспубліка Беларусь смела і рашуча адмовілася ад ***ліберальна-буржуазнай мадэлі рынка***, калі прадпрыемствы кідаюцца ў рыначную стыхію, у свабоднае плаванне, цэны лібералізуюцца, валютна-фінансавая сістэма вызваляецца ад дзяржаўнай манаполіі (апекі), многія прадпрыемствы ўпадаюць у стан банкруцтва, з'яўляецца масавае беспрацоўе, эканоміка разбураецца, і прыняла ***сацыяльна-арыентаваную мадэль рынка***, калі дзяржава рэгулюе працэсы ў эканамічнай і сацыяльнай сферах, абапіраючыся пры гэтым на рыначныя механізмы попыту і прапановы.

6. Гістарычны вопыт сведчыць, што адзінай крыніцай даходаў, дабрабыту людзей павінна з'яўляцца праца і ні ў якім разе ні зладзейства, жульніцтва, машэнніцтва. Пагэтаму ў Рэспубліцы Беларусь спынена дзікая "прыхватызацыя", распраданне кучкай дзеячоў нацыянальнага багацця і стварэнне капіталаў, якія маюць крымінальны характар. Гэта выклікала нянавісць да кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь з боку айчынных і замежных злодзеяў і прайдзісветаў.

7. Дзяржавы, дзе адзіным ідэалам з'яўляюцца грошы (долары), будучыні не маюць. Патрэбны іншыя, духоўна-маральныя каштоўнасці і ідэалы.

8. Гістарычны вопыт сведчыць, што ў любой краіне баль павінны правіць закон. Пагэтаму ў Рэспубліцы Беларусь умацоўваецца праваахоўная сістэма, наносяцца моцныя ўдары па гангстэрызму, мафіёзнасці, зладзейству. Рэспубліка Беларусь, бадай, адзіная з постсацыялістычных краін, дзе працуе закон, стабільнае становішча, не страляюць і не забіваюць людзей на вуліцах, у пад'ездах уласных дамоў.

9. Гістарычны вопыт сведчыць аб тым, што рашэнне ўнутраных праблем ёсць адзіны спосаб павышэння аўтарытэту і прэстыжу краіны ў свеце. Найбольшы эффект для краіны можа быць толькі там, дзе ёсць канцэнтрацыя намаганняў на ўсім зразумелых і дасягаемых канкрэтных мэтах і дзе дэмакратычная дзяржава выступае гарантам правоў і свабод чалавека, паборнікам сацыяльнай справядлівасці, клапоціцца аб інтарэсах усяго грамадства.

10. Гістарычны вопыт сведчыць, што вайна – самае вялікае зладзейства супраць чалавечнасці, што вайна – гэта кроў, слёзы і пакуты мільёнаў і мільёнаў людзей. Пагэтаму чалавек разумны (homosapiens) і ўсё чалавецтва павінны выключыць вайну з жыцця народаў і краін і ўсе спрэчныя пытанні вырашаць за сталом перагавораў. Вось чаму наша краіна дабраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі і не далучаецца да ніякіх ваенна-палітычных блокаў. ***Рэспубліка Беларусь – нейтральная, без'ядзерная дзяржава ў цэнтры Еўропы.***

11. У сучасным аднапалярным свеце пры наяўнасці мноства небяспек, у тым ліку і ваенных, порах трэба трымаць сухім, каб абараніць сваю

незалежнасць. Вось чаму Рэспубліка Беларусь умацоўвае свае ўзброеныя сілы, бо, як сведчыць гістарычны вопыт, калі народ не жадае ўтрымліваць свае ўласныя ўзброеныя сілы, ён будзе ўтрымліваць, карміць чужое войска, войска захопніка.

12. Няма добрых і дрэнных народаў, народаў-патрыётаў і народаў-здраднікаў. Гістарычны вопыт сведчыць, што пры пэўных абставінах сярод любога народа могуць знайсціся людзі, якія стануць на шлях супрацоўніцтва з ворагам, здрады сваёй Айчыне. Караць у адпаведнасці з Законам трэба здраднікаў, а не народы.

13. Рэспубліка Беларусь, бадай, адзіная з усіх постсацыялістычных краін, якая не стала на шлях дэзінтэграцыі, разбурэння індустрыі на той падставе, што яна быццам выраблялa "нікому не патрэбны хлам", а таксама на шлях дэкалектывізацыі, ломкі калгасна-саўгаснай сістэмы і стварэння фермерскіх, хутарскіх гаспадарак. Гэта прывяло б да катастрофы як у горадзе, так і ў вёсцы. Рэспубліка Беларусь цалкам захавала свой вытворча-эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял. У нашай краіне ёсць эканамічная і палітычная стабільнасць, працуюць фабрыкі і заводы, калгасы і саўгасы, арганізацыі і ўстановы, прыватны сектар эканомікі, людзі рэгулярна атрымліваюць зарплату, у кватэрах цёпла і светла, дзяржава падтрымлівае тых, хто не можа зарабляць ці мала зарабляе. Гістарычны вопыт сведчыць, што рэформы, пабудаваныя на разбурэнні, а не стварэнні новага, без уліку настрояў у грамадстве, церпяць крах. Рэформы ў Рэспубліцы Беларусь – паступовыя, абгрунтаваныя, стваральныя, галоўнае – у інтарэсах краіны і яе народа.

14. Рэспубліка Беларусь захавала сацыяльную сферу (бясплатную ахову здароўя, асвету, навуку і культуру), не знішчала помнікі гісторыі і культуры, бо яны створаны працай і геніем народа і яму павінны належаць. Беларускі народ з'яўляецца адным з самых адукаваных, культурных, інтэлектуальна развітых народаў свету. Высокі агульнаадукацыйны, прафесіянальны і культурны ўзровень беларускага народа – яго агульнацывілізацыйнае дасягненне.

15. Рэспубліка Беларусь закончыла ў асноўным перыяд індустрыяльнай трансфармацыі і ўступіла ў перыяд постіндустрыяльнага развіцця, ажыццяўлення інфармацыйна-тэхналагічнай рэвалюцыі. Яна з надзеяй крочыць у будучае. Зрабіць нашу краіну моцнай і квітнеючай можа беларускі народ, у тым ліку і сённяшнія студэнты, заўтрашнія настаўнікі, урачы, інжынеры, эканамісты, арганізатары вытворчасці, вучоныя, палітычныя і дзяржаўныя дзеячы.

**Грамадска-палітычнае становішча і перспектывы развіцця Рэспублікі Беларусь.** У палітычным спектры Рэспублікі Беларусь яскрава выдзяляюцца тры асноўныя накірункі. Першы з іх – праварадыкальны, буржуазны. Яго асноўнымі мэтамі з'яўляюцца буржуазная рэстаўрацыя, пераўтварэнне сацыялістычнага ладу ў капіталістычны, адмаўленне ўсіх здабыткаў апошніх дзесяцігоддзяў, спробы павярнуць кола гісторыі назад, у 1917 г. Але слоў "капіталістычная рэстаўрацыя", "буржуазнае адраджэнне" у праграмах

праварадыкальных партый і рухаў няма. Чаму? Таму што капіталізм як грамадска-палітычная сістэма ўжо даўно дыскрэдытаваны падзеямі апошніх стагоддзяў: дзве сусветныя вайны на сумленні капіталізму, каланіялізм, разбой і аграбленне народаў Азіі, Афрыкі, Акіяніі і Лацінскай Амерыкі, эксплуатацыя сваіх уласных народаў і г. д. Таму ідэолагі і палітыкі капіталістычных краін прыкладна з 20 – 30-х гадоў XX ст. адмовіліся ад тэрміна “капіталізм” і капіталістычнае грамадства сталі называць “грамадствам усеагульнага росквіту”, “грамадствам заходняй дэмакратыі”, “грамадствам з рыначнай эканомікай” і г. д. Прыхільнікі праварадыкальнай палітычнай арыентацыі словамі і выразамі “дэмакратыя”, “свабода”, “правы чалавека”, “прыватная ўласнасць”, “прававая дзяржава”, “рыначная эканоміка”, “інтэграцыя ў сусветную супольнасць”, “далучэнне да агульначалавечых каштоўнасцей” і іншымі прыкрываюць сваю адданасць капіталістычнаму выбару, а таксама свае дзеянні капіталістычна-рэстаўрацыйнага характару.

Другі накірунак у палітычным спектры – левалрадыкальны, сацыялістычны. Яго галоўнымі мэтамі з’яўляюцца аднаўленне савецкай улады і сацыялістычнага грамадства, спробы павярнуць кола гісторыі назад, да канца 80 – пачатку 90-х гадоў XX ст. Але сацыялізм як грамадска-палітычная сістэма сёння таксама дыскрэдытаваны памылкамі і злачынствамі, якія былі здзейснены кіраўнікамі КПСС і Савецкай дзяржавы, здрадай М. Гарбачова, Палітбюро і Сакратарыята ЦК КПСС, многіх мясцовых кіраўнікоў, а таксама магутнай антысацыялістычнай прапагандысцкай кампаніяй, якая праводзіцца ў апошняе дзесяцігоддзе не толькі на Захадзе, але і ў дзяржавах СНД і іншых былых сацыялістычных краінах.

Такім чынам, і праварадыкальны (буржуазны) і леварадыкальны (сацыялістычны) палітычныя накірункі сёння дыскрэдытаваны. І за правымі і за левымі партыямі і рухамі Беларусі ідзе меншасць насельніцтва.

Трэці накірунак развіцця грамадства, які заключае ў сабе ўсё лепшае, што выпрацавалі капіталізм і сацыялізм, – гэта ***грамадства сацыяльнай справядлівасці***. Якія лепшыя здабыткі капіталізму можа ўключаць у сябе гэтае грамадства? Гэта – элементы самарэгулявання ў рыначнай эканоміцы, высокая арганізацыя вытворчасці з арыентацыяй на канчатковы вынік, дысцыпліна працы, высокая прадукцыйнасць працы, паваротлівасць і мабільнасць у галіне навукова-тэхнічнага прагрэсу, выкананне буйных дзяржаўных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця і г. д.

Здабыткі сацыялізму – элементы сацыяльна-эканамічнай прадказальнасці ў планавай эканоміцы, дзяржаўнае кіраўніцтва выкананнем буйных сацыяльна-эканамічных праграм (гэта запазычана капіталізмам у сацыялістычных краінах і названа там “дзяржаўным рэгуляваннем”), навукова-тэхнічны прагрэс у вядучых галінах (космас, абаронная прамысловасць і г. д.), стабільнасць грамадства і ўпэўненасць людзей у заўтрашнім дні, моцная сацыяльная палітыка ў інтарэсах большасці народа – права і абавязак працаваць (адсутнасць беспрацоўя), адукацыя, ахова здароўя, пенсіённае забеспячэнне,

жыллё, камунальныя паслугі і г. д., разумная і адказная культурная палітыка – дзяржаўнае фінансаванне і кіраўніцтва развіццём навукі, літаратуры, музыкі, тэатра, выяўленчага мастацтва і г. д., недапушчальнасць прапаганды культу грошай (нажывы), насілля, садызму, спекуляцыі на чалавечых слабасцях, амаральнасці.

Ідэя трэцяга шляху развіцця грамадства, пабудовы грамадства сацыяльнай справядлівасці, адсутнічае ў праграмах цэнтрысцкіх партый і рухаў Беларусі. У апошніх ёсць фразеалогія і правых і левых партый і рухаў. Яны хітруюць, лаўчацца, хаваюць свае сапраўдныя палітычныя мэты. Людзі бачаць гэта і не хочуць звязваць з імі свае надзеі на будучыню.

***Магістральны шлях развіцця Рэспублікі Беларусь – пабудова грамадства сацыяльнай справядлівасці.***